
Георгій
Марчук
ВОЧЫ
І СОН

Георгій Марчук

# ВОЧЫ І СОН

# САВА ДЫМ І ЯГО ПАЛЮБОЎНІЦЫ

Георгій
Марчук





# ВОЧЫ
# І СОН

раман

# САВА ДЫМ
# І ЯГО
# ПАЛЮБОЎНІЦЫ

раман

МІНСК
«МАСТАЦКАЯ ЛІТАРАТУРА»
1990

ББК 84 Бел7
М30

Герой романа «Глаза и сон» Иван Чечирка подозревает жену в измене и убегает из тюрьмы, чтобы отомстить Аверьяну Лиходею, которого считает любовником жены. Подозрения Чечирки не подтверждаются, однако он случайно становится свидетелем покушения на жизнь Лиходея. Покушение делал слепой музыкант Казик Батура. Он и рассказал Чечирке о загадочном прошлом Лиходея.

Почему так сложилась жизнь Савы Дыма, симпатичного молодого человека, наблюдательного, способного, практичного, который, оказавшись в большом городе, поменял много профессий и соблазнился сладкой легкой жизнью? Ответ на этот вопрос автор стремится дать в романе «Сава Дым и его любовницы».

4702120201— 106
М ——————— 19—90
М 302(03)—90

ISBN 5-340-00433-3

© Выдавецтва «Мастацкая літаратура», 1990

# ВОЧЫ І СОН

раман





*Гермес спытаў Зеўса, як даць людзям Праўду і Сорам, можа, размеркаваць іх, як размеркаваны рамёствы? А падзелены яны так: аднаго, хто валодае талентам урача, хапае на многіх — і на тых, хто нічога не разумее ў хваробах. Значыць, Праўду і Сорам такім жа чынам размеркаваць сярод людзей? А можа, надаць іх усім?*

*«Усім,— адказаў Зеўс,— няхай усе будуць з імі. Не стаяць дзяржаве, калі толькі некаторыя будуць імі валодаць, як валодаюць рамёствамі. І гэты закон дазволь ахоўваць мне, каб кожнага, хто не зможа жыць з Праўдай і Сорамам, вынішчаць як язву грамадства».*

---

## РАЗДЗЕЛ ПЕРШЫ

**...Сумненні і трывогі Івана Чачыркі...**
**Бібліятэкар магілёўскай турмы...**
**Рызыка, апошні шанец**

З ранку і да вечара пульсавалі ў скронях адны і тыя ж думкі: «Рабі што-небудзь, дзейнічай, дзейнічай!» Выйсця не знаходзілася. Душу зняволенага магілёўскай турмы «Вейна» Івана Чачыркі, асуджанага па 175-й (супраціўленне ўладам) раз'ядала, гняла помста. Для яго быў нямілы белы свет, і здавалася, калі ён не паслухае гэтай надакучлівай позвы сэрца, жыццё спыніцца. І ён рызыкнуў адкрыць сваю акрываўленую падазрэннямі душу такому ж зняволенаму, як і сам. Выбраў у дарадцы і памочнікі загадчыка турэмнай бібліятэкі Кастуся Шарамета. Інтуіцыя падказала Івану, што, акрамя Кастуся, ніхто не зможа памагчы яму збегчы.

Чаму ж вырашыў шукаць падтрымку ў гэтага хітраватага маладога чалавека, па знешнім выглядзе якога было цяжка вызначыць і натуру і нацыянальнасць? Чарнявы, з вузкаватым прарэзам вачэй, характэрным больш для выхадцаў з Азіі, Шарамет быў суседам па кубрыку — так называлі камеру ў пяціпавярховым будынку, знешне падобным на звычайныя гарадскія дамы. І яшчэ кідаліся ў вочы пранырлівасць і хватка падладзіцца да турэмных абставін, яго амаль прыроднае ўменне ладзіць з начальствам і зняволенымі.

Ён прарабіў разам з ўсімі на будоўлі лаўсанавага завода не болей як тыдзень-два і нечакана для ўсіх быў пераведзены ў атрад № 1 (які займаўся абслугай лагера) на пасаду бібліятэкара. Ён вельмі хутка і ўдала наладзіў турніры

па шашках і шахматах, выпускаў насценгазету і стварыў духавы аркестр. Больш таго, нейкім чынам — ніхто не ведаў, чыя гэта ідэя, бо калі б дазналіся, што яго, забілі б — была ўжыта ў распарадак дня, звычайна ў нядзелю, страявая гадзіна. Шарамет казаў, што ідэя належыць намесніку «хазяіна» — так клікалі начальніка турмы — Квяткоўскаму, здаравеннаму мужыку, якога пабойваліся. Пад бадзёрыя гукі маршу (аркестрам кіраваў прафесіянал з гомельскай філармоніі, які папаўся за грашовыя махінацыі) атрады маршыравалі па пляцы. Шарамет, задаволенасць на твары якога часта зменьвалася неспакоем і трывогай, стаяў побач з Квяткоўскім і кіраўніком аркестра і пoглядамі, нязграбнымі жэстамі падбадзёрваў маршырантаў. Не ўсім і не адразу ўдавалася прайсці роўна, як гэта робіцца на парадах у сталіцах. Квяткоўскі моршчыў лоб, тоўстыя губы яго надзімаліся, шчокі чырванелі, і ён жэстам загадваў усё паўтарыць спачатку. Атрады, праклінаючы Квяткоўскага, завадзілу Шарамета, аркестрантаў, халодны вецер, які біў у твар, і свой лёс, пачыналі нанова. Іван Чачырка ў такія моманты не кляў нікога, бо ведаў — асноўная ідэя муштры на карысць зняволеных. Атраду, які паспяхова спраўляўся з маршыроўкай, Квяткоўскі дазваляў атрымаць дадаткова пяць пасылак з волі. Вось чаму, сціскаючы сківіцы, глытаючы пыл з пяском, зняволеныя грукалі зноў і зноў сваімі кірзачамі па пляцы, бо кожны марыў пра адно і тое ж: пра кіло сала — самай смачнай ежы ва ўсім свеце.

Іван, перад тым як звярнуцца да бібліятэкара, вядома ж, не адну ноч абдумваў, узважваў планы ўцёкаў, і нічога разумнага без рызыкі для ўласнага жыцця ў яго пасівелую на скронях галаву не прыходзіла. За гэтыя два гады, з трох запісаных яму, толькі тры выпадкі вырвацца на волю і здараліся.

Двое маладых зусім хлопцаў рызыкоўна кінуліся на колкі дрот. Трохі параніліся, напалохаліся аўчарак, канвоя і злога Квяткоўскага. Далі ім за гэткія спробы яшчэ па годзіку, тым справа і скончылася. Хадзілі чуткі, што раней адзін зняволены праглынуў некалькі фішак даміно і, калі яго везлі ў бальніцу на аперацыю, змог уцячы. Калі тое было, як прозвішча таго смельчака, ніхто ў кубрыках не ведаў. Пачуўшы гэта, былы загадчык магазіна, армянін, праглынуў ажно дваццаць фішак даміно. Але армяніна прааперыравалі і праз дзесяць дзён прывезлі назад. Ён ад сораму мо ці не тры дні нічога не еў. Ды як галодны будзеш цягаць цэглу на будоўлі?

Іван зразумеў, што толькі Шарамет, які застаецца на цэлы дзень у лагеры, мае мажлівасць вылічыць, вызначыць, адкрыць, а то і падрыхтаваць адну (толькі б была) надзейную магчымасць уцёкаў.

Сустрэліся яны ў ліпені на чыгуначным вакзале сталіцы. Менавіта тады Іван Чачырка перажыў сапраўдны сусветны (як казаў Кастусь) сорам на людзях, калі іх усіх — сто дваццаць асуджаных — на пероне ля багажні ў час чакання вагонаў прымусілі прысесці, абапіраючыся аб зямлю адным каленам. Рэдка калі Іван у сваім жыцці плакаў, а тут слёзы душылі, ён іх, здавалася, праглынаў ненароджанымі, сілай волі стрымліваў, каб не пацяклі па шчоках. Тады, калі сонца неахвотна кацілася на захад, калі вакзал жыў прыемнай трывогай сустрэч і провадаў, калі на іх кідалі позіркі папроку, іранічныя позіркі, позіркі спачування — і такія былі, асабліва ў людзей, якія не ведалі, што перад імі асуджаныя, а думалі, што гэта будучыя салдаты-навабранцы альбо проста цікаўныя позіркі, у якіх было ўсё — і празмерная цікавасць, і недаверлівасць, і асуджэнне. Вось тады Іван і прыкмеціў Шарамета. Гэта зараз ён ходзіць па лагеры, як па піўным бары. Забыўся, змяніўся, пасмялеў. А тады побач з ім сядзеў худы і бледны хлопец і тупа глядзеў у зямлю, баючыся падняць галаву. Хаваў карыя вочы асабліва тады, калі побач беглі маладыя вясёлыя дзяўчаты. Тады зняволеных і парадніла гэта абвостранае пачуццё сораму і перад сабой і перад людзьмі.

Відаць, так балюча ніхто з іх натоўпу не перажываў пазбаўленне волі, як яны. Разгубленасць іх апякла страшэнна, крута ўзяла ў палон трывога за жыццё родных на волі і за сваё жыццё там, куды іх праз мінуту павязе цягнік. Так разам трымаліся адзін аднаго, туліліся моўчкі ў кузаве машыны, аддалі свой харч нахрапістаму і агіднаму, з мордай забойцы зняволенаму, які амаль сілком вырваў пакет з рук Кастуся.

Кастусь да турмы працаваў адміністратарам на кінастудыі. Відаць было, што яго доўгія рукі з тонкімі кашчавымі пальцамі не ведалі цяжкай работы; ён трымаўся Івана, нібыта шукаючы ў яго і маральнай і фізічнай падтрымкі. Саракагадовы Іван мог быць апорай. Каржакаваты, ладна адшліфаваны прыродай сын каваля адпавядаў назве «дужы чалавек», якога, здавалася, шчасліва абмінулі хваробы цела. Адно што хіба ў рост не пайшоў і кідкай прыгажосцю не ўдаўся. У яго быў добры, адкрыты твар са шчырымі вачыма, за якімі не хаваецца фальш, хітрынка альбо незразумелая

насцярожанасць. Вялікія залысіны на галаве рана надалі яго твару мужчынскую сталасць. Яго роўная, упэўненая няспешная хада выдавала хутчэй у ім спартсмена, штангіста, баксёра, а не шафёра. Спортам, праўда, Іван сур'ёзна, калі не лічыць захаплення лыжамі, не займаўся. Колькі сябе памятае, лыжы любіў.

Недзе ў бацькоўскай хаце і дагэтуль мо ляжаць на вышках самаробныя шырокія лыжы. Ад гэтай любові і звычкі да лясных прагулак з асаблівым пачуццём чакаў заўсёды зіму. Рагатаў непрыгожа: на ўвесь голас. Гэты гучны смех, бывала, без дай прычыны, празмерная непасрэднасць, якую лёгка было прыняць за бескультур'е — у гаворцы з людзьмі ён адразу пераходзіў на «ты», няўвага да жаночага полу,— саслужылі яму нядобрую службу. Дзяўчаты пабойваліся яго сілы, гэткай непасрэднасці, не ведалі, што можна ад яго чакаць, і пачалі на ўсялякі выпадак цурацца Івана яшчэ са школы. З часам і ён пачаў заўважаць іх такую пастаянную насцярожанасць і пры сустрэчах з тымі, якія больш падабаліся, пераходзіў у іншую крайнасць: рабіўся замкнёным, маўклівым, няўважлівым. Кантакты з жаночым полам даваліся яму з цяжкасцю, і гэта цяжкасць рабіла з яго як бы зацюканага маўчуна. Мо таму ён доўга не мог знайсці сабе пару. Стары бацька — каваль пачаў баяцца, што знікне род, што сын яго ў такой незразумелай зацятасці сап'ецца яшчэ ды не ажэніцца ніколі. Ажаніўся, як кажуць, на радасць людзям і сабе на муку. Але пра гэта гаворка наперадзе, бо было б паспешліва і рызыкоўна вызначаць, што для яго радасць, а што сапраўднае гора і калі адно непрыкметна як бы пераходзіць у другое.

Кастусь яму спадабаўся — гэта факт. Ён яшчэ не браўся сам для сябе канчаткова адказаць, ці можа цалкам даверыцца Шарамету, але яго вялікасць час прыспешваў, прымушаў дзейнічаць. Іншага выйсця Іван не бачыў.

— Косця, мне трэба з табой сур'ёзна пагаварыць,— ціха сказаў Іван у час адбою.

— Доўгая гаворка? — таксама ціха перапытаў Кастусь.

— Доўгая. У туалеце не паспеем. Каб у бібліятэцы тваёй. Гэта можна?

— У прынцыпе ўсё можна. Я падумаю. Ранкам скажу.

У нядзелю ранкам, калі спіцца соладка, як у дзяцінстве, паднялі, як заўсёды, а шостай гадзіне. Кастусь па дарозе ў туалет параіў Івану зрабіць усё, каб прастудзіцца, захварэць і застацца ў медчасці, а ўжо там ён дасць знаць, як і калі прыйсці ў бібліятэку.

— У медчасці доктар наш чалавек. Сядзець яму яшчэ чырвонец. Ён спачувае нашым хлопцам. Галоўнае, каб кашаль быў натуральны, гэта важна.

На тым і дамовіліся. Іван не стаў адкладваць «прастуду» на заўтра, чакаць выпадку. Адразу пасля маршу на пляцы наглытаўся першага снегу, якога выпала бедна, як кот наплакаў, і таму прыйшлося зграбаць, а пасля яшчэ ўспацелы і расхрыстаны кінуўся піць з крана ваду, як у спякоту. Уначы высунуў з-пад шэрай коўдры ногі — адчуў, як да іх з акна даходзіць лёгкі халадок. Думаў затэмпературыць, хвароба зачэпіць. Магутны, загартаваны шматгадовай работай шафёра арганізм не паддаўся правакацыі: усяго толькі запяршыла ў горле. Паморшчыўся Іван і паскардзіўся на хваробу ў целе, на дрыжыкі, слабасць і галаўны боль напачатку «заўхозу», так называлі ў атрадзе, як бы старасту, адказнага за парадак, а пасля і камандзіру атрада маладому лейтэнанту. «Заўхоз» не паверыў, пакрывіў губы; каб быў упэўнены, што Іван не дасць здачы, мо і смальнуў бы яму раз: «Не прыкідвайся! За цябе ніхто рабіць не будзе». Здаралася такое — вучыў слабейшых, але тут быў асаблівы выпадак. Моцны кулак Івана, яго шырокія плечы, смеласць у вачах прымушалі быць абачлівым. Камандзір атрада, пазяхаючы і не надта ўважліва слухаючы жальбы Чачыркі, накіраваў яго да доктара. Той уважліва агледзеў Івана, зазірнуў так пранікнёна ў вочы, знайшоў у іх нешта вельмі яму аднаму знаёмае і даў вызваленне. Зняў са шчаслівай усмешкай з сябе Іван робу, апрануў лазарэтную вопратку і ўпаў на ложак, гатовы выпіць вядро лекаў і прыняць сотню ўколаў.

— Я калі першы раз сядзеў,— расказваў яму чулы доктар,— то на такарным станку рабіў. Пот увесь выходзіў, ногі не трымалі, у галаве гудзела, у роце сохла, у вачах зайцы бегалі. Знарок бяру глушу станок. Падыходзіць майстар. Кажу, не выдай! Пакорпайся, дай перадых. Так што я, браток, цану адпачынку ведаю. Дам не болей як тры дні. Ты не адзін. Не крыўдуй. Вітамінаў табе калоць не будуць, не на курорце, а горла пагрэем. Адпачывай.

А восьмай гадзіне лагер апусцеў. Ціша стаяла незвычайная, даўно такую не чуў Іван. Сабакі не брахалі, і быў чуцен смех жанчын каля канваірнай — яны сарціравалі і праглядвалі пісьмы зняволеных. Ён ведаў пра іх ад Кастуся, але ж сам ніколі не страчаў: яны прыязджалі з Магілёва на работу а дзевятай гадзіне, калі ўсе з лагера даўно працавалі на лаўсанбудзе, не трапляліся яму яны ніколі і ў лагерным буфеце. Гэты ледзь чутны жаночы смех абудзіў у ім яшчэ

большую злосць. Ён нават ніколі і не заўважаў за сабою, што можа быць такім злым і што злосць, як і дабро, доўга помніцца і стымулюе яго энергію. Там, на волі, ён карыстаўся павагай і яго ўсе ведалі найбольш як добразычлівага чалавека, цяпер жа ўся ягоная душа ўяўлялася яму расплаўленым жалезам, вулканам. Аголеная злосць і жаданне неадкладнай помсты запаланілі ўсе яго думкі і жаданні. Ён нават, чакаючы прыходу ў лазарэт Кастуся, напалохаўся: а ці засталіся якія-небудзь яшчэ пачуцці на дне ягонае душы. Акрамя гэтых вар'яцкіх і такіх яму зараз прыемных, гаючых. Каб здзейсніўся план, ён гатовы быў адсядзець яшчэ дзесяць гадоў, толькі б не пацвердзілася ганьба і знявага, толькі б адбылося ачышчэнне праўдай — тады ён зрабіўся б, здаецца, добрым і мог бы зноў цаніць само паняцце «жыццё», якое для яго тут, у турме, страчвала каштоўнасць.

— Доктар, можна я пайду ў бібліятэку? — нясмела, але з добрай доляй чалавечай просьбы спытаў Іван.

— Падыдзі,— ахвотна згадзіўся доктар.— Дарэчы, папрасі, каб мне далі свежых газет.

Іван з палёгкай уздыхнуў, нібыта атрымаў дазвол зусім пакінуць шасцігектарную тэрыторыю лагера. Ветлівы, але звычайна асцярожны Кастусь адразу правёў яго да шафы з кнігамі і пасадзіў там у кутку ля акна.

— Калі хто і забяжыць, дык наўрад ці цябе тут угледзіць.

— А што? Хіба нехта можа прыйсці з начальства? — занепакоіўся Іван.

— У прынцыпе ўсё магчыма. Я прывык страхавацца. Нават калі мой сябра-повар забяжыць, і яму не трэба ведаць, што ты тут. Дарэчы, лёгкі на ўспаміне.

Прыбег чырванашчокі повар, дастаў з-за пазухі некалькі катлет, пачаставаў бібліятэкара, які ў сваю чаргу даў клапатліваму і рухаваму без меры повару газет.

— Вось так і жывём. Баш на баш. Бяры, не саромейся, набірайся сіл,— прапанаваў Івану цёплыя катлеты Кастусь.

— Няўжо сёння будзе магчымасць уцячы? — не паверыў, аж падскочыў на табурэтцы Іван.

— Сядзі, сядзі. Я ж не фокуснік, а ты не джын, каб схавацца ў бутэльку. Я тут мазгаваў маленька... прыкідваў тое-сёе. Паслухай, якога чорта ты зараз хочаш уцякаць, калі сядзець засталося нейкіх там паўгода? Дзікасць! Ёсць такое слова ў навуцы: логіка. Дзе логіка, Ваня?

— Трэба, Косця. Пазарэз!

— Не, гэта не адказ... Калі ты мяне паважаеш, верыш,

што я не стукач, давай па-мужчынску — шчыра. Люблю праўду.

Іван перавёў дых, глянуў з-пад густых броваў на Кастуся і выціснуў з сябе кароткае і цвёрдае прызнанне:

— Забіць мне трэба аднаго чалавека.

Кастусь уцягнуў галаву ў плечы, інтуітыўна азірнуўся наўкола.

— Ну, ведаеш, апошнія два гады я развучыўся разумець, што такое жарт.

— Я не жартую. Мне трэба забіць аднаго чалавека.

— І на гэта ёсць падставы? Ты разумееш, што пляцеш? — пайшоў у наступленне Кастусь.

— Разумею. Я выкрыю факты. У мяне сэрца часам моцна ціснe, баюся, што не дажыву да волі. Трэба, разумееш, усё адно як хвароба напала, трэба! Падобнае на каханне, толькі з другога боку. Ты хацеў шчырай праўды, я сказаў,— як просячы прабачэння, закончыў Іван.

— Та-ак-с... Раскольнікаў. І хто ж гэты чалавек, калі не сакрэт?

— Начальнік міліцыі аднаго раёна.

— Та-ак-с... У прынцыпе ўсё магчыма пад гэтым грэшным небам. Хочаш адпомсціць за тое, што незаслужана пасадзілі? У прынцыпе... Калі нават у стане афекту, там з рэўнасці, дапусцім, на 36-ю пойдзеш, і мне, як саўдзельніку, прыпаяюць яшчэ на два кастылі па году.

— Косця, не здзекавайся. Я да цябе, як да брата. Калі я вырашыў табе аднаму адкрыцца, хіба ж я выдам цябе? Зямлю грызці буду, на валасах павешуся, а ўсё, што сёння паміж намі — гроб-магіла. Чорт ува мне сядзіць. Не магу больш трываць, сэрца лопне. Пра забойства і думаю ўвесь час, як звар'яцелы.

— Гэта бывае. У чалавека недасканалая нервовая сістэма. У цябе звычайнае перанапружанне. Не ўсе, брат, з турмы выходзяць белымі анёламі.

— Не. Гэта зусім іншае.

— Добра. Дапусцім... у прынцыпе. А што — ён сапраўды заслугоўвае, каб яго забіць, гэты твой крыўдзіцель? Ці гэта ўсё ж твая хворая фантазія?

— Так. Думаю, што заслугоўвае,— у вачах Івана прамільгнуў азартны бляск.

— Думаю — гэта расплывіста. А доказы?

— Ёсць доказы. Я ўпэўнены, яны мяне, доказы і факты, чакаюць. Калі здрэйфіў, скажы,— сказаў як адсек Іван.

— Та-ак-с... Павязаў ты мяне, Ваня. Толькі Косця

Шарамет хоць знешне сам баязлівец, а калі ўжо даў слова... у дошку разаб'ецца, а стрымае. Давай па парадку, давай без панікі. Ты гарачы, галава не здольна аналізаваць, ёсць такое слова ў кіно — аналіз ролі. Раскажы мне, адкрый душу... калі і напраўду ён заслугоўвае кары, о, сукай буду, вось табе мая рука, што змагу і не змагу, а зраблю ўсё. Я іх, мільтонаў паганых, ненавіджу. У мяне на іх у самога зуб, па іх жаданні і я тут парахнею, а маю бабу недзе на Чыжоўцы п'яны ахламон цісне ў цёплай пасцелі. Давай паспавядайся, а я думаць буду сваімі курынымі мазгамі, мо нешта разам і прыдумаем. Сінтэзаваць будзем. Слова ёсць такое — сінтэз. Давай.

— Доўгая песня, Косця, ды і сумная.

— Нічога. Часу хопіць. Давай ад самага пачатку.

— Не ўмею я. Трэба вярнуцца прыкладна гадоў на дзесяць назад... У тысяча дзевяцьсот шэсцьдзесят чацвёрты год.

— А пачынай хоць з дзяцінства, я цярпліва выслухаю.

Іван адкусіў катлету, праглынуў, выцер далонню губы, меў такую звычку, калі збіраўся доўга гаварыць, і распачаў свой расказ-споведзь.

## РАЗДЗЕЛ ДРУГІ

**...Першае каханне... Чужы горад... Жаніцьба... Пачатак знаёмства з начальнікам райаддзела ўнутраных спраў горада Белагрудка Авяр'янам Паўлавічам Ліхадзеем... Суд**

Нарадзіўся я на Палессі ў сям'і каваля ў некалі знакамітым і славутым Тураве, які цяпер у страшэнным заняпадзе і які чатырыста гадоў аніяк не адродзіцца. Прадзед мой мог адрамантаваць гадзіннік, умеў класці паркет, прыдумаў сваю мышалоўку. Дзеда майго звалі Дарафей, а як звалі прадзеда — не помню. Адно слова засталося — Чачырка. Як пароль. Лепшых кавалёў не было ў самым Давыд-Гарадку. Бацька мой разам з векам нарадзіўся. Што б ні казалі, а прафесія каваля накладвае адбітак на характар. Быў ён нелюдзімы, занадта незалежны і ганарлівы. Прасіць ды мухляваць — гары яно гарам. Маці была простая сялянка. Сям'я іх бедна жыла. У вайну мне было пяць гадоў. Помню немцаў. На адкрытай машыне ехалі. Падышлі з вясёлым гэгатам да плота па гэтай самай справе. Адзін

заўважыў мяне ў гародзе, я пад куст парэчкі схаваўся. Паманіў пальцам, дастаў з кішэні на грудзях шакаладку і даў мне... Што тут пра вайну ўспамінаць і пасляваеннае ліхалецце? Бацька на фронце, маці хваравітая ды мы: я і сястра малодшая. Брат маці — партызан — часта наведваўся. Прыходзіў стомлены, галодны як звер, бульбу з лушпайкамі еў, аднойчы нас сярод ночы падняў, завёў да дзеда, пасадзіў на печ і загадаў на вуліцу не выходзіць, яго чакаць.

Маці за сувязь з партызанамі немцы забілі. Мы ацалелі. Калі нас вызвалілі, атрымалі ліст ад бацькі са шпіталя. Хутка і прыехаў, без адной рукі. Ну, які з яго каваль без рукі. Моцна піць пачаў. І настаўнікі нашы яго саромелі, і дзед наш. Сястра вырве якую-небудзь зеляніну, абы з зямлі расло, і бяжыць да мяне з пытаннем: «А гэно мона есці? А гэно мона, не?»

Як падумаеш, што чалавеку дадзена перажыць... Усё спадзяешся на лепшае ў будучыні, а яно, бывае, як шандарахне аглобляй паміж вачэй... У прыродзе ўсё ўраўнаважана: прыйдзе час, і пакуту выцесніць радасць, але і яна не вечная, яе гоніць зноў пакута.

У памятным пяцьдзесят шостым бацьку раптам знялі з інваліднасці, пазбавілі пенсіі — гэта дабівала патроху яго, мы з сястрою збіраліся ў вялікі свет: я ў армію, яна рвалася на цаліну. Назад вяртацца нікому з нас не хацелася. Такая ўжо хвароба ўсіх правінцыялаў ды вяскоўцаў — уцякалі куды вочы глядзяць, толькі б у буйны горад, бо свой у некалькі вуліц з чайной на плошчы і паркам надакучвае. У нашым парку я ўпершыню і дзяўчыну адну прыціснуў, але пра гэта пасля. У армію ляцеў як на крылах. Суседка пісала пра бацьку, і ў кожным лісце адно і тое ж: не кідай яго, вяртайся дахаты, пісала, сядзіць п'яны ля чайной і плача, вас успамінаючы. Служыў пад Мінскам, там і прафесію набыў вадзіцеля. Ты ў войску не служыў? Дарма. У арміі толькі і пачынаеш разумець, што за плячыма радзіма, якую трэба бараніць кожны дзень. Там, у бібліятэцы, я ўпершыню прачытаў пра гісторыю Тураўскага княства, а так нічога не ведаў. Там жа мяне лёс сутыкнуў і мы добра пасябравалі з маім аднагодкам Грышам Белашапкам з таго Белагрудка, у якім суджана было мне напаткаць каханую. Далі мне водпуск, тады служылі тры гады, іду я ў кірзачах з чамаданчыкам па сваім Тураве вясёлы. Сэрца пяе. Зіма. Снег рыпіць пад нагамі. Сумёты, нізенькія хаты, белае сонца паміж галінак стогадовых дрэў — адно слова, казка. Падыходжу да сваёй сядзібы, аж сучачка незнаёмая з брэхам на мяне, а

зводдаль бачу, ля адрыны бацька адзін калоду на сталюзе пілуе. Давай мы абдымацца. Ніколі ён мяне так пяшчотна не цалаваў, не сустракаў, не гладзіў... бытта дзесяць гадоў не бачыліся. Я грэшным дзелам лічыў, вось пайду ў армію, а ён знойдзе кабету (тады ўдоў багата было) свайго веку, прывядзе, ды будуць дажываць разам. Ён жыў адзін. Такі аднalюб быў. Сястра яму з цаліны трохі грошай прыслала. Даравaў я яму несусветнае п'янства, пашкадаваў яго. Цвёрда вырашыў, калі мы дровы на марозе калолі, вярнуся назад у Тураў. Прыехаў. Каб ты бачыў яго радасць! Падваліны новыя ў старэнькай хаце паставілі, сталярку новую заказалі, знёс я гнілы плот, зрабіў моцны драцяны з сеткі. Індыкоў завялі. Я прывёз з Украіны. Шафёр у той час быў і цар, і бог, і воінскі начальнік. Грошай мала атрымлівалі, але ж значна больш рабілі, як цяпер робяць. Я не асуджаю, калі хто і краў тады. Усе мы на крадзеным выраслі. Крадзенае тое, можна лічыць, было заробленым. Чаго грэх таіць, і я левую капейку любіў. Частавалі самагонам. Ды я суровы закон меў: ніколі п'яны за руль не сяду. Кідаў машыну дзе папала і пёхам дахаты альбо залезу ў сваю палутарку ГН 15—45 і сплю. Пра жаніцьбу і не думалася. А потым, куды жонку маладую прывесці: у гэту галоту, да старога, хворага, часта п'янага бацькі?

Смерць да старога пачала падкрадвацца ад ног. Запомні на ўсё жыццё: пачнуць у чалавека балець ногі, пухнуць, бярэцца ён за кіёк — хана — пяць — сем год і памрэ. А тут яшчэ мая непуцёвая сястрыца прывезла з цаліны трохгадовага хлопчыка, кінула на нас, я спрабаваў сварыцца, але каму дакажаш, вецер у галаве. Сама паехала ў Мінск на трактарны, узялі яе там штампоўшчыцай. Унук трохі дысцыплінаваў старога, ды нервы былі сарваны ўшчэнт, лічы, дзіця расло самапасам. Я сястру пісьмамі засыпаў. Прыязджала на святы, прывозіла падарункаў і зноў уцякала, калі дзіця спала. Вольна мне было толькі ўвечары ды ўночы.

Я ўсё гэта мог бы табе і не расказваць, сам не ведаю, чаму пацягнула пачаць з Турава. Ты прасіў шчыра, а шчырасць моцна трымаецца каля дзяцінства і юнацтва. У сталым узросце можна ўсё ж тое-сёе і паўтарыць. Другі раз ажаніцца там ці пераехаць у іншы горад, змяніць прафесію. А дзяцінства ды юнацтва паўтарыць нельга. Вось чаму па ім з сумам, успамінаючы, і плачаш. Яшчэ ў арміі я вазіў свайго камандзіра на прыроду ў кампаніі смелых і пародзістых дзевак. Хапала там часам і на маю долю.

Прыехала да нас у сталоўку павaрыха — нязграбная,

плечы здаравенныя, твар рабаціністы, голас грубы, і чобаты насіла мо трыццаць дзевяты нумар ці саракавы. Не ўсе на новенькую кінуліся, як звычайна бывае сярод местачковых хлопцаў, бо ўсё ж навідавоку. Але нешта ў ёй вар'яцкае і прыцягальнае было. Ты ўсміхаешся? У кожнай з іх да пары сядзіць гэтае нешта прыцягальнае, што прыемна падыходзіць аднолькава і сатане і анёлу.

Ну, давёў я яе да Прыпяці. Сам трохі «на газу» быў, смелы. Прыціснуў раз, другі, памякчэла. Такія пірагі і з макам, і з мёдам... Я як жыў... віп'ю — цягне да яе, а так тыдзень не ўспамінаю. Яна на кватэры жыла. Я шух пад акно, раз, другі пастукаю, яна высунецца, кажа: «...Ідзі на старое месца, я дaганю». Атрымаем так крадком кожны сваю асалоду, а гаварыць няма пра што, яна саромеецца, а мяне на сон п'янага цягне. Тыдзень, два не прыходжу. Перакінулі яе ў Жыткавічы на чыгуначную станцыю. Я на машыне праз месяцы два шась у Жыткавічы. Яна кажа: болей не прыязджай, кавалер, кажа, у мяне тут аб'явіўся з сур'ёзнымі намерамі. А мне што, у адказ маўчу, сэрца маё да яе пустое. Так, кажа, каханне правяраюць, дастаткова, каб незнаёмае імя мужчыны з вуснаў каханай зляцела, а табе ўжо і свет нямілы. Адказваю, няхай так, не буду вам перашкаджаць. Падару, кажа, табе напаследак яшчэ адзін вечар, каб успамінаў. Паехалі ў лясок. Ну, брат, такое выкінула, такое... што ў мяне вочы на лоб палезлі. Пытаюся: няўжо цябе гэткае не зневажае як жанчыну? Кажа, свет да ўсяго прывучыць. Зноў я ў Тураве сваім адзін. Аднойчы ў нядзелю падхапіўся бацька, кажа, сынок, у грудзях пячэ... занясі мяне да нашай былой кузні — гэта за адрынаю метраў пяцьдзесят. Бяру на плечы, нясу — а што рабіць? Сеў. Пасядзелі на траўцы ля кузні, праводзіў сонца на захад, кажа, нясі, сынок, дахаты, холадна. Мінула два дні, тры... зноў стары, утаропіўшы погляд у адно месца, дурэе... Нясі, сыночак, да кузні, цяперака точна памру. Кажу, ай не дурыся. Суседзі смяяцца будуць. Бачу, слёзы ў вачах. Бяру на плечы, зноў цягну на горку. Сеў з ім побач. Адшчыпнуў травінку, пажаваў, выплюнуў. Сонца блудзіла ля хмар ды і схавалася. Заветрыла. Стары пазіраў удалечыню, кажа, сынок, нясі дахаты, не хачу ў такую пагоду паміраць. Старое, што малое, адзін розум. Панёс назад. Ледзь не ўпалі.

Праз дзень ехаў я па нашай вуліцы, думаю, прыпынюся, праверу, як там. Пляменнік мой з дзецьмі у двары гуляе. А дзе дзед, пытаюся? Кажа, да кузні пайшоў. У мяне так сэрца і ёкнула. З усіх ног я туды... Сядзіць ён ля сцяны, вочы

адкрыты, і твар такі змучаны, натаміўся ён, відаць, страшэнна, пакуль дапоўз да сваёй кузні.

...Прыехала сястра. Кажа, што рабіць будзем, трохі яна перабясілася, бацькава смерць яе напалохала. Нішто чалавека так не вучыць, як гора: абухом па галаве раз, другі... усе фанфаронствы моладзі, пустэчу і адсячэ. Засталася яна ў Тураве. Дзеўка — агонь. Пайшла нянечкай у дзіцячы садзік. Маладога інжынера, які працаваў на газаправодзе «Дружба», ну і апутала. Распісаліся. Я пачаў харчавацца ў сталоўцы, а сам шукаў зачэпку, каб куды махнуць. У хаце два пакоі на стары лад... якое жыццё. Вось тут я і ўспомніў пра Грышу з Белагрудка. Мы на святы абменьваліся паштоўкамі, сувязь падтрымлівалі... Я яго і папрасіў пашукаць мне работу... Можна было пачаць адразу адсюль... апошнім часам жыву мінулым, баюся будучыні. Амерыкі мо не адкрываю, можа, кожны тут жыве мінулым. Сястра хоць і рабіла выгляд, што занепакоена маім ад'ездам, ды я сэрцам адчуваў, што яна задаволена.

Была глыбокая восень. Калі марудна набліжаецца зіма, сэрца робіцца абыякавым да ўсяго. Ад'язджаў лёгка, як бы ўцякаў ад шэрага, нуднага, санлівага дня. У Баранавічах перасеў на белагрудскі аўтобус, дастаў з чамадана складанчык, паклаў у кішэню быццам для смеласці. Не быў у гэтых краях ніколі? Асаблівы раённы гарадок: на горках стаіць, як Мазыр наш. Што дзіўна, усе вуліцы ад цэнтральнай плошчы ўніз спускаюцца, як ручаі пятляюць: бы вянок і стужкі. Здзівіла, што гарадок парку свайго не мае, скверык у цэнтры захудалы ёсць, там алея Герояў Працы, камень — сведка часоў заснавання, а парку няма. Ну, гэта я агледзеў пасля, а ў першы вечар дзікавата, нялюдна было на душы. Пад'язджалі ў цемры... хаты без агеньчыка, бы нямыя, няўжо, думаю, людзі так рана спаць кладуцца? Раптам фары высвецілі высокі чырвоны касцёл, на ім цені ад крыжоў — ні людзей, ні машын насустрач. Дождж са снегам у шкло лепіць, некалькі чалавек выйшлі ля цагельні, мы ўтрох ехалі да аўтастанцыі. Моцна ўпершыню пашкадаваў, што паехаў сюды. А тут яшчэ, як дурань няпрошаны, тырчу на бязлюднай станцыі. Грышу свайго чакаю... Хаджу вакол, замёрз як сабака вулічны. Думаю, пайду ў буфет, пакуль яшчэ працуе, вермуту шклянку прапушчу для сагрэву. Заходжу... Паверыш, нідзе не патрапляўся мне такі брудны і абшарпаны буфет: сталы падрапаны, ножкі ў іх як бы пагрызены бабрамі, хвасты селядцоў, недасмажаныя сінія катлеты на сталах, гара смецця ў кутку ля паўнюткага адходамі вядра.

Буфетчыца боўтае ў вядры з вадой келіхі і, не выціраючы іх, налівае з бочкі піва... Ручнік ля вядра з жоўтай вадой ляжыць, паверыш, у мяне ў гаражы чысцейшы. Абажур на чвэрць абпалены, у ім маленькая лямпачка. На сценах невядома чаго болей — аблезлай зялёнай фарбы ці шэра-зялёнай, як скура жабы, цвілі. І пах... ледзь не вымуціла. Ахапіла жаданне ўзяць білет і ўцякаць. У сонных, стомленых, абыякавых і недаверлівых вачах буфетчыцы я прачытаў як бы прадказанне майго няшчасця тут у будучым. Не выключана, што я б і з'ехаў. Раптам з кутка ад століка, за якім сядзела чацвёра мужыкоў, мяне нехта аклікнуў: «Ваня! А я сяджу, яго гадзіну чакаю».

Абняліся мы, пацалаваліся. Падсеў да іх. Грыша ўзяў яшчэ дзве бутэлькі «Яблычнага». Сядзелі доўга, пакуль буфетчыца не выпхнула ў плечы. Павёў ён мяне дахаты на Замкавую вуліцу. Адно слова што вуліца. На гарышчы замка даўно няма, адна сцяна стаіць. Тыдзень яшчэ пілі віно, пакуль не выйшлі мае грошы. Грыша, як я заўважыў, ведаў увесь гарадок і мяне з усімі знаёміў: і з цырульнікам, і з прадаўцамі, і з шафёрамі, і з будаўнікамі, і з настаўнікамі, адно толькі з міліцыянерамі не знаёміў, абыходзіў іх бокам. Даведаўся (ад маці, здаецца, ці сястры Паліны), што ён трэці месяц нідзе не робіць. Забрала міліцыя ў яго вадзіцельскія правы. Казаў мне, што за грошы адзін міліцыянер абяцаў выкупіць іх.

Навучаны горам, я занепакоіўся — што ж рабіць? Павёў яго ў лазню, выпарыліся, ён ачуняў, прыняў чалавечы выгляд — я яго амаль сілком не выпускаў на вуліцу тры дні. Што высветлілася: жонка разышлася з ім, забрала малое дзіця і паехала на радзіму ў Ашмяны.

Маці хату падзяліла на дзве палавіны з асобным уваходам і кухняй. Яна здала мне ў наём пакойчык з кухняй за пятнаццаць рублёў у месяц. Пайшлі ў цэнтр, нарэшце, шукаць мне работу.

— У нашым горадзе,— даводзіў Грыша,— тры тысячы католікаў, тры тысячы праваслаўных і тры тысячы атэістаў. Быць таго не можа, каб хто-небудзь з іх не памог табе.

Мяне здзівіла мноства сімпатычных дзяўчат, якія былі модна і хораша апрануты. У аддзелах кадраў цагельні, масласырзавода, бальніцы, аўтабазы месца вадзіцеля не было. Тады незлаблівы і прастадушны Грыша аддаў мне сваю пасаду, якую землякі трымалі для яго. Так я апынуўся каля культуры, стаў вадзіцелем старэнькага зялёнага «аўта-

клуба». Давалі шэсцьдесят рублёў і трыццаць даплачвалі за электрыка... з голаду не апухнуць.

Першае маё знаёмства з начальнікам міліцыі Авяр'янам Паўлавічам Ліхадзеем адбылося, калі прапісваўся ў Белагрудку, перад тым, як атрымаць пашпарт са штампам, мяне паказалі начальніку. Падаўся ён мне чалавекам не строгім, але асцярожным. Смуглявы твар яго ў час гаворкі не змяняўся. Такое пачуццё было, быццам словы ім завучаны даўно і дасылаюцца слухачу без пачуццяў, акцэнтаў і зацікаўленасці. У яго былі густыя валасы, расчэсаныя на прабор. Голас мяккі... Прыемны барытон, як у Магамаева. Пры гаворцы глядзеў прама ў вочы, бы сачыў за тваімі паводзінамі. Мне дык непрыемна было. Пытаўся: адкуль я прыехаў, да каго, на якую работу ўладкаваўся, цікавіўся, дзе і калі я пазнаёміўся з Грышам. Без хвалявання я на ўсё адказваў. У час гаворкі ён круціў у руках кішэнны гадзіннік. Пазванілі. Добрых мінут дваццаць з некім размаўляў. Я чакаў. На развітанне сказаў: «Далей трымайся ад Грышы. Яго песня спета».

Скажу: работай я быў задаволены. У Доме культуры панаваў добры настрой, не было зайздрасці, я прыжыўся, як сярод сваіх, і меў добрыя адносіны і з дырэктарам (літовец па нацыянальнасці быў), і з метадыстамі, тэхнічкамі, касірам. З канцэртамі мы выбіраліся ў вёскі пад Карэлічы, Ліду, нас там звычайна частавалі самагонам, віном, а мне, як і паложана, бутэльку ў кішэню. Гляньмо далей. Вяртаемся ў клуб, а куды дзець бутэлькі... Не саліць жа іх. Зашторваем вокны і да стала. Танцы наладжваем. Твіст рэзалі... тады модна было. Адно песень не спявалі — баяліся раённага начальства. Аднойчы, у час танца, я адной бухгалтарцы шапнуў: «Застанься ў клубе, схавайся пад лесвіцай... пасядзім, прыёмнік паслухаем... Так добра, без памех Польшча дае. У мяне запасныя ключы ёсць ад клуба і ад метадкабінета». Пяшчотна так папрасіў. Прыглянулася яна мне. «Добра,— адказала,— я пайду ўніз першай і схаваюся». Ключа ад клуба ў мяне не было, спадзяваўся, што дамоўлюся з памяркоўным літоўцам. За ёй я даўно сачыў. Хлопцы з танцавальнага гуртка ціскалі яе за кулісамі, яна без сораму садзілася ў прысутнасці кампаніі каму-небудзь на калена, курыла. Кончылі бугі-вугі, выходзім, анекдоты травім, усім хораша. Першы марозец цела прабірае. Замкнуў дырэктар клуб, я да яго, маўляў, так і так, выручай, гадзіну з дзяўчынай адной у цяпле пасяджу, няма куды весці.

Кажа, цябе, Іван, паважаю, вось і дзесяць рублёў прэ-

міі выпісаў, а ключа не прасі. Я катэгарычна супраць бардэля. Гяряй[1]? У яго сям'я, пасада... хто хоча рызыкаваць. Што рабіць? Яна ж пад лесвіцай чакае. Паўгадзіны мінула — цішыня. Абышоў я наўкола Дом культуры: «Ат, думаю, заварыў кашу». Бяру цагліну, выбіваю шкло ў акне, лезу ў актавую залу, іду шукаць сяброўку. Месяц свеціць — адбівае палосы на падлозе, заслоне. Гляджу, а мая сімпатычная краля, прытуліўшыся да батарэі, дрыхне. Разбудзіў асцярожна, каб не напалохаць, і павёў у метадкабінет, уключыў радыёлу і давай кайфаваць пад яе зялёнае інтымнае святло. Шпарыць польскае радыё будзь здароў. Кажу: «Давай танцаваць». «Давай»,— санліва адказвае. Абняла мяне і паклала сваю п'яна-стомленую галаву на плячо, вось-вось захрапе. Маўчыць. Я руку на грудзі ёй — аса! Маўчыць. Танцуем далей. Музыка грае без перадыху. Бяру жаданую маю, вяду да старой канапы, сядаю побач. Туліцца да мяне, млява абдымае і шэпча ля вуха: «Не трэба, Рувім, прашу, харошы мой». Я ёй у адказ таксама на вуха: «Я не Рувім, я Іван».

Прыціснуў яе сваім целам, давай расшпільваць гузікі на спадніцы. Спераду — іх было многа, мо дваццаць гузікаў, аж злосць узяла. А яна зноў: «Рувім, дарагі, пасля, у мяне галава кружыцца». Я ўжо маўчу, думаю, табе хочацца, каб быў Рувім, няхай будзе Рувім. Надакучылі мне гэтыя гузікі, ірвануў я сілай, яна галаву павярнула на мяне, дыхнула ў твар самагонам, цыбуляй, салам... адрыжка на яе напала , вось-вось вымуціць... Падняў яе, павёў да урны. Папрасіла адчыніць акно. От, думаю, уліп, ёлкі-палкі, а калі хто-небудзь на плошчы стаіць? Адчыніў. Высунула яна галаву. Трымаю, баюся, каб не перакулілася, рот адкрыла, не надыхаецца. Няма агідней істоты, чым п'яная баба. Чакаю, пакуль яна акрыяе трохі: цярплівасці набраўся. Даў ёй паспаць гадзіны дзве. Вылезлі праз акно. Лезе на развітанне цалавацца, шчаку падстаўляе: «А табе добра было са мной, Ваня?» Смальнуць захацелася ёй па мордзе, кажу: «Ідзі, не Іван я, а Рувім». Не магу з таго часу на п'яную бабу глядзець і наогул падумаў тады, не шанцуе мне з гэтым слабым полам. Буду жыць халасцяком. Грышы я асцерагаўся, некалькі разоў давялося бараніць ад яго, п'янага, маці і сяструдзесяцікласніцу, з якой гуляў студэнт Юрась, калі прыязджаў на канікулы ў Белагрудак. Гэты хлопец мне падабаўся. Насіў, у адрозненне ад некаторых, на галаве «ёжык», як

[1] Добра *(літоўс.)*.

баксёры. Смелы такі, упарты... Некалькі разоў яго падпільноўваў п'яны Грыша, біўся з ім, забараняў хадзіць да Паліны — нуль эмоцыі, стаяў на сваім, і Грыша капітуліраваў. Юрась дамовіўся са сваім знаёмым, і той забраў Грышу ў брыгаду на будаўніцтва санаторыя ці дома адпачынку ля возера Свіцязь. Грыша вербаваў і мяне, нейкае шчымлівае пачуццё ўтрымлівала мяне менавіта ў Белагрудку, было такое вялікае прадчуванне, што вось-вось са мной на гэтых скутых марозам вуліцах здарыцца нешта значнае, прыемнае і шчаслівае неймаверна. Маё сэрца стамілася, чакаючы сапраўднага кахання, і я адчуў, калі аднойчы ішоў на лыжах насустрач сонцу, што яно, каханне, на парозе. Мінула зіма, забрала з сабой сум. У Белагрудку вясну не любяць: талы снег сыходзіць вадой зверху па вулачках уніз, уніз. Браўся часта і я за лапату, рабіў за сябе, за Грышу, за яго маці, сястру. Бяжыць вада, верне ў двор, як лава з вулкана.

Вёз я неяк у клуб з Гродна новыя крэслы. Дай бог памяць... Цераз Маяк, здаецца. Бачу, на дарозе «газік» стаіць... нашага сакратара райкома камсамола Старадарожца. Яго, высокага і прыгорбленага, я здалёк пазнаў. Вітаюся. Сакратар ходзіць вакол машыны, нервуецца. Я наўгад і кажу: «Прадуй трубку, бензін не падаецца...» Узялі помпу... Шух, шух... Точна. Завёўся. Праз тыдзень мяне выклікаў да сябе ў трохпавярховы будынак першы сакратар райкома і прапанаваў перайсці вадзіцелем да яго ў райком камсамола.

Клюнуў я. Будавалі другі ў горадзе пяціпавярховы дом, думаю, выб'ю кватэру... бо ў першую чаргу даюць — райкомаўскім. Павёз Старадарожца з жонкай у Вільнюс на «талчок». Сабе там купіў белую нейлонавую кашулю за дваццаць восем рублёў. Цягнула ў клуб. Паганая натура. Прывыкаю да людзей. Там шашкі, шахматы... Вось тут мне бог яе і паслаў. Прыехала яна ў Белагрудак пасля заканчэння педагагічнага вучылішча выхавацелькай дзіцячага садзіка. Было ёй тады дваццаць адзін год. Мяне гэта напалохала, бо я быў старэй на восем гадоў. Мастацкі кіраўнік надта ж любіў песні... марыў у сваім калектыве паўтарыць поспех сясцёр Фёдаравых (тады казалі, што яны загінулі ў авіякатастрофе па дарозе ў Японію)... «Ах, Таня, Таня, Танечка, с ней случай был такой».

Мая сімпатыя Вера Філіпчык была ў гэтым славутым мясцовым квартэце, які нязменна карыстаўся поспехам на ўсіх пляцоўках. Я не гуляў у шахматы, цягнула ў залу, пасядзець на рэпетыцыях. Гляну на Веру — усяго як агнём апякае. Адкрыты безабаронны светлы твар (як у дзяцей), не

кранутыя яшчэ расчараваннем і насцярогай вочы, доўгая каса з густых валасоў. Як заварожаны, сядзеў я на адной рэпетыцыі, на другой, трэцяй. Жыла яна на кватэры ў доме ля самай аўтобуснай станцыі. Непрыкметна праводзіў яе дахаты, стаяў насупраць вокнаў, чакаў, пакуль патушаць ва ўсім доме святло, і вяртаўся да сябе на Замкавую. Столькі там ля станцыі markнага люду хадзіла, шпаны ўсялякай... Папракнуў сябе: стары хрыч, да маладой лезеш... Я ўжо разумеў, што час наўкола нас не старыцца, цела старыцца. Пачаў апантана дапытвацца пра Веру, рабіў гэта, каб падазрэнняў не выклікаць. Ведаеш, аднаго танца было дастаткова, каб узненавідзець Юрася, ведаў, што ён гуляе з Палінай, а, паверыш, узненавідзеў. Яе на танцах запрашалі іншыя хлопцы, акрамя мяне, а да Юрася раўнаваў. З часам беспрычынная рэўнасць патухла. Я падгаварыў радыста клуба, які займаўся фатаграфіяй, і той сфатаграфаваў нас у дзень Сёмага лістапада на плошчы. Здымак, на якім я стаю побач з Верай, прычапіў над ложкам. Што ведаў пра яе? Сірата. Выхоўвалася ў лідскім дзіцячым доме. Любімы паэт Пушкін, яшчэ цытавала сяброўкам нейкага Амара Хаяма. Умее сама шыць. Яе адзенне адрознівалася пакроем, спалучэннем колераў. Усё ёй было да твару, што ні апране. Вяла перапіску з сяброўкамі. Бывала, у адзін дзень атрымлівала па пяць пісьмаў. Я да сястры пісаў раз у тры месяцы. Часта хадзіла ў кінатэатр «Пабеда» (усе там прападалі), сядзела ў шостым, пятым радзе і, як я заўважыў, у час сеанса карысталася акулярамі. Не помню хто, як і пры якіх абставінах нас пазнаёміў... Было нейкае паўзабыццё.

«Дзень добры, Вера».

«Дзень добры, Ваня».

Некалькі слоў дастаткова, каб зразумець чалавечыя сімпатыі. Я ёй прапанаваў прагулку на лыжах, яна з захапленнем згадзілася. Не вельмі і пагаворыш, калі табе сцюдзёны вецер б'е ў твар. Мы вярталіся ў горад, здымалі лыжы, ішлі ў сталоўку на чаяванне. Табе знаёмы сумненні закаханага сэрца? Год, два пільна хаваў я свае пачуцці, невядома, як усё б далей рухалася, каб не вечны генератар кахання — рэўнасць. Яна правакатар і натхніцель чалавека як асобы-ўласніка. Стаў да Веры чапляцца адзін участковы міліцыянер—усёдазволенасць служак закону набірала моц. Не ведаю, як дзе, а ў нас ліхадзееўцаў пабойваліся. Участковы Каўрыга быў вышэй за мяне ростам, ніколі вушы ў зімовай шапцы не апускаў, які б мароз ні быў. Вусікі коратка падстрыжаны, нахабны позірк. Заўсёды быў у чобатах. Ух,

як я запомніў гэтыя чобаты-лыжы: пазней, калі мы сам-насам счапіліся, ён садануў мне наском чобата ў жывот, ледзь апрытомнеў. Пачаў ён лезці да Веры. Не вытрымала дзяўчына. Мне аднаму са слязьмі на вачах і паскардзілася. «Вера, кажу, я люблю цябе... Даўно. Выходзь за мяне замуж!» Яна прызналася, што чакае свайго хлопца з арміі (ён служыў у марфлоце, застаўся на звыштэрміновую, абяцаў прыехаць і забраць яе ў Севастопаль). Я не раўнаваў да таго марачка... Было адчуванне, што я для Веры не чужы ў гэтым няўтульным для нас абаіх гарадку. Усё часцей мы гулялі пасля апошняга сеанса па Белагрудку, успамінаючы эпізоды фільма.

...Прыбегла Вера аднойчы да мяне на Замкавую... баіцца дадому ісці... Там ля плота Каўрыга ходзіць, яе чакае. Кажу, заставайся ў мяне, а я пайду ў гараж — у машыне пераначую. Згадзілася. Марачок даслаў ёй ліст, у якім паведаміў, што ажаніўся там з мясцовай. Дзіўна, але яна не надта каб убівалася, перажывала. Зноў я рызыкнуў, прапанаваў і руку і сэрца. Дала згоду! Я, брат, на сёмым небе быў, як будысты кажуць. Але ж, от бач, паганы характар, дакараць пачаў сябе падазрэннямі, што яна не па любові ідзе замуж, а ад жаху перад Каўрыгам. Хаваецца ад яго намаганняў... Спытаць баюся, яшчэ зняважыць можна. Вечар наладзілі ў мяне: яе сяброўкі прыйшлі, сястры пісаў, не прыехала. Здавалі новы дом — нарэшце завяршылі будаўніцтва. Апекуна майго пераводзяць другім сакратаром у райком партыі, а мне ні з таго ні з сяго прапануюць пераходзіць на аўтабазу. Як, цікаўлюся? Ёсць, кажуць, у міліцыі дадзеныя, што вы ў п'яным стане начуеце ў машыне выканкомаўскага гаража. Было? Кажу было, але п'яны не быў. А хто дакажа? На аўтабазу не згадзіўся, пайшоў на «хуткую дапамогу», на ёй начныя дзяжурствы, пасля я ўжо пашкадаваў. Скруцілі мне чаргу на кватэру ўсё роўна. Як мы пра свой дом марылі з Верай, ты не ўяўляеш.

«Хто табе дасць кватэру на адной пляцоўцы з сакратаром райкома, як мне побач з начальнікам» — перадражніваў мяне Каўрыга. Юрась раіў пісаць куды-небудзь. А, рука руку мые. Свету без мучаніка не бывае. Думаю, было б здароўе, з кватэры не праганяюць, жыць можна. На маю бяду, прыехаў Грыша і там работу кінуў. Знайшоў я кватэру на ўскраіне, па вуліцы Новай. Гаспадары ціхія, у гадах. Зрабіў асобны ўваход — цераз веранду. Нечакана паставілі Веру загадчыцай садзіка. Як яна радавалася. Чалавек слабы, асабліва жанчына — пахвалі яе, адорвай кампліментамі,

будзе цвісці, а калі пасаду дасі — на вачах зменьваецца. Усім хочацца пакінуць хоць які след у гэтай бездані жыцця. У выканком на пасяджэнні запрашалі. Неяк я сустрэў, калі яны выходзілі разам з Авяр'янам Паўлавічам. Баялася першыя месяцы кіраваць людзьмі, ведала, што па сваёй прыродзе нашы людзі самалюбівыя, вольныя і не пераносяць над сабой мізэрнага насілля... Сустракаю Каўрыгу, той здзекліва ўсміхаецца. Нешта, кажа, твая жонка хутка ўгару пайшла. Дэпутатам выбралі. Дарма ты, Іван, на мяне з нянавісцю паглядаеш, чарку разам не вып'еш... А ці думаў ты, што не аднаму мне твая Вера падабаецца? У мяне так сэрца і асела, як пад гнётам сыр. Само па сабе ўсплыло ў пене рэўнасці гэтае імя — Авяр'ян Ліхадзей. Я чуў і ад Веры: «Ездзілі ў саўгас «Каменка» з работнікамі выканкома. Выступаў Авяр'ян Паўлавіч». Іржа сумненняў напала на мяне, кожны ад'езд жонкі зрабіўся падазроным. Бачыў усё ў крывым люстэрку. Калі яшчэ сын яго Віталік хадзіў у садзік, я ўспомніў, як яны доўга стаялі з Верай і аб нечым зацікаўлена гутарылі. Аднаго разу прыехала яна з маёўкі надта ўсхваляваная, калі не сказаць, злая. Ад яе чуцен быў лёгкі пах алкаголю. Знарок не клалася спаць, нешта доўга пісала за сталом, чакала, пакуль я засну. Не вытрымала, лягла, кажа, даруй, мусіла з усімі выпіць, Авяр'ян угаварыў шклянку шампанскага выпіць. Падстаў для рэўнасці не было, я іх сам пачаў канструяваць і прыдумляць. Цягнула да Каўрыгі, а раптам ад яго пачую тое самае страшнае і жахлівае для мяне: здрадзіла! Ух, як я зневажаў сябе, «танцуючы» вакол участковага. «Ну, адвозіў ён тваю Веру ў лес, адвозіў. Я за рулём сядзеў, не піў». Смертаносныя словы гэтыя я не разумеў і не ведаў, як успрыняць — ці як праўду, ці як яго адчэпку.

Вера прызналася мне, што цяжарная. Доўга ў нас нічога не атрымлівалася, і раптам... як бы падліла ў агонь масла. «У нас дзіцятка будзе, наша дзіцятка, Ваня»,— так сказала, што ўсе падазрэнні зняла. Зганьбіў я Каўрыгу ў буфеце аўтавакзала. Тады Каўрыга, ён піў піва з новым шафёрам аўтаклуба, папрасіў таго пацвердзіць яго словы: «Так, вадзіў Веру ў лес Авяр'ян».

— Што? З'еў,— накінуўся на мяне Каўрыга.— Так што невядома яшчэ, чыё дзіця гадаваць будзеш.

Я не мог дараваць такія словы. Біў Каўрыгу моцна і доўга, аж сам стаміўся. Арыштавалі. З «Хуткай дапамогі» хадзілі да Авяр'яна, прасілі, каб перадаў справу ў таварыскі суд — тады такія суды былі ў модзе. Не згадзіўся. Праку-

рор прасіў чатыры, далі тры. Астатняе ты сам перажыў: асфальт на вакзале ў Мінску і ў цябе перад вачыма. Развітваючыся, я толькі і запытаў у Веры: «Хадзіла ў лес з Авяр'янам?» — «Хадзіла, Ваня. Даруй, бо гэтым выклікала твае падазрэнні і рэўнасць. Як я шкадавала пасля. Гэтыя пяць — дзесяць мінут мне дорага каштавалі. Мо ты нешта думаеш, Ваня? Няўжо ты мог западозрыць, што я... Не вер нікому. Я буду цябе чакаць. Я буду вернай».

Пісала мне сюды, што нарадзіла сына, пыталася, якое імя хачу даць. Напісаў: Васілёк. Жыццё маё кончана. Лісты ад яе атрымліваю сухія... у асноўным пра сына. Абяцаюць кватэру. Хто ж, думаю, абяцае, ці не Авяр'ян?

Мог жа, сукін сын, уратаваць мяне, перадаць на таварыскі суд. Я згодзен быў даць Каўрыгу тры сотні... Авяр'ян настаяў на судзе і прыстрашыў участковага. Яму трэба было, каб яна, Вера, засталася без апоры... Так? Вось што яму трэба было... Ён ходзіць да яе. Я падпільную... калі пацвердзіцца, не дарую падонку... Яна мне, Косця, фота сына так сюды яшчэ і не прыслала. Я знарок не прасіў, думаю, мо сама надумаецца, аж не... Якая прычына? А ты кажаш, паўгода... ды я ад падазрэння і сумнення сам на сябе рукі налажу... Яе я люблю, шкадую і ненавіджу з аднолькавай сілай. Ім, бабам, цяжка зразумець, што і мы слабыя істоты ў моры пачуццяў. Сэрца падказвае — ён вінаваты, нячысты. Абараніць яе, наша каханне, гонар сына там няма каму. З Авяр'янам у мяне была непрыгожая гісторыя. Выпаў у суботу ў мяне выхадны. Сеў я на ровар і да Нёмана — дзесяць кіламетраў ад нас. Юрась мне казаў, што Нёман — сімвал Беларусі, бо ўсе славутыя рэкі цякуць праз рэспубліку, і толькі Нёман бярэ ў нас пачатак. Да назвы Нёман я не мог прывыкнуць: у нас якія — Гарынь, Прыпяць, Лань, давер у назве, а за Нёманам суровасць, за ім бачыш бурклівага з сівой барадой дзеда, які не любіць жартаваць. Вада ракі, здаецца, дыхае холадам. Не магу плаваць, элементарна баюся. Дык вось, кручу педалі... ля жытнёвага поля... цішыня. Жаўрук спявае. Ані душы. Глядзь, збоку ля дрэўца ў жыце прыхаваны міліцэйскі матацыкл. Ат, думаю, сяду і як рыбіну на кручок цябе і вазьму, каго ж ты ў жыта прывёз. Гадзіну чакаю, другую... надакучыла, вось выходзіць з жыта Авяр'ян, а за ім буфетчыца аўтавакзала Зіна. Глянуў на мяне, нібыта звугліў, такое пачуццё, што застрэліць зараз.

«Ты што тут робіш?» — злосна спытаў.

«На рыбу еду»,— паморшчыўся я, як вінаваты вучань.

«А-а... давай. Шчаслівага клёву,— сказаў, як бы папя-

рэджваючы: ідзі і помні, ты нічога не бачыў, нічога не чуў.

Нават Веры я пра гэта не сказаў. Можа, ён злапамятны, адпомсціць надумаў...

Тут тысяча незразумелых пытанняў, якія рвуць маю душу. Не магу сядзець, бо чую за спіной сыты рогат.

...Даверлівай гаворцы ў турэмнай бібліятэцы ніхто, на шчасце, не перашкодзіў. Адзін раз наведаўся намеснік начальніка, папрасіў кніжку казак. Напалоханы да смерці, Іван, які прысеў ля стала, спытаў:

— Засёк?

— Не. Цяпер бум на кніжкі. Рады няма. Кожны з кіраўніцтва ходзіць ды вымагае для сваіх дзяцей кніжкі казак.

— І што ж, не вяртаюць?

— Канечне, не. Пішам акт, ды спісваем. Бібліятэка багатая. Чорт з імі. Я б на тваім месцы дачакаўся апошняга свістка... Павер мне, баба не заслугоўвае таго, каб дзеля яе ахвяравалі.

— Косця, я зняверыўся ў жыцці... Сёння, зараз мне трэба на волю.

Бібліятэкар задумаўся, нахмурыўшы бровы.

— Косця, калі і ты мяне пакінеш...

— Добра! Помні, калі я паабяцаў, я дрот перагрызу, а корашу памагу. Болей сюды не прыходзь. Сачы за кожным маім рухам, да мяне не падыходзь, я сам на цябе выйду, калі фартуна ўсміхнецца.

Гэты адзіны шчаслівы выпадак, які выпадае раз у дзесяць гадоў, сябры чакалі ўсяго два дні. Уначы ад моцных маразоў прарвала трубы ацяплення. Выкапалі яму, каб ліквідаваць аварыю, акурат як па заказе: на два бакі турэмнага плота. У Кастуся было мала часу — брыгаду рамонтнікаў (таксама са сваіх) павялі на абед. Канваірам (хлопцам з Сярэдняй Азіі) холадна стала стаяць адным, пакінулі работу ў той яме. Тры мінуты спатрэбілася Кастусю, каб вынесці з бібліятэкі робу — добра, што маці даслала яе перад Новым годам, тры мінуты спатрэбілася Івану, каб хутка пераапрануцца ў гэтую самую робу і выслухаць кароценькую параду:

— Ідзі да лаза-ямы, як быццам ты з каманды рамонтнікаў, а там дай бог ногі. Італьянскія фільмы глядзеў? Да жонкі, бацькоў, прыяцеляў на волі не заходзь, накрыюць. І не падумай ісці праз вёску Вейна. Былі тут адны ўцекачы — дзевяць чалавек, падфарціла. Уцяклі да першага магазіна, ў Вейне, налізаліся чарніла, давай песні гарлапаніць. У Навагрудку мой сябар жыве, Валодзя Бягун... на пошце

робіць шафёрам... Прывітанне ад мяне. Баны[1] мінай. У кішэні пятнаццаць рублёў, купі шапку. Пад шчаслівай ты зоркай нарадзіўся. Бач, захацеў уцячы, і бог табе паслаў магчымасць.

— Бывай, Косця. Да гроба табе ўдзячны.

— Не гарачыся. Жыццё адно. Не давярай рэўнасці.

— Калі што... я іх абаіх прыдушу!

Толькі позна увечары пайшоў па тэлетайпе сігнал: «Чачырка Іван Іванавіч, 1938 г. нараджэння, ураджэнец Турава, месца прапіскі Белагрудак, Лідская, 48, уцёк з Магілёўскай турмы 2 лютага 1974 года».

## РАЗДЗЕЛ ТРЭЦІ

**Нечаканае пісьмо...Старыя сябры... Сляпы... Замах**

Напачатку таго самага года, калі Іван Чачырка збіраўся перабірацца ў Белагрудак, першы сакратар райкома камсамола Анатоль Станіслававіч Старадарожац — хударлявы чалавек з засяроджаным тварам — атрымаў ліст ад свайго даўняга сябра, пра якога ў сям'і сакратара пачалі забываць, Авяр'яна Паўлавіча Ліхадзея. Ліст адрасаваўся на Белагрудскі райком, і толькі таму жонка сакратара настаўніца гісторыі, завуч мясцовай школы Варвара Якаўлеўна, якая сярод вучняў мела мянушку Кобра, а сярод настаўнікаў Панікёрша, не змагла прачытаць пісьмо. Адзіны ключ ад паштарні быў у яе, і ўсё чытала першай яна. У маладыя гады сумеснага жыцця Анатоль быў як бы задаволены такім цвёрдым матрыярхатам, калі задужа кантралюе, ахоўвае яго, значыць, моцна кахае, раўнуе. Інакш яе і не называў, як «падушачка», «пампушачка», «булачка мая». Так і сыпаў амаль кожны дзень: «салодкая», «мяккая», «цёплая», «пяшчотная». Праўда, з часам эпітэты гэтыя змяніліся на супрацьлеглыя, колкія. І яна плакала ў падушку, калі ён малаціў у запале: «сквапная», «недалёкая» (у сэнсе светапогляду), «аднабаковая», «настырная». Адно супакойвала яе: Анатоль хутка адыходзіў. А калі з часам паставілі яе дырэктарам школы, яна, ацэньваючы работу і паводзіны калег, узяла на ўзбраенне яго тэрміналогію. Гаспадарлівая (у яе яшчэ ў інтэрнаце Баранавіцкага інстытута настаўні-

---

[1] Бан — вакзал *(жаргон)*.

каў аднакурсніцы пазычалі грошы), прадбачлівая Варвара Якаўлеўна рана падхапіла і прыгрэла студэнта-пераростка Анатоля Старадарожца. За дзесяць гадоў сумеснага жыцця дапытлівая і пранырлівая Варвара Якаўлеўна, здаецца, ведала кожны крок свайго мужа як пасля жаніцьбы, так і да яе. Недзе ў глыбіні душы Варвара Якаўлеўна ўсё ж знаходзіла прычыны ў нечым не давяраць цалкам нават такому ручному, рахманаму, паслухмянаму, клапатліваму бацьку (гадавалі дачок-блізнятак), дамаседу Анатолю. Жыла з прадчуваннем: вось прыйдзе дзень (так падказвала ёй жаночая інтуіцыя), і ў нечым прызнаецца яе Толік, і гэтае нешта будзе абавязкова дрэннае. Як падумае, бывала, у школе на ўроку альбо седзячы адна дома і чакаючы яго з камандзіроўкі, аж працінае ўсю. Магла чакаць далёка за поўнач, пакуль ён прыедзе з далёкага калгаса.

Ён пераступаў парог кватэры ціха, доўга распранаўся, доўга чысціў зубы, усё адцягваў мінуту «даклада», баяўся, бо здаралася — вяртаўся з праверак п'яненькі. Лёгкую выпіўку яна яму даравала пасля першых слоў: «Ласкавая мая, харошая, разумніца, ты не спіш?» Вінаваты толькі ў тым, што лішняе выпіў, за словамі не было фальшу, і яна дабрэла. Бурчала, што наслядзіць, і пыталася, ці даў старшыня альбо сакратар партыйнай арганізацыі калгаса гасцінец дзецям? І была надта ж рада, калі ён даставаў з жоўтага партфеля кавалак духмянага з марозу сала альбо бітончык мёду. Варвара Якаўлеўна любіла сала са студэнцкіх гадоў, можна сказаць, на сале з бульбай і вывучылася. Дзвесце сорак рублёў стыпендыі (вучылася добра) прывозіла бацькам у вёску, яны ды бяздзетная цётка пакавалі ёй харчы. Паехалі па размеркаванні ў Белагрудак. Кіруючых кадраў не хапала, забралі Анатоля інструктарам, выбралі першым сакратаром райкома камсамола. Такі хуткі рост па службовай лесвіцы выклікаў у Варвары Якаўлеўны прыліў энергіі, у яе як бы выраслі крылы і неадольнае жаданне ўбачыць свайго мужа калі не на самым версе гэтай лесвіцы, то хоць бы як мага вышэй. Яна, як і большасць матэматыкаў, была чалавекам справы. Ніхто і не здагадаўся, што ў сям'і ў Старадарожца такі агрэсіўны матрыярхат, бо звычайна у гасцях Варвара Якаўлеўна была як анёл; ні слова, ні паўслова насуперак Анатолю.

І сам Старадарожац часам не разумеў такую метамарфозу. У адрозненне ад свайго мужа Варвара Якаўлеўна ўмела зазірнуць у будучыню, вельмі хутка вывучыла атмасферу нізоў і вярхоў у раённым мястэчку і рабіла ўсё, каб

не кампраметаваць сакратара на людзях (ці мала зайздроснікаў), а ствараць прыклад гарманічных адносін у сям'і кіраўніка. У гасцях (сябравалі з сем'ямі пракурора, хірурга) муж на падпітку пачынаў часам крытыкаваць першага сакратара райкома партыі, казаў, што не ўмее кіраваць. Яна, кусаючы губы, маўчала. «Рамонт» учыняла дома, пачынаючы аднымі і тымі ж словамі: «Праўда вочы коле і разумным і дурным. Ты не перавучыш нікога. Яны ўдзельнічалі ў вайне і вырашылі, што ўсё з іх боку зроблена, астатняе няхай робіць народ, а яны маюць права браць з карыта. З аднаго боку сталінізм, з другога хрушчавізм... Усе напалоханы крайнасцямі. Трэба браць сярэдзіну. Самому не адказваць ні за што... Разумнаму праўда не трэба, бо яму і так добра. Дурань яе не зразумее».

— Сацыялізм — гэта лад сумленных. Я хачу да іх апеліраваць,— гарачыўся ён.

— Сацыялізм — гэта лад, пры якім няма вінаватых. Застаецца на манер Амерыкі адмяніць смяротную кару, і ўсё.

— Не. Рускія людзі не дапусцяць гэтага.

— А хто іх пытаць будзе? Шальмаваць пачнуць па ўсім свеце. Цяпер жа раўненне пачынаецца на Амерыку.

— Нельга. Там чаму так... жыццёвы тэрмін... адкупіцца за грошы можна альбо ўцячы ў іншую краіну. Гэта адзінае, што яшчэ стрымлівае чалавека ад усёдазволенасці,— смяротная кара.

— Знойдуцца такія, якія скажуць, а дзе ж духоўнасць ваша, сумленне, высокая культура, дэмакратыя — чаму ж яны не стрымліваюць ад забойстваў? А? Што ж, скажуць, лад у вас недасканалы.

— А мы ім скажам пра В'етнам, пра мафію, наркаманію, пра багатых і бедных у трушчобах Лондана, пра забастоўкі чыгуначнікаў Францыі і сітуацыю на Кіпры. І наогул... нашых людзей трэба адвучыць ад таго, каб азіраліся: «А што скажа дзядзька Голдуотар, Вільсан, Мао?» А прайдзісветы, трутні, кар'ерысты — пры якім ладзе іх няма, скажы? Задача ўлады звесці іх працэнт да мінімуму. Каб звесці, трэба называць рэчы сваімі імёнамі. Вось чаму я люблю праўду. І ўсім гатовы сказаць, што першы сакратар райкома партыі не адпавядае часу і патрабаванням.

— Пакінь гэта пры сабе і не адкрывай рот, дзе трэба і не трэба. Выжываюць партыйныя кіраўнікі, якія для ўсіх добрыя.

Ён далей спрэчку не доўжыў. Жонка ўпартая, не пера-

трэш яе нават у жорнах, яна глядзіць на свет з акна кухні, думаючы аб грашах. Яна лічыла яго голым тэарэтыкам, які без яе практычнай жыццёвай хваткі не дасягне нават абласных вышынь. Радавала хіба, што яе Анатоль не брыдкасловіць нідзе, што ніводнага хамскага слова ніхто яшчэ ад яго не пачуў. Ён прыкметна вылучаецца прыроднай інтэлігентнасцю, незлаблівасцю. Ці ад прыроды, ці пад уплывам нейкага страху ён не адважваецца на рашучыя дзеянні, яго хапае толькі на голыя заклікі (хоць і з праўдзівымі ацэнкамі) за святочным сталом у сяброў.

Яна адразу прыкмеціла змену настрою ў мужа, як толькі ён сеў вячэраць. Падала яму марынаваныя грыбы (ён любіў іх збіраць і есці), аднак Анатоль сядзеў засмучаны, тады яна ўзяла яго за руку, павяла ў залу, пасадзіла ля стала, сама села насупраць і, не выпускаючы яго рукі са сваёй, зазірнула ў вочы, як гэта рабіла з вінаватымі вучнямі, і спытала:

— Не хавай ад мяне нічога. Мы ж дамовіліся. Давай начыстую.— Гэта быў яе любімы выраз.

Анатоль падаў пісьмо ад Авяр'яна, яна ўважліва прачытала.

— І што ты хочаш адказаць?

— Не ведаю.

— Не, так кашы не зварыш. Давай начыстую,— настойліва дамагалася свайго жонка.

У думках яна прыняла рашэнне адзінае і канчатковае — нага Ліхадзея не ступіць у Белагрудку, тым не менш адмоўны адказ ёй вельмі хацелася пачуць ад мужа. Дагэтуль наўмыснага зла ў адносінах да іх сям'і ад Авяр'яна не было. На ўсё жыццё, праўда, запамятала Варвара адзін выпадак, які не зможа дараваць ні сабе, ні свайму Анатолю, ні Авяр'яну, які яшчэ тады ў студэнцкія гады адрозніваўся ад Анатоля рухавасцю, абаяльнасцю, нават нейкай гарэзлівасцю, ініцыятывай. На Новы тысяча дзевяцьсот пяцьдзесят пяты год прыехаў да іх у двухпавярховы драўляны інтэрнат Авяр'ян, які ўжо працаваў у бабруйскай турме. Яны чацвёра (са студэнткай Авяр'ян пазнаёміўся на баль-маскарадзе) святкавалі сустрэчу Новага года ў дзявочым пакоі інтэрната.

У Авяр'яна быў спірт. Выпілі. Кіраваў застоллем Ліхадзей — любіў і ўмеў быць тамадою, ведаў мноства анекдотаў на адну і тую ж тэму: выпіўка і нявернасць жанчыны. Падурэлі ад разбаўленага вадой спірту да санлівай млявасці. Авяр'ян раптам падхапіў Варвару на рукі, панёс да ложка і, гуляючы, кінуў яе на яго. Сетка на ложку зарыпела. Усе

смяяліся. Варвара, задраўшы дагары ногі, сама рагатала, не саромеючыся зацыраваных вышэй калена панчох. Авяр'ян пацягнуў за руку Анатоля і штурхнуў яго да Варвары.

— Адпачывайце,— параіў Авяр'ян і, цалуючы на хаду ў губы сваю дзяўчыну, павёў да другога ложка, які стаяў ля акна.

. . . . . . . . . . . . . . . . . . . . . .

Першым прачнуўся Авяр'ян. Выпіў палову графіна вады, падышоў да ложка, на якім спалі Варвара і Анатоль, і нечакана пацягнуў на сябе шэра-чырвоную коўдру. Варвара расплюшчыла вочы і, угледзеўшы Авяр'яна, які стаяў перад ёю голы, сарамліва пачала хаваць рукамі грудзі. Ён толькі крыва ўсміхнуўся і вярнуўся да сваёй дзяўчыны.

Сведкаў гэтай сцэны, акрамя іх, не было — і Анатоль і дзяўчына спалі як мерцвякі. Ганарлівая Варвара не змагла дараваць яму такога нахабства, вось чаму яна ўсё рабіла і зрабіла, каб аддаліць, парушыць сяброўства свайго мужа і Авяр'яна.

Гадоў пяць ад Ліхадзея не было вестак. Апошні раз даслаў зноў жа пад Новы год Варвары падарунак — духі «Кветка», якія яна ў прысутнасці мужа выліла ў туалет. І вось пісьмо, дзе Ліхадзей паведамляў, што мае надзейныя «кручкі» ў абласным упраўленні міліцыі і ёсць як ніколі мажлівасць, калі будуць дзейнічаць разам, узначаліць белагрудскую міліцыю.

— Ну, слухаю. Давай начыстую,— зноў пачала яна сваё, устрывожана чакаючы пачуць таямнічае і невядомае ёй, бо нейкі ж ланцужок звязвае мужа з Авяр'янам.

Анатоль дапіў чай, пасунуўся на канапе бліжэй да жонкі, узяў у рукі аловак (любіў што-небудзь круціць у руках) і распачаў сваю споведзь. Жонка, стаіўшы дух, слухала надта ўважліва і толькі мо за ўсю гаворку двойчы ці тройчы і перапыняла словамі: «Гэта я ведаю, далей што?»

Упершыню Анатоль быў з ёй такі шчыры, ці гэта ёй падалося.

— Як ты ведаеш, я нарадзіўся ў сям'і шкловыдзімальшчыка ў мястэчку Бярозаўка. Праўда, гэта яно цяпер зрабілася мястэчкам, а тады перад вайной была звычайная беларуская вёска з вялікай і слаўнай гутай, якая давала шкло ўсёй Польшчы. Бацькі мае, з'еўшы ўсе зубы на выдзімальных трубках, там, на гуце, і пазнаёміліся, і пажаніліся. Маці ад нейкай хваробы памерла рана — мне і дзевяці

гадоў не было. Ажаніўся бацька другі раз: нас мачаха з сястрой Гэляй недалюблівала.

У гэтым месцы Варвара ўпершыню сказала: «Ведаю, давай далей». Яны былі два разы за сумеснае жыццё ў Бярозаўцы, так утульна схаванай у соснах, яна ведала і нелюдзімую Гэлю, і маўчуна свёкра, які дажываў свой век.

— Калі ты просіш усё начыстую, прызнаюся, што я там упершыню і закахаўся ў дачку нашага настаўніка. Ведаю тваё самалюбства, прынцыповасць і незалежнасць, таму адразу скажу — каханне было безадказным. Не мог я ёй падабацца: даўгалыгі, худы, бледны, з рэдкімі валасамі на галаве, якія чамусьці хутка пасля мыцця рабіліся бліскучымі, нібыта я іх барсучым салам намазваў. Я нават пяском іх мыў — нічога не дапамагала. Да цела майго не браўся загар, я саромеўся зняць кашулю, бо ўся спіна была аблуплена, а плечы да таго ж усе канапатыя. Мажліва, каханне і не нарадзілася б. Дапамог мой рост. Плаваць я навучыўся рана. Яе гэта злавала, што яна адна з усіх нас, шаснаццацігадовая, не ўмее. Яна папрасіла, каб я навучыў яе, але каб не на віду, каб ніхто не бачыў. Я згадзіўся. Я не распранаўся, ішоў у ваду ў штанах і сарочцы. Яна першыя два дні таксама не здымала сваё лёгкае плацце, але на трэці дзень зняла, у плацці цяжка было вучыцца.

Ядзя была ўпартая і працавітая, хутка навучылася трымацца на вадзе і магла сама метры са два плыць. На бераг я прыходзіў загадзя, баяўся, што яна не прыйдзе. Здаецца, гатовы быў страціць прытомнасць, кранаючы яе мяккае цела. Урокі былі патаемныя, калі двое цягнуцца да нечага свайго, сакрытага, толькі іхняга і не хочуць дзяліцца гэтым з усімі, тады і пачынаецца каханне.

На самым пачатку вайны трыццаць дзевятага года сям'я настаўніка выбралася ў Ліду, потым вярнулася назад, і ў саракавым іх вывезлі ў Сібір.

Было свята аб'яднання ў адзіную Беларусь... Мой бацька ніколі не цікавіўся раней палітыкай, а тады апранаў чыстую кашулю і не прапускаў ніводнага мітынгу і сходу. Аднаго мяне нічога не радавала. Я прыходзіў на тое месца, дзе вучыў яе плаваць, садзіўся на беразе Нёмана і плакаў. Забылася ўсё толькі ў першы год ваеннага ліхалецця.

Вайна, як самая злосная пачвара, плодзіць эгаізм. Каб выжыць, найперш думаеш пра сябе. Мы ўсе так напалохаліся тэхнікі ворага, смерці, голаду, што пазашываліся ў норы і чакалі, што ж будзе з рускімі? Паняцця, што мы адзінае цэлае і каб адолець ворага, трэба адзін аднаму дапамагаць,

ў нас, і маладых і старых местачкоўцаў, не было. Доўгі час вайна ўсё кацілася недзе зусім блізка, з боку ад нас і чапляла толькі чуткамі, якія прыходзілі альбо з Ліды, альбо з Навагрудка. Пачалі вывозіць людзей (моладзь) на работы ў Нямеччыну. «Ціхая» вайна найбольш уздзейнічае на свядомасць, нікому не верыш, бо нехта з твайго асяроддзя даводзіцца сваяком паліцаю, нехта робіць на немца, ва ўправе. На другім годзе вайны немец пачаў надакучваць, да яго прывыклі і пераcталі часова баяцца, ён і сам расслабіўся, пачаў гешэфтаваць, шукаць кантакту з людзьмі. Наша сям'я — вядомыя грыбнікі. За гэтыя грыбы выменьвалі ў немца цукар, соль.

Бацьку завяжы вочы — рукамі, навобмацак — скажа, дзе белы, падасінавік, мухамор, масляк. Мы тады заглыбіліся далёка ў лес, але я не палохаўся — бацька ведаў лес, як свой гародзік. Напаткалі партызан амаль выпадкова, сутыкнуліся нос у нос. Твары ў іх — бледныя, худыя, нязголеныя. Сярод іх была адна дзяўчына. Апранута яна была пазімоваму: у доўгі самаробны кажух. На нас наставілі зброю і загадалі падысці бліжэй. Адзін абмацаў нас з ног да галавы. Дзяўчына сядзела на пяньку, побач ляжалі самаробныя з жэрдак ношы. Па стомленым твары дзяўчыны было бачна, што ёй кепска, нешта баліць. Галоўны гэтай групы (а іх было пяцёра) спытаў у бацькі, ці ёсць паблізу ўрач, фельчар? Папытаў так настойліва і патрабавальна. Бацька мой ніколі і нікому не хлусіў, сказаў, што фельчара добра ведае, бо ён наш сусед. Тады гэты старэйшы (астатнія маўчалі) зноў жа патрабавальна папрасіў прывезці сюды фельчара. Адзін з барадой загадаў мне застацца з імі. Як заложніку. У надвячоркавую пару бацька прывёў фельчара. Можа, цікава, як я чакаў: сядзеў сабе збоку, як доўбень, як асуджаны, як злодзей які. Дасталі яны з торбы кансервы. Галоўны даў каманду Авяр'яну — ён быў у гэтай групе — і той падаў мне кавалак хлеба і бляшанку, на дне якой засталіся тры кавалачкі рыбы. Выцер аб рукаў ножык, якім сам еў, і даў яго мне. Пазнаёміліся. Авяр'ян, сеўшы побач, распытваў пра завод, местачкоўцаў, паліцаяў. Я нічога не ўтойваў. Дзяўчыне-радыстцы трэба было выразаць апендыкс: такі паставіў дыягназ польскі доктар Фларыян. Галоўны з іх прапанаваў доктару ісці з імі ў лагер пад Белагрудак — добрых паўсотні кіламетраў,— доктар даказваў, што рабіць гэта нельга, можна і спазніцца. Вырашылі так... пакінуць з хворай Авяр'яна і яшчэ аднаго партызана, панеслі дзяўчыну да нас... а куды дзенешся?

Тут жонка апошні раз перапыніла Анатоля: «Ведаю. Ты так часта згадваеш пра гэты выпадак, быццам, апроч гэтага, ваша сям'я ў вайну нічога і не зрабіла».

Бацька самой Варвары трапіў на перадавую ў сорак чацвёртым і дайшоў да Берліна.

— Мяне цікавіць больш Авяр'ян і вашы адносіны.

Анатоль працягваў:

— Прабыла ў нас Таццяна (сапраўднае яе імя Любоў Цімафееўна Фінагенава, масквічка, і зараз жыве ў Маскве, працуе рэдактарам у выдавецтве) каля дзесяці дзён. Як на бомбе жылі. Я іх узяўся праводзіць да лесу... там сябар Авяр'яна чакаў, недзе каня здабылі. Не ведаю чым, але я спадабаўся Авяр'яну, і ён актыўна агітаваў мяне ісці да іх. Прызнаюся, мне і самому вельмі ж хацелася. Я і не думаў, што сярод іх такія прыгожыя дзяўчаты ёсць. Я гатовы быў уцячы, ды баяўся бацькі. Авяр'ян пакінуў мне прозвішча свайго чалавека ў вёсцы Шчорсы. Я стаў жыць адным жаданнем: хутчэй да іх! Раптам арыштавалі Фларыяна. Знайшлі ў яго хаце многа ўзрыўчаткі, аказалася, што ён быў завербаваны агентамі польскай Арміі Краёвай. Па сакрэце сказаў майму бацьку знаёмы паліцыянт, што Фларыян быў сувязны вядомай на ўвесь Лідскі раён банды Панурага. Бацька напалохаўся за маё жыццё: «Чортведама, як там у СД будзе сябе паводзіць Фларыян, калі не вытрымае... успомніць пра радыстку...» Я сказаў бацьку, што магу пайсці да тых партызан, бо ведаю, як іх знайсці, пра нашу дамоўленасць з Авяр'янам сказаў. «Ідзі, сынок»,— сказаў мне бацька. «А ты?» — «Я стары. Мне нічога не зробяць. А табе яшчэ жыць трэба. Кажуць, у Лідзе двух чалавек павесілі. Скажу, пасварыўся з мачахаю, збег да цёткі ў Баранавічы».

Халадэча была. Іду па дарозе, пачую здалёк шум ці ўгледжу машыну, падводу — хаваюся ў лесе, вёскі мінаў. Харчы, якія на дарогу паклалі, з'еў. Ногі ў мазалях, апухлі, паясніцу не разагнуць, шыя баліць... бы торбу з пяском узвалілі. Завёў мяне сувязны ў атрад. Прызнаюся, праз два-тры дні мой ваяўнічы рамантызм як карова языком... Я ўцяміў, што партызанскае жыццё — цяжкая штодзённая праца. Дваццаць кіламетраў у адзін бок на аперацыю ды дваццаць назад, без перадыху і перапынку на абед. Сам ледзь ногі валачэш, а трэба падмяніць таварыша, трэба ношы з раненым несці. Скажу, рэдка я сустракаў у сваім жыцці такога вынослівага хлопца, як Авяр'ян. Я і ростам удаўся і на пяць гадоў маладзей, а ледзь паспяваў за ім. Ён мяне вучыў партызаншчыне. Далі яму пад каманду невялічкі атрад развед-

чыкаў — маладыя ўсе хлопцы, і мяне ён да сябе забраў. Ён ведаў лес, як вопытны ляснік, знаў пароды дрэў, кустоўя, лёгка арыентаваўся ў лесе і часам, не чакаючы парады, сам прымаў рызыкоўныя рашэнні. У нас былі два нямецкія мундзіры. Сам Авяр'ян ведаў не больш як пятнаццаць — дваццаць нямецкіх слоў, але трэба было бачыць яго ў форме фельдфебеля... як ён, устаўляючы гэтыя словы, выцягваў з паліцаяў патрэбную інфармацыю. Хітры і асцярожны быў як чорт. Была цвёрдая ўпэўненасць, што куля яго міне. Усе мы не думалі, што некага заб'юць, маладому не верыцца, што ён памрэ. І я, і астатнія ваявалі з аглядкай, не сунулі нос далей мяжы дазволенага. Яго недалюблівалі за гэткі адчай, бо такія паводзіны і цябе ўцягвалі ў рызыку. Калі адзін закрычаў «ура-а-а!», нейкая сіла прымушае рабіць тое ж і цябе, як бы ты ні ацэньваў свае ўчынкі. Сябравалі яны ўтрох: камандзір партызанскага атрада, Авяр'ян і энкавэдыст са смуглявым тварам. Усе ведалі і бачылі гэта, таму Авяр'яна паважалі, слухаліся і нават пабойваліся. Прыехалі неяк да камандзіра людзі з суседняга лагера ці з кіраўніцтва брыгады. Паўдня пасля той сустрэчы хадзілі пахмурнымі і засяроджанымі энкавэдыст і камандзір. Пад вечар пастроілі атрад і загадалі выйсці наперад Маштылю, якога абвінавацілі ў шпіёнстве. Месца лагера было засакрэчана, уваход і выхад з яго дазваляўся толькі партызанам. Маштыль не меў пісьмовага пропуска ад камандзіра на выхад з лагера. Жонкі, якія прыходзілі часам праведаць сваіх мужыкоў (такіх было небагата), даходзілі да першага паста — ён быў у трохстах метрах ад лагера. Ну, гэта асобная гаворка. Трошкі пра Маштыля. Вярталіся нашы хлопцы з задання, і прысеў на воз Пётр Маштыль: «Хлопцы і я пайду з вамі ў партызаны». Браліся маразы. Пятро быў вельмі лёгка, лічы, палетняму апрануты. Ён пайшоў на хітрыкі, прыкінуўся хворым. Хлопцы на заданне, а ён у зямлянцы сядзіць, хварэе. Вяртаюцца хлопцы, Пятро ім зброю чысціць... так аднаго разу стрэліла ў ягоных руках незнарок вінтоўка... Трэба ж... пацэліў у нагу Палукошка. Камандаванне вырашыла, што стрэл усё ж не быў выпадковы, пасадзілі Пятра ў халодную. Ці нехта з нашых ездзіў у вёску Пятра збіраць весткі аб ім, ці гэтыя людзі з брыгады прывезлі — адным словам, Пятра расстралялі. Суровы час быў... Павёў яго на расстрэл Авяр'ян. Аднойчы Ліхадзей узяў мяне аднаго на сакрэтнае заданне. За сем кіламетраў ад Белагрудка стаяў дыхтоўны, захаваны ад гібельнай сілы часу палац маёнтка пана Батуры, які ўцёк у Лондан на пачатку вайны ў трыццаць дзевятым

годзе. У маёнтку засталася яго маладая жонка (быў ён старэй за яе на пятнаццаць гадоў). Аляксандра Батура, адзіная дачка некалі не беднага шляхціца-беларуса Петраўца. Разам з пані ў маёнтку жылі два яе сыны: васемнаццацігадовы Уладзімір і шаснаццацігадовы сляпы ад нараджэння Казік. Пра ўсё гэта па дарозе да маёнтка і паведаў мне Авяр'ян. Было бачна, што яму прыемна расказваць пра гэтую сям'ю, ён як бы ўспамінаў нешта сваё. Такім я яго ніколі ў атрадзе не бачыў, прызнаўся, што ведае паноў і падпанкаў з маленства, бо яшчэ дзед Авяр'яна, перад тым як пачаў капаць калодзежы, рабіў на сыраварні ў бацькі пана Батуры. Усяго тры кіламетры праз дубовы лес, праз нешырокую ціхую з чорнай вадой рачулку Карчоўка было і да хутара Ліхадзееў. Мяне, прызнаюся, уразіла архітэктура палаца, само месца маёнтка. Двухпавярховы будынак цалкам быў драўляны, зроблены на стагоддзі з рэдкай пароды лесу самшытавага дрэва. Ён быў утульна схаваны старым паркам, які цягнуўся да штучнага возера. Алея была з высачэзных елак, такіх, як і перад Белагрудкам. Возера мы абмінулі, пастаялі мінуты тры ля сыраварні, пільна прыслухоўваліся да кожнага гуку, намагаючыся пачуць галасы ў палацы. Наўкола была ціша. Авяр'ян кінуў снежкай у крайняе акно, праз мінуту кінуў у гэтае ж самае акно зноў снежку — такі быў пароль. Чакалі, пакуль на ганак выйдзе гаспадыня. Правяла нас у вялікі пакой з зашторанымі вокнамі, запаліла фігурную лямпу. «Так позна сёння? Я ўжо і не чакала»,— сказала яна мяккім прыемным голасам. Авяр'ян паводзіў сябе як сапраўдны гаспадар, якому павінны дагаджаць.

— Мой сябар з атрада Мікіта, па мянушцы Баксёр,— на хаду прыдумаў ён мне імя.— Замерзлі мы, як ваўкі. Так што, пані Аляксандра, не адмовімся і ад горкага і гарачага,— гулліва працягваў Авяр'ян, паціраючы руку аб руку.

Мы, не распранаючыся, селі да стала. Аляксандра прынесла яшчэ цёплую бульбу, паставіла на стол бутлю самагонкі, паказала жэстам, каб сын Уладзімір, які стаяў ля дзвярэй, не хваляваўся, ішоў да сябе. Авяр'ян хапіўся разліваць самагонку, наліў у маленькі кілішак і для Аляксандры, які яна толькі прыгубіла. Мы выпілі, з воўчым апетытам паелі ўсе гуркі, сала, капусту. Яна падала Авяр'яну невялічкую пасылачку. «Бач, Мікіта, не даюць нам і дых перавесці, выправоджваюць з хаты».

Прыгожы твар (рэдка я сустракаў такі прыгожы, адухоўлены твар) пані Аляксандры скамянеў ад часовай разгубленасці, адчувалася, што яна пабойваецца Авяр'яна.

«Я падумала, дарога няблізкая. Бальшак занясе снегам»,— як бы ў сваё апраўданне адказала яна. «Дойдзем, не будзем прасіцца нанач, праўда, Мікіта. Утульна тут, цёпла, духамі пахне. І пярына, відаць, у пані мяккая. Ды наша справа мужчынская... Трэба ваяваць. Збірайся, Мікіта, пацягнемся вашэй карміць. Вось пра што хачу сказаць... У Белагрудак прыслалі новага каменданта. Страшэнны бабнік. Не пакідайце фальварак, пакуль мы яго... не прысмірым... І яшчэ... мне стала вядома, што сын ваш... Валодзя...— у даверлівых вачах яе мільганула насцярожанасць, — хадзіў прасіцца ў нацыяналістычную армію самаабароны да Рагулі. Армія гэта ідзе поруч з фашыстамі супраць Савецкай улады. Няхай ён гэтага не робіць. Яму будзе лепш, і вам усім, і нам спакайней. Я двойчы не паўтараю».— «Добра. Я папярэджу сына»,— з доляй непрыязні адказала яна.

Праз некаторы час мы зноў з Авяр'янам выбраліся да фальварка Батуры. Нешта ён месца сабе не знаходзіў, за дзень, два перад дарогай аж гарэў увесь, на ўсіх кідаўся. У атрадзе кончыліся медыкаменты. Ён папрасіўся ў камандзіра пайсці на дзень раней, так яму карцела. Ад сувязнога з Белагрудка ён нешта праведаў. Яго чорныя густыя бровы амаль збегліся на пераносіцы, па дарозе ён не размаўляў. Я прастудзіўся і дрэнна сябе пачуваў: балела галава, уначы кідала ў жар, але ж Авяр'ян быў няўмольны, узяў з сабой. «Там яна дасць табе парашкоў. Усё пройдзе».

Зноў усё паўтарылася, зноў ён кідаў снегам у крайняе акно. На гэты раз мы чакалі даўжэй... Зноў яна павяла нас у вялікую залу да стала, на якім стаяла, што здзівіла Авяр'яна, двухлітровая бутэлька самагону. «У пакоях нікога няма?» — спытаў Авяр'ян і адчыніў дзверы на кухню, у спальню, падняўся па лесвіцы, зазірнуў на другі паверх.

«Там Казік спіць,— папярэдзіла яна спакойным голасам.— Я чакала вас заўтра, як было дамоўлена ў пятніцу. Я не паспела перанесці лякарствы з бальніцы. У мяне толькі ёд. Бінтоў няма»,— пачала яна.

«Пасля пра гэта. Павячэраем спачатку».

Мы паставілі: ён аўтамат, а я карабін у куток ля буфета, распрануліся і селі да стала.

«А ты ж што з намі не пасядзіш?»

Авяр'ян упершыню пры мне назваў яе на «ты». Аляксандра затрывожылася, але села да стала. На гэты раз Авяр'ян наліў ёй самагонкі ў шклянку. Яна моўчкі, каб ён не надакучаў, прыгубіла. Мы выпілі па поўнай шклянцы. Ён першы, я за ім. Я хапіўся малаціць сківіцамі бульбу і сала,

Аўяр'ян есці не стаў, склаў рукі перад сабой на стале, утаропіўся на Аляксандру. «Я думаў, што цябе камендант навучыў піць... Праўда, там жа каньяк французскі, я і забыў. Каўнерыкі белыя, чыстыя. А мы ў кажусе смярдзім...» — «Аўяр'ян...» — як бы просячы за нешта прабачэння, сказала пані. Трэба ведаць Аўяр'яна: ён не прывык быць іншым, самалюбства яго не ведала межаў, ён і напраўду быў адзін з самых смелых і адчайных партызан.

«Ну, расказвай, як там у каменданта... Ці весела было, як гулялася, ну... мы слухаем?» — Ён наліў сабе яшчэ самагонкі і залпам выпіў.

Аляксандра маўчала, апусціла галаву і маўчала.

«У вочы мне глядзі... Я не ўпэўнены... можа, ён акрамя ўсяго такога... завербаваў цябе?»

«Аўяр'ян!» — яна ўпершыню павысіла голас.

«Што, Аўяр'ян? Аўяр'ян прыблудны сабака, быдла, мужыцкая кроў, паскуголіць, паўые ды прыпаўзе сюды... Так? — Ён моцна трымаў яе за руку.— Ці мы ўжо не вартыя павагі і ласкі. Я хачу паглядзець на той танец, які ты падарыла хеўры каменданта. Танцавала на стале? Інакш ён не загадаў бы адвезці цябе ў брычцы пад аховай салдат. Танцавала?»

«Аўяр'ян! Цябе няправільна інфармавалі. Танцавала медсястра Сталіна. Ты памыляешся, Аўяр'ян».

«Я ніколі не памыляюся! Я ж папярэджваў. Чаму ж ты пайшла да яго ў бардэль?»

«Быў дзень нараджэння галоўнага ўрача. Камендант быў у гасцях, а не мы ў яго».

«Я папярэджваў! — тупа гнуў сваё Аўяр'ян.— Пакажы і нам, простым смертным, свае белыя прыгожыя ногі. Танцуй...» — у голасе яго пачуўся суровы загад.

Я перастаў есці, адчуваў сябе няёмка, прыслухоўваючыся да іх сутычкі, мне было сорамна перад Аляксандрай, якую так зневажаў Аўяр'ян.

«Ты п'яны. Праспіся, і мы пагаворым»,— раптам вельмі смела і ўпэўнена сказала жанчына.

«Што-о-о?» — Гэтая незалежнасць пазбавіла яго апошняй кроплі раўнавагі.

«Я вам не жонка, не палюбоўніца і не сястра! Вы не маеце аніякага права зневажаць мяне дзікімі падазрэннямі, дыктаваць мне правілы паводзін. Забірайце лякарствы, пакіньце мой дом. Я перадам камандзіру атрада, каб ён больш ніколі не пасылаў вас сюды на сувязь!»

Можа, каб яна не так прама і рэзка накінулася на яго,

палохаючы камандзірам, усё яшчэ б скончылася мірам, але яе шляхецкая кроў ды панскі гонар узялі сваё. Авяр'ян збялеў увесь, сядзеў нерухома.

«На стол, шлюха!!! Танцуй!» — крыкнуў ён з такой злосцю, аж я напалохаўся, бо здавалася, што ён вось-вось яе застрэліць.

Менавіта ў гэты самы момант рэзка адчыніліся дзверы спальні, адтуль выскачыў сын Уладзімір і наставіў на Авяр'яна карабін. Нешта ўпала на другім паверсе.

«Не смей так размаўляць з маці, хамло! Пакінь наш дом, пакуль я цябе не прыстрэліў, як шалёнага сабаку».

«Уладзімір, маўчы! Маўчы! Богам прашу. Ідзі».

На парозе спальні стаяў яшчэ адзін малады хлопец у зялёнай форме салдата арміі Рагулі. Авяр'ян марудзіў. Справа ў тым, што ні Аляксандра, ні Уладзімір, ні нават я не паспелі заўважыць, калі Авяр'ян паклаў сабе на калена пісталет. Я ведаў гэтую яго пастаянную звычку, дзе б мы ні знаходзіліся: аўтамат, карабін стаялі побач, а на каленях абавязкова ляжаў пісталет. Усё здарылася ў нейкія долі мінуты. Авяр'ян стрэліў, я рвануўся да карабіна і зачапіў рукой лямпу. Аляксандра кінулася да сына і патрапіла пад другую кулю пісталета, бо Авяр'ян страляў у дзвярны праём безупынна. Пакуль я ўскінуў свой карабін, усё было скончана. Авяр'ян стаяў ля забітых з такімі вачыма, нібыта найшло на яго памутненне розуму.

«Трэба ўцякаць. Мажліва, тут засада. Ідзі на ганак. Я зараз». Відаць, ён дастаў на кухні газу і паліў пакой... бо нешта ж надта хутка пачало гарэць. Калі мы адбеглі да сыраварні, ён раптам прыпыніўся.

«Стой! Там сляпы павінны быць. І яе маці на другім паверсе».— І, не чакаючы ад мяне парады, ён пабег назад. Я за ім. У мяне моцна балела нага — ударыў яе аб нешта. Сляпога Казіка мы сустрэлі ў калідоры.

«Не страляйце, не страляйце!» — казаў ён нам, відаць, адчуў прысутнасць людзей.

З дыму вынырнуў Авяр'ян:

«Змоўкні! Хто без зброі, у таго я не страляю. Ты ідзі, Казік, ідзі вось па дарозе да Белагрудка».

«Я баюся, вы стрэліце мне ў спіну».

«Я двойчы не паўтараю. Вось табе мая рука, якую я падаю толькі сябру. Ідзі».

Авяр'ян узяў яго за руку, пацiснуў і вывеў на дарогу.

«А дзе мая маці, брат?»

На секунду Авяр'ян разгубіўся.

«Тут ворагі ўстроілі засаду на нас, на партызан. У перастрэлцы яна і брат забіты. Усё. Ідзі».

«Там бабуля».

«Знаю. Мы яе не зможам ўратаваць. Ідзі і перадай кожнаму, што партызаны адпомсцяць усім, хто будзе дапамагаць і служыць ворагу».

Мы кінуліся наўцёкі ад палаючага палаца.

На паўдарозе я зусім стаміўся. Жылісты Авяр'ян апошнія два кіламетры амаль цягнуў мяне на сабе. Мог акалець, каб не ён. Пасля вызвалення нас разам забралі ў армію, на фронт не паслалі, паехалі ў рэзервны полк пад Маскву. Далей ты сама ведаеш, я ў Баранавічы ў настаўніцкі інстытут два гады яшчэ аддаў, ён — у школу міліцыі.

— Чаму ты раней мне пра гэты выпадак не расказваў? — дакорліва запытала Варвара Якаўлеўна.

— Не ўсё з вайны і хочацца ўспамінаць... Прыемнага мала... Зверху ў памяці перамогі над ворагам... ад іх зарад аптымізму, еднасці людской... а быт у лагеры, вядома, страшэнны. Рады, што выжылі, колькі палягло.

— І ўсё ж мне цікава, чаму ты хаваў ад мяне гэты выпадак? Пра аперацыю з бензасховішчам расказваў, як гарнізон грамілі, як паліцаяў стралялі — пра ўсё часам успамінаў, а вось... Яна табе падабалася, гэтая пані-прыгажуня? — здзівіла сваім пытаннем жонка.

— Ну, як табе сказаць. Не ў такой ступені, каб я закахаўся ў яе. Часу не было. Я яе два-тры разы ўсяго і бачыў. Ад чаго ўзяцца каханню, калі лагічна разважыць? Ліст ад Авяр'яна... Выпадак і ўсплыў у памяці. Вось і ўсё.

— Усё? — перапытала яна, як настаўніца ў вучня.

— Усё! А яшчэ што? — адказаў ён.

— Усё дык усё... І што ж ты цяпер яму за гэта, што ён ўратаваў цябе, абавязаны будзеш усё жыццё?

— Не, канечне... Просіць чалавек... Ён настырны і сам праб'ецца, нехта ж паведаміў яму, што ў нас начальніка забралі ў вобласць? Чыста па-чалавечы, мне трэба падтрымаць яго.

— Падтрымай, калі гэта ў тваіх інтарэсах. Толькі папярэджваю... блізкім сябрам нашай сям'і ён не будзе... я так хачу.

Вярнуліся з двара стомленыя ад гульні дочкі, пакарміла іх, паклала спаць. Сама доўга не магла заснуць...

Ліхадзей прыехаў адзін, пасяліўся ў старэнькай двухпавярховай гасцініцы з вузкімі пакойчыкамі, старой мэбляй і адным тэлефонам у адміністратара-дзяжурнай. Ён

любіў такія маленькія гасцініцы з умывальнікам унізе, з бэзам, акацыямі, язмінам пад вокнамі. Любіў ранічкай, перакінуўшы ручнік цераз плячо, спускацца па рыпучай лесвіцы, доўга і старанна галіўся «апаскай», якую даглядаў, як дзіця — брускі купляў новыя, тачыльныя рамяні мяняў, футляр чысціў. Шмат на яго вяку было такіх гасцініц з сапсаванымі радыёпрыёмнікамі яшчэ даваеннай формы, мармуровымі попельніцамі, графінамі, копіямі карцін Шышкіна, Бялыніцкага-Бірулі, Саўрасава. Паленава на сценах, з кафельнымі грубкамі на калідорах, з карлікавымі пальмамі, папаратнікам у вялікіх драўляных скрынях.

Пятнаццаць гадоў ён не быў у роднай вобласці, калі не лічыць год пяцьдзесят дзевяты, тады ён на два дні выбраўся, каб пахаваць бацьку. Будаваў ён новыя турмы, рамантаваў старыя і вось цяпер з пасады намесніка начальніка міліцыі ехаў саракачатырохгадовым начальнікам аддзела. Той самы энкавэдыст з атрада працаваў у вобласці, з ім ён вёў перапіску і прасіў пасаду дзе-небудзь у Лідзе, Іўі, Белагрудку. «Надакучыла чужына, пацягнула ў родныя мясціны»,— пісаў. Нічога яго не трымала на старым месцы: ні сяброўскія кампаніі за шклянкай гарэлкі з анекдотамі, ні паляванне. Невядомае слова «настальгія» ахутала яго душу пасля сарака. Ён апантана пачаў вышукваць патрэбныя сувязі, успомніў і пра Старадарожца, і пра энкавэдыста, і пра земляка-пісьменніка (трэба ж, выбіўся ў людзі) Антона Антонавіча Шабыльчыка.

Ён хадзіў па дашчаным тратуары расійскага гарадка і казаў жонцы Рэгіне, што вось такія дашчаныя тратуары рабілі і ў Белагрудку. Усё часцей пачаў сніцца яму родны хутар (асабліва пасля смерці бацькі). Лес, рэчачка Карчоўка, велічны Нёман. Рэгіна напачатку пярэчыла, адгаворвала: хутар спарахнеў, колішнія сябры-партызаны (сам жа казаў) аселі ў Карэлічах ці паехалі да Радзюка[1] ў Ліду. А Старадарожац — даводзіў не раз сам — пластылін, амёба. Авяр'яну ўсё ж здавалася, што варта яму будзе пераехаць у Белагрудак, па-новаму здружыцца з Анатолем і пачуццё адзіноты і непрыкаянасці згіне. Дзіўна, але з такім характарам — непасрэднасць, аптымізм, дасціпнасць — ён усё больш і больш адчуваў на душы цяжар адзіноты. А тут, у Белагрудку, і касцёл свой, і царква, і таполі на плошчы, і нават карканне крумкачоў ля універмага, усё сваё. Калі ж атрымаў ліст ад Старадарожца, у якім Анатоль ручаўся,

---

[1] Радзюк — вядомы камандзір партызанскага атрада.

што дапаможа, сну пазбавіўся, так загарэўся пераязджаць, гатовы даць згоду на ўчастковага. Асабліва цягнула яго дахаты, калі ён перабіраў норму спіртнога. Складваў чамадан, пісаў рапарт, сварыўся з жонкаю, званіў на вакзал і цікавіўся білетамі...

— Скажы мне, што гняце так тваю душу? — асцярожна, добразычліва пыталася Рэгіна. За гады сумеснага жыцця яна трошкі вывучыла непастаянны і капрызны нораў мужа, у якога часта мяняўся настрой ад розных прычын.

— Не ведаю,— адказваў ён на цвярозую галаву,— стаміўся, мабыць, я. Воляй лёсу стаў міліцыянерам, турэмшчыкам... марыў калісь пра неба... Хацеў лятаць... Не атрымалася. Чалавек і без таго жыве ў пастаянным нервовым напружанні: кожны дзень нясе ў сабе рэальную магчымасць стаць апошнім, асабліва ў нашай прафесіі — загарэлася гасцініца, наехала машына, забіла маланка, застрэлілі... Жыццё ў нас з зеніту ўзяло на закат. Цягне да зямлі... Іншы раз, відаць, нервы, хочацца ўсё кінуць... от дзе-небудзь у цішы камунгаса ці ў кадрах на цагельні пасядзець. Можа, мне там спакайней будзе. Я ж на магілах бацькі і маці нават крыжа не паставіў. Магілу дзеда і не знайду, мабыць. Давай паедзем. Са сваёй прафесіяй ты нідзе не прападзеш, калі нават мяне і застрэліць злачынец.

— Ціпун табе на язык! Я ж прасіла так ніколі не жартаваць,— незадаволена адказала Рэгіна.

...І вось маёвы Белагрудак у аднастайнай, але такой прыемнай для вока белай квецені сліў, вішань. Няўжо гэта зноў усё з ім і дзеля яго? На душы мо за апошнія дваццаць гадоў паспакайнела. Мажліва, спакой ад таго, што яны разам, што Анатоль Старадарожац пад яго наглядам, прыцэлам... разам неяк будзе надзейней і лягчэй несці далей цяжар той лютаўскай ночы ў маёнтку Аляксандры Батуры. Анатоль падатлівы, будзе маўчаць, бо мусіць маўчаць...

## РАЗДЗЕЛ ЧАЦВЁРТЫ

**...Новая дзеючая асоба... Ганенне...**
**Яшчэ адзін сведка...**

Юрась Міхайлавіч Уладыкін, пра якога далей пойдзе расказ, нарадзіўся за тыдзень да таго вечара, калі згарэў маёнтак пана Батуры. Бацька яго Міхась Уладыкін, рускі чалавек са Смаленшчыны, журналіст па прафесіі, быў

накіраваны ў заходнія вобласці Беларусі адразу пасля вераснёўскага аб'яднання. На пачатку вайны ён, намеснік рэдактара, друкар дзядзька Харытон вывезлі ў баранавіцкія лясы шрыфты, друкарскі станок, тону паперы і схавалі ў лесніка. Праз два гады, калі быў заснаваны партызанскі атрад, і пачала дзейнічаць лясная друкарня Уладыкіна. Пасля ў анкеце ён так і пісаў: два першыя гады вайны хаваўся на хутарах ля вёскі Шастакі ў сям'і хутаранца Царыка, наладжваў сувязі з партызанамі, выконваў ролю сувязнога. Антаніна Царык, будучая маці Юрася, была па сутнасці гаспадыняй хутара, бо яе старыя бацькі не мелі ўжо сілы даглядаць зямлю. Была яна непрыгожая, высокая, худая, з насцярожанымі, праўда, добрымі вачыма. Уладыкін пазнаёміўся з ёй у Казлоўшчыне на агульным сходзе, дзе выступаў і, як талковы агітатар з прыкладамі, канкрэтнымі лічбамі, заклікаў аб'ядноўвацца ў калгасы. Звярнуўся да яе. Яна коратка адказала на яго пытанні, і тады ён адразу знянацку і запытаў: «Вось вы, Антаніна... не з беднай, не з галоднай сям'і — запісаліся б у калгас?» Антаніна цвёрда адказала: «Пайшла б». Пазнаёміліся. Рэгістравалі сына і распісваліся ў адзін дзень — у жніўні сорак чацвёртага.

Запрасілі яго ў рэдакцыю раённай газеты ў Дзятлава, адтуль у пяцідзесятыя гады перавялі рэдактарам раёнкі «Знамя коммунизма», якая выходзіла на рускай мове ў Белагрудку. Антаніна не хацела ехаць у чужы горад, яшчэ дажывалі свой век у Шастаках васьмідзесяцігадовыя бацькі — як іх пакінуць, на каго? Цвёрдай (прыладнай для горада) прафесіі яна не мела (у Дзятлаве рабіла апаратарам на пошце, а што ў Белагрудку, куды там пайсці?). Адзінае, што прымусіла яе згадзіцца і паехаць — любоў да Міхася і жаданне захаваць сям'ю, ёй здавалася, што там, у Белагрудку, слабы здароўем чалавек (у яго выявіўся парок сэрца) не пражыве адзін і паўгода. Дапамаглі і з працай, уладкавалі яе і тут на пошту. «Можа, табе сорамна, што я пасылкі ды бандэролі адпраўляю, Міша, скажы?» — «Не, Тоня... Для таго і рэвалюцыю рабілі, каб усе былі роўнымі і не было прэстыжнай і непрэстыжнай работы».

Так і сына выхоўваў, як жыў і сам: у гуманнасці і міласэрнасці, выхоўваў змалку пачуццё грамадзянскай мужнасці, справядлівасці і доўгу перад бацькаўшчынай. Юрась сам выбраў сабе гістарычны факультэт універсітэта, сам без дапамогі пасля школы паступіў. Сын быў на трэцім курсе,

калі хвароба звяла ў магілу бацьку, які перад смерцю казаў Юрасю: «Шкада, сынок, што не ў нас жыве славуты Бернард... можа, перасадзіў бы і мне сэрца, ды я пажыў бы яшчэ дзесятак гадоў. Але вер, будуць і ў нас, я ўпэўнены. Памятаеш словы Горкага: «Анафемскі талантліва Русь!» Бібліятэку не прадавай, вялікія ўсіх народаў ад Японіі да Бразіліі выхоўваліся на мудрых кнігах чалавецтва; у іх вопыт, папярэджанне, вучоба жыцця і трэніроўка розуму, выхаванне пачуццяў — у іх трэць чалавечай духоўнасці, яшчэ адна трэць ад прыроды і яшчэ адна ад пошукаў бога і ісціны. Не вер, калі табе будуць казаць сытыя цынікі, што гэта бессэнсоўна... сам пошук спасціжэння прыроды чалавека, ісціны існасці жыцця і ёсць духоўнасць. Памятай на ўсё жыццё, духоўная пустата душы абавязкова рана ці позна прывядзе чалавека да трагедыі. Лічы сябе шчаслівым, калі зможаш вольна жыць на віду ва ўсіх».

На ўсё жыццё запалі бацькоўскія словы ў душу. Юрась быў рады свайму размеркаванню — бо ехаў на радзіму, ехаў з маладой каханай жонкай — студэнткай апошняга курса матэматычнага факультэта Палінай Белашапка, у якую закахаўся, калі яна вучылася ў дзесятым класе. Да слова... жонка ехала ў Белагрудак з адной умовай, што будуць жыць з яе маці, а не з яго. Паліна, сталеючы і паступова разумеючы нялёгкую долю жанчыны на свеце, пачала шкадаваць і спачуваць сваёй гаротніцы маці, якая на сціплую зарплату закройшчыцы швейнага атэлье трымала п'яніцу мужа, а пасля яго ранняй смерці змагалася, на жаль, беспаспяхова, за сына Грышу. Паспакайнела, калі ён рабіў на будаўніцтве на Свіцязі. Нарадзілася дзяўчынка. Паліна, як ёй было ні цяжка, паспяхова здала дзяржаўныя экзамены, атрымала дыплом настаўніцы. Юрась любіў дзяцей, яна гэта заўважала ўсё больш і больш, хутка, нягледзячы на маладосць, заслужыў павагу і аўтарытэт сярод настаўнікаў. Бадай, яму аднаму пасля франтальнай абласной праверкі ўсяго раёна не было выказана ніводнай заўвагі. Яго прыкмецілі і ў раённым партыйным апараце, калі Старадарожац стаў другім сакратаром, ён адразу ж забраў Уладыкіна лектарам райкома. Юрась згадзіўся пайсці, бо Анатоль Станіслававіч абяцаў маладой сям'і даць уласную кватэру: мясціцца ў шасці квадратных метрах на Замкавай зрабілася немагчыма. Юрась не быў ахвочы да выпіўкі, а гэтыя начныя канцэрты за сцяной у Грышы, з якім усе стаміліся змагацца, нервавалі ўсю сям'ю і, як лічыў Юрась, маглі аказаць жахлівае ўздзеянне на псіхіку дачушкі. Да

сваёй маці ісці было нязручна. Стары домік, у якім жыла колісь сям'я галоўнага рэдактара, знеслі (будавалі двухпавярховы райком партыі), і паштоваму работніку далі аднапакаёўку ў доўгім шматкватэрным камунальным бараку, які дзесяты год абяцалі капітальна адрамантаваць ці наогул разбурыць, як аварыйны. Юрась пайшоў у райком часова дзеля кватэры, і гэтая часовасць цягнулася тры гады, за якія ён зрабіў добрую сотню выступленняў на розныя тэмы: атэістычныя, палітычныя, контрпрапагандысцкія, партыйныя, акрамя таго, рыхтаваў матэрыялы і пісаў прамовы сакратарам да ўсіх пленумаў і канферэнцый. Галава трашчала ад лічбаў, працэнтаў, тон, кілаграмаў, квадратных метраў, пастаноў, рэзалюцый. Зачасцілі камісіі з праверкамі: інспектары, начальнікі ўпраўленняў, намеснікі начальнікаў з вобласці, ехалі з абкома камсамола і з Міністэрства сельскай гаспадаркі, налятаді з народнага кантролю і з прафсаюзаў. Хто ўсебакова ведае свой раён? Лектар райкома Уладыкін, таму найчасцей суправаджаў, кансультаваў, знаёміў гасцей абласнога і рэспубліканскага рангу Юрась Міхайлавіч, проста Юра. Пасля такіх праверак амаль кожны раз ён вяртаўся апоўначы. Брыдкасловіў, што Паліне страшэнна не падабалася, каторы раз пісаў заяву аб пераводзе ў школу.

— П'янчужкі... прыдумляюць міфічныя праверкі, транжыраць народныя грошы... баб ім пастаўляй, частуй гарэлкай... пераліваюць з пустога ў парожняе... толькі б паперкі былі ў парадку... Каго выхоўваем... фармалістаў, алілуйшчыкаў, ашуканцаў... і ўсім добра, няма вінаватых, усе вінаватыя, а канкрэтна ніхто,— выгаворваўся ён перад жонкай,— не магу болей. Старшыня калгаса «Уперад» наўмысна домік пчалавода збудаваў ля Нёмана... апорны пункт для гасцей... з лазняй, гарэлкай, грыбамі, мёдам. Успомніш маё слова, праз паўгода атрымае калі не Героя, то ордэн... як мінімум. У школе нешта застаецца... вучні... творчасць ёсць... я не магу без творчасці... а тут толькі выконвай, што табе скажуць. Бюракратыя. Ён кантралюе маю партыйную свядомасць, ніякай самастойнасці. Самае жахлівае... не бачу выніку, усім да лямпачкі... народу нецікавыя нашы лозунгі, заклікі, ідэі. Трэба ж нешта з моладдзю ў вёсцы рабіць... уцякаюць. А камсамол рапартуе... Адправілі на БАМ атрад з дваццаці камсамольцаў... тут іх рукі трэба... тут... Ці я нічога не разумею, ці ўсе ўсё разумеюць і маўчаць? Пайду піянерважатым...

— Не ганьбуй мяне. Яшчэ што... Гісторык з першага

верасня пераходзіць у СПТВ... Давай будзем разам прасіць Варвару Якаўлеўну... яна баба-гром... угаворыць Старадарожца, і той адпусціць.

— Давай. Трэба нешта рабіць, пакуль я не ператварыўся ў алкаголіка. Ёсць людзі, якім такая работа падабаецца... Мяне яна загубіць...

Назаўтра Старадарожац і першы сакратар (стары і хворы) выклікалі да сябе, вярталі яго заяву са словамі: «Не пары гарачку. Ты наменклатура. Дзе патрэбен партыі, там і трымаем. Кватэру табе далі без чаргі. Рыхтуем у Вышэйшую партыйную школу. Мясцовы кадр. Яшчэ год — і зробім цябе загадчыкам аддзела агітацыі і прапаганды».

Ён апускаў у адчаі галаву, як бы прызнаючы за сабой нейкую віну... а раптам адбяруць кватэру?

Адну струну ў характары Варвары Якаўлеўны жонка Юрася адшукала. Дырэктарка школы сама не любіла прасіць і выслухоўваць просьбы, таму рэдка ў яе хто што-небудзь прасіў, загадзя ведаючы, што яна адмовіць, спасылаючыся на правілы, нормы, дысцыпліну і графік. Адзінае, што было для яе выключэннем — гэта хвароба. Паліна проста па-жаночы расплакалася ў кабінеце дырэктаркі, апелюючы да яе чалавечнасці і дабрыні. Такі паварот справы прыемна ашаламіў Варвару Якаўлеўну, якая даўно не чула ў свой адрас словы «чалавечная», «добрая», «душэўная». Усхваляваная, яна нават прытуліла да сябе Паліну і цвёрда паабяцала заступіцца, пагаварыць з Анатолем Станіслававічам і загадчыцай райана. Як пасля шкадавала Варвара Якаўлеўна, доўга не магла сабе дараваць гэту дабрадзейнасць.

...Вярнуўся Юрась у школу на свае васемнаццаць гадзін і дзевяноста рублёў.

Жонка прасіла адно: не канфліктаваць з Варварай Якаўлеўнай. Ён даў Паліне слова. Ніколі на педсаветах не выказваў супраць кіраўніцтва ніводнага крытычнага слова.

І вось як бы хтось нябачны сурочыў, усё пайшло ўверх дном і набыло нездаровы рэзананс. Прынялі рашэнне разгледзець паводзіны Юрася Уладыкіна на школьным партыйна-камсамольскім сходзе.

Юрась не пусціў сваю жонку на сход, яна была цяжарная. Ніхто яе па законе не мае права звольніць. Сам ён рыхтаваў сябе да самага горшага. З боку розных людзей чуў ён у свой адрас: дысідэнцтва, антыпедагагічнасць, дыскрэдытацыя звання члена партыі, самы кепскі прыклад і нават антысаветызм. Здарылася вось што...

Ад натхнення і душэўнага ўздыму ў райкоме наўрад ці ўспомнілі б, каму належала гэтая простая і рэдкая ідэя: сустрэць цягнік, у якім вяртаўся ў сталіцу дэпутат Вярхоўнага Савета СССР лаўрэат Ленінскай і Дзяржаўных прэмій, акадэмік, фізік-атамшчык на невялічкай станцыі, што за трыццаць кіламетраў ад Белагрудка. У гэтым, па словах Старадарожца, і ўсенародная любоў, і прыемны сюрпрыз, і аператыўнасць, і павага. Пазванілі ў вобласць, удакладнілі час адбыцця цягніка і атрымалі ў цэлым падтрымку ідэі. У Старадарожца развязаліся рукі — ніхто не бачыў яго такім дзейсным, азораным. Кіраўніцтва ён узяў на сябе, намеснікам прызначыў Ліхадзея. Часу было мала: літаральна суткі. Паднялі на ногі ўсіх. Кожная ўстанова мусіла камандзіраваць у склад раённай дэлегацыі палову свайго калектыву.

У Доме культуры не аказалася ніводнага прыстойнага транспаранта на беларускай мове. Неадкладна паслалі ў Ліду на лакафарбавую фабрыку. Двойчы званіў Старадарожац сакратару гаркома і дырэктару. Прывезлі патрэбныя фарбы. Настаўнікі, якія ўмелі пісаць лозунгі, пяць гадзін пісалі на чырвоных палотнах — іх не хапіла, знялі цёмна-чырвоныя шторы ў ашчаднай касе і Доме культуры — прывітанні: «Усе сілы на выкананне планаў пяцігодкі!», «Рашэнні XXV з'езда ў жыццё!», «Сардэчна вітаем славутага акадэміка на Белагрудскай зямлі!». Аўтарам заклікаў выступіла сама Варвара Якаўлеўна. Дырэктар аўтабазы мусіў зняць шэсць рэйсавых аўтобусаў. Нялёгкая праблема ўзнікла з кветкамі. Добра было б, каб на ўсялякі выпадак былі ў наяўнасці. «А раптам ён угледзіць такую маніфестацыю і загадае на мінуту прыпыніць цягнік?» — выказаў скрытую надзею Анатоль Станіслававіч.

Чырвоныя гваздзікі шукала Варвара Якаўлеўна. У самім горадзе не змаглі знайсці жывыя гваздзікі, абзванілі ўсе калгасы — і там не было. На ноч гледзячы, паехалі ў Любчу да кветкавода-аматара. Даручылі гэтую пачэсную місію выканаць Юрасю. Недзе апоўначы, знерваваны і акачанелы ад холаду, ён прывёз букет кволенькіх гваздзікоў. Усю ноч іх Варвара Якаўлеўна песціла, трымала ў падсаложаннай цёплай вадзе пад ультрафіялетавай лямпай, ледзь не хукала на іх, каб, не дай божа, заўчасна не завялі.

Паўстала пытанне: хто будзе дарыць кветкі, калі цягнік усё ж прыпыніцца на мінуту? Авяр'ян прапанаваў вылучыць ветэрана рэвалюцыі, грамадзянскай і Айчыннай войнаў. Сакратар райкома камсамола ўпарта не згаджалася:

лічыла, што трэба даручыць гэта маладым перадавікам-камсамольцам — гэта паслужыць ім стымулам і памяццю на ўсё далейшае жыццё, яны на ўздыме перагледзяць свае сацыялістычныя абавязацельствы і завершаць квартал датэрмінова на прадпрыемстве.

Анатоль Станіслававіч ведаў, як хацела ўручыць кветкі сама Варвара Якаўлеўна. Баяўся перасудаў, прапанаваў, каб былі гатовы ўручыць кветкі дзеці — вучні першага, другога і трэцяга класаў: ніхто так не ўскалыхне і не ўстрывожыць душу, як дзеці з кветкамі.

Здавалася: усё было прадугледжана, узгоднена і падрыхтавана. Адзінае турбавала Старадарожца: не падвяла б тэхніка, ды не засталіся б кукаваць дзе-небудзь пасярод дарогі. Таму апоўначы ён пазваніў дырэктару аўтабазы і яшчэ раз папрасіў асабіста ўсё пракантраляваць. Варвара Якаўлеўна падняла на ногі ўсю школу — ехалі на свята, якое выпадае (казала так) раз у сто гадоў, усе тэхнічкі, вартаўнік аднаногі Лукаш. Кемлівы, навучаны жыццём Старадарожац даў каманду выехаць на дзве гадзіны раней тэрміну. «Ведаю я парадкі ў нашых людзей. Раскачку. Лепей перастрахавацца, чымсьці пасля ў адчаі ламаць рукі»,— казаў ён Авяр'яну.

«Гэта што? Я помню, як пры Хрушчове сустракалі замежных гасцей з Афрыкі там... з Еўропы... уся Масква, здаецца, на праспект выходзіла».

Шэсць «пазікаў», «Кубанец», «аўтаклуб» Дома культуры, выканкомаўскія «газікі», райкомаўская «Волга» калонай кіраваліся да станцыі: наперадзе «рафік» Авяр'яна. Яшчэ калі садзіліся ў аўтобусы, Варвара Якаўлеўна, піянерважатая і першы сакратар райкома камсамола пільна правяралі: ці ўсе па-святочнаму, парадна апрануты. Некаторых вучняў і маладых рабочых сырзавода упартая і надта сур'ёзная ў гэты дзень Варвара Якаўлеўна адправіла дамоў пераапранацца. Невялічкая, калі не сказаць зусім малая, няўтульная старая пабудова станцыі нагадвала на фоне радкалесся хатку бабы-ягі. Драўляны фінскі домік дазорцы пуці стаяў ля кустоўя за сто метраў ад станцыі. І ўсё... больш ні хат наўкола, ні душы. Сумёты снегу на полі і цёмныя вершаліны елак удалечыні. Дзеці рассыпаліся па завуголлі станцыі нібыта яблыкі, якія высыпаў з торбы непуцёвы гаспадар. Так першыя паўгадзіны было хораша на свежым паветры, нават весела — той-сёй дурыўся, забаўляўся са снегам. Чуўся гарэзлівы дзіцячы смех. А потым усчалася мяцеліца, неба нахмурылася, памацнеў вецер.

Дазорца пуці, відаць, яе папярэдзілі загадзя, празмерна напаліла кафельную грубку. У цеснаце, духаце — можна было ўчадзець. Дзеці пачатковых класаў — чалавек дваццаць пяць — трыццаць пачалі хныкаць. Да цягніка з паважаным госцем заставалася яшчэ паўтары гадзіны. Толькі цяпер Старадарожац зразумеў, што дапусціў памылку, калі загадаў адпраўляцца раней, але не падаваў выгляду, наадварот, падбадзёрваў усіх. Ад чаду адну кволую дзяўчынку (яна павінна была ўручаць кветкі) вымуціла.

— Дайце хоць каманду перайсці дзецям у аўтобус. Тут учадзеюць усе,— настойваў Юрась.

— Вядзі, калі лічыш, што там лепш! — згадзіўся Анатоль Станіслававіч.

Дзеці на дварэ зусім панікл: у некаторых балелі галовы, яны туліліся адно да аднаго, хукалі на рукі, хавалі чырвоныя насы і шчокі ў шалікі. Авяр'ян Паўлавіч (ён аддаў свой кажушок пагрэцца піянерважатай) хадзіў з мегафонам у руках і падбадзёрваў моладзь.

— Так дзела не пайдзёць. Вышэй нос, камсамольцы і піянеры! Я, брат, у вашы гады босым па снезе бегаў... і нічога — выжыў. Загартоўвацца трэба... Ану, давай дружна вакол станцыі і аўтобусаў пяць кругоў. Шагам марш!

Дзеці паслухалі чалавека ў міліцэйскай форме. Да прыбыцця цягніка заставалася гадзіна, калі дзяжурнай паведамілі, што цягнік прыйдзе са спазненнем на сорак мінут.

«І як ёй не холадна?» — дзівілася Варвара Якаўлеўна, гледзячы на жонку Авяр'яна. Рэгіна з трыма хлопцамі зграбала з перона снег. «Ёй спорт, мусіць, дапамагае. Інакш і яна б ціхенька паплыла да старасці. Вырашана, заўтра ж пачну рэгулярна займацца гімнастыкай. Адгадавала жывот, як у цяжарнай. Усё. Заўтра». Колькі разоў яна давала сабе слова заняцца гімнастыкай і так яго і не стрымала ні разу. Яна зайздросціла рухавай, спартыўнай і статнай Рэгіне, якую ніколі, як і сам Авяр'ян, не лічыла прыгожай. «Не, трэба выраўняць свой другі падбародак, зняць жывот... і тады з абаяльнай знешнасцю пры модным адзенні я буду першай дамай горадка. А калі бог дасць і майго Старадарожца выберуць дэпутатам Вярхоўнага Савета рэспублікі, я зраблю ўсё, каб адчынілі мне магазін у падвале Саўміна і абласную базу... Я завалю хату імпартнымі рэчамі».

— Варвара Якаўлеўна, ідзіце да нас на падмогу. Сагрэецеся на славу! — бадзёра клікнула яе Рэгіна.

Аж збялела ад злосці Варвара Якаўлеўна.

«Нахабніца. І не саромеецца. А можа, наадварот... хоча

такім чынам зняважыць? Каб я, дырэктар школы, жонка другога сакратара райкома на віду ў дзяцей, у чужых людзей адграбала снег? Гэта больш як нахабства!»

А цягніка ўсё не было і не было бачна там, ля сасоннiку, куды час ад часу ўглядаліся ўсе.

Гэта надакучлівае чаканне абрыдла не толькі аднаму Юрасю. Паліна была апранута ў лёгкае для зімы шэранькае паліто, на каўнер якога маці нашыла ўжо ношаную чарнабурку. Юрась быў заняты дзецьмі і толькі цяпер заўважыў, як акалела яго жонка. У яе нават не было сілы зняць тонкія ваўняныя рукавіцы. Ён грэў у сваіх далонях яе халодныя рукі, хукаў на іх, выціраў з яе шчакі слязінку. Трываць болей не было сіл. Ніводзін з вадзіцеляў аўтабазы, нягледзячы на яго просьбы і ўгаворы, не згаджаўся без дазволу высокага начальства ехаць у Белагрудак. Юрась закусіў ад адчаю губу. Да прыбыцця цягніка заставалася сорак мінут. Юрась падышоў да Івана Чачыркі — яго аднаго ён ведаў лепш за астатніх.

— Ваня, ніхто не згаджаецца без дазволу Старадарожца адвезці малых дзяцей у Белагрудак. Ты сам бачыш, яны акалелі. Я не магу больш угаворваць гэтых чванлівых і ўпартых кіраўнікоў. Усё бяру на сябе. Выручай, брат.

Іван, насупіўшы бровы, коратка і рашуча адказаў:

— Давай, Юрась, дзяцей... Пра што гаворка, мігам дамчу.

Юрась вывеў з памяшкання станцыі вучняў першых — трэціх класаў, забраў сваю жонку і пасадзіў усіх у «аўтаклуб».

— Жмі, Іван, толькі асцярожна. Іх там як селядцоў у бочцы.

Першы з кіраўніцтва заўважыў, калі паехаў «аўтаклуб», Авяр'ян Паўлавіч (Старадарожац грэў аб грубку рукі), ён падбег да Уладыкіна і працадзіў праз зубы:

— За самавольства ў нас караюць. І мы гэта вам не даруем.

Да прыбыцця цягніка заставалася дваццаць мінут. Страшэнна разгневалася Варвара Якаўлеўна: малыя дзеці звезлі з сабой і такія неабходныя і дарагія для ўсіх кветкі.

— Усім грэцца! Бягом! Бягом! Не стаяць на адным месцы. Засталося, таварышы, якіх-небудзь пятнаццаць мінут,— падбадзёрваў людзей Старадарожац.

Нарэшце паказаўся-такі доўгачаканы цягнік. Усе кінуліся да рэек.

— Трымайце! Трымайце народ! Без панікі! — крычаў

Авяр'ян сваім міліцыянерам. Над натоўпам пранеслася гучнае «ўра-а!». Здаецца, першы выгукнуў яго Старадарожац. Варвара Якаўлеўна паспела знайсці ў дазорцы пыльныя бяссмертнікі, кінула іх у снежную каламуць. Цягнік праляцеў так хутка, што нельга было нават угледзець: хто стаяў ля акон дзевятага, дзесятага вагонаў і ці стаяў той, каго ўсе чакалі з надзеяй, уздымам і хваляваннем. Усё. На пероне зрабілася раптам ціха-ціха, як уначы на могілках. Здавалася, чутно было, як цяжка дыхае Авяр'ян Паўлавіч, які нарэшце, не чакаючы сігналу Старадарожца, крыкнуў:

— Па машынах!

Кінуліся ўсе бягом да аўтобусаў, а дзеці старэйшых класаў загарлапанілі гучнае і радаснае «ўра-а-а!».

...І вось партыйны сход. Юрась загадзя ведаў, што сакратар партыйнай арганізацыі — настаўнік фізікі — стары чалавек, перад пенсіяй, не будзе яго абараняць. Юрась добра быў знаёмы з механікай сходаў, на якіх кожнае выступленне гучала з аглядкай на Варвару Якаўлеўну — па сутнасці яна вызначала дзейнасць партыйнага лідэра школы. Даходзіла да кур'ёзаў: часам адкладвалі, не прымалі пастанову. Варвара Якаўлеўна званіла ў райком, і адтуль ёй дыктавалі «шапку» пастановы, заключныя словы і некаторыя тэзісы. Яшчэ да сходу ўсталявалася цвёрдая думка: трэба асудзіць учынак Уладыкіна як антыпартыйны.

Сход праходзіў сумна. Усе ведалі, што вымовы не мінаваць, а таму дзеля чаго дарма марнаваць час. З лёгкай рукі сакратара асудзілі ўчынак Уладыкіна і разам з тым аднадушна пахвалілі яго, як здольнага гісторыка і добрага настаўніка. На сходзе прысутнічаў інструктар райкома, з якім некалі Юрась працаваў у адным пакоі, і той на працягу ўсяго сходу адводзіў убок вочы: толькі б, не дай бог, не сустрэцца поглядам з Юрасём. Доўга ўсе маўчалі на пытанне сакратара «Якія будуць прапановы?», пакуль сам жа сакратар і не сказаў: «Ёсць думка... даруйце, прапанова вынесці Юрасю Міхайлавічу Уладыкіну вымову». Інструктар апусціў вочы. Гэта заўважылі сакратар і Варвара Якаўлеўна, якую заўсёды запрашалі ў прэзідыум як прадстаўніка адміністрацыі. Сакратар паправіў сам сябе: «З занясеннем ва ўліковую картачку». Юрась маўчаў. Перад сходам настаўнік фізікі так і сказаў: «Дана такая ўстаноўка. Варвара лютуе, сам ведаеш...» «Няма іншых прапаноў?» — перапытаў сакратар. «Няма»,— адказаў нехта так хутка,

быццам баяўся настроіць супраць сябе народ. Усе стаміліся, хуценька прагаласавалі. Сакратар (а ён сам вёў сход) нават не папытаў: хто ўстрымаўся, хто супраць. «Аднагалосна»,— канстатаваў ён.

Разыходзіліся. Сакратар супакойваў: «Усё ў парадку, Юрась, не бярыце да галавы. Праз год знімем». Уладыкін нічога не адказаў — яго ахапіла пачуццё гідкасці, непрыязні і злосці на калег. Так нахабна ніхто і нідзе не зневажаў яго. Дома Паліна прасіла забыць усё, як кашмарны сон, чакаць моўчкі гэты год і, крый божа, не паднімаць бучы, бо будзе яшчэ горш.

— Няўжо ты лічыш мяне вінаватым?

— Не. Табе не даравала Варвара Якаўлеўна тваёй самастойнасці і смеласці. Вось каб з яе дазволу...

— Яна б не дазволіла.

— Не плюй супраць ветру!

— Дык што, ты лічыш, часы праўды і сораму мінулі? Усё? Не-е... любая мая, харошая, ласкавая жоначка... Я ж не змагу жыць далей... Паўната шчасця залежыць і ад таго, наколькі ты сам сябе паважаеш, на якой вышыні жыве ў табе сумленне і гэтае самае пачуццё сораму і праўды! Я чакаць не буду. Я звярнуся ў вышэйшыя ўстановы...

— Пасіўныя ворагі зробяцца актыўнымі — і ўсё.

Болей ён жонку не слухаў, і яна, ведаючы яго прыродную настырнасць і абвостранае пачуццё ўласнай годнасці, змірылася.

Ён напісаў ліст у рэспубліканскую газету «Звязда». Ранкам ваяўнічы пыл яго трохі асеў, ды не знікла рашучасць дзейнічаць, і ён пайшоў параіцца з рэдактарам раёнкі, які адседзеў пры Сталіне дзесяць гадоў і які ўмеў пісаць скаргі. Худы, хворы чалавек з металічнымі ўстаўнымі зубамі толькі развёў рукамі...

— Столькі праблем, браце, паўсюдна выплывае... эканоміка трашчыць, нацыянальны даход падае, нас толькі газ і нафта ратуюць... а так палезлі б у даўгі, як зараз у іх лезуць палякі і венгры... каму ёсць час займацца такой дробяззю, як твая справа. У час маёй маладосці... колькі нас рэпрэсіравалі, сотні тысяч... Колькі скаргаў пісалі... гэта была ўсенародная праблема, закручаная Кагановічам і Берыяй... і што... Пакуль не памёр...

— Я ж не супраць партыі... і яе ЦК. Я супраць райкома, які зацвердзіў вымову на падставе толькі адыёзных фактаў.

— Хто ж, па-твойму, з рэспублікі возьме твой бок, каб

даказаць бездапаможнасць раённага кіраўніцтва? Ды гэта ж іх кадры! Аснова ж пярвічныя партыйныя і раённыя арганізацыі. Паклёп на самога сябе? Гэтае пакаленне яшчэ пад гнётам жаху... Ну, натоліш ты свой гонар — напішаш у Маскву, прыедзе інструктар з Мінска... Цяпер не той час, зразумей, на тваю вымову ніхто не будзе звяртаць аніякай увагі. Ужо сёння ўсе забыліся на цябе... наперадзе сяўба, запчасткі для камбайнаў, планы, планы... паліва для раёна... газіфікацыя ўсяго раёна, алкагалізм... І побач такая дробязь — вымова. Напішы ў парткамісію ЦК рэспублікі. Далі незаслужана, калі шчыра... Я гатоў падпісацца... А фельетон у раёнцы не змагу даць... Усе крытычныя матэрыялы праходзяць праз Старадарожца. Кожны месяц у раёне па тры — пяць вымоў некаму даюць. Гэта жывы працэс развіцця партыі. Нехта прыходзіць, нехта яе пакідае. Аўтарытэт катастрафічна падае.

— Дык вось мая перамога, мая праўда і ўзніме на раённым узроўні яе аўтарытэт!

— Гэта ілюзія. Ты малады і наіўны. Малі бога, што ўсе памякчэлі, падабрэлі... мая гарачка і прага справядлівасці каштавалі мне дзесяці гадоў. Цябе на той час маглі паставіць да сцяны.

— Я гэтага не пакіну,— цвёрда ў канцы гаворкі сказаў Уладыкін.

— Як знаеш. Мая газета ўлады і аўтарытэту не мае. Мне год да пенсіі... і дня не застануся... як сабачка пры двары. Вось што... не пішы ты і ў «Звязду»... Пачні з «Праўды».

Доўга чакаў прыезду сваіх уратавальнікаў Юрась, ды так і не дачакаўся. Замест гэтага яго выклікаў Старадарожац, суха і ветліва запрасіў сесці, сам не падняўся з крэсла і не падаў рукі.

— Не чакаў, Юрась Міхайлавіч, не чакаў ад цябе такога. Мы, можна сказаць, пашкадавалі, абмежаваліся вымовай, пакінулі ў школе... а ты, даруй, слюнявая баба... узяўся парочыць кіраўніцтва раёна, школьны калектыў.

— А... вы ведаеце пра пісьмы? — здагадаўся Юрась.

— Як жа нам не ведаць? Няўжо ты, наіўная душа, падумаў, што на твае лісты-скаргі, скажам так, прышлюць карэспандэнта? Хоць партыя ў нас і багатая, ніякіх сродкаў не хопіць, каб камандзіраваць людзей з цэнтра на праверкі. Вось чаму яно ляжыць на маім стале з рэзалюцыяй: разабрацца і даць аб'ектыўны адказ.

— Як? Я ж на вас скардзіўся?.. Чаму ж так... Антыдэмакратычна...

— Ну, не будзем перагінаць палку. Акрамя нас з табой, вырашаць няма каму. Першы сакратар зноў у лечкамісіі. Падазраюць астму... Не хочаш ты працаваць у школе, не ўжываешся ў калектыве, скажы, мы пашукаем табе новую работу.

Юрась не чакаў пачуць апошнія словы.

— Я люблю сваю работу, люблю школу.

— Дык навошта ж ты яе ганьбіш на ўвесь Саюз, калі любіш,— узвысіў голас Старадарожац.

— Я лічу, што далі мне вымову несправядліва. Гульня амбіцый. Хачу знайсці праўду,— адказаў Юрась.

— Ды што ты, чорт вазьмі, прыліп з гэтай вымовай! Каго яна цікавіць? Што табе яна муляе, грошай меней плацяць, касцюм ад гэтага не так сядзіць? Ды мяне тры старшыні калгасаў за аналагічныя вымовы на руках ад падзякі носяць! Жыві спакойна... прыйдзе час, і знімем. Не трымай камень за пазухай, не крывіся на Варвару Якаўлеўну, яна, дарэчы, была супраць, каб тваю вымову заносілі ва ўліковую картку. Не ўмеем мы паважаць высокае партыйнае кіраўніцтва... анекдоты пахабныя, плёткі... Ніколі такога не было, каб столькі анекдотаў пра Хрушчова і Брэжнева хадзіла. Калі партыя згубіць аўтарытэт, адракуцца ўсе ад улады, ніхто паважаць кіраўнікоў не будзе, а чыстым гаспадарнікам няма часу дбаць пра ўладу. Вазьмі да прыкладу Італію. Колькі гадоў ідзе палітычны крызіс.

— Даруйце мне, Анатоль Станіслававіч, альбо мы не разумеем адзін аднаго, альбо грукаем у адчыненыя дзверы. Я лічу, што знявага мяне, як чалавека, у дадзеным выпадку і падрывае ў цэлым аўтарытэт усёй партыі,— з ранейшай настойлівасцю адказаў Юрась.

— Ёсць людзі, як казалі ў старадаўнія часы, якія, убачыўшы бездань, панікуюць, палохаюцца, а другія думаюць, як бы тут пабудаваць мост. Я хачу, каб быў між намі мост, а не бездань.

Пачуўся мяккі, прыглушаны тэлефонны званок. Старадарожац рыўком, як бы са злосцю і незадаволена, паднёс да вуха трубку. Званіў з рэспубліканскай бальніцы першы сакратар райкома, пра гэта Юрась даведаўся, калі Старадарожац вельмі лагодна і ветліва прывітаўся з ім.

— Слухаю вас уважліва, Ілья Фаміч... Так... Поўным ходам... Восемдзесят пяць працэнтаў... За тыдзень сяўбу завершым паўсюдна. Абяцаю. Так... Не турбуйцеся... Як вы? Што кажуць урачы? Гэта здароўе. З ім не жартуюць. Усё пад маім кантролем. Так. Запісваю... Добра. Усё зро-

бім. Што яшчэ? Можа, нешта перадаць Валянціне Мсціславаўне? Так. Запісваю. Добра. Не турбуйцеся, Ілья Фаміч... Усё зробім. Добра. Жадаю вам хутчэй выздаравець. Дзякую. Да пабачэння. Будзем спадзявацца хуткага.

Старадарожац вярнуўся да гаворкі з Юрасём.

— Я адвёў на цябе дваццаць мінут, ды бачу, што не хопіць і гадзіны. Ты думаеш, райкому апроч тваёй справы няма чым і займацца? Калі б на тваім месцы сядзеў хто іншы — не паверыў бы. Пляваць у калодзеж, выносіць смецце з уласнай хаты... І не сорамна. А яшчэ кіраўнік палітгуртка. У цябе ж фармалізм поўны. Збіраецеся раз у два месяцы... Думаеш, мы не ведаем... Думаеш, людзям з вышэйшай адукацыяй не трэба павышаць свой палітычны ўзровень? Памыляешся.

— Пры чым тут палітзаняткі, Анатоль Станіслававіч? Зніміце з мяне функцыі кіраўніка. Гэта не мае адносін да маёй вымовы.

— Так. Усё, бачу, цябе не пераканаеш... Райком зацвердзіў табе вымову, і мы ад свайго рашэння не адмовімся. Позна. Так я і адкажу ў газету і ў апарат. Не пішы болей нікуды, павер... Усё будзе вяртацца да нас назад... на гэты вось стол. Табе яшчэ доўга жыць і працаваць у Белагрудку. Не настройвай супраць сябе людзей. Я ў твае гады і пікнуць не мог супраць камандзіра.

— Кожны час фарміруе і свае законы, і рэформы, і паводзіны людзей. Наша гора, што мы ўсё ніяк не навучымся вучыцца на памылках іншых.

— Акрамя сумлення ёсць і такія паняцці, як доўг, віна, абавязак жыць для грамадства і яму аддаваць свой талент і сілы,— падкрэсліў Старадарожац.

— Як жа я магу аддаваць усе сілы служэнню грамадству, калі яно вашымі рукамі пазбавіла мяне спакою, сапсавала гармонію сямейнага жыцця. Без гістарычнага, індывідуальнага, дыялектычнага падыходу да кожнай з'явы нават у нашым Белагрудку не будзе ў вас аўтарытэту, кажу вам як гісторык.

— Я хоць і не гісторык, адкажу так... Мне дастаткова для аўтарытэту, што я роўна ў дзевяць нуль-нуль кожны дзень сяджу ў кабінеце, што я кожны месяц праводжу дзесятак нарад, адказваю на сотні званкоў, кантралюю ўсю кадравую палітыку, рыхтую прамовы і выступаю на пленумах, сходах, канферэнцыях, што тройчы на месяц еду ў вобласць, адзін раз у сталіцу на нарады, што кожны вечар прашу ў бога, каб ён даў пагоду, а мы выканалі пастаўкі

ў саюзны, рэспубліканскі, абласны фонды, каб п'яны трактарыст не забіў на дарозе людзей, каб не гарэлі склады і льносушылкі ў калгасах, каб кожны дзень пякарня выпякала хлеб, каб завезлі мінімум мяса ў сталоўкі школы, бальніцы, дзіцячага садзіка. Я, я адзін фактычна цягну ўвесь раён — каторы год хварэе першы! І ніхто не пытае, як я сябе адчуваю, як маё сумленне, якая мая ацэнка падзей, як жывуць і чым жывуць усе сорак тысяч жыхароў раёна. Ніхто!!! Давай, давай, давай... Колькі разоў мяне тыцкалі тварам у гразь на актывах у вобласці, у сталіцы... колькі разоў пагражалі, зневажалі... Я сціскаў зубы і маўчаў... Ехаў дахаты і ў дзевяць нуль-нуль усё пачынаў спачатку. А цябе, бач, адзін раз пакрытыкавалі, дык ты сваю віну і нянавісць гатовы раздуць на ўвесь раён. Крытыканы заўсёды былі і будуць, а наша задача давесці сацыялізм да вышэйшай ступені. Узніміся над абставінамі, вось мая табе апошняя парада, не баламуць ваду, і без таго ўсё трашчыць.

— Дзякую за параду... Але я такі ўжо ўрадзіўся,— не здаваўся Юрась.

— Ідзі,— неяк ціха і абыякава сказаў Старадарожац,— няма больш пра што гаварыць. Толькі ўлічы, што я таксама ўпарты.

На тым і разышліся. Праз два тыдні, калі ў Ліхадзееў святкавалі дзень нараджэння Рэгіны і ўжо добра выпілі, Старадарожац паведаміў усім пра гэту сустрэчу з Юрасём. Сярод запрошаных быў і пракурор Пётр Архіпавіч Рыжы з паслухмянай і непрыкметнай за сталом жонкай. Пракурор смачна прычмокваў і хваліў літаральна ўсё, што стаяла на святочным стале. Рэгіна і жонка пракурора каторы раз нюхалі падарунак — французскія духі, якія недзе раздабыў Авяр'ян па вялікім блаце.

— Няўдзячныя людзі пайшлі цяпер, няўдзячныя,— казаў наўздагон інфармацыі Старадарожца пракурор, выціраючы ручніком тоўстыя бліскучыя ад тлушчу губы.

— Хапае нахабства палохаць сакратара райкома,— не магла змірыцца і Варвара Якаўлеўна,— колькі я зрабіла яму дабра? Паліна яго так кепска пераносіла цяжарнасць. Я ж сама хадзіла падмяняць яе на ўрокі... а яму... задрыпанцу, паўтары стаўкі дала. Дабро не помніць.

— Усё ён помніць,— хацелася выказацца тоўстаму пракурору,— была, ёсць і будзе да пары да часу непрыхаваная нянавісць да людзей, у руках якіх мясцовая ўлада. Калі, дзе, скажыце, у якой краіне любілі суддзю, міліцыя-

нера, пракурора, паліцыянта, жандара, губернатара?.. Ніколі. Альбо баяцца, альбо носяць злосць да пары... як камень за пазухай.

— Гэта точна,— уставіў сваё слова Ліхадзей,— вось паглядзіце, прыйдзе час і за сваю ляноту, п'янства, безадказнасць пачнуць валіць усе грахі на нас, на ўладу. Правільна, Толя, што не пайшоў на капітуляцыю. Трэба прымусіць масу паважаць закон і ўладу, калі не баяцца, як пры Сталіну, дык няхай, чорт вазьмі, адчуваюць адказнасць перад уладай.

Авяр'ян за сталом, у якой бы кампаніі ні даводзілася знаходзіцца, заўсёды адчуваў сябе гаспадаром, браў кіраўніцтва застоллем на сябе: разліваў віно, гарэлку, даручаў тосты, падбадзёрваў жанчын. Хутка ён сышоўся і з новым пракурорам. На дзень нараджэння жонкі Авяр'ян прыхаваў сувенір: магнітафонную стужку з запісамі песень Высоцкага. Стужку гэтую «падарыў» яму адзін камандзіраваны з Мурманска — ён прыязджаў у Белагрудак вербаваць моладзь на будоўлі Поўначы і гульнуў у рэстаране. Ад пятнаццаці сутак ён адкупіўся стужкай.

Было не да песні, не хацелася «травіць» і анекдоты. Дзеці — дочкі Старадарожца і сын Авяр'яна — не дачакаўшыся торта, ухапілі са стала цукерак і пабеглі ў кіно на Фантамаса.

Кіно ў Белагрудку любілі ўсе. А калі адкрылі новы кінатэатр «Авангард» (дарэчы, адзін Уладыкін і быў супраць такой назвы), дык месца-пятачок ля цаглянага ў белым неонавым святле кінатэатра зрабілася самым папулярным у моладзі і падлеткаў. Вечарам тут збіраліся хуліганы з «Ганконга», цагельні і Слабады; курылі, распівалі ў скверыку насупраць таннае віно, уключалі на ўсю вуліцу транзістарныя магнітафоны, гучна рагаталі з дзевак, фарцавалі джынсамі, жавальнымі гумкамі, самаробнымі парнаграфічнымі фотакарткамі. Здараліся сваркі, часта білі адзін аднаму насы. Менавіта сюды найчасцей пад заканчэнне апошняга сеанса пад'язджалі на «рафіку» з міліцыі. Горы паперы, акуркаў штораніцы вымятала з фае-калідора, з ганка раззлаваная прыбіральшчыца кінатэатра. Не прапускалі новых фільмаў — асабліва індыйскіх — і сем'і Ліхадзея і Старадарожца.

Варвара Якаўлеўна прыкмеціла, што Рэгіна і Авяр'ян заўсёды купляюць білеты ў сёмы рад. Рэгіна брала ў кіно акуляры, відаць, таму яны далей не садзіліся. Але ж чаму, які б натоўп не асаджаў утульны кінатэатр, Ліхадзеі сядзяць

на адных і тых жа месцах? Пазней даведалася, што дырэктар кінатэатра, якога прагналі за п'янку з райспажыўсаюза, пакідаў Авяр'яну бронь. І яна, Варвара Якаўлеўна, у той жа дзень, як даведалася, прымусіла і свайго нешта прыдумаць. Так упершыню і назаўсёды ўвайшло ў побыт белагрудчан выслоўе «райкомаўская бронь». Чулі словы гэтыя ад сына Ліхадзея і дачок Старадарожца, ад дзяцей старшыні райвыканкома і пракурора. Віталік Ліхадзей з восьмага класа наўмысна пачаў браць білеты за пяць мінут да пачатку сеанса. Пасля гэтымі словамі «райкомаўская бронь» прыкрываліся касіры Дома культуры, касіры аўтастанцыі, загадчыкі секцый раённага універмага, калі прыязджалі рэдкія артысты столінскай філармоніі, цыганскія ансамблі.

Нарэшце ўпершыню Варвара Якаўлеўна адчула сябе паўнапраўнай гаспадыняй усяго Белагрудка. Яе пазнавалі здалёк, ніхто не прамінаў, наадварот, пераходзілі вуліцу ёй насустрач, цікавіліся здароўем, школай і хвалілі, хвалілі, хвалілі усе... школу, настаўнікаў, паспяховасць вучняў, умелае кіраўніцтва. Загадчыцы аддзелаў універмага ўзялі моду ў канцы кожнага месяца, калі атрымоўвалі з базы Навагрудка новыя тавары, званіць на кватэру Старадарожцу і дакладваць увесь асартымент. Цяпер Варвара Якаўлеўна насіла дарагую імпартную шубу, мела імпартнае дэмісезоннае паліто, дочкам купіла японскія курткі з балонні, добрыя замшавыя чобаты, набыла два дываны і замяніла старую мэблю. З адносным дастаткам, душэўным спакоем і пачуццём уласнай годнасці, якое перарастала ў местачковую фанабэрыю чалавека, які лічыць, што ён ужо мае неабмежаваныя магчымасці і здольны атрымаць усё, што толькі ёсць у раёне, жыла Варвара Якаўлеўна. Мінула яе даўняе колкае пачуццё зайздрасці да статнай Рэгіны. Адно толькі і непакоіла: празмерная самастойнасць, незалежнасць, розум (так, і гэта заўважала) і ўпартая смеласць гісторыка Уладыкіна, які адкрыта мог на педсавеце пакрытыкаваць яе, дырэктара, пазіцыю ці прапанову, мог не выканаць яе даручэнне, калі лічыў, што яно непатрэбнае і наўмыснае. Ігнараваў яе асабістыя заўвагі, меркаванні загадчыка метадкабінета райана. Прымушаў дзяцей шукаць факты і матэрыялы, якіх не было ў падручніках, у бібліятэчных кнігах. Склаў спіс старых і рэдкіх кніг па гісторыі Гродзеншчыны.

Бацькі некаторых дзяцей пратэставалі. Ён без разбору ляпіў усім двойкі, не думаючы пра паспяховасць у класе, пра агульную паспяховасць у школе. І гэта ў той час, калі

патрабавалі паўсюдна ў працэнтных адносінах выправіць становішча з двойкамі, узняць «узровень ведаў у вучняў на якасна новую вышэйшую ступень». І гэта тады, калі ўсе настаўнікі яе школы нейкім чынам выцягвалі двоечнікаў, падганялі іх да «серадняка» і пераводзілі ў наступны клас. Школа каторы год не ведае другагоднікаў. Гэтая «белая варона» са сваім навуковым дыялектычным падыходам да сістэмы навучання хоча наклікаць на школу бяду. Толькі чалавек, які не любіць дзяцей, можа так абыякава і няшчадна сыпаць двойкі, лічыла яна і ўнушала гэтую думку ўсім настаўнікам. Думалася, што пасля вымовы ён прыціхне, стане як усе, дык не! Яна адчувала, што ён пасля ўсяго ўзненавідзеў яе, і таму пачала патроху збіраць усе факты і факцікі, каб яго звольніць. Дочкі яе не мелі схільнасці да дакладных навук, яна іх рыхтавала ў гуманітарыі. Цяпер, калі ён пазабіваў ім галовы «праўдзівай» гісторыяй і перакроіў праграму, яна не ведала, што і рабіць. Гэтыя невясёлыя думкі суправаджалі яе паўсюдна, нават тут, ля святочнага стала.

Рэгіна падала чай і каву з каньяком.

— А па-мойму, Варвара Якаўлеўна, ты перабольшваеш і дарма ўчыняеш ганенні на Уладыкіна. Ты ды і я, мы ўжо судзім па-старому, прэтэнцыёзна. Што б ні казалі; сістэма, метад, а прафесія настаўніка — творчая прафесія. Мы — пакаленне ўсё — метафізікі, дасягнулі трошкі і спыніліся, жывём па напісаным і баімося ўставіць дзе-небудзь свае словы, сваю думку. Помню, яшчэ ў дзяцінстве мы як гімн спявалі: «Ад веку мы спалі, прыйшлі людзі, разбудзілі і сказалі, што трэба рабіць». Складваецца такое ўражанне, што сярод беларусаў не было духоўнасці і ніхто не ведаў, што ж рабіць і як бараніцца ад зла, і як прасвятляць людзей. Мне не сорамна, я прызнаюся, што толькі ад Уладыкіна я ўпершыню пачула пра Рагнеду, Ефрасінню Полацкую, Буднага, Скарыну, Грыгаровіча, Каліноўскага. Паглядзіце на нашых дзяцей — мы робім з іх робатаў, спажыўцоў, а не правацыруем у іх духоўнасць і прагу да творчасці і працы,— выказалася, што было нечакана для Варвары, і Рэгіна.

— Так! Няхай так,— ледзь стрымліваючы тэмперамент, спяшалася адказаць Варвара Якаўлеўна,— я згодна. Можна тварыць і прыўносіць нешта новае, але у рамках сістэмы школы і праграмы. У цябе на ўроках ці левую руку напачатку паднімі ўгару, ці правую — розніцы няма. А ў нас не зменіш час смерці Івана Грознага і не выкрасліш апрычні-

ну, як і не скажаш, што два плюс два — пяць. Так скажу, не народжаны быць настаўнікам — змірыся, пакінь. У дваццаць шэсць можна яшчэ пачаць усё спачатку, нам пасля сарака — позна! Вось ты, Рэгіна, абараняеш яго. Ну, а як ты расцэніш такі факт. Сёмы клас не прынёс макулатуру, ніводзін вучань, акрамя двух актывістаў. Натуральна, раззлаваная класная кіраўніца затрымала іх на гадзіну пасля заняткаў. І я яе разумею. Трэба вышукваць любыя сродкі, каб абуджаць у дзяцей актыўнасць да грамадскіх спраў. Зноў жа толькі Уладыкін на савеце асудзіў учынак класнай як антыпедагагічны, спасылаючыся, між іншым, на цябе, Рэгіна, бо ты ніколі не паставіш у дзённік двойку за тое, што вучань забыў узяць у школу фізкультурную форму, а твой калега Перфудзінаў дысцыплінарнымі двойкамі дабіўся поўнай дысцыпліны.

— Гэтага жывадзёра дзеці баяцца. Ідуць на ўрокі пад прымусам і праклінаюць фізкультуру. Урэшце, я з табой згодна, кожны вучыць, як умее,— вырашыла закончыць доўгую дыскусію Рэгіна.— Мы са сваімі вечнымі праблемамі не дамо людзям і адпачыць.

— Нічога, нічога, было ўсё цікава,— як бы пахваліў іх пракурор.

— Бярыце каву. Нясу пірог.

— Паверце, мне неспакойна на душы, калі ходзіць па калідорах школы чалавек, які адкрыта, я гэта заўважаю, жадае мне нядобрага, зла жадае,— не магла супакоіцца Варвара Якаўлеўна.— І без таго з сучаснымі дзецьмі рэшткі нерваў перагараюць. У дзесятым, не буду казаць хто, адна зацяжарала і мусіць пераходзіць у вячэрнюю.

— Захад. Уздзеянне Захаду, скажу вам,— рэзюмаваў пракурор.

— Сапраўды, Толя, няўжо табе не шкада жонкі, нашых дзяцей,— уставіў сваё і Авяр'ян,— ды знайдзі ты яму работу.

— Будзем шукаць, канечне, нешта ў такой экстрэмальнай сітуацыі рабіць трэба. Адкрываем музей, прапаную яму пайсці туды,— адказаў Старадарожац.

— Не хапае фактаў, каб зняць? — не хацеў згаджацца з пасіўнасцю сябра Авяр'ян.

— Выходзіць, мала. Ён з вымовай колькі шуму падымае, а калі незаконна звольнім, у Маскву паедзе.

— Няхай едзе! Усё адно сюды вернуцца! Не пазнаю цябе, баяцца вераб'я? Праўда будзе на нашым баку заўсёды,— упэўнена адказаў Авяр'ян.

— Хопіць... Нешта прыдумаем. Давай лепш свой сюрпрыз.

— Давай, давай, частуй, калі абяцаў! — падтрымаў і пракурор.

— Я імянінніца і буду кіраваць другой паловай вечара. Авяр'ян, магнітафон на стол. Мой муж дастаў новыя запісы Высоцкага.

— Чорт,— усклікнуў пракурор,— скажу вам, я ў Гродна ў аднаго кагэбэшніка, на таможні робіць, слайды бачыў. Пакажы вам, вочы на лоб палезуць. Французы нічога не саромеюцца, яй-богу, ат, Захад, адным словам. А мы зеленеем ад парнаграфіі.

— Такія, як Уладыкін, сваім выклікам і правацыруюць усіх на разбэшчанасць,— зноў імпульсіўна гнула сваё Варвара Якаўлеўна.

Ёй на гэты раз не далі разгаварыцца... Авяр'ян уключыў магнітафон. Слухалі доўга. Абменьваліся кароткімі рэплікамі, часам Авяр'ян уголас на ўсю кватэру рагатаў. (Рэгіна тады яго штурхала ў бок.) Пілі каву і зноў слухалі некаторыя песні другі раз. Вярнуліся з кіно стомленыя і санлівыя дзеці. Пракурор кляваў носам, часта пазяхаючы. Вечар наблізіўся да мінорнага фіналу.

— Давайце яшчэ паспяваем. Запявай, жана, а мы падхопім. Хто словы ведае якой песні, пачніце... «Песню мира запевает молодежь, молодежь...» — ажывіўся пракурор.

— Позна. І дзеці спаць ляглі,— супакоіў яго Старадарожац.— Заўтра рана на работу ўставаць. Так што дзякуем гаспадарам за хлеб-соль.

— Па пяцьдзесят грамаў каньячку на пасашок! — прыліпаў да ўсіх Авяр'ян.

— Заставайцеся яшчэ,— казала Рэгіна.

Выпілі, пайшлі ў калідор апранацца, яшчэ раз віншуючы імянінніцу.

...Авяр'ян узяўся мыць пасуду. Гарачую ваду (якую давалі толькі на суботу і нядзелю) ужо адключылі. Ён нагрэў на газе каструлю вады. Жонка не спрабавала пярэчыць, бо ведала даўнюю звычку мужа: ён ніколі не клаўся спаць, каб перад тым не памыць пасуду. Дапіў рэшткі каньяку, склаў бутэлькі ў сумку. Сам ніколі не насіў здаваць, рабіў гэта яго шафёр. Праверыў, ці замкнёныя дзверы. Распрануўся, лёг у ложак, жонка спрасоння пасунулася да сцяны. Ён абхапіў яе за талію. Яна зняла яго руку: «Не трэба... Я стамілася. Давай спаць». Ён са словамі: «Ну, добра, добра» — адвярнуўся. Святло ад лямпачкі на слупе (на

якім ён загадаў павесіць сотку) падала на стол, сервант каля акна, на вялікі вазон фікуса. Авяр'ян аж уздрыгнуў ад маланкі-ўспаміну. Менавіта такі малюнак — святло ад лімоннага месяца на фікусе ля серванта з посудам — захавала і моцна трымала ў яго галаве памяць. Так. Божа, як гэта падобна на той самы фікус і сервант у пакоі Аляксандры Батуры! Ён закурыў. Дужа неспакойна стала на сэрцы. Устаў і перасунуў вазон у цень. Зноў лёг. Увесь вечар гаворкі пра школу, Уладыкіна, Высоцкага, плёткі пра жыццё вярхоў у сталіцы — усё гэта разам забылася. Авяр'ян наогул доўга ніколі не трымаў у памяці тое, што не тычылася непасрэдна яго. Зусім не цікавіла яго і гісторыя з Уладыкіным.

Юрася браў адчай. Скаргі, апеляцыі ў рэдакцыю «Настаўніцкай газеты», у ЦК КПБ, у Міністэрства асветы рэспублікі, у ЦК КПСС нязменна вярталіся назад у Белагрудак на бліскучы адпаліраваны стол другога сакратара.

Прыехаў на праверку інспектар з аблана. Тыдзень вывучаў зімовую справу, па некалькі разоў сустракаўся з настаўнікамі-калегамі, высвятляў, якая ж усё-такі была тэмпература паветра ў той дзень і чаму ніхто з тых, хто застаўся, нічога не адмарозіў? Некаторыя настаўнікі — пасіўна яны былі на баку Уладыкіна — перадавалі яму, што інспектар у асноўным збірае ўсё адмоўнае, што тычыцца яго. Юрась хадзіў па Белагрудку, чуючы за спінай і непрыемныя шэпты, і іранічнае «хі-хі».

З часам нават і Паліна змірылася з яго вымовай і слёзна прасіла не нажываць сабе новых ворагаў. Ад пастаяннай нервовай напружанасці ў доме, ад бяссонных начэй, сварак з мужам у яе прапала малако, а паколькі ў магазіне адвеку не вадзілася малочная сумесь «Малютка», то мусілі дамовіцца з карміліцай. Яна жыла ў самым канцы Лідскай вуліцы, гэта далекавата ад іх, Усходняй, але выбару не было. Праўда, у хуткім часе карміліца адмовілася даваць малако; наведала яе з вёскі маці і сказала, што даваць чужым дзецям малако не трэба, маўляў, забіраеш ад свайго дзіцяці шчасце. Карміліца была жанчына набожная, напалохалася. Зноў у сям'і Уладыкіных узрасла паніка. Кароў у Белагрудку не трымалі, як пачаліся тыя налогі на хатнюю жывёлу, усе паздавалі кароў на мяса, толькі ля цагельні жыло некалькі перасяленцаў з хутароў, якія трымалі кароў.

Юрась на золку садзіўся на ровар і гнаў да цагельні, чакаў, пакуль падояць, браў цёплае малако і вёз дахаты. Медсястра дзіцячага аддзялення бальніцы падказала маладым бацькам, каб абавязкова малако ад каровы разбаўлялі вадой, бо ў дзіцяці будзе балець жывоцік.

Якраз у той час прыехаў Грыша Белашапка і ў добрым настроі (зарабілі грошай на шабашцы) павёў Юрася ў рэстаран «хрысціць» пляменніка. Не хацелася Юрасю ісці, але ж, ведаючы настырны нораў шурына, згадзіўся. Па дарозе Грыша прыхапіў з сабой дзве бутэлькі гарэлкі: «Дзешавей будзе, там з нацэнкай».

У невялічкай утульнай зале вячэралі рэдкія камандзіраваныя, збіраліся дзецюкі, разведзеныя жанкі з агромністымі начосамі і мясцовыя фраеры з «Ганконга» і Слабады.

З цагельні госці былі рэдкія — там адкрылі піўбар, і таму моладзь не вылазіла з яго суткамі.

У рэстаране іграў невялікі ансамбль Дома культуры — кларнетыст, баяніст, гітарыст і трамбаніст, якія сядзелі на невялічкай эстрадзе ў сваіх кідкіх вогненна-чырвоных пінжаках. У гэты вечар рэстаран быў перапоўнены, дзверы штурмавалі балельшчыкі мінскага «Дынама», хацелі разам адсвяткаваць перамогу роднай каманды. Няголены швейцар з глыбока пасаджанымі вачыма і каменным выразам на твары з геркулесавай сілай штурхаў натоўп ад дзвярэй.

Грышу ведалі ўсе, бо з кім толькі ён не піў, каго толькі не частаваў. Грыша адкрыта сунуў швейцару пяць рублёў, якія той умомант згроб у кулак і, не перастаючы лаяць астатніх мацернымі словамі, пусціў Грышу з Юрасём у залу. Пазналі Грышу аркестранты, урэзалі некалькі акордаў яго любімай мелодыі, нехта выгукнуў гучнае прывітанне.

Заказалі адзіную фірменную страву — свіную адбіўную катлету са смажанай бульбай. Неяк паступова і неўпрыкмет з куткоў да іх століка падыходзілі рознага ўзросту дзецюкі на падпітку, чокаліся фужэрамі, цалавалі Грышу, лезлі цалавацца і да Юрася. Добра ўжо выпілі, накурыліся да ачмурэння, нагаманіліся да галаўнога болю — час і дахаты збірацца. Завяліся хлопцы з «Ганконга», распачалі бойку з хлопцамі са Слабады. Юрась толкам і не ўгледзеў, з-за чаго ўсё пачалося. Дзяўчат было зусім мала, мо іх не падзялілі. П'яны, узрыўны Грыша пабег некага ратаваць, калі ж Юрась прыгледзеўся да мітуслівага натоўпу, то аказалася, што трэба ратаваць ад частых кулакоў сваяка. Пайшлі ў ход бутэлькі, крэслы. Даўно такога разбою не

бачыў рэстаран пад невядома кім прыдуманай назвай «Юбілейны».

Прыбеглі дружыннікі, праз некалькі мінут пад'ехаў міліцэйскі фургон — у гэтым іх шчасце, бо не пазбегнуць бы Грышу і Юрасю калецтва. Былі часы, калі хадзіў «Ганконг» на Слабаду, Цагельня на Цэнтр, што і жываты паролі, і бакі рэзалі, і зубы выбівалі. Ліхадзей навёў парадак хуценька. Аднаму, другому адпетаму хулігану далі па году прымусовых работ. Пацішэла. Толькі адзін прытон у буфетчыцы аўтастанцыі Зінкі не чапалі. Яна адна доўга карысталася апекай начальніка міліцыі.

Нехта закруціў Юрасю за спіну руку і пацягнуў да выхаду, некалькі разоў ударылі гумаўкамі па спіне і ўвапхнулі ў «чорны воран». КПЗ размяшчалася ў былым саляным складзе. У камеры, куды пасадзілі чалавек восем — дзесяць, пахла блявоцінай, потам і чортведама яшчэ чым.

Праз некаторы час па адным пачалі выклікаць да дзяжурнага. Вярталіся назад (хмель трохі паслаб), казалі, што там білі, нямоцна, але білі. Юрась стаяў у кутку, нервова кусаючы губы, ён не слухаў нікога. Выклікалі яго і павялі па доўгім калідоры ў другі бок. Дзяжурны яшчэ не паспеў скласці пратакол, калі ў пакой увайшоў Авяр'ян Паўлавіч. Яго погляд і Юрася сустрэліся. Ліхадзей рэзка наблізіўся да яго і ўдарыў далонню па шчацэ.

— Настаўнік! Пацан! Як ты можаш ганьбіць Савецкую ўладу?!

Юрась панік, вінавата апусціў вочы долу.

— Ну, няхай яны — падонкі, алкаголікі... А ты... той, хто выхоўвае нашых дзяцей. Так маральна нізка ўпасці.

— Я...— ледзь чутна пачаў Юрась і асекся.

— Маўчы. Закон для ўсіх роўны. Па пятнаццаць сутак прыпаяем усім, дамо і табе, у нас няма выключэння. Усё! — Далей ён звярнуўся да дзяжурнага: — Ранкам пратакол мне на стол і не зацягвайце, як у мінулы раз.

Усю ноч Юрась так і праседзеў у кутку камеры, не спаў ён адзін. «П'яны настаўнік, які да таго ж удзельнічаў у бойцы, прывод у міліцыю, пятнаццаць сутак — гэта ў такім невялікім гарадку выпадак адыёзны. Калі не прагоняць з партыі, з работы звольняць абавязкова,— думаў ён.— Як усё па-дурному склалася. Каму жаліцца, у каго прасіць прабачэння? Трагедыя не ў тым, што робіш памылкі сам, а ў тым, што не ўмееш выкарыстоўваць вопыт памылак іншых. Ці ж я не ведаў нораў Грышы? Гарбатага магіла выправіць. Праўду кажуць, каб зарабіць аўтарытэт,

трэба гады, каб яго страціць, трэба гадзіны. Мала ён мяне, дурня, адзін раз ударыў. Трэба было смальнуць кулаком у лыч, каб юшка пацякла. Божа, а як жа там адна Паліна? Хто ж пятнаццаць сутак будзе вазіць ёй малако?»

Яму хацелася плакаць.

Паліна прыбегла ў міліцыю а першай гадзіне ночы і пра ўсё даведалася. Ранкам яна з грудным сынам на руках і маленькай дачушкай прыйшла да кватэры Варвары Якаўлеўны і са слязамі на вачах прасіла ўратаваць мужа.

Варвара Якаўлеўна яшчэ нічога не ведала, зжалілася, паклікала Анатоля Станіслававіча, і яны пазванілі Авяр'яну.

— Поля, не плач. Супакойся. Віны тваёй няма. Ва ўсім ён вінаваты, адзін. Ёсць бог, хоць я вечная атэістка, гэта ён пакараў яго за скаргі. Сама разумееш, што з такой рэпутацыяй я яго ў школе трымаць не змагу. На пятнаццаць сутак яго не пасадзяць. Гэта мы возьмем на сябе. Ідзі дахаты, а то яшчэ прастудзяцца дзеці. Праз гадзіну Авяр'ян Паўлавіч яго выпусціць.

Варвара Якаўлеўна сама гадавала сваіх блізнят і ведала, што такое хворыя ды яшчэ малыя дзеці.

— Дзякую вам, Варвара Якаўлеўна.

Ці яна, ці Старадарожац угаворвалі Авяр'яна, але Варвара Якаўлеўна сваё слова стрымала. Пад абед, хаваючы вочы ад стрэчных і ўгнуўшы галаву ў каўнер плашча, Юрась з бледным тварам і дрыготкімі губамі пераступіў парог сваёй аднапакаёўкі на Усходняй. Ён не асуджаў учынак жонкі ў той дзень, а пасля ўсё часцей думаў: «Навошта яна пайшла? Жыць, хадзіць побач, сустракацца і ведаць, што ты ім абавязаны, што яны, бач, моцныя свету гэтага, даравалі табе волю! Адседзеў бы спакойна... душа была б чыстай. Ці ж не вучыў я яе, што лепш адмовіцца ад неабходнага, чымсьці прасіць у недастойнага. Трэба нешта шукаць, з'язджаць адсюль. У Казлоўшчыну, у Мір. У Казлоўшчыне добрае сельскагаспадарчае вучылішча. Выхавацелем пайду ў інтэрнат».

Перабраў ён усё. Была, праўда, яшчэ надзея на музей. Дырэктарам зацвердзілі жонку новага дырэктара лясгаса Канавалава, заставалася месца навуковага супрацоўніка. Месяц хадзіў без работы, пісаў у газеты замалёўкі пра першых ударнікаў камуністычнай працы. Галоўны рэдактар згадзіўся іх друкаваць з адной умовай, каб ішлі пад псеўданімам. Юрась не пярэчыў. Калі ж пачаў атрымліваць

ганарар па рублю, па восемдзесят капеек, па паўтара рубля — кінуў гэту марную справу. Трохі грашыма дапамагала маці, купляла на базары яйкі, мяса, несла ім на кватэру. Аднаго разу ад бездапаможнасці і абыякавасці ўсіх да яго душэўнага стану заблыталася ў яго галаве вар'яцкая думка пра самагубства. Было такое пачуццё, што ён нікому не патрэбны, што ўсе разам, і сябры і ворагі, адвярнуліся ад яго.

«Які ж наш брат, беларус, асцярожны, перастрахоўшчык,— казаў ён Паліне.— Гордасць, незалежнасць, самастойнасць думкі, цікавасць да лёсу гарадка, сваёй гісторыі — як гэта ўсё далёка ад нас яшчэ... I якія мы блізкія да бяспамяцтва і татальнай грамадзянскай абыякавасці». Ніхто з настаўнікаў за гэты час так і не наведаўся да іх, не памог матэрыяльна. Паліна маўчала, разумела яго пакуты. Юрась за кожным яе рэдкім словам, знерваваным жэстам бачыў нямы дакор і просьбу: «Не ўпарціся, ідзі да Старадарожца і прасі работу».

Грыша прыкасцюміўся, угаварыў Юрася пайсці выпіць піва, у буфеце аўтастанцыі дабавілі віна. Упоўз у кватэру апоўначы. Паліна не вытрымала, выпхнула сілком у плечы брата і ўсыпала Юрасю. Увесь дзень не размаўлялі. Юрась паабяцаў жонцы, што болей падобнага ніколі не паўторыцца і з агромністай цяжкасцю, пераадольваючы ўласную ганарлівасць, пайшоў да Старадарожца. У калідоры райкома яго напаткала дырэктарка музея, як яна сябе называла «беларуская сібірачка» Марыя Ануфрыеўна, і з добрымі намерамі і адкрытай душой сказала:

— Уладыкін, а мы пра вас толькі што гаварылі з другім сакратаром. Не здагадваецеся, наконт чаго?

— Не,— адказаў ён.

— Наконт работы. Ідзіце да мяне ў музей навуковым супрацоўнікам. Абяцаю, будзе па-творчаму цікава. Нарэшце выканком выдзеліў нам памяшканне. Правядуць рамонт, і адкрыемся, а пакуль пасядзім у бібліятэцы. Згаджайцеся... работы непачаты край, і якой работы... Найцікавейшай! Нашы людзі тут (яму спадабалася, што яна не ўжыла слова «вашы») і не ўяўляюць, якім багаццем валодаюць. Я наведала музей Міцкевіча ў Навагрудку, Урублеўскага ў Жалудку, была ў цудоўным школьным музеі вёскі Валёўка, дарэчы, цікавейшы энтузіяст музейнай справы там гісторык, як і вы, Урбановіч. У Шчучыне ў школе цудоўны куток сучаснай гісторыі і вайсковай часці. I толькі ў нас тут забыты богам і людзьмі край. Як бы саромеемся сваёй

гісторыі. Наш музей, паверце, будзе не горшы. Далёкую гісторыю аднавіць будзе цяжка, я згодна, але ж адна вайна — багацейшы матэрыял. Яшчэ жыве чалавек Карп Міранчук, матрос легендарнай «Аўроры» — ну, як?!

Выбару не было, ён нават не пытаўся, якія там грошы, бо ў глыбіні душы ўжо даў згоду, калі там нават будзе трыццаць рублёў.

— За свае трыццаць гадоў музейнай справы я ў Сібіры тры раённых музеі заснавала. Галоўнае пачаць, паверце. Пасля людзі самі нам будуць дапамагаць, галоўнае, абудзіць у іх духоўнасць, любоў да гісторыі.

Марыя Ануфрыеўна, пачуўшы яго згоду, шчыра ўзрадавалася і сама амаль за руку пацягнула да другога сакратара, трэці сакратар мякка і тактоўна навязваў ёй у супрацоўнікі свайго чалавека, яна гэта ведала. Пасядзелі ў прыёмнай, чакалі, пакуль сакратар вызваліцца... Праз мінут дваццаць Старадарожац выйшаў у суправаджэнні яшчэ трох невядомых Юрасю людзей. Быў у яго добры настрой. Шырокім жэстам ён запрасіў іх да сябе, выслухаў Марыю Ануфрыеўну і ў іх прысутнасці пазваніў трэцяму, потым загадчыку аддзела культуры. Усмешка не пакідала яго твар. Ён пажадаў шчаслівай работы і абаім пацiснуў рукі.

Так пачалося для сям'і Уладыкіных больш весялейшае жыццё. Паступова Юрась уцягваўся ў новую работу. Умоўна, з гаварлівай і добразычлівай Марыяй Ануфрыеўнай яны падзялілі яе так: Вялікую Айчынную вайну і сённяшні дзень Белагрудчыны вёў ён, а яна — рэвалюцыю і 20—30-я гады.

Уладыкін з натхненнем узяўся збіраць матэрыялы. Асобны невялічкі закутак з акном аддалі пад стэнды для гісторыі партызанскага атрада «Народныя мсціўцы».

Прачуўшы пра такі размах, з якім узяўся за справу Уладыкін, Варвара Якаўлеўна праз вучняў восьмага класа (яны ўваходзілі ў члены савета музея атрада «Следапыты») перадала для экспазіцыі асабістыя рэчы мужа: складны сцізорык, медаль, жоўта-зялёны кіцель, фота Анатоля Станіслававіча ў год перамогі.

Авяр'ян Паўлавіч не застаўся ўбаку, перадаў старую партупею, кішэнны (дзедаў) гадзіннік і фота пачатку пяцідзесятых гадоў. Юныя следапыты засыпалі лістамі архівы вобласці, суседніх раёнаў, шукалі адрасы былых партызан, прасілі копіі дакументаў, у якіх было хоць самае нязначнае ўпамінанне пра Белагрудчыну.

Мінуў год... Беручы прыклад са старэйшых таварышаў

па партыі, многія хіліліся запісваць і свае мемуары. Рэдакцыі сталіц вярталі іх, раілі здаваць у мясцовыя музеі, партыйныя кабінеты.

Юрась чытаў усё вельмі ўважліва, хоць, што грэх утойваць, часам чытаў як бы пад прымусам, нешта для сябе занатоўваў, выпісваў, узгадняў з аўтарамі, прасіў фота і пасылаў запыты ў рэспубліканскі музей Вялікай Айчыннай вайны.

Трапляліся абсалютна розныя апісанні адных і тых жа падзей. У такіх мемуарах-успамінах, лістах на яго імя некалькі разоў траплялася Уладыкіну адно і тое ж прозвішча — пані Аляксандры Батуры. Нехта згадваў іх маёнтак, некага яна ратавала ад хваробы, нехта ўспамінаў сыраварню, дарогу да хутароў, сувязь самой пані з партызанамі, з немцамі...

Усё больш і больш таямнічая дакторка — з аднаго боку партызанскі сувязны, памочнік, з другога правакатар — забірала яго ўвагу.

Нешта было ў гэтай справе наблытана, недагаворана, скажона, схавана. А такім ужо ўрадзіўся Юрась, што не мог прайсці міма гэтай забытай часам таямнічай гісторыі пані Аляксандры Батуры.

...Самы час цяпер вярнуцца да таго, хто ўцёк з магілёўскай турмы, да Івана Чачыркі, таго самага, які сябраваў з Грышам Белашапкам і які піў за здароўе маладых Юрася і Паліны на сціплым вечары-вяселлі.

Удаўся за ўсю гнілую зіму сонечны з лёгкім прыемным маразам суботні дзень. Другі тыдзень хаваўся Іван на кватэры ў брата турэмнага бібліятэкара. Той, праўда, не праганяў, але ж як чалавек, які вёў гуллівае жыццё халасцяка і які любіў выпіўку і жаночыя кампаніі, мог дзе-небудзь і прагаварыцца. Адна дзяўчына, сяброўка навагрудскага донжуана, працавала афіцыянткай у санаторыі-пансіянаце «Свіцязь», і дзякуючы ёй Іван унёс карэктывы ў свой план, бо даведаўся, што на выхадныя дні прыязджаюць папарыцца ў лазні пансіяната, адпачыць і кіраўнікі з Белагрудка. Бывае, прывозяць з сабой у міліцэйскім «газіку» жанчын. Кіруе такімі выязнымі кампаніямі чалавек з рэдкім імем Авяр'ян Паўлавіч. Яна апісала яго знешні выгляд. Іван і не сумняваўся — гэта быў Ліхадзей.

Рэгіна, яна даўно не давярала мужу, аднойчы пагартала яго святую святых — запісную кніжку і здзівілася

нумарам тэлефонаў, супраць якіх стаяла адно і тое ж слова: «участковы», «участковы вёскі Д.», «участковы вёсак В., Г., О.». Не магла яна ведаць, што пад імем участковых былі пазначаны Авяр'янам яго надзейныя добрыя знаёмыя кабеты розных узростаў, якія любілі і выпіць і пагуляць, большасць з іх былі разведзеныя, некаторыя займалі адказныя кіруючыя пасады. Рэгіне было непрыемна чуць любімую прыказку Авяр'яна, якую ён не саромеўся пры ёй сказаць ў любой кампаніі: «Чужая жонка мёдам мазана, а свая смалою».

Быў у яго спіс прастытутак раёна. Толькі аднаго разу ён і прыводзіў іх у флігель на другі паверх пансіяната. Жанчыны напіліся ды і пабіліся між сабою...

Іван чакаў прыезду гасцей, сціскаючы ў кішэні цяжкі алавяны кастэт. Чакаў гадзіны са тры. Усяго адна машына «Запарожац» збочыла ў напрамку да пансіяната. Здзівіла, што за рулём «Запарожца» была жанчына.

Чачырка усё хадзіў між дрэў ля шашы, адчуваючы, што мароз з лёгкім ветрыкам і не такі ўжо прыемны. Добра, што абуў старыя валёнкі замест сваіх кірзачоў.

Час цягнуўся марудна. Нарэшце на горцы паказаліся два «газікі» і «Волга». Сэрца ў Івана закалацілася, ён схаваўся за дрэвы, крадком цікуючы за машынамі, якія збочылі да пансіяната. За рулём аднаго «газіка» ён пазнаў Авяр'яна. Жарам пыхнула ў твар, ногі не хацелі слухацца, нейкі час ён стаяў нерухома, а потым бягом, напрасткі пусціўся да пансіяната. Усё здавалася, што не паспее ўгледзець, калі будуць выходзіць з машын жанчыны. «Божа, зрабі, каб сярод іх не было Веры!»

Ён гатовы быў забіць іх разам на месцы, калі яны апынуцца побач. Жанчын ён бачыў са спіны. Доўгай касы ні ў адной з іх не было. Трохі ад сэрца адлягло, але трывога не праходзіла.

Іван абмінуў «Запарожац», які стаяў недалёка ад лазні, і падаўся бліжэй да флігеля. Трэба было яшчэ чакаць, пакуль госці не пойдуць у лазню. Хутка кампанія ў добрым настроі высыпала на двор. Цяпер ён бачыў усіх добра. Веры сярод вясёлых людзей не было. Прамільгнула думка, а раптам яна засталася там, у пакоі на другім паверсе. Раўнівае сэрца здольна на фантазію. Ён прыцягнуў драбіны, якія стаялі ля дрэва, падняўся да акна — нікога, перанёс драбіны на другі бок, да другога акна, і там пуста. На душы паспакайнела. Упершыню заўважыў, як калоцяцца яго рукі. Іван хацеў абагнуць лазню і выйсці на сцежку, аднак у

гэты момант з «Запарожца» выйшаў чалавек у чорных акулярах і з дапамогай тонкага кіёчка, як гэта робяць сляпыя людзі, рушыў у бок лазні, насустрач Івану. Чачырка не рызыкнуў выходзіць да сляпога, бо за ім назірала жанчына, якая выйшла з «Запарожца» і працірала, як падалося, для блізіру лабавое шкло.

Іван прытуліўся да сцяны і вырашыў перачакаць. Яго трывога нарастала. Здалося падазроным: чаму сляпы прыпыніўся ля дрэва, насупраць лазні, і там стаіць, як бы чакаючы некага. Дзверы лазні адчыніліся, і ў адных сподніках, босы і голы па пояс, выбег на пухкі іскрысты снег Авяр'ян і пачаў ім, вокаючы і ахаючы, абціracца.

— Авяр'ян! — нечакана паклікаў сляпы і сам зрабіў некалькі крокаў да яго.

Ліхадзей здзівіўся, выпраміўся, выцер з твару снег. Сляпы стаяў побач і працягваў яму руку.

— Здароў, Авяр'ян!

Як заварожаны, Авяр'ян падаў сляпому руку, якую той моцна сціснуў сваёй шырокай далонню.

— Не пазнаеш, Авяр'ян? — дрыготкім голасам, не выпускаючы рукі, пытаў сляпы.

— Казік? — ледзь здолеў выцiснуць з сябе Авяр'ян.

— Я! — адказаў сляпы і прыставіў нечакана да грудзей Ліхадзея дула пісталета.

— Доўга я цябе шукаў, пакуль высачыў.

— Пачакай, Казік, не страляй! Так... я чакаў цябе, усё жыццё чакаў... ведаў, што ты знойдзеш мяне... Ніколі не сумняваўся... баяўся... Пачакай, не страляй... Столькі год мінула... Усё забылася... У мяне сям'я, сын... Я, можна сказаць, толькі зараз пачынаю ўпоўную жыць. Я малады быў, гарачы, дурны... Вайна... Малю... дай мне магчымасць... я гатоў рукі табе цалаваць... падары мне жыццё... яно і без таго кароткае... Я каюся, горкімі слязамі каюся...

— Позна. Такое не даруюць,— сурова адказаў Казік і націснуў на курок, але стрэлу не пачулася. Авяр'ян ёмкім прыёмам выбіў пісталет у Казіка, але той паспеў учапіцца рукамі за яго горла, абодва яны ўпалі на снег: адзін — абараняючыся і намагаючыся вызваліцца, другі, наадварот, усім целам навальваючыся. Авяр'ян намацаў у снезе Казікаў пісталет, падхапіў яго і ўдарыў Казіка па галаве, той адкінуўся, і цяпер ужо Авяр'ян прыцiскаў сляпога да зямлі.

Усё гэта адбывалася за тры метры ад Івана. Невядома, якое пачуццё падштурхнула Чачырку да дзеяння. Іван кастэтам ударыў Авяр'яна па галаве, сцягнуў яго і штурх-

нуў у снег. Падаючы, Ліхадзей ударыўся галавой аб кучу камення і страціў прытомнасць. Да іх падбегла жанчына.

— Казік? Жывы? Слава богу, у машыну хутчэй! Памажыце мне, добры чалавек,— звярнулая яна да Івана.

Чачырка падхапіў Казіка з акрываўленай галавой, і яны подбегам рушылі да машыны. Паехалі ў бок Карэлічаў. Сам не ведаючы чаму, Іван паехаў з імі.

Пачынала цямнець, калі прыехалі ў вёску Вароны. Усю дарогу сляпы маўчаў, толькі зрэдку ад болю ціха стагнаў.

У хаце з двух пакояў на стары сялянскі лад, з абразамі, было чыста. Мэбля дажывала свой век. Кінулася ў вочы вялікая лямпачка без абажура.

Ядзя, так назваў жанчыну сляпы, хуценька, не прапаноўваючы Івану сесці, абмыла Казіку рану на галаве, дастала ёд, бінт і з дапамогай Івана перавязала.

Упершыню ў жыцці Іван так блізка бачыў сляпыя вочы з малюсенькімі прарэзамі, якія, здавалася, зліпліся.

— Сляпы быў ад нараджэння. Я яго вазіла ў Адэсу два гады таму на аперацыю. Правым вокам зараз ён ледзьледзь бачыць. І за гэта богу век дзякаваць будзем.

Казік узняў галаву, павярнуўся да Івана і падаў руку.

— Казік Батура.

— Іван Чачырка з Белагрудка.

— Гэта мая жонка Ядзя.

— Іван ўратаваў цябе,— сказала Ядзя.

— Ведаю. Дзякую, Іван. Шкада толькі, што я не забіў гэтага шакала... шкада... Цяпер ён будзе асцярожны...

— Значыць, не лёс. Так, значыць, угодна богу. Мыйце рукі, будзем вячэраць,— увішная Ядзя накіравалася да шкафчыка, дастала бутэльку самагонкі.

— Самі не гонім. Ад вяселляў застаецца. Мы з Казікам іграем на вяселлях. Ён на акардэоне, а я на бубне. А вы хто ж будзеце? — на жаўтлявым твары Ядзі пад вачамі, як угледзеў Іван, былі ацёкі, нібыта ў чалавека, хворага на ныркі.

— Не стану таіцца... розныя шляхі прывялі нас на сустрэчу з Авяр'янам... прызнаюся, я збег з турмы з адной мэтай — адпомсціць крыўдзіцелю, бо меў дадзеныя, што ён спакусіў маю жонку і яе возіць на пікнікі ў «Свіцязь». Дзякуй богу, памыліўся. Спяшацца мне пакуль што няма куды...

— Жывіце ў нас, колькі вам трэба. Мы адны жывём, без дзяцей.

— Дзякую. Дзень, два пабуду. Да жонкі мне трэба ў Белагрудак... дабравольна здамся... менш накінуць.

І Чачырка няспешна, з перакурам, падрабязна, нібыта адкрываўся самым блізкім людзям, расказаў сваю гісторыю.

Усхваляваны расказам Івана, Казік устаўляў слова «падонкі» разоў дзесяць. Узбуджаны, ён памкнуўся адкрыць і свой даўні боль, але Ядзя злёгку штубнула яго ў бок, маўляў, маўчы.

— Чаго ты штубаеш? Мне няма каго баяцца... Няхай ведае ўвесь белы свет. Я сваё аджываю, слабею... Мне не ўдалося забіць гэтага сабаку, няхай сумленныя людзі, а яны ёсць у народзе заўсёды, у любы час, даведаўшыся пра ўсё, зганьбяць яго імя... Гэта таксама кара. Паслухай, чалавеча, і маю жытку. Налі нам, Ядзя, яшчэ па сто грамаў. Вып'ем. Цяпер слухай. Недалёка адсюль, якіх-небудзь паўсотні кіламетраў, быў калісь ладны маёнтак пана Батуры, майго дзеда па маці. Сам пан, мой бацька, быў каталік, паляк, а маці з беларусаў. Мелі зямлю і сваю сыраварню, якая славілася на ўсю Еўропу. Адным словам, заможна жылі, не так, як сённяшні люд, гне спіну за капейку. У нас арандатар у пяць разоў больш атрымліваў. Дык вось так... Былі ў пані два сыны. Адзін ад нараджэння быў калека. Яшчэ жыла старая бабуля, маці пана. Адно слова жыла, пакутавала... Паралізавала яе. Усе чакалі яе смерці, ды бог даў ёй моцнае сэрца, яно і трымала старую. Жонку пана Аляксандру паважалі і местачкоўцы з Белагрудка і сяляне-хутаранцы. Была яна лекарам. Усё добра было, можна сказаць, толькі адзін сын рос калекам. Дактары казалі, што з часам можна будзе зрабіць аперацыю...

Наляцела вайна. Праз семнаццаць дзён прыйшлі Саветы. Пан уцёк на Захад, а пані дакторка засталася ў маёнтку адна, не пакінула старую паралізаваную жанчыну і сыноў — аднаму з іх было пятнаццаць, другому чатырнаццаць гадоў. Вайна як вайна, у кожным месцы яна розная: на фронце адна, у тыле іншая, пад акупацыяй сваё. Першыя гады было ціха. Потым аб'явіліся партызаны. Пані Аляксандра не выбірала... Прыйшлі і сказалі, каб ім дапамагала... і яна згадзілася. Давала партызанам старую адзежу, абутак, сыр... быў трохі запас, а найбольш бінты, ёд, таблеткі, парашкі.

Асабліва часта і толькі сярод ночы прыходзілі ў маёнтак двое партызан — сувязныя Цыган і Баксёр — мянушкі такія. Наглаватыя былі... мы іх усе баяліся... паводзілі сябе і распараджаліся як дома. Патрабавалі, вымагалі самагонку. Дзе той самагонкі ўзяць... Пані разбаўляла вадой

альбо сокам вішні спірт і загадзя да іх прыходу рыхтавала літровы графінчык. Пасля перадавала ім не толькі медыкаменты, а і звесткі пра немцаў у Белагрудку. Там стаяў вялікі гарнізон. Не адзін раз старэйшы брат абураўся такімі нахабнымі паводзінамі гэтых сувязных партызан. На яго альбо прыкрыквалі, альбо выпіхвалі ў плечы з пакоя. У канцы сорак трэцяга года, калі яму споўнілася васемнаццаць гадоў, ён — маці была страшэнна супраць — уступіў у войска самаабароны. А ў пачатку сорак чацвёртага партызаны пасмялелі. Да іх пачалі прымазвацца ўсе, хто яшчэ два гады таму і нос у лес баяўся сунуць. Немец бачыць, што справы-дрэнь, пачаў лютаваць... зразумеў, што не адолець яму Расію. Партызаны са свайго боку ажываліся. Пачалі нападаць на гарнізоны. Пані баялася, бо яны ж папярэджвалі, каб сын не смеў браць у рукі зброю. Клаліся спаць рана, не запальвалі лямпы, вячэралі на кухні. Пачалі падазраваць пані і немцы, аднаго разу пакінулі засаду з трох чалавек, але ўсё абышлося.

Партызаны навучыліся за два гады ваяваць ды і сваіх сувязных мелі ў Белагрудку.

Аднаго разу партызаны прыйшлі галодныя, злыя... Яны наогул ніколі не прыходзілі ў добрым настроі, але тыя разы такая-сякая павага да гаспадыні маёнтка была. На гэты раз па ўсім было бачна, што нешта мусіць адбыцца. Цыган — тады сапраўднага імя ніхто не ведаў, быў гарачы, як напаленая грубка,— дакраніся — апячэ. Усё ім было не так, кожнае слова пані ўспрымалі ў штыкі, быў такі адкрыты нахабны здзек з жанчыны. Патрабавалі зноў самагонкі і, п'яныя, пачалі абвінавачваць пані ў сувязі з нямецкім камендантам, сына яе — у здрадзе, пачалі адкрыта пагражаць, забыліся, што ім трэба атабарыцца. Старэйшы сын, ён быў у гэты час у хаце і хаваўся ў суседнім пакоі, не вытрымаў, выскачыў і запатрабаваў, каб яны не здзекаваліся з маці, папрасілі ў яе прабачэння і пакінулі маёнтак. І вось тады Цыган...— Казік быццам спатыкнуўся, з цяжкасцю вымаўляючы словы.— І вось тады Цыган нечакана стрэліў у сына пані... забіў яго... Яна не вытрымала... кінулася на забойцу...

Далей Казік не змог гаварыць... спазмы перахапілі горла, ён пачаў наўзрыд плакаць, моцна закашляўся, упаў на ложак. Яго калаціла, як у эпілепсіі, Ядзя напалохалася, узяла са стала лыжку і ўсунула яму між зубоў.

Пасля Казік падкурчыў ногі і, ціха ўсхліпваючы, заснуў. Яна не распранала яго, толькі сцягнула з ног чобаты.

— Напалохаліся?

Іван паціснуў плячыма.

— Я дык ужо ведала. Ён некалькі разоў і мне расказваў, а неяк, калі пачаў казаць, што ў гэтым годзе памрэ, адкрыўся і мясцоваму настаўніку Фёдару Іванавічу... і кожны раз на адным і тым жа месцы яго расказ абрываецца. Такая вось нерваванка-падучая сціскае горла, і язык нямее. Застрэліў Цыган яго матку, бо сляпы — гэта ж і ёсць Казік. Доўга ён насіў усё ў сабе, пакуль мы не пазнаёміліся. Не варта вам расказваць, як мы шукалі Цыгана-Авяр'яна, як ездзілі ў Данбас, пісталет у жулікаў купілі... як сачылі за ім у «Сувязі», як планавалі яму кару. Ён, Авяр'ян, вінаваты перада мной таксама... доўга расказваць, сутак не хопіць... Тое, што было, мінула. Казіку веру. Ды, відаць, пад шчаслівай зоркай, у сарочцы нарадзіўся Авяр'ян... Кладзіцеся спаць, а я каля яго пасяджу. Ён слабы здароўем, беркулёз яго есць патроху. Недзе яшчэ да таго, як нас бог злучыў, ён вяртаўся п'яны з вяселля і ноч на снезе пераспаў. Ды ці многа чалавеку трэба... Кладзіцеся, адпачывайце.

І сапраўды праз мінут пяць Казік падхапіўся.

— Ядзя!

— Тут я. Супакойся.

— Пісталет у цябе?

— Не.

— Іван?

— Я.

— У цябе?

— Не... Я і забыў пра яго.

— Цьфу, праклятце... Сукіны дзеці. Там пакінулі. Ну, я сляпы, а вы што ж?

— Хто ж ведаў, Казік. Уцякаць трэба было,— пачала нервавацца Ядзя.

— Гэта точна, прамашка. Можа быць сур'ёзнай улікай,— канстатаваў Іван.

— Ды чхаў я на яго ўлікі. Павязаны ён, маўчаць будзе. Чым яго заб'еш, калі няма пісталета... Эх, божа, божа...— Казік лёг на ложак і адвярнуўся да сцяны.

«Чорт... упусцілі. Адпячаткі пальцаў зняць можна»,— думаў, доўга не засынаючы, Іван. А ранкам першым аўтобусам паехаў у Белагрудак. Адкрыта ехаў. Ля парога сваёй кватэры абняў Веру (да яе прыходзілі з міліцыі і папярэдзілі, што ён уцёк, каб не таіла, а дала ім знаць), стаў перад ёй на калені і сказаў:

— Даруй, Вера, даруй, любая... што падазраваў цябе,

не верыў... мая віна... любіў і любіць буду ўсё жыццё... Сам пайду да іх, многа не накінуць. Даруй...

Яна заплакала. Суткі Іван не пакідаў кватэру, а потым развітаўся з жонкай, сынам і пайшоў у міліцыю. Авяр'яна не было... ён быў на бюлетэні. Павезлі Івана назад ў Магілёў. Ехаў ён з адной думкай: як мага лепш і сумленна працаваць, быць актывістам і перадавіком, вытрываць... Было прадчуванне і надзея, што праз год патрапіць пад амністыю. Шкадаваў, што не давялося пабачыцца з Авяр'янам. «Цікава, якія ў яго былі вочы пасля таго выпадку ля лазні? І ўсё ж трэба будзе, калі выйду на волю, яшчэ раз сустрэцца з Казікам»,— думаў Іван.

## РАЗДЗЕЛ ПЯТЫ

**Адкрыццё музея... Трывогі і падазрэнні Авяр'яна... Манумент славы... Амністыя**

Ліхадзей пазваніў галоўнаму ўрачу Белагрудскай бальніцы:

— Лазар Майсеевіч, віншую вас, зорку першай велічыні! А мяне напалохалі, кажуць, ад'язджае наш Лазар у Ізраіль на зямлю абетаваную... Думаю пазваню, буду адгаворваць.

— Дружа, Авяр'ян Паўлавіч, колькі свет стаіць — адны едуць, другія прыязджаюць... А я стары чалавек. Дажыву век тут, не верце чуткам. Слухаю вас.

— І правільна. Гэта толькі здаецца, што там добра, дзе нас няма... Паўсюдна дзень зменьвае ноч, моладасць старасць, і немагчыма ўцячы ад смерці. Ты арганізуй мне бюлетэнь, Лазар Майсеевіч!

— На колькі дзён?

— Дзён на дзесяць. Адаспацца хачу. Выматаўся, як любоўнік у першую ноч.

— Запісана.

— Дзякую. Што там наша медыцына можа параіць новенькае ад нерваў?

— Усё новенькае, за золата купленае, асядае, самі ведаеце, у якіх апартаментах, а ў нас ужо што бог паслаў.

— Дружа... перадай якіх пілюль, каб спакайней спалася і весялей жылося.

— Будет сделано. Яшчэ пытанні?

— Пакуль усё. Удзячны. Там у цябе хутка з'явіцца рэві-

зія. Патрусяць шэф-повара сталоўкі. Будзь гатовы.

— Няхай правяраюць. Я стаміўся гэтага дурня папраўляць і вучыць. Розум як грошы — альбо ёсць, альбо няма. Звані. Калі пілюлі мае не памогуць, буду званіць знаёмым у лечкамісію.

— Дзякуй за турботы. Бывай здароў.

Авяр'ян паклаў трубку, падышоў да люстэрка, угледзеўся, нібыта не пазнаючы самога сябе,— даўно не было на яго галаве белай павязкі, гадоў трыццаць таму.... калі грамілі варожы гарнізон. Стоячы ля акна, пачаў разглядаць абрыдлую, надакучлівую сваёй нязменнасцю і невыразнасцю архітэктуры няўтульную і брудную плошчу. Людзі ў чорных саках, пуховых хустках, доўгіх паліто і паўпаліто з драпу з накладнымі накасяк вялікімі кішэнямі ў валёнках і чобатах ішлі да касцёла. Быў нейкі дробны фэсцік. Колькі іх гэтых дробных і вялікіх фэстаў каталікаў ды свят царкоўных? Ён іх не запамінаў, ведаў раздво, вялікдзень, тройцу, святога Яна, спас, ведаў, бо асабіста адказваў за парадак і антырэлігійны напрамак работы ўсёй міліцыі. Гэта Авяр'ян падказаў Старадарожцу прыняць пастанову, згодна з якой кожны член партыі, камсамолец мусіў абавязкова назваць прычыну свайго наведвання касцёла ці царквы. Перад гэтым двух чалавек выключылі з партыі за тое, што яны пахавалі сваіх бацькоў згодна з воляй нябожчыкаў па хрысціянскім рытуале з ксяндзом ці папом і пеўчымі. Тады ж людзі пачалі «крывіцца», скоса паглядаць, азлабляцца на райкомаўскіх, на міліцыю, якая ганяла моладзь у час фэстаў і свят ад касцёла і царквы. І зноў жа Авяр'ян прыдумаў такі фокус: найбольш недысцыплінаваную моладзь, мясцовых «фраераў» ды выпівох грузілі ў аўтобусы і вывозілі за кіламетраў дваццаць ад Белагрудка, пакуль тыя стомленыя пад раніцу вярталіся ў горад — служба даўно ў храмах заканчвалася. Што і казаць — міліцыю ў горадзе баяліся, не паважалі, а менавіта баяліся.

А людзі ўсё ідуць...

Прыслужнік ксяндза ў белай ажурнай палярыне выскачыў на ганак службовага ўвахода ў касцёл і пачаў раскручваць перад сабой кадзіла. Гэта ў яго было своеасаблівым рытуалам.

Цяпер не тое, махнулі рукой на барацьбу з рэлігіяй, у галаве найбольш думкі пра ўраджай, мяса, малако.

І яны ідуць, як і сто, як і трыста гадоў таму... Ён так і не мог зразумець, што гэта... сапраўды цяга да бога, да

выкуплення грахоў, ачышчэння, еднасці і роўнасці ўсіх перад богам? А можа, звычка ці страх перад непазбежным канцом? Людзі... ён ведае ім цану... Што ім улада? Здаецца, з'елі б яго жыўцом ці ўтапілі б у палонцы... А калі дзве дошкі сусед у суседа ўкрадзе, да ненавіснага Авяр'яна Паўлавіча бягуць, які так перашкаджае ім красці ў дзяржавы і рабаваць слабейшага. Тады іх бог адзіны — Авяр'ян — і недзялімы на духа і на айца. Вунь старшыня калгаса паўбочкі мёду, пяць кіло сушаных грыбоў прыпёр, ведае, што аддзел сеў на хвост, высвятляе яго вялізны крадзеж.

Людзі... слепа лічаць, што бог іх абразуміць, утрымае сакрытыя вар'яцкія страсці. Ім унушылі, што бог кіруе светам і грамадствам. А кожны з іх гатовы за капейку прадаць душу д'яблу... за грош ломаны...

Аб якой гармоніі і суладдзі адносін з прыродай і з людзьмі можна марыць, будуючы гэтае светлае заўтра. Яно і не можа быць абсалютна светлым, дзень і той зменьваецца ноччу. Нікому не дадзена, ні богу, ні ўладзе, выкарчаваць з натуры чалавека распусту, распуста вечная, ды і законы стрымання і пакарання вечныя. Усё канкрэтна і ўсё тваё. Старадарожац абмежаваны — альбо палохай народ, альбо ўхваляй усё і ўся, захвальвай.

Ён у свайго парторга забіраў усе фармальныя пастановы партыйных сходаў, хаваў іх некаторы час у сейфе, а пасля проста паліў імі грубку. Былі выпадкі, калі сакратар партарганізацыі не паспяваў скласці праект пастановы, Авяр'ян тады даставаў яму з сейфа стары, зачытвалі і ўсе аднагалосна прымалі за аснову. У ідэйнасці міліцыі ніхто не сумняваўся. Аўтарытэт яе ён здолеў узняць. Па-першае, адправіў на пенсію старога следчага, узяў маладога, здольнага і хітрага, як ліса. Цяпер у раёне замест васьмі — шасці нераскрытых злачынстваў было адно-два. Выбіў для свайго аддзела новае абсталяванне для экспертызы, навёў парадак з транспартам, мог дараваць супрацоўніку невялікі бытавы грэх, а дысцыпліну патрабаваў рэгулярна. У аддзеле яго пабойваліся, ведаючы сяброўства з кіраўнікамі раёна, неміналі выпадку, каб выказаць сваю павагу, павіншаваць з днём нараджэння, святамі. На дзень нараджэння абавязкова складваліся па чырвонцу і дарылі канверт з грашыма, падарункі не шукалі. Ён аднойчы намесніку так і сказаў: «Давайце грашыма». Усе ведалі яго любімую прыказку «Утопающему дождь не страшен» і часта яе ўжывалі самі.

Ён чорнарабочы, санітар, які мае адносіны з непаўнацэннай прыродай чалавека. І што новае, акрамя наручнікаў,

прыдумаеш? Трэба будзе даць каманду старшыні выканкома, каб пачалі разбураць гэтыя голыя сцены і франтон былога касцёла дамініканцаў. Увесь свет засцілае, лесу не бачна, сонца, якое за лесам садзіцца. Ах, як ён любіць лес! Вось адзінае, што не здраджвае чалавеку — прырода: прыйдзе час, і будзе вясна, прыйдзе час, і настане лета, і ніколі яны не памяняюцца месцамі. Усё паўстала ў памяці з новай сілай, нібыта адбылося не трыццаць гадоў таму, а ўчора. Рэдка калі ён успамінаў самы пачатак гэтай гісторыі, найчасцей трывожным рэхам адзываўся ў памяці фінал. Цяпер усё паўстала выразна, як наяве.

...Было яму тады ладнаму ды статнаму хлопцу семнаццаць гадоў. Здалёк ён яе, прыгожую пані, бачыў некалькі разоў ля свайго хутара. Сівы пан (ён падаўся Авяр'яну надта ж старым) і яна часта, асабліва ў пару залатой восені, вярхом на пародзістых конях выбіраліся на прагулкі вакол лесу. Ад хутара, які перакупіў у дваццатых гадах яго дзед Фабіян, да маёнтка пані Батуры было якіх-небудзь трычатыры кіламетры. Дзед усё жыццё капаў студні, напачатку ў Лідзе ў падручных славутага майстра Смольскага, пасля, зарабіўшы грошай, узяў пазыку ў банку і адкрыў сваю справу. Колькі часу ён праседзеў у сырых ямах, колькі мокрай зямлі выцягнуў наверх — аднаму богу і вядома. Адзінаму сыну марыў пакінуць у спадчыну зямлю, а не сваю прафесію, так яна ўелася ў пячонкі. Калі моцна захварэў, казаў, што хвароба гэта ад таго, што абапіраўся спінаю ў яме аб сырую зямлю. Хваравітая бабуля памерла, калі Авяр'яну было два гады. Тады людзі жылі мала, да доктара хадзілі рэдка, ужо калі моцна дапякала.

Вось так і Фабіян — доўга трымаўся, упарціўся, змагаўся з хваробай, калі ж прыкавала да ложка, ногі не слухаліся, есці не хацелася, паслаў унука, каб той пазваў дактарку пані Аляксандру. У старога адранку балеў жывот. Бацькі Авяр'яна паехалі на суседні хутар да брата маці кідаць бульбу, а Авяр'яна пакінулі пільнаваць слабога дзеда. Дзеда Авяр'ян не любіў, бо колькі яго помніў, той увесь час павучаў унука аднымі словамі: «Рабі, дурань, зарабляй капейку, бо прымусяць іншыя на сябе рабіць. У бога вер, ёлуп, бо іншыя навучаць пакланяцца д'яблу».

Дзед быў сквапны. Бывала, прывязе з кірмашу штонебудзь смачнае, абавязкова ўсё схавае пад замок, нікога не пачастуе. Колькі сябе памятае Авяр'ян, яму заўсёды хацелася мець такі дарагі з боем кішэнны гадзіннік, як у дзеда. У яго былі нават думкі ўкрасці гадзіннік як-небудзь

ды схаваць, а дачакаўшыся дзедавай смерці, дастаць. Кожную раніцу ў адну і тую ж гадзіну Авяр'ян праз млявасць сну чуў, як за сцяной дзед заводзіць свой гадзіннік.

Як ішлі з Аляксандрай да хутара, ён баяўся паглядзець на яе і адказваў на рэдкія пытанні, заікаючыся і апусціўшы вочы долу. Яму хацелася сказаць: «Дайце, я панясу ваш медыцынскі рыдыкюль», але ён саромеўся і баяўся вымавіць слова.

Калі яна аглядала хворага, ён стаяў побач, гатовы выканаць любую яе просьбу, забыўшыся на ўсё на свеце. Кінуліся ў вочы яе белыя мяккія прыгожыя рукі, якімі яна кранала правалены, здавалася, да пазваночніка жывот Фабіяна.

— Трэба ехаць у бальніцу, пане Фабіяне,— яна добра ведала старога майстра, ён капаў калісь калодзеж і ў маёнтку Батуры,— я не дам рады.

Яна зрабіла старому ўкол, пакінула на стале парашкі. Дзед слабой рукой пацягнуўся пад падушку, дастаў грошы.

— Прашу вас, не трэба рабіць гэтага. На жаль, я бяссільная памагчы вам. Трэба ў бальніцу.

Яна папрасіла Авяр'яна, каб ён прынёс вядро вады, паліў ёй на рукі. Мыла і ручнік былі ў яе рыдыкюлі.

— Я вас правяду,— зусім нечакана для сябе сказаў Авяр'ян, калі яны выйшлі на панадворак,— тут напрасткі праз лес карацей будзе. Можа, вы спяшаецеся, там сцежка ёсць,— усхвалявана працягваў ён.

— Калі ласка,— ледзь прыкметна ўсміхнуўшыся, адказала яна.— Праводзь.

Толькі потым Авяр'ян успомніў, што на іх шляху будзе лясная рэчка Карчоўка, якую трэба пераходзіць па гладкай перакінутай з берага на бераг кладцы. Ён скоса паглядзеў на яе мініяцюрныя абцасікі і жахнуўся — хоць ты паварочвай назад.

Яна пра нешта пытала ў яго: «Пра што ён марыць? Ці чытае кніжкі? Ці хоча вывучыцца на каго-небудзь? Ці не збіраецца ехаць у Аргенціну на заробкі?»

Ён адказваў неўпапад, бо ўсе думкі былі там... пра тое, як перайсці гэтую рызыкоўную кладачку. Падышлі да рачулкі.

— А я толькі падумала, што недзе тут мусіць быць рэчка. Улетку там-сям яна перасыхае?

— Не.

— Ну, што ж, будзем рызыкаваць, як у цырку... Дарэчы, ты быў у цырку?

— Ніколі не быў.

— Я люблю цырк. Патрымай, калі ласка, мой рыдыкюльчык. Ідзі побач. Я паспрабую сама. Калі буду падаць, губляць раўнавагу, падасі руку.

— Добра,— абрадаваўся ён.

— У дзяцінстве мне ніколі не ўдавалася перайсці рэчку па такой самаробнай кладачцы. Усім сяброўкам удавалася, а мне не,— шчыра прызналася яна.

І яна, як тое малое дзіця, са словамі «Ай, мама!» зрабіла першыя тры-чатыры крокі па кладцы.

Авяр'ян сачыў за кожным яе рухам, трымаўся побач. Далікатна апускаючы ў ваду насок чобата, як бусел на мокрай сенажаці сваю нагу. Аляксандра занадта нахілілася ў левы бок і не ўтрымалася. Авяр'ян ухапіў яе за руку, моцна сціснуў і павёў да беражка.

Яна падзякавала.

— Невязучая я. Пра гэта яшчэ бабка казала, калі я нарадзілася. Крумкач у той дзень з лесу прыляцеў на наш двор і некалькі разоў каркнуў.

— Я таксама з першага разу не адолеў. Сасна крывая...— хацеў абнадзеіць дакторку Авяр'ян.

Яна зразумела яго памкненні і ўсміхнулася. Ля цаглянай высокай брамы са страхой Аляксандра забрала ў яго рыдыкюль, падзякавала за турботы, падала на развітанне руку, якую ён нязграбна паціснуў.

— Так і перадай тату, каб сёння ж павезлі дзеда ў бальніцу.

Яна пайшла па алеі, паабапал якой грувасціліся кусты такога цудоўнага белага бэзу, якога раней Авяр'ян ніколі не бачыў. Ён стаяў зачараваны гэтым дзівосным казачным малюнкам; сэрца падказвала, што яна азірнецца... І ён не памыліўся. Яна азірнулася, ён нават угледзеў здалёк нешта падобнае на добрую ўсмешку на твары. Яна ўзняла руку, як бы ледзь прыкметна махнула яму і знікла ў чорным праёме адчыненых дзвярэй.

Тым жа кароткім шляхам вяртаўся ён дахаты. Прыбег, знайшоў кавалак пемзы і пачаў шкрабаць свае чорныя рукі, доўга да чырвані цёр іх, далей вычысціў ад гразі чобаты, дастаў з камоды чыстую кашулю, апрануў і пайшоў хадзіць туды-сюды ад хутара да лесу.

Нягледзячы на тое, што душэўная ўзбуджанасць не давала доўга заснуць, ён усё ж прачнуўся вельмі рана. Ляжаў, глядзеў у акно, за якім пачынала днець, і чакаў — калі ж дзед пачне заводзіць свой гадзіннік. Ужо і сонца ўзышло, і

бацька ўголас пазяхнуў, а за полагам было ціха. Усе зразумелі, што здарылася нешта жахлівае,— так яно і было.

Бацька дакараў сябе: дарма ён не павёз старога ў бальніцу ўвечары, а паслухаў хворага і адклаў на ранак. Дзед за ноч ціха сканаў. Нарэшце гадзіннік апынуўся ў руках Авяр'яна. Бацька не пярэчыў, сказаў: «Няхай табе застаецца, помніць будзеш дзеда».

Авяр'ян прымераў на сябе і дзедаву целагрэйку, хораша так, зусім як у заможных асаднікаў глядзеўся на ёй срэбны ланцужок ад гадзінніка.

З гэтага дня Авяр'ян як ніколі адчуў сябе дарослым. Прыбавілася сілы, упэўненасці. Упершыню ён не баяўся пярэчыць бацьку, калі той вяртаўся дахаты п'яны. Калі ж бацька гразіўся, што не будзе яго карміць, крычаў у адказ, што ўцячэ ў Амерыку. Уцякаць яму з хутара якраз і не хацелася. Яго ўсё больш і больш цягнула да маёнтка, каб наўмысна ці выпадкова сустрэць там пані Аляксандру. Мінула некалькі тыдняў, а ён так яе і не напаткаў, блукаючы па лесе ля сядзібы паноў. А мо яна захварэла? Ад гэтай думкі ў яго прапаў настрой, не хацелася ісці да аднагодкаў на суседнія хутары на вячоркі. І ён рызыкнуў. Авяр'ян не ведаў, дзе яе спальня. Якое акно на гэта пакажа... ён проста вырашыў, што залезе на адно дрэва, на другое, і такім чынам яму пашанцуе. Пайшоў. І яму такі пашанцавала.

Яна доўга сядзела перад круглым люстэркам, расцірала рукамі твар, шыю, голыя плечы.

Да яе падышоў пан у доўгім чырвона-белым халаце, пацалаваў руку, яна пагладзіла яго па шчацэ, тады ён нахіліўся і пацалаваў яе ў плечы. Яна засталася сядзець, а ён накіраваўся да ложка, зняў халат, лёг і накрыўся адной прасцінай. Ноч была месячная, цёплая.

Авяр'ян (ніколі яшчэ не калаціласа так яго сэрца) сядзеў на дрэве і пільна сачыў за яе рухамі. «Няўжо яна пойдзе да яго ў ложак?» — стукала яму ў скроні. Захацелася разбіць акно і ўкрасці яе ад гэтага сівога сутулага і вечна незадаволенага ўсім пана. Яна патушыла лямпу, зняла сарочку і на нейкае імгненне трапіла ў паласу святла месяца, затрымалася ля вялізнага фікуса. Ён не паверыў сваім вачам — вось яна за два-тры крокі ад яго, уся навідавоку, прыцягальная, белая, як малако, чыстая, як малое дзіця, і прыгожая, як багіня. Ён напалохаўся. Яна глядзела, здавалася, прама яму ў вочы. Няўжо прыкмеціць?

Ён не вытрымаў, схаваўся за ствол дрэва. Калі праз

хвілю ён зноў высунуўся — яна знікла. Ад злосці і бездапаможнасці ён сцяў зубы...

Раніцай за нешта сварыўся бацька... Ён амаль не слухаў. Цяжкая, аднастайная праца на хутары гняла душу, хлопца цягнула ў горад, у свет, да людзей. Марыў пра адно і тое ж: як бы купіць чорны касцюм, прычапіць на лацкан белую ружу, прыдбаць чаравікі, наняць аўтамабіль і махнуць да Варшавы. Каб яна паглядзела на яго тады...

Купілі сячкарню, ладнага коніка Рыся... Ці ж бацька адпусціць яго, калі падумаць цвяроза? Або купіць касцюм, чаравікі?.. Хіба на вяселле. Сватае на п'яную галаву касавокую Гэлю з суседняга хутара. На чорта яна яму. Цягнула туды, да маёнтка. Яшчэ некалькі разоў ён падкрадваўся да знаёмага акна яе спальні. Пачаліся цёмныя, халодныя восеньскія ночы. Пан аднекуль прывёз у маёнтак двух вялікіх сабак, якія аднаго разу напалохалі і ледзь не выдалі Авяр'яна.

Пачыналася пара лістападу. Авяр'ян неяк на сваім коніку падпільнаваў паноў, пагнаўся навыперадкі з імі. Яны прынялі яго дзёрзкі выклік. І ён на сваім адданым, дужым Рысю амаль атрымаў перамогу, але конь няўдала аступіўся, упаў і зламаў нагу. Яны рагаталі зводдаль, не ведаючы, што здарылася бяда.

Авяр'ян як ухапіў кепку зубамі, так і пракусіў яе. Бацька яму каня не даравау бы. І таму ён, як злодзей, пранік у хату, забраў свае рэчы, дастаў дакументы, знайшоў трохі грошай, кароценькім абкусаным алоўкам напісаў, дзе конь, што з ім і што сам пакідае хату, няхай не шукаюць. Куды паехаў не напісаў. З'ехаў у Гродна, параілі ўладкавацца на тытунёвую фабрыку. Парабіў там паўгода, цягнула назад, невыносна хацелася пабачыць яе.

Бацькі ўсё яму даравалі. Прыехаў у Белагрудак. Талковай работы не знайшоў, успомніў пра сыраварню ў Батуры і паляцеў у маёнтак прасіцца хоць на якую работу.

Дужыя рукі, шырокія плечы, вочы, у якіх сядзела рабскае пакланенне, спадабаліся пану. Яго ўзялі. Пані з панам паехалі на воды, сустрэўся з ёй Авяр'ян праз месяц. Яна як быццам абрадавалася, сама завяла гаворку, пра нешта пыталася. «Як ёй паведаць пра свае пачуцці?» — вар'яцеў ён. Пана не было, паехаў да Варшавы. Час пайшоў неспакойны. Усе гаварылі пра блізкі пачатак вайны. Неяк, выбраўшы ўдалы момант, ён схапіў яе за рукі, прыціснуў да сцяны і нечакана для сябе і для яе прызнаўся: «Я люблю вас, люблю...»

Яна адштурхнула яго. Разгубілася, ударыла па твары, нямоцна, праўда. Пану пра гэты выпадак не сказала, каб Авяр'яна не звольнілі. І гэтым яна абнадзеіла яго параненую душу. Зноў у галаве завіхрыліся планы.

Тое, чаго так усе баяліся, пачалося. Вайна парушыла ўсе планы і надзеі.

Мабілізавалі Авяр'яна, апранулі па-вайсковаму. У той жа дзень строем рушылі да Гродна. Беларусаў адрознівалі ўсе: у большасці сваёй сялянскія хлопцы і мужыкі мясілі пыл босымі нагамі, а чобаты былі звязаны і перакінуты на плячах.

«Яны чобаты не ўмеюць насіць, усе ногі пазбівалі, ці з імі адолеем немца?» — крывіліся польскія харунжыя.

Авяр'ян, як і камандзіры, ішоў у чобатах, хоць і адчуваў, што націраe мезенец. Сапраўднага пораху так і не давялося панюхаць. Узялі ў палон, раззброілі і пагналі ў часовы лагер ля Гайнаўкі. Тры галодныя дні зрабілі сваю справу: інстынкт самазахавання перарадзіўся ў інстынкт самаратавання. Невялічкай групе ўдалося ўцячы. Раніцай раздзяліліся, і кожны накіраваўся ў свой павет, да свайго хутара. Авяр'яна параніла ў плячо, сушыла ў роце, балела галава. Ён напалохаўся, што можа памерці ад заражэння крыві. Выйсця не было, адразу пайшоў шукаць ратавання да пані Аляксандры. Не прагоніць параненага. Яна нават махала ім рукой услед, калі ішлі на вайну.

Стомленага, галоднага, худога з запалымі насцярожанымі вачыма яна ўпусціла ў пакоі і агледзела рану. Ён як упаў... дык спаў суткі беспрабудна. Прачнуўся, а на парозе бацька стаіць. Мусіў Авяр'ян ехаць на хутар. Па дарозе даведаўся, што пан уцёк з маёнтка, напалохаўся Савецкай улады.

Гэтая вестка падбадзёрыла Авяр'яна. Увечары ён, нягледзячы на боль у плячы, заняў звыклае месца на галіне старога дрэва ля акна Аляксандры. У пакоі рыхтаваўся да сну старэйшы сын Уладзімір. Авяр'ян злосна сплюнуў і болей туды не хадзіў. На суседнім хутары з двума братамі, яго аднагодкамі, жыла Гэлька, да якой хацелі яго сватаць. Хадзіла яна без пары ў самым саку, як панурая птушка ля балота. Ён і не ўгаворваў яе доўга. Заўсёды пасля гарачых абдымкаў у гумне, у лесе яна хутка зашпільвала на грудзях кофту і садзілася, запрашаючы і яго есці сала з цыбуляй. Яна так з прыцмокам ела, так нязграбна і недалікатна, запіхвала пальцамі сала ў рот і нават рагатала з поўным ротам — што ўсё гэта было яму агідна. Пра іх

сувязь даведаліся. Яе браты пачалі пільнаваць, накрылі іх на месцы спаткання, прыгразілі Авяр'яну. Ён адкрыта і смела сказаў, што жаніцца не будзе. Браты былі жулікаватыя і дружныя, пабілі яго. Праўда, час быў такі, што яны і баяліся Авяр'яна. У іх зямлі было багата.

Ліхадзей прыліп да энкавэдыста, як верны служака, хадзіў з ім ад хутара да хутара, памагаў абмерваць зямлю, насіў газеты, партрэты Сталіна, напяваў часам песню «Ці сонейка захад, ці сонейка ўсход. Аб Сталіне песню спявай, спявай беларускі народ».

Паспелі Саветы нацыяналізаваць толькі сыраварню Батуры. Пайшоў фашыст на СССР. У першыя дні вайны хаваліся ў іх на хутары пяцёра чырвонаармейцаў, якія адступалі з-пад Беластока. Галоўны над імі палітрук, пакідаючы хутар і дзякуючы хутаранцам, так і сказаў Авяр'яну (ён з ім сябраваў): «Мы вернемся, абавязкова вернемся. Не паддавайся фашысту. Славяне не будуць рабамі, а ты, славянін, памятай. Ты думаеш, яны супраць бальшавікоў ідуць? Дужа ім наша самастойнасць, дабрыня, талент не даюць спакою. А яшчэ багацце зямелькі роднай. Усё сваё барані: зямлю, гісторыю, лес, хутар, душу».

— А царкву? — запытаў Авяр'ян.

— І царкву барані. Мы вернемся.

Мінуў год, другі, а ніхто не вяртаўся...

«Задрыпанцы... Яны вернуцца,— казаў слабы здароўем бацька Авяр'яну,— ды начхаць і рускаму і немцу на тваю душу, на тваё поле, лес, хутар. Усім рукі нашы трэба. Унь прыйшлі і пагналі моладзь у Нямеччыну. Учора прыязджалі немец з Белагрудка з палявой жандармерыі і два паліцаі. Усё абмералі, перапісалі, падлічылі, нават колькі пудоў жыта зніму, карове вунь бірку на шыю павесілі, каб не прадаў і не абмяняў. Усё сабе прысвоілі. А ты гэтых чакаеш, пакуль з голаду не памром»,— дакорліва казаў стары.

— Палітрук бараніў мяне. Браты Бярэйшы падпільнавалі на дарозе і давай мяне мясіць. А яны, акружэнцы, у лесе хаваліся. Гэты палітрук падляцеў ды як дасць аднаму, другому прыёмам. Жах! Разагнаў, як катоў. А яны былі гатовы забіць мяне.

— За што?

Авяр'ян не адказаў.

— Не хочаш жаніцца, не гуляй, так скажу.

— А на чорта яна мне... Каб я ў яе першы быў... Скуль я ведаю, колькі ў яе пабывала.

— Ну, трымайся. Браты яе, казаў сусед Колбік, падаліся ў паліцаі. Глядзі, каб не прыбілі. Цяпер далёка твой палітрук, мо за Волгай, не паможа прыёмам, як ты кажаш.

Бацька памыліўся. Быў ён тады не за Волгай, а ля Нёмана. У глыбокую восень сорак другога года палітрук завітаў на хутар. Быў ён у цывільным з двума невядомымі Ліхадзею людзьмі, узброенымі аўтаматамі. У аднаго з іх, як і ў палітрука, былі вусы і на ўвесь твар барада... Так Авяр'ян упершыню даведаўся пра існаванне партызанскага атрада «Народныя мсціўцы» і даў падпіску быць у іх сувязным, а пад зіму, калі браты-паліцаі западозрылі яго ў сувязі зляснымі людзьмі, пайшоў, нягледзячы на ўгаворы бацькі, у атрад. Цяпер, са зброяй, яму не тое што браты, а сам чорт быў не страшны.

Камандзіра атрада, таго самага палітрука здзівіла прыродная здольнасць Авяр'яна арыентавацца ў складаных абставінах, талент стралка, зайздроснае ўменне бачыць наперад, лісіная асцярожнасць і смеласць ваўка. Ліхадзей узначаліў невялічкую групу разведчыкаў, кожнага з якіх сам камандзір вывучаў сапёрнай справе.

Цяпер сястра братоў-паліцаяў сама шукала сустрэчы з ім і пакорліва прыходзіла ў прызначанае месца, бо добра запомніла яго словы: «Не будзеш прыходзіць, застрэлім тваіх паліцыянтаў, як цуцыкаў». Змаўчала нават і тады, калі ён яе падсунуў і свайму камандзіру.

...Не хапала зброі, медыкаментаў. Вось тады Авяр'ян і ўспомніў пра сваю напаўзабытую каханую дакторку. Адзін не пайшоў. Прыйшлі пяцёра. Дамовіліся, што кур'ерамі будуць толькі Баксёр — Старадарожац і Цыган — Ліхадзей. Што здзівіла. Яна нават не напалохалася іх прыходу. У час вячэры сціпла пачаставала бульбай са скваркамі. Непрыкметна для астатніх цікавала за ім. Развітваючыся, ён падаў ёй руку, яна зрабіла тое ж самае, трохі праз сілу ўсміхнулася. Ён адчуў, што цяпер яго верх, яе незалежнасць, фанабэрыя зніклі. Яна як бы пачала яго баяцца. Больш да сястры паліцаяў яго не цягнула. Няхай распараджаецца ёю камандзір. Вабіла да сябе з новай сілаю Аляксандра.

...Шмат было ў яго жыцці дробных і значных падзей, пра якія ён забываўся, жыў адным днём, да гэтых жа, звязаных з Аляксандрай, вяртаўся памяццю пастаянна. Як бы хто закляў. Згадаўшы пра пачатак гісторыі, міжволі «прагартаў» у памяці і яе трагічны фінал. Ці далёка ён быў ад маёнтка, ці блізка — розніцы не было, як ніколі не было пачуцця страху і сораму за тое, што нарабіў —

партызаншчына, барацьба з лютым ворагам пераважаць усё.

І вось толькі Казік змог парушыць яго спакой. Самаробны пісталет малодшага сына Батуры ляжаў перад ім на стале. Добра, калі не купіць другі і не пачне зноў на яго паляванне. Калі знойдзе яго? Дзе? У Навагрудскім, Лідскім, Карэліцкім, Дзятлаўскім раёнах? Мусіць недзе быць паблізу. Урэшце, што ён дакажа, калі і заявіць... хто сляпому паверыць... ды ён і не бачыў нічога. Ён мусіць маўчаць, калі лагічна. Пісталет з адбіткамі ягоных пальцаў на стале. За захаванне зброі можна два гады атрымаць, і лысы не падкапаецца. Ці ўсё ж параіцца са Старадарожцам? Не! Гэты баязлівец запанікуе і напалохае ўсіх. Хацелася б пасля ўсяго паглядзець на маніякальную Варвару. Бясплатны канцэрт!

У такой невясёлай задуменнасці і заспела яго ля акна жонка, якая, не распранаючыся, уляцела ў пакой. Ён ледзь паспеў схаваць у прыстолак Казікаў пісталет. Рэдка ён бачыў яе такой узбуджанай:

— Ну, усё... дагуляўся! Колькі разоў цябе папярэджвала. Авяр'ян, дарагі, ну няхай няма паміж намі любві, была, з часам знікла, няхай жывём мы разам, мо перабольшваю, пад прымусовай згодай, кожны сам па сабе, ты ніколі не адкрываў мне душу, не цікавіўся, што ў мяне на сэрцы... няхай... позна пачынаць спачатку, няхай ідзе ўсё сваёй чаргой да гэтай праклятай старасці, якая прымірыць, аб'яднае па-новаму. Сваім празмерным эгаізмам, халоднасцю, вечнай скрытасцю і незадаволенасцю сямейным жыццём, крыкам ты знішчыў усё светлае, што пачыналася даўным-даўно паміж намі. Я не крыўдую... Цераспалосіца лёсу. Можа, табе трэба была другая жонка. Не хачу сварыцца... змірылася. Уратуй хаця б адзінага сына. На бацькоўскія сходы не хадзіў, як вучыцца, не цікавіўся, дзе ён вечарамі бывае, чым займаецца, не хацеў ведаць — усё ўзваліў на мае плечы і — вось расплата. Ганьба, калі ўсе даведаюцца, на ўвесь Белагрудак. Хоць ты бяры ды з'язджай куды вочы глядзяць. Божа, чаму ў мяне такі нешчаслівы лёс, чаму?

Ён доўга не адказваў.

— Я не люблю, калі скуголіць і плача жанчына. Мне тады яе хочацца біць, моцна біць,— раздражнёна сказаў ён.— Што ён учудзіў?

— Што? А тое, што і вымавіць страшна. Ён жыве з дачкою тэхнічкі-прыбіральшчыцы нашай школы, непаўнагадняй Любай Кароза, і яна ад яго цяжарная.

— І гэта ўсё?

— Табе гэтага мала? Авяр'ян, аб чым ты думаеш? — не хацела верыць яго спакою жонка.

— А я думаў... Патушым гэты пажар адным махам. Дзе ён?

— На кухні.

— Пакліч сюды.

Рэгіна прывяла сына. Стаяў ён перад ім высокі, сутулы, з густымі чорнымі бровамі, як у бацькі, з рэдкімі чорнымі вусікамі, з абыякавымі вачыма.

— Дзе робіць яе бацька?

— Хлеб возіць на кабыле...— нехаця адказаў сын, упэўнены, што вялікіх непрыемнасцей у яго не будзе.

— Ты як быццам незадаволены, што цябе пытаюць?

— Маё дзела.

— Вядома, тваё, хто ж адмаўляе. Знайшоў пару... У сне не прысніцца... маці прыбіральшчыца, бацька п'яніца. Ты ж трымай марку! Не дурны, прыгожы, з харошай сям'і. Што табе — нашых мала? Дачка пракурора, у старшыні выканкома школу закончыла... у дырэктара масласырзавода... Ты ж не сабакам жыў, які душыцца на ланцужку без волі. Дзякуй богу, як сыр у масле купаўся. Транзістар «Спідола» — табе першаму, магнітафон табе... Не падабаецца «Вясна», «Соні» купілі. Гітару, джынсы табе першаму на ўвесь Белагрудак. Клёшы, доўгія патлы, як у бітлаў, крыжы на шыі — я на ўсё махнуў рукой... Думаю, перахварэеш, была б галава на плячах. Ты ўявіў сябе каралём Белагрудка. Няхай так. Вядома, цябе ж міліцыя не чапае. Пануй, радуйся жыццю... Маё пакаленне маладосці не мела, а пасля вайны радасці не бачыла. Няхай вам усё лепшае... хто ж супраць?.. Памаўчы, не перабівай мяне, не люблю: так дам, што з хаты ўцячэш. Я нічога не прашу ўзамен, бо той не бацька, хто папракае сына: «Я цябе кармлю, апранаю». Гэта бацькоўскі абавязак... я пра іншае... Ты ацані душэўны боль, пакуты, бяссонныя ночы, цану рублю, які ты лёгка траціш. Ступень дабраты да сябе ацані. Думаеш, мы не ведалі, хто пад Новы год ссек адзіную елку ля паліклінікі? Ты яе дзеўцы аднёс, у алкагольным дурмане гераізм паказаў? Маўчы... Ведалі. Ні ты, ні я, ні маці — мы не пасадзілі замест елкі ніводнага дрэва, усё чакалі, што ты раскаешся, не-е... Цябе ўжо прыцягваў ложак. Мы помнім, як ты першую ноч не начаваў дома, збег. Ці ж маці не аблівалася слязьмі, а я не глытаў валідол? Яна моўчкі даравала твае выбрыкі: пераходны ўзрост, скажы дзякуй маці, я гатовы быў забіць цябе. Стрымаўся, бо былі выпадкі і ў

Гродна і ў сталіцы, што дзеці ў тваім узросце вешаліся. Мы ведалі пра гэта, ахоўвалі тваю ранімую псіхіку, патакалі табе ва ўсім, зневажаючы сваю чалавечую і бацькоўскую годнасць. У партызанах за такія паводзіны, як у цябе, я расстраляў бы кожнага. Як ты вучыўся? Цябе цягнулі за вушы... У дзевяты пайшоў у вячэрнюю. Ідзі. Я табе арганізаваў даведку з двухгадовым працоўным стажам. Усё ж спадзяваліся, што сын паступіць на юрыдычны. Хоць адзін дзень ты быў на той рабоце? Маўчы! Не быў. Ты хадзіў у рэстаран, не плаціў афіцыянткам... ты браў прыклад з мяне. Ды мяне дырэктар і шэф-повар да пенсіі могуць дарма карміць за тое, што я ім работу прабіў. У паловы горада ты напазычаў грошай. Мы маўчалі. Паедзе паступаць, возьмецца за розум. Так думалася. Паехаў... Я падняў на ногі ўсіх знаёмых... Дэпутат, пісьменнік Шабыльчык і той дапамагаў. Ты ж марыў пра юрыдычны факультэт — на табе юрыдычны... Ваенком вызваліў ад арміі... Паступай, вучыся. І што... Ты нават на тройкі не здаў. Добра. Бывае... Грошы бацькі даюць, вазьмі кнігі ў рукі, нельга ж так жыць без сілы волі... Мы не вечныя, чалавек абавязаны мець прафесію, калі бог не даў таленту. Сёння я ёсць, заўтра мяне няма. Я цудам трымаюся. Усіх маіх калег-аднагодкаў ужо змянілі ў раёнах. Ідзе адукаваная моладзь... Думай трохі, стрымай спакусы-жаданні, страсці, гэтую вечную прагу ўсёдазволенасці. Рана ці позна загубленыя ўпустую гады маладосці адпомсцяць хваробамі, зайздрасцю да больш удачлівых аднагодкаў, комплексам непаўнацэннасці. Я няшчасны... таксама так... я марыў стаць лётчыкам і не стаў ім. Нічога мне маю неажыццёўленую мару не кампенсуе. І вось апафеоз тваёй безадказнасці і жорсткага стаўлення да нашай дабрыні. Няма чым крыць? Збірайся, паедзем да іх.

— Ну, не маўчы... адкажы што-небудзь бацьку, ён жа табе зла не жадае,— шкадавала сына маці.

— Калі я кахаю яе... Што тады? — не зусім шчыра прызнаўся сын.

— Блеф! — узарваўся Авяр'ян.— Чым забіта твая галава? Ажаніцца ў васемнаццаць гадоў? Ды ты ж праз два гады завыеш. Абмяняць сваю волю, магчымасць выбару... прывязаць сябе на ланцуг? Хадзем да іх. Я пагавару. А ты, Рэгіна, заставайся ў хаце... будуць званіць, я хворы, у паліклініцы на працэдурах... калі ўжо якое ЧП — запішы.

Яны апрануліся. Віталік пакорліва пайшоў за бацькам.

Каржакаваты, з цяжкім поглядам Лаўрэнцій Кароза, бацька Любы, не чакаў прыходу такога высокага і дарагога

госця: разгубіўся. Маці, яны з дачкою сядзелі ля стала, першай апамяталася: хуценька прыбрала са стала талеркі, хлеб, прынесла крэсла, табурэткі, запрасіла гасцей сесці.

Люба знерухомела, не звяртала ўвагі на Віталіка і яго бацьку ці рабіла выгляд, што не звяртае.

— Добры вечар у хату,— аблізнуўшы губы, сказаў Авяр'ян і падаў усім руку.

Лаўрэнція ён ведаў з часоў вайны, калі атрады аб'ядноўваліся ў адно баранавіцкае злучэнне. Авяр'ян сеў да стала, не распранаючыся, тым самым даў зразумець, што прыйшоў ненадоўга. Хоць і ваявалі яны разам апошнія тры месяцы перад вызваленнем, ды ніколі не сядзелі за адным сталом.

— Спадзяюся, што дзела такое... якое не трэба адкладваць...

— Ваша праўда, Авяр'ян Паўлавіч,— хуценька згадзіўся напалоханы Лаўрэнцій,— што з дурня ўзяць? Іх корміш дарам, апранаеш, а яны амаль запраглі. Білі мала. Пры Польшчы ў школе як дасць настаўнік... а бацька дабавіць...

— Тут твая праўда, Лаўрэнцій.

— А што ты мала яе біў? — з папрокам да чалавека сказала маці Любы, якая пасля гэтых матчыных слоў адвярнула твар убок, хаваючы пад вокам сіняк.

— Мала, выходзіць! — буркнуў на жонку Лаўрэнцій.

— Так. Жыццё доўгае. У кожнага з іх яшчэ ўсё наперадзе. Ускідваць пятлю на шыю... мы ў сям'і ўсё ўзважылі і вырашылі, што рана. Так, сынок?

Віталік нічога не адказаў, толькі як бы хітнуў злёгку ў знак згоды галавою.

— Ды і я ж пра тое,— спяшаўся дадаць Лаўрэнцій.

— Не хочацца, каб злыя языкі разносілі па ўсім гарадку і ганьбілі імя тваёй дачкі і майго сына. Думаю, мы паладзім... пасябруем. У мяне ёсць знаёмы ў Лідзе. Тут, самі разумееце, не пажадана.

— У нас сястра маёй жонкі акушэркай у Баранавічах робіць. Мы прыкідвалі тое-сёе.

— Ну, дык лепей і не прыдумаць,— як бы падвёў рысу Авяр'ян, дастаў кашалёк, адлічыў пяць чырвонцаў, пасля дадаў яшчэ цэлую пяцідзесятку і паклаў грошы на стол,— вазьміце. Забудзем усё і застанёмся сябрамі. Дарэчы, Лаўрэнцій, я шукаю чалавека, які б узначаліў пазаведамасную ахову масласырзавода. Харошы аклад, форма. Ты чалавек правераны... быў партызан, франтавік. З чаркай, праўда, у рабочы час прыйдзецца завязаць. Так што падумай... пазвоніш ці зойдзеш. А?

— Я падумала толькі... што...

Але жонцы Лаўрэнцій не даў дагаварыць:

— Маўчы! Чалавек правільна робіць. І ёй пакалечым жыццё і яму. Не пара яны. Усё зробім па першаму класу, Авяр'ян Паўлавіч, не турбуйцеся.

— Будзем спадзявацца, што і ў Любы няма прэтэнзій? Што яна і сама не хоча загубіць сваё маладое жыццё ў брудных пялёнках. Так, Люба?

— Так, так,— адказаў за дачку Лаўрэнцій.

— Так, Люба? — паўтарыў Авяр'ян.

— Так,— ледзь стрымліваючы слёзы, адказала дзяўчына з худой шыяй і дзіцячымі яшчэ плечыкамі.

— Ну, вось і цудоўна! Я бачу, у цябе расце разумная дачка. Наконт прапановы маёй падумай і не зацягвай з адказам. Усяго добрага.

Кароза падхапіўся, адчыніў дзверы і правёў Ліхадзеяў аж да сярэдзіны вуліцы.

— Я жонцы адразу так і сказаў, што трэба да ўрача, што рана, што трэба яшчэ вучыцца. Я ім спуску не дам. Усё будзе ціха. Я казаў сваёй, каб нават вашай жонцы нічога не гаварыла... Што з іх возьмеш... бабы.

— Ты, Лаўрэнцій, кантралюй гэтую справу, зразумеў?

— Усё зробім, Авяр'ян Паўлавіч.

— Бывай здароў.

Лаўрэнцій доўга трос руку Ліхадзею, нібыта дзякуючы за тую сотню рублёў, якая засталася на стале.

— Усяго вам добрага, Авяр'ян Паўлавіч.

— Бач, вось і ўсё яе каханне,— казаў бацька, калі яны засталіся адны на цёмнай ускраіне Белагрудка.— Не крычала, не даказвала сваю любоў, не білася ў істэрыцы, а моўчкі згадзілася. Ты ўпэўнены, што быў у яе адзін?

— Яна напалохалася,— адказаў сын.

— Мілы мой, ты не ведаеш яшчэ жанчын. Куды той страх і знікае, калі ёсць магчымасць урваць сабе куш.

— Яна не такая,— не згаджаўся пануры Віталік.

— Ну, добра, добра... Не будзем спрачацца... час пакажа, якая яна. Мяне радуе, што ты зразумеў абсурднасць і непатрэбнасць і для цябе і для нас гэтага ранняга шлюбу. Першае каханне сляпое. Гэта добрая навука і фільтрацыя мазгоў — наперад у бабскіх справах будзеш разумнейшы.

Толькі зараз, зноў вяртаючыся ў думках да Казіка, Авяр'ян здзівіўся яго вынаходлівасці. Раней усё не мог аніяк дадумацца, чаго ён падпільноўваў яго ля лазні пансіяната, і вось зараз зразумеў — бо менавіта ля лазні ён быў без

зброі. Так. Сапраўды, са сваёй партупеяй і пісталетам Авяр'ян ніколі і нідзе не разлучаўся. Нават калі зрэдку апранаў цывільны светла-шэры касцюм, які не любіў насіць, клаў пісталет у бакавую кішэню пінжака, ішоў спаць, браў пісталет пад падушку. Такая пастаянная прысутнасць зброі, здавалася яму, супакойвала, рабіла смялейшым.

Ён і сон бачыў перад гэтым. Казік іграў у тым сне на сваім нямецкім чырвоным акардэоне, і як толькі ў пакой увайшоў Авяр'ян, адклаў убок інструмент і падаў Ліхадзею стары ў дзірках чорнага колеру касцюм. Маўляў, апранайся і будзеш танцаваць з астатнімі. Авяр'ян узяў касцюм, пайшоў у другі пакой і пачаў апранацца ў знаёмай спальні Аляксандры. Напалохаўся, кінуў касцюм на ложак, а сам да акна, скочыў уніз і па глыбокім снезе доўга ўцякаў прэч ад маёнтка. У сне ён аж закрычаў, задыхаўся, клікаў на дапамогу. Рэгіна пабудзіла яго.

А ў гэтую ноч Авяр'яну праснілася, нібыта ён Люцыфер і ў чырвона-чорным плашчы лётае над Белагрудкам — ад Замкавай гары да касцёла бернардзінаў...

Што ж, заставалася пакуль адно: выявіць праз сяброў, дзе знаходзіцца Казік Батура.

Зачэпка ёсць. Ён добры музыка і, відаць, хлеб зарабляе на вяселлях. Ён яго абавязкова знойдзе. Калі Казік змог высачыць яго паездкі ў лазню... значыць, жыве недзе недалёка...

Праз тыдзень маці Любы павезла заплаканую дачку да сястры ў Баранавічы. Там высветлілася, што аборт рабіць позна: пайшоў чатырнаццаты тыдзень цяжарнасці. Апошняе слова было за Любаю; яна згадзілася раджаць. Заплакала, шкадуючы сваю дачку, маці, заплакала бяздзетная цётка. Яна ж, даведаўшыся, хто бацька будучага дзіцяці, адгаварыла Любу вяртацца ў Белагрудак, пакінула яе каля сябе.

— Дзіця ж яна зусім... Горкае дзіця... Ручкі танюсенькія, ножкі худыя... Яна ж калоціцца ўся. Нічога ж не ела, відаць. Няхай гэтыя паўгода пажыве ў мяне. А што там наперадзе будзе, нам не дадзена ведаць, аднаму богу і вядома (акушэрка хадзіла да царквы і была вельмі набожнай). Мы, захоўваючы жыццё, супраць бога не ідзём, мо ўсё зменіцца на лепшае. Заставайся, дзіцятка. Усё, што супраць смерці,— на радасць чалавеку.

Анатоль Старадарожац нічога не ведаў пра ЧП у сям'і Авяр'яна і пра Казіка. Сакратар быў цалкам заняты сваімі справамі. Па-ранейшаму, які ўжо год, хварэў, клаўся ў баль-

ніцу, ехаў у Місхор, на Рыжскае ўзмор'е, зноў ехаў на кансультацыі і прафілактыку ў сталіцу яго першы сакратар сівагаловы Ілья Фаміч і па-ранейшаму без перспектывы на павышэнне цягнуў лямку і за сябе, і за першага Анатоль Станіслававіч. Далі райкому новенькую белую «Волгу», дык без дазволу першага, два месяцы, пакуль ён хварэў, ёй ніхто не карыстаўся. Кожную суботу жонка Ільі Фаміча з унучкай ехалі праведаць хворага ў сталіцу і ў нядзелю вярталіся назад. Больш за астатніх гэтыя шыкоўныя паездкі хвалявалі Варвару Якаўлеўну; яна якімі толькі словамі не называла свайго чалавека: «ануча», «слізняк», «амёба», «мікроб»...

Доўга ён баяўся без дазволу першага карыстацца гэтай машынай, пакуль (падказаў Авяр'ян) не рызыкнуў на ёй паехаць у сталіцу да першага, каб узгадніць спіс кандыдатур, вылучаных райкомам на атрыманне ордэнаў і медалёў. Пасля Старадарожац шкадаваў — не трэба было ехаць, можа, з-за машыны першы ў тым спісе толькі і паправіў адно месца: супраць прозвішча Старадарожац закрэсліў ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга і напісаў ордэн «Знак Пашаны». Прачытаўшы гэта, Варвара Якаўлеўна параіла наогул зняць сваё прозвішча, а выставіць наступны раз асобна ад усіх і адразу на Героя. «Альбо ўсё, альбо нічога!» — казала яна. Выйшаў Указ аб увекавечанні заслуг двойчы Герояў, аб бюстах на радзіме. «Альбо ўсё, альбо нічога»,— гарачылася Варвара Якаўлеўна, якая атрымала магчымасць карыстацца райкомаўскай «Волгай» як сваёй.

Паехалі ў Вільнюс на «талкучку», купілі Анатолю Станіслававічу касцюм-тройку ўпершыню ў жыцці. Ён раздабрэў у свае пяцьдзесят (нарэшце), лёгкая сівізна на скронях і акуляры надавалі яго твару інтэлігентнасць, як прафесар які... Знікла сутуласць, не было больш тонкай гусінай шыі, за якую недалюблівала свайго чалавека Варвара Якаўлеўна.

«Альбо ўсё, альбо нічога...» Ён паслухаў і выкрасліў сваё прозвішча. Ці данеслі першаму, ці ён сам пазваніў... а дванаццатай гадзіне ночы і загадаў, каб выкраслілі са спісу брыгадзіра калгаса «1 Мая», у якога, як ён даведаўся, у гэту зіму памерзла 100 цэнтнераў бульбы, не змаглі захаваць, і папрасіў яшчэ раз пільна праверыць ва ўсіх кандыдатаў біяграфіі... да трэцяга калена... сказаў таксама, развітваючыся, як бы мімаходзь, каб Старадарожац супраць свайго прозвішча паставіў ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга.

— Давай усё ж я дапішу? — раіўся з жонкай Анатоль.

— Бач, стары хрыч, не можа перажыць, калі і ў цябе будзе ордэн. Ты іх два заслужыў. Выкраслі.

— Ён злапамятны. Усё зробіць, каб выпхнуць мяне ў выканком ці ў старшыні калгаса. Трэба чакаць. Усё ўзгоднена, мяне падтрымліваюць, ёсць свае людзі ў абкоме. Як толькі ён пойдзе на пенсію, раён аддадуць мне.

— Яго ж пакуль не вынесуць нагамі ўперад, сам не пойдзе. Час такі... каб па сваёй волі ад карыта адступіцца? Яму няцяжка, ты, як вол, цягнеш і райком і выканком. Каму расказаць... торф, дарогі, кінафікацыя, медыцына, школы, выязныя пасяджэнні выканкома... Нічога без цябе не могуць. Навошта тады выканком, калі ўсё звалена на твае плечы?

— Я страхую ўсіх, бяру на кантроль усё! Дысцыпліна падае... кожны тыдзень я гадзіну праводжу за трыбунай, за гады работы восем месяцаў за трыбунай. Так... Словы, словы... можа, работы і не бачна... такая спецыфіка кіравання, без яе нельга. Ніхто правільна не можа напісаць рэзалюцыю, пастанову партыйнага сходу, запісаць пратакол, ніхто не ўмее правільна скласці прывітальны адрас на імя Генеральнага сакратара.

Авяр'яну, канечне, лягчэй... паймалі злодзея ці забойцу, затрымалі хулігана, падабралі на вуліцы п'янага, у рэстаране, выявілі растратчыка — усё навідавоку, пішы справаздачу. Пастаянна новыя метады... Атрымалі трубку для ДАІ, каб выявіць піў ці не піў — дыхні, і гатова. На магазіны аўтаматычную сігналізацыю ставяць, ёсць рэспубліканская картатэка злачынцаў, а ў мяне што... белы аркуш паперы ды ручка. Ведаеш, як нялоўка было, калі не змог на адным сходзе адказаць на пытанне: якая розніца паміж словамі «эмігрант» і «імігрант»?

— Адказаў бы: здраднік і там і тут. Цябе ніхто не просіць надрывацца. Прымушай рабіць апарат, размяркуй абавязкі, ёсць жа камісіі розныя. У мяне, напрыклад, кожны настаўнік мае грамадскае даручэнне і нясе персанальную адказнасць. Я ім даю нагрузкі, каб не было часу муціць ваду і пісаць ананімкі. У цябе ж актыў ёсць горада і раёна.

— Адно слова, што ёсць. Быў у мяне адзін у камісіі, ветэран. Былы рэвізор. Завальвае ананімкамі ўсе газеты і аддзелы ЦК. У параўнанні з ім твая справа з Уладыкіным пусты гук. Дзесяць камісій перажыў, а ты пра актыў. Пакуль гладзіш кіраўнікоў па галоўцы, падпісваеш іхнюю ліпу, перакідваеш, спісваеш пазыку — ён добры, любіць і партыю,

і райком, а пачні патрабаваць ды кантраляваць — скардзіцца ў вобласць. Дажыліся. Запрасілі з братняй Літвы гасцей, мала таго што нашы кіраўнікі па-беларуску дватры словы прывітання сказаць не могуць, дык калі ў фінальнай частцы ўрачыстасці заспявалі «Інтэрнацыянал» — сарамата, дзікунства — ніхто ж слоў не ведае! Работнікі райкома не ведаюць! Рот для блізіру адкрываюць. Добра, што Авяр'ян на закрыццё паспеў з пласцінкай, дык далі па дынаміках на ўсю залу. Упэўнены, што зноў былы рэвізор пашле ананімку. Як узняць аўтарытэт партыі?

— Як узняць... Ты ж як дэлегат XXV з'езда партыі два гады ездзіў па гаспадарках і прадпрыемствах раёна, агітаваў, даносіў рашэнні з'езда да народа. Хіба ж гэтага мала? — здзівілася Варвара Якаўлеўна.

— Відаць, мала.

— А сродкі тваёй інфармацыі? Газета, радыё. Трэба пашырыць тэмы, напрыклад: «Саветы і жыццё», «Правафланговыя пяцігодкі», «Партыйнае жыццё», «Школьнае жыццё». Шукайце новыя формы, бо хутка тэлевізары забяруць увесь вольны час.

— Газета, радыё... Найшла што ўспомніць. Раёнка ўчора выдала такі ляпсус: «Нашы звеннявыя рыхтуюцца да новага ўраджаю, ноччу не спяць!» Пародыя нейкая. Праўду ўсе баяцца сказаць, усе...

— І ты?

— І я. Мне пяцьдзесят. Поезд, як кажуць, пайшоў. Раней кожны кіраўнік сядзеў тры — пяць гадоў і — на павышэнне альбо ў другі раён, у вобласць. Кіраўнікі былі і ёсць пастаянныя пасажыры, бо загадзя ведаюць, што сядзець часова, што іх перакінуць... а калі часова, усё чужое: калгас, завод, школа, горад. Часовыя людзі, часовая зямля, часовая пасада: калі ўдумацца, гэта жахліва, няма нічога свайго, няма што бараніць. І я прасядзеў на чамаданах у Белагрудку... не пашэнціла, не забралі... Я чуў толькі адно слова «давай». Давай... насустрач юбілею, дню свята, давай дагонім Амерыку. Не будзеш адпавядаць гэтаму «давай», цябе заменяць на іншага. Так, я баюся, як і ўсе, баюся пакрытыкаваць абкомаўскага работніка, першага сакратара свайго раёна... Можа, табе падасца дзіўным, але ж з ананімак рэвізора я выпісваю ленінскія цытаты. Так-так... Чытаючы часам яго ананімкі, я лаўлю сябе на думцы, што і я, грэшны, так лічу і думаю, як сам аўтар. Юрась твой, ведаеш, якое мне абвінавачванне кінуў, што, маўляў, партыя

ў асноўным вінавата ў тым, што ў душах ідзе разбурэнне самастойнасці, духоўнасці і патрыятызму.

Я табе скажу, крывіцца на ўладу будуць заўсёды. Чалавецтва на такой ступені свайго развіцця, што назад у пячору пад крыло правадыра племя не хоча. Наадварот, людзі хочуць, каб іх спакой ля тэлевізараў ахоўвала міліцыя, войска ад знешніх ворагаў бараніла, каб была гарантыя будучыні. Мы мала ствараем матэрыяльных каштоўнасцей, а чалавек па паганай натуры сваёй бачыць найперш гэта.

Я заслужыў Героя даўно толькі за тое, што кожную раніцу роўна ў дзевяць і да шасці на рабочым месцы. І ён, зайздросная жаба, сам не гам і другому не дам... падпісвае мяне да ўзнагароды, а ў самога рука дрыжыць.

— Мне падабаюцца твае словы, Толя. Ты мысліш маштабна. Ведаеш, я перадумала. Пакінь сваё прозвішча ў спісе. Каб не было падстаў для помсты. Скажуць, ён адмовіўся ад ордэна. У нас за шэсцьдзесят год ніхто ад дзяржаўнай узнагароды не адмовіўся. Пакінь. Злы чалавек ідзе па няправільным пуці, а добры па правільным — вучыла мяне маці. Не вечна ж ён будзе першым.

— Ну, а Мао вунь колькі жыве?

— Знайшоў з кім параўноўваць. Усё. Пытанне вырашана. Вось што... Абавязкова зрабі фотаздымак у новым касцюме для музея. Матэрыялы пра Ліхадзея там займаюць паўсцяны. Нібыта ён адзін і заснаваў партызанскі рух і кіраваў ім. І яшчэ. Трэба нарэшце вырашыць, як прапіхнуць дачок на філалагічны факультэт універсітэта.

— Адна надзея застаецца. Выбралі на другі тэрмін нашым дэпутатам Антона Антонавіча Шабыльчыка.

— Дык дзейнічай. Час ляціць хутка. Мы вылучым яго на прэмію.

— Ён адну атрымаў.

— Давай на Ленінскую.

— Не гарачыся. Ён хоча атрымаць званне народнага.

— Цудоўна. Наша школа мае пабрацімаў-вучняў у Ольштыне і ў Роўна. Будзем пісаць куды трэба ўсе разам. Няхай скажа куды.

— Трэба прасіць Авяр'яна.

— Без яго ты кроку не ступіш. Не дай бог, да баб, да камсамолачак разам ходзіце, асарамачу на ўвесь белы свет, запішы на лбе.

— Проста ён сябруе з Шабыльчыкам з вайны.

— Што ж ён ягонаму сыну не дапаможа. Боўтаецца трутнем па Белагрудку.

— На юрыдычны цяжка. Філалогія Шабыльчыку бліжэй. Там усе свае. Яго хлеб.

— Дзейнічай. Няхай так. Я не перажыву, калі яны не паступяць.

На тым яны і закончылі нядзельны абед.

Анатоль Станіслававіч узяў бутэльку мадэры (сувенір прывёз яму загадчык аддзела культуры, які вазіў хор Белагрудка ў Крым на выступленні) і пайшоў на чацвёрты паверх да Авяр'яна.

Ліхадзей быў адзін, жонка праводзіла старты ГПА.

— Гэта ты, дружа, б'еш у дзесятку,— упэўнена пачаў Авяр'ян, калі даведаўся пра клопаты Старадарожца,— бо калі я прасіў гэтага нязграбу за свайго сына, дык ён развёў рукамі, кажа, юрыдычны не кантралюем, от з філалогіяй... няма пытання. Там у яго нявестка працуе ці дачка... не помню. Даю сто працэнтаў, што дочкі твае будуць там.

Авяр'ян добра помніў, што Шабыльчык яму шмат чым абавязаны.

...Далучыўся Антон Антонавіч да партызан перад самым вызваленнем... мо ніводнага разу і не стрэліў з карабіна за чатыры месяцыляснога жыцця. Напачатку быў ля кухні, а пасля ўзялі яго да сябе газетчыкі, калі даведаліся, што ён умее жвава чытаць і пісаць па-беларуску. Зусім нядаўна (нейкі год таму) Шабыльчык прыязджаў у раён, прасіў Авяр'яна, каб той дапамог узяць даведку і на жонку пісьменніка, якая быццам таксама была звязана з партызанамі, дапамагала яму асабіста і мела сувязь з атрадам. Жонка выходзіла на пенсію, і Шабыльчык вырашыў зрабіць ёй, як і сабе, персанальную. Дапамог Авяр'ян, далі Шабыльчыку такую даведку.

Так, сам-насам яны збіраліся зрэдку, баючыся, што адзін з іх закране ў гаворцы ці нагадае тую лютаўскую ноч сорак чацвёртага. Калі, як сёння, і выпадала пасядзець адным, то гаворка была больш сумбурная, гаварылі пра ўсё ўрыўкамі з недагаворкамі, перапынялі адзін аднаго і мянялі тэму альбо абрывалі на паўслове расказ, зноў жа трымаючы пад кантролем свае паводзіны і пільна сочачы за бегам думкі таварыша.

Авяр'ян адразу ж пасля просьбы Анатоля, калі выпілі віно, адкрыта выклаў і сваю турботу: прасіў пакінуць на пасадзе сакратара парткома аднаго калгаса сваю даўнюю знаёмую. Старадарожац даў згоду, нічога не пытаючыся. Селі гуляць у шахматы. Чорныя фігуры (так было заўсёды) былі ў Старадарожца, бо ён гуляў мацней.

— Як вазьму лішку — цісне пячонка. А ў цябе? — Авяр'яну хацелася пагаварыць.

— Што ж ты хочаш, не атамны рэактар... З ярмаркі едзем. Паўсотні адпахалі.

— Ну, а твой старац як, не памірае яшчэ?

— То ў лечкамісіі, то ў Крамлёўцы, то ў санаторыі... Чаго паміраць. На рабоце месяцы тры на год — астатнія бюлетэнь. Хварэе тады, калі райкомы задыхаюцца: вясною, як сяўба, і па восені — калі ўраджай ідзе ды справаздачна-выбарныя сходы пачынаюцца. Я дзесяты год не магу пайсці ў адпачынак улетку. Быў я неяк з ім на праверцы па льну. Адна і тая ж стандартная фраза: «Верхняя саломка пераляжала, а ніжняя недаляжала». І ўсё. І праходзіць усюды на «ўра», як знаўца сельскай гаспадаркі. Я не ведаю, дык і не лезу з парадамі, раюся са спецыялістамі ў аддзеле, а яму хоць бы хны. Колькі з ільном справу мае, не петрыць ні грама, вазьмі пачытай кніжку, каб не аблапошыцца. Дваццаць гадоў адно і тое ж — «верхняя пераляжала, ніжняя недаляжала».

— А куды дзецца? Ідзе следам пакаленне адукаваных. Рана ці позна, а прыйдзецца ім саступіць месца. Я, прызнаюся, пачаў шукаць сабе пасаду. Калі знянацку знімуць, не мой характар, не пераджыву, лепей самому перайсці куды.

— Табе не варта турбавацца. Як мне аддаць усё гатовае чужому? Колькі сіл і здароўя аддаў я, каб падняць раён. Я вапну, як ты помніш, прымусіў вазіць з-пад Міра, каб нейтралізаваць кіслотнасць нашай глебы. Зямля ў большасці гарыстая ды камяністая. Маімі намаганнямі калгасы паднялі ўраджай. Я адбудаваў Белагрудак. Заліў вуліцы асфальтам. Ты помніш дзесяць год таму... гразюка была непралазная. Пры мне пайшлі грошы ад кінасеткі: трыццаць пяць тысяч кінасеансаў, якія яшчэ раён можа так пахваліцца гледачамі. У нас застаўся адзін мінус: бытавое абслугоўванне. Няма культуры, свае мазгі не ўставіш! Гэта агульная хвароба: людзі жывуць адным днём, як чужыя. Я бачу і такую прычыну: само абслугоўванне стасуецца з лізаблюдствам, пакланеннем, рабствам і знявагай чалавечай годнасці. Так аналізуючы, думаю, што не ў прыродзе гэта нашых людзей гнуць горб і танцаваць перад кліентам сербіянку-мамку. Не трэба звяртаць увагу на Захад. Мы не можам выцягваць грошы з людзей любой цаной — бо гэта прывядзе да бездухоўнасці і дэградацыі чалавека як асобы. Ведаеш, я і старшыні райспажыўсаюза даў наганяй. Паехалі, купілі ў саўгасе

сорак тон ранняй бульбы па дваццаць пяць капеек, павезлі ў Гродна і прадалі па сорак капеек.

— Мілы мой, камерцыя... у яе свае законы.

— Буржуазныя метады. Дарэчы, даўно хацеў цябе папытаць: чаму ўсё больш і больш на лабавым шкле нашы машыны выстаўляюць партрэт Сталіна. Адкуль гэта? Мода, ці што?

— Пра гэта ты лепш запытай у нашага мясцовага кагэбіста,— усміхнуўся Авяр'ян.

— Што адказаць, калі часам запытаюць на сходзе?

— Адкажы, што кожны выбірае сабе куміра сам, адпаведна сваёй распушчанасці. Да нас прыехаў адзін грузін на аўтабазу... пачапіў першы, на яго гледзячы, яшчэ тойсёй прычапіў. Трэба змірыцца, сталінскую дысцыпліну не вернеш...

— Каб ведалі, што ён натварыў, не выстаўлялі б.

— А што, ён адзін тварыў?

— У вас у органах пануе факт, а нам партыйным ніяк нельга ўсю праўду народу казаць. Мы, мякка сказаць, толькі-толькі вызначаем правільныя метады партыйнага кіраўніцтва. Трэба шырэй даводзіць да народа, што ўсё, што мы робім, правільна і адзіна верна. Палітвучоба — слабае месца.

— Ай, канчай гэту сваю дэмагогію. Ні чорта вы там не даводзіце, праціраючы штаны, складваючы паперы ды перасылаючы іх адзін аднаму. I мой сакратар так робіць. Перапісвае пастановы. Ксёндз наш машыну купіў... таксама ідэолаг, і таксама нічога ж у яго пропаведзях і службе не зменьваецца. Усе ведаюць, што на вялікдзень будзе тое ж, што і ў мінулы год, і дзесяць, і сто гадоў назад. Прыходзяць новыя людзі, рытуалы адпрацаваныя і нязменныя. Ён не саромеецца. А ты купі машыну... загрызуць. Хабарнікам абзавуць. Трэба плюнуць на ўсё і жыць для сябе... усё ўцякае з-пад ног... Спяшайся. Так?

— Так.

— Перастаў я, брат, даўно жыць ідэямі... і дзеля іх адных. Жыццё кароткае... зубы ўжо выпадаюць... трэба паспець узяць сваё, што нам належыць. Усе прывыклі на чужым гарбе ў рай... а мы горшыя?

— I ў ксяндза можна таму-сяму павучыцца, як жыць і браць сваё. Намякну старшыні райвыканкома, няхай дабавіць касцёлу здаць у фонд міру не тысячу рублёў, а дзве...

— Давай, давай, а заадно знімі працэнт і са старшыні выканкома.

— Як? Не разумею.

— За кватэры хабар бярэ. Магу прыстрашыць... Няхай падзеліцца, а?

Старадарожац больш чым здзівіўся.

— Крый божа... мяне ў гэтую справу не...

— Добра. Не хвалюйся так. Глядзі на дошку... шах табе?.. Давай яшчэ адну.

— Давай,— сказаў абыякава ад пачутай навіны Старадарожац.

— Расстаўляй. Ты так здзівіўся, што я гатовы паверыць, што ты сапраўды нічога не ведаў. Ці ён адзін. Мухлююць у рэстаране, на сырзаводзе, крадуць у сталоўках бальніцы і дзіцячага садзіка.

— Я ж яго выхаваў. З камсамола... узяў яго пад апеку... гэта ж мой кадр.

— Чалавечая душа пацёмкі, так кажуць людзі, твой ход.

— Даруй, не магу сёння гуляць. Галаву сціснула... Ад рэзкай змены надвор'я... Апошнім часам страшна ціск скача,— шукаючы спачування, сказаў Анатоль Станіслававіч.

— Гэта ад шампанскага, каньяку і сухога віна. Колькі разоў цябе вучыў — пі заўсёды адно: гарэлачку пад харошую закусь.

— Дык што мне рабіць, Авяр'ян? Калі, не дай бог, усплыве ўсё, а нічога патаемнага няма, калі-небудзь ды ўсплыве — можа, пляма і на мяне. Я ж аб'ектыўна не маю адносін да размеркавання кватэр.

— Вось іменна. Аб'ектыўна. Усе ведаюць, што без дазволу райкома муху ў сталовай не заб'юць.

— Я яго звольню, пакуль не позна.

— Правільна. Намесніка яго зрабі старшынёй, а мяне намеснікам.

— Як? — здзівіўся Анатоль Станіслававіч.

— Не зараз... у перспектыве... бліжэйшай.

— Праўда? — не хацеў верыць Анатоль.

— Старасць, дружа мой. Быў у Мінску на нарадзе. Увечары грамаў сто пяцьдзесят узяў для разрадкі. Іду па бязлюдным праспекце да гасцініцы. Стаў на плошчы Коласа, захацелася светлавую газету пачытаць. Дзіковінка. Стаю, чытаю: колькі сталі варым, колькі рыбы ловім, колькі лесу валім... Зачытаўся. І тут нехта з галавы шапку, майго «пыжыка» за сто восемдзесят рублёў — хваць. Я — за імі. За філармонію туды... там горка. Адставаць стаў. Дыхаць цяжка. Аж у сэрца закалола. Не, думаю, сука... Я цябе

дастану. З цемры яшчэ два выскачылі... мне падножку... а самі ўгару, да кафейні. Ледзь падняўся я з зямлі... задыхаўся... Злы на ўвесь белы свет... Холадна. Позна. Мусіў браць таксі да Шабыльчыка. Даў ён, у кулак пасмейваючыся, сваю старую шапку. Вось табе першая прычына. Надакучыла гэтая сабачая работа санітара. Ніякай павагі. Дырэктар аўтабазы і той, панімаеш, член бюро райкома. Задрыпаны твой інструктарышка і той правярае, панімаеш, маю работу і работу маёй партарганізацыі...

— Даруй. Мая віна. Не трэба было ўключаць праверку ў планы работы... Трэба ўсё абмазгаваць, не пароць гарачку. Пакуль ты кіруеш міліцыяй, і я адчуваю сябе спакайней. Можа, ёсць усё ж іншыя прычыны? Скажы. Калі ўжо мы пачнём адзін ад другога таіць нешта... Тады...

— Стаміўся... Не паспяваю выхоўваць, не патрабую. Хоць і кажуць — у сям'і не без вырадка. Зноў вяртаемся да адной гісторыі. Як ты кажаш, аб'ектыўна ніхто не вінаваты.

— Нешта здарылася?

— Два мае міліцыянеры... яны родам з вёскі... уліплі па вушы. Прыехалі ў вёску Падзішчы на вяселле. Сваты, гэта як закон, дарагіх гасцей частуюць ды яшчэ і на дарогу даюць. Мне ў падарунак прывозяць. Я на гэтую самую глядзець не магу... гарэлачку за мілую душу, а самагон... сасуды ад яго мякчэюць. Выпілі яны. Падалося, што мала ім далі, што на іншых вяселлях даюць больш. Прычапіліся да шафера, маўляў, давай ідзі прынось яшчэ, бо запішам, што самагон гоніце. Шафер выпіўшы быў, раззлаваўся, прагнаў іх з двара. Не супакоіліся мае хлопцы. Праз паўгадзіны падхапілі шафера, у матацыкл з каляскай кінулі... каб ён не палез першы, можа, усё ціха і скончылася б... маім малатабойцам толькі дай волю. Да смерці збілі і кінулі ў снег. Пакуль яго падабралі, завезлі ў бальніцу... Адным словам, памёр шафер.

— Я чуў пра гэта.

— Пахавалі. Усё як быццам ціха. Маці таго хлопца напісала ў вобласць. Тады на месцы патушылі агонь. Ездзілі да яе, гаварылі, угаворвалі. Не супакоілася. Паехала на Палессе. Там акурат была сустрэча першага сакратара з выбаршчыкамі... Карацей кажучы, змагла там перадаць сакратару заяву-прашэнне... скаргу сваю на міліцыю. Утварылі з міністэрства камісію... вось едуць эксперты, будуць рабіць эксгумацыю.

— Калі?

— Заўтра будуць тут.

— І што можа высветліцца?

— Высветліцца, што трэба судзіць міліцыянераў. Як быццам я ўскосна і не вінаваты, а страгача атрымаю. Надакучыла быць пастаянна на мяжы паміж жыццём і смерцю. Прыходзяць у аддзел усе з ромбікамі, глядзяць на цябе як на непаўнацэннага. А ўзяць голымі рукамі злачынцу не могуць.

Тут Старадарожац успомніў выпадак, калі злавілі двух асабліва небяспечных злачынцаў, якія збеглі з гродзенскай турмы. Дзве ночы тады кіраўніцтва раёна не спала, усе знерваваліся. Паступіў сігнал, што бандыты едуць у аўтобусе Ліда—Белагрудак. Выратавала смеласць і вынаходлівасць Ліхадзея, які апрануўся ў адзежу селяніна, узяў у рукі кош з гусем і, накульгваючы на адну нагу, пайшоў да прыпынку. Пасля казалі, як ён пачаў кракатаць ды войкаць у аўтобусе пад смяшкі прысутных, прыкмеціў бандытаў (яны сядзелі на апошніх сядзеннях ля дзвярэй), пастулова наблізіўся да іх, жартуючы, даў аднаму патрымаць кош з гусем, а сам палез па кашалёк, каб заплаціць за білет. Не паспелі яны і апомніцца, як ён, выхапіўшы з кішэні пісталет, ударыў ім аднаго па галаве, а другому, які трымаў кош, прыставіў дула да скроні. Атрымаў тады Ліхадзей за гэта імянны гадзіннік у пазалочаным корпусе і грамату абласнога ўпраўлення. Было, праўда, гэта даўнавата...

Авяр'ян тым часам спавядаўся Старадарожцу далей.

— Я, ведаеш, маю такі характар, прывык так — альбо я першы, альбо там, дзе я другі, не бываю.

— Авяр'ян, пабойся бога... табе ды жаліцца на недахоп аўтарытэту? — не хацеў згаджацца Старадарожац.

— Наш аўтарытэт з табой, дружа, падобны на аўтарытэт вялікага палітыка, галоўнага кіраўніка — знялі яго і нядаўна яшчэ вялікі аўтарытэт лопаецца, як мыльняк. Французы правільна гавораць: слава палітыка і артыста — дым. Па натуры я разведчык, люблю, каб заўсёды было куды адступаць, каб быў забяспечаны тыл. На жаль, прырода чалавека не дазваляе ўвесь час да смерці трымацца на грэбні хвалі. Гэта ўсё хлусня пісьменнікаў, што можна, маўляў, займацца самаўдасканаленнем бясконца. Генеральскія пагоны мне не свецяць, дык які сэнс згараць? Я самалюбівы, ты ведаеш, крытыка нават за вочы, за спінай: майго стылю работы, паводзін, маёй паходкі, манеры гаварыць, манеры піць гарэлку, манеры спяваць «Чарнявая, бялявая, руса каса кучаравая», манеры трымацца на людзях, весці

пасяджэнне — такая крытыка даводзіць мяне да белай гарачкі. Суцяшэння няма. Я ў такім узросце — гэта пачалося недзе пасля сарака, калі люблю і хачу адказваць за сябе сам, без падказкі малакасосаў. Мне, калі хочаш, нельга з людзьмі, нельга імі кіраваць, бо я іх ненавіджу. Гэта шчыра кажу, за тое, што яны пазбаўлены ёты самастойнасці. Пра які камунізм у тысяча дзевяцьсот шасцідзесятым годзе талкаваў нам Хрушчоў? Няўжо ты верыш, што калі-небудзь праз сто, тысячу гадоў можна выключыць будзе з жыцця распусту людзей?

— Хрушчова мы развянчалі. У нешта ж трэба верыць, Авяр'ян. Вер у сацыялізм, у перамогу дабра над злом,— разгубіўся Анатоль.

— Дэмагогія і з верай. Выйдзі на вуліцу... бязвер'е. Ксёндз на пропаведзі плача... Кажа, так да касцёла ніхто не ідзе, пра бога кожны дзень не ўспамінае, а ўжо калі прыпрэ, прыцісне жыццё — падае ніц і моліцца, як звар'яцелы. Бач, рэлігія іх навучыць не можа амаль за тысячы гадоў.

— Бо чужая рэлігія. Не свая.

— Якая розніца. Тылы з нашай голай зарплаты не забяспечыш, вось чаму я не асуджаю старшыню выканкома. Упэўненасці, што я буду вечна пры ўладзе — няма.

— Калі па ўзросту ці з-за непрафесіяналізму пераводзяць на іншую работу — гэта прыстойна, а калі са скандалам — ганебна. Я веру, што правільна жыць лягчэй. Сумленне не мучае,— не саступаў Анатоль. Насцярожыўся, яму падалося, што супярэчлівы Ліхадзей у гэты момант абавязкова ў сваёй гарачцы нагадае пра Аляксандру Батуру.

— Сумленне — птушка, якую трымаюць у клетцы для сваёй асалоды і не выпускаюць на волю,— адказаў Авяр'ян, змаўчаўшы пра Аляксандру, і раптам перайначыў усё, як быццам нічога да таго не выказваў і быў ва ўсім згодны з Анатолем.

— Мажліва, твая праўда. У мяне, відаць, не хапае ведаў. Трэба свае сумненні час ад часу падтрымліваць вопытам з жыцця людзей, а там, акрамя крыві, зайздрасці і хлусні, я нічога не знаходжу, такі характар. Веды я браў сабе наскокам, самапасам, у гуртках палітзаняткаў. Ніводнай філасофіі толкам не ведаю — нешта магу блытаць.

— Авяр'ян, я думаю, што твая такая падазронасць да ўсіх і непрыязнь — гэта ўсё-ткі ідзе ад прафесіі, а не ад характару. Я чытаў у адным часопісе, што ёсць прафесійныя

хваробы, што яны часта служаць прычынай душэўных дэпрэсій.

— Як ты сказаў?

— Душэўных дэпрэсій. Калі ўсё няміла.

— Вось-вось... гэта ў мяне. Даўно. Я, брат, ужо без таблетак не засынаю..

— А як ты?

— Па-рознаму. Як калі...

Вярнулася Рэгіна, і таму яны з маўклівай згоды вырашылі развітацца, праўда, добразычлівая Рэгіна, нягледзячы на стому, прапанавала пасядзець яшчэ, абяцала пачаставаць сапраўднай бразільскай кавай. Старадарожац пачціва адмовіўся.

Авяр'ян пайшоў за сябрам на лесвічную пляцоўку, куды ён выходзіў пакурыць, калі балела галава ў жонкі і калі ён быў цвярозы. Як бы мімаходзь на пляцоўцы ён і сказаў асноўнае, пра што і хацеў паведаміць Анатолю:

— У музеі не быў?

— А што? — Колькі разоў ён лавіў сябе на думцы, што кожны раз пры сустрэчы з Ліхадзеем гэтае «А што, здарылася што-небудзь?» ён пытаўся абавязкова і рэгулярна.

— Не падабаецца мне там твой Уладыкін. Саманадзейны такі, настырны... Прычапіўся, як палавумны, да маёнтка Батуры... піша ў архівы, шукае сведак... Навошта нам зараз сыпаць соль на раны... Мне нязручна, сам разумееш, а ты ціха там вазьмі пад свой кантроль, каб ён дроў не наламаў... Чорт... Я б на тваім месцы вярнуў бы яго назад у школу... Спакайней будзе і ў цябе і ў мяне на душы. А за дачак — ручаюся. Зраблю.

— Добра. Дзякуй, што папярэдзіў. Я падумаю.

— Тады бывай здароў!

— Усяго добрага.

«Ну вось, пачынаецца... Так і ведаў, так і ведаў... Што рана ці позна, гэта пачнецца... Навошта мне гэта зараз? Калі ўсё адносна добра і спакойна».

У пакоі кінуўся ў вочы дарагі (рублёў за трыста) абедзенны набор, які яму падарылі на дзень нараджэння старшыня выканкома і Авяр'ян. Разам! Як ён раней не заўважыў іх супольнасці. А можа, яны ўжо дзеляцца хабарам, і сёння Авяр'ян, як кажуць, зандзіраваў глебу? Чорт вазьмі... як усё да аднаго ліпне...

Упершыню, доўга не засынаючы, Старадарожац пашкадаваў, што дапамог Ліхадзею перабрацца ў Белагрудак. Паўставаць супраць яго, не згаджацца, а тым больш ад-

даляцца ад Авяр'яна Паўлавіча і бессэнсоўна і небяспечна. Няўжо наканавана лёсам ісці, як у густым тумане, разам? Пад адной вуздэчкай? Так. Пад адной у розныя бакі не пабяжыш. Няўжо Уладыкін зможа дакапацца да праўды аб пажары ў маёнтку і смерці Аляксандры Батуры?

Мала-памалу сямейнае жыццё Уладыкіных наладзілася: падрастаў вельмі пацешны і кемлівы сынок, гадавалася дачушка. Паліна вярнулася ў школу, паводзіла сябе вельмі асцярожна, падтрымлівала дырэктарку, нават калі ў нечым і не была з ёй згодна, трымалася за работу, баялася каму-небудзь адкрыць свае думкі, каб, не дай бог, не данеслі да вушэй Варвары Якаўлеўны, якая ашалела ад сваёй бескантрольнай улады. Шчыра яны гаварылі толькі ў сям'і, паміж сабою. Дзеці — гэты барометр школы — гублялі дысцыпліну, павагу да ўсіх настаўнікаў і жаданне вучыцца з кожным годам. Баяліся і, як мышы, паводзілі сябе на ўроках дырэктаркі, зубрылі гісторыю, як калісь іх дзяды «Ойча наш».

Дастаткова было без памылкі назваць гады праўлення таго ці іншага цара, год і месяц паўстання, і гэта было зарукай, што атрымаеш добрую адзнаку. Паліна не была класным кіраўніком, па ўзросце выбыла з камсамола, не мела грамадскіх даручэнняў, любіла праводзіць час у сям'і. Прыходзіла маці Юрася, сядзела з дзіцем. Да сваёй маці Паліна дзіця не вадзіла. Брат Грыша адседзеў за дармаедства два гады, вярнуўся ў Белагрудак і паціху прапіваў пенсію.

Юрась багата часу прападаў у сваім музеі. У яго нават як бы і характар змяніўся. У вольны час да апоўначы пісаў дома лісты ў розныя куткі Саюза. Паліна сварылася, што ён траціць на канверты болей грошай, як атрымлівае іх у палучку. Дакоры жонкі былі не зласлівымі.

Ён, апантаны, знаёміў яе з фактамі гісторыі, прыносіў дзівосныя легенды, зачытваў рэдкія факты і матэрыялы мінулых гадоў. Паліне самой рабілася цікава слухаць яго.

Старадарожац свой візіт да Юрася адклаў роўна на два тыдні. Раніцай прыйшла нечаканая прыемная навіна: яго ўключылі ў склад дэлегацыі работнікаў сельскай гаспадаркі на паездку ў Францыю. Забылася разам усё. За ўсю савецкую гісторыю Белагрудка гэта была першая паездка прадстаўніка раёна ў камандзіроўку за мяжу. У Польшчу (найчасцей), у Чэхаславакію, Балгарыю рэдкія турысты з мясцовых былі... а вось каб у камандзіроўку ў капкраіну...

гэта была сенсацыя. Усе віншавалі Варвару Якаўлеўну, сядзелі ў яе кабінеце, нехта нешта ўспамінаў пра тое, што калісь чытаў пра Парыж, Елісейскія палі, Манмартр... Яна прымала віншаванні з такім шчаслівым тварам, нібыта ехала сама. Купіла Анатолю дзве белыя нейлонавыя кашулі, тры пары новых шкарпэтак, трусы, новыя хатнія тапкі, новы чамадан... і ўзяла з яго клятву-абяцанне, што ён не будзе нават гартаць парнаграфічныя часопісы і глядзець распусныя фільмы.

Ён пярэчыў: «Як ты магла нават думаць такое? Я ж афіцыйная асоба, адзін з кіраўнікоў...»

Праводзячы яго, Варвара Якаўлеўна нават заплакала.

...Калі ж муж прыехаў назад, толькі і было гаворкі: «А вось у Парыжы зараз модна тое і тое, а вось у Парыжы такая дробязь каштуе столькі, а вось у Парыжы...»

Абурэнне выклікала ў яе тое, што Паліна, адна Паліна нічога пра Парыж не запытала. «Нічога ў свеце яе не цікавіць...»

Далёкая і адносна прыемная паездка мала што змяніла ў настроі Анатоля Станіслававіча. У памяці сядзелі, як скаба ў калодзе, словы Ліхадзея пра музей, пра Аляксандру... У канцы рабочага дня Старадарожац завітаў у музей.

Юрась праводзіў заняткі з членамі савета. Гэта былі вучні сёмых — дзесятых класаў, пенсіянер-настаўнік яшчэ польскай школы, метадыстка Дома культуры і бібліятэкар, блізарукая дзяўчына, якая пачала працаваць першы год у Белагрудку.

Юрась заўважыўшы сакратара, прыпыніў гаворку, але Анатоль Станіслававіч, прысеўшы на крэсла ля грубкі, даў зразумець, каб кіраўнік гуртка працягваў заняткі:

— Нічога, нічога... І мне самому цікава паслухаць.

Уладыкін, акінуўшы позіркам сваіх паплечнікаў, нібыта пералічваючы іх, працягваў гаворку.

— ...На мінулых занятках мы пазнаёміліся з гісторыяй Нясвіжскага замка і Мірскага, а таксама Лідскага замка-крэпасці — помніка абарончага дойлідства XIV стагоддзя, у гэтым годзе, дарэчы, распачалі там буйныя раскопкі. Можна сказаць, што Белагрудку пашанцавала: ён знаходзіцца на скрыжаванні дарог, якія вядуць у нашы слаўныя гістарычныя мясціны. Якіх-небудзь 50—80 кіламетраў да Нясвіжа, Навагрудка, Ліды і Крэва, тых самых слынных калісь Гальшан, пра якія мы распачалі гаворку на пачатку пасяджэння. Тут ужо зрабіў цікавы даклад вучань восьмага класа Тадэвуш Галавач, я толькі дадам, што другі сын Івана

Альгімундавіча, паплечнік вялікага князя Вітаўта, Аляксандр, які меў мянушку Нелюб, у 1405 годзе перайшоў на бок смаленскага князя, дарэчы, свайго сваяка, і з часам атрымаў ад маскоўскага князя, часова, праўда, Пераяслаў-Залескі. Тут багата было сказана пра ўнучку Івана Альгімундавіча Соф'ю, якая ў 1622 годзе абвянчалася ў Наваградку з польскім каралём Ягайлам і зрабілася заснавальніцай дынастыі Ягелонаў. Я прыкмеціў здзіўленне на вашых тварах, калі вы пачулі пра гэта: наша зямлячка і каралева Польшчы?! У нас дагэтуль пад Белагрудкам на горку кажуць гара Міланега. Можа, на гэтай гары гродзенскі славуты дойлід нешта будаваў. Так, так, той самы славуты ў Кіеве Пётр Міланег, які пабудаваў Пятніцкую царкву ў Чарнігаве, каменную сцяну ў Выдубінскім манастыры, царкву ў Оўручы. Багата яшчэ хаваюць нашы храмы, архівы і людзі, часам забытыя ўсімі старыя нашы землякі. Калі мы не запішам, не збяром іх успаміны, казкі, прыказкі — будучыя пакаленні нам не даруюць. Улетку мы правядзём некалькі экспедыцый па раёне. Гэта не азначае, што нам трэба сядзець склаўшы рукі і чакаць лета. Збірайце, нясіце ў музей цапы, пранікі, жорны, кросны, калаўроты, цэбры, маслабойкі, цярніцы, сохі, драўляныя бароны, ночвы, калыскі, сярпы, старыя кніжкі, карціны, скульптуры. Тут мы з настаўнікам, актыўным членам савета нашага музея, склалі ліст у Міністэрства культуры ў абарону нашай Замкавай гары з Паўночнай вежай і касцёла бернардзінаў, помніка XVIII стагоддзя, на які падымае руку наш выканком, ён хоча на месцы касцёла збудаваць новую лазню. Пачнём работу нашага гуртка з гэтага. Дарэчы, жыхары Гальшан пішуць лісты ў абарону свайго замка, у якім размясцілася калгасная ферма.

Каб любіць, трэба ведаць, любіў паўтараць Гётэ. У нас аднаму ведаць мала. Наша задача будзе даводзіць да людзей усё, што мы адкрыем, пашыраць экспазіцыю будучага музея, трымаць пад пастаяннай аховай нашу гісторыю ад розных тарбахватаў, якія ахвочы пералапіць яе на свой лад і на сваю карысць. Перад тым як ліст падпісаць, скажу, што праект, які на мінулым пасяджэнні абмеркавалі, шаноўны Ян Францавіч надрукаваў на машынцы і прынёс нам на подпіс.

Юрась зачытаў наўмысна для Старадарожца змест ліста ў Міністэрства культуры.

— І яшчэ апошняе. Нам трэба выбраць дэвіз нашага савета і ўсяго музея. Я прасіў вас падрыхтаваць такія дэвізы. Кожны на свой густ. Зацвердзім большасцю галасоў

той, які ўсім спадабаецца. Валя, вазьмі ручку і ліст паперы, будзем запісваць. Калі ласка. Хто першы? Прашу... Смялей.

— «Чалавек без радзімы — жабрак». Якуб Колас,— першай сказала кірпатая дзяўчына, і гэта паслужыла як бы сігналам астатнім, пацягнулі ўгару рукі і пасыпаліся прапановы:

На роднай зямельцы ўсе мы не госці,
Усе мы — чыесьці, усе мы — кагосьці.
Хай спарахнелі дзядоў нашых косці,
У нашай натуры ёсць іхняе штосьці.

*Ларыса Геніюш*

«Человеческое достоинство измеряется силою его патриотизма». Н. Чернышевский.

«Будущее в настоящем, но будущее и в прошлом». А. Франс.

Два чувства дивно близки нам —
В них обретает сердце пищу —
Любовь к родному пепелищу,
Любовь к отеческим гробам.
На этом зиждется от века
По воле бога самого
Самостоянье человека,
Залог величия его.

*А. С. Пушкин*

«Человек является прежде всего сыном своей страны, гражданином своего отечества». В. Белинский.

«Кто везде — тот нигде». Сенека.

Верш А. Пушкіна набраў большасць галасоў.

— Анатоль Станіслававіч, можа, вы маеце што сказаць членам савета? — перад тым як адпусціць дзяцей, запытаў Юрась у Старадарожца.

— Магу толькі пажадаць нашай змене прыкласці ўсе сілы і намаганні, каб зрабіць наш музей лепшым сярод раённых музеяў ва ўсёй рэспубліцы. Гэта я жадаю ад імя райкома партыі і выканкома,— дзяжурна адказаў Анатоль Станіслававіч.

Дзеці, якія памкнуліся пакінуць пакой і згрувасціліся ля дзвярэй, пачалі апладзіраваць.

Старадарожац пацснуў руку самаму шаноўнаму члену савета Яну Францавічу. Яшчэ хвіля, і яны з Юрасём засталіся ў памяшканні музея адны.

— Прызнацца, я і не чакаў, што вы так хутка і добра разгорніце ў музеі дзейнасць. Пахвальна. Трэба ўвесь час памятаць, што ў нас ствараецца музей баявой і працоўнай

славы, а не гісторыка-краязнаўчы. Сродкі, якія аддзел культуры адпускае, фонды — мізэрныя. Ліст міністру, праўда, трошкі... пахне нацыянальнай абмежаванасцю, крыклівасцю. Могуць няправільна зразумець. Непрыемны цень падае на інтэлігенцыю горада, на райком. А што, хіба гэты касцёл бернардзінаў... правільней кажучы, дзве сцяны і брама ўяўляюць гістарычную і архітэктурную каштоўнасць? Што ў ім вянчаўся Манюшка, Каліноўскі?

— Каліноўскі не паспеў ажаніцца.

— Не кантралюй мяне так пільна... я да слова сказаў.

— Даруйце.

— Думаю, гэтыя развалiны каштоўнасці не ўяўляюць.

— Я супрацьлеглай думкі. Прыйдзе час, разбагацее раён, горад, і мы рэстаўрыруем увесь будынак.

— Баюся, што нашага жыцця не хопіць, пакуль разбагацеем.

— Без нас зробяць. Я ўпэўнены, чым хутчэй будзе расці духоўнасць людзей, тым больш будзе павагі і любові да свайго. На жаль, цяпер усё зроблена, каб памяць у народзе спала.

— Перабольшваеш. Бачу, хораша тут ужо. Будзе што паказаць людзям. Галоўнае, каб хадзілі.

— Запрашаць будзем. Праводзіць вечары, сустрэчы ля самавара з чаем. Адно бракуе: не хапае плошчы. Самі бачыце. У падвале яшчэ поўна ўсяго.

— Не ўсё адразу. Вось я б на вашым месцы не стаў бы так шмат увагі надаваць жыццю нейкіх там паноў ды манахаў, каралёў ды эксплуатататараў. На якіх прыкладах там вучыць моладзь? Здаецца, калі я не блытаю, абмяркоўваючы планы, статут, мы запісалі і асноўны накірунак развіцця музейнай справы — сацыялістычная перабудова Белагрудчыны. Трэба ўкладваць дзяржаўныя грошы на тое, што патрэбна народу, на праслаўленне подзвігу рэвалюцыі, грамадзянскай вайны, першых пяцігодак, слаўных нашых дзён. Асобны аддзел мусіць быць такі — барацьба з рэлігіяй. Не мне вам гаварыць пра набожнасць нашага рэгіёна... гэта праблема праблем. Я разумею і падтрымліваю ваш энтузіязм, але ж нельга ахапіць усё адразу. У наступнай пяцігодцы, калі не абстрыгуць фонды на культуру, абяцаю, будзем шукаць ці будаваць новы будынак пад музей. Сёння, заўтра нам трэба прыводзіць сюды, пакуль сюды, дзяцей з усяго раёна і выхоўваць іх на баявых і працоўных традыцыях правафланговых пяцігодак.

— Адно другога, паважаны Анатоль Станіслававіч, не

выключае, а дапаўняе. Без мінулага — а яго нам і без таго абалгалі... як чалавек без нагі. Прашу сюды, калі ласка... вось раздзел пра барацьбу Кампартыі Заходняй Беларусі і Польшчы. Ёсць трошкі дакументаў пра жнівеньскія падзеі 1920 года ў Гродна. Вось копія газеты «Известия» таго часу і фота некаторых членаў гродзенскага рэўкома. Асобнае фота старшыні рэвалюцыйнага камітэта Славінскага... Вось тут будзе ўсё, што тычыцца Вялікай Айчыннай вайны на тэрыторыі раёна. Месца, як бачна, катастрафічна не хапае. Тут размешчаны матэрыялы: «Першыя ўдарнікі камуністычнай працы 1965 года».

Старадарожац агледзеў стэнды, плакаты, дакументы пад шклом, фота, копіі дакументаў паспешліва.

— Цудоўна! Проста дзівосна, каб за такі кароткі тэрмін і так шмат зрабілі. Душа радуецца. Колькі знаёмых імёнаў, па-сапраўднаму наш гонар і слава. Фенаменальна, што знайшлі здымак першага трактара... саракавы год, здаецца. Так. Не памыліўся. Партызанскі рух досыць прадстаўнічы. Шкада, што наш камандзір, камісар, ды астатнія баявыя хлопцы-сябры не дажылі да гэтых дзён. Як расквітнела краіна! Які ім гэта цудоўны помнік. Мы прабіваем, каб запаліць у калгасе «1 Мая» Вечны агонь, як на плошчы Перамогі ў сталіцы.

— Дзе ж газу столькі возьмуць?

— Зямля наша багатая... Бачу, для пасляваенных гадоў месца малавата, неяк усе ў кучы... а вы надумалі цягнуць сюды шляхецкія гербы, гісторыі замкаў, маёнткаў... ідэалогія прыгнятальнікаў. Гэта чый герб?

— Беларускі. Пагоня.

— Дазволу, наколькі я памятаю, зверху на гэта няма. Нацыяналістычны буржуазны герб здыміце. Пачакаем, калі вучоныя людзі перабяруць усё ў гісторыі, расставяць на свае месцы, каб мы ведалі, каго пакідаць у ёй, а каго не. Скажам, вось па сваім партызанскім атрадзе: я тут як рыба ў вадзе магу кансультаваць і ўдакладняць спрэчныя ці малавядомыя моманты. А браць на сябе супярэчлівую гісторыю ўзаемаадносін Расіі і Рэчы Паспалітай, Вялікага княства Літоўскага і ролю беларусаў ва ўсім гэтым, па меншай меры, рызыкоўна. Ёсць і над намі кіраўнікі, а ці не прышыюць нам нацыяналізм з усімі гэтымі Сапегамі, Гальшанскімі, Мірскімі ды Радзівіламі?

— Даруйце, але ж жахліва жыць і не ведаць, калі нарадзіўся твой горад, што і каго ён даў свету, а калі не даў, чаму не даў?

— Дату знойдзем, а з імёнамі... давайце ўсё ж будзем узгадняць. Карэкціраваць дзеянні. А з панамі... зразумейце мяне... з часам вернемся да гісторыі, калі будуць выпрацаваны гатовыя інструкцыі і рэкамендацыі. А цяпер пакуль усе сілы і веды нашым гераічным будням. Дарэчы, ідэя! Можна стварыць куток, прысвечаны нашаму земляку ўдзельніку Генеральнай сесіі ААН, дэлегату пісьменніку Шабыльчыку.

— Яшчэ невядома, ці заслугоўвае ён гэтага. Час вырашыць. Варта пачакаць. Удзел у Генеральнай сесіі — яшчэ не талент.

— Згодзен, але ж у перспектыве трымайце пад увагай. Трэба неяк арыентавацца ў часе — на каралях ды панах далёка не паедзеш, яны не кормяць. Два паважаных ветэраны Айчыннай вайны звярнуліся да вас сюды з прапановай стварыць куток гісторыі 18-й арміі. Яны маюць на руках, магу засведчыць, рэдкія фота тых часоў і сённяшняе фота ў Крамлі.

Гэта рэдкі шанс! Не думаю, каб яшчэ які раён, нават вобласць маглі пахваліцца гэтым. А ты ім адмовіў, канечне, незаслужана пакрыўджаныя, яны абурыліся. Гатовы былі пісаць самому. Я паабяцаў, што папраўлю маладога таварыша. Пайдзі насустрач паважаным людзям, адзін з іх паранены. Яны заслугоўваюць гэтага.

— Па-першае, Анатоль Станіслававіч, я ім не адмовіў. Сказаў, калі будзе месца, мы абавязкова ўключым у экспазіцыю іх фота, але ствараць музей у музеі і я супраць, і Канавалава.

— З ёй я буду мець асобную гаворку. Трэба, Юрась Міхайлавіч, знайсці месца і ўвекавечыць і першага рэдактара нашай раённай газеты Міхася Уладыкіна, з якім я добра быў знаёмы, калі працаваў у камсамоле. Паверце, які-небудзь дысідэнт падхопіць ваш адказ як праяву антысаветызму. Ёсць другаснае ў экспазіцыі, якое не заслугоўвае шырокага асвятлення і ўвагі. Вось, напрыклад, што далёка хадзіць: колькі вы адводзіце месца маёнтку паноў Батураў... аж вачам цесна — сыраварня, сад, штучныя азёры, ландшафт... самой пані. І я вам неаднаразова казаў, і Авяр'ян Паўлавіч дапаўняў, што так, яна была з намі, з партызанамі, але ж вораг падкупіў яе нейкім чынам, і яна згадзілася працаваць на яго. Стала на шлях правакатарства. Больш таго, у маёнтку была арганізавана на партызанскіх разведчыкаў засада. Яна не папярэдзіла, заманіла, можна сказаць, у палац партызанскіх сувязных, якія цаной мужна-

сці і страт адбіліся і ацалелі. Гэта дасканала вядома. Неаспрэчныя факты баявой гісторыі атрада «Народныя мсціўцы». Калі нам не верыць, сведкам, тады каму ж?

— Я веру. Мяне зацікавіла гэта асоба. Ёсць супярэчлівыя думкі наконт яе здрадніцтва. Дом у іх быў у нейкай ступені асветніцкі. Яшчэ на пачатку веку ў ім была адна з лепшых у Польшчы бібліятэк. Мы маем дзесятак кніг (знайшлі ў людзей) з іх экслібрысам, на якім бусел, Пагоня і сілуэт палаца. Дзед Батуры на свае грошы вучыў здольных сялянскіх дзяцей з усёй акругі. Я напісаў братам Паўлюкам у Польшчу ў горад Ольштын.

— Яны жывыя! — здзівіўся Анатоль.

— Так. На жаль, з вашага атрада мала засталося ў Беларусі.

— Перадай абавязкова прывітанне ад нас з Авяр'янам Паўлавічам.

— Маці братоў рабіла прыслугай у Батуры.

— Ведаю. Яны ж прыйшлі ў наш атрад у сорак чацвёртым.

— Я атрымаў ужо лісты ад Іванова, Кавальчука і Краснадубскага.

— І яны жывуць?

— У розных кутках Саюза... далёка ад Беларусі. Ніхто з іх не верыць, што Аляксандра, якая столькі дапамагала партызанам, аказалася правакатарам. А гэта малюнак палаца, які зрабіў па памяці Кецька. Людзі кажуць, што жыве недзе і сын Аляксандры, Казік.

— А... помню. Наколькі мне вядома, ён сляпы.

— Трэба і яго знайсці.

— Не на тое скіравана ваша энергія. У дзяржавы няма сродкаў, хто ж вам дасць грошы на аднаўленне маёнтка Батуры. Рэальней трэба глядзець на рэчы... Спусціцеся з неба на зямлю. Ці вы ставіце пад сумненне паказанні Авяр'яна Паўлавіча? Мае? За знішчэнне засады Авяр'ян Паўлавіч быў адзначаны камандаваннем. Ёсць факт дакумента, а розныя там неабгрунтаваныя домыслы — з вобласці фантазіі, гэта не для гісторыі, для чыстай літаратуры добра. Апалітычна па меншай меры не даваць ходу просьбе ветэранаў 18-й арміі, а любым чынам і любымі сродкамі штучна гераізаваць здрадніка. Мы не дапусцім скажэння. Дзе ў вас гісторыя стварэння Гродзенскага азотна-тукавага гіганта? Нашы ж белагрудчане і пачыналі будаўніцтва і цяпер працуюць там. Сюды, у гэтым напрамку скіроўвайце сваю энергію. А пра вайну дазвольце нам меркаваць,

удзельнікам. Зніміце ўсё, што тычыцца Аляксандры Батуры. Лічыце гэта як загад. Пра сыраварню, дзеда, пра штучнае возера... я б і гэта не пакідаў бы... пакіньце ўпамінанне. І досыць. Пан быў жорсткім эксплуататарам, прагульваў грошы ў Парыжы, быў я там, бачыў — усё дазволена, ад гомасексуалізму да лесбіянства, ад тэрарыстычных выбухаў да дзіцячай прастытуцыі.

— Гэта розныя рэчы, Анатоль Станіслававіч.

— Рэч адна: ідэалогія нашага чалавека, мараль моладзі, якая будзе фарміравацць і наш музей. Адмоўнае народзіць адмоўнае.

— Але сакрытае народзіць двойчы адмоўнае.

— Не трэба ўпарціцца, дарагі Юрась Міхайлавіч, калі старэйшы чалавек па партыі папраўляе ці падказвае. Так мы можам і не спрацавацца разам... Вось так. Я меў гутарку з загадчыкам аддзела культуры наконт сцэнарыя адкрыцця музея, ён спіхвае ўсё на вас. Я налічыў ажно пяць фальклорных груп. Дзеля чаго ў светлы дзень Кастрычніка збіраць па закутках вёсак старых хворых бабак з іх панылымі аднастайнымі песнямі?

— У нас будзе ў экспазіцыі аддзел фальклору, народнага касцюма...

— Калі ласка, ніхто ж не супраць. Цягне вас у нейкі махровы нацыяналізм. Уключыце ў праграму наша, бадзёрае, савецкае, няўжо цяжка? Гэта хоць бы «Широка страна моя родная» альбо «Сердце, тебе не хочется покоя», «Жураўлі». Такое пачуццё, што вы топчацеся на месцы, не адчуваеце дух часу. Размах будоўляў, БАМ, космас. Выходзім на рашаючую барацьбу з сусветным імперыялізмам.

Збіраючыся пакінуць музей, Анатоль Станіслававіч ля выхаду затрымаўся, зноў дастаў акуляры, прачытаў услых:

— «Одни защитные действия без наступательных ведут к поражению. Как бы ни были укреплены защитные силы, они все-таки будут сломлены, если не смогут перейти в наступление. Так и во всем, во всей жизненной борьбе. Во имя блага будьте воителями, не сидите взаперти за стенами крепости, но выходите бодро в чисто поле. Пусть каждая разрушительная злоба получит удар заслуженный. Н. Рерих». Хто такі гэты Рэрых?

— Рускі мысліцель і мастак. Жыў у Індыі.

— Эмігрыраваў?

— Адтуль займаўся асветніцкай дзейнасцю.

— Дзеля чаго гэта вам тут?

— Ну як напамін, што свайго шчасця на волю другіх аддаваць нельга.

— Штосьці я не прыпамінаю гэтага мастака і філосафа. Калі не ўключаны нідзе ў праграмы, відаць, нечым перад Савецкай уладай правініўся.

— Ручаюся, тут няма падвохаў. Сусветнае імя.

— Добра. Папулярызуем эмігрантаў, якія будавалі з намі сацыялізм. Нашых мала? Вазьмі добрых паэтаў, якую газету ні разгарну — Броўка, потым Танк... Панчанка. Бярыце ўсё праверанае, надрукаванае, ухваленае крытыкамі. Не трэба ісці па вастрыі брытвы. Небяспечна. Ну, жадаю поспеху. Усяго добрага, і прыслухайцеся да маіх парад.

— Да пабачэння,— адказаў Уладыкін.

Нічога з таго, што гаварыў і раіў Старадарожац, ён не хацеў прыняць і не мог.

Паліна ж раіла згадзіцца і не лезці на ражон, бо прагоняць з работы, і тады ж ужо хоць з торбай па свеце. «Твая трагедыя ў тым, што ты пераацэньваеш людзей, думаеш, што ўсе яны, як і ты, жывуць у вялікім душэўным неспакоі, у любові да радзімы і да яе мінуўшчыны, што яны і дня не могуць пражыць без судакранання з прыгожым, з дабром. Памыляешся. Па маіх назіраннях, дык людзі, наадварот, падаюць духоўна. Бібліятэка пустуе... будзе пуставаць і твой музей».

— Нешта ж рабіць трэба, чорт вазьмі. Не веру, каб беларускі народ быў пазбаўлены прагі да інтэлігентнасці, культуры, духоўнасці.

— Вер, але не спакушайся і не патрабуй ад усіх тваёй вышыні разумення абавязку, сумлення, ісціны, чалавека.

— Няхай будзе па-твойму. Аддам куток надакучлівым ветэранам з 18-й арміі, нібыта 20-я ці 23-я горш ваявалі, зніму словы Рэрыха, перапішу іх у альбом, а за Аляксандру Батуру буду змагацца. Такое пачуццё, што справа тут цёмная, нешта недагаворана ці не хочуць гаварыць... і хто б... Шаноўныя Ліхадзей ды Старадарожац.

— З'ядуць цябе і выплюнуць,— расчаравана адказала Паліна.

— Адсячы мне руку, а нешта за гэтай гісторыяй хаваецца. Мне падалося, што ён нават перапалохаўся, калі даведаўся, што я напісаў братам Паўлюкам. Кажа, а яны жывыя? А ў вачах, бачу, мільгануў сполах трывогі. Думаю, чаго ж ты не ўзрадаваўся, даведаўшыся, што баявыя сябры знайшліся, што жывыя?

— Не капай пад іх яму, каб не падумалі, што ты помслівы.

— Мяне яны не цікавяць, мяне цікавіць лёс Аляксандры Батуры. Бачу тут тайну, а тайна прыцягальная, яе хочацца разгадаць.

— Пра нас не забывай... не адною ж работай жывы чалавек. Дарэчы, маці даўно не праведваў. Сёння напаткала яе... далі ёй накіраванне на рэнтген. Падазраюць язву страўніка.

— Праведаю. Заўтра ж. Абяцаю.

...Старадарожац не спяшаўся дахаты. Задуменны хадзіў вакол невялічкай плошчы, шукаў паратунку ад цяжкіх успамінаў. Раптам яго асяніла — Белагрудак не мае парку. Быў ля пошты стары сквер, дык яго выкарчавалі бульдозерамі і паставілі велізарную Дошку гонару раёна і цір ДТСААФ, які трэці сезон не выконвае план... Як няўтульна ў горадзе, які не мае парку...

Браты Паўлюкі Старадарожца не хвалявалі... бо яны ў той дзень выйшлі з атрада сапраўды разам, але ж Ліхадзей пакінуў іх на хутары. Калі ж яны, угледзеўшы пажар, беглі ім насустрач — было позна, яны былі сведкамі эпілога, а не кульмінацыі... «Ат не мела баба клопату...» Даўно ён не размаўляў так сам-насам з Юрасём і цяпер здзівіўся яго ўпартасці, якая, здаецца, яшчэ пабольшала. З ім яшчэ за апошнія дзесяць гадоў ніхто так рэзка і смела не размаўляў. Мае рацыю Авяр'ян... гэткі можа наламаць дроў...

Усё... З наступнага навучальнага года ці нават пасля зімовых канікул к чортавай мацеры назад яго, у школу. Варвара трохі «забранзавела», змірыцца. Там ён ёй не канкурэнт. А дапусцім, знойдзе Казіка? Яго ж выцягнуў з агню Авяр'ян...

Ён быў са старой на другім паверсе, што можа сапраўды бачыць сляпы чалавек... абсурд.

Анатоль Станіслававіч падышоў да жоўта-карычневых сцен былога касцёла бернардзінаў. «Каб аднавіць яго толькі знешне, тысяч трыста трэба. Дзе яму ўзяць і хто іх дасць? Фантазёр. Ах, як бы на гэтым месцы добра глядзеўся новы універсітэт... Не хапае ў цэнтры парку, не хапае. І парк мог быць на яго месцы. Ідэя! Трэба будзе падказаць архітэктару. Добрая палітычная акцыя. Увесь горад выйдзе на пасадку парку імя 60-годдзя Вялікага Кастрычніка.

Геніяльная ідэя... Прыпыніўся на мінуту ля помніка Леніну. На вялікім пастаменце, пафарбаваным у цёмна-чырвоны колер, непрапарцыянальна маленькая фігура правадыра са знаёмым жэстам рукі стаяла, бы на труне. Яго ад такой карціны аж калатнула ўсяго. З другога паверха свайго кабінета ён і не заўважаў такой жахлівай дыспрапорцыі і аляпаватасці помніка.

«Заўтра ж загадаю камунгасу выфарбаваць помнік срэбнай фарбай. Страшэннае бескультур'е. Як быццам нікому нічога не трэба, няхай баліць галава аднаму. Пакуль пальцам не ўкажаш, ніхто не хоча ўласную ініцыятыву праявіць. І як літоўскія гарадкі адрозніваюцца па эстэтыцы, культуры, святлу ад нашых! Хто кіруе ў нас культурай, хто выхоўвае густ?»

Да Замкавай гары не пайшоў. Трэба было ўзнімацца па крутой вуліцы. Адчуў стому ў нагах, задышку, а абыходзіць з другога боку было далекавата. Узяў па левую руку ад царквы і касцёла.

«А... заўтра райвыканком прыпаяе ксяндзу дзве тысячы рублёў у фонд міру. Я яго адвучу з народнай капейкі машыны купляць. Унясе дзве тысячы, не буду я Старадарожцам».

Яны спаборнічалі, царква і касцёл, цягнуліся адзін з чырвонай цэглы ў строгай готыцы, другая белакаменная з блакітнымі купаламі да неба. Хто вышэй. Так блізка да іх ён гадоў пяць не падыходзіў. Задраў галаву, каб угледзець на шпілі крыж.

«Прывядзі сюды якога-небудзь рабацягу-парыжаніна... брудная сталоўка, вуліцы ў гразі, аселыя ў зямлю хаты, шэрыя аблупленыя будынкі на плошчы, помнік-пародыя... адзін касцёл з царквою — вось і ўсё, чым можна здзівіць». Анатоль успомніў. Ліхадзей некалькі гадоў таму назад, калі стаялі кіназдымшчыкі пад Навагрудкам, хацеў запрасіць у госці на творчую сустрэчу Уладзіміра Высоцкага і Марыну Уладзі. Ад сораму не ведалі куды б вочы дзець. «Усё залью асфальтам, усё...»

Ахапіла Старадарожца нецярпенне і злосць.

Недалёка адзінока стаяла мураваная аўтобусная станцыя з аблупленай там-сям абліцоўкай. Рэдкія вясковыя людзі спяшаліся да апошніх аўтобусаў. Туды Анатоль Станіслававіч не пайшоў, павярнуў дамоў. Вечаровы халодны ветрык лез за каўнер, надакучаў твару.

«Пра Казіка ўсё ж паведамлю Авяр'яну».

Іван Чачырка вярнуўся ў Белагрудак пад самы Новы год. Яго цяжка было пазнаць: шчокі ўваліліся, твар бледны, здаецца, і паходка здрабнела. Вера прыняла амаль як чужога. Сама плакала і кляла сябе за такую абыякавасць, і ён разумеў: час зрабіў сваю справу — яна адвыкла. Паступова, вельмі марудна вярталася да іх абаіх колішняе пачуццё, нават не колішняе, а новае, з адценнем жалю і неабходнасці сямейнага абавязку.

Паглядзелі ў каляровых лямпачках і мноствам прыгожых цацак ёлку на плошчы, пакаталіся з гары на санках і ўцяклі ад холаду ў сваю ўтульную кватэру. Пакармілі дзіця, і яно, стомленае, хутка заснула.

Вера падала на стол гарачыя калдуны, якія купаліся ў тушонай капусце. Іван адкрыў бляшанку шпротаў. Вера знарок, амаль год, трымала кансервы да яго сустрэчы. Нарэзаў каўбасы, сыру. Вера прынесла з калідорчыка (халадзільніка ў іх не было) бутэльку венгерскага шампанскага. Ён піў, смакуючы, як п'юць у французскіх фільмах. Тэлевізара не было. Прыцішылі трошкі радыё — перадавалі навагодні канцэрт — і леглі ў ложак. Нехта з Замкавай гары запускаў у зорнае неба чырвоныя і зялёныя ракеты. У той момант, калі яны загараліся, чулася моцнае «ўра-а!..».

— Можа, ты разлюбіла мяне, Вера? Я бачу, як табе цяжка. Ты прымушаеш сябе, пераадольваеш, каб быць ветлівай, ласкавай. Ты скажы. Я ўсё дарую. Толькі б ты была шчаслівай, не бойся, я ж ніколі цябе рукой не крану, хоць характар маю буйны. Я зараз табе чужы.

— Сумненні згінуць. Нікога ў мяне не было і няма. Ты не чужы, гэта не тое слова, ты блізкі, але я не магу прывыкнуць. Так доўга, здаецца, вечнасць, я была адна.

Сляза пацякла па яе шчацэ, і ён асцярожна, тыльным бокам далоні зняў яе. Пацалаваў яе косы, рукі, шыю... пяшчотна прытуліў да сябе.

— Пачнём усё спачатку. Я веру, што шчасце не абміне нас, калі жыццё не разлучыла. Заўтра ж я пайду шукаць работу. Буду працаваць дзень і ноч, я хачу апрануць цябе ў моднае адзенне, ты ж у мяне прыгажуня. Усё купім: італьянскія чобаты, дублёнку... Не ўсё здароўе турма забрала, не ўсё... рукі ёсць, прафесію маю. Не будзем падаць духам. Добра?

— Я, Ваня, ніколі не скардзілася, як цяжка ні было.

— Веру, таму і люблю і берагчы буду.

Адразу на работу Івану ўладкавацца не ўдалося. На аўтабазе месца не аказалася. У райспажыўсаюзе, на масла-

сырзаводзе, у школе, міжкалгасбудзе шафёраў хапала. Створаныя пры ваенкамаце курсы штогод выпускалі да трыццаці чалавек. Прафесія шафёра зрабілася ў горадзе самай распаўсюджанай. Дырэктар Дома культуры абяцаў яго забраць да сябе, але ж прасілі пачакаць. Трэба сказаць, што начальнікі кадраў усе як адзін сустракалі яго з кіслай мінай, па якой ён загадзя ведаў: пачнуць віляць хвастом, шукаць адгаворку.

Участковы, малады чалавек, які актыўна ўзяўся за сваю работу, правяраў і папярэджваў: «Шукайце работу. Трэба ўладкоўвацца».

— Дапамажыце, вы ж абавязаны! — казаў у адказ Іван.

Участковы і сам разумеў, што адны не жадаюць браць чалавека з турмы, другія не маюць месца.

— Ат, ты сінус-косінус, печкі-лавачкі... усе перастрахоўшчыкі. Пацярпі, Вера, не хачу ісці качагарам у Дом культуры на шэсцьдзесят рублёў...

Яна маўчала. Ён зноў падаўся абыходзіць установы другі раз. Спачуваць спачувалі, браць — ніхто не браў. Гэтая бірка «непаўнацэннага і ненадзейнага» ў рэшце рэшт раззлавала яго. Ён напісаў ліст-скаргу пракурору. Месяц не было адказу.

Энергічны надакучлівы ўчастковы не прамінаў нагадваць: «Шукайце работу, а то могуць прыцягнуць да адказнасці».

Ён узарваўся:

— Студэнт, якое ты маеш права зневажаць мяне?

Вера ледзь утрымала яго ад новай сваркі. Цяпер нават месца качагара было занята. Нарэшце дачакаліся ліста ад пракурора, які напісаў, што ім дадзена распараджэнне міліцыі і райвыканкому ўладкаваць грамадзяніна І. Чачырку на работу на працягу двух тыдняў. Перадалі, каб зайшоў на аўтабазу. Кадравік прапанаваў месца ў рамонтным цэху. Іван, не пытаючыся пра зарплату, згадзіўся. Праўда, хлопцы ў яго маторным блоку трапіліся як на падбор — заядлыя «чарнільшчыкі». Пару разоў і ён выпіваў з імі за кампанію, закусваючы на скорую руку лівернай кілбасой, плаўленым сырком, а потым паступова пачаў п'янтосаў цурацца, шукаў розныя адгаворкі. Яны крывіліся на яго, недалюблівалі за гэта. Жыць усё ж можна было, каб не так моцна цягнула стужка асфальту, далёкая дарога, машына.

Калі ён выязджаў на адрамантаваным аўтобусе на двор аўтабазы, рабіў колькі кругоў, думаў, што звар'яцее ад шчасця. Яго радасць заставалася яго радасцю. Звычайна,

кажуць людзі, жанаты чалавек губляе сваіх сяброў-халасцякоў. Самым блізкім да турмы дружбаком быў у яго Грыша Белашапка, супраць сяброўства з якім зараз пратэставала Вера, ды і сам ён бачыў, што хлопец (другі раз ён так і не ажаніўся) дайшоў да ручкі. Некалькі разоў пасля вяртання яны сустракаліся і ў буфеце аўтастанцыі, і ў піўным бары. Іван не мог не заўважыць, як трэсліся рукі ў Грышы, як ён прагна піў, амаль не закусваючы, п'янеў адразу; твар яго ахоплівала нейкая ваўкаватасць, глядзеў ён на ўсё безуважна, услых крыў нецэнзурнымі словамі ўсіх і ўсё цягнуў Івана за руку.

— Хадзем, ну... я адпомшчу за цябе пракурору...

Іван яго садзіў за стол, супакойваў. Грыша крычаў, што ён нікога не баіцца і пляваць на ўсіх хацеў. Не было таго разу, калі яны сустракаліся, каб Грыша не цягнуў сябра дахаты. У хаце на яго нападала як бы белая гарачка. Ён ні з таго ні з сяго мог лезці да Івана біцца, кляў маці, лез біцца і да яе, а аднойчы без дай прычыны ўдарыў рукой на шкле, крычаў, што задушыцца.

Маці тады бегла клікаць на дапамогу зяця Уладыкіна, і ўжо разам утраіх яны звязвалі Грышу вяроўкамі. Так было разы са тры.

Юрась — яны былі знаёмы яшчэ з вяселля — тактоўна прасіў Івана не зводзіць Грышу і не частаваць яго. Маці пад націскам дачкі і зяця нарэшце напісала заяву ў міліцыю, каб адправілі Грышу на прымусовае лячэнне ад алкаголю ў міжраённы ЛПП пад Навагрудак.

Цвярозы, магло падацца дзіўным, Грыша і сам прасіў Юрася, каб той здаў яго ў ЛПП, а п'яны ўсё забываў, алкаголікам сябе не лічыў.

Праводзілі яго, калі яшчэ і на работу ніхто не ішоў. Так папрасіў сам. Саромеўся. «Ну, Юрка, ты ў свой музей запішы, што першым алкаголікам з Белагрудка, які паехаў у ЛПП, быў Грыша Белашапка».

Знешне ён казырыўся.

— Вам яго не шкада? — спытала Паліна, калі Юрась і Іван вярнуліся дахаты.

— Не,— адказаў Юрась.

Іван маўчаў.

— Ты бяздушны чалавек.

— Не апраўдвай п'янства ніколі. Гэта не слабасць чалавечага духу, а распушчанасць, якую запраглі лянота ды эгаізм у свой воз. Яму дай тры рублі і скажы — на вось, ідзі павалі на зямлю дуб ля школы, і пойдзе.

На жаль, школа і сям'я не заклалі ў ім падмурка духоўнасці.

— Усе цяпер валяць на школу. Модна. Дзе духоўнасць у горадзе, у грамадстве? Мала ты змагаўся за храм бернардзінаў? Каму толькі не пісаў і што — усё роўна разбурылі. І не алкаголікі зрабілі гэта.

— Значыць, мала змагаўся. Я быў на семінары ў Гродна. Мы б з вучнямі сталі ля касцёла, аб'явілі б забастоўку. Аказваецца, жадаючы дабра сваёй бацькаўшчыне, трэба мець мужнасць на кожны дзень. Помню, як я служыў у Германіі. Звальненне ў нядзелю. Зойдзем у кафэ. Бармен-гаспадар рады... «О, камрад, бітэ, бітэ». Кожнаму налівае поўную шклянку гарэлкі. Частуе. Мы на паказуху шклянку шах... адным глытком. Немцы за столікам апладзіруюць. Парадзіруем Сакалова з фільма Бандарчука «Судьба человека», памятаеш. Здзек, калі параўнаць. Вось так дурнотаю і падтачваем здаровыя асновы ў народа. А іншыя не спяць, шмат яшчэ хто зацікаўлены, каб мы былі сляпыя, адурманеныя гарэлкай, бездухоўныя. Пушкін верыў, Дастаеўскі верыў у ратавальную місію духоўнасці нашых людзей. Купала разрываў путы занядбанасці, Талстой заклікаў абуджаць бога ў душы сваёй, Чэхаў спадзяваўся, што будуць сапраўдныя інтэлігенты паўсюдна, і толькі нашаму Грышу напляваць, хто ў яго стаіць за плячыма, няма гордасці за мінулае, няма што бараніць і ў дні сённяшнім. А ты хочаш, каб я яго шкадаваў. Ніколі! Так, Іване?

— Так! — выпаліў у гарачай згодзе Іван.

— Ну, гэта злы ты такі ад уласных няўдач,— хацела трошкі астудзіць нервовае ўзбуджэнне Юрася жонка,— можна любіць і спачуваць чалавеку за яго слабасць, за тое, што ён ведае свой трагічны фінал загадзя, а ўсё ж жыве, не паспяваючы часам асэнсаваць нават, чаго ён прыйшоў сюды і хто ён?

— Мазгі мусяць працаваць, а ён не хоча, каб яны працавалі. Душа спіць. Любіць? За што? Можа, Варвару Якаўлеўну ды вашых настаўнікаў, з маўклівай згоды якіх школа пераведзена з беларускай на рускую мову? Ці старшыню выканкома, які даў згоду зруйнаваць касцёл? Іх мне любіць?

— Свет трымаецца ўсё ж на добрых людзях,— не хацела згаджацца жонка.

— Пустыя словы. Пакуль не разумееш, што дабро трэба бараніць, сцвярджаць уласным учынкам.

— Не кожны здольны жыць на такой высокай ноце

ўласнай трывогі, адказнасці і абавязку. Па-мойму, я табе аднойчы пра гэта гаварыла,— не кожны жыве з любоўю да ўсяго жывога.

— Лягчэй, канечне, з лёгкім грашком кажнадзённай здрады і раўнадушша.

Іван Чачырка за гэты час не вымавіў ні слова. У нечым яны былі падобны з Юрасём. Пасля ён доўга думаў: у чым? Юрась і разумнейшы, і ведае ўсяго значна больш, і адукацыю вышэйшую мае... Але гэтае падабенства адчуваў усёй душой. Бачылася яму яно ў самастойнасці, любві да волі, радасці ад адчування, што ты чалавек, якому неабыякава, як пражыць і дзеля чаго сваё жыццё. І ён надумаў пры выпадку расказаць Юрасю гісторыю, звязаную з Авяр'янам, ім і Казікам.

Анатолю Станіслававічу ўдалося нарэшце ўгаварыць сваю жонку, каб яна забрала Уладыкіна назад у школу. Напачатку Варвара Якаўлеўна і слухаць не хацела, так наляцела на мужа — нібыта ён яе найпершы вораг і зайздроснік. Ён браў угаворамі. «А раптам адна з дачок не паступіць? Трэба загадзя мець месца, каб потым ніхто пальцам не тыкаў»

Настрой у яго быў баявы. Хадзілі ўстойлівыя чуткі, што нарэшце першы сакратар Белагрудскага райкома падаў у абком заяву з просьбай аб пенсіі па стане здароўя. Крэсла першага як ніколі было блізка. Ён не сумняваўся, ведаючы шматгадовую практыку, калі прапануюць на канферэнцыі яго кандыдатуру, усе як заведзеныя прагаласуюць аднагалосна.

Варвара Якаўлеўна ўпарцілася браць Уладыкіна.

Старадарожац цярпліва даказваў, што яны такім чынам пазбавяцца ад адзінага заклятага ворага і ў яе застануцца толькі бяссільныя зайздроснікі. Трэба ўмець даравааць, калі ад гэтага залежыць перамога ў цэлым. «Пашкадуй такога, як Юрась (ён лічыў яго разумным чалавекам), і ён усё даруе. Больш таго, прапануй яму пасаду завуча, першага свайго памочніка і паплечніка». Ад гэтых слоў у яе палезлі на лоб вочы. Як у кожнай жанчыны, у яе была магутная інтуіцыя, але ж, як кожная жанчына, яна не мела здольнасцей зазірнуць далёка ў будучыню.

Усё спрыяла задуме Анатоля. Паліна зацяжарала і збіралася ў дэкрэт. Сям'і Уладыкіных патрэбны былі грошы. На базары цэны раслі з кожным годам... асартымент у мага-

зінах па-ранейшаму зводзіўся да мінімуму. Народ у мястэчку — службоўцы, інтэлігенцыя, рабочыя — жыў вельмі сціпла. Большасць не брала соткі, не садзіла бульбу, моркву, капусту.

Як грыбы пасля дажджу на прысядзібных участках пачалі расці цяпліцы пад гуркі. Першым такую цяпліцу пабудаваў Лаўрэнцій Кароза. І не адну, а дзве. На яго пачалі тыкаць пальцам: маўляў, нажываецца, кулак, не мае права спекуляваць гуркамі. Ніхто не ведаў, што рабіць з бумам на цяпліцы, які памер для іх пакінуць і зацвердзіць выканкомам.

Уладыкіны не мелі прысядзібнага ўчастка, не мелі жыўнасці, не мелі цяпліцы.

Старадарожац быў упэўнены, што поспех будзе на яго баку. Варвара Якаўлеўна ўпарцілася. Тады ён мякка, асцярожна, каб не напалохаць, намякнуў пра нездаровую цікавасць Уладыкіна да пажару ў маёнтку і загадкавай смерці Батуры і яе сям'і.

— Чаму ж загадкавай? У атрадзе пра гэта ўсе ж даўно ведалі. Ці было яшчэ нешта? — праглынула горкі камяк напалоханая Варвара Якаўлеўна.

— Нічога не было і не магло быць. Нас пасля, калі былі ў брыгадзе, падставіла нейкая зайздросная падаль, вялі допыт і ў асобым аддзеле. Усё чыста, усё даказана... сведкі ёсць... Але ж цяпер, ты ведаеш, які тут люд пайшоў, іх хлебам не кармі, а дай што-небудзь салёнае, каб перамываць костачкі свайму кіраўніцтву. У мяне ёсць і павінна быць чыстая рэпутацыя. Першы нарэшце падаў заяву на пенсію. Ты заб'еш двух зайцаў: захаваеш мой аўтарытэт і набярэш сабе балаў да ганаровага звання «народны настаўнік». Я пранюхаў, маюць намер даць разнарадку на наш раён. Хлопцы з вобласці падштурхнуць. Не трэба ўпірацца, не жыві адным днём, прашу, забяры яго да сябе.

— Няхай так,— ледзь не праз слёзы сказала яна.— На крутых, адказных паваротах жыцця ты заўсёды падаўляў маю волю і мае жаданні. Толькі яго прасіць не стану. Няхай гэта робіць загадчык райана.

Юрасю пазваніў сам Анатоль Станіслававіч. Запрасіў да сябе і доўга так сардэчна, як старэйшы брат, пераконваў вярнуцца ў школу. Маўляў, усё старое даўно забылася, і сама Варвара Якаўлеўна хоча, даўно згодна, але саромеецца звярнуцца з просьбай першай. Жанчына. Школе як ніколі патрэбны мужчыны. Колькі іх там... раз, два... Выхаваўчая работа панізілася. Пакланенне Захаду. Рок, доўгія

валасы, золата на руках, у вушах, крыжы ды свастыка на грудзях. Уладыкін адзін з нямногіх, хто ўмее змагацца за душы. Гуртком, саветам... можа кіраваць, ніхто не будзе перашкаджаць, калі ласка. Пачынаецца будаўніцтва школы № 2, вырашана рыхтаваць Уладыкіна на дырэктара. Год, два і... Прыязджае новы першы сакратар райкома камсамола. Яго жонцы трэба работа...

Юрась абяцаў падумаць, бо ўсё было нечакана.

— Мы ж не пераводзім вас на Месяц,— жартаваў Старадарожац,— апора ў ідэалагічнай барацьбе — школа, музей — другі план. Сухамлінскі, кажуць, на Украіне нешта новае прыдумаў. Дамо камандзіроўку. Пераймайце вопыт.

Паліна і не сумнявалася, раіла згадзіцца. Можна будзе нарэшце хоць чалавечую спальню купіць, а то сорам прызнацца, у госці запрасіць сяброў боязна: «Ажаніўся твой сябар Алег Чумак, я не магу іх да сябе запрасіць. Спім на старой замусоленай, як у начлежках, чорнай канапе».

Юрась не пярэчыў. Даў згоду.

Завітаў неяк Юрась у музей, купіў ля царквы белыя хрызантэмы, ішоў павіншаваць дырэктарку Канавалаву з унучкай. Хатнія турботы, прыемныя і трывожныя (з паўгода таму ў яе чалавека быў інфаркт), забіралі ў яе ўвесь вольны (ды і рабочы) час, пазбаўлялі былога энтузіязму. Музей, як бы не паспеўшы нарадзіцца, пастарэў. Нічога, нават тых сціплых матэрыялаў пра гісторыю маёнтка, лёс Аляксандры Батуры не было і ў паміне. Ён здзівіўся. Яна сказала, што яны не першай важнасці і неабходнасці, што Ліхадзей прынёс новыя, звязаныя з усёй брыгадай, што атрымала копіі дакументаў з Баранавіч, а гэтыя, другарадныя, склалі ў асобную папку і схавалі ў падсобным памяшканні ў шафу, калі будзе з часам новы будынак, знойдзецца месца і для іх.

— У мяне ёсць два лісты з Польшчы ад братоў Паўлюкоў. У іх таксама цікавыя факты.

— Пакіньце іх, калі ласка. Нічога не згубім. Знойдзецца і для іх месца. З часам, канечне.

Юрась адчуў, што Канавалавай не да таго, што яна часова занята хатнімі клопатамі, і таму лісты не пакінуў.

У першым лісце браты пісалі, што, калі яны заўважылі пажар, пабеглі насустрач Цыгану і Баксёру, то тыя беглі прэч ад маёнтка і сказалі, што там была засада, якую ім удалося знішчыць, і што, магчыма, за імі гоняцца. Выключна высока адазваліся пра дзейнасць і смеласць Аляксандры Батуры і паўтарылі два разы, што і тады і зараз не вераць

у яе здрадніцтва. У другім лісце (ён быў кароткім) на пытанні Юрася: ці адказалі на партызанскую акцыю ў той лютаўскі вечар фашысты ў Белагрудку, ці рабілі аблавы, ці бралі ў горадзе заложнікаў, ці было пахаванне тых, каго забілі ў палацы, спаленых салдат? Адказ быў адзін — нічога гэтага не было. Менавіта праз два дні ў атрад прыйшоў іх сваяк з Белагрудка, які, на жаль, у хуткім часе загінуў, і ён казаў, што на месца пажару ездзіў камендант і следчы ад паліцыі. Пайшла гуляць пагалоска: казалі, што маёнтак спалілі немцы за тое, што пані дапамагала партызанам, другія — за тое, што пані супрацоўнічала з немцамі...

Лісты прынёс дамоў, паклаў іх у кнігу «Житие протопопа Аввакума» — гэта быў падарунак Грышы. Недзе на вёсцы ён знайшоў гэтую кнігу з экслібрысам Батуры.

Юрась меў звычку часам выразаць з газет і часопісаў артыкулы рускіх, літоўскіх, украінскіх, грузінскіх дзеячаў культуры па пытаннях гісторыі, літаратуры і хаваў іх у найбольш дарагіх яму творах класікаў рускай літаратуры XIX стагоддзя, кнігі якіх пачаў збіраць яшчэ яго бацька.

Сям'я Чачыркі пакідала Белагрудак. Іван напісаў ліст да сястры на радзіму і выказаў усё, што набалела на душы за гэтыя гады. Мусіў прызнацца ёй, што сядзеў у турме. Лісты да сястры пісала тады Вера і падпісвала «Вашы родныя Іван, Вера і Васілёк».

Чачырка ведаў, што муж сястры за гэты час стаў намеснікам старшыні буйнога калгаса ля Давыд-Гарадка. Сястра, калі атрымала ліст, не вытрымала, прыехала на выхадныя ў Белагрудак і ўгаварыла іх вярнуцца на радзіму. «Дадуць кватэру ў рассрочку. Пятнаццаць тысяч. З гэтай вашай канурой і раўняць не хачу. Ты, Вера, будзеш загадчыцай дзіцячага садзіка... З Бранска, з Кастрамы людзі нам пішуць, просяцца ў калгас. І не думай нават. Пішыце заявы, ды я адразу і павязу».

Іван падаў у міліцыю дакументы на выпіску, а калі прыйшоў забіраць пашпарты, напаткаў на ганку Авяр'яна Паўлавіча, які чамусьці ні з таго ні з сяго выпаліў яму ў вочы:

— Уцякаеш? Думаеш, там менш будуць даваць за выбітыя ў міліцыянера зубы? Закон роўны ўсюды, Чачырка.

І так Івану захацелася садануць кулаком у нахабны твар, што ледзь стрымаўся.

— Біць буду, калі таго заслужаць. Сляпых толькі душыць не буду,— злосна кінуў у адказ Іван.

Авар'ян знерухомеў, на нейкую секунду разгублена здзівіўся і паспяшаўся з адказам:

— У міліцыі няма адбору. Сляпыя, глухія, аднаногія — усе злачынцы для нас аднолькавыя. Шчасліва паехаць,— як бы прымірэнча закончыў ён.

Душа ў Івана бушавала, як вецер у лесе, яму хацелася паведаміць гісторыю пра Казіка і Ліхадзея. Ён скіраваў да школы, дачакаўся званка і сустрэў Юрася на школьным двары.

— Давай пагуляем вакол Замкавай гары. Маю табе нешта сказаць.

Чачырка ў час гэтага шпацыру ўсхвалявана ўсё, што ведаў, чуў і чаму быў сведка, расказаў. Споведзь завяршыў такімі словамі:

— Я яшчэ як з турмы прыехаў, хацеў каму-небудзь паведаміць. Следчаму, пракурору... Жонка адгаварыла. Кажа, пачне помсціць, усё зробіць, каб пасадзіць яшчэ раз. Яны звязаны адзін з адным. Штосьці тут хаваецца. Сустрэнься з Казікам. Абавязкова. Вось трымай... тут ягоны адрас. Вёска Вароны. Можа, ён даверыцца табе, як настаўніку, работніку музея, можа, выкладзе ўсю праўду... калі я спатрэблюся, пры смерці буду, а прыеду... як сведка. Тут і мой адрас.

Нібыта аглушаны стрэлам ля самага вуха стаяў Юрась, не верачы і верачы Чачырку. Абышлі гару яшчэ раз. Юрась удакладніў час, дэталі пажару ў маёнтку і спытаў пра пансіянат. Іван паўтарыў усё слова ў слова.

Таямнічае жыццё Аляксандры Батуры і яшчэ больш таямнічая яе пагібель паланілі Юрасёву душу, свядомасць, сумленне. Ён зразумеў, што цяпер яму спакою не будзе, пакуль ён не паставіць усе кропкі над «і».

## РАЗДЗЕЛ ШОСТЫ

**Смерць апошняга сведкі... Вяртанне ў мінулае... Бацькі і дзеці... Абвінавачванне**

За дзень да паездкі ў сталіцу Авяр'яну прысніўся сон. Апошнія гады ён звычайна засынаў пасля апоўначы. Сноў палохаўся. Прыснілася яму, што нібыта бог спусціўся на зямлю і ператварыў яго ў бусла. Ходзіць ён па балоце,

шукае жаб ды розную брыдоту каўтае. Крычаў, кідаўся ў сне, ад задухі прачнуўся: «Што? Зноў вайна?» — пыталася жонка. «Вайна»,— схлусіў ён.

Ранкам пазваніў у бальніцу.

— Смялянскага знайдзіце. Гэта Ліхадзей.

— Ён на аперацыі.

— Няхай мне пазвоніць дахаты.

Праз паўгадзіны галоўны ўрач пазваніў.

— Лазар Майсеевіч, штосьці твой наксірон не валіць мяне з ног. Дай такое, каб упаў і мёртвы забыўся пра белы свет да самага ранку.

— Ёсць у мяне барбаміл, барбітол...

— Давай. Курс седуксенам я закончыў. Падумаў, можа, да экстрасенса звярнуцца. Ёсць у вас там хто-небудзь?

— Няма. Трэба ў сталіцу ехаць. Да нас яшчэ гэта не дайшло. Ты траўміраваны зноў?

— Не. Бог мілуе. А што?

— Сын прыбягаў. Браў для бацькі некалькі ампул марфіну.

— Ат, сукін сын... Прашу цябе... нічога болей без майго тэлефоннага званка нікому — сыну, жонцы, чорту, д'яблу — не даваць.

— Дамовіліся. Пытанняў больш няма?

— Дзякую. Пакуль няма.

У дарогу на дно чамаданчыка ўпершыню кінуў аптэчку з цытрамонам, седуксенам, наксіронам, валідолам, вітамінамі, анальгінам.

Шабыльчык быў у добрым настроі. Справіў наваселле ў чатырохпакаёвай кватэры ў цагляным (а не панельнаблочным бетонным) доме на беразе санлівай Свіслачы. Не паспеў Ліхадзей распрануцца, як сталічны жыхар пацягнуў яго з пакоя ў пакой, паказваючы, «якая прастора, які краявід з акна, якая ўтульнасць, які паркет, якая абліцоўка ў ваннай, якія шырокія вокны». У рабочым кабінеце, яшчэ заваленым кніжкамі, мноствам вялікіх, як іконы, фотаздымкаў гаспадара ў полі, ля Нарачы, ля буравой вышкі, у метро.

— Вось тут... у гэтых пакоях, нарэшце, напішу раман, які не сорамна будзе вылучаць на ўсе прэміі свету. Сядай. Бяры частуйся. Урук, разынкі... Вось толькі што нарадзілася. Карціць каму-небудзь пачытаць. Паслухай: «Вочы выцвілі ад чаго,— пытае адзін стары ў другога,— ад гадоў ці ад нянавісці да бога, што забірае?» — «Ад сораму перад

ім, што грэшна жыў»,— адказаў стары». Ну, як?

— Добра,— адказаў Ліхадзей,— толькі я, здаецца, у нас сярод людзей гэта чуў.

— Так. Праўда. У аўтобусе падслухаў. Ратуюць запісныя кніжкі. Усё ж паўтараецца. Вазьму якое-небудзь назіранне, дапішу канец. І ўжо твор атрымліваецца. Ніхто гэтым не валодае ў нас. Раман напішу. Страшна не хапае часу.

Гэта «раман напішу» Аўяр'ян чуў ужо гадоў дзесяць. Шабыльчык прынёс бутэльку «Гамзы», бутэрброды з сырам. Піць, аднак, Ліхадзей адмовіўся, ён прыехаў не толькі па даручэнні Старадарожца, але і са сваёй просьбай. Хацеў, каб Шабыльчык паказаў яго знаёмаму суседу-псіхіятру, пра якога некалі расказваў.

— Вышэй галаву, Аўяр'ян Паўлавіч. Не сядзі, як стары карабаты вяз. Як слова «карабаты»? Гэтыя графаманы саракагадовыя, якія нахабна наступаюць на пяты, мовы не ведаюць. Табе пашэнціла. Псіхіятр на бюлетэні. Не будзем адкладваць. Я яму пазваню, ён мой сусед па лесвічнай пляцоўцы, і пытанне вырашым. Бачыш карціну? Белая птушка, пальма, чорны фон. Птушка Додо. З вострава Маўрыкій. Паўтары тысячы за пуцёўку аддаў... як дурань, маскі ды птушку-талісман і прывёз. А нашы на Сейшэльскія астравы лёталі. Кажуць, там арэхі растуць, якія мужчынскую імпатэнцыю... лечаць... Ці ты яшчэ бабу ў кутку прыціснеш, а?

Ліхадзей усміхнуўся.

— Дык і псіхіятр не трэба. Жартую. Пойдзем пакажу.

Ён пазваніў, і яны пайшлі да суседа, доктара навук, які добрую гадзіну сядзеў з Аўяр'янам. Ліхадзей жаліўся на працяглую бяссонніцу, на часты галаўны боль, перапады настрою, боязь святла месяца і комплекс, як ён яго сам ахрысціў, «свядомай правакацыі левай рукі». Так ён расшыфраваў сваё дзіўнае жаданне выехаць на паласу сустрэчнага руху і зачапіць бокам сваёй машыны сустрэчны транспарт.

Шмат на якія пытанні адказваў Аўяр'ян маладому прафесару, запаўняў тэсты, успамінаў траўмы галавы з дзяцінства, спавядаўся пра сексуальнае жыццё, пра выпіўкі, дозы выпітага, пра жаданні, якія ахопліваюць у час ап'янення. Нічога не ўтойваў. Прызнаўся, што мае некалькі палюбоўніц, сустракаецца з якімі рэдка, расказваў, што выпівае рэгулярна, раз-два на тыдзень, што раней, калі не дабіраў да нормы, цягнула да сваіх жанчын, званіў, а часам садзіўся

на машыну і ехаў да надзейных, якія жылі адны ў Навагрудку, Лідзе, у суседніх вёсках. Быў з імі гадзіну, дзве... трохі спаў і заўсёды вяртаўся нанач дахаты, даючы сабе па дарозе слова «завязаць», болей да іх не ездзіць. Калі ж праз тыдзень-два зноў выпіваў, зноў цягнула да іх. Прызнаўся, што сын співаецца. Прасіў зашыць яму ратавальную модную пілюлю. Усе звычайныя сродкі, угаворы не дапамагаюць: гіне сын на вачах.

Не сказаў доктару пра той моцны ўдар па галаве ля пансіяната. Прызнаўся: пастаянная нервовая напружанасць, правінцыяльная жыццёвая аднастайнасць пазбаўляюць яго аптымізму і павялічваюць тугу.

— Ёсць жах перад смерцю? Як часта ўзнікаюць пра яе думкі? — пад канец гаворкі спытаў псіхіятр.

— Страху няма. Яшчэ не хочацца спяшацца. Ёсць неадкладныя справы: запісаць успаміны, ажаніць сына. Не хачу ўнукаў. Пачуццё стомленасці ёсць, фізічнай, праўда, а ўспрыняцце свету надзіва маладое. Пражываю дзень лёгка — калі з людзьмі. Не магу заставацца адзін. У выхадны, як дурны. Не ратуе ні тэлевізар, ні сямейны дабрабыт, ні смачны абед, ні сон пасля абеду... пасплю, дык да трох ночы не магу заснуць. А то яшчэ... раптам пачынаюць халадзець рукі, ногі. Хадуном ходзіць сэрца, такое пачуццё, што задыхаюся, паміраю. Не хапае паветра. Уключаю святло, бяру каплі, валідол, аднаго разу «хуткую» выклікаў, укол далі.

Прафесар мусіў нешта напісаць, хоць шчыра прызнаўся, што пакуль нічога небяспечнага не заўважае. Настойліва параіў змяніць хаця б часова работу. Выпісаў лекі, прасіў піць рэгулярна на працягу месяца і не ўжываць алкаголь. Паназіраць, прасіў, за сабой у гэты час.

— Забудзь,— раіў яму Шабыльчык, калі пакінулі кватэру псіхіятра,— усё ад унушэння. Свет не зменім, ён коціцца да горшага. Бум на кніжкі. Купляюць і складваюць на паліцы. Ніхто амаль не чытае. Прыйшла смерць тоўстым кніжкам. Я вось «карацістам» зрабіўся.— Яны выпілі віна, з'елі па бутэрброду.— Гэта яшчэ старыя запасы з Гагры. Цяпер ужо такога віна не знойдзеш. Вывозім за мяжу, а сваім у партугальцаў «чарніла» купляем. Атрута. Не пі. Я, брат, цяпер маю ўсё, і ўнукам хопіць. Пашэнціла, што адразу шкрабаць пачаў. Пасля вайны колькі нас засталося... жменька... цяпер пішуць усе і жук, і жаба. Нахрапістыя, крытыкуюць, лезуць... Дагнаць немагчыма.

Адно засталося: атрымаць званне «народнага», і пойдуць зборы твораў.

— Дык мы ж пісалі, Антон Антонавіч. Старадарожац казаў, што нават у ЦК. Зноў прасілі пакінуць цябе дэпутатам.

— Ведаю, ведаю. Малайцы. Шум трэба, братка, пастаянны шум, каб не забывалі... Трэба быць увесь час на віду. Гартаю газеты, бачу дзень, два ні слова пра мяне — апетыт прападае. Ты думаеш, кнігі маіх калег-лаўрэатаў нехта чытае? Ляжаць і іхнія, і мае. Трэба трох-чатырох крытыкаў прыкарміць, каб трубілі, каб у вушы людзям увесці: Шабыльчык, Шабыльчык... Ён хоць і не чытаў, а скажа, каб не быць дурным прафанам, Шабыльчыка ведаю. Нашаму чытачу за апошнія пятнаццаць гадоў убілі ў галаву прозвішчы гэтых лаўрэатаў, і яны аўтаматычна іх і называюць. У мяне няма буйнога твора, няма чаго вылучаць на Ленінскую прэмію... Трагедыя. А «народнага» вырваць можна. Чаму з табой так шчыра... паважаю, помню дабрыню... Калі твае людзі, як ты кажаш, ды яшчэ з Польшчы напішуць...

— Я, прызнацца, даўно не браў беларускую кніжку ў рукі.

— І правільна робіш. Няма каго чытаць. Ты ў Польшчу яшчэ раз напішы. Водгук трэба неадкладна. Мусім перадаць, маўляў, наша вялікае партызанскае дзякуй народнаму пісьменніку... Шабыльчыку, як быццам яны нічога не ведаюць, ці далі мне, ці не далі яшчэ. Створым такую атмасферу па ўсёй рэспубліцы... ёсць добрыя кадры і ў Латвіі. Не даць званне будзе і няёмка і несалідна.

— Усё зробім, што ад нас залежыць,— бачна было, што сваёй аднастайнай гаворкай Шабыльчык надакучыў Авяр'яну. Ён сядзеў і думаў пра сваё: «Намёк на сляпых. Якіх? У сэнсе дурных, п'яных, сляпых у жыцці, ад нараджэння? Ці Казіка? Адкуль Чачырка можа ведаць пра Батуру?»

Тым часам за гаворкай дапілі віно.

— І яшчэ, Паўлавіч. Будуць камплектаваць дэлегацыю вашага раёна на ВДНГ на Украіну, у Літву, у Польшчу. Прапануй і маю кандыдатуру.

— Гэта раз плюнуць. Старадарожац запланаваў правесці свята горада. Зараз шукаюць кандыдатуру на званне «пачэсны грамадзянін Белагрудка». Прапанаваць?

— Давай. Геніяльная ідэя. За гэта і выпіць не грэх! Па грамульцы. Французскі каньяк!

Выпілі і каньяку. Авяр'ян выклаў просьбу Старадарожца. Шабыльчык, выслухаўшы да канца, сказаў як адрэзаў:

— Усё. Мне двойчы паўтараць не трэба. Дачок яго буду трымаць на кантролі. Паступіць адно лёгка, трэба ж будзе яшчэ ў сесію і экзамены здаваць. Правінцыяльных дзевак горад так перакручвае. Жах... Замежных студэнтаў розных нацыянальнасцей большае... Нашыя ж дурыдлы, як табе слова? Маё... Гатовы ў рот глядзець, як на ідалаў... Усяму пакланяюцца... толькі скажы, што іншаземец. Спрастытуціцца лёгка, як ніколі. Сын казаў, штовечар ходзяць дружыннікі з інтэрнатаў ды выцягваюць дзевак з ложкаў у неграў. За адну ноч бяруць мыла, бляшанку кансерваваных сасісак, шампунь... Няхай грошай дочкам не шкадуе, каб незалежнымі былі... Яны дзеўкі прыгожыя, на іх ахвотнікаў будзе багата.

Авяр'ян узяў з маленькага століка два бутэрброды з шынкай, адзін з каўбасой, грушу, яблык і галінку вінаграду «Ізабэла».

— Вадзіцелю дам. Сядзіць у машыне без абеду. Чакае.

— Калі ласка,— азваўся Шабыльчык і падаў яшчэ адзін бутэрброд з сырам.— І вось што — з сынам не зацягвай. Прывозь сюды, няхай зашыюць пілюлю. А не, дык пакладзём у Навінкі ананімна. Ёсць там пару палат, ніхто і ведаць не будзе. А то пасядзі яшчэ.

— Дарога далёкая. Пакуль даедзем. Дзякую за ўсё.

— Звані.

Авяр'ян ганарыўся сваім знаёмствам з вядомым пісьменнікам, бо ведаў, што не ўсіх так шчыра і ветліва прымае ў сябе на кватэры Шабыльчык. Ліхадзей ведаў ад старых сяброў па брыгадзе, што ён знаходзіў шмат лазеек, каб па тэлефоне адмовіцца ад сустрэчы, і нікога ў апошнія гады не пакідаў у сябе начаваць. Перадавалі адзін аднаму як анекдот выпадак, калі Шабыльчык, каб не пакідаць начаваць земляка, наняў таксі і завёз яго ў Дом творчасці пісьменнікаў пад Мінск, там уладкаваў начаваць, а сам вярнуўся дахаты.

Авяр'яна ён яшчэ паважаў, трымаўся за знаёмства і сам Ліхадзей. Па-першае, было больш спакою: усё кіраўніцтва, і высокае, і сярэдняе, ведала пра прыяцельскія адносіны Авяр'яна і Шабыльчыка, па-другое, Ліхадзей бачыў, што іх, акрамя «я — табе, ты — мне», нічога не звязвала. Авяр'ян ніколі не прачытаў да сярэдзіны ніводнай з добрага дзесятка выдадзеных дэпутатам кніг. Сяброўства ж аберагаў на ўсялякі выпадак. Раптам які пракол ці асечка, дэпутат абароніць і ад вымовы і ад турмы.

Шэрая стужка асфальту бегла перад вачыма. Паабапал дарогі трапляліся ўсохлыя дрэвы. Гэта псавала настрой. Ніколі ён не любіў такія голыя сярод зелені дрэвы. Па дарозе ўпершыню адчуў, што не цягне ў Белагрудак, як бы нават боязна стала. Загадаў вадзіцелю не гнаць машыну. Ехалі на Мір, Карэлічы, Навагрудак...

Стаяла залатая восень з цяплом і празрыста-васільковым небам. Жоўтыя, зялёныя, чырвоныя, карычневыя парасоны лістоты на дрэвах і не думалі асыпацца на зямлю. Замерлі ў дзівоснай цішы, як на карцінах вялікіх пейзажыстаў, чакаючы ветру і дажджу.

— Колькі жыву, такой восені не бачыў,— нечакана сказаў яго вадзіцель.

— Што? — вяртаўся да сваіх неспакойных думак Аўяр'ян Паўлавіч.

— Кажу, восень прыгожая!

— Сапраўды,— ажывіўся на секунду Ліхадзей.

Ехалі міма Мірскага замка. Аўяр'ян папрасіў прыпыніць. Гадоў дзесяць не быў ён тут. Ды ўрэшце нічога не змянілася. Жоўта-карычневыя сцены з чорнымі дзіркамі пастулова раз'ядала цвіль. Ліхадзей абышоў замак вакол. Стаміўся, зняў фуражку, выцер насоўкай ад поту лоб. У дворыку стаялі двое маладых людзей у джынсах. Ён прывітаўся. Пацікавіўся, ці распачнуць рэстаўрацыю? Яны адказалі, што рэстаўрацыя пачалася.

«Хто, калі і як зможа высветліць усю праўду, што рабілася за гэтымі сценамі, у гэтых высокіх вежах, галерэях, пакоях? Усёй праўды і ведаць не будуць. А калі яе цалкам няма ўсёй, дык палову праўды можна павярнуць у любы бок — хоць да ісціны, хоць да хлусні. Калі Мірскага замка — дыямента айчыннай культуры — цалкам не ведаюць, ці ж пад сілу аднаму Уладыкіну аднавіць усю гісторыю маёнтка Батуры? Абсурд!»

Паехалі далей. Мільгануў на сіняй дошчачцы ўказальнік «Вароны — 21 км».

— Прыпыні,— аўтаматычна загадаў ён вадзіцелю. Той рэзка націснуў на тармазы.

— Хаця не... Другім разам. Паехалі,— больш стрымана і спакойна сказаў Аўяр'ян.

Дык вось чаго яго цягнула ехаць гэтай дарогай? Вёска Вароны. Доўга ён з той зімы шукаў па вобласці сляпога музыканта, званіў сябрам — кіраўнікам раённых аддзелаў... да ўсіх звяртаўся з адным і тым жа пытаннем: «Жаню

сына. У маладосці ведаў аднаго сляпога музыку-акардэаніста Казіка. Ці жыве такі ў тваім раёне?»

Праз месяц атрымаў адказ, пазваніў начальнік з Карэлічаў і перадаў, што за паўлітра дасць адрас Казіка. Авяр'ян не даў яму дагаварыць, крыкнуў у трубку: «Бутэлька каньяку, лічы, твая пры першай сустрэчы». Так ён даведаўся пра вёску Вароны. На душы палягчэла, але не паспакайнела.

Месяцы са тры ён амаль кожны дзень чакаў прыезду Казіка ў Белагрудак і свядома рыхтаваўся да гэтага. Тады, у хвіліны найбольшага нервовага напружання, упершыню пашкадаваў: чаму не застрэліў яго. Напалоханы яго замахам, Авяр'ян выношваў зусім вар'яцкія планы: нелегальна высачыць Казіка ў Варонах, калі будзе п'яны вяртацца з вяселля, ды піхнуць у возера ці стукнуць па галаве, каб тым самым знішчыць нават успаміны пра мінулае. Мінуў год. Год трывожнага чакання і напружанасці, які зусім знясіліў яго. Авяр'ян амаль забыўся пра сваіх палюбоўніц, а калі прыязджаў — выпівалі, праз сілу ён «травіў» некалькі свежых анекдотаў і збіраўся назад. Нават адносна маладая буфетчыца Зіна, з якой ён сустракаўся рэдка (не было ўмоў, усё было на віду, яна жыла на ўскраіне Белагрудка), не вабіла яго. Але ішоў час. Усё было ціха. Памалу Авяр'ян весялеў, патроху забываўся і той выпадак ля пансіяната, у які ён болей ніколі не ездзіў, спасылаючыся на тое, што лазня паднімае ціск і абцугамі скоўвае сэрца.

Абудзілі зноў трывогу кароткія словы Чачыркі. Трэба было ўсё ж тады на маёўцы, нягледзячы на яе супраціўленне, прыціснуць Веру да зямлі... змаўчала б... Ён абняў тады, пачаў цалаваць, не чакаючы ад яе такога фізічнага пратэсту... падрапала нават да крыві шыю. Выпусціў з абдымкаў, яна паспела крутануцца і пабегла да вогнішча. Мог спакойна дагнаць. Лес густы быў. Шкада, што не пабег. Ну, а Чачырка, на што ён намякнуў? Можа, нехта з яго знаёмых быў сведкай, калі ён качаўся з Казікам у снезе? Мо з акна хто ўгледзеў? З акна не заўважыць. Праз два тыдні ён ездзіў у пансіянат, непрыкметна зрабіў апытанне: ніхто пра бойку ля лазні і не ўспамінаў. Бачылі старэнькі «Запарожац». Нехта сказаў, што за рулём «Запарожца» сядзела жанчына. «А калі не Казік мяне каменем ударыў? А, дапусцім, яго памочнік. Жанчына? Мог быць і яшчэ хтонебудзь. Як я раней пра гэта не падумаў? Ударылі кастэтам. Факт. Можа, трэба было зрабіць экспертызу? Для сябе? Можа, дарма тады напалохаўся?» Аніяк не хацелася яму

вяртацца ў той злапамятны дзень. Само жыццё напамінала: дэталлю, такім вось дарожным знакам, дотыкам рукі да месца былой раны на галаве, поглядам на пісталет, на чорныя акуляры, акардэон. І доўжылася гэта ўвесь апошні час. А калісь, і пасля вайны, і ў пяцідзесятыя гады, жыў прывольна і бестурботна. Цяпер на кухні пакладзе нож з відэльцам накрыж і напалохаецца: прыкмета блізкай смерці. Пачаў прыкмячаць гэты крыж у кветках, кніжках, складзеных газетах. Як навалач якая.

«Калі цябе так усё раздражняе, так няміла ў сям'і, лічы, што я табе дала поўную свабоду. Мала? Хочаш афіцыйна развесціся — калі ласка, падавай заяву».— Рэгіна спакойна глядзела яму ў вочы. Раней яна хоць збольшага, але ж кантралявала яго, цікавілася камандзіроўкамі, пыталася асцярожна, дзе быў, куды ездзіў, куды ідзе? Яе сэрца па ім перастала балець. Турбаваў толькі лёс сына. Як і кожная маці, яна і асуджала яго і шкадавала. Рэгіна першай даведалася, што Люба нарадзіла ў Баранавічах дачку. Далі ёй імя Саша. Прачула Рэгіна і тое, што яе Віталік ужо некалькі разоў ездзіў туды. Не разумеючы існай прычыны залішняй нервознасці Авяр'яна, яна не рызыкнула паведаміць яму пра таямнічыя падарожжы сына да Любы, і сын упарта не хацеў адкрываць маці сваіх намераў, як яна яго на гэта не правацыравала.

Нічога, на жаль, змяніць было нельга. Рэгіна чакала момант, каб расказаць усё Авяр'яну.

...Паварот на Вароны застаўся ззаду. Да Карэліч было кіламетраў дзесяць, калі на ўзбочыне Ліхадзей убачыў чалавека ў міліцэйскай форме. Той узрадавана (ехала ж свая машына) прагаласаваў. Вадзіцель, не пытаючыся згоды Авяр'яна Паўлавіча (ведаў, што той заўсёды падвозіў па дарозе свайго брата-міліцыянера), прыпыніў «газік». Разгаварыліся як старыя знаёмыя: усё ж аднолькавае — і праблемы, і турботы.

Міліцыянер аказаўся участковым вёскі Вароны, ехаў у Карэлічы дамаўляцца з ансамблем Дома культуры. Выдаваў замуж дачку.

— А што, хіба ваш славуты музыка Казік з'ехаў куды? — стрымліваючы цікавасць, спытаў Авяр'ян, не паварочваючы галавы ў бок участковага.

— Памёр наш Казік. Сорак дзён сёння. Уся вёска, калі хавалі, за трунойішла, плакала. І старыя і малыя.

Вы ведалі яго? Больш такі музыка наўрад ці народзіцца. Ад бога талент меў. Каб Казік быў, я і гора не ведаў бы. Яго запрашалі і ў Мір, і ў Навагрудскі раён... Адно толькі ў Белагрудак адмаўляўся ехаць.

— Чаму?

— Толкам ніхто не ведаў. Кажуць, быццам бы там жывуць людзі, што хату яго спалілі, маці забілі... Можа, жонка яго што і ведае...— ахвотна дзяліўся сваімі разважаннямі міліцыянер.

— Ён і жанаты быў?

— О, яшчэ якая пара! Гадоў дзесяць, як сышліся. Ён на акардэоне жарыць, а яна на бубне. Што твой аркестр! Ды з падсвістам, з прыпеўкамі... мёртвага разбудзяць. Ніхто не ўседзіць, каб не тупнуць нагой... Нікога так не хавалі.

— Ад чаго памёр?

— Астма даканала. Каб, можа, так моцна не піў, яшчэ жыў бы. Колькі ўжо гарэлка звяла людзей у нашай вёсцы, ды маладых, не пералічыць.

— Самагонку гоняць?

— Ніхто на яе не глядзіць. Заводзік спіртавы маем. З канадскай пшаніцы медыцынскі чысцяк гонім. Паўшклянкі хлабысні, галава яшчэ варыць, а ногі не нясуць. Гора нашым жанчынам ад гэтага заводзіка. Альбо сам садзіся вучыся піць, альбо падавай на развод. Я пісаў старшыні сельсавета, у Вярхоўны Савет звяртаўся, дэпутату Шабыльчыку, каб перавялі яго куды-небудзь, закрылі. Дзе там... каму якая справа да простага чалавека. На словах усё,— жаліўся ўчастковы.

— Гэта бяда паўсюдная. Дзвесце тысяч чалавек пабывала ў мінулым годзе ў медвыцвярэзніку. Калі адкінуць дзяцей і старых, то выходзіць, што кожны дваццаты чалавек.

— А дзе ж гэта напісана?

— Такое не пішуць.

— Шкада. Вось тут, калі ласка, прыпыніце. Дзякую вам. Шчаслівай дарогі.

— Зяця хоць не п'янтоса выбраў? — з гумарам запытаў Авяр'ян.

— Прывезла з Гродна. Яшчэ не раскусіў. Тры дні як знаёмыя. Цяпер у іх не так, як у нас, а шах-мах і — гатова.

— Гані, Пеця, да Белагрудка без прыпынкаў. З вецярком гані, каб шыны спявалі.— Крута змяніўся настрой у Ліхадзея.

Цяжар спаў з яго душы, і таму хацелася дзеяння, хацелася помсты ўсім знаёмым, Юрасю... Жыццё! Каму падуладна цябе спланаваць, размеркаваць усяго пароўну на гады? Нікому. Слабейшы, як у прыродзе, саступі назад. Па якому праву праведнікі мусяць асуджаць няправедных? Хто ім даваў гэтае самае права называцца праведнымі? Сумленне, сорам, праўдзівае жыццё ўва ўсіх на віду? Хлусня. Душы іх раз'ядае зайздрасць да грэшных. Кожны з грахом, кожны!

Усе людскія службы створаны дзеля аднаго — стрымаць пастаяннае жаданне грашыць. Паўсюдна.

Шабыльчык — гэты двудушнік... пры жыцці помнік стварае... таксама Талстой... Старадарожац... баязлівец-угоднік, алілуйшчык, функцыянер, выканаўца волі вышэйшых кіраўнікоў... Грош цана тваёй самастойнасці на ўзроўні логікі жонкі.

Варвара... пыхлівая, тупагаловая, гатовая захлiснуцца ва ўласнай фанабэрыі нікчэмнасць! Знімуць яе чалавека з пасады, тады яе ж лепшая сяброўка з раёна перавядзе Варвару ў тэхнічкі...

Юрась... крыклівы максіматіст, ці ж не ён кідае ласкавым вокам на разведзеную дачку дырэктаркі музея, ці не кіруе ім жаданне славы і ўзвышэння над астатнімі. Хто з іх мае права асуджаць Авяр'яна, калі яны ўсе з заганамі самі? Судзіць яго маладога з вышыні іх сытай старасці?

Ён як бы нанава нарадзіўся, адчуў прыліў новых сіл. Як юнак узляцеў па сходах на другі паверх, адкрыў прыёмную, паказаў пальцам на дзверы другога сакратара. Немаладая ўжо сакратарка хітнула галавой.

Старадарожац пераняў методыку ад першага: бесцырымонна адчытваў старшыню калгаса. Была ў яго такая завядзёнка «рамантаваць» калгаснае кіраўніцтва.

— Ну, што ж ты, дарагі мой, падводзіш нас. Колькі мне каштавала і сіл і здароўя, каб адкрыць на тэрыторыі твайго калгаса мемарыял з Вечным агнём. Табе аднаму далі такі гонар... А ты..? Мы ж дамаўляліся, што ты возьмеш павышаныя сацабавязацельствы, як флагман сацыялістычнага спаборніцтва. Мы табе новую тэхніку, хімію, амаль трэць фондаў, людзям тваім ордэны і медалі далі, шчодра далі... Які ж ты прыклад астатнім падаеш? А будаўнічыя матэрыялы, жалезныя канструкцыі? Ну, мала што праўленне вырашыла, а цябе нашто паставілі, каб мог пераканаць любое праўленне. Калі ў нас кожнае праўленне будзе гнуць свае законы, мы да канца XX стагоддзя каму-

нізм не пабудуем. Хто кім кіруе: праўленне табой ці ты праўленнем? Я падаў у вобласць вашы павышаныя абавязацельствы, адтуль пайшло на рэспубліку... Ты ціха, ціха... Супакойся. Заявай не палохай. І я не ўпэўнены, і я не веру, што выдасі гэтыя лічбы. Мне трэба, каб быў лідэр, на які б раўняліся ўсе астатнія, каб нам было больш падстаў іх папракаць, сароміць, ставіць цябе і твой калгас у прыклад. Дарагі мой, няхай будзе на паперы... З такім настроем, як у цябе, цяжка кіраваць і заклікаць людзей да энтузіязму, да новых вышынь. Ніхто не ведае, якія ўмовы пашле боженька. Не панікуй. Каб апраўдацца, заўсёды знаходзіцца больш прычын, гэта закон нашага жыцця. Ніхто цябе не падстаўляе. Не падстаўляй і ты нас. Усё... Даруй. Дамовіліся. Мала часу.

— Падсцёбванне нядбайных,— уставіў Ліхадзей, калі Анатоль Станіслававіч паклаў трубку.

— Куды ідзём, не ведаю? Старшыні калгасаў зусім адбіваюцца ад рук. Кіраваць немагчыма. Паны. Забыліся, хто іх рыхтаваў, хто ім даваў пасады.

— Алілуйшчыкі, аглабельшчыкі, рапартавальшчыкі.

— Так. Гэта ў дзесятку трапіў. Двое з усіх сапраўдныя гаспадары, актывісты. У цябе нешта тэрміновае?

— Самае тэрміновае,— адказаў Авяр'ян.

— Давай тады я яшчэ аднаму гаўрыку накачку дам, і...

Ліхадзей не даў яму дагаварыць, паклаў руку на тэлефон.

— Пашкадуй язык, канчай дэмагогію. Яшчура няма, і лады. Збірайся, паедзем.

— Куды? — сціснулася сэрца ў Старадарожца.

— Справа ёсць.

— Да канца рабочага дня паўгадзіны. Я прызначу сустрэчу сакратару партыйнай арганізацыі аўтабазы.

— Перанясі на заўтра. Сакратар перазвоніць. Паехалі. Унізе машына чакае.

— Вечна ў цябе нейкія сюрпрызы,— як бы незадаволена адказаў Анатоль.— Хоць скажы, што здарылася?

— Потым. Усё потым.

— Куды хоць едзем?

— У рэстаран «Нёман». «Даміно, даміно...» Эх, як даўно мне не хацелася спяваць...— яшчэ больш павесялеў Ліхадзей.— Праўда, без маладухі-кралі. Самі пасядзім.

У рэстаране толькі што завяршылі капітальны рамонт: аздобілі сцены чаканкай, паставілі вялікія драўляныя сталы і крэслы з фігурнымі спінкамі, прыбудавалі невялічкі банкетны зальчык з запасным выхадам праз калідор кухні.

Рэстаран быў зачынены на абедзенны перапынак з 17 да 18 гадзін. Убачыўшы высокае кіраўніцтва, адміністратарка, мажная нязграбная маладзіца, бягом кінулася адчыняць дзверы.

Правялі іх у банкетны зальчык, сама хапілася ўзяць заказ, пачуўшы традыцыйны і знаёмы загад-просьбу Авяр'яна:

— Мяса, агародніны, бульбы ў фруцелі і бутэльку «Белавежскай». Стоп. Сёння адменім гарэлку. Дзве бутэлькі шампанскага.— Авяр'ян злёгку крануў адміністратарку за талію.

— О-го, шампань! — здзівіўся Анатоль.— У цябе, няйначай, юбілей ці свята?

— Свята, Толя. Наша з табой свята.

Дзве афіцыянткі прынеслі келіхі, шампанскае, памідоры, гуркі, тоўста нарэзаную вяндліну. Авяр'ян наліў шампанскага ў келіхі па самы край, хоць злізвай.

— Казік Батура жывы. Ён хацеў мяне застрэліць з пісталета,— сказаў Авяр'ян, гледзячы ў вочы Старадарожцу.

Анатоль Сцяпанавіч не дацягнуўся рукой да келіха, так і знерухомеў, адчуваючы холад ва ўсім целе. Весялосць у поглядзе рэзка змяніў жах, мальба аб дапамозе.

— Гэта было больш года таму назад ля лазні пансіяната «Свіцязь». Мяне ўратаваў цуд. Яшчэ малому варажбіха напрарочыла, што ад кулі я не памру. Я гэта добра запомніў. Пісталет даў асечку. Памятаеш, я на галаве насіў павязку.

У Анатоля Станіслававіча не хапала паветра, каб услых адказваць, ён толькі ківаў галавой і прагна слухаў.

— Ён параніў мяне кастэтам. Сам збег. Я страціў часова тады прытомнасць. Доўга я шукаў яго след... Не быў бы Ліхадзеем, каб не вылічыў яго. Вёска Вароны, Карэліцкі раён. Якіх-небудзь сто кіламетраў ад нас з табой. Які мізэр...

— Навошта ты мне гэта адкрыў, Авяр'ян? — голасам цяжкахворага спытаў Анатоль.— Навошта? Я не хачу успамінаць, я ўсё даўно забыў...

— Вось то-та і яно... Авяр'ян усё на сябе ўзваліў, адзін! Усё помніў... ты адганяў успаміны прэч... Я моцны, таўстаскуры... Вытрымаю. Я шкадаваў і шкадую цябе, таму адразу нічога і не паведаміў. Люблю, як сябра, надзейнага сябра... Перавядзі дых і супакойся.

— Як можна, даведаўшыся пра гэта, супакоіцца, Авяр'ян? Пра што ты гаворыш. Ён рызыкнуў пайсці на замах! Ці ж гэта жартачкі: замах на жыццё? — загарэўся Ана-

толь, палохаючыся сваіх слоў і азіраючыся на дзверы.

— Супакойся. Калі-небудзь, спадзяюся, ты ацэніш маю ахвяру. Амаль год я маўчаў, шкадуючы тваю псіхіку і твой спакой... Мне было нялёгка, але я вытрымаў і перамог. Літаральна гадзіну таму я даведаўся, што Казік памёр.

— Гэта дакладна? — не супакойваўся Анатоль.

— Дакладней і быць не можа. Ці ж я калі-небудзь рабіў што-небудзь недакладна? Так што, лічы, адбылося ў нас другое нараджэнне. Вось за гэта свята і вып'ем да дна, а заадно і памянём душу рабы божай Аляксандры. Магла б яна застацца жывой? Магла б... На цяперашні розум, але ж так склаліся абставіны... вайна, класавая барацьба... маладосці не дадзена мудрасці старэйшых. Каб усё здарылася сёння, усё было б інакш. Не падвяргай рэвізіі сяброўства — яно выжыла і яшчэ нас парадуе, уратуе ад адзіноты, нягледзячы на тое, што замешана на граху, але загартавана ваеннымі дарогамі, замацавана сумленнай працай у гады пяцігодак. Будзь здароў!

Выпілі адным махам, хутка, як гаючую ваду.

— Ты сваім жыццём пяць разоў выкупіў віну. Пяць! Ніколі не адчайвайся і не падай духам. Выкінь з галавы. Ты бог, ты цар! Усё запраграмавана. Сотні людзей нараджаюцца толькі дзеля таго, каб паслужыць стымулам больш мацнейшым, яны таксама запраграмаваны на ахвяру. Іх забівае маланка, яны тонуць у рэках, гараць у агні, гінуць у аўтамабільных катастрофах — сваім блізкім яны такой ранняй смерцю загартоўваюць волю, надаюць мужнасці і самастойнасці. Уся гэтая філасофія пра гармонію, еднасць — сліна гнілых разбэшчаных інтэлігентаў,— ваяўніча казаў Ліхадзей.

Выпілі яшчэ па келіху шампанскага, закусілі.

Авяр'ян закурыў.

— І моцна ты, брат, напалохаўся. Аж мне не па сабе зрабілася.

— Нервы. Можа, табе падасца і смешным, усе гэтыя трыццаць пяць гадоў жыў адной марай — толькі б бог не паслаў сустрэчу з Казікам,— супакойваючыся, дзяліўся патаемным Старадарожац.

— Ты нарадзіўся пад шчаслівай зоркай. Жыві цяпер доўга і спакойна. А то не ведаю, як цябе, а мяне калаціла ўсяго, калі гэты малакасос Уладыкін кідаў у мой бок падазроныя позіркі, дакоры. Іх тэлебачанне, кіно, тэатры нацкоўваюць на наша пакаленне, дык ён, сляпы, бачыць усе беды бездухоўнасці ў нашых памылках і грахах. Колькі

жыве чалавек, столькі і памыляецца... Уладыкін сваёй незалежнасцю і падазронасцю зневажаў мяне як асобу і кіраўніка. Ух, як у мяне рукі свярбелі... Няхай цяпер хоць Мегрэ выпісвае, а ўсё наша, як кажуць разумныя, з намі і памрэ. Калі ён там баламуціць ваду, не дае кіраваць Варвары, вяртай назад у музей, няхай пакруціцца на восемдзесят рублёў. З гэтага дня ён сам, сам мусіць прасіць у нас...

Прынеслі бульбу і глыбокую талерку смажанага мяса.

— Галубанька мая, дай нам па сто пяцьдзесят гарэлкі. Грэх пад такую закусь піць жаночы напітак. Вазьмі і сабе фужэрчык, вып'еш з намі.

Авяр'ян наліў адміністратару поўны келіх шампанскага.

— Ой, дзякую вам, мне ж нельга. Я ж на рабоце. Яшчэ ап'янею,— замахала рукамі ветлівая жанчына з капой перафарбаваных у вогненны колер валасоў.

— Галуба мая, усе мы на службе і на рабоце... За тваё здароўе і чулае сэрца... і каб рэвізій не было,— намагаўся жартаваць Авяр'ян Паўлавіч.

Адміністратарка села на край крэсла, выпіла з імі, дастала з кішэні цукерку, разгарнула паперку, скамячыла яе, кінула на дно свайго келіха і панесла на кухню пустыя бутэлькі.

— Кава ёсць. Падаваць? — спытала яна з парога.

— Нясі і каву, мая радасць. Ну, а стары твой маразмат? Угаварылі пайсці на пенсію?—па-свойску папытаў Авяр'ян.

— Дзе там. І заяву ж падаў. І ўсё было ўзгоднена і падрыхтавана. Паехаў у сталіцу — усе ж яго аднагодкі пасады моцна трымаюць, угаварыў. Семдзесят сёмы год... разумееш? Званіў учора... Кажа, партыя і ўрад не адпускаюць, просяць яшчэ пастаяць ля руля кіраўніцтва.

— Сказаў бы я, за што яму трымацца засталося, ды баюся нецэнзурная рыфма атрымаецца. Кінь ты ўсё... з'ядуць. Ты казёл адпушчэння... зразумей. Пераходзь, пакуль пры ўладзе, на старшыню райвыканкома, а мяне бяры намеснікам. Звон цыкадаў паслухаем, хоць пад старасць пажывеш у дастатку. Не так на віду. Падумай.

— Не вечны ж ён, ёлкі-палкі. Сто хвароб носіць. Цябе, калі ўжо сапраўды нацёр лоб міліцэйскай фуражкай, перавяду ў намеснікі.

— Тады яшчэ сотачку? — ажывіўся Авяр'ян.

— Не. Ты ж ведаеш, я трымаюся нормы.

— Хочаш быць як вялікі Махмуд Эсамбаеў?

— Ды не. Сам па сабе.

— А... кантралюе твая пава па-ранейшаму.

— Не тое слова. Як адправіла дачок у сталіцу, зусім лютуе. Усё яе раздражняе, кожная дробязь.

— Плюнь... Ёсць у мяне кадры... Гарачыя, кралі...

Абое нязмушана зарагаталі. Анатоль Станіслававіч палез у бакавую кішэню, дастаў кашалёк.

— Схавай. Яны мне тут усе абавязаны,— скрыжаваў перад сабой на стале рукі Авяр'ян.

Прынеслі каву. Яны выпілі яе залпам, як пілі дагэтуль спіртное.

Кідаў на горад густыя цені вечар. У гэтай адвечнай барацьбе святла і цемры загадзя вядомы пераможца, але ж чаму тугой ахоплівае сэрца, калі памірае дзень, чаму толькі ў гэтыя імгненні ўсе раптам заўважаюць: якое прыгожае сонца, як дзівосна-непаўторна яно залоціць купалы царквы і шпіль касцёла і як невыносна тужліва праводзіць яго за лес, з трывогай думаючы, а ці ўзыдзе яно заўтра? Розум падказвае: узыдзе. А душа ўсё ные... У мінуты захаду сонца чалавек звычайна думае аб мінулым, і, наадварот, сонечным ранкам чалавека цягне ў дарогу, у поле, думаецца з асалодай аб будучым. І што гэта за вечны цуд такі маці-прырода?

Старадарожац з Авяр'янам, крочачы па цэнтральнай вуліцы свайго горада, не ўспаміналі мінулае і не марылі пра будучыню. Ім хацелася хутчэй дайсці дахаты, спакойна забыцца сном.

Авяр'яна блажыла сярод ночы. Даўно ён не змешваў гарэлку з шампанскім. «А можа, наўмысна падсунулі сапсаванае мяса? Усе мяне ненавідзяць, усе зайздросцяць!»

Старадарожцу ў пустой кватэры (Варвара праводзіла бацькоўскі сход) не сядзелася, ён вярнуўся ў райком і пачаў па тэлефоне «накручваць хвасты» астатнім старшыням калгасаў.

Гэта былі маналогі, рэдка каго апошнім часам ён выслухоўваў да канца. І яны мала-памалу прывыклі да сваёй «тэлефоннай мачахі», добра ведалі яе любімыя словы «падумай», «абсудзі», «прымі меры» і «знайдзі рэзервы». Сёння ж у яго заплятаўся язык, а павучаць хацелася: ён страшыў народным кантролем, вымовай, судом. Забываўся, каму званіў, зноў набіраў нумар тэлефона, блытаў імёны і гнуў сваё.

У гаспадаркі Старадарожац зараз не ездзіў, два разы

на тыдзень збіраў усіх кіраўнікоў на радыёпераклічку. Любіў аператыўнасць, добра валодаў інфармацыяй, праўда, далей гэтай інфармацыі справа не ішла. Яму давяралі ўсё меней, усё больш і больш не стрымліваў ён сваіх абяцанняў, якія сыпаў па тэлефоне як гарох. Здавалі свае пазіцыі найлепшыя калгасы раёна: «1 Мая» і «Камунар». Як і дзесяць гадоў таму назад ратавала сябе раённае кіраўніцтва ад гневу абласнога льном. Неперспектыўнасць большасці вёсак, заняпад усяго раёна доўга беспакарана цягнуцца не маглі. Старадарожац гэта разумеў. Ён пачаў рыхтаваць шырокую змену кадраў, узяў палітыку на амаладжэнне. Падабраў з былога свайго камсамольскага актыву добрую змену, толькі зноў жа, казаў Авяр'яну, што заўпарціўся першы: «Гэта рэвалюцыя. Бунтам пахне. Восемдзесят працэнтаў зляціць... не. Правераныя, надзейныя людзі... і аддаць усё ветранай моладзі... яны ж па свеце пусцяць усе гаспадаркі. Ужо зараз насенне траў у літоўцаў купляем, а потым і хлеб купляць будзем». І ўсё. Пыл яго астыў. Заўвагі былі толькі ў адрас райспажыўсаюза на ўсіх сходах і канферэнцыях. Райком жа нідзе і ніхто не крытыкаваў. Ніколі не было выказана адмоўных ацэнак выбарным органам ва ўсім раёне. З году ў год у бюро і партыйныя камітэты ўваходзілі адны і тыя ж людзі, толькі на два працэнты змянялі кадры сакратароў.

Адкрытая крытыка чулася хіба на раённым рынку, у чэргах ля магазінаў, у сталоўцы, у камбінаце бытавога абслугоўвання.

Старадарожац, па прыкладу іншых раённых цэнтраў, адкрыў у горадзе першы кааператыўны магазін, у якім можна было купіць кіло кракаўскай каўбасы за шэсць рублёў, кіло мяса за чатыры.

Цяпер, калі хто і калоў кабанчыка, для сябе амаль нічога не пакідаў — нёс на рынак і браў за яго вялікія грошы.

Найбольш рост цэн ударыў па кішэнях мясцовай інтэлігенцыі. Трэба было дапамагаць дзецям, якія вучыліся ў сталіцы і абласным цэнтры. Да ўсяго, як лічыў Старадарожац, наш рахманы чалавек прывыкае, звыкся ён і з новымі цэнамі на спіртное, прыняў і новыя кааператыўныя цэны на мяса, сала, каўбасы.

Прыемны пах свежай «Тміннай», «Адэскай» поўз з магазіна на вуліцу, заманьваў. Асцярожна пераступалі парог жанкі, бралі дзецям і хворым у бальніцу па дзвесце, трыста грамаў. На святы падавалі рэдкім гасцям да стала танюсенька, «па-шляхецку», нарэзаную каўбасу.

Старадарожац, пераадольваючы сваю прыродную сціпласць, у злым адчаі, не спадзеючыся больш на далейшы росквіт, зноў і зноў круціў тэлефонны дыск: «падумайце», «абсудзіце», «прымайце меры», «найдзіце рэзервы».

Сям'я Уладыкіных з нараджэннем трэцяга дзіцяці жыла вельмі сціпла, калі не сказаць бедна. Пасля аперацыі маці Юрася выйшла на пенсію і мірна дажывала свой век, атрымліваючы шэсцьдзесят сем рублёў штомесяц.

Маці Паліны часам зарабляла якую капейку, брала ад людзей заказы і шыла штаны, спадніцы. Купляла ўнукам яблыкі, памідоры, свежыя гуркі.

Трымаў ладную цяпліцу і Лаўрэнцій Кароза. Добрыя гуркі былі ў яго, набылі вялікую славу на ўвесь гарадок. Гледзячы на Лаўрэнцыя, і астатнія гаспадары паспільвалі старыя яблыні ды слівы і пабудавалі цяпліцы. З'ява рабілася масавай і набірала непрыемны ажыятаж і непатрэбную зайздрасць да вялікіх заробкаў «гурочных каралёў». Лаўрэнцій, як адкрывальнік «клондайка», адгрукаў другую цяпліцу, не зважаючы ўвагі на папярэджанне прадстаўніка выканкома. Трэба было нешта неадкладна рабіць. І па прыкладу мясцовых улад на Палессі, выканком прыняў рашэнне дазволіць будаваць цяпліцы толькі памерам пяць метраў на пятнаццаць. Там-сям міліцыя разбурыла некалькі цяпліц. Спакойна жыў адзін Лаўрэнцій, адчуваючы паблажлівасць Ліхадзея. Ды было гэта да пары. Авяр'ян даведаўся пра дзіця ў Любы. Рэгіны акурат у хаце не было. Зняў ён сваю папругу з пражкай і так адлупцаваў разгубленага сына, што той мусіў схавацца пад ложак. Быў ён збіты так моцна, што не змог нават сам вылезці адтуль, калі прыйшла з работы маці. «Я ўцяку... Я тут жыць не буду. Усё... Пасля і цябе забяру»,— упершыню так шчыра прызнаўся маці Віталік.

Ліхадзей пачаў адкрыта помсціць Лаўрэнцію. Па-першае, знялі яго без усялякіх прычын з работы, на якую так сватаў Авяр'ян. Па-другое, сам начальнік кіраваў, разнеслі ўшчэнт бульдозерам яго цяпліцы. Лаўрэнцій прывык да харошага заробку, не стаў шукаць работу ў Белагрудку, прачуў пра шабашнікаў (брыгаду фарміравалі ў вёсцы Падзішчы), узяў сякеру і гэблік ды паехаў на пяць месяцаў у Свярдлоўскую вобласць будаваць кароўнікі. «Каб я шапку здымаў перад гэтым г...? Зневажаў сябе! Не-е... Пераменяцца часы... знімуць і яго. Бач, які помслівы... Гніда. Нездар-

ма казалі ў партызанах, што ён ні за што пані забіў і замак спаліў. Не-е... Лаўрэнцій не спаганіўся яшчэ. Забірай дачку сюды. Нікога не бойся»,— казаў Кароза занепакоенай жонцы. «Няхай там пабудзе. На рабоце, дзякуй богу, з людзьмі. А дзіцятка забяру, калі аддасць»,— адказвала жонка.

Цяпер, калі ўсё адкрылася і ўсе змірыліся з абставінамі, Віталік часцей і ахвотней ездзіў у Баранавічы. Прынцыпова не прасіў грошай у бацькоў. Сядзела ў ім бацькоўская струнка празмернай фанабэрыі і надменнасці. Ён вёў Любу ў рэстаран, купляў дарагія падарункі, транжырыў грошы як толькі можна. Сродкаў на такое прывольнае жыццё не хапала. Паступова, шукаючы лёгкіх грошай, ён далучыўся да фарцоўкі. Джынсавыя штаны, спадніцы, майкі з амерыканскімі і англійскімі сцягамі, курткі, японская радыёапаратура — усё гэта з цяжкасцю даставалася і перапрадавалася на базарах у Ваўкавыску, Лідзе, Навагрудку. Грошы, якія хутка адным махам прыходзілі, так жа хутка прахам і выходзілі. Знайшоў ён з сябрамі новую справу: пачалі рабаваць цэрквы і касцёлы, кралі з помнікаў на могілках алавяныя крыжы і распяцці Хрыста. Цішком наладжваліся кантакты са сталічнымі фарцоўшчыкамі, спецыялістамі на царкоўныя рэчы. Так упершыню ў яго кашальку з'явіліся зялёненькія паперкі долараў, якімі ён з задавальненнем і нават дзёрзкасцю хваліўся перад Любай і яе сяброўкамі.

Рэгіна толькі падазравала пра авантуры сына, толкам не ведала, як часта ён пераступаў мяжу закона. На яе просьбы пагаварыць шчыра, вырашыць, нарэшце, свой лёс, ён аднекваўся. Вучыцца яму даўно не хацелася. Пастаянна на кватэру па міжгорадзе званілі жанчыны. Усё гэта палохала маці. Ён супакойваў, казаў што нічога жахлівага няма, што жаніцца ён таксама перадумаў і ніколі не будзе. Ад бацькі ўсё начыста хавалі. Абое баяліся, што ён у ярасці можа забіць сына. Авяр'ян даведаўся пра «грахі» сына ад чужога чалавека.

Алег Чумак, круглатвары, з абаяльнай усмешкай, якую не маглі схаваць густыя чорныя вусы, пасля заканчэння юрыдычнага факультэта нейкі час працаваў следчым у баранавіцкім аддзеле ўнутраных спраў. Яго бацька, белагрудскі адвакат, як толькі вызвалілася пасада старшага следчага ў сваім раёне, угаварыў, канечне, за чаркаю, Ліхадзея запрасіць на гэту пасаду Алега. Трыццаціпяцігадовы следчы ў росквіце творчых і фізічных сіл апантана ўзяўся за работу. Можна сказаць, з лёту раскрыў першую для сябе

ў горадзе справу — абрабаванне касы рэстарана «Нёман», чым адразу і замацаваў аўтарытэт добрага прафесіянала. Алег быў трохі старэй за Юрася, аднак гэта не перашкаджала ім сябраваць яшчэ ў далёкім дзяцінстве. Пачцівая і нешматслоўная, у адрозненне ад мужа, жонка Алега, украінка па нацыянальнасці, хутка пасябравала з Палінай. Малодшая дачка Чумакоў і сын Уладыкіных былі аднагодкі, больш таго, нарадзіліся ў адзін дзень. Святкавалі дні нараджэння разам. Нельга было адмовіць Алегу ў прыроднай фантазіі і здольнасці да імправізацыі. На хаду ён прыдумваў дзецям загадкі, гульні, браў падушку, выдаючы яе за гармонік, акампаніраваў дзіцячаму дуэту і падпяваў сам. Юрася Алег паважаў за чуллівае сэрца і светлы розум. Яму імпанавала ў натуры Юрася нянавісць да ўсяго, што прыносіць чалавеку пакуты. Здзіўляла Алега, што яго сябар дзяцінства так шчыра верыць у чалавека, любіць яго і заклікае стаць лепшым. Мажліва, менавіта таму ён і сказаў Юрасю пра тое, што нарабіў сын Ліхадзея.

Ніхто не падаваў заяву, каб завялі справу. Па ўласнай ініцыятыве, пасля сустрэчы з адным вясковым засмучаным святарам, Алег заняўся пошукамі зладзеяў. І знайшоў. У нечым памаглі і былыя калегі з Баранавіч.

У сваім адказе Уладыкін быў бескампрамісны: «Трэба даводзіць дазнанне да канца. Далей справа пракурора».

— Даведаецца Ліхадзей. Яны сябруюць з пракурорам. Усё папярэдзіць і апярэдзіць. Спаляць усе масты, напалохаюць сведкаў... і закрыюць за недастатковасцю ўлік.

— Тады трэба судзіць за страту гістарычнай памяці і здраду культуры, нацыянальнай свядомасці,— гарачыўся Юрась.

— Такога артыкула няма,— усміхнуўся Алег.

— От так у нас усё па-дурному. У жонкі маёй няма каго паслаць на абласную алімпіяду па матэматыцы... трагедыя. Чакае вымову. Усім падавай вынік, адразу любой цаной, а працэс ніхто не кантралюе, ніхто ў ім не зацікаўлены. Рух наш, а чые інтарэсы? Гэта пакідаць ніяк нельга. Абыдзі Ліхадзея. Вось што... давай пазнаёмім з матэрыяламі карэспандэнта абласной газеты. Шахне фельетон. Напісанае застаецца,— актыўна шукаў падказку ўсхваляваны Уладыкін.

— Рана. Тое-сёе трэба ўдакладніць.

— Скажы, што боязна.

— Праўда на маім баку, чаго баяцца.

— Калі прыняў рашэнне, навошта раішся са мной?

— Не з Ліхадзеем жа мне раіцца. Гарачы ты стаў... У нашай справе спяшацца нельга.

— Пакуль ты будзеш думаць, дык яны і званы з касцёла ўкрадуць. Магчыма?

— Магчыма,— згадзіўся Алег.

— Ну, вось,— як бы расчаравана адказаў Юрась.

— Я больш чым упэўнены, што мне тут перакрыюць дых на самым узлёце... Вось што... дай мне яшчэ тыдзень... і прызначай сустрэчу с карэспандэнтам. Ты з ім добра знаёмы?

— Чалавек прынцыповы, яго хоць трохі баіцца раённае кіраўніцтва. Ты яшчэ абвінаваўчае заключэнне не рабіў?

— Пакуль не. Прыпісваецца грабёж. Пабілі ў адной царкве старасту.

Авяр'ян даведаўся пра грахі свайго сына ад Чумака-старэйшага.

Дабрадушны адвакат, памятаючы, хто дапамагаў яго сыну, у знак падзякі намякнуў Ліхадзею пра тое, што ён сам краем вуха пачуў ад сына. Намёку Авяр'яну было дастаткова, каб ён усё раскруціў за адзін дзень. Прызнацца, ён не чакаў такой «партызаншчыны» ад Алега, ды выгляду не падаў. Выбраў тактыку адабрэння і хвалы, абвінавачваючы сваю праклятую работу, якая не давала магчымасці і часу на выхаванне ўласнага сына. Мякка папрасіў справу для азнаямлення. Алег адгаварыўся, сказаў, што матэрыялы ў карэспандэнта абласной газеты.

Настрой у Ліхадзея імгненна змяніўся. Ён добра ведаў гэтага карэспандэнта. Бывала, калі яго прасілі не друкаваць, не абнародваць якую-небудзь скандальную гісторыю, абяцалі на месцы разабрацца і вырашыць, ён не паддаваўся на любыя ўгаворы.

Куды падзелася ўся стрыманасць Ліхадзея. Ён абураўся, не саромеючыся грубых выразаў: «Пацан. Каму ты абавязаны! Яму капаеш? На маё месца захацеў? Хто цябе ўзяў на павышэнне... чым ты аддзякаваў за ласку і клопат? Здаецца, я твайму бацьку нічога кепскага не рабіў». Алег разгубіўся, але адступаць не было куды.

— Што вы палохаеце мяне! І над вамі ёсць кіраўніцтва. Мне дзяржава дала пасаду, а не вы! — не сцярпеў, таго сам не чакаючы, Алег.

Авяр'ян збялеў. Ніхто яму так адкрыта ў твар не пярэчыў. Ён паказаў рукой на выхад, ні слова не сказаўшы ў адказ. Праз дзень маладому следчаму пазваніў пракурор і прасіў прыйсці да яго з матэрыяламі справы Віталія. Зва-

нок быў на кватэру ў выхадны дзень. Алег вырашыў параіцца з сябрам, пасля абеду накіраваўся да яго, аднак Юрася дома не аказалася, Паліна паведаміла, што ён па нейкай неадкладнай справе паехаў у Карэліцкі раён у вёску Вароны. Яна і сама занепакоена: паехаў а шостай гадзіне, абяцаў хутка назад, а ўжо хутка вечар, а яго няма. Алег супакоіў жанчыну, сказаў, што рэдка ходзяць аўтобусы, папрасіў, як толькі прыедзе, каб пазваніў яму.

Уладыкін да гэтага часу ўсё адкладваў сваю паездку ў Вароны, хоць помніў аб гэтым пастаянна і нават дакараў сябе за пасіўнасць. Неяк усё адно да другога: то работа, то сямейныя клопаты, то хвароба маці, то неспадзяваная рэўнасць Паліны, ад якой амаль не ўшчаўся скандал на ўвесь Белагрудак.

Часта прыходзіла ў музей да маці яе абаяльная і гаварлівая дачка Света, якая пасля нараджэння дзіцяці акруглілася, папрыгажэла. Яна вабіла да сябе адкрытасцю, маладосцю.

Ёсць такі рэдкі тып жанчын, у якіх знешняя жаноцкасць, прывабнасць валодаюць як бы магічным уздзеяннем на мужчын. Яна хоць і воддаль стаіць, а цябе прабіраюць, працінаюць нябачныя хвалі пяшчоты да яе і авалодвае жаданне падысці, загаварыць, бо ў ёй — усё шчырае, натуральнае. Такая была і Святлана. Яна ніколі не спекулявала гэтымі сваімі прыроднымі якасцямі, па маладосці яна яшчэ не ведала свайму багаццю цаны. Выскачыла замуж па каханні на другім курсе інстытута за выпускніка вайсковага вучылішча, нарадзіла дзіця і чакала, седзячы ля маці, пакуль прыедзе яе русявы афіцэр і забярэ ў далёкую Комі. Часта яна пакідала ў музеі каляску з дзіцем, а сама бегла ў кіно на французскую камедыю ці індыйскую меладраму. Яна з неахвотай вучылася. Юрась часам карміў дзіця з бутэлькі малачком, асабліва калі ішоў двухсерыйны фільм.

Ці багата тых фактаў трэба, каб якой-небудзь цётцызавадатару нарадзіць перабольшаную пагалоску? Часам яны стаялі доўга ля музея, калі-нікалі ён нават ішоў з ёй па вуліцы. Быў грэх. Аднаго разу, застаўшыся сам-насам у музеі, яны неяк памкнуліся адначасова адно да аднаго. Яна так засумавала без мужчынскіх абдымкаў, што пачала цалаваць яго, не звяртаючы ўвагі на плач дзіцяці ў калясцы. Потым хутка сунула малому соску, павярнула каляску другім бокам, быццам было сорамна перад дзіцем, і зноў наблізілася да яго. Юрась не стрымаўся і горача прыпаў да яе падатлівых вуснаў. Гэтая яе даступнасць і падатлівасць

ап'янілі Юрася. Невядома, чым бы ўсё скончылася, каб не пачуўся рып дзвярэй і тупат ног па рассохлай падлозе ў калідоры. Прыйшоў у музей настаўнік-пенсіянер. Два дні яна не выбіралася з каляскай у цэнтр. На трэці прыйшла ў музей у новай кофтачцы, з белым бантам на галаве, з непадведзенымі вейкамі і кідкай памадай на губах. У той дзень ім не ўдалося пабыць адным. «І гэта добра»,— казаў сам сабе Юрась.

Праз дзень, калі ў маці быў выхадны, Святлана, як заўсёды прыгожа і модна апранутая, прыйшла ў музей адна, без дзіцяці. Відаць, нехта ўсё ж падказаў Паліне, а можа, адыграла сваю ролю вострая жаночая інтуіцыя. Праявіўся нарэшце ў Паліны буйны характар бацькі Белашапкі. Ледзь Юрась іх разняў. Каб не разняў, адужала б Паліна дачку дырэктаркі, павырывала б ёй валасы. Дзён дзесяць жонка з ім не размаўляла. Яшчэ дзён дзесяць абменьваліся і абыходзіліся кароткімі і самымі неабходнымі ў быце словамі. Памірылі іх дзеці. Яна даравала, але запомніла на ўсё жыццё.

Калі ж Святланы не стала ў Белагрудку, цяжкі камень недаверу на сэрцы жонкі рассыпаўся.

Ён са спакойнай душой паехаў у суседні раён у вёску Вароны.

З многім звыкся, шмат да чаго прывык Анатоль Стадарожац, загадзя ведаючы: хто чаго варты і што ад каго чакаць. Ён зразумеў, што гаспадарку ў раёне яму не падняць, і таму цвёрда вырашыў не мітусіцца. Трэба трошкі пажыць і для сябе, пакуль ёсць магчымасць і адносная ціша. Толькі з двух месц ён і чакаў трывожныя сігналы: ад дачок са сталіцы і ад свайго ваенкома. Бяда па шчаслівай выпадковасці доўга абыходзіла бокам Белагрудскі раён. Далёкія чуткі пра гора суседзяў не бралі за жывое. Усім хацелася думаць, што іх яно міне.

Не мінула. Толькі з большай трывогай, незажыўна адгукнулася ў душах, раніла ў самае сэрца. Тэлеграфныя правады прынеслі жахлівую вестку і ў Белагрудак: «Смертью героя погиб, выполняя интернациональный долг в Афганистане, младший сержант Евгений Александрович Кулик. Гроб с телом будет доставлен на Щукинский аэродром 10 мая в 8.30 утра».

Пазваніў ваенком, ён жа і папярэдзіў, што труну даставяць на радзіму сяржанта ў вёску Падзішчы салдаты

з ягонай часці. Па-чалавечы ўсхваляваны Анатоль Станіслававіч пазваніў Ліхадзею, каб параіцца, каго ўключаць у камісію па пахаванні. Для сябе ён вырашыў — узяць абавязкова і Авяр'яна. Хто яго ведае, як павядзе сябе вясковы люд, каб не было непажаданых, з душком антысаветызму выкрыкаў з натоўпу ці яшчэ горш: незадаволеных заклікаў, стыхійнага мітынгу. Пачуўшы парады спакойнага Авяр'яна, Анатоль на ўсялякі выпадак перакінуўся некалькімі словамі са сваім калегам з Гродна, удакладніў, каму адкрываць жалобны мітынг, каму выступіць.

У райкомаўскую «Волгу» селі Старадарожац, першы сакратар райкома камсамола, старшыня райвыканкома, сакратар партыйнай арганізацыі СПТВ, у якім вучыўся Яўген Кулік. Вянкі ад райкома партыі і выканкома, райкома камсамола і СПТВ паклалі ў міліцэйскі «газік». Ваенком паехаў у Падзішчы раніцай.

Па дарозе маўчалі. Мінулі палеткі калгаса «1 Мая», яшчэ праз паўгадзіны ўехалі ў вёску Падзішчы. Гадоў пяць не быў у ёй Старадарожац. Паставілі жыхары новыя хаты, узвялі на голым месцы невялічкі новы цагляны клуб. Расцягнулася непазнавальна вёска ўздоўж лесу, і апынуліся могілкі ў яе цэнтры. Кулікі жылі ў Малых Падзішчах, занядбанай часам і забытай богам і людзьмі вёсачцы ля самай ракі. Было дванаццаць гадзін. Нязвыкла было для раённага кіраўніцтва бачыць так многа людзей на лаўках і прызбах ля хат, вялікі натоўп на могілках ля свежавыкапанага долу. Кіраўнікі выйшлі з машыны, адчуваючы на сабе насцярожаныя позіркі. Падалося Авяр'яну, што ў гэтых позірках была і доля недаверу, схаванага дакору. Усе засталіся на сваіх месцах, да машын падбег старшыня сельсавета.

— Добры дзень, таварышы! — услых, каб пачулі і астатнія, хто стаяў ля шэрага старога штыкетніка, сказаў Старадарожац.

— Добры дзень, Анатоль Станіслававіч,— паспяшаўся з адказам рухавы старшыня.

— Я даваў каманду, каб аркестр з раёна быў.

— Яны там. Прыехалі.

— Добра. А чаму народ так рана сабраўся?

— Загадзя прыйшлі, Анатоль Станіслававіч, не ведаюць, калі пахаванне,— услужліва адказваў старшыня сельсавета.

Старадарожац акінуў усіх поглядам. Людзей было чалавек дзвесце, дзвесце пяцьдзесят. Яны стаялі невялічкімі групамі, асобна жанчыны і асобна мужчыны, якія ў большасці сваёй дымілі цыгаркамі.

— Трэба туды ехаць,— падказаў Анатолю Ліхадзей.
— Так. Едзем.

Хата Кулікоў стаяла акурат пасярэдзіне вуліцы, па другі бок якой раслі старыя клёны, бярозы, а за імі прасціраліся аж да ракі гароды. Ля староватай, але яшчэ не аселай у зямлю хаты з калодзежам ля варот, прапелерам на вільчыку страхі і разнымі налічнікамі, пафарбаванымі ў жоўта-зялёны колер, стаялі панурыя людзі. Адна жанчына, заўважыўшы райкомаўскую «Волгу», пабегла ў хату, папярэдзіла. Ім насустрач выйшлі ваенком і малады зусім з запалымі стомленымі вачыма афіцэр. Нязваныя госці ўзялі вянкі і панеслі іх да труны.

Маладая яшчэ маці Яўгена з шэрым тварам і выплаканымі вачыма сядзела ля запаянай цынкавай труны, апусціўшы галаву і скрыжаваўшы перад сабой рукі. Яна нікога не бачыла. Бацька, рана палыселы, але таксама яшчэ малады мужчына, сядзеў побач, утаропіўшы позірк у куток. Ён заўважыў высокае кіраўніцтва і злёгку як бы хітнуў галавой: маўляў, праходзьце бліжэй.

Старадарожац сумеўся. Ён, як і ўсе астатнія, упершыню бачыў цынкавую труну, на веку якой быў выразаны круг толькі для твару нябожчыка. Было цемнавата ў хаце, твар разгледзець было амаль немагчыма.

Маці ўзняла галаву, паправіла чорную хустку, якая спаўзла, і, сіплым голасам прыгаворваючы, заплакала:

— За што забілі майго сыночка? Вярніце мне яго... Навошта схавалі, замуравалі? Ой, людцы добрыя, што ж гэта робіцца?..

Усе, хто прыехаў, апусцілі вочы долу, быццам няшчасная жанчына звярталася менавіта да іх.

Чакалі, пакуль дзяўчаты, былыя яго аднакласніцы, упрыгожаць жалобную машыну.

Старадарожац і Ліхадзей не ведалі, куды сябе дзець. Нарэшце распачалі мітынг. Анатоль Станіслававіч вырашыў так: у хаце ля труны развітальнае слова скажуць ваенком, дырэктар школы, у якой вучыўся сціплы і спакойны Жэня, і сакратар райкома камсамола, на мітынгу ля магілы, дзе сабраліся людзі, выступіць сам Старадарожац і афіцэр часці, у якой служыў Кулік.

Панеслі з хаты чырвоны слупок з пяцікутнай зоркай, здымак Жэні ў пазалочанай рамцы, вянкі... Падхапілі рослыя салдаты на моцныя плечы труну, і працэсія рушыла да

машыны. Да могілак было кіламетры са тры. Заплакалі трубы, ім туравалі, паглыбляючы мінорны запеў, барытоны, рэзка абрываў такт, як абрываецца маладое жыццё, вялікі бубен.

Нясккладна распачалі музыкі жалобны марш.

«Халтуршчыкі! З перапою, ці што? Не... не ўмеем мы яшчэ хаваць, як цывілізаваныя людзі. Як гэтыя шарамыжнікі апрануты... А машына. Колы ў гнаі. Іржа. Разбіта ўся. Не ўмеем»,— унутрана абураўся Старадарожац.

А ранняя вясна панавала ў квецені вішань, сліў, у зеляніне дрэў. Сонца, якое біла насустрач, так лашчыла твар, што хацелася заплюшчыць вочы і замерці на месцы, ні аб чым не думаючы. Не хацелася верыць, што ідзе жалобная працэсія, так яна не адпавядала аптымістычнаму, поўнаму дзівосных гукаў і птушыных песень настрою прыроды.

Старадарожац і Авяр'ян ішлі побач, трошкі ўбаку ад старшыні выканкома.

— Чым яго ўзнагародзілі, не ведаеш?

— На падушачцы ордэн Чырвонай Зоркі,— адказаў Авяр'ян.

— Ты заставайся там сярод натоўпу, да магілы не ідзі.

— Разбяромся. Слухай, даўно хацеў табе сказаць... Чаго мы трымаем у дэпутатах гэтага графамана, які нічога для раёна не зрабіў, не прабіў, не здабыў? Маю на ўвазе Шабыльчыка. Чаму б табе не стаць дэпутатам, вось аб чым падумаў. Зноў жа восемдзесят дармавых, лічы, рублёў плаціць. Хоць нейкая карысць будзе. Шабыльчык нам зараз не патрэбны, дочкі вучацца...— чамусьці загаварыў зусім пра іншае Ліхадзей.

— А што... Неблагая ідэя. Трэба падумаць.

— Што дочкі пішуць?

— А... расчараваны ўжо. Каму цяпер ахвота вучыцца, прывыклі на бацькоўскіх шыях... Жанна яшчэ так-сяк, а Арыядна як галёры адбывае. Гулі на вуме.

— Слухай. Колькі на раён «Жыгулёў» выдзелілі?

— Здаецца, чатыры, а што?

— Вельмі прасіў у мяне адзін чалавек.

— Я пас. Памог аднаму. Твайму Смялянскаму. Дык прадаў машыну, а сам за гэтыя грошы з'ехаў у Амерыку.

— Што ты перажываеш? Калі я кажу трэба, значыць, трэба.

— Пагавары са старшынёй выканкома.

— У мяне ёсць білеты на «Песняроў». У Гродне канцэрт даюць.

— Скажу Варвары.

Авяр'ян зрабіў неўпрыкмет некалькі крокаў да старшыні. Падышлі да могілак. Убачыўшы труну, пачуўшы стогн-плач маці, жанчыны пасунуліся бліжэй да машыны, ціха заплакалі, мужчыны знялі запыленыя кепкі. Салдаты ўзялі з машыны труну і панеслі на могілкі да долу. Старшыня сельсавета паспеў зняць з завесаў шырокія вароты. І добра зрабіў. Людскі натоўп знёс бы іх. Ваенком адкрыў мітынг і даў слова маладому афіцэру. Другім выступаў Старадарожац.

Авяр'ян, як і дамовіліся, хадзіў сярод натоўпу, да магілы не падыходзіў.

Старадарожац збіваўся, блытаўся, доўга шукаючы цёплыя словы, а выходзіла казённа, штучна, бяздушна. Ён у канцы паабяцаў, што раён увекавечыць памяць свайго героя, назаве яго імем поле, зробіць у школе, дзе ён вучыўся, музей. Людзі амаль не слухалі яго. Надышла мінута апошняга развітання. Маці ўпала на труну, біла па ёй рукамі і роспачна галасіла, расчульваючы ўсіх прысутных.

Маўклівы бацька нябожчыка падхапіў яе пад рукі, стараўся супакоіць. Людзі ў натоўпе загаманілі: «Калі ж гэта ўсё скончыцца? У нас таксама сын у арміі».— «І ў нас...» Анатоль Станіслававіч апусціў уніз галаву і думаў толькі пра адно: хутчэй бы салдаты паднялі труну, якая стаяла на дзвюх старых табурэтках, і ён бачыў, што ў пярэдняй табурэтцы ножкі пакасіліся, вось-вось зломяцца...

Ён аж успацеў увесь ад думкі, што вось труна ўпадзе і тады пачнуць крычаць і тыя, хто сілком стрымлівае свой гнеў і абурэнне.

Салдаты паднеслі труну да долу, і мясцовыя дзядзькі на ручніках узяліся апускаць яе, а салдаты тым часам пайшлі да свайго сябра, які стаях недалёка і трымаў на плячах аўтаматы.

Яшчэ раз халодным рэхам абдаў усіх стогн-плач маці...

Лапаты бралі па чарзе, дапамагаючы засыпаць,— і афіцэр, і ваенком, і старшыня выканкома. Трыма залпамі салютавалі над магілай салдаты-аднапалчане. Зноў маці не вытрымала, упала з плачам на свежы пясок.

Аркестранты першымі подбегам рушылі да свайго аўтобуса, за імі пайшло раённае начальства. Вяскоўцы стаялі на сваіх месцах нерухома.

— Бацька Жэні запрашае вас да жалобнага стала, памянуць,— падбег да Старадарожца старшыня сельсавета.

Анатоль Станіслававіч запытальна паглядзеў на Авяр'яна.

— Трэба дык трэба,— адказаў услых Авяр'ян.

Тройчы выпілі. Слова зноў сказаў ваенком. Сваякі, родныя, сябры Жэні, суседзі сядзелі моўчкі. Было такое пачуццё, што госці з раёна лішнія тут людзі. Дарэчы, гэта адчувалі і самі раённыя кіраўнікі. Старадарожац услых сказаў: «Што тычыцца бытавых пытанняў, работы, пуцёвак, дапамогі... прашу адразу ў райком да мяне... да ваенкома ў любы дзень і час».

Быў на пахаванні і яшчэ адзін чалавек — стрыечны брат бацькі Жэні. Гэтага чалавека калісь у партызанах добра ведаў Авяр'ян, прызнаў яго і цяпер і ўсё рабіў, каб той не зачапіў яго. Ліхадзей нават не падаў рукі, не павздароваўся. Чалавек, відаць, той быў сціплы, не рызыкнуў сам першы падысці да Авяр'яна. У хаце на памінках Авяр'ян наўмысна сеў спіною да свайго былога таварыша-партызана.

Спехам раённае кіраўніцтва пакінула вёску Малыя Падзішчы, у якой з трыццаці трох чалавек насельніцтва на аднаго паменела.

Юрасю Уладыкіну, можна сказаць, пашанцавала, бо калі б ён спазніўся на дзень-два, давялося б яму шукаць Ядзю Батуру ў Цюменскай вобласці. Яна прадала спіртзаводу сваю хаціну, не змагла жыць пасля смерці Казіка ў Варонах. Пустая хата гняла душу ўспамінамі... Ядзя баялася заставацца адна, прасіла суседку пераначаваць... Ды ўсё з часам патроху забываецца...

У магазіне месца было занята, у калгас Ядзю не цягнула, бо, колькі сябе свядома памятае, рабіла ў магазіне, які знаходзіўся ў бацькавай хаце пасля вайны. Арэндавалі памяшканне. Дуэт іх вясельны, які даваў, трэба сказаць, неблагія грошы, распаўся пасля Казікавай смерці. Пражывала яна грошы, якія адклалі на чорны дзень, думала, выбірала, куды б прыткнуцца на работу.

Неспадзявана для сябе ўбіла ў галаву паехаць назаўсёды ў Цюмень. Напісала туды, што хоча завербавацца... толькі каб буфетчыцай, поварам ці афіцыянткай у сталоўку. Пад гарачую руку пісала. Прыйшоў ліст-запрашэнне. Яна і разгубілася. Параілася з дырэктарам школы, іх суседам, Фёдарам Фёдаравічам, якому чамусьці давярала, як і Казік некалі, і думкі свае, і сядзібу. Дырэктар багата перажыў на сваім вяку, добра ведаў чалавечы характар. Ён бачыў, што пакутуе ад адзіноты жанчына, якая часцей і часцей прычашчаецца чаркай. І акардэон Казіка прадала...

за нешта ж жыць трэба... Ен і параіў ёй ехаць да людзей, каб была работа, каб калектыў быў. «Нам, мясцовым, лягчэй. З дзяцінства адзін аднаго ведаем... А табе цяжка... сваіх няма. Адна... Адну бабу ў вёсцы не любяць... Не старая яшчэ ж... Скоса паглядаюць. Вельмі ж лёгка ўдаве ў наш час спіцца... Хочацца самой ехаць, падказвае сэрца... збірайся ў дарогу».

Юрася сустрэла насцярожана. Напачатку не ўсё зразумела, навошта гэта яму пра Казіка ведаць? Напалохалася, калі прачула пра Івана Чачырку. А раптам яго арыштавалі, падумала, ён нешта сказаў і цяпер будуць трывожыць яе? Клікнула на ўсялякі выпадак суседа Фёдара Фёдаравіча.

Селі на ганку. Ёй не хацелася запрашаць нязванага госця ў хату. Юрась падрабязна расказаў ім пра сябе, пра створаны музей, пра сяброўства з Іванам Чачыркам, пра лёс сям'і Батуры, які так зацікавіў яго некалькі гадоў таму назад.

Прызнаўся, што ехаў да Казіка і напачатку не паверыў жанчыне, калі яна казала, што Казік памёр і што сама нічога не ведае. Яшчэ прызнаўся, што яго вельмі цікавяць менавіта апошнія дні жыцця пані Аляксандры, сыноў — Казіка і Уладзіміра. Ядзя з палёгкай уздыхнула. Малады чалавек, які сядзеў насупраць і так шчыра, зацікаўлена расказваў пра сябе і пытаўся пра Казіка, зараз унушаў ёй давер.

Фёдар Фёдаравіч, каб, можа, крыху супакоіць і сваю насцярогу, папытаўся, ці ведае Юрась некаторых белагрудчан, якіх ведаў і сам Фёдар Фёдаравіч. І ўжо зусім супакоіўся, падабрэў і павесялеў, калі Юрась назваўся сынам Міхася Уладыкіна, якому, як аказалася, некалі Фёдар Фёдаравіч дасылаў у рэдакцыю свае першыя вершы.

Ядзя пайшла ў хату і прынесла срэбны медальён, дзе была ўстаўлена маленькая фатаграфія пані Аляксандры. Дзіўна, але Юрасю падалося, што менавіта такой ён яе і ўяўляў. Дзе ж ён мог бачыць падобны твар? Потым успомніў: Аляксандра вельмі падобна на маці паэта Багдановіча. Так. Якое дзівоснае падабенства! Як сёстры. Няўжо маці-прырода паўтараецца таксама?

Утойваць што-небудзь не было сэнсу. Ядвіга спакойна пачала расказваць пра апошнія гадзіны жыцця Казіка.

— Ён не любіў успамінаць пра сваё жыццё ў маёнтку. Так... хіба калі нечым быў вельмі ўзрушаны... згадваў гады маленства. Пра пажар і смерць блізкіх я ўсяго разы са тры і чула. Як сышліся, угледзела я медальён у яго на шыі, пацікавілася. Спрабаваў расказаць, але ж не да канца. Я ад-

чувала, што ён нешта тоіць. Тройчы я чула ад яго споведзь, і тройчы ён не меў сілы і здароўя расказаць усё дарэшты. Нешта заўсёды дабаўляў, пра нешта казаў па-новаму. Адно толькі люта ненавідзеў Авяр'яна і ўсё жыццё хацеў яму адпомсціць.

Юрась не нагадваў жанчыне пра выпадак ля пансіяната, і яна сама маўчала, не ўспомніла ў гаворцы пра спробу замаху.

— Я яго ўгаворвала паехаць да яго на радзіму... на месца былога маёнтка... Кожнага ж цягне туды, дзе ён нарадзіўся. Не згаджаўся. І раптам за тры дні да смерці, кажа, павязі мяне туды... хачу развітацца з духамі маці, брата і бабулі. Цяжка яму было збірацца ў дарогу. Ногі не трымалі ўжо. Завяла я «Запарожац»... зараз няма яго, прадала... павезла туды пад Белагрудак. Што там... парасло ўсё, закінута... У былой сыраварні канюшня калгасная. Якія ў яго вочы, вядома ж. Адным ледзь-ледзь свет божы бачыў. Упаў ён на зямлю, доўга плакаў. Наўзрыд. Я ўжо ведала, што рабіць: ручнік мокры да галавы, яго ў машыну... супакоіўся. У дзень смерці папрасіў, каб пагаліла яго. Я гэта спрытна навучылася рабіць. Папрасіў, каб прывяла да пасцелі ксяндза. Кажу, дзе ж таго ксяндза знайду, тады, кажа, няхай прыйдзе святар. Спавядацца хачу... і, кажа, няхай прыйдзе Фёдар Фёдаравіч. Прыйшоў, праўда, хуценька бацюшка Георгій, і Фёдар Фёдаравіч прыйшоў, дзякуй ім. Вось тады, без прыступу, без задухі, ён упершыню спакойна і расказаў нам, як жылі ў маёнтку. Як маці, памагаючы партызанам, страшэнна баялася аднаго з іх — Цыгана. Казала дзецям, што ён яе заб'е. А ўцячы не было куды. Брат Уладзімір пайшоў у самаабарону толькі з адной мэтаю, каб была ў хаце зброя, каб бараніць маці... Яны так былі напалоханы Цыганом. Як толькі ён прыходзіў, брат браў вінтоўку і стаіўшы дых хаваўся ў суседнім пакоі, прыслухоўваючыся да кожнага слова. ...Яны прыйшлі ўдвух зусім нечакана. Маці пабудзіла сыноў... Загадала ім схавацца на кухні, каб можна было хуценька, калі што, уцячы праз чорны выхад. Нечым Цыган і Баксёр былі ўстрывожаны. Усё іх, асабліва Цыгана, раздражняла, да ўсяго чапляўся. Многа выпілі. І вось тут Цыган пачаў лезці да Аляксандры. Пасадзіў яе да сябе на калені і пачаў сілком цалаваць. «Ён ссільнічае яе! Ты чакай тут, а я пайду!» — сказаў Казіку Уладзімір і ўскочыў з вінтоўкай у пакой. Загадаў пакінуць ім хату, не чапаць маці, а не то застрэліць іх... Пачуўся стрэл. Толькі па матчыным крыку Казік зразумеў,

што забілі яго брата. Ён палез пад прыпечак шукаць сякеру. Знайшоў яе і паціху рушыў на галасы. Тое, што ён пачуў, апякло яго слых, спыніла сэрца. «Патрымай ёй ногі, што стаіш як пень... каб к... не брыкалася»,— хмура загадаў адзін другому.

Маці толькі мармытала, відаць, адной рукой ён заціскаў ёй рот. Некалькі слоў ён пачуў, змагла выгукнуць: «Авяр'ян... Бог табе гэтага ніколі не даруе. Жывёліна, жывёліна... памажыце... Казік! Мама!»

«Я тут, мама»,— сказаў Казік, пераступаючы парог. Ззаду нехта заламаў яму руку з сякерай назад, вырваў з рук тапарышча, а яго піхнуў назад у кухню. Казік упаў, параніўшы галаву.

«Што ж, сука, думала так і паедзеш з немцамі...— даносілася да Казіка.— А цяпер, Баксёр, давай і ты... Ну... Я ногі патрымаю, не бойся... Ды яна ўжо згодна... Смірна ляжыць. Інструмент спадніцай не прыкрывае... не сарамеецца. Не скуголь, бо застрэлю... Давай, Баксёр, каму сказаў. Ну...» — «Авяр'ян... я баюся... я не змагу... не настроены».— «Нічога... ляжаш на гэтае багацце, настроішся. Давай, а то і цябе застрэлю».

Дзверы, якія Баксёр зачыніў за Казікам, не паддаваліся яму. Ён толькі моцна стукаў у іх кулакамі.

Пасля пачуўся стрэл. Казік адчуў пах паленага і зразумеў, што ў пакоі пажар. Дарма ён крычаў за дзвярыма: «Мама!», «Мама!» Ніхто на яго крык не адгукнуўся. Тады ён пайшоў на другі паверх, каб ратаваць калеку-бабулю. Дарогу туды перагарадзіў агонь. Ён памкнуўся назад, не ведаючы, як знайсці выйсце, як ратавацца ад агню. Нехта ў дымным калідоры пацягнуў яго за руку, выпхнуў з агню на ганак. Казік, не ўтрымаўшыся, упаў у снег. Яго паднялі. «Твая маці і брат былі звязаны з немцамі. На нас была аблава. Маці і брата ў перастрэлцы застрэлілі. Цябе не чапаем. Не бойся. Вось мая рука. Каму я даю руку, той мне сябар. Ідзі прама да хутароў. Усім перадай... хто пойдзе да немцаў ці ў самаабарону — усіх пасцігне партызанская кара». Нервовы цік скаваў Казіку сківіцы. «Там... там бабуля!» — праз слёзы ўспомніў ён. «Позна. Яна згарэла разам з немцамі з засады. Не плач па старым. Ідзі ўперад»,— загадаў яму голас Цыгана.

Так мы ўтраіх тады ўпершыню і пачулі ад Казіка яго тайну-праўду, якую не хапала яму сіл і волі адкрыць раней. Баяўся напачатку, што Авяр'ян знойдзе ды заб'е. Таму з'ехаў адтуль.

Што яшчэ сказаць. Калі сябруеце з Іванам, ведаеце, мусіць, пра выпадак ля пансіяната. Скажу, колькі Казік жыў, шукаў Авяр'яна. Знайшоўшы, хацеў адпомсціць. Я яму паверыла адразу... Трошкі ведала Ліхадзея і я. Маладая была... без галавы. Гандлявала ў магазіне... пасля ў раёне ў буфеце... выяздныя буфеты тады былі ў модзе. На ўсе святы ехалі на прыроду і парк... Навучылася мухляваць. Маё начальства добра паслося каля дармавой гарэлачкі ды закусачкі. Кажуць, Ядзя, не бойся, возьмем цябе пад абарону. Не дапусцім турмы. Ну і што, я дурная, паверыла... паіла іх. Прывучылася красці. Добра жылося. Замуж не хацелася. Да пары збан ваду носіць. Патрусілі. Выявілася велізарная недастача. Бачу, што мае апекуны забыліся пра мяне, не ратуюць. Узяла я ўсё следчаму пра іх махінацыі і сказала. Тады гэтага следчага забралі. Аддалі мяне другому. Адвакат напалохаў. Кажа, на судзе маўчы, дадуць тры гады з канфіскацыяй. Іх не чапай, а то прыпаяюць усе пяць. Паслухалася. Сядзела ў жаночай турме. Застала там Ліхадзея. Тры месяцы пры мне быў. О, бабы плакалі... Каму толькі не скардзіліся, Брэжневу пісалі. Нікога і нічога не баяўся. Запрашаў у кабінет, распранаў і забаўляўся як хацеў. Каго ўгаворам браў, абяцаннем амністыі, каго шантажом, каго сілком. Мы нават некаторыя факты ў лістах апісвалі... у яго ў паху, дзе нага пераходзіць у тулава, вялікая радзімка.

Пісалі, пісалі, плакаліся, патрабавалі суда... як у бочку. Я яго пазнала. Ён мяне не... А я яго пазнала. Вось і ўся гісторыя. Толькі навошта яна вам? Што ад гэтага зменіцца... Ніхто яго ніколі судзіць не будзе... Каму гэта трэба?

— Людзям трэба! — усхвалявана адказаў Юрась.

— Хіба што людзям. Казік так і сказаў апошнія словы... «Няхай ведаюць, людскі суд яго асудзіць, калі бог маўчыць».

— Скажыце, вы маглі б даць гэты медальён для нашага музея? Можам нават за гэта заплаціць. Праўда, грошы невялікія.

— Бярыце, калі трэба. Бог з імі, з грашыма. Іх ніколі не хапае.

Да аўтобуснага прыпынку Юрася праводзіў маўклівы засяроджаны Фёдар Фёдаравіч.

— Вы не сумняваецеся ў праўдзівасці апошніх слоў Казіка? — запытаўся ён у Юрася.

— Ніколькі. Праўда, існая праўда!

— І я так падумаў, калі толькі пачуў. Загарэўся, скажу

вам, пісаць хацеў у пракуратуру, у камітэт дзяржбяспекі. Пасля астыў, перадумаў. Асноўны сведка памёр. Мала што ён мог нам сказаць. Хто паверыць? Ды і хто за даўнасцю гадоў шукаць будзе вінаватых. Гэтыя людзі маюць, відаць, заслугі на цяперашні час.

— Ніякія заслугі не могуць апраўдваць іх бесчалавечнасці.

— Так-то яно так... Але ж...

— Скажыце, я магу разлічваць на вас... калі, скажам, спатрэбяцца сведкі?

— Можаце,— са спакойнай упэўненасцю адказаў Фёдар Фёдаравіч.

— Дзякую.

— Зайздрошчу вам, калега. Вы яшчэ верыце ў справядлівасць. Я ж, прызнаюся, на працягу апошніх дзесяцігоддзяў страціў гэтую веру. Толькі не асуджайце, маўляў, настаўнік, як ён выхоўвае моладзь?.. За вучняў не сорамна... пакуль не сорамна... Але ж мяне падмяла пад сябе ачэзлая аднадзённасць і вялікая апатыя. Аўтарытэт настаўніка страчаны. Большасць нашай інтэлігенцыі жыве не толькі беднавата, але і нецікава... Адкуль прычына страшэннай абыякавасці — не ведаю. Даўно наспела рэформа школы... Ні ў кога рукі не даходзяць. Прыходзяць маладыя... Божа праведны, інтарэсы мізэрныя... любоў да дзяцей на нулі. Вы для мяне прыемнае выключэнне. Даруйце, вы мне нагадваеце мяне ў маладосці. Не цалкам, скажам, а вось гэтым пратэстам супраць несправядлівасці, даруйце за казённыя словы, прагай сцвердзіць і праўду і дабро.

— Вы мяне пераацэньваеце, паважаны Фёдар Фёдаравіч, мне здаецца, гэта натуральнае жаданне кожнага жывога чалавека, якому баліць сэрца.

— Так, так... я згодны. Вось іменна жывога... А колькі іх... з мёртвымі душамі, якія так і не прачнуліся. На жаль, агромністая большасць. Я чуў, гэты Авяр'ян усё яшчэ начальнік міліцыі?

— Пакуль начальнік. Судзіць такіх трэба.

— Ну, не гарачыцеся. На цяперашні час змагацца з прадстаўнікамі ўлады — усё адно што пляваць супраць ветру.

Паўстаў і я... адкрыюся вам... даўно. Гады са тры... і супраць каго... старшыні калгаса. Жорсткі, нахабны чалавек, які людзей у капейку не ставіў. Узяла адна ўдава ў брыгадзіра без дазволу старшыні коніка, соткі свае ўзараць. Свята было. У калгасе не рабілі. Божа мой, наляцеў, як каршун...

Аблаяў жанчыну... Чаму, маўляў, без яго дазволу... і забраў, шэльма, каня... не даў дааранць. Узяўся я пісаць супраць яго. Сябар у мяне аднакурснік ёсць. У сталіцы жыве, добры паэт, працуе ў часопісе. Запрасіў я яго, каб ён у газеце выступіў. Даў яму багата фактаў. Хадзіў ён па хатах, распытваў пра старшыню. Людзі праўду баяцца сказаць, вядома... Увечары людзі старшыні напалохалі майго паэта... прыгразілі, мо і паг дых раз далі... Браце, уцёк, нават і не развітаўся. Я не здаваўся. Пісаў, нічога не дапамагло. Толькі ворага сабе лютага нажыў. Помсціць, пакасціць пачаў. Начальства яго пакрывае... Вып'е — гразіцца застрэліць мяне. Соткі да мізэру ўрэзаў. Бацькоў падгаворваў, каб на мяне пісалі... Вось, брат, якая гісторыя... Чатыры гады не размаўляем. Кінуў я пісаць, марная справа...

— Я не кіну...

— Таму вам і зайздрошчу... і паважаю вас...

Развіталіся яны як сябры.

Яшчэ доўга, засяроджана, стаяў ля прыпынку Фёдар Фёдаравіч, праводзячы позіркам белы аўтобус.

Як воз, у які запрэжаны шалёныя коні і які нясецца ўніз з гары, палохаючы наваколле грукатам і несучы бяду стрэчным, навалiлiся на Авяр'яна Паўлавіча з усіх бакоў жахлівыя падзеі. Не ўдалося ўціхамірыць карэспандэнта абласной газеты і следчага Алега Чумака. Даведаўшыся ад Юрася пра сапраўдную гісторыю лёсу Аляксандры Батуры і ролю ў ёй Цыгана і Баксёра, Алег зрабіўся ўдвая ўпартым і смелым. Юрась прасіў пакуль не абнародваць тое, што яны ведалі пакуль удвух, Алег узненавідзеў Ліхадзея.

Са свайго боку па справе аб грабяжы цэркваў у Белагрудскім раёне і спекуляцыі нарабаваным сярод перакупшчыкаў антыквару і розных махляроў, самастойна выйшаў следчы абласной пракуратуры.

Напалоханы Віталік тры ночы не быў дома. Ліхадзей узяў машыну і сам, седзячы за рулём, шукаў яго па ўсім раёне. Знайшоў. Ён ведаў некаторых «хлыстоў», з якімі боўтаўся без работы па горадзе яго сын. Не біў на гэты раз. На ўліку была кожная мінута. Паехалі на явачныя кватэры і падпольныя склады. Сабралі ўсё, што змаглі. Да суда астатніх завадатараў разбою Віталік прызнаўся і самавольна здаў усё, што змаглі аператыўна знайсці. Заставала-

ся адшукаць тры званы выплаўкі 1793, 1888 і 1912 гадоў. Не паспелі.

Прозвішча Ліхадзея і яго сына было на языку ва ўсіх жыхароў горада. Нашкодзіў і фельетон у газеце.

Авяр'ян Паўлавіч за тры дні да абнародвання фельетона паспеў перайсці ў намеснікі старшыні райвыканкома. Перад гэтым зрабіў банкет для сваіх. Як быццам нічога страшнага не сталася. Усё добра, усё ідзе сваёй чаргой... Казаў, што ён даўно хацеў кінуць па стане здароўя работу і робіць гэта без шкадавання і з задавальненнем. Запрасіў усіх супрацоўнікаў аддзела ў банкетную залу рэстарана. Прыйшлі два супрацоўнікі: намеснік па гаспадарчай частцы і ўчастковы Каўрыга. Некалькі чалавек пазванілі, папярэдзілі, што не змогуць прыйсці, шукалі на тое розныя прычыны. Былі такія, што проста праігнаравалі запрашэнне былога шэфа. У той вечар ён выпіў вельмі багата, хмель, аднак, не адолеў яго, толькі назаўтра з раніцы адчуў, што не можа падняць галавы. Пазваніў у бальніцу па даўно вядомым тэлефоне галоўнага ўрача.

— Лазар Майсеевіч! Ай, даруй... Усё забываю. Ты, Мікалай Іванавіч? Добры дзень. Дай мне бюлетэнь, браток, на тыдзень. Ай, мілы, усіх жа кантралююць... Мяне і таго аблажылі, як ваўка, флажкамі. Як таварыш прашу... Калі хочаш, як свайго падначаленага, бо праз два дні я намеснік старшыні райвыканкома. Сіл на прыём прыйсці аніякіх. Няхай тры. Дзякую і за тры. Разумею, што малады, што толькі пачынаеш, што строгі кантроль. Я цябе ў крыўду не дам. Усё. І ад нерваў для заспакаення душы няхай медсястра прынясе. Будзь ласка. Не забуду. Дзякую.

Сына бачыць Авяр'яну не хацелася, жонку бачыць не хацелася, з людзьмі сустракацца не хацелася. Ён здагадваўся, што не ўсе яго любяць у аддзеле, але каб да такой ступені была гэтая непрыязь, не здагадваўся.

Сыну пашанцавала, астатнія атрымалі па заслугах. Віталіку далі ўмоўна год прымусовых работ з утрыманнем дваццаці працэнтаў з заробку. Бацькі змаглі трошкі супакоіцца. Можа, нарэшце сын возьмецца за розум.

Першыя дні Авяр'ян прыходзіў у свой новы кабінет і сядзеў ля тэлефона, абзваньваў кіраўнікоў усіх прадпрыемстваў, якія курыраваў. Сустракаючыся са знаёмымі, абмінаў іх, не затрымліваўся, рабіў выгляд, што заўсёды некуды спяшаецца па справах. Нездаровы ажыятаж вакол яго персоны, былых дробных грахоў па службе, злоўжывання службовымі абавязкамі паступова аціхаў.

У значнай ступені дапамагла гэтаму дачка Старадарожца Арыядна. Учынак Арыядны абмяркоўваў увесь гарадок. Яна тайком без ведама і згоды бацькоў, ведаючы, што такой згоды не атрымае, распісалася са студэнтам політэхнічнага інстытута, грамадзянінам далёкай афрыканскай краіны Ангола. Вестку прывезла ў сям'ю сястра Жанна. У той жа дзень Старадарожцы прыехалі ў сталіцу. Маці ўпершыню моцна ўдарыла Жанну па твары: «Дзе ты была раней? Чаму не папярэдзіла. Не пазваніла».— «А-га,— аднеквалася, сумеўшыся, Жанна,— яна мяне напалохала. Кажа, калі прызнаешся бацькам... павешуся».

Варвара Якаўлеўна верыла, што адгаворыць дачку, памяняе ўсе планы. Бедная наіўная жанчына яшчэ не ведала, што яе дачка павінна праз тры месяцы нарадзіць дзіця. Дачка праявіла жалезную ўпартасць, сароміла бацькоў, абвінавачваючы іх у мяшчанстве, старым падыходзе да паняццяў свабоды любві, падмацоўвала свой выбар не толькі каханнем, без якога не можа жыць, але і тым, што яна, як інтэрнацыяналістка, паедзе туды, дзе змагаецца яго народ, будзе вучыць дзяцей, праславіць сям'ю Старадарожцаў. Папракала бацькоў, што ў іх ачарсцвелі сэрцы, што душы не адчуваюць, што некаму яшчэ не так свабодна і хораша жывецца, як нам, што трэба насіць у сабе сусветны боль. Сястры абяцала кожны месяц высылаць пасылку з джынсамі, апаратурай, амерыканскімі цыгарэтамі.

Толькі цяпер паніклыя духам і прысаромленыя пры людзях бацькі даведаліся, што іх дочкі кураць.

Арыядна падала бацькам спіс, што трэба купіць, каб потым правезці цераз мяжу. Пад першым нумарам у невялічкім спісе ішоў тэлевізар, пад другім халадзільнік.

«Ты камуніст, адданы партыец, няўжо і ты будзеш падтрымліваць маці і захочаш, каб твая дачка была няшчаснай. Дайце мне магчымасць жыць так, як падказвае сэрца. Вы ж самі так вучылі!» — гаварыла Арыядна бацьку.

Анатоль Станіслававіч абняў дачку (ён не мог цярпець жаночых слёз), прыгарнуў да сябе і сказаў:

«Рабі так, як жадаеш. Каб потым не былі мы вінаватыя». Яна яго пацалавала. Варвара Якаўлеўна зрабіла выгляд, што даравала дачцэ, змірылася.

У той самы час прымірэння і згоды Варвара Якаўлеўна думала пра сваё, галоўнае: неадкладна, на працягу месяца, пакінуць Белагрудак. Сувязі яшчэ надзейныя. Былі яе Ана-

толю прапановы ў іншыя раёны на самыя розныя пасады... магчымасць ёсць... прэч з Белагрудка. Галава яе мітуслівa шукала магчымыя варыянты.

Анатоль сядзеў у машыне, калі вярталіся ўначы дамоў, скаваны, нерухомы. Яна перабірала раённыя цэнтры, успамінаючы, дзе больш знаёмых і сяброў.

Анатоль цалкам даверыўся ў гэтай справе жонцы. Ад перажытага, пачутага ад дачкі ён разгубіўся: «Чаму так сталася? Хто вінаваты? Бацькі? Школа?» Адказу ён не знаходзіў.

Варвара Якаўлеўна пацішэла — гэта заўважылі ўсе настаўнікі — і трохі падабрэла. Сама першая на педсавеце пахвалілася сваім зяцем, прыдумала, праўда, што ён нібыта закончыў аспірантуру і што яму прарочаць бліскучую навуковую кар'еру. Арыядна зрабіла свой выбар сама. Цяпер не тыя патрыярхальныя часы: людзі спакойна перамяшчаюцца па свеце і лёгка падвяргаюць сумненням традыцыі і звычкі бацькоў. Яна будзе там і заможная, і шчаслівая.

Настаўнікі, не ведаючы, як сябе паводзіць, адгукнуліся на гэтую навіну апладысментамі.

Яна пачырванела. Ёй падалося, што яны гэтымі апладысментамі пацяшаюцца з яе.

Ліхадзей успрыняў вестку пра ад'езд Арыядны ў Афрыку са стрыманай злосцю. Так і сказаў Рэгіне:

— Ты сварылася на нашага... А гэта ўчудзіла яшчэ лепш. Я папярэджваў Анатоля. Не трымай іх у клетцы, не песці, як цяплічныя кветкі... Яны не падрыхтаваны да самастойнага жыцця. Вырваліся на волю, і вось вынік... Я не веру, што яна пакахала так да смерці... Першае яе каханне — сын ваенкома. Сам мне пра гэта казаў... Вяртаецца з арміі... падарунак яму будзе... а?

— Збоку чужыя памылкі ўсе бачаць...— адказала Рэгіна.— Людзі могуць тыцнуць пальцам і на цябе, і на нашага сына.

— Мяне голымі рукамі не возьмеш. Ліхадзей яшчэ будзе на версе... Ён паслізнуўся, ён не ўпаў.

Авяр'ян ніколі не асэнсоўваў жыццё, не задаваў сабе адвечныя пытанні, бо на іх трэба было доўга шукаць адказы, якія не суцяшалі. Шукаючы, трэба напружваць свядомасць, памяць, прымушаць, як любяць казаць паэты, працаваць душу. Было такое ўражанне, што ён спыніўся, зацэмента-

ваўся на ўзроўні таго семнаццацігадовага хлапца, які адмываў ад бруду свае рукі, які яшчэ марыў і цягнуўся да людзей.

Дасягнуўшы адноснай незалежнасці і адчуўшы, што многія людзі яму абавязаны, а не ён ім, Авяр'ян жыў жыццём чалавека, які не любіў і не казаў слова «дзякуй». Яму было ўсё роўна, па якой зямлі ён ходзіць, якая ў яе гісторыя, культура, ён нават не ўжываў ніколі гэтага слова «зямля», абыходзіўся сваім «тэрыторыя».

Затаіў Авяр'ян крыўду на Алега Чумака. Што карэспандэнт? Фельетон далі надрукаваць, як і належыць, калі адбыўся суд. Фельетон — вынік... Прычына — ганарлівасць і жаданне выслужыцца Алега. Авяр'ян склаў нават маленькую картатэку-план: праблемы і пытанні, рашэнне якіх залежыць ад Ліхадзея і якія тычацца быту і службы Алега. Што-што, а кватэру ў бліжэйшыя тры гады ён яму не дасць.

Вярнуўся з заробкаў Лаўрэнцій Кароза, пляменнік якога таксама праходзіў па справе яго сына як саўдзельнік.

Кемлівы, здатны на ўсе рукі Лаўрэнцій, зарабіўшы на шабашцы грошай, купіў запчастак, такарны станок і з адыходаў металалому зрабіў ладны, кампактны трактар. Міліцыя не давала нумара на машыну. Упарты Лаўрэнцій, якога абвінавацілі ў незаконных дзеяннях (ён апрацоўваў на трактары прысядзібныя ўчасткі), распачаў валтузню з мясцовым кіраўніцтвам. Авяр'ян загадзя вырашыў і вынес на пасяджэнне выканкома адно рашэнне: забараніць і разабраць машыну як сродак лёгкай нажывы і эксплуатацыі народа. Ён мякка намякнуў Лаўрэнцію, што выканком можа змяніць рашэнне... Угаворваў сканструяваць маленькі трактарок, але ж трэба, каб і Лаўрэнцій дапамог Авяр'яну. Трэба, каб пляменнік паскардзіўся на следчага Чумака за тое, што той вымагаў хабар і атрымаў яго. «Баяцца няма чаго, гэта амаль недаказуема».

Лаўрэнцій, хоць і быў злосны на ўсю міліцыю, аднак на такую адкрытую аферу не згадзіўся. Авяр'ян змаўчаў. Адчуў, як ён страчвае ўладу над усімі. Закусіў губу. Не страшыў Лаўрэнція, толькі шкадаваў, што адкрыў яму сваю непрыязнь да Алега. З бегам часу і гэта забылася. Старадарожцу данёс загадчык аддзела культуры, што ў музеі поўнае «самаўпраўства» і «адсябяціна», што ён бяссільны пераканаць дырэктара Канавалаву і старшыню савета, кіраўніка гуртка гісторыі Уладыкіна. Анатоль Стані-

слававіч пазваніў Авяр'яну і прасіў разабрацца, у чым там канфлікт.

Больш года не быў Авяр'ян у музеі, які па-ранейшаму размяшчаўся ў старым будынку былой паліклінікі. Ударыў у нос пах цвілі і гнілой падлогі, дзіркі ў якой закрылі выпацканай у карычневую фарбу бляхай. Напачатку ён палічыў, што гэты непрыемны пах ад мноства «фауны»: ва ўсю велічыню стаялі як жывыя воўк, ліса, заяц, малады алень, дзікі кабан і нават расамаха.

У невялічкім цесным пакойчыку сядзелі за сталом сівая (падумаў, як яна здала за апошні год) Канавалава і Уладыкін. Авяр'ян досыць уважліва з імі прывітаўся, пачуў у адказ скупое слова адной Канавалавай. Падалося, што Уладыкін як бы праігнараваў яго.

— Да-а, умовы, скажу вам, горшаюць тут з кожным месяцам. Вы не ходзіце, не скардзіцеся. Як-ніяк цяпер у мяне болей сілы... Спачатку пяцігодкі пачнём будаваць новы будынак — гэта магу гарантаваць. Уключана ў планы. Думаю, зайду, пацікаўлюся, як тут у вас. Працуйце, не буду перашкаджаць... Агледжу экспазіцыю сам. Бачу, у вас тут, як у Эрмітажы... За такі кароткі тэрмін, аж не верыцца.

Уладыкін сядзеў нерухома, нават не ўзнімаў галавы, нешта пісаў.

Ліхадзей пайшоў у залу, яго цягнула да знаёмага «свайго» кутка — сцяны. Тое, што ён праз мінуту ўбачыў, маланкай паралізавала волю, падкасіла ногі, прымусіўшы абаперціся рукой аб грубку. Са сцяны на яго глядзеў вялікі партрэт Аляксандры Батуры. Ён азірнуўся. Юрась стаяў на парозе кабінеціка і сачыў за Ліхадзеем. З цяжкасцю Авяр'ян Паўлавіч адолеў свой жах. Зрабіў некалькі крокаў наперад. Ніякіх матэрыялаў, звязаных з яго імем, з імем Старадарожца, іх фота, асабістых рэчаў у экспазіцыі не было. Авяр'ян насупіўся. Чырванню наліўся яго твар.

— А дзе?.. Нашы дзе?

— Яны складзены ў гэту скрыню... Яны былі музею не патрэбны. Вы можаце іх забраць,— нечакана сказаў Юрась.

— Як? — вушы ў Авяр'яна пабялелі.— Вы пры сваім розуме ці з перапою?

— Паўтараю, яны музею не патрэбны. Гэта можа пацвердзіць і дырэктар.

— Нічога не разумею? Гэта жарт? Так скажыце, што перанеслі першага красавіка на дзень сённяшні... Здорава прыдумана... але ж такімі рэчамі не жартуюць... Камедыя добра на сцэне Дома культуры, а тут дзяржаўная справа.

— Камедыю выключыла трагедыя. Гэта не жарт... І мы пакуль пры сваім розуме. Матэрыялы пра вашы «подзвігі» кампраметуюць партызанскі рух і цалкам гераізм нашага народа.

— Не балбачыце! Паводзьце сябе не так нахабна... Вашу гарачнасць мы добра ведаем... Хто вам даў права падвяргаць рэвізіі мой партызанскі лёс і кідаць мне ў вочы такія словы «кампраметуе партызанскі рух». Гэта, ведаеце, пераходзіць усе рамкі... Я думаў тут жарт, а тут самаўпраўства, помста за крытыку, зайздрасць, што не твой бацька слаўны партызан, а мы, я... Ніхто не вінаваты, што ён палову вайны прасядзеў у бабы пад спадніцай, на хутары. Я цяпер разумею... яму месца знайшоў, бач. Ды за зняваґу асобы, добра, што ёсць сведка, я падам на цябе, смаркач, у суд! — нервова дрыжаў у музейнай цішы голас узбуджанага Ліхадзея.

— Не палохайце мяне судом... не прымушайце, каб я сказаў вам у твар усю праўду,— не ўступаў Уладыкін.

— Неўрасценік, ты яшчэ на старэйшага голас павышаеш? Не палохай мяне, не такіх перажылі. Запомні гэта... Цябе ніхто не баіцца, ніхто! Бач, які танны шантажыст вырас. Мы яму адваявалі мір, волю... дык ён у твар плюе. Твая правата меднага граша не варта. Шчанюк, ты мне за ўсё адкажаш...

— Вам трэба адказваць перад законам!

— Што? Чаго ты збялеў? Кажы, я ж спакойны... Пакажы, які ты смелы... за што адказваць? — Авяр'ян гатовы быў ударыць Уладыкіна.

— За што? За наўмыснае забойства партызанскага сувязнога Аляксандры Батуры, над якой вы... вы... разам... не адзін... учынілі гвалт! А пасля, каб не было сведкаў, забілі і яе, і сына Уладзіміра, які кінуўся ратаваць маці!

— Бязглуздзіца! Нагавор! — шукаў патрэбныя ратавальныя словы ў адказ і апраўданне Авяр'ян. Ён прыкметна панік духам, разгубіўся.— Помста, зайздрасць... за гэта расстраляць мала... што прыдумаў? Сатана, нягоднік... падвяргаць рэвізіі маё мінулае... Хто даў права?

— Маё сумленне мне падказала такое права,— трохі рытарычна адказаў Юрась, бачачы, што Авяр'ян выдаў сябе.

— Гэта нахабная хлусня, за якую ты, богам клянуся, адкажаш перад судом... Трэба ж мець доказы, сведкаў, хоць падстаўных, каб кідаць у твар такое...— Авяр'ян выцер з губ сліну.

— Ёсць сведкі. Жонка Казіка Батуры, малодшага сына

Аляксандры, дырэктар школы, свяшчэннік вёскі Вароны, якім перад смерцю сляпы музыка адкрыў усю праўду маёнтка Батуры.

— Мала што мог наплесці п'янчуга Казік у смяротнай агоніі,— наступаў Авяр'ян.

— Ёсць яшчэ Іван Чачырка, які быў сведкам замаху на вас... так... так... не глядзіце на мяне такімі здзіўленымі вачыма, замаху на вас ля лазні пансіяната «Свіцязь».

— Хлусня. Паклёп. Ён прыдумаў... Помсціць мне за Веру. Ніхто ж не паверыць... Хлусня... Усё хлусня... Я гэта так не пакіну. Я... я... за ваша будучае кроў праліваў, каб вы сыта елі, мірна спалі... і вось... падзяка...— як бы ў сне, сам сабе бубніў Авяр'ян, накіроўваючыся да выхаду.

Сонца ўдарыла яму ў твар. Ён закрыў вочы рукой, апусціўшы галаву долу, паволі пайшоў. Не ведаў, куды нясуць яго такія слабыя, раптам аслабелыя ногі.

Неўзабаве, праз дні тры, Старадарожцу пазваніла Рэгіна і паскардзілася на душэўны стан свайго Авяр'яна, які трэцюю ноч не можа спаць, страшэнна многа курыць, дома амаль не размаўляе, кажа, што ён захварэў, баліць, маўляў, галава, узяў бюлетэнь. Прасіла наведаць, бо сама, ведаючы безліч адценняў і перападаў у настроі свайго чалавека, тым не менш бачыць яго такім, «ну як пахілены да долу чарот», упершыню.

Анатоль Станіслававіч супакоіў жанчыну, сказаў, што Авяр'ян з цяжкасцю прывыкае да новага месца, што гэта часовая хвароба, настрой адаптацыі. Яна настойвала на сваім. І Старадарожац абяцаў пасля работы наведаць сябра.

Наведаць давялося толькі ўвечары наступнага дня. Зацягнулася пасяджэнне, ён прыйшоў на абед а трэцяй гадзіне, якраз прыбегла са школы і галодная Варвара Якаўлеўна, якая ўспомніла, што забылася забраць пошту. Яны ўжо стаміліся пяты месяц чакаць ад дачкі пісьмо. Варвара Якаўлеўна хацела нават пісаць у наша пасольства.

Анатоль спусціўся ўніз і прынёс нарэшце доўгае і вузкае з мноствам штэмпеляў і каляровых марак пісьмо. Рукі ў Варвары Якаўлеўны так дрыжалі, што яна ўпершыню за ўсе гады перадала канверт Анатолю і папрасіла распячатаць. Ён чытаў услых, не верачы літарам і свайму глухому голасу. Варвара Якаўлеўна заплакала ў самым пачатку, калі прагучала «Здравствуйте, мои дорогие, родные, любимые, единственные в мире родители...» Істэрыка з жанчынай усчалася, калі яна, выхапіўшы з рук Анатоля ліст, сама

прачытала: «Приехала я сюда, а у него оказалось три жены и пятнадцать детей. Он мне и говорит: «Будешь младшей женой». Я уже за эти полгода четыре раза малярией переболела... никак не могу привыкнуть, хоть народ в большинстве неплохой. Кругом нищета. Мне страшно. Боюсь, что это ждет многих, кто сюда по молодости поехал не на месяц, а навсегда. Передайте Жанне, что я не смогу здесь достать ей японский портативный магнитофон. Она должна действовать, искать дома. Любящая вас дочь Ариадна».

Варвара Якаўлеўна, не саромеючыся суседзяў, плакала наўзрыд, крычала, ірвала на галаве валасы, нават ударыла мужа па твары ў гарачцы. Ён трымаў напагатове бутэлечку з лекамі і маўчаў, адчуваючы ў горле даўкі камяк.

Прыйшла Жанна, прачытала ліст і кінулася да маці, заплакалі ўдзвюх, пасля, крыху супакоіўшыся, Жанна сказала, што Арыядна просіць дапамогі. Яна хоча дамоў!..

— Вось гэтыя словы: «Передайте Жанне, что я не смогу здесь достать ей японский портативный магнитофон. Она должна действовать, искать дома». Мамачка, гэта наш пароль. Гэта SOS, каб яе неадкладна ратавалі... Яна кіне ўсё, гэта заклік дзейнічаць неадкладна. Ёй цяжка, і яна пры смерці... Такі пароль. Мы так дамовіліся! Памажыце ёй, ратуйце яе!

Жанна ціха ўсхліпвала. Варвара Якаўлеўна толькі замахнулася на дачку, не ўдарыла. У той жа вечар абзванілі ўсіх сваіх знаёмых ад Масквы да Гродна, просячы дапамагчы. Недзе сярод бяссоннай начы Варвара Якаўлеўна ўспомніла і пра Шабыльчыка, хацела неадкладна накіраваць Анатоля да Ліхадзеяў, каб званілі ў сталіцу. Анатоль адгаварыў: «Жонка Шабыльчыка не любіць, калі яму звоняць пасля дзесятай гадзіны вечара». Анатоль паабяцаў, што яны з Авяр'янам абавязкова падключаць да гэтай справы і Шабыльчыка.

З такімі невясёлымі думкамі пераступіў парог кватэры свайго сябра Старадарожац. Здзівіўся: сапраўды, цяжка было пазнаць у схуднелым, прыгорбленым і няголеным чалавеку з прапаленай на грудзях сарочкай (відаць, цыгарэтай) былога, жвавага Авяр'яна.

— Што-о... і ты нешта краем вуха, можа, прачуў, што з такім заклапочаным тварам прыбег? — накінуўся Авяр'ян.

— Пра што ты? Не разумею, Авяр'ян.

— А я думаў, цябе таксама напалохаў Уладыкін,— больш стрымана сказаў Ліхадзей.

— Я з ім не сустракаўся. А што... можа... здарылася нешта... Ты не хавай ад мяне... скажы...

— Сказаць? А ты да ўсяго гатовы?.. Вытрымаеш? — крыва ўсміхнуўся Авяр'ян.

— Не палохай так... Такое пачуццё, што ты ненавідзіш мяне, баюся нават гэта казаць... адчуваю.

— Правільна адчуваеш? Чаго ж ты прыбег... напалохаўся?

— Я ішоў па просьбе Рэгіны. Яна напалохала тваім душэўным станам... Хваробай...

— Рана хаваеце... Калі ты такі дбайны, смелы, адданы сябра, я табе скажу... Уладыкін ведае пра ўсё! Ён знайшоў жонку сляпога... ведае нават, што Казік рабіў на мяне замах... Усё, адным словам, разумееш, усё!

— Як! Божа, гэта канец, канец,— бессэнсоўна, утаропіўшы позірк у адну кропку, прамовіў збялелы Анатоль Станіслававіч.

— Не шукай ратавання ў бога, калі аб ім ніколі не думаў.

— Уратуй мяне, Авяр'ян... Я гатовы на калені ўстаць. Уратуй... Калі ён ведае, будзе ведаць і ўвесь горад. Суд! Авяр'ян, можа быць суд? Уратуй, вазьмі на сябе... усё...— Старадарожац і напраўду ўпаў перад ім на калені.

— Устань, слізняк. Я заўсёды ведаў, што ты баязлівец паганы, апошні трус... Цябе баяўся болей, як астатніх, Уладыкіна. Пашкадуй, кажаш? Тваю недасягальнасць, кар'еру я ахоўваў. Я!

— Так, так... усё так... Але ж суд...

— Змоўкні! Суд... Пра грэх успомніў... А як мне было жыць... калі я кожны дзень... думаў, каб толькі не параніць тваю памяць, псіхіку, каб ты дасягнуў вышынь па службе. Падзяліцца думаў. Шчасцем... радасцю... турботай... А ты па выніках пяцігодкі нават не ўключыў маё прозвішча на медаль... Вашывую медаль, якую даюць апошняму грузчыку. Суда баішся? Якога?

— І людскога, і законнага. Уратуй...

— Ідзі. Не будзе суда. Хто зараз возьмецца з адных нагавораў заводзіць справу? Прамых сведкаў няма, і больш нікога, акрамя нас, не будзе. Вайна ўсё спаліла, усё! На суд людскі наплюй... хоць ты і не здолееш... Уцякай адсюль куды-небудзь... Ты баязлівец, а баязлівец не мае права патрабаваць ад людзей павагі і славы... Моцны чалавек забярэ ў іх гэта сам. Ідзі. Я не магу на цябе такога глядзець. Я цярпліва чакаў свайго зорнага часу, жыў як пры месячным

зацьменні, а ты цяпер адкрыта здраджваеш мне. Ідзі!

— Даруй... даруй... я з табой... мне болей да канца дзён ні з кім нельга і не трэба... Я з табой і за цябе... Я з'еду, абяцаю. Даруй,— круціўся, як сабака ля ног свайго гаспадара, Анатоль Станіслававіч.

Усё разам вылецела з галавы — жонка, далёкая Афрыка, дачка, Шабыльчык... Выразна, як ніколі паўстала лютаўская пятніца сорак чацвёртага года ў маёнтку Батуры.

Нязграбна, раскідваючы ногі, ішоў ён дамоў. Анатоль Станіслававіч упаў на падлогу ў зале ля стала. Сядзеў, пасунуўся ўперад, хацеў падняцца і ўпаў. Яшчэ пашчасціла — не параніўся, на дыван. Жанна ў суседнім пакоі збірала свае рэчы, пакавала ў чамадан, збіраючыся ў сталіцу. Яна выклікала «хуткую дапамогу», пазваніла маці на работу. Інсульт... Апошнія гады Старадарожац так яго баяўся. Нагледзеўся на свайго суседа-пенсіянера. Былога лётчыка, які перанёс інсульт і хадзіў з кавенькай вакол дома.

Кансультант, які прыехаў з Гродна, усё ж абнадзеіў: «Жыць будзе». І Анатоль Станіслававіч акрыяў. Змяніўся з твару. Хадзіў з кавенькай. З надакучлівай упартасцю прасіўся ў абласнога кіраўніцтва, каб не спісвалі, бо яшчэ ёсць сілы і яшчэ можа служыць. Не пакінулі яго, перавялі дырэктарам невялічкай мэблевай фабрыкі ў гарадскі пасёлак Казлоўшчыну. Там, здавалася, у яго сяброў і знаёмых не было. Таму ехалі яны туды з Варвараю Якаўлеўнай задаволеныя і нават вясёлыя.

Не хацела вяртацца да Авяр'яна былая весялосць, упэўненасць і задаволенасць жыццём. Ён штучна ўзвінчваў і падтрымліваў настрой алкаголем — усё меней і меней саромеўся і хаваўся ад людзей.

Аднаго разу, калі быў п'яны, сырым вечарам падышоў да цёмнага акна музея, угледзеўся. Усё карцела даведацца, ці вісіць на сцяне партрэт Батуры? Партрэт вісеў...

Усё смялей і часцей пачалі людзі пагаворваць, а некаторыя і пісаць ананімкі пра тое, што ў райвыканкоме дзейнічае кучка казнакрадаў і хабарнікаў, што там самаўпраўства...

Хітры Авяр'ян браў хабар праз былога свайго паплечніка і намесніка. У адкрытую не саромеўся вымагаць, каб яго частавалі. Кожны трэці вадзіў яго ў рэстаран, альбо сядзелі ў буфеце Зіны, якая раздабрэла, расцвіла і зрабілася такой жа нахабнай і крыклівай, як некалі быў Авяр'ян.

Нарабаваўшы дабра і па шчаслівай выпадковасці мінуўшы суд і турму, старшыня райвыканкома ў час збег. Сябры, відаць, ён падкармліваў і іх, перавялі яго ў «Сельгастэхніку» ў вобласць.

Былая сіла Авяр'яна была падарвана. Старадарожац з'ехаў. Менавіта таму Авяр'яну не ўдалося прасунуць на пасаду старшыні сваю кандыдатуру, былую палюбоўніцу, сакратара партыйнай арганізацыі калгаса «І Мая», а з новым старшынёй выканкома ён не знаходзіў агульнай мовы. Абыякавасць да ўсяго раз'ядала душу Ліхадзея. Ён сам прапанаваў, каб яго перавялі загадваць раённай электрасеткай. Нішто не хвалявала яго, нават хатняя трагедыя. Сын Віталік, які па-ранейшаму ездзіў да Любы ў Баранавічы, упаў з трэцяга паверха, цяжка пашкодзіў пазваночнік. Быў п'яны. У інтэрнат да Любы не пускалі, і ён палез у яе пакой па вадасцёкавай трубе.

Авяр'ян сам прывёз з Гродна інвалідную каляску. Два дні спачуваў Рэгіне. Дактары казалі, што сын зможа ўстаць на ногі, але патрэбны час і цярпенне... Год, два, тры... Вечарам п'яны Авяр'ян чапляўся да сына без дай прычыны, сарамаціў яго, павучаў, іранізаваў з «прастытуткі» Любы, якая нават не звоніць. Зганяў злосць на калецтве сына. Некалькі разоў не начаваў дома.

Рэгіна падала на развод. Было невыносна цярпець яго нянавісць, здзек, п'яную істэрыю. Ён з ахвотаю згадзіўся. Калі ж атрымалі дакументы аб разводзе, пачаў крычаць і абвінавачваць яе ва ўсіх грахах: «На маладога пацягнула, шлюха?» Лез біцца. Рэгіна плюнула на ўсё, забрала сына, кнігі, посуд і пераехала да маці ў родны Пінск.

Цяпер Авяр'ян атрымаў тое, што хацеў — поўную, нікім не кантралюемую волю, адзіноту і незалежнасць. Пасля работы роўненька шыбаваў у буфет да Зіны. Нарэшце была магчымасць адкрыта, не таячыся, наведваць яе, а ёй прыходзіць да яго. Ды і Зіна змянілася: цяпер яна дыктавала сваю волю. Сустракалася з ім, калі мела настрой. Ён, як пабіты сабака, сядзеў у кутку за брудным сталом і чакаў з мальбой у вачах, пакуль яна жэстам пакажа, ці можна сёння яе чакаць пасля работы.

Неяк позна ўвечары на бязлюднай вуліцы давялося сустрэцца разам Авяр'яну і Уладыкіну. Да гэтага разу Ліхадзей абыходзіў настаўніка, хаваўся ад яго. І вось сустрэча. Авяр'ян перайшоў вуліцу, падышоў да Юрася.

— Не пойдзеце, Юрась Міхайлавіч, дырэктарам у новую школу? Ходзяць такія чуткі?

— Не. Не пайду.

— І правільна. Добра ісці туды, дзе адладжана сістэма. Закурыць не знойдзецца? Не пачастуеце?

— Я не куру.

— А... так... добра. Ну, усяго добрага.

Руку на развітанне падаць баяўся. Дахаты ісці не хацелася. Ён павярнуў зноў у бок да аўтобуснай станцыі, хоць і ведаў, што Зіна яго сёння не хоча бачыць. Там круціліся ля яе два каўказцы. Сыпаў густы снег. Горад толькі-толькі пачынаў рыхтавацца да навагодняга свята. Авяр'ян Паўлавіч не любіў высакосныя гады.

Але ж бег часу (невядома, ці на радасць, ці на гора) ад чалавека не залежыць. Снег ішоў і раставаў, ледзь дакрануўшыся зямлі. Было няўтульна. Макрэча, парывісты вецер... І раптам раніцай, як падарунак — сонца, лёгкі мароз, пухкі снег... Стукаўся ў дзверы год васьмідзесяты, год высакосны, якому, калі глянуць у акно, хацелася адчыніць дзверы...

Гермес спытаў Зеўса, як даць людзям Праўду і Сорам, можа, размеркаваць іх, як размеркаваны рамёствы? А падзелены яны так: аднаго, хто валодае талентам урача, хапае на многіх — і на тых, хто нічога не разумее ў хваробах. Значыць, Праўду і Сорам такім жа чынам размеркаваць сярод людзей? А можа, надаць іх усім?

«Усім,— адказаў Зеўс,— няхай усе будуць з імі. Не стаяць дзяржаве, калі толькі некаторыя будуць імі валодаць, як валодаюць рамёствамі. І гэты закон дазволь ахоўваць мне, каб кожнага, хто не зможа жыць з Праўдай і Сорамам, вынішчаць як язву грамадства».

*1986—1988 гг.*

# САВА ДЫМ І ЯГО ПАЛЮБОЎНІЦЫ

раман





У красавіку тысяча дзевяцьсот восемдзесят шостага года ў мінскую бальніцу хуткай дапамогі прывезлі ў цяжкім становішчы маладую жанчыну Марыю Жураўлёву, якая ўначы ва ўласнай кватэры спрабавала скончыць жыццё самагубствам: выпіла воцату. Гэты выпадак застаўся непрыкметны, бо ўслед пайшлі трагедыйныя карціны Чарнобыльскай аварыі, карупцыі, казнакрадства, злоўжывання ўладай — на што шматмільённай чытацкай аўдыторыі ад Брэста і да Уладзівастока адкрылі вочы ў адзін год і разам стаўшыя смелымі газетчыкі. Здзіўлены, напалоханы, знерваваны і разгублены чытач, здавалася, акрамя сенсацый пра сталінскія рэпрэсіі, наркаманію, трагедыю сірот, прастытуцыю, эканамічную катастрофу, нічым іншым і не цікавіцца. Часопісы і газеты з выкрывальнымі артыкуламі імгненна перадаваліся з рук у рукі, як каштоўныя рэліквіі. І працоўны дзень звычайна пачынаўся традыцыйнай фразай: «А вы не чыталі пра... Рэкамендую. Абавязкова прачытайце. Такое выкрываюць... вочы на лоб лезуць, сэрца халадзее». Пазабываліся байкі пра розныя там талеркі, снежнага чалавека, звышінтуітыўнага экстрасенса. У канцы працоўнага дня чакалі таямнічы тэлефонны званок: «Знайдзіце часопіс «Наш современник» нумар чатыры. Такога ў нас яшчэ не друкавалі». Чытачы з дапамогай усё той жа прэсы падзяліліся як бы на два лагеры: адзін, які вітаў галоснасць да апошняй літары, глабальную шчырасць, татальны дэмакратызм і плюралізм, і другі лагер — асцярожных, якія не без трывогі за лёс і нораў дзяцей і грамадства былі незадаволены такімі дзеяннямі прэсы. Не ўсе аказаліся падрыхтаваныя да праўды і крытыкі ў любы адрас.

Усё гэта, аднак, не прыводзіла да жорсткіх спрэчак, але ж акумуліравала ў многіх душах разгубленасць, скепсіс недаверу. Усё часцей можна было пачуць у сталоўцы, у перакурні цэха, на будаўнічай пляцоўцы, у купэ вагона,

на канцэрце гэта нязвыклае слова «крызіс». Кожны, улічваючы і свой жыццёвы вопыт, і свае сямейныя звадкі, перакручваў гэтае слова на свой лад: «эканамічны крызіс», «духоўны крызіс», «крызіс веры, школы, сям'і, маралі». Ніхто не хацеў браць віну і адказнасць на сябе, усе шукалі вінаватых зверху. Гараджане неахвотна хадзілі ў госці, былі асцярожнымі ў выбары новых знаёмых, мірыліся з жорсткасцю і цынізмам на вуліцах, і ўсе згубілі цікавасць да грамадскіх спраў і гуманных місій. Было пачуццё агульнай стомленасці, разгубленасці. Адкрытага чалавека са шчаслівай усмешкай сустрэць на вуліцах горада, у метро, у магазіне было цяжка, усё роўна як знайсці зімой на яблыні яблык.

Выпадак з Марыяй Жураўлёвай, сіратліва зарэгістраваны ў журнале прыёмнага пакоя пад нумарам трынаццаць, не прыцягнуў да сябе ўвагі.

Жыццё чалавека — нябачнае спляценне лёсаў дзесяткаў людзей. Пасля першых спачувальных слоў тых, хто з ёй разам працаваў, можна было пачуць і такое, што зроблена гэта было пры затуманеным розуме. Тых, хто ведаў яе на працягу апошніх дзесяці гадоў, такі ўчынак жанчыны непрыемна здзівіў. Ніхто не ведаў існай прычыны, бо няшчасная жыла замкнёна, мала чым дзялілася з сяброўкамі па рабоце, сваё асабістае, набалелае больш ўтойвала. Мы раскажам пра аднаго чалавека, які меў самыя непасрэдныя адносіны і да Жураўлёвай і да яе ўчынку. Марыя была ягонай апошняй па часе палюбоўніцай. Гэтым чалавекам быў трыццацісямігадовы Сава Паўлавіч Дым.

«Навошта? Што яна гэтым хацела даказаць? Прынізіць мяне ці ўзвысіцца самой?» Ён, хто лічыў сябе знаўцам жаночых сэрцаў і майстрам «на жаночым фронце», разгубіўся: «А калі завядуць справу і дакажуць, што яе хтось падбухторваў, правакаваў на самагубства?»

Нават адно тое, што можа трапіць у сведкі — палохала яго. «А калі са сведкі зробяць яшчэ і вінаватым? Пацягнуць у суд?!» Ён успомніў — вельмі выразна і ясна, усё сваё сталічнае жыццё, сваю эпапею донжуана, казановы. Вырашыў скласці ўсе дваццаць гадоў жыцця як бы ў адзін дзень і высветліць: ці ёсць яго віна перад ёю, ці нехта вінаваты перад ім?

Успомніў усё: ад першага дня знаёмства са сталіцай.

## РАЗДЗЕЛ ПЕРШЫ

### АКНО НАДЗЕІ

Выпускнікоў сярэдняй школы мястэчка Ракаў (да якога сорак кіламетраў ад Мінска) праводзілі светлым летнім днём на ўступныя экзамены ў сталічныя тэхнікумы і інстытуты. Ад радавога хутара Паўла Дыма — бацькі Савы — да аўтастанцыі роўна сем кіламетраў. Усталі ранењка. Сытна паснедалі. Бацька і дзед выпілі па шклянцы самагону. Сава п'янага дзеда пабойваўся, той быў фанабэрысты: «Я апошні тутака мясцовы беларускі шляхцюк... а вы ўсе... г...о. Памру, дык і хутар згіне. Вы ўсе лайдакі, а не гаспадары».

І папраўдзе гэтыя тры хутары, так ладна схаваныя на вялікай палянцы, на беразе імклівай, хоць і мелкаводнай, лясной рачулкі Іслач, мелі добрую славу. Хутаранцы тут жылі заможна.

Дзед меў усе падставы, каб ганарыцца мінулым... на жаль, толькі мінулым. Не вярнуліся з апошняй вайны два сыны, аддалі дачку замуж у суседні Валожын, састарыліся з жонкаю, а надзеі на меншага Паўла не было. Удаўся ён шалапутны, ветраны, з дзяцінства не любіў адзіноцтва ў лесе, спіхваў цяжкую работу на слабую здароўем маці. Трымалі тады яшчэ авечак, тры каровы, каня.

Шашаль пачаў патрохі есці сцены адрыны, асеў падмурак хаты: цяжкі мох, колькі яго не сцягвалі бусаком, рос на даху; сыпаўся, гніў масток, зелянела вада ў студні... Усё наўкола прасіла дапамогі чалавечых рук, а іх якраз і не хапала. Галоўнаму гаспадару ішоў восьмы дзесятак. Паслаблі вочы, балелі рукі, ногі... круглы год дзед хадзіў у валёнках.

Пасля смерці бабы дзед зусім панік, змірыўся з жыццём і бурчаў на сына, нявестку і ўнука Саву, якія сваёй лянотай, падманам раздражнялі старога. На суседні хутар у выхадныя дні прыязджаў стрыечны брат Савы Міхась Сокал, які вось ужо дзесяць гадоў рабіў на трактарным заводзе ў сталіцы і расхвальваў гэтае сталічнае жыццё на ўсе лады, як курыца сваё седала.

Мінуў яшчэ год... і заціх назаўсёды млын на хутары аднавокага Яна, які пайшоў вартаўніком на старую, збудаваную на пачатку стагоддзя млячарню, туды ж уладкавалася прыёмшчыцай і маці Савы. Зручна. Ад хутара цераз рэчку, праз лужок, сасновы лес і ты на млячарні. Дзед

не дазваляў прадаць жыўнасць. Яшчэ на хутары былі авечкі, карова, трусы, куры ды індыкі.

Калі ж у той злашчасны год бацьку Савы «прапіхнулі» прадаўцом у сельмаг суседняй з млячарняй вёскі, Павел Дым упершыню адмовіўся сеяць жыта на хутарской дзялянцы. Нямоглы дзед сам упрогся ў саху, прайшоў метраў дзесяць і ўпаў у свежую баразну, заплакаў горкімі слязьмі. Пяцьдзесят гадоў зямелька гэта радзіла яму свой хлеб. Не думаў дзед, што дажыве да такога. Сава ніколі ў жыцці не бачыў дзедавых слёз. О, як стары Дым любіў пару, калі калосіцца, грае жыта! І вось усё ў мінулым.

«Ды плюнь ты, забудзь! Не буду я кілу рваць. Вазіць, малаціць, малоць, прывозіць... Я табе з магазіна дзве, тры торбы пшаніцы прывязу, хоць парасят кармі. І ў магазін пайшоў, каб не гнуць да старасці спіну ад цямна і да цямна. Палавіна майго жыцця тут прапала. І Сава няхай у свет едзе. Вывучыцца прафесіі, чалавекам будзе»,— цяжка дыхаючы над самым носам дзеда, даказваў бацька Савы. Дзед маўчаў. Здаралася, што ён без дай прычыны мог месяцамі не размаўляць з сынам, нявесткаю. У такія «манастырскія дні затворніцтва» Сава асабліва баяўся падыходзіць да дзеда. Але ўсё праходзіць. Памякчэў і дзед. На дзесяці сотках цяпер садзілі толькі бульбу. Жытнёвае поле парасло травой.

Да сёмага класа Сава хадзіў у вясковую школу, а апошнія тры класы трэба было ездзіць у Ракаў. Была ў яго ў гэтыя школьныя гады спадарожніца, аднакласніца, дачка суседа аднавокага Яна Галіна Шкода.

Дзіўна, колькі сябе помніць Сава, ён не чуў, каб яго аднакласніцу называў хто інакш, як толькі Галіна. Магчыма, гэта ішло ад яе зусім не дзіцячай сур'ёзнасці, удумлівых адносін да вучобы, працы, яе дабрыні і сціпласці. Канечне ж, Сава мала цікавіўся і глыбока не задумваўся над яе своеасаблівым душэўным ладам. Хуткаплынныя гады дзяцінства яны пражылі-правялі як брат і сястра.

Праўда, дзед, у адрозненне ад бацькі, ніколі не дазваляў Саву садзіцца да стала суседа Яна, сям'ю якога заўсёды лічыў мужыцкай.

Кожны дзень Сава і Галіна адольвалі вясной і ўвосень на роварах, узімку частку шляху пешкі, частку на аўтобусе разам. Проста, без рамантычных760 мараў і разважанняў аб прыродзе ды розных птушках.

Не было суму на яго твары і тады, калі яна ў дзевятым класе моцна захварэла на грып. Ён нават не праведаў яе ля

ложка, перадаваў школьныя заданні бацьку, сам баяўся заразіцца. У дзевятым яму яшчэ хацелася вучыцца, што таіць грэх, браў прыклад з Галіны, марыў паступіць у мараходку і прыехаць у Ракаў у форме капітана дальняга плавання.

У дзесятым класе, калі зусім нечакана пачаў вельмі бессаромна і нахрапіста чапіцца да Галіны іх аднакласнік, Сава занепакоіўся: «Ніхто ж не дазваляў яму так паводзіць сябе. Суправаджае амаль да самага хутара». Аднаго разу, заклапочаны празмернай увагай хлопца, Сава папытаў у Галіны:

— Ты абяцала, што будзеш з ім хадзіць?

— Не. Сам прычапіўся,— ціха без усмешкі адказала Галіна, і яе густыя чорныя бровы збегліся на пераносіцы.

— Я яму рыла намылю,— хацеў паказаць сваю баявітасць Сава.

— Навошта? Ён і сам адстане,— на гэты раз яна ўсміхнулася.

Для сябе Сава вырашыў, што ён ніколі з ім біцца не будзе, сказаў так, да слова, каб яна адчула, што знаходзіцца ў яго пад абаронай, што на яе толькі ў яго аднаго ўсе правы.

А было і такое: вярталіся са школьнага вечара і адзін аднакласнік (ён добра выпіў) ухапіў Галіну за руку і пацягнуў у цёмны завулак. Сава бачыў, як Галіна выцяла нахабніка па шчацэ і праз некалькі мінут дагнала астатніх. Сава зрабіў выгляд, што ён не заўважыў у цемры валтузні ля штыкетніка. Біцца і сварыцца ён не хацеў, наперад ведаючы, што ракаўскія хлопцы адаб'юць яму пячонку. Ён знайшоў, як нагадзіць крыўдзіцелю Галіны, непрыкметна ўкраў у саперніка імпартную шарыкавую ручку з карцінкай голай жанчыны. Ручку Сава схаваў на вышках ля коміна і тайком ад усіх час ад часу разглядваў дзіва-карцінку, усё параўноўваючы яе з жывой прывабнай Галінай. Назіральны Сава заўважыў, што дзяўчына падабаецца яшчэ аднаму аднакласніку, Тамашэвічу, але да яго ён яе не раўнаваў. Бледны з твару, худы юнак ад нараджэння кульгаў на правую нагу.

Неяк вясной, калі снег яшчэ не пацямнеў, але назаўсёды страціў свой лютаўскі блакіт, бацька Галіны, незлаблівы Ян, не дайшоў да хутара метраў з трыста, упаў тварам моцна п'яны ў першую калюгу. За ім вадзіўся гэты грэх яшчэ задоўга да трагічнай недарэчнай смерці. Галіна бацьку любіла, мачаху і яе сына Васіля недалюблівала, а бацьку і шкадавала і паважала. Суседзі-хутаранцы няспешна разы-

ходзіліся з памінак: на хвілю ў душы кожнага з іх абудзілася пачуццё еднасці, прасіліся на свет са шчымлівай пяшчотай успаміны далёкіх гадоў дзяцінства. Нібыта згаварыўшыся, Галіна і Сава выйшлі з хаты. Нетаропка рушылі да старога млына. Зусім па-дзіцячы яна ўткнулася тварам у цёплы каўнер яго кажушка, горка і бездапаможна заплакала. Ён з невядомай дагэтуль пяшчотаю супакойваў дзяўчыну, часта, яшчэ няўмела цалаваў яе шчокі, вочы, губы. У звонкай цішы вясновай ночы былі чуваць іх усхваляваныя і шчырыя словы:

— Я кахаю цябе.

— І я кахаю цябе.

— Я ніколі не пакіну цябе.

— І я буду кахаць цябе вечна.

— Я не здраджу нашаму каханню.

— Клянуся!

— Гэта праўда?

— Так. Мы пажэнімся?

— Я кахаю цябе.

— І я цябе кахаю.

— Я больш,— з радасцю казала Галіна.

Да выпускных экзаменаў заставалася два месяцы, два месяцы — і бывай хутар, прывітанне сталіца. Яны чамусьці шчыра верылі, што ўсё будзе цудоўна, яны паступяць у інстытут, будуць разам жыць у інтэрнаце і на трэцім ці чацвёртым курсе распішуцца. Сава болей не ездзіў пасля школы на заняткі па тэнісу, ён спяшаўся, як толькі сцямнее, да старога млына і ў салодкім аняменні чакаў Галіну. Упершыню ён пачаў звяртаць увагу на свой знешні выгляд. Узяў у бацькі два старых гальштукі, угаварыў маці, каб купілі яму дзве модныя сарочкі ў клетачку. Пасля сустрэч, пасля палкіх пацалункаў ён доўга не мог заснуць. Раніцай па дарозе ў школу сарамліва адварочваўся ўбок, хаваў ад яе вочы.

Вырашылі яны паступаць (канечне ж, разам) у медыцынскі інстытут: яму было ўсё роўна куды ісці вучыцца, абы разам з ёю. Пра мараходку ён амаль не ўспамінаў, не цягнула яго, як раней, і вывучыцца на следчага. У медыцынскі дык у медыцынскі. Даведаўшыся, аднак, які агромністы наплыў абітурыентаў у гэты інстытут, яны моўчкі забралі дакументы і пайшлі па чыстым, прыгожым Ленінскім праспекце шукаць шчасця ў іншых інстытутах. Больш астатніх Саву спадабалася ў будынку тэатральна-мастацкага інстытута: прыемна ўразілі юнака прыгожыя дзяўчаты

у кароткіх спадніцах. Яны так непасрэдна і смела сябе паводзілі, ускрыквалі ад здзіўлення, не саромеючыся курылі, седзячы на падаконніках. У Савы ў дзесятым класе хлопцы не ўмелі так па-даросламу зацягвацца.

Па лесвіцы хадзілі барадачы ў сініх халатах на голае цела, насілі бюсты, рамы, мальберты. «Тут мне б хацелася вучыцца»,— падумаў ён, аднак абыякавая да гэткай кідкай знешняй атмасферы Галіна цягнула яго за руку на праспект. Да аднаго інстытута яны знарок не дайшлі, да інстытута механізацыі і электрыфікацыі сельскай гаспадаркі, хоць ведалі, знаёмы хлопец з Ракава паведаміў, што там наогул конкурсу няма, здавай на «траякі» — і ты ў інстытуце.

Ім абаім не хацелася вяртацца назад у вёску, іх надта прывабліваў горад, марылі набыць гарадскую прафесію.

Пад вечар вельмі стомленыя яны вярнуліся назад да вакзала і падалі заявы (быў апошні дзень прыёму) у тэхналагічны інстытут на хіміка-тэхналагічнае аддзяленне. Сава не адолеў матэматыку, а яна як бы ў знак салідарнасці не рашыла задач па хіміі. З крыўдай на ўвесь свет і болем у душы яны пераначавалі адну ноч у душнай зале чакання на вакзале, так ім не хацелася ехаць назад на хутар. У галовах усё пераняшалася: трывога, жах, пачуццё безабароннасці. Вырашылі так: шукаць самую нязначную магчымасць, любую зачэпку, каб утрымацца ў сталіцы, увесь год рыхтавацца і паступаць нанава. Сава паехаў у новы мікрараён Чыжоўка шукаць Міхася Сокала, а Галіна накіравалася да стрыечнай сястры свайго бацькі (яна была на пахаванні), якая працавала шэф-поварам у кафэ ля цырка.

Застаўшыся адзін, Сава не прамінуў наведаць яшчэ раз тэатральна-мастацкі інстытут і перапісаў на ўсялякі выпадак правілы прыёму на ўсе факультэты.

Трыццацігадовы халасцяк Міхась Сокал, які зусім нядаўна перабраўся ў аднапакаёвую кааператыўную кватэру, у добрым настроі вельмі прыязна сустрэў Саву, даў яму ключ: «Жыві, брат, карыстайся газам, гарачай вадой, туалетам... Работу знойдзем. Назад у вёску вяртаюцца толькі аднаклетачныя ды інваліды». Рухавы Міхась адразу пачаў адгаворваць Саву ад трактарнага завода: «У цябе не тая натура. Ты арыстакрат, шляхта... А тут пад'ём у шэсць раніцы, перакур пятнаццаць мінут, абед і зноў працуй да поту. Пакуль дапрэш да чацвёртага разрада, валасы пасівеюць. І потым — сто трыццаць рублёў, не надта на іх і разгуляешся. Цяпер на рабочага глядзяць як на дурня. Плююць. Інакш як п'яніца і не называюць. Год можна

перакантавацца дзе-небудзь на халтуры. Ты не крыўдуй, у цябе мала сур'ёзу для рабочага. Табе ўсё хутка надакучвае. Сусед мой па пад'ездзе працуе асвятляльнікам на кінастудыі. Пачне часам у кампаніі расказваць... сэрца замірае, вочы на лоб лезуць. Вось дзе жытуха! Камандзіроўкі па ўсім Саюзе, артыстачкі ў саку, фешэнебельныя гасцініцы... і галоўнае няма гэтага ад званка да званка, у іх ненарміраваны рабочы дзень. Эліта. Туды год утрубіць не шкада. Хоць свет пабачыш. Праўда, ёсць адна закавыка. Трэба прапіска. Ліміты маюць толькі буйныя заводы, будтрэсты ды фабрыкі... але ж не панікуй. Нешта прыдумаем. Кажуць, законы на тое і пішуць, каб іх абысці. Калі б мне давялося пачынаць усё спачатку, далібог, пачаў бы з кінастудыі».

Словы «артыстачкі», «фешэнебельныя гасцініцы па ўсім Саюзе» запалі Саву ў душу.

Галіне пашанцавала. Ёй сваячка адразу прапанавала рэальны шанц: «Трэба ўладкавацца на курсы афіцыянтак».

Саву наогул гэтае слова «афіцыянт» па невядомай прычыне не падабалася, мела яно адбітак разбэшчанасці, але ж выйсця не было, і ён параіў ёй слухаць цётку, тым больш што яна ўзяла Галіну да сябе, аддала ёй маленькі пакойчык у невялікім драўляным доме на зялёнай незаасфальтаванай вуліцы ў канцы тралейбуснага маршруту.

Саву ж давялося чакаць асвятляльніка кінастудыі, бо, як аказалася, ён тэрмінова паехаў у трохмесячную камандзіроўку на здымкі фільма ажно ў Мурманск.

«Не адчайвайся. З голаду не памрэш,— супакойваў Міхась,— будзем пакуль шукаць табе прапіску». Праз знаёмых Сокала знайшлі ў пасёлку Дражня гаспадыню аднаго вялікага прыватнага дома. «Шуруй да Моці,— раілі Міхасю яго сябры,— у яе палова дамавой кнігі запісана на «лімітчыкаў». Мажная, з нягнуткімі тоўстымі пальцамі і прыдзірлівым позіркам гаспадыня пры сустрэчы адразу запатрабавала даць наперад тысячу рублёў.

Канечне ж, такіх грошай у Савы, хоць упадзі ён у ногі да бацькоў, не было.

Тады жвавы Міхась здагадаўся: «Трэба прапісацца ў Мінскім раёне. Ёлкі-палкі, і асвятляльніка-суседа ўзялі на кінастудыю з раённай прапіскай. На гэтую справу дзве сотні хопіць».

Сава паехаў на хутар, доўга ўгаворваў бацькоў (маці і слухаць не хацела пра сталіцу) і ўгаварыў. Павел дастаў — хаваў ад жонкі на чорны дзень — дзвесце рублёў.

На электрычцы ехалі Сава, Міхась і знаёмы Міхася, Мікалай Кандратавіч. Сівы гадоў пяцідзесяці мужчына з абыякавымі, стомленымі вачыма. Галёкаў, чапіўся да незнаёмых дзяўчат, расказваў анекдоты толькі Міхась. Прыехалі на станцыю Новае Сяло, далей пехатою пайшлі да вёсачкі Нізоўка, там знайшлі сваяка Мікалая Кандратавіча, выпілі з ім тры бутэлькі гарэлкі, пакінулі для прапіскі пашпарт, сто рублёў і, стомленыя, паехалі назад у Мінск.

Міхась, выспаўшыся за дарогу, прапанаваў скінуцца па траяку, купіць спіртнога і гульнуць.

— Футбола няма. У рэстаран дорага. На танцверанду неахвота. Не хочацца, каб дзень прапаў дарма. Гуляць дык гуляць! Не падвядзе твой чалавек, Мікола?

— Надзейны хлопец,— адказаў асіплым голасам Мікалай Кандратавіч.

— І я пра тое,— ажывіўся Міхась.— Зараз пазвонім Райцы, Зіне. Ёсць дзе сабрацца, дзякуй богу. А дзяўчаты кампанейскія.

— Я згодны. З мяне тры бутэлькі віна і бутэлька шампанскага,— Саву вельмі хацелася аддзякаваць сваім гарадскім сябрам.

— Тады я згодзен,— Мікалай Кандратавіч паціснуў Саву руку.— Ты не жлоб, я люблю такіх.

Калі ж Сава ўбачыў на століку «батарэю» бутэлек са спіртным, з жахам падумаў: «Няўжо гэта ўсё яны змогуць асіліць?»

Выпілі, адужалі. Падалося мала. Міхась пайшоў званіць да суседзяў, шукаць выпіўку. Вярнуўся толькі з бутэлькай піва. Мікалай Кандратавіч дастаў тры рублі, Сава паклаў на стол і сваю пяцёрку. Рая не адпусціла Міхася аднаго, паехалі з ім разам на таксі да бліжэйшага рэстарана «Сосны». Прывезлі дзве бутэлькі «Белавежскай».

— Мікалай Кандратавіч, міленькі, пакажыце, калі ласка, вышэйшы пілатаж,— прасілі ў адзін голас дзяўчаты, бландзінка Рая і брунетка Зіна.

— Пакажы, Мікола,— няхай малады салага вучыцца,— ледзь варочаючы языком, сказаў і Міхась.

Прынеслі глыбокую міску, у якую Мікалай Кандратавіч артыстычна выліў паўбутэлькі гарэлкі, грамаў сто яблычнага віна, накрышыў чорнага хлеба. Рая падала свайму куміру распісную сувенірную драўляную лыжку. Усе на момант прыціхлі. Выключылі старэнькі магнітафон «Днепр», які круціў стужку ў маткі.

Мікалай Кандратавіч чарпнуў лыжкай жыжу адзін раз,

другі, трэці, чацвёрты! З'еў — выпіў усё з міскі да дна з спакойным стомлена-засяроджаным тварам. Рая і Зіна кінуліся цалаваць героя вечара.

— Ну, рызыкні паўтарыць. Тут на дзве лыжкі засталося,— прапанаваў Саву Міхась.

— Рызыкну,— Саву вельмі хацелася, каб гарадскія дзяўчаты звярнулі ўвагу і на яго.

Зачарпнуў ён лыжкай, пажаваў мокры хлеб і не змог пракаўтнуць, пабег у туалет.

Бледны вярнуўся ў пакой. Ніхто, аднак, з яго не смяяўся.

— Бедненькі наш хлопчык, зараз я завару табе кавы,— шчыра занепакоілася Рая.

— Дарэчы, кава і гарэлка падаражаюць,— як успомніўшы, сказала Зіна.

Рая прынесла каву, пагладзіла Саву па галаве. Кубачак з цёмна-жоўтай пенай стаяў на спадачку. Сава не ведаў, што рабіць: ці трымаць кубачак у адной руцэ, а спадачак у другой, ці пакінуць спадачак на століку?

Мікалай Кандратавіч узяў у руку адзін кубачак. Так зрабіў і Сава.

— Танцы! Няхай будуць танцы, шманцы, зажыманцы,— ажывіўся Міхась і паставіў другую касету.— Святло патушы. Я ўключу інтымнае асвятленне,— кіраваў ён.

Уключылі чырвоны таршэр, які днямі купілі ў камісіёнцы. Пары для Савы не было, і ён калупаўся ля магнітафона, перабіраў касеты. Міхась, скрыжаваўшы рукі за спінай Раі, смачна, не саромеючыся, цалаваў яе ў вусны. Мікалай Кандратавіч, наадварот, танцаваў як гусар. Грацыёзна, строга. Зіна нешта шапнула яму на вуха, і ён у знак згоды кіўнуў галавой. Праз мінуту Зіна непрыкметна выйшла і хутка вярнулася з сяброўкай, з якой і пазнаёмілі Саву. Міхась наліў у шклянку гарэлкі і не адчапіўся ад Леакадзіі (такое было ў яе імя), пакуль тая не выпіла. Трэба сказаць, што выпіла без какецтва, закусіла кавалачкам шакаладу.

— Запрасі яе на танец. Міравая баба. Заўсёды грошы пазычае,— параіў Міхась Саву.

Танцавалі моўчкі. Ён не ведаў, як пачаць з незнаёмай гаворку, яна не ведала, пра што з ім гаварыць. Рая і Зіна пайшлі на кухню курыць, Леакадзія паспяшалася за імі.

— Падабаецца табе Ліка? — пацікавіўся Мікалай Кандратавіч.

— Нічога жанчына,— з выглядам знаўцы адказаў Сава.

— Ты, галоўнае, не тушуйся. Гэта нічога, што яна адна-

го з табой росту. Памятай словы геніяльнага драматурга... «Жанчыны любяць герояў, а спяць з імі комікі». Ты яшчэ ў тым узросце, калі кожная жанчына ўяўляе цікавасць. Я гэтым пахваліцца не магу. Дзейнічаю выбарачна,— павучаў Мікалай Кандратавіч.

Набліжалася поўнач. Зіна, пазяхаючы, пачала збірацца дахаты, запытальна пазіраючы ў бок Мікалая Кандратавіча.

— Дык я пайду. Мне ў дванаццаць трэба быць дома.

— А мо застанешся? — санліва-абыякава прапанаваў Міхась, ён сядзеў на канапе і абдымаў адной рукой Раю.

— Пасядзі, Зіна,— казала і Леакадзія.

— Не. Трэба дахаты,— не вельмі цвёрда адказвала Зіна.— Шчасліва вам гуляць і прыемных сноў.

— Я праводжу,— нарэшце сказаў Мікалай Кандратавіч, падаючы дзяўчыне цёмна-зялёную кофту.

— А ён яе да сябе не павядзе? — рызыкнуў ціха пацікавіцца ў Міхася Сава.

— Не. Ён у нас са бзыкам. Да сябе не водзіць.

І сапраўды Мікалай Кандратавіч хутка вярнуўся назад. Яшчэ пілі каву. Нарэшце і Мікалай Кандратавіч па-джэнтльменску развітаўся з усімі і пакінуў кватэру. Сава ў разгубленасці прыпыніўся на парозе пакоя.

— А ты ў гасцях, ці што! Забірай раскладушку і на кухню. Леакадзія, памажы майму земляку, ён у нас сарамлівы хлопец.

У кухні было цёмна. Леакадзія з Раяй аб нечым доўга ўпотай гаварылі ў ваннай і курылі. Сава распрануўся і залез пад тонкую старую коўдру. Ні з таго ні з сяго яго прабраў моцны калатун, як на марозе, аж да ляскату зубоў. Сава заплюшчыў вочы, злёгку кружылася галава. Нарэшце ў ваннай патушылі святло. Леакадзія прыйшла ў кухню, а Рая пайшла ў туалет.

— Ну, як ты тут уладкаваўся? Не холадна? — як у добрага знаёмага спытала Леакадзія.

— Не,— адказаў ён,— не холадна.

Святло з туалетнага акенца падала Саву ў твар, ён павярнуўся на бок і ўбачыў калені Леакадзіі, якая сядзела на табурэце ля раскладушкі.

Толькі зараз ён угледзеў, што яна ў ярка-чырвонай камбінацыі. Леакадзія закурыла невядома якую па ліку цыгарэту, закінула нагу на нагу. Сава па-ранейшаму ўсяго калаціла. Яна гэта заўважыла. Узяла яго руку ў сваю, пагладзіла па галаве.

— Табе холадна?

— Не,— нерашуча сказаў ён.

У туалеце з моцным шумам злілі ваду, выключылі святло.

Сава нясмела паклаў руку на калена Леакадзіі.

Яна глыбока зацягнулася, доўга тушыла акурак у попельніцы, нетаропка сабрала валасы на патыліцы, заціснула іх гумкай і асцярожна залезла да яго пад коўдру. Раскладушка моцна рыпела — варта было зрабіць нязначны рух ці павярнуцца на бок.

Сава, адчуўшы побач пругкае жаночае цела, голыя грудзі, прыклаўся успацелай шчакой да яе шчакі, саромеючыся цалаваць у вусны, лічыў, што гэта можа не спадабацца ёй і яна пакіне кухню. Леакадзія павярнулася да яго тварам, дыхнула рэзкім пахам нікаціну. Сава ніколі не курыў, і гэты агідны пах ледзь не вывернуў яму кішкі, і ўсё ж, пераадольваючы брыдкасць, ён нясмела пацалаваў яе тонкія вусны.

— Не спяшайся. Няхай яны заснуць,— шапнула яна, абдымаючы яго.

Сава не чуў яе папярэджання, ім завалодала страсць, прадчуванне хуткай перамогі над гарадской прыгажуняй падштурхоўвала яго дзейнічаць хутка і неадкладна.

— Не спяшайся, ласкавы мой,— шаптала яна,— ты прыгалуб мяне... не так адразу...

Ён не хацеў нічога слухаць і нічога разумець.

Нечакана нехта адчыніў на кухню дзверы.

На парозе ў доўгіх трусах стаяў Міхась.

— Вы што? У італьянскім бардэлі? Пакладзі матрац на падлогу.

Сава хуценька выканаў строгі загад земляка. Леглі на матрац. Маленькая падушачка, якая цяпер выглядала, як жаба на карыце, толькі перашкаджала ім. Леакадзіі ляжаць было нязручна, яна білася галавой аб цяжкую цеплавую батарэю.

— Божа мой, ты заб'еш мяне,— праз смех казала яна...

Ён заплюшчыў вочы, упёрся сваім квадратным падбародкам ёй у шыю і парывіста засоп...

— Скажы, а чаму ніхто з вас не застаўся з Мікалаем Кандратавічам? Ён не будзе на мяне крыўдаваць?

— Не. Ён жонаненавіснік. У маладыя гады быў мараком. Жонка яму тут, на сушы, нагуляла дзіця. Вось ён і помсціць з таго часу нам... жанчынам... Садыст, адным словам. Ведае, што яго Зінка кахае. І яна дурная. Плача, зневажае сябе...

— А-а,— зацягнуў Сава,— цяпер разумею.

— Нічога ты яшчэ не разумееш. Малады, нявопытны. Я прыношу шчасце. Магу прадказаць будучыню. Ты будзеш мець поспех у жанчын. У цябе прыемнае спалучэнне: чорныя валасы і блакітныя вочы. Трэба трошкі паправіцца. Худы. Але нічога. Ты мне спадабаўся.

— І ты мне,— перайшоў на «ты» Сава.

«Як усё празаічна,— думаў ён,— без эксцэсаў, слёз... як усё проста».

Ён соладка заснуў на яе плячы.

Раніцой, калі за акном пачуўся шум першых аўтобусаў на вуліцы Ташкенцкай, на кухню бесцырымонна ў трусах, прыгорблены і заспаны, увайшоў Міхась, уключыў газ, паставіў на пліту чайнік.

Леакадзія ляжала на спіне і курыла.

— У-цю-цю-цю,— Міхась пацягнуў на сябе коўдру.

— Міхась, перастань, не люблю,— незадаволена сказала яму Леакадзія.

— У-цю-цю, якія мы сталі адразу сарамлівыя.

Міхась выйшаў. Леакадзія хутка падхапілася і пачала спешна, як у арміі, апранацца.

— Ты куды? — Саву не хацелася яе адпускаць. Як яна падобна на тых, каго ён бачыў у калідоры тэатральна-мастацкага інстытута.

— На работу, мой малады сябар, трэба ўкалываць і па суботах. Ды дзіця ў садзік завесці...

— У цябе ёсць дзіця? — ён зусім не чакаў пачуць гэта. Здавалася, што Леакадзія старэй за яго ну няхай на пяць, шэсць гадоў. Але каб у яе ўжо было дзіця? Такога ён не мог уявіць.

— Хіба ж яны нічога табе пра мяне не расказвалі? — сардэчна так спытала яна.

— Не.

— Дзіўна. Я лічыла, што ты ведаеш пра гэта. Ну да пабачэння, мой салодзенькі. Тут мы больш сустракацца не будзем. Калі засумуеш па мне, пазвані ў кватэру № 18 у апошнім доме на гэтай вуліцы. У панядзелак у мяне выхадны. Лепш, калі прыйдзеш раніцай... да гадзіны. Не, не... не цалуй мяне... Я ўжо намазала памадай губы. Ну, не сумуй, да пабачэння.

Праз паўгадзіны ўсе разбегліся, хто куды. Рая спяшалася ў свой абутковы магазін, а Міхась успомніў, што і ў яго «чорная субота». Сава даведаўся, што Леакадзія працуе ў сталоўцы радыятарнага завода ці адміністратарам, ці каль-

кулятарам. Спяшацца яму не было куды, і ён лёг спаць, а недзе а шостай гадзіне сустрэўся з Галінай. Яна ўзяла білеты ў кіно, яны дамовіліся аб гэтым яшчэ ўчора. Пры сустрэчы ён хаваў ад яе вочы, пацягнуў у залу і там, дачакаўшыся ратавальнай цемры, узяў яе за руку і трымаў да той пары, пакуль у яго не ўспацела далонь. Фільм не цікавіў яго. Яшчэ ніколі ў жыцці ён не адчуваў сябе побач з ёй так няўтульна. Як толькі заплюшчваў вочы, бачыў Леакадзію. Яму хацелася кінуць Галіну і бегчы туды, на Ташкенцкую вуліцу на кухню да гэтай незнаёмай і такой блізкай жанчыны. Але ж у кішэні ў яго быў толькі рубель. Паўсотні пазычыў Міхась, каб купіць тэлевізар. Сава засумаваў: «Эх, каб былі грошы. Узяць бы таксі, купіць бутэльку шампанскага, падкаціць да сталоўкі, забраць яе». Успомніў, як яго павучаў Мікалай Кандратавіч: «Сапраўдны мужчына павінен завалодаць жанчынай, якая яму спадабалася, з рублём у кішэні». Сава крыва ўсміхнуўся. Галіна адчула нешта нядобрае, але не ведала, што яго непакоіць. Толькі калі яны развітваліся каля дома, яна спытала:

— Можа, у цябе няма грошай?

— Так. З гэтай прапіскай давялося патраціцца. Маці трымае ў чорным целе, у бацькі няма... Ды нічога. Праз тыдні тры ўладкуюся на работу.

— Вазьмі,— яна дастала з кашалька дзесяць рублёў.

— А як жа ты?

— У мяне яшчэ засталося.

— Дзякую. Прыйдзе час, разбагацеем.

Ён пацалаваў яе... больш у знак падзякі. Сава паляцеў у свой далёкі мікраараён з адной надзеяй, каб паўтарылася ўчарашняя вечарынка.

Дзяўчат у кватэры не было. На кухні сядзелі Міхась і пануры Мікалай Кандратавіч, ля ног у якога ляжаў маўклівы чорна-белы сабака. Гадзіну таму Мікалай Кандратавіч атрымаў тэлеграму аб смерці бацькі, які доўгі час быў бакеншчыкам на Дняпры ў гарадку Лоеў.

— І выпіць няма чаго,— задуменна пачухаў патыліцу Міхась,— хоць бы памянулі твайго бацьку.

— Памінаць трэба, калі чалавека ў зямлю закапаюць. Пакіну на вас Цяпу. Выводзіць яго трэба двойчы: ранкам і ўвечары. Калі затрымаюся... не хвалюйцеся... Прапіску табе пастаянную зробяць.

— Я падумаў, можа, няварта чакаць асвятляльніка... Можа, пайсці на будаўніцтва ці завод?

— Дурань. Ты слухай, што табе вопытныя старэйшыя гавораць,— буркнуў Міхась.

— У жыцці ёсць чатыры сферы,— шукаючы словы, пачаў Мікалай Кандратавіч,— першая сфера — вытворчасць харчу, другая — вытворчасць сродкаў вытворчасці, трэцяя — улада, чацвёртая сфера — вытворчасць забаў. Да першых дзвюх ты заўсёды можаш вярнуцца як на свой хутар.

— Я і кажу, дурань,— не сядзелася Міхасю,— ірвецца на работу. Тут не ведаеш, як і куды ад яе дзецца. Сядзі, дыхай воляй. Пакідай, Коля, сабачку. Сава дагледзіць.

Сваяк Мікалая Кандратавіча прывёз пашпарт раней, чым чакалі. І яшчэ пашанцавала: па неадкладнай справе прыляцеў на тры дні з Мурманска асвятляльнік, якога з такой надзеяй чакалі на вуліцы Ташкенцкай. Яшчэ праз два дні, у сераду, Саву Дыма залічылі ў штат кінастудыі асвятляльнікам першага разрада з акладам шэсцьдзесят рублёў у месяц, а ў пятніцу яго ўжо накіроўвалі ў першую творчую камандзіроўку (о, як мілагучна гучала для яго гэта слова) у горад Мазыр на здымкі мастацкага фільма «Хмара на гарызонце». Збіраліся паўдня. Шафёр грузавой машыны, якая была замацавана за асвятляльнікамі, папрасіўся ў брыгадзіра Чакатоўскага на гадзінку, а вярнуўся да студыйнага калектара пасля абеду.

— Не люблю...— бушаваў Чакатоўскі,— ты б чэсна сказаў, адпусці на халтуру, я б не марыў мальцаў,— строга, але нязлосна сварыўся ён на маладога вадзіцеля.

Сава прыслухоўваўся да ўсяго, сядзеў ціха, як мыш.

Чакатоўскі — чалавек высокага росту, з рыжай, як у клоуна, галавой, незлаблівымі вачыма і яшчэ добрай сілай у целе. Было гэтаму з рэзкім высокім голасам брыгадзіру асвятляльнікаў гадоў пяцьдзесят, а мо і трохі больш. Вадзіцель грузавой машыны вінавата маўчаў, а праз пяць мінут без просьбы пачаў памагаць асвятляльнікам грузіць прыборы... Насілі цяжкія дзігі, штатывы, рэастаты пад дзігі, кабель «бэбікі», тройкі, на гэту ж машыну пагрузілі скрыні касцюмера і грымёра. Самі селі ў аўтобус з усёй здымачнай групай.

Бойкі чарнявы адміністратар Рома Саву вельмі падабаўся. Ён упэўнена, з весялосцю нават кіраваў пагрузкай, у канцы работы выдаў асвятляльнікам за пагрузку пабочнага грузу па цалковым, а хлопцы ў сваю чаргу моўчкі перадалі грошы пасыльнаму, які паспеў да адпраўлення

аўтобуса прынесці чатыры бутэлькі яблычнага віна. Хутка выпала магчымасць яго выпіць.

У Жлобіне сапсаваўся стары «пазік». Адміністратар віна не піў, дапякаў вадзіцеля.

— А што я? Кажыце начальству гаража, чаму такую ламачыну не спісваюць. Я з ёй год мудохаюся! — аднекваўся вадзіцель.

Прыехалі ў Мазыр увечары.

Пасялілі Саву ў гасцінічны нумар разам з асістэнтам рэжысёра Лявонам Жабакрыкам, які выглядаў старэй сваіх дваццаці васьмі гадоў мо яшчэ і ад таго, што быў ён у целе, насіў густую бараду. У нумары быў тэлефон. Асістэнту трэба было і ўдзень і ўначы трымаць сувязь з акцёрамі трох сталіц: Масквы, Кіева, Вільнюса. Менавіта адтуль набралі выканаўцаў галоўных роляў.

Рэжысёр-пастаноўшчык здымаў заўсёды «зорак» досыць вядомых шматмільённай аўдыторыі ўсёй краіны. Толькі ў трох нумарах гэтай новай чатырохпавярховай гасцініцы з кафэ на першым паверсе, з цырульняй, з сувенірным кіёскам і міжгароднім тэлефонам-аўтаматам і былі тэлефоны. Позна ўвечары, калі яны ляжалі ў ложках, Сава даведаўся, што Лявон вучыцца на трэцім курсе рэжысёрскага факультэта таго самага тэатральна-мастацкага інстытута і што хутка сам будзе здымаць «сваё кіно». Сава пранікся да новага сябра вялікай павагай і сімпатыяй. Праўда, з часам ён даведаўся пра адну значную дробязь: Лявон вучыўся на аддзяленні рэжысёраў народных тэатраў, але гэта было значна пазней, цяпер жа ён боготварыў свайго новага куміра. На душы панаваў прыемны салодкі ўздым. Якія цудоўныя хлопцы-асвятляльнікі, які люксавы нумар, магнітафон, згаворлівы брыгадзір Чакатоўскі, разумны Лявон. Нібыта сон, дзіўны сон, які так яму падабаецца. А якія абаяльныя з моднымі прычоскамі памочнікі рэжысёра, асістэнты, грымёры... а ў нумары гарачая вада, умывальнік, тэлефон. «Добра, што паслухаў Міхася,— думаў ён, засынаючы пад любімую мелодыю Лявона «Бесаме». Болей за ўсё яму падабалася, што ў нумары ёсць тэлефон. Менавіта тэлефон і саслужыў нядобрую службу, Сава ледзь не пасварыўся з Лявонам...

А што ж Галіна? Як жа яна паставілася да жадання Савы шукаць сваё шчасце ў кіно, да якога ён быў абыякавы ў школе? У рэшце рэшт яна магла і змірыцца з яго нечака-

ным жаданнем, турбавала іншае — як яна застанецца адна ў гэтым агромністым чужым горадзе. Дні залатой восені спешна поўніліся ранняй цемрай. Пры адной думцы, што ёй прыйдзецца а дванаццатай гадзіне вечара адной вяртацца на бязлюдную вуліцу Чайкоўскага, яна халадзела ад страху, невядомага ёй на хутарах. Здаралася, і начавала адна ў хаце, і ля могілак хадзіла апоўначы. Галіна прыйшла яго праводзіць, сядзела ў скверыку ля кінастудыі, чакала. Ён выкраіў мінут дзесяць.

— Ты надоўга ў камандзіроўку?

— На тры месяцы.

Ёй хацелася заплакаць. Саву яе настрой раздражняў.

— Не люблю. Не трэба памінак. У нас будуць выхадныя. Я прылячу самалётам. Абяцаю. Усё. Чакай. Маё слова — закон. Усё. Пакуль. Там мяне чакаюць.

Яна засталася з надзеяй, мусіла паступова звыкнуцца з бязлюдным тралейбусам, з адзінокай фігурай п'янага мужчыны, які часта спаў на лаўцы ля прыпынку, выцягнуўшы, як мярцвяк, доўгія ногі.

У першыя дні працавалі па-чорнаму, не шкадуючы мускулаў, спяшаліся, бо адна «зорка» тэрмінова ад'язджала за мяжу на здымкі фільма да маэстра Жалакявічуса. Так Сава адразу ўведаў пачым фунт ліха і што такое праца асвятляльніка. Здымалі ад дзевяці да дзевяці, лёталі з аднаго аб'екта на другі. «Хата Колі», «Прыстань. Дэбаркадар», а ўвечары — вуліцы горада. Рукі адрываліся ад ставасьмідзесяцікілаграмовых дзігаў: зáпар тры дні здымалі так званы «рэжым» з пяці гадзін ранку. А тут як на грэх — хвароба. Ці ад ежы, ці ад старога піва Саву схапіў жывот, і ён часта бегаў да туалета. Сварыліся на яго за гэта і Чакатоўскі, і адміністратар, і нават аператар. Не верылі, думалі, сімулюе. Кожны павучаў, чытаў натацыі і вучыў кінематографу. Ён, абхапіўшы жывот рукамі, у якім калола, пучыла, рэзала, моўчкі выслухоўваў павучанні. Знакамітыя і праслаўленыя акцёры — выканаўцы галоўных роляў, нагадвалі Саву аблезлых, замораных катоў, якія лавілі кожную мінуту для сну: спалі ў аўтобусе, у жэзлонгу, на матрацы на дне перавернутай лодкі, у гамаку. Перад тым як увайсці ў кадр, іх будзілі, грымёры паспявалі надаць ім боскі выгляд, на бягу яны вучылі тэкст, пілі з бутэлькі малако і беглі на рэпетыцыю і толькі перад камерай непазнавальна пераўтвараліся. Сава сачыў за імі, як малпа ў цырку за рухамі ўтаймавальніка, але з часам прывык і да іх, як да сваіх асвятляльных прыбораў.

Сутачных грошай яму давалі мізэр — адзін рубель дзесяць капеек на дзень. Адзін Чакатоўскі з усіх асвятляльнікаў і падсобных рабочых атрымоўваў два рублі шэсцьдзесят капеек, але і яму, як і яго паплечнікам, гэтых сутачных не хапала.

Асвятляльнікі выкручваліся як маглі, бралі ў нумары электраплітку, куплялі макароны,ількі ў таматным соусе, вырылі бульбу. Чакатоўскі, шкадуючы сваіх хлопцаў, пазычыў у адміністратара дваццаць пяць рублёў і акуратна субсідзіраваў ім на абеды, а часам даваў і на снеданне за перасмажаныя да гаркаты катлеты і шклянку бледнажоўтай какавы. Без віна і грошай асвятляльнікі засумавалі, а тут яшчэ бухгалтэрыя не паспела пераслаць ім аванс.

У паветры запахла сваркай, праўда, дырэктар паводзіў сябе з рабочымі асцярожна, бо яны адны маглі аспрэчваць ва ўсіх інстанцыях частыя ненарміраваныя дні. Паўстаў сам Чакатоўскі, патрабуючы ад адміністрацыі грошай сваім хлопцам. Дырэктар даўно мог бы адаслаць самастойнага і незалежнага брыгадзіра назад на кінастудыю, замяніць яго на іншага. Была і падстава: Чакатоўскі запіў і тры дні не выходзіў з нумара, але хто ж заменіць гэтага «рыжага клоуна», скандаліста, які лепш за астатніх ведае сваю справу і заўсёды трымае сваю брыгаду ў дысцыпліне. Знайшлі асвятляльнікам аванс, выплацілі грошы, і выпала такая прыемная для ўсіх працэдура на выхадныя дні.

Да раніцы хлопцы рэзаліся ў прэферанс, спалі да абеду, а потым пагаліліся, распакавалі нарэшце чамаданы, апранулі белыя нейлонавыя сарочкі і рознакаляровыя гальштукі і пайшлі ў горад на мясцовы Брадвей шукаць жанчын.

Усе зайздросцілі вадзіцелю службовай «Волгі», які ўжо вазіў на заднім сядзенні мясцовую бландзінку.

Хадзілі хлопцы па набярэжнай з пачуццём бяздоннай волі, як паўліны.

Апякун Савы Лявон з іроніяй ставіўся да такіх паходаў:

— Яны бітыя ваўкі, а ты хто... Нявопытны заяц. На непрыемнасці нарвешся. Ты слухай Лявона, ён не толькі ўмее каваць грошы, а ведае толк у жанчынах. Глядзі, за гадзіну маю дваццаць тэлефонаў першых прыгажунь горада. Вось у запісной кніжачцы. Мой дарагі, магічнае «хачу зняць вас у сваім фільме»,— а ўвесь горад бурліць, ведае, што тут здымаюць кіно,— і яна ў шоку, на ўсё гатова. Сядай да тэлефона, звані, запрашай у нумар на рэпетыцыю. Ты хлопец сімпатычны, адзін падбародак, як у Жана Марэ, толькі

патлы падстрыжы, не бяры прыклад з бітлаў, іх час мінуў. Па сакрэце скажу, наш галоўны рэжысёр сексуальны маньяк... не было ў яго яшчэ фільма, каб ён не здымаў гераіню голай. Помню, здымаў фільм пра вайну, дык і там прымусіў санітарку голай лезці ў палонку. Яна сабе там тое-сёе застудзіла... два гады пасля лячылася. Унікальны рэжысёр. Каб можна ў нас было здымаць парнаграфічныя фільмы, ён быў бы ў авангардзе. Наглядзіцца ў Доме кіно закрытых замежных фільмаў і хоча скапіраваць з іх усё. Фелінчык. Усім ім не дае спакойна спаць талент Таркоўскага. Нашы актрысы рэдка згаджаюцца здымацца голымі. Дваццаць рублёў за дубль... для іх не грошы. Вось і шукаем дублёрку. Ты мяне слухай. Будзь вышэй, не паддавайся суяце сует, не выдай сваёй рабскай залежнасці ад іх, не распыляйся. Туман глыбакадумнасці ў вачах, такт, павага,— уся гэта самадзейнасць для асвятляльнікаў, ты вышэй за іх па інтэлекце. Мне падабаецца, што ты ўмееш самастойна аналізаваць сітуацыю, чалавека — кіруйся у гэтым напрамку. Вучыся бачыць з'яву цалкам і выцыганьвай з яе для сябе карысць. Стане гэта нормай, і ты адчуеш сэнс жыцця. А пакуль мне твае дзеянні нагадваюць шчаня, якога кінулі ў раку, а ён боўтаецца, плыве па цячэнні, не ведаючы, што чакае на беразе. Сядай да тэлефона і круці дыск.

Натхнёны гаворкай і пахвалой, Сава апантана кінуўся званіць мазырскім «зоркам». Першы вечар, праўда, прынёс расчараванне. З сямі кандыдатак на ўдзел у эпізодзе, Лявон асабліва падкрэсліваў гэтае слова «эпізод», прыйшлі толькі тры дзяўчыны.

Дзве маладзенькія дзяўчынкі, якія нясмела пастукалі да іх у нумар, ад хвалявання так заікаліся, што можна было падумаць, дарма яны не звернуцца да лагапеда.

Усё ішло цудоўна да той пары, пакуль Лявон не даведаўся, што адной шаснаццаць гадоў і два месяцы, а другой шаснаццаць гадоў і сем месяцаў. «Галоўны рэжысёр», а менавіта ім прадстаўляўся Лявон, адпусціў дзяўчат, паабяцаўшы, што здыме іх у сцэне «Провады ў армію». Як старую знаёмую кожную пацалаваў у шчаку. Сава зусім зніякавеў, ён быў ашаломлены: так у Лявона падвешаны язык, ён так імгненна ўмее наладзіць сяброўскую атмасферу, наблізіць да сябе незнаёмых людзей, настроіць іх на спакойны лад, так уздзейнічае эрудыцыяй, абаяннем, што яму, Саву, яшчэ вучыцца і вучыцца.

— Шаснаццацігадовых голымі я зарокся здымаць. Быў у мяне адзін выпадак у Гродне. Ледзьве ад яе бацькоў уцёк.

Падманула, аказалася, у яе бацька пракурор. Не-е. Непаўналетніх абыходзь бокам... крый божа. Ты Лявона слухай.

Але вось прыйшла адна паўналетняя з маці. Было такое пачуццё, што гэта не дачку, а маці запрашаюць удзельнічаць у здымках, так ужо ёй хацелася, аж з скуры лезла, спадабацца маладым «рэжысёрам», так ужо яна спявала пра сваю любоў да кіно і тэатра.

Лявон здаўся, запісаў іх на масавую сцэну, абяцаючы, што здыме кожную буйным планам, так што ў горадзе ўсе іх пазнаюць.

— Па-мойму, гэтая дзяўчына падыходзіла для сцэны купання,— зрабіў вывад Сава.

— Малайчына, у цябе ёсць густ.

— Я цікавіўся жывапісам. Збіраў нават рэпрадукцыі з часопіса «Огонек».

— Так-то яно так, але ж дохлы нумар. Маці яе ніколі адну не адпусціць, хутчэй сама пойдзе голай у ваду. Фігура ў дзяўчыны сапраўды класная, але ты надалей унушай сабе заўсёды, што ёсць яшчэ лепшая, таму што прырода бясконцая, і табе будзе тады не так цяжка перажываць страты. Таму што яны, бабы, маюць адну пастаянную асаблівасць — пакідаюць нас, ідуць да іншага. Да здымак яшчэ чатыры дні... заўтра ў мяне іх будзе батальён. Хадзем, пакуль кафэ не зачынілі, пашамкаем. Я частую, не піжонься.

Прыблізна а палове адзінаццатай у нумар да Савы і Лявона пазванілі. Прыемны жаночы голас папрасіў Віктара. Лявон лагодным тонам адказаў, што Віктара тут няма, што цяпер тут жывуць кінематаграфісты. Праз дзесяць мінут пазванілі зноў. На гэты раз Лявон адказаў, што Віктара тэрмінова выклікалі на жывадзёрню, бо там без яго не могуць нешта аддзяліць у быка ад скуры. У трубцы пачуўся смех. Пазванілі і ў трэці раз. Лявон змяніў свой жартаўлівы тон і вельмі ласкава пачаў гаварыць з таямнічай незнаёмай. Сава прыслухаўся і дзівіўся, як яго сябар неўпрыкмет даведаўся: хто гэта незнаёмая, дзе працуе, дзе жыве?

Лявон буркаваў:

— У вас дзіўны голас, за ім я бачу мора абаяльнасці, пяшчоты. Не сумуйце. Усё будзе добра. Абяцаю, што буду чакаць званка ад вас кожны вечар,— гэта згладзіць маю адзіноту ў гэтым горадзе. Усяго вам добрага. Вельмі прыемна пазнаёміцца.

— Спіш?

— Не,— адказаў Сава.

— Давай паспрачаемся на бутэльку шампанскага, што роўна праз дзесяць мінут яна пазвоніць зноў. І калі скажа, што ёй сумна і адзінока і на маё пытанне, ці ёсць у яе чорная кава, адкажа, што ёсць, я пайду да яе на хату. Давай?

— Згодзен,— загарэўся Сава.

— Я, брат, нутром іх адчуваю. У чым, па-твойму, трагедыя адносін паміж мужчынам і жанчынай? У немагчымасці пастаянства пачуцця, ці, назавём гэта — дзіўнага імгнення. Яна ніколі не можа быць тваёй поўнасцю, бо немагчыма адгарадзіць яе ад усяго свету, у якім так і кішаць спакусы, распуста, грэх, новыя пачуцці. Жывога чалавека так і цягне ўсё зведаць.

— Тады што ж застаецца? — задумаўся Сава.

— Што? А чорт яго ведае. Сам б'юся над гэтым пытаннем. Відаць, лавіць імгненне, выхаваць з сябе мужнага чалавека, які разумее, што і той, да каго яна пойдзе, усяго толькі халіф на гадзіну.

— Дык, па-твойму, выходзіць кахання няма?

— Ёсць. Але ты загадзя павінен ведаць, што гэта часовая хвароба. Я ніколі не ставіўся да пачуццяў жанчыны сур'ёзна, ведаю, што яна запраграмавана на здраду. Жэстам, поглядам, смехам, нават спадніцай, знакам увагі да незнаёмага мужчыны... усім... Яна падобна зорнаму небу, як быццам уся на віду і так далёкая і бязмежная.

— А ці ж яны падобны ў гэтым адна на адну? — сумняваўся Сава.

— Усе з аднаго цеста. Часам я з жахам думаю, што ўвесь свет не што іншае, як адзін агромністы публічны дом. Скажу табе, я пакаштаваў сямейнага хлеба... зарокся на ўсё жыццё. Рэшту жыцця пражыву халасцяком.

У гэты самы момант пачуўся тэлефонны званок. Лявон аж падскочыў, ускінуў угару, як шчаслівы футбаліст пасля гола, рукі.

— Што я табе казаў? Вучыся ў Лявона,— і ён з гонарам узяў у руку тэлефонную трубку.

На гэты раз гаворка была кароткай, як на бланку тэлеграмы: Лявон запісаў адрас незнаёмкі, сказаў, што ён праз дваццаць мінут будзе каля дома, і папрасіў, каб яна яго сустрэла.

— І ты рызыкнеш апоўначы ў чужым горадзе пайсці да яе? А калі, напрыклад, муж? — ад здзіўлення Сава сеў на ложку.

— Па-першае, у кожным мужчыне, мусіць, хоць трошкі

сядзіць донжуан, па-другое, калі дама запрашае да сябе на кубачак кавы, каб развеяць бяссонніцу і тугу, пагаварыць пра кіно, значыць, там, акрамя яе, нікога няма і не будзе, і яшчэ, галоўнае, хто не рызыкуе, той жыве толькі са сваёй жонкай.

Лявон «прыпоўз» у гасцініцу а палове сёмай, літаральна за некалькі хвілін да ад'езду групы на аб'ект. Упаў на ложак і праспаў роўна пятнаццаць мінут. У абедзенны перапынак коратка пераказаў нецярпліваму Саву свае начныя прыгоды.

— Як я і думаў, яна была адна, гадоў ёй пад трыццаць. Поўненькая такая, з кароткай стрыжкай і рэдкімі зубкамі. Кажа, калі не падманула, што муж на зборах. У сексуальным плане прымітыўная, але тэмперамент мае. Пачаставала балгарскім сухім вінам. Замарыла размовамі пра кіно... пакуль ляглі ў пасцель, пятая гадзіна была. Працуе, калі зноў не хлусіць, у бальніцы лабаранткай. Так што ўсё о'кэй. Купляй бутэльку шампузы. Спаць хачу, ногі не трымаюць. Пайду ў аўтобус, пакімару. Разбудзіш толькі тады, калі будзе цікавіцца шэф.

— Зразумеў,— з захапленнем адказаў Сава.

«Герой. Рызыкант. Я б так не змог. Ды Лявона пабіць, дык і сілу трэба мець, а я верабей. Трэба, як раіць Леакадзія, заняцца культурыстыкай. Заўтра ж куплю гантэлі. Усё. Вырашана».

Лявону паспаць уволю не давялося: на здымачную пляцоўку прынеслі тэрміновую тэлеграму, у якой маскоўская актрыса паведамляла, што кіраўніцтва тэатра не адпускае яе на здымкі акурат у тыя дні, якія былі абгавораны раней. Гэта была першая бомба ў групе. Пахла катастрофай. З іншых гарадоў з цяжкасцямі ўжо ехалі менавіта на гэтыя здымачныя дні ўсе астатнія артысты.

Сава ўпершыню бачыў раз'юшанага, як бык, рэжысёра-пастаноўшчыка, які так адрозніваўся ад таго мяккага, сцішанага рыбака, што разам з Чакатоўскім сядзеў на беразе Прыпяці. Шэф мацернымі словамі бязбожна крыў дырэктара карціны, другога рэжысёра, палохаў іх, што яны год будуць плаціць кінастудыі з уласнай кішэні. Паступова гнеў перанёсся на галаву асістэнта Лявона, які мірна спаў у аўтобусе. Дырэктар даў Жабакрыку сто рублёў, загадаў вадзіцелю «Волгі» гнаць у гомельскі аэрапорт на ўсіх парах: «Лёня, без актрысы ў Мазыры не аб'яўляйся. Цягні сюды, хоць мёртвую, але прывязі на запланаваныя дні. Я асабіста пастаўлю табе дзве бутэлькі каньяку і буду падтрымліваць

тваю кандыдатуру на тарыфікацыйнай камісіі. Усё. З богам,— рашуча казаў дырэктар і шэптам дадаў: — Мне прывязеш кілаграм чорнай кавы ў зернях і памятай... прэміяльныя усёй групы ў тваіх руках».

Лявону ехаць не хацелася. Сава бачыў, як яго ўсяго перакасіла, як ён нервова церабіў сваю бараду, закусваў вусны, але грунтоўнай альтэрнатывы ў асістэнта не было. Што зробіць кволы, нявопытны памочнік рэжысёра?

Лявон нават не паспеў заехаць у гасцініцу па свой любімы спартыўны касцюм, які ён перакупіў у алімпійскага чэмпіёна, нічога не паспеў і сказаць Саву. Так Дым апынуўся ў нумары адзін. Пазванілі, як і ўчора, роўна а палове адзінаццатай. Дым стараўся быць ва ўсім падобны на Лявона, нават інтанацыяй голасу. Адразу назваў сваё імя і сказаў, што Лявон паляцеў у Маскву і калі вернецца — невядома. Схлусіў, назваўся асістэнтам рэжысёра. Шчаслівы ўчарашні ваяж сябра надаваў яму смеласці і рашучасці. Жанчына з жалем паведаміла, што Лявон пакінуў у яе на стале сваю папку з нейкімі бланкамі штотыднёвых справаздач і што яна гатова вярнуць іх сёння, бо заўтра збіраецца ў вёску да маці. Сава глянуў на тумбачку ля Лявонавага ложка... там ляжала цэлая гара гэтых самых бланкаў, і ён рызыкнуў.

— Я магу прыехаць і забраць гэтыя справаздачы, калі, канечне, вы мяне ля дома сустрэнеце.

Пасля некаторай непрацяглай паўзы ў трубцы пачулася:

— Добра. Я вас сустрэну на лесвіцы. Ведаеце, як ісці? Уніз па вуліцы ад гасцініцы да моста, ад яго адразу ў правы бок і па лесвіцы ўгару. Праз дваццаць мінут я вас — чакаю. Я буду ў белым плашчы.

— Зразумеў. Выходжу. Да сустрэчы.

— Да сустрэчы,— яму падалося, што яна сказала гэта слова неяк гулліва.

Ішоў да моста хуткім крокам, не азіраючыся. Лесвіца была крутая, высокая і цёмная, толькі там угары па вуліцы Будаўнікоў гарэў адзінокі ліхтар. Марасіў дробны дождж. Сава паднімаўся па лесвіцы нетаропка, часта азіраючыся ўніз: ці не сочаць за ім, ці не ідуць следам. Прыхавалася падазрэнне: а раптам з ім вырашылі пажартаваць? Ён падумаў: «А мо пакуль не позна павярнуць назад?» Але ж там на мяжы цемры і святла ён прыкмеціў жаночую постаць.

— Добры вечар. Вы не мяне сустракаеце? Я Сава,— сказаў ён, хаваючы насцярогу.

— Тады вас. Будзем знаёмы, Люда,— адказала яна.

Ён заўважыў, што яна была ў хатніх тапках.

— Дом недалёка. Вы не спяшаецеся?

— Не,— павесялеў ён.

— Хадзіце бліжэй пад парасон. Я ж не кусаюся, не бойцеся.

— Я і не баюся.

У цёмным пад'ездзе пахла капустай, нехта першы нашынкаваў яе на зіму.

— Я жыву на трэцім паверсе,— казала яна, не азіраючыся на яго,— не суседзі, а бандыты. Не паспею ўкруціць лямпачку, праз гадзіну ўкрадуць.

Дзверы адзінаццатай кватэры былі прыадчынены. У вялікім пакоі быў уключаны ярка-чырвоны таршэр, святло якога слаба асвятляла і пярэднюю.

— Здымі плашч,— перайшла яна нечакана на «ты» і паказала на вешалку.— Праходзь у залу. У мяне тут у гасцях сяброўка, мая суседка, ёй будзе цікава пазнаёміцца з кіношнікам. Пры слове «сяброўка» на сэрцы ў Савы адлягло, пацяплела: усё ж не сам-насам, калі і «застукаюць», сяброўка выручыць. Сяброўку, якая сядзела ля таршэра ў хатнім халаце і без цікавасці гартала часопіс, звалі Ніна. Рэдкія, перафарбаваныя ў белы колер валасы лезлі ёй у вочы, і яна ўвесь час іх папраўляла.

Гаспадыня кватэры паставіла на столік бутэльку сухога віна, прынесла тры фужэры і высыпала з кулька ў крыштальную вазу карамель.

Сава спадылба агледзеў пакой: двое дзвярэй у іншыя пакоі, стары сервант, канапа, над ёй рэпрадукцыя карціны Шышкіна, у куце швейная машына, ля акна тэлевізар «Рэкорд». Шпалеры на сценах старыя, ад часу выцвілі.

— Разлівайце, Сава, гэта мужчынская работа,— пачціва-лагодна прапанавала гаспадыня.— Праўда, у яго рэдкае прыгожае імя, Ніна?

Ніна маўчала, уважліва разглядаючы госця.

— За што вып'ем? — Сава падаў жанчынам фужэры.

— За знаёмства,— адказала Люда. Сумная, а можа, хваравітая Ніна маўчала. Чокнуліся, выпілі. Ніна адразу закурыла. Сава паспеў паднесці ёй запальнічку.

— Такі малады і ўжо асістэнт рэжысёра. Па голасе я думала ты старэй, і голас у трубцы прыемны, праўда, Ніна?

Ніна маўчала, перакідваючы цыгарэту з аднаго кутка рота ў другі.

Патроху Сава асвоіўся. «Калі муж застукае, выскачу з трэцяга паверха. Дзякуй богу, ён невысокі». Разгаварылі-

ся. Сава пачаў вельмі натуральна «спяваць» пра вучобу ў тэатральна-мастацкім інстытуце, знаходзіў месца анекдоту (без пахабшчыны), успамінаў байкі пра сямейнае жыццё славутых артыстаў.

Люда ўважліва слухала, часта ўсміхалася.

Ніна не пераставала хмурыцца.

— А вот Лявон учора расказваў пра сваю паездку на здымкі ў Сайгон. Праўда, было цікава, Ніна?

Ніна, унурыўшыся, сядзела моўчкі.

«А мо яна нямая»,— падумаў Сава, і тут Ніна густым, прапітым голасам сказала:

— Баста. Хачу спаць. Давай пачастуй кавай ды пайду.

Было каля дзвюх гадзін ночы. «Аўтобусы не ходзяць. Калі яе муж не прыехаў да гадзіны, можна быць спакойным да шасці».

Выпілі ўсё віно. Люда прынесла кафейнік і маленькія кубачкі.

— Натуральнага ў горадзе няма. Бурду п'ём...

— Цудоўная кава. Ах, і пах прыемны,— спяшаўся пахваліць гаспадыню Сава.— У вас тут хораша... вы ветлівыя. Усё добра.

Ніна крыва ўсміхнулася, схавала ў кішэню халата пачак «БТ», запальнічку і пакінула мяккае скуранае крэсла.

— А колькі атрымоўвае асістэнт рэжысёра?

— Як вам сказаць,— разгубіўся Сава,— сто пяцьдзесят рублёў ды плюс яшчэ сутачныя, плюс прэміяльныя, пастановачныя пасля здачы фільма ў Маскве. У сярэднім дзве сотні выходзіць.

— Такая цяжкая работа. Я думала ў вас вялікія грошы,— расчаравана сказала Ніна.

Люда правяла сяброўку да дзвярэй, і там яны аб нечым яшчэ пашапталіся.

Сава тым часам хутка і непрыкметна адчыніў дзверы ў спальню. Нікога. Дзверы ў трэці пакой былі зачынены. Гэта насцярожыла Саву, і ён спытаў:

— А там ёсць хто-небудзь?

— Не думала, што ты такі асцярожны.

— Проста беражонага бог беражэ.

— Там спіць мая маці. Яна хворая, без снатворнага не засынае. Зараз спіць моцна, ключ у мяне. Вось бланкі справаздач. Позна. Я пасцялю табе на кушэтцы, а ў шэсць раніцы пабуджу. Не рана? — казала Люда, рассцілаючы на кушэтцы прасціну.

— Добра. Выезд на змену ў нас у сем раніцы.

— Не высока табе падушка? Як ты любіш?

— Папраўдзе, дык я люблю засынаць на руцэ у жанчыны.

Яна ўсміхнулася.

— З табой, бачу, сумаваць не прыходзіцца.

Люда пайшла ў ванную, як бы знарок не зачыніла шчыльна дзверы. Яркая палоска святла падала з ваннай на сцяну калідорчыка, забіраючы ўсю яго ўвагу. Рэзка, непрыемна-палахліва забарабанілі краны, потым стала ціха, і ў гэтай цішы пачуўся шум вады.

Сава выключыў таршэр і па-кашачаму падкраўся да дзвярэй ваннай. Асцярожна зазірнуў туды. Люда стаяла пад душам спінай да яго, калі ж, адчуўшы яго позірк, павярнулася, дык ён не заўважыў на яе твары абурэння, наадварот, яна як бы з дакорам усміхнулася:

— Бессаромнік. Нядобра падглядваць.

Яму падалося, што калі яна будзе праходзіць міма, дык абавязкова сядзе на кушэтку, аднак ён памыліўся. Люда ў доўгай да пят начной сарочцы пайшла ў спальню і зноў пакінула і туды дзверы адчыненымі. Адтуль данёсся моцны прыемны пах крэма і лёгкі пах духоў. Сава павярнуўся на сваёй кушэтцы.

— Не спіцца? — адгукнулася яна.

— Не магу заснуць. Халаднавата.

Праз мінуту яна прынесла танюсенькую коўдру і сама накрыла яго, як маці малое дзіця. Яе твар, рукі былі зусім блізка, ён амаль уткнуўся тварам у яе пышныя грудзі. Моцна ўхапіў яе за руку і пацягнуў да сябе.

Люда не ўпіралася, падалася целам да яго. Ён хутка прыпаў да яе гарачых вуснаў. Яна выслізнула з яго абдымкаў, але рукі не выслабаніла.

— Не трэба тут. Хадзем у спальню,— як быццам просячы прабачэння, сказала яна.

Яны, трымаючыся за рукі, накіраваліся ў спальню...

— Любі мяне, любі,— аўтаматычна казала Люда,— яшчэ пабуду так... табе не цяжка, ты скажы...

— Ды не, не,— адказваў ён, адчуваючы, як кроў прылівае да яго галавы.

Яна нахінулася да яго і цяжка дыхала яму ў вуха. Пачуўшы званок, яны адразу і не ўцямілі, што гэта званяць да іх.

Сава апамятаўся першы, падбег да дзвярэй, прыпаў да «вочка» і ахнуў. Ён бачыў пагоны вайскоўца. Зашпільваючы на хаду халат, падышла да яго і Люда.

— Муж... там пагоны. Куды мне? — ледзь чутна шаптаў, нямеючы ад жаху, Сава.

— Сюды! У пакой да маці! — Яна адчыніла дзверы.

Сава паспеў прыхапіць з сабой вопратку, толькі туфлі засталіся ў ваннай. Ён пра гэта ўспомніў і сказаў ёй:

— Туфлі, туфлі ў ваннай. Мае туфлі.

Люда ўжо адчыніла дзверы, не звяртаючы ўвагі на яго словы.

— О-го, віно? Кава? Нехта быў? — муж яе быў вельмі п'яны і яна з палёгкай уздыхнула.

— З Нінай сядзелі. А дзе гэта ты так назюзюкаўся, га?

— Радавалася б, што муж на выхадныя вырваўся. А чаго пасцель на кушэтцы?

— Маці звечара ляжала. Кепска ёй было. Я баялася яе адну ў пакоі пакідаць.— Люда адказвала спакойна.

— А... Пагляджу, дык ты і не рада мне.

— Чаму радавацца? Налізаўся як апошняя свіння, ледзь на нагах стаіш.

— Адчыні акно, задыхаюся. Накурылі тут, дыхаць няма чым,— прасіў муж.

— Дык хто ж гэта цябе пачаставаў так?

— У Пятра Коласа. Самагон мне не пайшоў. Ты ж ведаеш, мой арганізм... мне трэба піць нешта адно,— казаў муж, трымаючыся сваімі валасатымі рукамі за жывот.

— Пі, пі... нажывеш цыроз, як твой брат,— дакарала Люда.

— Усё, не травi душу. Завязваю, усё. Ратуй мяне. Паміраю.

— Старая песня. Кладзіся спаць, у мяне заўтра суботнік.

— Не магу ні стаяць, ні ляжаць. Усё кругом гойдаецца. Муціць. Дай расолу.

— Раджу табе? Ты ж усё яшчэ перад зборамі выпіў: і расол, і грыбок, і ваду з акварыума.

— О, грыбок! Гэта маё адзінае ратаванне. У маці на падаконніку стаіць грыбок. Прынясі, богам прашу.

— Ты што, ачумеў? Яна з такой цяжкасцю заснула, аж тры таблеткі снатворнага выпіла. Гэта амаль смяротная доза. Пашкадуй яе. От кладзіся спаць. Чаю дам.

— Ідзі ты... са сваім чаем! Памру я, Люда, без грыбка. Яшчэ ніколі не было мне так блага. Пячэ вось тут.— Ён паказаў на свае шырокія грудзі.— Унутры гарыць усё, як у домне. Згару я ад гэтага праклятага самагону. Пабудзі маці... Нясі грыбок! Гэта адзінае, што мяне ўратуе.

— Не! — Люда загарадзіла дарогу да дзвярэй сваім пышным целам.

— Яна будзе спаць. Мы паціху... возьмем, і ўсё... я ёй лекі дастаў. Дэфіцыт. Прашу, адчыняй дзверы, нясі грыбок.— Бачна было, што ён не саступіць.

— У мяне няма ключа. Усё. Пашкадуй хворага чалавека. Я завару табе моцны чай.

— Ды чай твой як мерцвяку прыпарка. Кажу я табе, памру... грыбок трэба. Я дам ключ. Вось,— ён палез у кішэню.

— Як? Адкуль ён у цябе?

— Я зрабіў сабе ў цэху запасны, на ўсялякі выпадак,— прызнаўся вінавата муж.

— Дык вось чаму так часта і невядома куды знікала ў маці частка пенсіі? Зладзюга. Дваццаць восем рублёў у машы пенсія, а ты... рабаваў хворага чалавека, спісваў усё на яе склероз. Прызнавайся, кат? — строга патрабавала жонка.

— Не да таго цяпер! Я браў часам рубель на піва, браў! З палучкі аддам. Паміраю, няўжо не бачыш. Нясі грыбок,— маліў ён.

— Гэтага не будзе ніколі! — І яна выкінула ключ у адчыненае акно.

— Ты звар'яцела! Пусці, я выламаю дзверы! Чумічка, пусці.

Яна зразумела, што яго цяпер не ўтрымаць.

— Стой! Сядай! Мінуту. Супакойся! Я не магу цябе туды пусціць. Там... у маці... мужчына.

— Як? Хто?!

— Ён прыйшоў да яе... сватацца.

— Як? Яна ж ледзьве ногі валочыць?

— Любоў зла. У рэшце рэшт гэта яе права. Гэта яе жыллёвая плошча. Ты сваю кватэру яшчэ не атрымаў. Сядзі моўчкі. Я зараз пайду да Ніны і прынясу табе расолу. Сядзі і не рыпайся, я буду праз тры мінуты.

Люда выйшла. П'яны не стаў чакаць і мінуты, падышоў да дзвярэй і ціха пастукаў:

— Гэй, таварыш? Друг! Чуеш? Прашу цябе, як мужыка, ты не спіш, таварыш? Падай мне там на падаконніку ў слоіку грыбок пад марляй...

За дзвярамі маўчалі, і тады п'яны муж пачаў падбіраць да замка ключ.

Такога Сава не чакаў, яму нічога не заставалася, як адчыніць акно і паспрабаваць па вадасцёкавай трубе пакінуць

кватэру. Было, калі глянуў уніз, высока, але ж выйсця інша-га не было. У спешцы, адчыняючы акно, Сава зачапіў локцем слоік з грыбком, які ўпаў на падлогу і разбіўся.

Дзіўна, але ж маці Люды па-ранейшаму беспрабудна спала. Відаць, усё ж перапіла снатворнага.

— Ты што зрабіў? Адказвай? — насцярожана і патрабавальна спытаў муж Люды.— Ты разбіў грыбок? Адчыняй дзверы, сабака!

Сава нічога не чуў. Як толькі ён дакрануўся голымі пяткамі да зямлі, даў такога дзёру да гасцініцы, што, бадай, не знайшоўся б сабака ў Мазыры, каб яго дагнаць. Толькі ля гасцініцы Сава зрабіў перадышку, бо надта ж моцна калола пад лыжачкай. На ганку ён лоб у лоб сутыкнуўся з Чакатоўскім, які ў сваім цёмна-зялёным бушлаце і кірзачах ішоў на рыбалку.

— Адкуль гэта ты? — здзівіўся брыгадзір, гледзячы на босыя ногі свайго асвятляльніка.— Не інакш, як ад бабы? Муж застукаў? Прызнавайся!

Сава, як вінаваты вучань, апусціў галаву.

— Та-ак,— зацягнуў Чакатоўскі,— запомні на ўсё астатняе жыццё: выступай заўсёды на сваёй палавіне бою альбо на чужой тэрыторыі і ніколі не ідзі, як ні будуць прасіць, да іх на кватэру. Мая табе парада. Пакуль малады, саплівы, вучыся. У бабе сядзіць больш д'ябла, чым анёла. Клоун... Тваю маць... Добра, што яшчэ жывы, а туфлі купіш, не шкадуй. Аць... прыткі салага.

Сава маўчаў, думаючы аб адным, толькі б Чакатоўскі нікому не расказаў, ды не ўзнялі яго ў групе на смех.

Спаў да вечара. Вячэраць не пайшоў, здавалася, што ўжо ўся гасцініца ведае аб яго прыгодах. Пазванілі. Ён не рызыкаваў, не паднімаў тэлефонную трубку. Праз гадзіну зноў пазванілі. На гэты раз быў міжгародні званок. Званіла Галіна. Ён адказваў на яе скупыя пытанні суха: «Экспедыцыя праходзіць нармальна. У першыя ж выхадныя буду ў сталіцы. Горад сумны. Перыферыя. Хрушчоўскія пяціпавярховыя домікі — вось і ўсе небаскробы. Мост, царква... а ў асноўным прыватны сектар. Многа зеляніны». У канцы гаворкі, калі тэлефаністка папярэдзіла: «Заканчвайце. Час размовы выйшаў», ён спытаў, як яна? Яна паспела адказаць, што добра, што паступіла на падрыхтоўчыя курсы ў інстытут народнай гаспадаркі.

Сава нават быў рады, што дысцыплінаваная тэлефаністка прыпыніла іх размову, бо ні гаварыць, ні чуць, ні бачыць нікога яму не хацелася. Ён здзівіўся, як тое, што па-

чыналася і было паміж імі на хутары, недзе цяпер далёка ад яго, і сэрца неяк па-асабліваму заныла. Але раптам ён падумаў, што там, у Мінску, без яго і да яе ж могуць чапляцца і нават праводзіць хлопцы. «Не. Трэба праверыць. Нельга яе надоўга пакідаць адну». Жыццё, як любіць казаць Лявон, настолькі непрадказальнае, што ён баіцца быць упэўненым у чым-небудзь дарэшты.

Асістэнт Жабакрык «вырваў», прывёз на здымкі капрызную маскоўскую «зорку» і два дні хадзіў героем, адно хіба здзіўляючыся, чаму яму не звоніць Люда. Сава маўчаў пра свае начныя прыгоды. Нарэшце ў суботу нецярплівы Лявон вырашыў без званка ісці на вуліцу Будаўнікоў. Тады Сава, чырванеючы, прызнаўся Лявону ва ўсім і паведаміў нават пра сустрэчу з Чакатоўскім.

— Калі па шчырасці, дык я не дарую тым, хто забірае маіх жанчын,— гаварыў Лявон,— але табе пашчасціла, яна не паспела заваражыць мяне. Гэта прымітыўная прастытутка, якая гуляе без мужа раз у месяц, у паўгода. А я думаю, чаго гэта ты кеды не здымаеш, а туфлі, аказваецца, там пакінуў. Ну і зух. Пашчасціла, што паверх невысокі. Памятнае хрышчэнне.

Лявон у адрозненне ад астатніх яшчэ ўмее і дараваць. Баба ніколі не заменіць мужчынскага сяброўства, нават калі яна будзе знешне, як Брыджыт Бардо, сексуальнай, як Сафі Ларэн, і тонкай, як Вініцка. А тут звычайная перыферыйная б... Забудзем.

Сава павесялеў:

— А як думаеш, Чакатоўскі не выдасць? Хаджу бы жабу праглынуў. Не хочацца быць пудзілам.

— Дзед — міравы чувак. Ён і сам яшчэ зусім нядаўна перажыў моцную драму кахання. Паступова адыходзіць. Разумее ўсё. Будзе маўчаць.

— Ты кажаш, ён і сам перажыў драму кахання? Няўжо ў яго ўзросце? — не верыў Сава.

— Тады ён быў маладзейшы. Гэта за апошні год здаў, захірэў. Бабам ён цану ведае. Пры выпадку пастаў яму бутэльку гарэлкі, ён успомніць, варта паслухаць. Цікавая гісторыя. Каб рэжысёры-рамеснікі не праслаўлялі ўвесь час нашы працоўныя будні, дык даўно можна было зняць фільм пра Чакатоўскага. Я б зняў, дык мне не дадуць... пакуль не дадуць. Лявон яшчэ здыме сваё кіно... закончу інстытут і буду дамагацца. Я ім пакажу хлопчыка на пабягушках. Заўтра ў нас сцэна «Купанне», і што? Без мяне памочніца крутанула задам, і нікога не знайшлі... хацелі

званіць натуршчыцы. Лявон прыехаў, два званкі, і дзве мясцовыя дублёркі гатовы за пяць рублёў не толькі голымі зняцца, але і ў ложак да рэжысёра. Вучыся, пакуль я жывы.

Сава пасля гэтых слоў яшчэ больш стаў паважаць свайго куміра. Заставалася адно: аддзякаваць за маўчанне Чакатоўскаму.

Захварэла неба. Дзень і ноч ліў дождж.

Здымкі часова адмянілі, далі групе незапланаваныя выхадныя дні. Засумаваў без работы і рыбалкі Чакатоўскі. Неяк клікнуў Саву, даў пяць рублёў і папрасіў прынесці ў нумар бутэльку «Зуброўкі». «Толькі, каб як мыш, каб ніхто не прыкмеціў»,— наказаў ён.

Саву хацелася ўслужыць свайму кіраўніку, хоць ён ужо і перадумаў звязваць свой далейшы лёс з асвятляльнікамі, меўся (так было ў планах) пайсці на наступны фільм адміністратарам, на што яго «сватаў» і Лявон.

Брыгадзір запрасіў сесці, пачаставаў гарэлкай, выпіў сам, доўга жаваў сала, адчыніў акно і закурыў едкую «Прыму». Настрой у яго тужлівы. Сябра ў групе ў Чакатоўскага не было.

— Падабаецца табе наша прафесія? — спытаў ён, гледзячы ў акно.

— Падабаецца.

— Ай, басяк. Бачу, што не падабаецца. Ды бог з табой. Жыццё доўгае. Не курыш?

— Не.

— Ну, а бабы падабаюцца?

— Як сказаць,— Дым не ведаў, што адказаць.

— Падабаюцца. На талковых баб мне ніколі не шанцавала, на б... шанцавала. Можа, сярод іх і няма талковых? Я ўжо гадоў пяць, як з кірмашу еду — што гэта значыць? А тое, што больш думаю пра духоўнае, царкоўнае, а не пра зямное, грахоўнае. У твае гады я пакахаў адну... усёй душой, як кажуць. Яна старэй за мяне была. Удава. Чалавека свайго з фронту да пяцьдзесят трэцяга года чакала. Ростам я ўдаўся. Нічога малец быў. Першы на сяле. Толькі на гармоніку граць не ўмеў, а так па гаспадарцы, у полі... падэшвы адрываў. Бацька мой застаўся ляжаць пад Варшавай. Маці захварэла. Усё на мне трымалася. Надумаў я ажаніцца. Мая, сустракаліся мы тайна, і кажа, а не будзеш пасля шкадаваць? Не будзеш дакараць першым? Не буду, адказваю. Сышліся. Вырашылі пажыць без роспісу... жывём месяц, два, тры... Маці мне перад сваёй смерцю і кажа, маўляў, так у нашых людзей не заведзена, трэба па-

вянчацца. У царкву я не пайшоў. Камсамольцы тады акурат вялікую барацьбу з папамі вялі. Распісаліся мы ў сельсавеце. Хутка і дачка нарадзілася. Гаспадарку памалу падымалі, пакуль Хрушчоў з падаткамі не прыйшоў. А тут, не паверыш, вяртаецца ў сяло яе першы... аказалася, што ён не загінуў, а сядзеў у лагеры, лес валіў. Усё адразу змянілася, як сурочылі. Ляжым у ложку, бывае сярод ночы прачнуся, пытаю, спіш? Не, адказвае. Я ўжо праведаў, што яна да яго на край сяла ходзіць. Трэба ён табе, пытаю? З дачкою возьме? «Возьме»,— адказала яна. Адпусціў я тады яе з богам. Вокны ў хаце забіў і падаўся ў горад. Прыбіўся да кінастудыі. Не надта, каб і ўбіваўся... і да дачкі не цягнула, мо з таго, што не выхоўваў. У горадзе пазнаёміўся з адной. Навучаны быў... кажу, распісвацца не буду. Прыеду з камандзіроўкі... яна адагрэе, прыгалубіць... месяц жывём душа ў душу... адчуваю, зноў мяне дарога цягне. Пілі тады па-чорнаму. Сілы былі маладыя. Здымалі аднаго разу ў Вярхоўным Савеце, на такія мерапрыемствы, вядомая справа, вопытных, лепшых асвятляльнікаў пасылаюць. Зранку мне так моташна было... хоць удавіся... чакаў, як бы апахмяліцца. У буфеце там каньячок быў. Хлабыснулі ад душы. Сяджу задаволены такі ля трыбуны, кімару. Выступаюць дэлегаты, без канца галасуюць... а мне і справы няма. Заканчвалі. Пераносіў я асвятляльны прыбор. Апаратар папаўся працівны, хацеў выслужыцца, каб званне далі, усё першага сакратара здымаў. Мяне ў духаце размарыла, ногі заплятаюцца, зачапіўся я і перад самай трыбунай ляпнуўся носам аб падлогу. Таўхнуў апаратара, і той таксама ўпаў. У зале смех! Ніхто на выступаючага міністра ўнутраных спраў і ўвагі не звяртае.

А я, паверыш, не магу ўстаць, няма сілы, ды і жадання... так бы, здаецца, з асалодай гадзіну, другую паспаў.

Падбеглі асвятляльнікі, кагэбіст, паднялі апаратара, мяне... У зале рогат. Можа, калі б выступаў не міністр унутраных спраў, усё б і абышлося...

Уляпілі б вымову па прафсаюзнай лініі, і што? Начхаць! Наш прафсаюз г..., аўтарытэту не мае.

Але націснулі на нашага міністра па кінематаграфіі і мяне без дапамогі выкінулі на вуліцу. Пасля гэтага я стаў спачуваць беспрацоўным у капкраінах. Куды, думаю? Дыплома ж не маю, а кіно прывучыла брадзяжнічаць, на рэжымную работу не цягне, і не зможаш пасля кіно на заводзе ці на фабрыцы.

Адзін знаёмы па кінастудыі дырэктар узяў мяне да сябе

ў намесніку ў матэль, які пабудавалі на манер Захаду. Лічыўся я ў яго за вартаўніка, адміністратара і садоўніка.

Сезонная работа: са снежня па сакавік у адпачынку. Была там у суседняй вёсцы прадаўшчыца адна, мы ў яе гарэлкай атаварваліся. Мой начальнік быў вялікі спецыяліст мухлявацъ. Заснаваў у матэлі маленькую падпольную базу па перапродажы дэфіцытных тавараў. Рэфрыжэратары з поўначы на поўдзень штодня ездзілі. Я матацыкл купіў. Раз — і ў вёску да прадаўшчыцы. Гарачая была. Пустых размоў не любіла. Я ад яе, паверыш, ніводнага разу не пачуў сваё імя. Далібог, ніколі не сказала: «Ваня, я цябе кахаю, ці, Ваня, пацалуй мяне». За два гады так імя свайго ад яе і не пачуў. Жалезны Фелікс, а не баба. Выпіць любіць. Я на сваім драндулеце ледзь не разбіўся. Бачыш, шрам на лбе. Не ад дзіга, а з тых часоў гэта. Прагарэў трэст майго начальніка. Стаяла глыбокая восень. Застаўся я ў двухпавярховым матэлі адзін. Тэхнічка ў дэкрэтны водпуск пайшла. Запісаў я ўсю гаспадарку на сябе, думаю, пасяджу да сакавіка і з'еду. Стукнула мне тады сорак восем гадоў. Старасці яшчэ не здаваўся. Давай вып'ем яшчэ. Ты сала бяры, не саромейся.

Дык вось... тут і выпала мне сустрэцца з ёй.

Чакатоўскі нарэзаў сала, падзяліў плаўлены сырок на дзве роўныя часткі.

— Нечакана бог паслаў мне гэтае самае пачуццё, якое сярод людзей называюць каханнем. Калі кніжкі там розныя чытаў, сябе з героем параўноўваў і думаў, што ён, дурань, маецца, прыйдзі да яе, выпі і ў люлю. Дурната ўсё, лічыў. Яна прыехала ў матэль на спадарожнай. Пашпарта ў яе не аказалася. Ён у яе быў, як я потым даведаўся, але яна схавала. Шафёра, які яе прывёз, я пасяліў на першым паверсе, а яе — на другім. Розныя выпадкі бывалі. Прывязе які гаўрык з сабой палюбоўніцу, такі ўжо добранькі, чырвонец падае, толькі пасялі іх у адзін нумар. Гэты быў да смерці стомлены, яму не да баб было. Раніцай адзін і паехаў, не стаў чакаць яе. Я, праўда, пастукаў, кажу, таварыш ад'язджае. Яна маўчыць. Я да яго, маўляў, барышню не бярэш? Ён жартуе, табе, кажа, пакідаю. Яна не выйшла: «Перадумала, дзед».

Мяне гэта яе «дзед» вельмі пакрыўдзіла. Так засталіся мы ўдваіх. Падрыхтаваў я снеданне, запрасіў яе. Галодная была. Умалаціла ўсё адным махам.

«Не прагоніце мяне, Іван Васільевіч?» — спытала так даверліва.

Не, кажу, Аксана, не праганю. А сам рады, усміхаюся, як дурань. Дзень, кажа, другі пажыву. Грошай няма. Я, кажа, бацькам тэлеграму дам, яны прышлюць.

Я нічога ў яе не пытаў. Сама прызналася, што працуе ў сталіцы экскурсаводам. Я паверыў. Была яна прыгожая, калі не сказаць надта прыгожая. Праўду кажу, у многіх бог забраў, каб ёй даць. Я і сам не ведаю чаму, прыфранціўся, апрануў белую кашулю. Дастаў са старых запасаў свініну, зрабіў царскія адбіўныя. Нясмела прапанаваў выпіць. Заўважыў, вачыма так мяне і свідруе ўсяго. Насцярожылася. Разліваю я і бачу, што ў адной шклянцы муха плавае. Пачырванеў я, як пацан, даруйце, кажу, няма гаспадыні, дык і мухі плаваюць. Бяру шклянку і выліваю ў куток. Яна ў адказ: «Навошта. Дасталі б муху, і ўсё дзела». Тады я і падумаў, ты не экскурсавод, ты з простых, з нашых. Яна выпіла, не крывілася. Дзень жыве, два, пяць. Я маўчу. Бачу, месца сабе не знаходзіць. Я сарочкі, шкарпэткі кожны дзень мыю. Пры гальштуку іду сустракаць рэдкія машыны. Па два разы на дзень галюся. Яна заўважыла гэтую ўва мне перамену. Выйшла неяк усё само па сабе. Цвярозыя былі. Паверыш, сэрца маё ніколі не падавала такіх сігналаў ласкі і пяшчоты, як тады. Наш брат звычайна як? Зрабіў сваю справу і на бакавую альбо ў дзверы і да сябе. А я, як хворы... сяду побач, вазьму яе руку і гладжу, гладжу... Нейкія і словы цёплыя знаходзіліся. Як паэт які. Тады ўпершыню падумаў, што каханне, гэта калі не сорамна перад жанчынай за сваё прыніжэнне, рабства. Душа спявала. Бачу, і ёй прыемна са мной. У яе пальчыкі былі тоненькія, мяккія. Не ведаў я, як аддзякаваць бога за гэтыя райскія дні. Тады яна і прызналася, што апошнія паўгода нідзе не працуе, што зараз дабіраецца да бацькоў у Лельчыцкі раён. Бацькі звярнуліся ў газету, не ведалі, дзе яе знайсці, ці жывая яна? Як паехала на будоўлю, дык і згінула. Бачу, што яна перажывае, сорамна ёй перад бацькамі. Я праўда нічога ёй не раіў, баяўся, што напалохаю. Кажу, заставайся, будзь жонкай. Яна ўсміхнулася. Кажа, што ў яе і пашпарта няма. Што заўважаць пачаў: бяжыць па шашы рэфрыжэратар, яна да акна альбо сядзе ў крэсла, абхопіць рукамі калені і моўчкі сядзіць гадзіну, дзве, курыць цыгарэту за цыгарэтай. Я маўчу. А ў самога сэрца разрываецца ад дагадак. Неяк, бралася ўжо змяркацца, я нават дзверы замкнуў, падрулій да параднага блакітны рэфрыжэратар. Малады хлопец гадоў, можа, трыццаці. Пастукаў у дзверы. Бачу, ён шарыць сваімі чорнымі вочкамі ў адзін бок, у другі, круціць свае вусікі, як

бы шукае каго. Дастаў пляшку віскі, прапанаваў мне з ім выпіць. Думаю, вып'ю, бо не адчэпіцца, я такіх жучкоў ведаю.

Ён налівае мне паўнюткую шклянку. Тут уваходзіць Аксана і кажа: «Веня, не прымушай піць чалавека. Я перад табой, што табе трэба, кажы?» Ён, убачыўшы яе, узрадаваўся, падбег, пацалаваў руку, пасадзіў да стала, дастаў з сумкі цукеркі, джынсы. Вазьмі, кажа, табе вёз. Я, кажа, помню свае абяцанні, кажа, колькі часу цябе шукаю на ўсіх дарогах. Запрасіў яе выпіць. Аксана адліла віскі з маёй шклянкі ў сваю. Веня падаўся мне нахабным, непрыемным. Уключыў магнітафон і запрасіў яе на танец. Божа, мая душа круватачыла. Я не глядзеў у іх бок, баяўся, што магу ўхапіць нож ды ўсадзіць яму ў спіну. Не ведаю, што ён гаварыў ёй на вуха. Яна пайшла да сябе, замкнула дзверы. Доўга я змагаўся са сном. Чуў, як ён падышоў да дзвярэй, прасіў яе адчыніць, яна не адчыніла. Пад раніцу я ўсё ж заснуў. Прачнуўся... Аксаны не было... Яна збегла з Венем. Я сеў і заплакаў. Упершыню ў жыцці плакаў з-за бабы. Табе гэта яшчэ незнаёма. Вы, сённяшнія маладыя, як бы на льготных умовах знаходзіцеся. Вам усё лёгка даецца. Я выходзіў на шашу. Цяпер гэта смешна. Шукаў яе ў кабінах машын. Супакойваў сябе тым, што яна прастытутка і што не разумее, што ёсць душэўны боль. Неяк я чытаў Святонія пра жыццё рымскіх цэзараў. Дык вось там адзін Калігула адбіў жонку ў сенатара і вельмі яе любіў. Я не верыў, думаў гэта немагчыма, што можна любіць адну, першую... аказваецца, не... Жыццё, космас, рух душы не паддаюцца сістэме. Душа — калодзеж хаосу жаданняў і страсцей, якія зрэдку, толькі ў час кахання, прыходзяць у гармонію. Мне зрабілася жахліва, бо мною кіравала злосць на каханне. Святое прасвятленне праз любоў дадзена перажыць кожнаму, але не кожны пасля гэтага робіцца святым. Не стаў ім і я. Я ачарсцвеў, панік і ўзненавідзеў жанчын. Але і ў затворніцтве цяжка. Жаданне прыдаўлена, пад прымусам. Абдымаючы жанчын, цалуючы іх — я ўнушаў, што ўсё міне. Будзь асцярожны. Каго ні пачытаю, усе пішуць пра трагедыю кахання Сарэля, Рагожына, Дзмітрыя Карамазава, Рамэо...

— Дык што? Лепш нікога не любіць? — спытаў Сава.

— Любі. І манах няшчасны без жанчыны. Але ўспрымай жыццё як уваскрэсенне і паміранне ў кожным дні. Я вар'яцею, калі спрабую прааналізаваць усяго толькі адзін дзень. Нейкая абракадабра атрымоўваецца: сотні сустрэч і развітанняў, патрэбнае, непатрэбнае, абавязковае, неабавязко-

вае. Усе гэтыя домыслы розных пісак пра сэнс жыцця здаюцца мне гноем пры аналізе аднаго дня. Не спрабаваў разабрацца ў сваім такім дні? А потым запытай сябе, што пасля яго засталося?

Мне смешна, калі пачынаюць празмерна сур'ёзна гаварыць пра чалавека.

— А што ж тады вас радуе?

— Воля! Прырода... І ўсё. Кажуць, вянец прыроды — каханне мужчыны і жанчыны. Магчыма. Я не прымаю. Бруд, здрада, крывадушша — вось чым кішаць душы людскія. Я прыняў гэта як аснову. Прымі і ты.

— І мне будзе лягчэй жыць, калі я не буду нікому спачуваць?

— Жыць заўсёды цяжка, бо ведаеш фінал. Але жыць будзе весялей, калі да ўсяго будзеш ставіцца з іроніяй. Не павялічвай пакут — яны ідуць самі разам з хваробамі, смерцю блізкіх, родных, не патрабуй ад людзей і света дасканаласці. Цьфу, глупства, пане дабрадзею. Гляджу на цябе, панік зусім. Начны матылёк перад вачамі? Забудзь. Колькі іх яшчэ ў цябе будзе. Выпі і забудзь.

Чакатоўскі выпіў і зноў закурыў.

Брыгадзір памыляўся. Сава думаў аб Галіне. Нечакана яго вельмі пацягнула да яе, аж здзівіўся. Чаму ён раней не дабіваўся большага ў іх адносінах? Усяго? Быў нявопытны? Сарамлівы?

Да Чакатоўскага прыйшлі асвятляльнікі, прынеслі дзесяць бутэлек піва і воблу. Селі гуляць у карты. Запрашалі і Саву. Сава быў навучаны: гулялі на грошы і яму аднойчы давялося нават пабудзіць адміністратара, папрасіць у яго пяць рублёў і аддаць картачны доўг. Пасля такой знявагі Сава гуляць адмаўляўся. У яго кішэні быў рубель і трыццаць капеек, а да сутачных заставалася яшчэ тры дні. Чакатоўскі другі год вёў марную перапіску з прафсаюзамі, міністэрствамі і камітэтамі, каб сутачныя ўраўнялі, каб усе атрымоўвалі па два рублі шэсцьдзесят капеек, збіраў нават калектыўныя подпісы, ды нічога не магло прабіць пастановы, прынятыя, як аказалася, яшчэ ў трыццатыя гады. Сава ўпершыню ў жыцці адчуў, што такое голад. Асвятляльнікі адразу прапівалі сутачныя грошы і пераходзілі на салянку, кільку, плаўленыя сыркі, чай.

Сава зайздросціў акцёрам, пастаноўшчыкам, аператару, мастаку, дырэктару, якія кожны вечар сытна елі ў рэстаране. А як іх сустракалі афіцыянткі, як глядзелі на іх з кухні повары, паказвалі на іх пальцамі як на заморскае дзі-

ва. Нават Лявон не сядзеў з галоўнымі «тварцамі» за адным сталом. Ён браў пяць бутэлек піва, ішоў у куток, да дзвярэй на скразняк.

Не, асвятляльнікі — гэта самая непрэстыжная прафесія. Надрывацца пятнаццаць гадоў за семдзесят рублёў і ў лепшым выпадку перад пенсіяй дайсці да брыгадзіра? Не... гэта не для яго. У Мінск! Там будзе бачна, куды кіравацца. Лявон абяцаў садзейнічаць.

Дым Галіне на вочы не паказаўся, схітрыў, вырашыў яе праверыць. Падняў каўнер паліто, надзеў чорныя акуляры і, дачакаўшыся закрыцця кафэ, пайшоў услед за дзяўчынай. За Галяй увязаўся курсант вайсковага вучылішча. Сава недзе глыбока ў душы ўзрадаваўся — пры выпадку нагадае ёй пра курсанта. Ён ішоў па процілеглым баку вуліцы, не выпускаючы іх з поля зроку.

Курсант трымаўся прыстойна.

«Та-ак. Відаць, зялёны салага. Баіцца нават за руку ўзяць». Некалькі мінут яны стаялі каля форткі. Яна першай падала яму руку на развітанне. На гэтым іх спатканне і завяршылася. Галіна зачыніла за сабой дзверы. Курсант зняў фуражку і сігануў у бок Севастопальскага скверу да вучылішча. Дым пералез цераз плот і пастукаў у знаёмае акно.

— Сава, ты?

— Канечне, я,— бадзёра адказаў ён.

— Пачакай, я выйду.

— Не трэба. Пусці мяне да сябе. Адчыні акно.

— А калі цётка пачуе? Лепш я выйду.

— Не. Не пачуе. Я ціха. Адчыні,— у ягоным голасе загучала патрабавальнасць.

— Не трэба ўсё ж, прашу цябе.

— Ты не рада мне? Мо знайшла кавалера?

— Рада.

— Тады адчыні.

— Я цёткі баюся.

— Не бойся. Я ж не чужы.

Пакойчык быў маленькі: ложак, столік, у кутку шкап, крэсла. Сціпла, проста. Ён абняў яе, пацалаваў.

— Чакала?

— Так.

— Я не мог раней. Я да цябе ляцеў самалётам. Сумаваў. Ты як быццам не рада?

— Рада. Толькі баюся, што цётка пачуе.

— Табе з цёткай жыць ці са мной?

— Усё ж баюся.

Ён зноў прытуліў яе да сябе, пацалаваў яшчэ з большай пяшчотай.

— Ластаўка мая... Я ж ніколі цябе не пакіну і нікому ніколі не аддам... каб ты ведала.— Сава зняў з яе сукенку, яна стаяла нібы ўкопаная, разгубленая, не ведала, што рабіць. Ён пасадзіў яе на ложак, сам сеў побач. Яна прытаіла дыханне, задрыжала.

— Я баюся, Сава.

— Чаго, міленькая?

— Усяго.

— Не бойся.— Ён супакойваў яе пяшчотнымі словамі, бесперапынна цалаваў шыю, грудзі, рукі, вочы, вусны... І яна не вытрымала, падалася да яго, горача абдымаючы і адказваючы ласкай на яго пацалункі...

Раніцай яна прачнулася першая і доўга не рашалася пабудзіць яго. Калі ж, счакаўшы, пакуль збярэцца на працу цётка, яна апранулася і хацела выйсці на кухню, Сава хітра прыжмурыў адно вока і гулліва сказаў: «Куды гэта мы ўцякаем?»

— Мне падалося, калі ты спаў, што ты далёка-далёка ад мяне і разлюбіў,— шчыра і з нейкім сумам у голасе сказала яна, нахінуўшыся да яго шчакі.

— Якая ты ў мяне наіўная дзяўчынка. О, як я чакаў нашай першай ночы.

— Я прынясу снеданне.

— Давай. Як у буржуйскіх фільмах — у ложак. Я галодны, як егіпецкі раб. Дарэчы, ты ведаеш, чым іх кармілі на будоўлях пірамід?

— Не.

— Рэдзькай.

— Я цябе пачастую смажанай свінінай з памідорамі і чырвоным перцам.

— О, як на возеры Рыца. Давай. Я гатовы з'есці тону. Не хочацца вяртацца ў галодны Мазыр.

— Гэта праўда?

— Так.

— Тады, можа, застанешся? Можа, знойдзеш работу без камандзіровак?

— Паглядзім. Мне адзін чалавек абяцаў уладкаваць адміністратарам. Клёвая работа і чыстая. А чыё піва?

— Цёткі.

— Давай шахнем. А ёй скажаш, што мышка бегла і хвастом махнула.

— Добра. Так і скажу. Адкрывай.

У іх быў цудоўны настрой. Галіна піва не любіла, выпіла трошкі.

— А гэты фраер, курсант, часта цябе праводзіць дадому? — спытаў як пра нязначнае, малаважнае Сава.

— Прыліп. Ты бачыў?

— Я ішоў за вамі. Ад мяне будзе цяжка што-небудзь утаіць.

— Ты ішоў за намі? І не пазваў? Ён не верыць, што ў мяне ёсць ты. Чаму ты не спыніў нас?

— Навошта палохаць чалавека. Я ўпэўніўся, што ты дзяўчына сціплая, і мне гэта прыемна. Але лепш будзе яго адшыць. Далікатна так. У цябе калі выхадны дзень?

— Сёння.

— Цудоўна. Лявон, мой новы знаёмы, запрашае ў рэстаран на свой дзень нараджэння.

— Трэба ж купіць падарунак?

— Навошта. Цяпер цяжка ўгадзіць. Дамо ў канверце чырвонец... ну, два... У цябе ёсць грошы?

— Ёсць.

— Дамо два. Збірае ўсіх у «Папараць-кветцы». Кажуць, там цудоўная кухня і музыка нічога. Адпачнеш. Трэба прымераць гарадское жыццё на сябе. А ўвечары... я зноў пастукаю ў акенца. Ціха так, непрыкметна.

— З агнём жартуем, Сава?

— Хто не рызыкуе, той не мае!

Тры дні ягоных выхадных шчаслівы Сава і не менш шчаслівая Галіна правялі разам, не бачыліся хіба якіх шэсць-пяць гадзін. Збіраючыся ў дарогу, ён абяцаў ёй званіць у кафэ кожны вечар. Словы свае стрымаў толькі ў першыя два дні пасля вяртання ў Мазыр. Неяк усё пайшло наперакасяк. У гасцініцы сапсаваўся тэлефон-аўтамат, а ў цэнтр горада на пошту ён не ездзіў, папраўдзе, і часу не было: гналі план. Восень у Мазыры, бадай, самая непрыемная пара, асабліва калі з гары, з боку нафтагіганта дзьме халодны вецер, тады горад робіцца непрывабным, на яго вулачках немагчыма схавацца ад скразнякоў. Усім ад асвятляльніка да рэжысёра-пастаноўшчыка працяглая экспедыцыя надакучыла да смерці. Усе разам загаварылі пра кепскае харчаванне ў кафэ, пра холад у нумарах, жанчыны патрабавалі абагравальныя прыборы, якія адміністрацыя ім не давала, яны сварыліся з бязвіннымі дзяжурнымі, пакаёўкамі. А тут яшчэ адключылі ва ўсім квартале гарачую ваду. Група прыкметна стамілася, знервавалася, нават ця-

гавіты Лявон здаў, разы са два-тры браў пад язык таблетку валідолу. Сава, калі сябра адчуў сябе кепска, прынёс у нумар вячэру і правёў самастойна дзве тэлефонныя размовы з маскоўскай «зоркай». «Нічога. Не губляешся, малайчына. З лёту хапаеш метаду. Так што работу адміністратара пацягнеш, калі ў войска не заграбуць»,— пахваліў яго Лявон.

І як ён раней не думаў, што калі не паступіць у інстытут, дык ад войска не выкруціцца? Ён вырашыў паступаць на факультэт да Лявона, але высветлілася, што на факультэт рэжысёраў народных тэатраў у гэты год не набіралі, абы-куды ісці ён ужо не хацеў. На волі яму заставалася быць дзесяць месяцаў.

— Што ж рабіць, Лявон? А студыя не мае права вызваліць ад войска? — спытаў ён.

— Студыя?! Гэта шарашкіна кантора нават свайго жыллёвага фонда не мае. Я трэці год у агульным памяшканні кантуюся. Студыя яшчэ нікога не вызваліла, усе служаць.

— Што ж ты параіш? Я хачу паступіць толькі на твой факультэт і працаваць у кіно.

— Калі ты не калека, не шызафрэнік, не туберкулёзнік, супраць закону баставаць дарэмна. Але ж усялякі закон можна абысці,— усміхнуўся Лявон.

— Як?

— За так і карова малака не дае.

— Ды я... ды з мяне... колькі скажаш, столькі бутэлек каньяку пастаўлю.

— Ты валодаеш якім-небудзь музычным інструментам?

— Як сказаць... на гітары трымкаю. У школе на ўдарных іграў. Аркестрык у нас быў невялічкі. Бацалі твіст. Гэту помніш «Зиганшин буги, Зиганшин рок, Зиганшин первым съел сапог». Праўда, нот не ведаю. Тут я баран,— прызнаўся Сава.

— Баран не баран, а выйсце — тут. Я цябе ў сталіцы да аднаго талковага яўрэя ў джаз-банду ўладкую. Абучаць цябе на ўдарных. Паўгода паўкалваеш у рэстаране, наб'еш руку, тады, можа, праціснем цябе служыць у армейскі ансамбль акругі. Мы іх здымалі. У мяне генерал знаёмы. Не служба, скажу, лафа. Праз гэты ансамбль у нас ужо адзін асістэнт і два артысты прайшлі. Ты Лявона слухай. У мяне, брат, увесь горад у кулаку. Цяпер без сувязей ні гу-гу, такі час пайшоў.

Праз два дні пасля гэтай гаворкі экспедыцыю ў Мазыры завяршылі. Застаўся толькі намеснік дырэктара, які і ўзяў

усе грахі на сябе: заплаціў за пабітыя шклянкі і графіны, за шкло ў акне, за пляму невядома якога паходжання на сцяне, разлічыўся за пабітае люстра ў пакоі апаратара, за дзірку ў коўдры на яго ж ложку.

Уся абслуга гасцініцы з палёгкай уздыхнула: «Слава богу, нарэшце з'ехалі!»

Лявон стрымаў сваё слова. Маленькі ў смешных акулярах яўрэй-скрыпач праверыў у Дыма музычны слых. «Ты такі барабаншчык, як я балерун. Але... ладна... за два тыдні навучу. Пішы заяву на імя дырэктара рэстарана «Спутнік».

«Вось каго мне трэба трымацца. Толькі Лявона і яго сяброў. А што Міхась Сокал? Ён далей сваёй Чыжоўкі і не выбіраецца. Тут сапраўднае жыццё».

Сава аказаўся здольным вучнем, хутка асвоіў ударныя інструменты і пакінуў брыгаду асвятляльнікаў.

Чакатоўскі, калі даведаўся, куды ідзе Сава, рукі яму на развітанне не падаў: «Ануча ты... Я думаў, з цябе чалавека зробім... А ты пырхаеш, як матыль. Усялякую дрэнь набіраюць, а пасля плачуць: цякучасць кадраў, цякучасць кадраў. Цьфу...»

Сава прыхаваў крыўду на брыгадзіра, а больш лаяльным хлопцам паставіў дзве бутэлькі гарэлкі, і тыя, «кірнуўшы на халяву», шчасліва яго праводзілі на новую пасаду.

Дым не сумаваў, таму што не паспеў прывыкнуць і стаць неад'емнай часткай гэтай загадкавай і таямнічай атмасферы кінастудыі. Ён не сумаваў, можа, яшчэ і таму, што спадзяваўся вярнуцца туды, але ўжо ў іншай якасці.

Сава так хутка ўлез у шкуру рэстараннага музыкі і яму так спадабалася на новым месцы, што ён пачаў паступова забывацца на мару паступіць у інстытут. У аркестры лічылі яго сваім чалавекам, і гэта было яму прыемна.

Кіраўнік без утайкі, пры ўсіх дзяліў «хворыя» грошы. З надыходам пагодлівай зімы «хворых» рабілася ўсё больш і больш. «Заводзілі»-падбадзёрвалі іх звычайна ў другой палове вечара, калі хмель путаў ногі. Вось тады і пачыналі «Семь сорок» і «Мясаедаўскую вуліцу», чакаючы першага «хворага», і ён азызла, з жывоцікам, з рэдкімі, тлустымі валасамі альбо з лысінай на паўгалавы, з хітрымі ап'янелымі вочкамі, з плямамі поту пад пахамі, з крошкамі хлеба на падбародку крывымі ножкамі тупаў да эстрады.

— «Хворы»,— шэптам казаў Саву піяніст.

«Хворы» падыходзіў да гітарыста, часта ікаючы, прасіў паўтарыць танец. Гітарыст паціскаў плячыма і перапраўляў «хворага» да скрыпача, той у сваю чаргу пасылаў да сакса-

фаніста, які паказваў на Саву або на піяніста, якія ўжо давалі слушную параду: «Башлі пакладзі на піяніна, і мы сыграем».

За рэдкім выключэннем «хворыя» адразу ўсё разумелі, лезлі ў кішэню па грошы, выцягвалі насоўку, сернікі, медзь, знаходзілі чырвонец (пятак давалі зрэдку). Пасля гэтай працэдуры «хворы» пераможна вяртаўся да століка і запрашаў на танец самую прыгожую жанчыну са сваёй кампаніі. І рэдка якая пава-дама з моднай прычоскай адмаўляла «хвораму». Не адмаўлялі ім, нягледзячы на розніцу ва ўзросце, і мясцовыя маладыя прастытуткі, якіх музыкі ці не ў першы дзень пазнаёмілі з Савам. Было іх чацвёра. Амаль аднаго ўзросту: каля дваццаці ці трохі болей дваццаці. Валасы ў іх былі выфарбаваны ў едка-белы колер. Яны да ванітаў курылі, заказвалі бутэльку шампанскага, каву. Прыходзілі толькі ў суботу і нядзелю і садзіліся за адзін і той жа столік. Адна з іх худая, бледнатварая з вузкімі, як у азіяткі, вачыма, у кідкім джэмперы ўсякі раз ці жэстам рукі, ці позіркам намагалася забраць увагу Дыма на сябе, і ён вельмі пачціва ёй усміхаўся, але падыходзіць не рызыкаваў: «А раптам яна спіць з саксафаністам ці піяністам?»

Піяніст дапамог сам: «Клеецца Ірка, забірай. Праўда, у яе хаты няма. Жыве ў чорта на кулічках. Ды гэту справу любіць. Умее ўсё. Вышэйшы пілатаж». Жыццё пакацілася як мяккі купейны вагон. Паступова, як бы неўпрыкмет чужы горад рабіўся даступны. Ужо не так палохалі цёмныя двары, пад'езды, глухія вулачкі. Усё часцей ён дабіраўся да Чыжоўкі на таксі. І часам яму здавалася, што кубак асалоды ніхто не вырве з яго ных рук. Ён «абрастаў» новымі сябрамі: міліцыянерамі, камсамольскімі работнікамі, мастакамі, артыстамі філармоніі. Упершыню адчуў ён і асалоду славы, калі аднойчы нехта з прысутных услых выгукнуў: «Брава ўдарнік! Брава!» Гэта яго акрыліла. Чаго было, здаецца, яшчэ жадаць? Сыты, абуты. Сто рублёў у месяц, калі не лічыць «хворых» грошай, атрымлівае. Работа — не бочкі грузіць. Апрануты па модзе, піяніст прадаў яму свае амерыканскія джынсы. Гуляй сабе да войска. Сава купіў сабе ўпершыню запісную кніжку, у якую дробнымі літарамі і лічбамі заносіў прозвішчы і нумары тэлефонаў усіх новых знаёмых без разбору і адбору, так, на ўсялякі выпадак, а раптам хто калі і спатрэбіцца. Аднаго разу (відаць, выпадкова) Галіна пагартала яго кніжку і здзівілася колькасці ў ёй жаночых імёнаў. Ён раззлаваўся, сказаў, што гэта тычыцца яго справы і толькі справы. Яна заплакала. У апошні

час Галіна непазнавальна змянілася, зрабілася нявытрыманай, часта плакала і крыўдзілася. Што з ёю сталася, дзяўчына не разумела і сама, пакуль не падзялілася пад вялікім сакрэтам сваімі падазрэннямі з сяброўкай-афіцыянткай, якая неадкладна параіла Галіне звярнуцца да ўрача. «А лепш знайсці чалавека на хаце. Куды табе раджаць? У кансультацыі адразу возьмуць на ўлік. І ўсё. У іх план. Павялічвай колькасць насельніцтва. У кансультацыю нельга. Я табе дапамагу».

Сяброўка-мінчанка прынесла праз дзень адрас акушэркі, сама яе нават туды завезла. Цяпер яны ведалі, хоць і прыкладна, тэрмін. Трэба было спяшацца з рашэннем. Галіна саромелася, ніяк не магла прызнацца Саву, усё адкладвала. А ён не чакаў ад яе такой ашаламляльнай навіны.

## РАЗДЗЕЛ ДРУГІ

### ДЗВЕРЫ ТРЫВОГІ

Аднаго разу праведаў Саву ў рэстаране «Спутнік» і Лявон Жабакрык.

Быў ён у цудоўным настроі: атрымаў прэміяльныя — два месячных аклады. Па ўсім было відаць, што Лявон хоча весела і шырока гульнуць. Музыкі віталі яго бадзёрымі акордамі. З Лявонам былі дзве дзяўчыны ў модных джынсавых спадніцах. Паводзілі сябе яго барышні высакамерна. Лявон нібы гусак, пагладжваючы свой жывоцік, хадзіў па зале з адміністратарам і выбіраў столік. Яго дзяўчаты стаялі пакуль каля эстрады, глядзелі на музыкаў. Нарэшце Лявон гукнуў іх.

Была паўза, і Сава падсеў да свайго даўняга сябра, які неадкладна пазнаёміў яго з дзяўчатамі. Вераніка і Стэла мелі не толькі аднолькавыя валасы і спадніцы, але і голас у іх быў падобны: ціхі і млявы.

Лявон пачаставаў шампанскім сваіх сяброў-музыкаў. Асушыў келіх віна і Сава.

— Я «зняў» Вераніку і Стэлу з паштамта. Нічога, га? Сексуальныя чувіхі. Усё дамоўлена. Паедзем да іх. Я цябе бяру з сабою.

— А дынама не выкінуць? — знешні выгляд у дзяўчат не ўнушаў Саву даверу.

— Карашок, са мной такія нумары не праходзяць. У мяне нюх.

На Лявона напаў азарт, ён цешыўся ўвагай сваіх дзяўчат, эфектна танцаваў па чарзе з кожнай і, трэба сказаць, нягледзячы на свой жывоцік, лёгка, нават грацыёзна вадзіў іх у вальсе, даў жару пад «Мясаедаўскую». Лявон «захварэў», паклаў на піяніна дваццацьпятку і заказаў тройчы запар іграць «Аргенцінскае танга». Яго просьбу тактоўна, з усмешкай, праўда, уважылі.

Развітваючыся, а ён апошнім пакідаў залу, Лявон усім даваў «на чай» — каму рубель, каму тры рублі. Затым папрасіў адміністратара выклікаць таксі, а сам купіў у буфеце на вынас з нацэнкай бутэльку шампанскага.

Стэла і Вераніка пайшлі ў туалет.

Таксі чакала. Лявон нерваваўся. Адчыніў дзверы туалета і гучна крыкнуў: «Стэла, матор чакае!» Мінут праз пяць яны нарэшце выйшлі. Стэла — Сава добра і не запомніў: хто з іх Вераніка, а хто Стэла — затрымалася ля тэлефона-аўтамата.

— Я пазваню дахаты. Можа, маці вярнулася.

— Давай,— сказаў Лявон,— толькі ў тэмпе.

Ён зняў трубку, падаў ёй, сам не адыходзіў ад тэлефона.

Стэла перадумала:

— Ладна. Паедзем. Ёй яшчэ тыдзень адпачываць на курорце.

Ехалі доўга. Лявон сядзеў на пярэднім сядзенні і паказваў шафёру, як лепш і карацей праехаць да вуліцы, якую назвала Стэла. Таксіст моўчкі кіраваўся яго парадамі, пакуль не заехалі ў нейкі тупік. Прыйшлося павярнуць назад. Цяпер, пазяхаючы, Лявон маўчаў.

Стэла доўга не магла знайсці свой дом, паехалі яшчэ наўкруг, нарэшце прыпыніліся каля дзевяціпавярховага панельнага дома, які, гэта было бачна па прыкметах, толькі-толькі засялілі.

— Пачакайце мяне тут. Я адчыню дзверы, выйду на балкон і клікну вас,— без ценю хвалявання і змовы сказала Стэла.

— Добра! — згадзіўся Лявон і ўзяў пад руку Вераніку.

Стэла шмыгнула ў цёмны пад'езд. Чакалі яе мінут дзесяць. Лявон пачаў нервавацца. Вераніка, як запраўскі спартсмен, пераскочыла цераз шырокую яму і схавалася ў суседнім пад'ездзе. Лявон, праўда, адрэагаваў хутка, штурхнуў Саву:

— Давай за ёй, а я гэту праверу.

У цёмным пад'ездзе Сава дзяўчыну не знайшоў, пры-

слухаўся: не чуваць крокаў наверсе, тады ён адчыніў дзверы, якія вялі на глухі двор, і ўсё зразумеў. Яна ўцякла праз гэты чорны ход.

У двары было цёмна, хоць выстаўляй перад сабою рукі. Шукаць яе тут не было аніякага сэнсу, і ён вярнуўся да Лявона, які ў сваім пад'ездзе знайшоў запасны выхад.

— Ат, сукі... накалолі. Скажы чэсна, няма куды вас, хлопцы, весці, і я зразумею, дарую. Б...і.— Лявон лаяўся і пляваў.

— Ну і ... з імі. Калі папраўдзе, ні на адну з іх мяне не цягнула,— супакойваў сябе Сава,— за кампанію з табой паехаў.

— Трэцяя гадзіна. Айда лавіць матор,— прапанаваў Лявон, усё яшчэ не супакоіўшыся.— Ат, шаўкі беспародныя. У мяне ж зрокавая памяць на ўзроўні слыху Моцарта. Я ж вас, кумушкі, напаткаю на «Брадвеі». Ад мяне схавацца цяжка.

— Пачакай, мачавы пузыр лопне...

— Ты што ачумеў на ветры?

— Давай у пад'езд...

Раптам Лявон у адчыненыя дзверы заўважыў міліцэйскі патруль.

«Газон» прыпыніўся акурат насупраць іх. З машыны выскачылі два міліцыянеры і хуткімі крокамі накіраваліся да Лявона і Савы.

— Міліцыя! — паспеў папярэдзіць Лявон.— Давай праз чорны ход. Хутка!

На злом галавы яны кінуліся бегчы ад міліцыянераў, цудам мінаючы камяні, цэглу, ямы.

Стэла і Вераніка ўжо паспелі аддыхацца і супакоіцца. Яны ішлі нетаропка па вуліцы і анямелі, згледзеўшы Лявона і Саву, якія беглі ў іхні бок.

— Памажыце! Гвалцяць! Памажыце! — кінуліся яны з крыкам прэч ад надакучлівых кавалераў, хоць тыя і не думалі даганяць сваіх «дынамістак», прабеглі побач, апярэдзілі іх і праз двор, нарэшце, выскачылі да стаянкі таксі.

— Фу-у-у,— не мог аддыхацца Лявон.— Зладзеяў бы лавілі, бандытаў... а яны сумленным людзям не даюць спакойна п...ць. Ой, падла.

Пры святле вулічнага ліхтара Сава ўгледзеў, што плашч у Лявона да пояса парваны. Было і смешна і грэшна, але ён нічога сябру не сказаў. Церусіў дробны дождж.

На лаўцы сіратліва ляжаў чалавек. Яны падышлі бліжэй. Лявон нагнуўся і пазнаў п'янага чалавека.

— Швейцар з рэстарана «Каменная кветка». Вусаты Макар.

Лявон штурхнуў злёгку швейцара. Той не кратаўся. Лявон пасадзіў яго.

— Макар! Давай, давай... прачніся. На цягнік спознішся. От, хадзячы анекдот. Як ты тут апынуўся, Макар, ты ж у Сцяпянцы жывеш?

— У гасцях быў,— ледзь чутна, не расплюшчваючы вачэй, адказаў Макар.

— Нешта ты зусім расклеіўся. Давай уставай. Адвязу цябе дахаты. Сава, вунь таксі, галасуй!

Таксі на вялікай хуткасці прамчалася міма.

— Вот жывёліна! Стаяць жа людзі пад дажджом. Вазьмі падкінь, хоць да вакзала... у цэнтр. Не, усе распусціліся. Ты ведаеш, Сава, пакаленне, якое ідзе за намі, будзе нам страшна зайздросціць. Чаму? Таму што мы жывём, ні за што не адказваючы. Унікальнае грамадства.

Чакалі добрыя паўгадзіны. Пакуль нарэшце да стаянкі плаўна, як човен па вадзе, не падкаціла «Волга». Вадзіцель, нахрапісты чалавек сярэдніх гадоў, адмаўляўся садзіць у салон п'янага швейцара, спасылаючыся на тое, што выпівоха зарыгае ўсю машыну, а яму пасля бясплатна прыбірай.

Лявон зразумеў намёк і сунуў вымагацелю ў руку чырвонец.

— Табе куды, Сава?

— А... давай на Чайкоўскага.

— О'кэй. Гані, хазяін, у Сцяпянку, пасля на кінастудыю да агульнага памяшкання, а там рукой падаць да Чайкоўскага. Ты ў «Каменнай кветцы» быў? — павярнуўся Лявон да Савы.

— Не.

— Трэба будзе табе паказаць. Класна. Дзяўчаты з балета стрыптыз па-савецку паказваюць. Аля-улю. Закачайся. Білеты цяжка дастаць, ды Макар выручыць. Праўда, Макар?

— Праўда,— бубніў пад нос стомлены Макар.

Сава па старой завядзёнцы тройчы асцярожна пастукаў у акно. Галіна здзівілася: так позна ён да яе яшчэ не прыходзіў.

— Колькі на гадзінніку?

— Чатыры,— адказала яна.

— Засядзеліся з Лявонам... ты глядзі... У агульным пакоі. Стаміўся. Ты недалёка, думаю, падамся да цябе.

Ранкам яму есці не хацелася, піў толькі каву.
Галіна, гледзячы ў акно, прызналася, што цяжарная. Знешне ён успрыняў навіну спакойна, без хвалявання.

— Ты ўпэўнена? Табе не падалося?

— Я была ў акушэркі.

І яна расказала і пра сяброўку-афіцыянтку, і пра паход да акушэркі-падпольшчыцы.

— Ну, гэта не так жахліва, думаю. Што-небудзь прыдумаем. У адзінаццаць у мяне рэпетыцыя, а ў чатыры буду каля твайго кафэ. Паходзім па парку, усё абмяркуем,— без ценю трывогі гаварыў ён. Дапіў каву і паехаў, але не на рэпетыцыю, а ў інтэрнат да Лявона.

Аднапавярховы шэры будынак з высокімі вузкімі вокнамі ля металічных варот кінастудыі будавалі пад туалет, але пасля аддалі пад інтэрнат, перагарадзілі на шэсць пакояў, у якіх жылі і сямейныя і халасцякі. Лявон займаў бакавы пакойчык, дзе амаль упрытык стаялі два ложкі, столік, дзве тумбачкі, стары халадзільнік. Адзін ложак лічыўся рэзервовым для часова камандзіраваных аператараў, мастакоў, рэжысёраў. Ратавалі ад гнёту аднастайнасці пастаянныя камандзіроўкі, новыя знаёмствы, жанчыны. Сем гадоў ён працаваў на кінастудыі і рэдка калі заставаўся без работы, быў, як казалі, «у творчым прастоі». Яго паважалі, любілі і запрашалі да сябе дырэктары і рэжысёры на розныя складаныя фільмы. Лявон умеў выпіць (быў такі грэх), часам быў ганарлівы, але заўсёды надзейны. Як кажуць, ён ніколі не пляваў на крывога, ведаючы, што і сам можа зрабіцца гарбатым. Не саромеўся і не цураўся самай чорнай работы, якую людзі яго прафесіі не рабілі, каб не «падмачыць» сваю рэпутацыю. Сябры ў яго былі ўсе і ніхто. Нехта недалюбліваў яго за праўдзівае слоўца, нехта не даруваў яму іроніі. Ніхто не ведаў мінулае жыццё гэтага асістэнта рэжысёра, сына вядомага мастака-пейзажыста з Брэста. Лявон на бацьку пакрыўдзіўся, лічыў, што ў разводзе з маці толькі яго віна. Карціны бацькі крытыкаваў строга, з веданнем справы. Грошы ў доўг не браў, а калі і браў зрэдку, вяртаў усе да капейкі. Маці выйшла другі раз замуж за ўдаўца-пісьменніка, кнігі якога Лявон таксама смела крытыкаваў, як і пейзажы бацькі. Пісьменнік крытыку не пераносіў.

Як кінематаграфіст Лявон быў улюбёны ў творчасць свайго куміра італьянца Феліні, збіраў у сваю калекцыю ўсё, што пісалі пра Феліні ў нас і ў польскай прэсе.

Сава доўга стукаў у абабітыя фанерай дзверы. Ягоны

духоўны настаўнік не хацеў прачынацца. Нарэшце дастукаўся да Жабакрыка. Лявон нехаця, без увагі слухаў Саву, які, апавядаючы пра сваю трывогу, зайздросціў свабодзе Лявона, яго незалежнасці. Дым на хвілю ўявіў сябе бацькам — і яму зрабілася млосна.

— Завяз кіпцюрок, усёй пташцы пагібель,— пазяхаючы, абыякава сказаў Лявон.— Ты лепш збегай па піва.

Сава прынёс чатыры бутэлькі. Дзве з іх Лявон выпіў адразу.

— Ты што ж, мой сябар, законаў прыроды не вывучыў? — Лявон не паднімаўся з ложка, перавярнуўся на бок, закурыў.— Калатун бярэ? Бачу. Вусны дрыжаць. Большасць правінцыялаў праходзіць праз гэта. Адно скажу, дзяўчыну шкада. У цябе выпадак асаблівы. Зямлячка, аднакласніца... першае каханне. Не крыўляйся... першае, першае... Ніхто таму не мае права даваць табе парады. Адно ведаю: табе вельмі рана падпісвацца ў рабства, у трыццаць будзе позна, а цяпер рана. Ты эмоцыямі яшчэ кіраваць не навучыўся. Волю любіш. Кодэкс маралі — гэта добра, калі ён на паперы, а ў жыцці... спакусы, прага граху... Тым больш што два гады табе прыйдзецца начаваць у вайсковай казарме. Улічы і гэта, усё ўлічвай. Абставіны супраць заснавання сям'і — за яе галасуе толькі каханне. Вялікая сіла, што й гаварыць. А як яна?

— Што яна? Як скажу, так і будзе,— з гуллівай упэўненасцю адказаў Сава.— А што б ты на маім месцы зрабіў?

— Я? Вось наша самая вялікая памылка: жыць і азірацца на кагосьці. Па-першае, навучыся заўсёды думаць самастойна. Правільна ці не... жыццё падкажа, навучыць, але самастойна. Вялікую ролю адыгрывае інтуіцыя. Наогул, табе ўжо час пачытаць «Опыты морали» Шапенгауэра і «Так говорил Заратустра» Ніцшэ. У Ленінскай бібліятэцы можна заказаць кнігі гэтых разумных немцаў. Па-другое, мне шмат гадоў, а табе няма і дваццаці. Мая псіхалогія, мой характар і твае — як неба і зямля. Ніколі не пытай, што нехта рабіў бы на тваім месцы. Толькі ад цябе залежаць лёс, каханне, будучыня. Акрамя бога, раіць чалавеку ніхто не можа, і бойся, казала мне адна бабка пад Даўгаўпілсам, толькі бога. Ты думаеш, я не пападаў у аналагічную сітуацыю?

Сава ажывіўся.

— Было, усё было. Падзаляцеў. Напачатку было тое, што і ў цябе. Але мне шанцавала. Трапляліся паслухмяныя цёлкі, якія за энную суму самі ведалі, што і як ім рабіць

далей. Я не быў у іх першы і адзіны. У цябе, паўтараю, асаблівы выпадак. Вучыся, стары, выходзіць з экстрэмальных сітуацый. Уяві сабе, што кожную гадзіну ў свеце робяць адначасова сотні тысяч абортаў і сотні тысяч зноў кладуцца ў пасцель да мужчыны.

Лявон стаў часцей пазяхаць, бачна было, што ён недаспаў і што тэма гаворкі вычарпана. Сава ў роспачы пакінуў сябра і вырашыў прайсціся па праспекце да Батанічнага саду, вылічваючы магчымыя варыянты. Чым больш ён сябе ўяўляў жанатым чалавекам, тым большы жах ахопліваў яго душу. «Я ж яшчэ нічога не бачыў, не жыў! А Леакадзія? Іра? Трэба ўгаварыць Галіну на аборт... адно выйсце».

Галіна пакорліва-маўкліва сустрэла яго настойлівую параду, якую ён, на здзіўленне, па-філасофску і сацыяльна доказна так, па-дарослсаму абгрунтаваў. Яна нават не сказала яму, што трэба падумаць, а проста адказала, што акушэрка на Усходняй робіць за грошы аборты.

— Колькі?

— Сорак рублёў.

— Грошы я знайду,— упэўнена, з палёгкай сказаў Сава і прытуліў дзяўчыну да сябе.

Да акушэркі Галіна апранула сваю святочную белую сукенку. Ён давёў яе да форткі: «Трымайся. Я тут пачакаю».

Сава хадзіў туды-сюды на процілеглым баку вуліцы, падстаўляючы твар першым па-вясноваму цёплым сонечным промням. Чакаў добрую гадзіну і знерваваўся за гэты час. Ён баяўся, каб акушэрка не адмовілася.

— Усё? — першае, аб чым ён спытаў Галіну.

— Не ведаю.

— Ну... яна рабіла што-небудзь?

— Так. Набрала поўны шпрыц нейкай вадкасці. У яе там гразь такая... Яна нават рукі не памыла. Гадка ўсё.

— Нічога. Усё закончылася, і дзякуй богу. Айда ў «Журавінку» абедаць.

— Не хочацца. Завязі мяне дахаты.

Сава не пярэчыў. Ён асцярожна ўзяў яе пад руку і павёў да трамвайнага прыпынку.

Відаць, усё ж падпольны гінеколаг не давяла справу да канца альбо аказалася звычайнай аферысткай, якая дзякуючы пасрэднікам вербавала сабе кліентуру з такіх «цёмных вясковых дурніц», адным словам, Галіна хутка зразумела, што ад цяжарнасці яна не пазбавілася. Ішоў трынаццаты тыдзень яе пакут і трывог. Абставіны і інтуіцыя зноў падказалі ёй звярнуцца да Савы.

— Ды я гэту авантурыстку ў турму пасаджу,— узбуджана гарачыўся ён.— Я пагавару са сваімі хлопцамі, цябе яны не ведаюць, сорамна не будзе. У іх сувязі. Чакай мяне ўвечары.

У рэстаране прыйшлося ўсё расказаць хлопцам. Скрыпач толькі і спытаў:

— Які тэрмін?

— Амаль трынаццаць.

— Ну, дарагі мой... дзе ты быў раней. Бяруць да дванаццаці.

— Ды адна прайдзісветка ўзялася на хаце зрабіць... хто ж ведаў, што яна шарлатанка... падманула...

— Деревня, деревня... ты ж мог так забіць сваю знаёмую. Трэба было раней падысці. Мог жа адкрыцца крывацёк, ніхто ж не застрахаваны... яна і «хуткаю» не выклікала б... падсудная справа... выправадзіла б тваю... і яна б сышла ўся крывёю дзе-небудзь у парку на лавачцы. Цемната.

— Хто ж ведаў? Хто? — з дакорам самому сабе казаў Сава.— Яна хоча паступаць у інстытут. Памажы, Навум. Да гроба абавязаны буду. З вёскі дзяўчына...

— Навошта да гроба... Цьфу на твае словы. Я жыць хачу і лепш у іншым месцы. Мая аднакласніца працуе зараз галоўным урачом у гарадскім радзільным доме. Яна спачувае вясковым дурыдлам... лае іх мацернымі словамі, але спачувае. Табе пашэнціла. Тэрмін, тэрмін, канечне. Грошы не бярэ, але знойдзем, як аддзякаваць. Сына свайго будзе жаніць, дамо згоду іграць на вяселлі.

Праз дзень Галіну паклалі ў бальніцу тэрмінам на тры дні. Каб ніхто не даведаўся, Сава купіў дзве пуцёўкі на калектыўны выезд на суботу і нядзелю ў дом адпачынку «Беларусь». Пуцёўкі як дакумент Галіна паказала на рабоце, узяла дзень адгулу.

Усяго хапіла: і сораму, і болю.

Ён сустрэў яе, пазбаўленую, здаецца, сіл, збялелую, ля вялікіх варот раддома.

Апошні час Сава змяніўся, хоць і пільна хаваў сваю перамену знешне. Яна гэта адчула, калі ён, спасылаючыся на стомленасць, прыходзіў да яе на вуліцу Чайкоўскага ўсё радзей і радзей. А неяк, як бы мімаходзь, падказаў, што добра было б, каб яна навучылася асцерагацца. «Табе ў раддоме не падказалі, як гэта робіцца? Я вось прынёс спецыяльную літаратуру».

Яна адказала, што суседкі ў палаце таму-сяму інтымнаму яе падвучылі.

Лявон стрымаў сваё слова, «падключыў» знаёмага генерала, і Дыма ўзялі на службу ў акруговы вайсковы ансамбль. «У сарочцы нарадзіўся»,— казала суседка Міхася Сокала па лесвічнай пляцоўцы. Сава забег да земляка на нейкія дзесяць — пятнаццаць мінут, спяшаўся ў рэстаран да сваіх, хацелася сустрэцца з Ірай. Цяпер ён быў вольны. Форма, дысцыпліна і казарма надзейна хавалі яго ад Галіны. Раней, не трэба ўтойваць грэх, ён баяўся, каб не патрапіць ёй на вочы дзе-небудзь на праспекце ў цэнтры з хіповымі дзяўчатамі, цяпер іншая справа. З казармы ехаў да Міхася, пераапранаўся ў цывільнае і выходзіў на людзі як барон. Іры ў гэты вечар ніхто не бачыў, у хлопцаў не папытаўся, дзе яна, саромеўся, не хацеў, каб яны ведалі яго намер. Бавіў час са швейцарам. Іра не прыйшла. Дарма прападаў такі дарагі вольны дзень. «Ведаў бы такую накладку, паехаў бы да Леакадзіі».

Леакадзія чакала яго звычайна ў панядзелак, ранкам. Заспаная, яна адчыняла дзверы, аўтаматычна падстаўляла для пацалунка шчаку, зачыняла Саву на кухні, ішла ў пакой, апранала сваю дачку (дзяўчынка хадзіла ў школу, у другую змену), выправоджвала яе пагуляць на двор, сама ж, не здымаючы з плячэй цёмна-карычневага байкавага халата, вярталася да яго на кухню.

Сава тым часам паспяваў адкаркаваць бутэльку «Гамзы» ці «Каберне». Яна неталопка пыталася ў яго пра справы, пра Міхася, пра новы фільм, наразала бутэрброды (сервілат ды іншыя дарагія гатункі каўбас заўсёды былі ў халадзільніку), ставіла на пліту стары кафейнік. Сава выпіваў каву першы, пачынаў цалаваць яе ў шыю, агаляў плечы. Яна войкала, піла, часам абліваючыся, каву, усміхалася. Неахвотна як бы яна паварочвалася тварам да яго, падстаўляючы для пацалункаў губы. Не пакідаючы цалаваць, Сава вёў Леакадзію ў пакой, знімаючы на хаду з яе плеч халат.

«Холадна ж, дурненькі. Бачыш, мурашкі па целе пабеглі»,— з дзіцячым дакорам казала яна і цягнула на сябе коўдру з вярблюджай воўны — гэтым пахвалялася кожную сустрэчу — ці падабалася хваліцца, ці забывалася, што ўжо пра тое гаварыла. Сава ставіў пласцінку з песнямі яе любімага спевака Хампердзінка і клаўся ў ложак. Яна любіла забаўляцца, хавалася з галавою пад коўдру, ёй падабалася, калі ён доўга «выкручваў» яе з коўдры, прагна цалуючы рукі, шыю, плечы.

Ля ложка стаяла старая даваенная яшчэ шафа з вялікім тоўстым люстэркам. Леакадзія заўсёды паспявала легчы

ўпоперак ложка і кожны раз папярэджвала яго: «Не глядзі ў люстэрка». І ён, як злодзей, уткнуўшыся ў яе плячо, адным вокам, як кажуць, усё ж шукаў у люстэрку іх адбіткі. Яна, заўважаючы гэта, моцна ціснула яго галаву да сваёй шыі. Сава спяшаўся, ведаючы, што ў кожную мінуту можа пазваніць у дзверы маці Леакадзіі. Яна папярэджвала, ды такое аднойчы і было ўжо. Тады ён хуценька апрануўся і выскачыў з балкона з першага паверха. З таго часу ён заўсёды спяшаўся, хоць яна і прасіла паляжаць побач, сама курыла, слухала Хампердзінка і пыталася ў Савы, чаму ён не цікавіцца яе былым мужам.

— Хіба цябе не цікавяць мае адносіны з іншымі мужчынамі? Няўжо ты такі абыякавы?

— Калі хочаш, раскажы,— адказваў ён, гледзячы на гадзіннік.

— Нецікава табе, і я буду маўчаць. Што было, тое сплыло. Мы падыходзім адно аднаму,— яна не сказала, што «мы патрэбны адно аднаму», а менавіта «мы падыходзім»,— я гляджу на цябе, як на мужчыну. Вам, на жаль, не дадзена зразумець жаночую душу.

— Дык няма ж калі і пагаварыць,— апраўдваўся ён.— Дачка ж яшчэ і ўрокі не вывучыла.

— Ай... што там яшчэ вучыць! Да вас, мужчын сённяшніх, у большасці і ставяцца як да жарабкоў, бо вы без пачуццяў. А калі б яшчэ ў вас было і матэрыяльнае становішча... не ведаю тады, што чакала б бедную жанчыну... кабала. Я так дзякую богу, што магу самастойна сябе пракарміць, што маю магчымасць у фарцоўшчыка купіць модную адзежыну, і не наш шырпатрэб. А тут яшчэ лёс падарыў цябе. Слухай, а цябе не палохае, што я старэйшая за цябе?

— І не думаў пра гэта.

— І правільна. Чаму ты мяне ніколі не цалуеш пасля... жанчыне гэта прыемна, помні.

Ён нехаця пацалаваў яе.

— Будзем апранацца? Мне на работу ў гадзіну. Калі будзеш званіць у наступны раз, пачакай, пакуль пакладуць трубку паралельнага тэлефона. Новы загадчык сталоўкі на мяне «вока палажыў», кантралюе, шэльма.— Яна выключыла прайгравальнік, высунулася ў фортку і крыкнула:

— Юля, ідзі дахаты!

Сава ў гэты час ужо таптаўся ў пярэдняй. Леакадзія адчыніла дзверы, падставіла, як і пры сустрэчы, шчаку для пацалунка: «Звані, калі задумаеш».

Зрэдку ў час нязменнага рытуалу (віно, бутэрброды, ка-

ва, пацалункі) Леакадзія скардзілася на стому, на паршывую работу і мізэрныя грошы. Аліменты яна адкладвала на ашчадную кніжку і брала грошы толькі тады, калі не хапала на якую-небудзь імпартную адзежыну.

Неяк ён спытаў:

— А твой першы часам не заходзіць?

— Мардабою не будзе. Не спяшайся як на пажары. Не прыйдзе.

— Кажуць, учынкі мужчын таксама не прадказальныя,— успомніў Сава Лявонавы словы.

— Мой не прыйдзе. Канкурэнт ты несур'ёзны. Замуж за цябе я не пайду. І табе рана... нагуляйся. Мне патрэбен мужчына ў гадах. Добра, каб пры грашах быў. Усе знаёмыя жывуць сціпла. Паверыш... за тры дні да палучкі пяцьдзесят працэнтаў рабочых не абедаюць... Няма грошай. Інжынеры носяць на працу сабойку...

Была ўжо глыбокая восень. Калючы вецер круціў між маўклівымі шэрымі дамамі мокры снег. Прыкрываючы твар рукой, Сава з бутэлькай «Каберне» у кішэні спяшаўся да Леакадзіі.

Сустрэчы ў іх былі рэдкія, і кожны раз яны як бы пачыналі зноўку. Ён і сам не разумеў прыцягальную сілу гэтай жанчыны, не ведаў, чаму, даючы сабе слова болей да яе не хадзіць, ён тым не менш з ахвотаю парушаў гэтае слова. Няўжо, лічыў ён, можна быць шчаслівым і так, не зазіраючы ў душу, без рэўнасці, не цікавіцца, чаму радуецца чалавек, які ляжыць побач у ложку, што яго засмучае. Што гэта? Панцыр? Дыктат часу і нораваў? А мо гэта і ёсць апафеоз свабоднай любові, сексуальнае разняволенне, пра якое, як пра язву гнілога Захаду, гаварыў у іх на камсамольскім сходзе сакратар Марат Свістун, якога таксама па блату ўладкавалі праходзіць службу ў ансамблі. Быў ён сынам аднаго прафсаюзнага кіраўніка. Няздольны ў музыцы, гэты вастраносы хлопец у акулярах з такімі паслужлівымі насцярожанымі вочкамі і «ёршыкам» на галаве сваім пісклявым голасам звычайна вёў праграму.

Не разумеў Сава Леакадзію ды і не надта хацеў разумець яе душу, лёгка было так у меру дагаджаць, патакаць, усё астатняе няважна.

У той слотны дзень Сава ішоў да яе, як заўсёды, подбегам. Яны сутыкнуліся ледзь не штурхнуўшы адно аднаго: ён і Юлька. Сумная, без рукавічак, з чырвоненькім ад халоднага ветру тварыкам, яна адна сядзела на цяжкіх металічных арэлях.

— Здравствуйте,— з нязменнай дзіцячай інтанацыяй павагі да дарослых сказала яна.

— Добры дзень, Юля. А ты што тут робіш?

— Мама гулять вывела.

— А табе не холадна?

— Нет,— адказала дзяўчынка і, каб пацвердзіць сказанае, хапілася раскачваць рыпучыя арэлі.

Сава глянуў на гадзіннік.

Звычайна ён быў пунктуальны, але ж сёння болей звычайнага прастаяў у чарзе па віно. Відаць, каб эканоміць час, ведаючы, што ён на падыходзе, Леакадзія і выгнала дачку на пляцоўку. Дзяўчынка яшчэ не разумела, чаго прыходзіць гэты дзядзя з рэдкімі чорнымі вусікамі. Некалькі крокаў ён ішоў не азіраючыся, потым не стрымаўся: дзяўчынка сядзела на тым жа месцы і глядзела яму ўслед. Раптам яму зрабілася да болю шкада гэтае дзіця. Ён павярнуў назад да Юлі, дастаў з кішэні шакаладку.

— Бяры, я частую. І вось што. Ідзі дахаты. Перадай маці, што дзядзя Сава паслаў цябе дахаты, а сам паехаў на канцэрт. Зразумела? Ну і добра. Ідзі. Бывай!

— До свидания. Спасибо,— адказала Юля.

На душы ў Савы павесялела.

«Паеду да Лявона... не будзе... паеду да Ірыны. Усё, што ні робіцца, робіцца да лепшага. Зацяжарыць, знойдзе сведкаў, напіша камандуючаму акругі, і праз камсамол прымусяць ажаніцца. Што тады?»

Да душэўнай палёгкі прымяшалася яшчэ пасля гэтых думак і пачуццё радасці: «Добра, што ў час апамятаўся. Бязвіннае дзіця ніколі не павінна пакутаваць»,— успомніў ён дзедавы словы. Усё. Бывай, Леакадзія. Назаўсёды. Хопіць! Маюць рацыю Лявон і Чакатоўскі, якія кажуць, што ў адносінах з жанчынамі без страт застаецца той, хто зможа лёгка адолець сантыменты.

Аўтобус быў перапоўнены, ён перасеў у тралейбус... Туды людзей набілася яшчэ больш. «А калі людзі працуюць? Дзіўна».

Хутчэй за ўсё ад маладосці і нявопытнасці Сава так рызыкоўна даў сам сабе клятву: не сустракацца болей з Леакадзіяй. Праз некалькі гадоў у дзіўных абставінах ён лёгка парушыць дадзеную клятву. Гэта будзе пазней, калі ён вернецца адміністратарам на кінастудыю і будзе працаваць у адной групе з Лявонам. А цяпер, увосень семдзесят першага года, ён пакуль спяшаецца да свайго сябра, каб выпіць разам бутэльку віна. Выпілі. Закусілі па завядзёнцы плаў-

леным сырком. На добрую закусь у Лявона і грошай не было. Трэці месяц ён быў у творчым прастоі, пазычаў у сяброў грошы і на іх жыў, чакаючы, пакуль запусцяць фільм сябра-рэжысёра.

А сёння яшчэ якраз спяшаўся на пахаванне швейцара з «Каменнай кветкі».

— Той Макар памёр?

— Ён. Трэба пайсці. Неяк даўным-даўно я сустракаўся з яго дачкой. Яна і пазваніла. Неспакойна, кажа, на сэрцы... а раптам не будзе каму і труну вынесці. Тут недалёка за абсерваторыяй. Справы жыццёвыя. Ніхто не ведае, можа, і нас чакае тое, што не будзе каму пахаваць. У зямлю зарыюць, а вось пахаваць — гэта яшчэ пытанне. Хадзем разам, калі час маеш... Заадно пагаворым...

Сава згадзіўся. Сярод сваякоў Макара Сава сустрэў, чаго ніяк не чакаў, Марата Свістуна, якому прыйшлося (большасць было жанчын, дзяцей) кіраваць гэтай самай сумнай цырымоніяй.

Як дачка і прадчувала, труну з хаты не было каму вынесці. Ад мясцовай прафсаюзнай арганізацыі прыйшлі дзве афіцыянткі, якія, было бачна, упершыню трапілі на пахаванне, не ведалі куды і як пакласці жалобны вянок са штучных кветак і з чорнай стужкай, на якой літара «С» у тэксце была размазана.

— Трэба, таварышы, штосьці рабіць! — звярнуўся Марат да Лявона, інтуітыўна адчуваючы, што гэты чалавек здолее дапамагчы.— Можа, пад'ехаць да гастранома ці піўнога бара ды ўзяць чацвёра алкашоў?

— Машына ёсць?

— Ёсць. За дзень да смерці купіў зяць, муж яго роднай дачкі.

— Давай сюды. Чакайце мяне.

Лявон паехаў на кінастудыю ўзяць на дапамогу хлопцаў.

Ад Марата, пакуль чакалі Лявона, Сава Дым даведаўся, што Макар наклаў на сябе рукі: павесіўся. Марат паказаў на жанчыну, знешне яна выглядала на гадоў сорак.

— Гэта яго прыёмная дачка. Ніколі не думаў,— казаў Марат,— што яна прыедзе на пахаванне. Мой бацька не змог, ён у замежнай камандзіроўцы, а вось яна... прыляцела з Мурманска...

«Відаць, з гэтай і сустракаўся Лявон»,— вырашыў для сябе Сава і стаў уважліва прыглядацца да госці з Мурманска.

Жанчына яму спадабалася. У яе былі прыемныя рысы твару, асабліва выдзяляліся надзвычай выразныя і яркія вочы: прыгожыя, прыцягальныя і задумліва-мудрыя.

Шафёр аўтобуса, музыкі жалобнага аркестра — яны прыехалі ў прызначаны час, нерваваліся. Здагадлівая суседка прынесла з кладоўкі бутэльку гарэлкі, дала брыгадзіру музыкаў. Мінула яшчэ паўгадзіны, нарэшце на вулачку выехаў «Масквіч» з завербаванымі Лявонам асвятляльнікамі.

— Сваякі, не бярыце вянкі і кветкі,— зычна распараджаўся Марат.

Века выносіць не было каму, і Свістун даў каманду закрыць труну. Жанчыны ля труны не плакалі, хіба адна жонка нябожчыка выцірала насоўкай стомленыя сухія вочы.

Труну пранеслі па завулку метраў з пяцьдзесят, паставілі ў аўтобус і паспешліва селі ў другі аўтобус, для жывых. І ўсё ж спазніліся на могілкі, чым парушылі графік у магільшчыкаў, давялося іх чакаць.

— Адчыніць труну? Будзеце развітвацца, цёця? — ціха спытаў ва ўдавы Марат. Пачуў яго словы хіба адзін Сава.

— Не ведаю. Як дачка?

Марат нахіліўся з пытаннем да малодшай дачкі Люсі.

— А як маці?

— Не ведаю. Ой, божа мой... Адчыніць трэба. Я развітаюся... Суседзі плявузгаць пачнуць...

Адчынілі века. Дачка асцярожна, быццам баючыся пабудзіць нябожчыка, пацалавала яго ў лоб. Дакранулася да лба і жонка вуснамі, усплакнула. Прыёмная дачка з Мурманска да нябожчыка не наблізілася.

Доўга, здавалася, вельмі доўга не падыходзілі магільшчыкі. Балелі ногі. Усе прыкметна стаміліся.

— Трэба сунуць у лапу. Бо іх могуць перахапіць,— параіў Лявон Марату.

— А што? Бутэльку? Чырвонец?

— І гарэлку і чырвонец.

— Зрабі гэта ты. У цябе лепш атрымаецца.

Лявон накіраваўся да магільшчыкаў, якія падкрэслена доўга трамбавалі на свежай магіле зямлю, ставілі чырвоную пірамідку з пяціканечнай зоркай наверсе.

Праз мінуту магільшчыкі ўжо забівалі тоўстымі цвікамі века труны Макара. Усе з палёгкай уздыхнулі. «Сумны наш люд... адпачываць як след не ўмее... Хаваць не ўмее»,— сказаў ціха Саву Лявон.

Магільшчыкі працавалі спраўна. Стомленыя, без цікавасці да ўсяго на свеце людзі пасяшаліся да аўтобуса. Так сталася, што Сава апынуўся побач з дачкою Макара. Звярнуў увагу на яе рукі: шурпатыя, мазолістыя, як у яго маці, зусім не жаночыя рукі. За жалобным сталом доўга не сядзелі: тройчы выпілі па сто грамаў гарэлкі, закусілі гарачымі катлетамі ды і пакінулі хату ўдавы. Ішлі да інтэрната пешкі. Лявон без просьбы Савы паведаў яму ўсю гісторыю, звязаную з Макарам і ягонай прыёмнай дачкой Нінай. Расказваў, пераскокваючы з аднаго на другое: «Здарылася гэта адразу пасля вайны. Калі быць дакладным, дык вайна яшчэ кроватачыла недзе пад Берлінам, але Макар з ёю ўжо, можна сказаць, шчасліва развітаўся. Ён добраахвотна ў пачатку вайны пайшоў у партызаны. Там быў лёгка паранены... Ажаніўся Макар у год, калі вайна пачалася. Жонку выбраў сабе па каханні. Была яна не злаблівая, ціхая, вельмі чулая жанчына, хоць асаблівай прыгажосцю і не вылучалася. Да вайны вывучылася на рахункавода. Працавала ў МТС. Бацька яе быў свяшчэннік. Міравы попік, казалі, быў. Збіраў на вялікадня ў прыхаджан харчы і зносіў іх у лес партызанам.

За гэтую рызыкоўную аперацыю фашысты яго і расстралялі. І што паразіты прыдумалі. Выкапаў ён дол. Яны паставілі на краі яго і ягоную матушку. Потым галоўны афіцэр гаворыць, каб матушку адпусцілі. Перахрысціў свяшчэннік жонку і кажа: «Жыві, бог цябе ўтрымае», а яна да яго назад, побач стала. Дык вось... Казалі, што ўначы, пасля іх смерці, званы самі званілі. Містыка, канечне, а ўрэшце мы нічога да канца не ведаем. Нам цяпер, аморфным рацыяналістам, атрафіраваным рамантыкам, не зразумець. Развучыліся мы марыць, зняверыліся. Як падкінулі абяцанку, што да камунізму... рукой падаць, а людзі ж усё бачаць і разумеюць... Я так лічу, знайшоўся смелы чалавек, працягнуў доўгую вяроўку, вось званы і званілі. Засталася дачка свяшчэнніка адна. Яна пра смерць бацькоў і не ведала, бо жыла з Макарам у другой вёсцы.

У вайну людзі да смерці хутка прывыкалі. Але нечаканая смерць бацькоў, відаць, вельмі ўзрушыла жонку Макара, якая і без таго гора лішку хапіла — жыла адна ў чужой вёсцы. Макар наведваўся з лесу рэдка. Яго можна зразумець. Па прыродзе сваёй ён быў чалавек асцярожны, ведаў, што ў ягонай вёсцы акрамя паліцаяў жылі і ворагі яго жонкі.

Прасіў жонку прыходзіць да яго ў лес, у дом лесніка.

Яна хадзіла восем кіламетраў туды ды назад. Хто ведае, адкуль на чалавека хвароба нападае. Можа, і гэтыя паходы ў дождж і холад пры дрэнных харчах справацыравалі туберкулёз. Карацей, вызвалілі вёску. Чакае хворая жонка свайго Макара-партызана.

Месяц яго няма, два. Тут людзі ёй і кажуць, не чакай, маўляў, бо ты хварэеш на сухоты, ён не прыйдзе, таму што другі месяц жыве ў адной удавы ў суседняй вёсцы. Як ён прыбіўся да яе, ніхто не ведае. Можа, маці Ніне не ўсё і казала. Адзін выпадак дзяўчына запомніла сама, калі дзядзька Макар іх вельмі аднойчы сярод ночы напалохаў.

Прывёз ён дзве торбы мукі і загадаў надзейна схаваць, не чапаць, пакуль ён не прыйдзе, і нікому нічога не гаварыць. Дзе ён узяў гэтую муку, не ведалі, не даведаліся і тады, калі ён да іх жыць прыйшоў. Маглі толькі здагадвацца. Казалі, што партызаны правялі смелую аперацыю і нібыта захапілі шмат харчоў, завезлі ў свой лагер. Макар нейкім чынам, відаць, украў гэтыя дзве торбы мукі і схаваў іх у надзейным месцы, не ў хаце хворай жонкі, а ў незнаёмай удавы. Ведаў: там ніхто шукаць не будзе.

Толькі ўзімку сорак шостага, Ніна добра помніць гэта, ёй было ўжо сем гадоў, Макар упершыню дазволіў спячы з гэтай мукі хлеб. Чаму запомніла? Бо ёй вельмі ж хацелася гэтага духмянага хлеба з печы. Яна ўхапіла з бляхі гарачую булку, апякла далоні. Ніна ад нечаканасці ўпусціла хлеб, і ён пакаціўся да дзвярэй, да памыйнага вядра. Макар угледзеў гэта з другога пакоя, кінуўся, як п'яны, да Ніны і ўдарыў яе па твары. «За што, Макар? Яна ж дзіця?» — не вытрымала жонка. «Мне яе шкада, але няхай прывучаецца да парадку і дысцыпліны. Нельга так хлеб свінячыць. Ведаеш, як ён мне дастаўся? Вось так. Я не скнара. Кармлю вас і карміць буду».

Я так думаю, яму было тады гэтага хлеба шкада ўсё ж. Мужык ён быў хітрэнны. У швейцарах калі быў... тры, пяць капеек сабе заўсёды пакідаў, калі папросіш, бывае, яго купіць у буфеце цыгарэт.

Паглядзеў бы, як мяняўся яго твар, калі яму давалі на чай рубель, тры. Нам не дадзена перажываць за іншага чалавека. Не ведаю, што было ў яго ў думках, калі ён еў духмяны хлеб, ведаючы, што ў суседняй вёсцы ад голаду памірае яго першая жонка. Ёсць людзі цвердаскурыя, пакуль не прыйдзе іх час паміраць, яны жывуць без спачування ўсяму жывому. А потым ім хочацца адкупіцца. Жонка памерла. Знайшлі Макара, кажуць, забірай з бальніцы,

пахавай. Макар не ў час акурат руку зламаў, стаў адгаворвацца, маўляў, і паранены, і рука баліць, да таго ж і жыў ён з ёю нядоўга, няхай бальніца пахавае. У вёсцы засталіся адны бабы. Каго ў войска забралі, хто загінуў у партызанах.

Аднарукі фельчар са старых дошак так-сяк збіў труну, на века адна дошка і засталася. Стаміўся ён, хоць і жонка дапамагала... Пакінулі труну ў магіле, сіл закапаць у іх не засталося, вырашылі завяршыць работу раніцай. Ды і холадна ранняй вясной было.

Вясковыя могілкі былі адны на дзве вёскі. Месца высокае. Дрэвы, кусты. Суха. І я помню, мы любілі гуляць па старых могілках. Слухай далей. Ніна бегла з дзецьмі і не змагла пераскочыць цераз свежую магілу, упала на труну. Калі ж убачыла бела-сіні твар нябожчыцы, знямела, не змагла паклікаць на дапамогу. Дзеці загуляліся і не заўважылі, куды збегла Ніна.

Пачалі яе шукаць ужо ўвечары. Абышлі ўсе хаты. Нідзе не было. Вырашылі, што начуе ў сяброўкі ў суседняй вёсцы. Знайшла Ніну раніцай паштальёнка, яна ж і прынесла дзяўчынку дахаты.

Праз многа гадоў, калі я з ёй быў добра знаёмы, яна расказвала мне пра гэты выпадак, казала, што нябожчыца ляжала ў труне з адкрытымі вачыма.

Павезлі тады малую Ніну да шаптухі, выганялі па-народнаму спалох. Дзяўчынка вельмі змянілася. З часам зрабіўся раздражнёным і нервовым і Макар. Жонка — яна ўжо нарадзіла яму дачку — тую самую, муж якой на «Масквічы» ездзіў са мной на кінастудыю, заўважыла азлобленасць Макара, яго нецярпенне да Ніны. Макар, як шалёны, бунтаваў, раіў аддаць Ніну ў дзіцячы дом, маўляў, «дачку загінуўшага салдата возьмуць». Калі ж Ніна падрасла, настойваў выправадзіць у сталіцу «на свой хлеб». Жыць было цяжка. Макар хварэў, а больш піў. Доўга не разумела жонка: за што ён так люта ўзненавідзеў яе старэйшую дачку? Чым перашкаджала яму ціхая, паслухмяная, нават нелюдзімая Ніна? Выпіў ён аднаго разу, яна і пачала дапытвацца прычыны.

«Вочы яе бачыць не магу! Забі мяне гром! Не яе гэта вочы, не яе. У яе вочы маёй першай жонкі. Аслабадзі ты мяне ад яе, дай спакой, няхай з'едзе з хаты. Як сядзе ды ўтаропіцца на мяне, як нажом па горле. Мяне ў жар кідае, рукі дрыжаць. Няхай з'едзе. Не маленькая. Не прападзе. Я ёй у горад пасылкі з салам дасылаць буду. Сарвацца магу, тады за сябе не ручаюся. Я за жыццё і нашай Люсі

баюся... Чорт ведае што ў яе на вуме. Пырне нажом, і ўсё. Яна ж пасля той ночы на могілках форменная вар'ятка зрабілася. Не ў парадку ў яе з галавой. Ты прыгледзься».

Аднаго разу і сапраўды ён не ўтрымаўся, ударыў Ніну: «Не глядзі на мяне так, гадзюка, не глядзі!»

Вось пасля таго разу жонка змірылася. Знайшліся ў Мінску знаёмыя ці нават сваякі. Вывучылася Ніна на тынкоўшчыцу, пасля перайшла на вадзіцеля тралейбуса. Я пазнаёміўся з ёй на танцах у Доме культуры будтрэста № 1. Менавіта на яе вочы і звярнуў увагу. Іх апісаць пад сілу толькі Высоцкаму. Вось у Расіі які спявак ёсць. Цуд. Дастанеш дзе запісы, цягні і мне. Я тады ў клубе ўжо смелы быў, таму-сяму навучаны. У першы ж вечар палез да яе... ды атрымаў адлуп. Я быў «пад мухай». Яна пашкадавала мяне, «вялікага кінематаграфіста», я ўмеў ужо тады мазгі пудрыць. А тут яшчэ такі нумар выкінуў, перакінуўся на яе сяброўку. Нічога. Перажыла і гэта. Я са сваімі былымі не сваруся, застаёмся сябрамі. Так і з Нінаю. Пасля яна ўжо завербавалася ў Мурманск.

Помню, цягнуў яе ў «Каменную кветку». Кажа, не хачу туды, там працуе адзін чалавек, які мне непрыемны. Я прычапіўся, раўнівы быў, кажу хто? Вось яна тады пра Макара ўсё і расказала. Ён у Сцяпянцы дом купіў, пераехаў у сталіцу. Бач, не даў бог сваёй смерці. Мажліва, і ёсць там на небе гэты мудры стары? А то мы ўсе пад барабан ды горн салютавалі. Толькі партыйным лідэрам.

Сава ў бога не верыў. Падумаў: «Дурань Макар. Навошта было вешацца, калі чалавек і так ўсё роўна памрэ?»

Галіна паступіла ў інстытут народнай гаспадаркі, перабралася ў інтэрнат ля самай чыгункі, насупраць тлумнай аўтобуснай станцыі, і трэцяга верасня паехала на бульбу.

Сава паспеў наведаць яе ў інтэрнаце. Праверыў, з кім яна будзе «існаваць» у адным пакоі і ці ёсць па суседству пакоі для хлопцаў.

У апошні час яны сустракаліся ўсё радзей і радзей. Аднаго разу, падазраючы Галіну ў сувязі з курсантам і жадаючы кінуць ёй абвінавачванне, ён высачыў іх ля Палаца спорту на канцэрце грузінскага ансамбля «Арэра». Усю дарогу ад Палаца спорту да праспекта курсант трымаў Галіну за руку. Гэта не спадабалася Саву, але і было нязначнай дробяззю, каб учыніць сцэну рэўнасці. З Талачынскага раёна, куды паехалі студэнты, Сава атрымаў два

кароткія сухія лісты, дзе, ён звярнуў увагу, у канцы не было слова «цалую».

Ён паслаў ёй паштоўку з яшчэ больш кароткім тэкстам, у якім знарок падкрэсліў два словы «Цалую. Твой С.».

Памутнелі ўспаміны аб марозных вечарах на хутары, аб дарозе ў школу, першых пацалунках. Здавалася яму ўсё тое нейкім далёкім сном, і ад успамінаў душа не абуджалася салодкім болем, як было раней, не замірала ў надзеі на новую сустрэчу.

Служба яго завяршылася. З граматай. Ён не змог бы з павязкай на вачах і без яе беспамылкова сабраць і разабраць аўтамат, як гэта ўдала рабілі на тэлевізійных перадачах салдаты. Ён не задумваўся: добра гэта ці дрэнна. Яму падабалася так лёгка ісці па жыцці.

Былы ансамбль рэстарана «Спутнік» распаўся. Кіраўніцтва ўсімі рэстараннымі аркестрамі ўзяла філармонія пад сваю ўвагу і кантроль. Скрыпач-кіраўнік не змог перажыць кантролю і прыгнёту яго волі і падаў дакументы на выезд у Ізраіль, з упэўненасцю заяўляючы знаёмым, што за мяжой лепшыя бары чакаюць яго.

Да здзіўлення, візу на выезд ён атрымаў у вельмі кароткі тэрмін. Даехаў да Брэста. Хадзілі чуткі, што амаль на парозе таможні зваліў яго інфаркт. Вярнулі цела ў сталіцу і пахавалі. Ансамбль разваліўся. Калі быць шчырым, Саву не хацелася назад у рэстаран. «Наеўся» ён музыкі. Цягнула да сябе першае яго «каханне» — кінастудыя: дарогі, экспедыцыі, гасцініцы, жанчыны.

Чакатоўскі, калі даведаўся, што Сава зноў на кінастудыі і зараз у якасці адміністратара, руку падаў, але з жалем сказаў: «Ты не разумееш, і ніхто ў нас не разумее, што такое асвятленне. Колер — гэта пачуцці, тон, сюжэт. Гэта першы эфект у кіно. Акцёр без святла нішто. Гэта фантазія». Сава пачаставаў сваіх «светлячкоў» добрым вінОм. Цяпер у яго кішэні заўсёды вадзіліся грошы і свае і студыйныя, падсправаздачныя. Чакатоўскі за шчодрасць пачаў паважаць Дыма. Сава хутка вывучыў няхітрую механіку наёмнай працы ў кінагрупе і яе аплату. Ён так прафесійна маніпуліраваў рахункамі-распіскамі на аплаце за пагрузку, разгрузку, падвоз, арэнду, так хутка ўступаў у махлярскую змову з такелажнікамі, удзельнікамі масавых здымак, што нават вопытны Лявон, падпісваючы фальшывыя распіскі, не прыкмячаў падлогу. Кінематаграфістаў паважалі як шафё-

раў у трыццатыя гады, асабліва богатварылі дзеячаў экрана ў раёнах і невялічкіх пасёлках, дзе яшчэ верылі ў магічную сілу кінаплёнкі і выключнасць людзей, якія здзяйсняюць гэткія цуды. Часта, спекулюючы на гэтай павазе і даверы людзей, Сава шмат што атрымоўваў у мясцовых улад дарма і ўжо пасля вышукваў надзейных людзей і складаў фіктыўныя дакументы. Здаралася, на студыю нечакана налятаў рэвізоры — выяўлялі падлог і фінансавыя парушэнні. Адна справа набыла досыць шырокі і непрыемны рэзананс, і вінаватых, як за іх ні змагалася кіраўніцтва, давялося аддаць усё ж пад суд. Ды Сава быў дробнай рыбкай.

Яму шэнціла, магчыма, што выбіраў надзейных людзей, быў упэўнены, што не падвядуць, ды і рэвізоры не звярталі ўвагі на дробныя парушэнні: на тры, пяць, няхай дзесяць рублёў. Найчасцей ролю падстаўной асобы выконваў стары прыяцель Міхась Сокал. «Дзяржава, Міхась, ад украдзеных мною і табою дзесяці рублёў не збяднее. Дзяржава мне за маю працу да поту недаплачвае. Колькі, ты думаеш, каштуе фільм? Трыста тысяч, пяцьсот. Такія грошы і за што? Усё ж... макулатура... а народ маўчыць, бо яго казачкамі ўкалыхваюць. Эх, павяду цябе ў Дом кіно, там круцяць замежныя фільмы, не для ўсіх, канечне, для спецыялістаў. Феліні! Вось гэта кіно. А мы закамплексаваны на партызаншчыне. Я пасля гэтых закрытых праглядаў нашы дубовыя фільмы не магу глядзець. Я дастану табе запрашэнне альбо папрашу аператара, ён член саюза кінематаграфістаў, мае права правесці з сабой аднаго чалавека. Такі секс выдаюць! І не снілася. Феерверк! Я цябе вазьму разам з Раяй і Зінай». Так, абяцаючы залатыя горы і мора асалоды, Сава ўгаворваў Міхася на новую авантуру. Трэба было тэрмінова — у кіно заўсёды тэрмінова — транспарціраваць да чыгуначнага вакзала ігравы бранявік, пагрузіць на платформу, аформіць усё і адправіць у Гродна. Сава прасіў толькі пасядзець у кабіне браневіка, падстрахаваць яго, Саву, які сеў за руль сам. Вадзіцель студыйнага «газіка» (Сава наняў яго за чырвонец) згадзіўся адбуксіраваць бранявік да вакзала. Вырашылі ехаць кальцавой дарогай, далей ад прыдзірлівага вока міліцыі.

Міхась, высунуўшы галаву з маленькага люка, падказваў Саву: «Давай управа... а зараз прама... Рыхтуйся, будзе паварот». Было нават весела. Не спяшаліся... ішлі кіламетраў дваццаць у гадзіну. На першым жа скрыжаванні гарадскіх вуліц гэтую цыркавую кавалькаду, прыпыніў

невядома скуль наляцеўшы матацыкліст-даішнік. Упарты служка закону, якому было глыбока, як кажуць, начхаць на магічнае слова «кіно», прычапіўся да таго, што імі былі парушаны правілы транспарціроўкі: бо ні ў Міхася, ні ў Савы не аказалася правоў вадзіцеля. Даішнік забраў тады правы ў шафёра «газіка». Трэба было выручаць бязвіннага, і Сава, непрыкметна для ўсіх — а назбіралася трохі і старонніх людзей, сунуў міліцыянеру чырвонец.

— Мы вінаваты. Вазьміце штраф. Здачы не трэба. Я вас прашу, вярніце яму правы. Ён сірата. У яго бацька загінуў на падводнай лодцы ў Ледавітым акіяне. Сын героя. Для яго ж гэта трагедыя, бо ўжо аднойчы на год пазбаўлялі,— плёў Сава.

Міліцыянер маўчаў, потым пачаў нешта шукаць у сваёй сумцы-планшэце.

Тады Сава дастаў яшчэ дзесяць рублёў і даў даішніку.

— Я вас прашу, суправадзіце нас да вакзала. Не хочацца лішніх эксцэсаў. Мы здымаем вялікае рэвалюцыйнае палатно. Асабіста таварыш Машэраў курыруе нашу групу. Рэжысёр — лаўрэат Дзяржаўнай прэміі, народны артыст рэспублікі Ілля Ваданос. Не чулі?

— А-а-а,— зацягнуў міліцыянер. Невядома, што ўздзейнічала больш на прадстаўніка закону: грошы, імя народнага ці ўпамінанне першага сакратара ЦК КПБ. Ён згадзіўся экскарціраваць бранявік.

— Ну, даеш елкі-палкі,— здзівіўся Міхась.

— Ха! Хочаш жыць, умей круціцца,— адказваў весела Сава,— людзі падзяляюцца на тры катэгорыі: адны бяруць хабар адкрыта — падарункі, сувеніры, грошы,— другія бяруць закрыта тое ж самае, толькі ў другім месцы, і трэцяя катэгорыя — хто бярэ ўсюды і заўсёды. Ён распішацца ў мяне ў рахунку-распісцы за тры рублі — аплата за суправаджэнне іgraвога транспарту. Я ж пасля лічбы тры падстаўлю нулік і атрымаецца, што мы квіты. Не слухай пра псіхааналіз, дэпрэсію, пакажы чалавеку рубель, а лепш долар, і ён адразу прасвятлее.

— Так... адміністратарам я не змог бы. Не ўмею я ладзіць з людзьмі. Я дэталь зашугучу ў станок і шурую... ні станок, ні дэталь мяне не крытыкуюць, не могуць зняважыць. З людзьмі цяжка. У мяне майстар... не прывядзі божа... Шалёны сабака ў параўнанні з ім святая істота.

— Міхась, а дзе ты людзей бачыш? Гэта пісьменнікі навязалі нам ідэалы, герояў розных напрыдумалі... Чалавек слабы, трэба толькі вывучыць яго слабасці, і з ім будзе

лёгка. Я па вачах часам бачу, хто чым дыхае. Чхаць ён хацеў на ідэалы, дай напачатку чалавеку зарабіць. Ставіцца да ўсіх трэба проста, без захаплення і пакланення перад чалавекам як вянцом прыроды. Усе з грахом, ва ўсіх рыльца ў пушку. Пасада, званне, адукацыя — добра для грошай. Сутнасць — першым паспець да карыта. Здымаўся ў нас адзін народны артыст. Бабы нашы адурэлі: чай, каву ў тэрмасе, у рот яму глядзелі — ах, ой, ох... Геній! Здымалі ў памяшканні тэатра, доўга рыхтаваліся. Падзывае народны да сябе дырэктара тэатра. Той, як лізаблюд, на задніх лапах. Як угоднік. «Слухаю».— «А скажы, мілы чалавек, колькі гледачоў можа запоўніць тваю залу?» Дырэктар збялеў. Думае, мо нешта наконт плана, цэн на білеты... «Дзвесце пяцьдзесят» — адказвае. Народны і звяртаецца да нашай мужчынскай кампаніі: «Вось, мілыя мае, роўна столькі ў мяне было жанчын. Гэта дзесьці дзесятае месца ў Маскве. У Берыі было дзевяць ордэнаў Леніна і сем тысяч наложніц». А вы лічыце, што мы кіно здымаем? Мастацтва — гэта завуаліраваная распуста. Мы выхаваны з табой на чэкістах і стаханаўцах, закліках, сустрэчных планах... я не хацеў згаджацца з народным артыстам. А з гадамі яму ўсё больш веру. Усё правакацыя. Эфемерныя ідэі нараджаюцца і паміраюць. Сацыялізм мусіць даваць адно — болей зарабіць. Цяпер усе горад хаяць. Хлусня. Як успомню наша жыццё на хутарах з блохамі, клапамі, цяжкую працу... як кажуць, косці ламае, вочы коліць. Вось такія пірагі з макам.

— А я, паверыш, пачаў сумаваць па хутары. Сорак гадоў стукнула, і засумаваў,— казаў Міхась.

— Гэта часова. Там туга непралазная.

Міхась упершыню пазайздросціў Саву, яго самаўпэўненасці, яго волі. На пагрузку ўтрубілі чатыры гадзіны. Міхась спазніўся на змену:

— А чорт з імі... Было два прагулы, будзе тры. Не звольняць. Я перайшоў у ліцейку. Формы для штамповак робім. Не знойдуць яны ахвотнікаў на маё месца. Няма сярод гарадскіх дурняў восем гадзін пыл глытаць. Рэспіратар насунеш на морду, дыхаць немагчыма. О, як...

Увечары на кватэры ў Міхася адсвяткавалі пагрузку браневіка.

П'янага Міхася заўсёды цягнула да жанчыны, і ён як заведзены набіраў тэлефон Раі.

— Адключыла, падла! Я пайду да яе. Ты пасядзі.— І ён, каб скараціць шлях, саскочыў з балкона, ды няўдала, не змог устаць на ногі, клікнуў Саву.

Дым узваліў сябра на плечы і ўцягнуў яго ў кватэру.

— Ат, невязуха! Колькі разоў скакаў... і балкон нізка. Як пракляў хто.

Міхась паспрабаваў стаць на правую нагу і не змог.

— Давай выклікаем «хуткую»!

— Не! Ты што? Бюлетэнь не выпішуць. Ведаеш, якія ў нас прафсаюзныя законы? Прычэпяцца — не ў рабочы час, і ўсё, хана. Заўтра раніцай аднясеш мяне разам з Мікалаем Кандратавічам на аўтобусны прыпынак. Дарога да работы ўжо ўваходзіць у рабочы час. Вось туды і выклічам «хуткую». Камар носа не падточыць. Заадно і прафорг цэхкома будзе сведкам. Роўна ў сем трыццаць ён садзіцца ў аўтобус.

— Далёка несці прыйдзецца. Метраў трыста. Можа, на таксі? — засумаваў Сава. Яму не хацелася ўставаць так рана.

— Нельга матор заказваць. Таксіст можа быць сведкам ды і суседзі... У мяне з імі міру няма. Раніцай вуліца бязлюдная. Ідзі пакліч Мікалая Кандратавіча, трэба з ім дамовіцца. Я так паўгадзіны паляжу, і ўсё ў ажуры.

Суседа ў кватэры не было, маладая пара (яны адчынілі дзверы) сказала, што ён не вярнуўся з Палесся. Маладыя здымалі яго кватэру, як даведаўся Сава, заплацілі Мікалаю Кандратавічу на год уперад.

Пачуўшы гэту навіну, Міхась знік. Моцны боль ацвеpaзіў яго. Ён пазваніў аднаму знаёмаму, другому... усе пад рознымі прычынамі адмаўляліся.

— Ніхто не можа?

— Ану іх усіх на... Калі ім трэба... лес на дачу, мэблю на адзінаццаты паверх без ліфта, падлогу перакладваць... дык Міхась заўсёды гатовы, як піянер-робат. Адзін згадзіўся. Толькі гаворыць, давай зараз цябе туды занясём, бо заўтра ў яго справы. П'яны. Не ўрубіўся. Яму б толькі з хаты цягнуць. Дык я мушу, мазгі яго курыныя, усю ноч ляжаць на марозе. Ідыёт.

— Міхась, не нервуйся так. Далібог, на таксі замчым, ніхто не заўважыць.

Міхась катэгарычна адмаўляўся, пазваніў апошняму сябру — Раі. Пачуўшы пра яго няшчасце, яна хуценька прыбегла. Прыбрала стол, пасмажыла свініны, якую прынесла з дому, і ўсю ноч прасядзела ля хворага, прыкладвала да яго нагі халодныя прымочкі. Доўга не мог заснуць на старой знаёмай яму раскладушцы і Сава. Адвык. Цяпер ён жыў у інтэрнаце кінастудыі, разам з Лявонам у яго па-

койчыку. Ляжаў Дым на кухні і ўспамінаў Леакадзію. «Цікава, ці выйшла яна замуж? Амаль год не сустракаў. Нават дзіўна. «Багіня», «царыца», «адзіная»... Чаму ён тады так яе ахрысціў? Звычайная баба, якая не ўмее адмаўляць мужыку, мажліва, не адмаўляе не толькі яму аднаму. Цікава, а вось калі б ён зламаў нагу? Ці прыбегла б Леакадзія, як Рая, па першым званку? Галіна прыбегла б, а Леакадзія? Не ўпэўнены, не ўпэўнены».

Ён заснуў. Раніцай з цяжкасцю прымусіў сябе адплюшчыць вочы. Рая ўжо тройчы стукала ў шкло кухонных дзвярэй.

Міхась кульгаў, абапіраючыся на плячо сябра амаль да прыпынку. Калі ж заставалася метраў пяцьдзесят, Сава ўзваліў яго на плечы і панёс. Рая, падтрымліваючы хворую нагу, тупала побач.

— Хопіць! Харэ! Апускай на зямлю.

Міхась упаў на асфальт ля лаўкі, нібыта торба з пяском.

— О'кэй! Я паляжу, а ты давай да тэлефона-аўтамата. Давай сюды «хуткую».

— Міхась, ты ж прастудзішся. На хоць куртку пад бок пакладзі. Ныркі ж застудзіць можна,— хвалявалася Рая.

— Ныркі дробязь, галоўнае што-небудзь іншае не застудзіць,— жартаваў Міхась.

Ніводзін з трох тэлефонаў-аўтаматаў не працаваў. У адным наогул была адарваная трубка. Сава з Раяю пабеглі ў розныя бакі, шукаць іншыя тэлефонныя будкі. Мінула добрых сорак мінут, пакуль нарэшце прыехала да небаракі «хуткая дапамога». Ён трымаўся, бо ўсё ішло па задуманым плане.

— Што ж гэта ты, Міхайла, на роўным месцы ногі ламаеш,— не хацеў верыць хударлявы старшыня прафкома, які падышоў да Сокала на прыпынку, пачаставаў яго цыгарэтай.

— Калі б ведаў, дзе ўпадзеш, дык саломкі падкінуў бы. Спяшаўся на работу. Вы ж самі падганялі, план гарыць, канец месяца, канец квартала.

— Ты ўпэўнены, што перадом? — сумняваўся прафсаюзны важак,— можа, усё ж вывіх?

— Не. Пералом. Баліць вельмі.

— Ладна. Ты на бюлетэні доўга не сядзі. Стаж у цябе бесперапынны, хаця не, здаецца, перапыняўся. Бачыш, як кепска, сто працэнтаў плаціць не будзем.

— Ведаю. Як толькі гіпс знімуць, адразу і выйду,— Міхась з палёгкай уздыхнуў.— Добра быць свяшчэннікам.

— Чаму? — не зразумеў Сава.

— Яны не бяруць бюлетэні. Ім у храмах вераць на слова.

— Шкада, што не веру ў бога, пайшоў бы ў папы.

Ужо збіраючыся ехаць на кінастудыю, Сава спытаў у Раі:

— А Леакадзія выйшла замуж ці не?

— Не. Цяпер лягчэй чырвонец на дрэве знайсці, чым выйсці замуж. Што яна звар'яцела, браць новага п'янтоса сабе на шыю.

На душы ў Савы ад гэтай навіны як быццам павесялела. Яму было прыемна, што яны кружаць вакол яго: аморфная Леакадзія, разумная Галіна, наіўная Ірына. Ён не рабіў выбару. Але ж пакуль яны поўнілі яго жыццё сэнсам. Турбавала адна Галіна. Тры гады ў сталіцы змянілі яе характар. Ніколі, як ён яе ні ўгаворваў, яна не заставалася ў яго ў інтэрнаце на ўсю ноч. А яму, у сваю чаргу, не хацелася цягнуцца праз увесь праспект да яе інтэрната.

Былой радасці, калі ён вяртаўся з камандзіровак, на яе твары ён не заўважаў. Яна хуценька апраналася, яны ішлі ў кафэ альбо ў кінатэатр «Цэнтральны» на любы фільм. Нешта нябачнае падтачвала іх першае пачуццё. Бывала, ні з таго ні з сяго ён пачынаў у мінуты раздражнёнасці дакараць яе курсантам.

— Ну, навошта мы хлусім сабе, Сава? — казала Галіна.— Я ж не трэба табе. Цела хіба што, але ж не душа. Так?

— Ат, не будзем камплексаваць. За камандзіроўку мы адвыклі адно ад аднаго. Гэта натуральны працэс, але ён нявечны, усё міне.— І ён абдымаў яе, цалаваў.— Мы паспяшаліся ўжо адзін раз. Будзем надалей асцярожныя. У мяне няма ўпэўненасці ў будучыні, на жаль. Я не арол, гэта ён адзін глядзіць на сонца не міргаючы. Рана распісвацца... мы слабыя. Я еду ў Ашхабад... Ты адна... На кінастудыі мне абяцалі кааператыў. Ты за гэты час закончыш інстытут, я паступлю на завочнае ў тэатральны. Больш-менш надзейная перспектыва.

— Так, так,— манатонна згаджалася яна.

Сава пачынаў паўтарацца і з кааператывам, і з інстытутам. Калі яны развітваліся ў калідоры ці ля акна і строгая дзяжурная не пускала яго на чацвёрты паверх, дык у абаіх з'яўлялася пачуццё палёгкі. Ён ішоў на вакзал, выпіваў шклянку гарачай кавы з піражком, садзіўся ў тралейбус і доўга ехаў да кінастудыі, паспяваючы па дарозе пазнаёміцца з якой-небудзь спадарожніцай. Здаралася, ён заводзіў знаёмствы і з аднакурсніцамі Галіны. Кінулася ў вочы Томка

з шырокай добразычлівай усмешкай. Яна, каб зарабіць да стыпендыі лішнюю капейчыну, здымалася ў масавых сцэнах на кінастудыі, дзе яе прыкмеціў і запрасіў у студыйнае атэлье жвавы фатограф Фелікс, які шукаў натуршчыцу «суперабаяльнасці» («супер» — было яго любімае слова).

Сава не цікавіўся, ці заплаціў дзяўчыне Фелікс, аднак ён ведаў, што здымаў ён яе ў розных ракурсах, колькі хацеў. Гэтыя фатаграфіі Дым на свае вочы бачыў у Фелікса. Усё ў гэтай Томкі было на продаж: усмешка, вычварныя манеры, смех з прычыны і без прычыны.

Сава, чакаючы Галіну стаяў на чацвёртым паверсе ля акна і гартаў часопіс «Советский экран». Яна амаль вылецела з дымнай кухні інтэрната.

— Колькі зараз гадзін?

— Томка? Прывітанне!

Яна здзівілася. З Савам яна сустрэлася ўпершыню.

— Няўжо не памятаеш? На кінастудыі нас знаёмілі. На калідоры. Фелікс.

Пры слове «кінастудыя» ўсё стала на свае месцы. Яна эфектна ўдарыла сябе рукою па лбе, усміхнулася.

— Прывітанне. З цяжкасцю, але ўспамінаю.

— Сава. Маё імя Сава.

Ён абхапіў яе за талію, нахінуўся і злёгку, як камар, датыкаўся сваімі вуснамі да яе шчакі.

— Ты пахарашэла.

— А ты што тут робіш? Зноў масоўку збіраеш?

— Ды не. Знаёмага чакаю. Давай сустрэнемся ля кафэ «Вясна»?

— Там не хачу,— капрызна адказала яна.

— Добра. Тады каля Дома афіцэраў.

— Далёка. А бліжэй нельга?

— Пра што гаворка. Буду ў дваццаць нуль-нуль у скверыку насупраць вашага інтэрната.

— Цвёрда не абяцаю... мажліва, я буду, калі не будзе кансультацыі. Галава дурэе ад гэтай вучобы. Затравілі навуковым камунізмам і рознымі філасофіямі.

— Буду чакаць.

Томка прыйшла пяць мінут а дзевятай. Ён пачаставаў шакаладкай: ёй гэта спадабалася. Трымалася яна вельмі вольна, амаль развязна, дазваляючы яму цалаваць сябе колькі хоча, праўда, адказвала на пацалункі суха. «Халодная, відаць, як бонза. А можа, фрыгідная?» — думаў Сава.

— Губы баляць ад пацалункаў. Давай пакурым. Нешта расслабілася я зусім,— і яна злёгку адштурхнула яго.

— Нічога жахлівага няма.

— Вам што... нам пасля расхлёбваць.

— А ці вы не марыце аб гэтым? Ці ж не хваліцеся вечарамі сваімі хлопцамі, не пералічваеце іх?

— Мая душа — пацёмкі. Я нікому нічога не расказваю. Я мару ў адзіноце.

— Пра што?

— Хітры. Усё табе раскажы. Мару ўдала выйсці замуж. За сына якога-небудзь высокага-высокага начальніка. У нас да адной ходзіць сын першага сакратара абкома... О-о... ёй увесь курс зайздросціць.

Сэрца ў Савы ёкнула, падумалася, што гэты сын ходзіць да Галіны.

— А з якой групы гэта шчаслівая?

— З дваццаць восьмай.

— А ў якім пакоі яна жыве?

— Усё табе скажы. Ды нічога ў ёй асаблівага няма. Дублёнку бацькі купілі. Прастушка. І мне б купілі, але за што і дзе?

— Я тут курсанта сустрэў. Ён не да вашых ходзіць?

— Ён наведваецца да Галіны Шкода. Яна з простых. Прыгожы хлопец. Мне падабаецца. Але я не хачу замуж за афіцэра. Сядзець дзе-небудзь у чорта на кулічках... у лесе... гэта не для мяне. Люблю горад.

— А ў гэтай Галіны з курсантам сур'ёзна?

— Не ведаю. Я з ёю не сябрую. Яна занадта вясковая. Дзяўчаты, я чула, кажуць, што яны збіраюцца падаваць заяву ў загс.

У Дыма перахапіла дух. Ён страціў усялякі інтарэс да субяседніцы. Хутка пачаў шукаць падставу, каб пакінуць яе. Мінуты праз тры-чатыры ён спахапіўся, маўляў, толькі зараз успомніў, што трэба праводзіць на цягнік Мінск — Масква аднаго народнага артыста.

— Як цікава! Я ўсё жыццё марыла з ім пазнаёміцца. Ой, толькі б, здаецца, адным вокам глянуць,— узрадавалася Томка.

— Не той выпадак. Божа мой, ён прыедзе праз тыдзень, калі ласка, разам пасядзім, павячэраем у рэстаране.

— У рэстаране? Абяцаеш?

— Так.

— Пакляніся!

— Я з тых, хто трымае слова. Ты мне падабаешся.

— Няўжо?

— Павер. Абяцаю, што знайду цябе.

— Я ў пакоі нумар чатырыста дваццаць адзін. Ты запішы.

— Я запомню. Ну, да сустрэчы.

— Да хуткай.

Яшчэ праз мінут трыццаць ён літаральна ўварваўся на чацвёрты паверх, без стуку адчыніў дзверы пакоя нумар чатырыста.

— Пакіньце нас! — звярнуўся Дым да сяброўак Галіны, і тыя моўчкі і паслухмяна выйшлі, глянуўшы яму ў твар.

— Ты чаму ўвесь час мне хлусіш?

— Супакойся. Пра што ты?

— Не прыкідвайся ідыёткай. Ты падала з курсантам заяву? Падала? Глядзі мне ў вочы. Я пытаю, падала? Адказвай, так ці не?

— Пакуль не падалі... але ж...

— Дагаворвай. Давай, давай... смялей.— Твар яго наліўся чырванню.

— Я і не баюся. Збіраемся падаць.

— Ах, сука... падаль... здрадніца... Я яшчэ сумняваўся, ідыёт... верыў, спадзяваўся. А ты скруцілася тут!

Галіна стаяла як укопаная.

— Пакінь мяне, ідзі,— ледзь стрымліваючы слёзы, сказала яна.

— Пайду. Пайду назаўсёды і не азірнуся. Ты здрадзіла нашаму каханню... нізка, подла. Помні, я не вярнуся. Не стану грукаць дзвярыма, выйду без эфектаў. Бывай!

На вуліцы яму раптам зрабілася да болю крыўдна, ён зразумеў, што вось у гэтую самую мінуту ён губляе яе назаўсёды. Ён меркаваў троху збольшага пашчыпаць ёй нервы, ядавіта ўкалоць, напалохаць, маўляў, асцярожна, ён усё ведае, а яно вось куды перахілілася: у нянавісць і азлобленасць. Чаму яна не апраўдвалася, не супакойвала яго, не абняла, не пацалавала? «Няўжо я ёй абыякавы? І гэта пачатак канца?» Быў час, калі яму і самому хацелася дачакацца гэткага моманту, ён нават неўпрыкмет прыспешваў яго, выношваў планы, і вось цяпер, калі ўсё прыйшло само, ён адчуў сябе слабым, зняважаным, не хацелася губляць Галіну назаўсёды.

«Ды што мне іронія Лявона, горкі вопыт Чакатоўскага, схаваны эгаізм Марата, прымітыўнасць Міхася? Я прыгожы, няхай трохі горшы за Алена Дэлона, але ж не раўня ім усім. Разумны, тактоўны, асцярожны, хітры, дасціпны... Усё... Заснуць, забыць. Воля дае сілы. Воля — вышэй кахання. Воля мацуе упэўненасць. У адным можна згадзіцца

з Лявонам: трэба заўжды быць гатовым у гэтай праклятай справе кахання да расчаравання, падману. Трэба з мужнасцю пераносіць згубу».

Даехаў да «Абсерваторыі», пранік у інтэрнат непрыкметна, як тхор, каб нікога не сустрэць. Некалькі разоў падыходзіў да акна, углядаўся ў цемру, з надзеяй убачыць яе: «Няўжо не прыедзе, каб шукаць прымірэння, не пастукае ў шыбу?»

Яна не прыехала. Два дні пад рознымі прычынамі ён прасядзеў у групе ля тэлефона. Галіна не пазваніла. Тады Сава зразумеў, што перагнуў палку, занадта разбушаваўся, і што трэба шукаць падставы, каб павярнуць усё на старое. «Але ж памірыцца... значыць, прызнаць сваю віну? Не... яна, толькі яна мусіць прыехаць з павіннай!»

Непрыемнасці навалiліся на яго як мокрая цяжкая гліна. А тут яшчэ нядаўна яго абралі сакратаром камсамольскай арганізацыі творчага аб'яднання мастацкіх і тэлевізійных фільмаў. Сава Дым адказваў за маладых супрацоўнікаў. Сакратара перавыбіралі штогод з прычыны заняпаду ў рабоце. Пад рознымі маркамі вопытныя асістэнты, маладыя рэжысёры адмаўляліся ад пачэснай выбарнай пасады. Згадзіўся на пост неахвотна, загадзя ведаючы, што больш як два сходы на год правесці, хоць ты лопні, немагчыма. Парторг, яна толькі перайшла з інструктараў райкома партыі на кінастудыю, усяляк падбадзёрвала Дыма.

Як таго і хацеў, Сава паступіў на завочнае аддзяленне рэжысёраў народных тэатраў. З гэтага ў вачах парторга меў вагу і аўтарытэт. Да таго ж яму абяцалі паскорыць вырашэнне пытання з кааператыўнай кватэрай. Натхнёны гэтым і абяцаннямі хуткага творчага росту, Сава ўзяўся за невядомую для яго камсамольскую працу.

«Прашу адно: своечасова збіраць узносы і праводзіць суботнікі»,— прасіла парторг.

Ды раптам павялічылі першы ўзнос за будаўніцтва кааператыўных кватэр, і цяпер за аднапакаёўку ён мусіў заплаціць авансу каля дзвюх тысяч рублёў. На такія грошы Дым не мог разлічваць і адразу пыл да новай пасады згас. Гняла знявага: ён хадзіў за кожным камсамольцам і прасіў заплаціць узносы ці прыйсці на сход.

Сустракалі каля кінатэатра «Партызан» Фідэля Кастра, які рабіў азнаямленчую паездку па сталіцы Беларусі. На сустрэчу з правадыром кубінскіх рэвалюцыянераў Сава за нейкую гадзіну запрасіў усіх сваіх вольных камсамольцаў. Кіраваў, апякаў, настаўляў і павучаў прадстаўнікоў кіна-

студыі інструктар райкома Марат Свістун. Надзьмуты і важны, ён сваім выглядам шакіраваў Дыма.

— Прывітанне, Марат,— не вытрымаў Сава.

Свістун нават не заўважыў былога калегу па вайсковым ансамблі.

— Прывітанне, Марат,— зноў паўтарыў Сава.

— Здароў! Здароў! Вы чаму прыйшлі без транспарантаў, партрэтаў Брэжнева, членаў Палітбюро, чырвоных сцяжкоў?

— А нам ніхто нічога не казаў.

— Інструкцыю не перадавалі? Якая безадказнасць! Я праверу.

Ён пайшоў далей, папярэджваючы людзей не выходзіць за межы пазначанай зоны.

Праляцелі міма чорныя «Чайкі». Ля кінатэатра шаноўны госць пакінуў машыну, цёпла, з усмешкай павітаўся з людзьмі і пайшоў у кінатэатр.

— Няхай жыве савецка-кубінская дружба! Віва Фідэль! Віва Куба! — неслася над шматлюдным гуртам. Госць пабратэрску махаў усім рукою.

Народ ззаду націскаў, усім хацелася прабіцца-праціснуцца бліжэй да машыны. Стрымліваць гэткі натоўп рабілася цяжка.

— Таварышы, захоўвайце парадак! — да сіпаты гарлапаніў Марат.

Фідэля спешна пасадзілі ў машыну і павезлі. Людзі хутка пачалі разыходзіцца, хто куды, бо працоўны дзень для іх, як і абяцалі, закончыўся. Сава стаяў і чакаў, пакуль Марат дасць апошнія «каштоўныя распараджэнні». Свістун рабіў выгляд, што не заўважае Саву. Нарэшце бульвар апусцеў, Марат пальцам паманіў да сябе Саву:

— Што ж ты, сябар, зусім запусціў камсамольскую работу. Разваліў установу. Тваё падраздзяленне не паддаецца крытыцы. Па тры, чатыры, пяць месяцаў твае камсамольцы не плацяць узносаў. У трох згублены камсамольскія білеты... яны іх не аднаўляюць. П'янствуюць. Колькі сігналаў з медвыцвярэзніка. І ніводнага баявога сходу за апошнія чатыры месяцы. Калі я даведаўся, што ты ўзначальваеш гэта галоўнейшае звяно студыі, я пачырванеў ад сораму. Парторг і мы ўскладваем велізарныя надзеі... не падводзь камсамол, ЦК і партыю. Ты ж сазнацельны элемент, авангард. Не ведаю, не ведаю... мы з цябе строга спытаем.

— Ты, Марат, нібыта з Марса зваліўся. Хто цяпер камсамол сур'ёзна ўспрымае? Чатыры разы я збіраў сход і

чатыры адкладваў. Кворуму не было. Усяго пяцёра з дваццаці васьмі і прыходзіла. Усе вашы інструкцыі, пастановы... дутыя. Няхай, я так лічу, будзе адзін сход, але дзелавы, а не папяровы.

— Па-першае, на людзях ты канчай фамільярнасць і панібрацтва: «Марат», «Марат»... Я для цябе Марат Эдуардавіч. Па-другое, дарагі мой, нам ніхто не дазваляе адступаць ад Статута. Кепскаму танцору, даруй за грубасць, сам ведаеш, што перашкаджае. Апошні раз папярэджваю: выпраўляй становішча. Не падводзь у цэлым здаровы калектыў. У цябе могуць быць непрыемнасці.

Глянуў на Свістуна Сава і ледзь стрымаў смех, бо падаўся яму апаратчык у сваёй напускной сур'ёзнасці і разумнасці вельмі бутафорскім.

— Паслухай, Свістун, ты сур'ёзна ўсё гэта гаворыш ці не разумеючы спецыфікі работы нашай установы з яе пастаяннымі камандзіроўкамі? — не вытрымаў Дым.— Я хацеў выпіць з табой бутэльку віна, пагаварыць, успомніць войска. Што ты з мяне ідыёта робіш ці казла адпушчэння?

— Я цябе папярэджваю: ні сувязі, ні сяброўства не ўратуе. Знімем цябе. Вынікі будуць сумныя.

— Толькі не палохай мяне. Я гатовы гэта ярмо перадаць табе хоць зараз. Вазьмі вось гэтую папку. Тут спісы, ведамасці, інструкцыі... пісулькі. Трымай! — Дым сунуў у рукі разгубленаму Марату сваю карычневую папку.

— Ты што ачумеў?

— Гэта ты ачумеў.

— Ну гэтага я табе не дарую! Цябе не тарыфіцыруюць, запомні... пра кватэру забудзь. У нас ветэраны, якія кроў пад Берлінам пралівалі, па дзесяць гадоў стаяць у чарзе. Помні, што мы і твой інстытут курыруем. Можаш паставіць на сабе крыж.

— Пайшоў ты на...— праглынуў апошняе слова ўзбуджаны Сава.

Праз два месяцы — усё неяк адно да аднаго — здарылася ЧП і ў групе адміністратара Дыма. На натурнай пляцоўцы (недалёка ад сталіцы) увечары асістэнт аператара стрэліў з паляўнічага ружжа ў жывот вадзіцелю грузавой машыны, якога завезлі ў раённую бальніцу, дзе ён праз дзве гадзіны сканаў.

Сава не быў сведкам сутычкі паміж асістэнтам і вадзіцелем, ды і самой сваркі не было, быў п'яны разгул: рэзаліся да памутнення мазгоў у карты, тупелі без работы. Група тыдзень не здымала, чакалі маладую артыстку, якая

здымалася аднначасова ў трох фільмах на розных студыях краіны.

Адміністрацыі і вядучых творчых работнікаў на натурнай пляцоўцы не было — яны баяліся вільгаці, не хацелі заставацца нанач у халодных фінскіх доміках. Афіцыйна за дысцыпліну і маральны клімат, як кажуць, адказвае дырэктар кінакарціны.

У той злашчасны вечар, акрамя Савы, ні дырэктара, ні ягонага намесніка, які ўмеў выпіць шклянку гарэлкі без рук, трымаючы толькі зубамі, не было. Мужчыны, якія ўцяклі ад жонак на прыроду, дурэлі ад волі і гарэлкі. Не хапала чумнога зелля, заводзілі ігравы танк «Т-34» і шпарылі на ім шэсць кіламетраў да бліжэйшага магазіна. Сустрэчныя людзі толькі паціскалі плячыма: «Кіно, халера... ім усё можна!»

Сава і стрэлу не чуў. Прыбег, калі ўсё ўжо здарылася, пабудзіў вадзіцеля «газіка» і сам павёз параненага ў бальніцу. Да гэтага выпадку Дым жыў як кот на печы. І вось гэты трагічны выпадак.

«А раптам звольняць?» Сава пайшоў шукаць падтрымкі ў мастака, які быў яму абавязаны. Неяк Дым угаварыў старасту адной царквы, і мастаку прадалі досыць рэдкую па прыгажосці старую ікону Божай Маці.

Мастак паабяцаў пагаварыць з кім трэба.

Падаў голас у абарону і Лявон.

Забойцу судзілі, а студыйная камісія пакарала астатніх па-свойму. Каб не траўміраваць залішне рэжысёра-пастаноўшчыка, заслужанага дзеяча мастацтваў, яго не чапалі, далі строгую вымову дырэктару і падкінулі па вымове Лявону, намесніку дырэктара і Саву.

— Ну, вось... ты пад каўпаком,— павучаў Лявон,— колькі разоў цябе вучыць — не пі з усялякай шушарай. Воўк свінні не таварыш. Ты ж ім грошы ў доўг даў на выпіўку. Добра, што не капнулі глыбей, усё не ўсплыло... Мазіла... шавялі мазгамі... гэта работа з людзьмі, а не на пілараме з дошкамі.

Дыма перавялі ў іншую групу, якая ад'язджала ў Чарнігаў.

Тры месяцы ён не бачыў Галіну, не ведаў, што з ёй, нічога ёй не пісаў. Як толькі прыехалі ў Мінск, ён у раўнівай турбоце накіраваўся да яе ў інтэрнат. Не дачакаўся яе ля ўвахода, падняўся на чацвёрты паверх.

— Галіна выйшла замуж. Яна перавялася на завочнае і паехала з мужам у Падмаскоўе,— непрыемна падцяла губы прышчаватая аднакурсніца Галіны.

— За курсанта? — дрыготкім голасам спытаў ён.

— За афіцэра Георгія.

Ён больш не стаў нічога распытваць. На першым паверсе сутыкнуўся з Томкай і аўтаматычна запрасіў яе ў рэстаран. Яна з велізарнай ахвотаю згадзілася.

Селі ў кутку. Выпілі шампанскае.

— Страх як люблю шампанскае! — радавалася Томка. Яе часта, апярэджваючы адзін аднаго, запрашалі на танец незнаёмыя людзі, нават і не пытаючы ў яго дазволу. Афіцыянтка (ён папрасіў) прынесла яму асобна сто пяцьдзесят грамаў гарэлкі, якую ён залпам і выпіў, пакуль Томка танцавала. Па ўсім было бачна, што яна робіцца «каралевай вечара».

Кавалеры ліплі як мухі, застацца сам-насам ім не ўдавалася. Па праўдзе сказаць, у Савы знікла жаданне адкрыць ёй душу, паспавядацца.

— Ты ведаеш, чацвёра запрашаюць мяне з сабой,— цешылася шчаслівая студэнтка.— Двое набіваюцца ў праважатыя. Адзін пакінуў свой тэлефон. Ах, які феерычны вечар, казачны. А гэты паўгрузін ці паўармянін — каўказец, адным словам, хоча нават падсесці да нашага століка.

— Ты вольная казачка. Рабі ўсё, што табе хочацца. Толькі так адчуваеш шчасце. Кіруйся жаданнем. Сёння я не ў гуморы, сумны субяседнік. Выбірай і дзейнічай.

— Ты хочаш аддаць мяне іншаму?

— Я так не сказаў. Я хачу, каб ты ведала, што не залежыш ад мяне. Ты вольная.

— Але ж ты... гэта... патраціўся. Віно, стол...

— Дробязь. Забудзь. Дзейнічай, як табе хочацца.

Да іх століка з дзвюма бутэлькамі шампанскага, усміхаючыся на ўсе залатыя зубы, ішоў малады, але з унушальнымі залысінамі чалавек незразумелай нацыянальнасці. Доўгі шырокі каляровы гальштук быў закінуты на плечы, дзве шэрыя плямы распаўзліся пад пахамі. Увесь яго выгляд выклікаў у Савы агіду.

— Вам можна саставіць кампанію? — з наўмысным акцэнтам, не перастаючы ўсміхацца, спытаў ён.

Томка перавяла погляд на Саву.

— Сядай.

— Дзякую.

Выпілі пад бясконцыя анекдоты гэтыя дзве бутэлькі шампанскага за дзесяць мінут, тады незнаёмы заказаў яшчэ адну. Нарэшце Томка запрасіла на танец Саву.

— Ведаеш, няма спасу. Ён мне надакучыў. Цягне да ся-

бе ў гасцініцу. Я знікну першая. Непрыкметна так. У туалет. А ты за мной. Калі ж размінёмся... буду чакаць цябе на стаянцы таксі.

Танцуючы, яна незаўважна для Савы пераглядвалася з доўгавалосым хлопцам у джынсавай куртачцы. Іх красамоўнае маўчанне вопытнаму Дыму пра многае гаварыла. Галава яго была забіта іншым, там нібы калолі іголкамі: «Галіна, Галіна...» У другой сітуацыі ён бы Томку нікому не саступіў. Але ж цяпер быў не яго час. Як ён і думаў, студэнткі нідзе не было, нават ля таксі.

«Заўтра ж паеду на хутар і вазьму Галінін адрас. Мачаха павінна ведаць,— суцяшаў ён сябе, ідучы па бязлюдным праспекце.— А навошта? Зараз яна недзе з ім у ложку, цалуе, мілуе. Не, усё... Вяртанне — гэта утопія». Упершыню ён адчуў, што яго не цягне ва ўтульны пакойчык студыйнага інтэрната. Ён прыпыніў таксі і назваў адрас Ірыны, які яна яму некалі пакінула: «Нарэшце з маці атрымалі кватэру» — зіхацелі радасцю тады яе зеленаватыя вочы.

Гэта быў апошні дзевяціпавярховы дом-дуга на Ракаўскай шашы.

Як быццам прадчуваючы нешта, Сава папрасіў таксіста пачакаць яго некалькі хвілін.

Доўга шукаў пад'езд з патрэбным яму нумарам кватэры. Ліфт не працаваў. Падняўся на восьмы паверх, пазваніў. На здзіўленне яму, хутка адчынілі дзверы. На парозе стаяла ў сваёй цёмна-сіняй сукенцы (ён яшчэ падумаў, чаму не ў халаце) Ірына з сумна-здзіўленымі вачыма.

— Прывітанне. Я толькі што з камандзіроўкі. Як у цябе з часам?

— Прывітанне. У пакоі мае сваякі. Толькі заўтра яны ад'язджаюць.

— А... Тады даруй. А чаго такая... прыбітая горам? Здарылася што?

— Так. Маму ўчора пахавала.

— Даруй. Ты глядзі, яна ж маладая была. Хвароба веку?

— Не. Яна загінула трагічна. Даруй. Я мушу ісці.

— Трымайся. Як кажа мой бацька, усе там будзем. Ты па-ранейшаму ў аптэцы на Чкалава?

— Так.

— Я пазваню.

— Добра.

— Да сустрэчы.

— Да сустрэчы. Даруй.
— Нічога. Я ж усё разумею. Пакуль.

## РАЗДЗЕЛ ТРЭЦІ

## КАЛІДОРЫ ЖАДАННЯЎ

Тэлеграму з просьбай тэрмінова прыехаць дахаты падпісала маці. Пад вечар, гэта было ў пятніцу, ён, праклінаючы аўтамабільнае міністэрства і нашы аўтобусы ў перапоўненай «душагубцы» з цяжкасцю выехаў з горада. Вадзіцель старога ЛАЗа, відаць, не згаджаўся з інструкцыяй, альбо яму хацелася патрапіць у кнігу рэкордаў Гінеса, вырашыў даказаць, што салон аўтобуса з гумы і ўмесціць у тры разы больш пасажыраў, чым тая колькасць, якая пазначана на шыльдачцы ля дзвярэй. На ўсіх прыпынках ён камандаваў сіплым голасам: «Прайдзіце на сярэдзіну салона, дайце людзям увайсці. Яшчэ прашу паціснуцца. Я не паеду, пакуль не пройдзеце на сярэдзіну».

Ад поту кашуля на спіне ў Савы прыліпла да цела, дыхаць цяжкім паветрам з прымессю бензіну было немагчыма. Адчыніць люк не дазвалялі жанчыны, якія з груднымі дзецьмі сядзелі на пярэднім сядзенні. Сава адвык ездзіць у такіх сатанінскіх умовах і недзе на паўдарозе сышоў. Галава раскалвалася ад болю, калола ў патыліцу. Ён «галасаваў», аднак ніводзін гаспадар «Жыгулёў», «Запарожцаў» ды «Масквічоў» не падабраў яго.

Сава губляў у адчаі надзею на лепшае, змірыўся з думкаю, што гэтыя восем кіламетраў да Ракава прыйдзецца цягнуцца пешкі. Выручыў матацыкліст, як аказалася, стары знаёмы з гарадскога пасёлка, падкінуў яго да ляска. Дым ішоў знаёмай дарогай сярод маладых соснаў, пастаяў крыху на кладачцы. «Як усё тут адзінока, сумна... Няўжо і час канае ў забыццё? Аказваецца, і луґ, і рэчка, і лес — усё без прысутнасці чалавека наганяе нуду. Дзіўны лёс у гэтага вялікага дуба. Адзін на ўсю паляну. Пастаянная адзінота. Карова ў спякоту пад ім пастаіць і пойдзе, дзікі кабан жалуды пазбірае і ўцячэ ў лес, а ён стаіць. Кажуць, што ў старых індыйскіх кнігах ёсць сцвярджэнне, што ўсё мае душу. Ці вые ягоная душа ад адзіноты? Сто, дзвесце гадоў назіраць адзін і той жа краявід?» — Сава ўявіў сябе на месцы дуба і жахнуўся.

Маці абірала бульбу, калі ён пераступіў спарахнелы

парог роднай хаты. Яна не паспела выцерці аб спадніцу рукі, ён датыкнуўся да яе гарачай шчакі.

— Дапіўся наш бацька, сыночак,— пачала паўшэптам маці,— даскакаўся лысы чорт. Арыштавалі яго за растрату. Будуць судзіць, во-о... Колькі я слёз выплакала, а божа мой праведны... Прасіла дурня, папярэджвала — за прылаўкам не частуй усіх налева і направа. Куды там... вумнік вялікі. У мяне няма за што яго выкупляць. У людзей браць у доўг не буду. Ён, сыночак, спутаўся з адной з Кіеўца. Хату ёй збудаваў за казённыя грошы. Думаў, усё шыта-крыта будзе. Вось няхай яна яму грошы і дае, а маё жыццё змарнавалася, я свой век ужо дажываю, а не жыву... зганьбіў мяне, паганец паршывы. Здароўе на яго ўсё паклала, калі на беркулёз хварэў... Няўдзячны... скаціна і тая руку ліжа... Пяцьдзесят тры гады... Пра бога трэ думаць, а ён са шлюхай звязаўся. Яна з Мінска прыехала. Там дзіця нагуляла, там яе раскусілі, дык нашага лысага дурня знайшла. З яе ўзяткі гладкі. Няхай засудзяць, ня-а-хай... Заслужыў...

Сава ў адказ не вымавіў ані слова.

Маці пачала жаліцца па другім разе.

— А колькі ў яго растрата?

— Кажуць, пяць тысяч. Можа, яна сама і заявіла ў міліцыю. Навошта ёй стары хрыч. Выпіла ўсю кроў, і ўсё. А хто ведае?

Маці апавядала пра ўсё як бы абыякава, без ценю трывогі за далейшы лёс мужа.

— Я слабы. Пяцьсот рублёў наскрабу... можа, у доўг, не болей. Можа, карову прадаць,— прапанаваў ён.

— Я без каровы не застануся. Яму яшчэ і карову? Няхай судзяць. Карова мяне на свеце трымае. Няхай з ягонай зарплаты ды пенсіі вылічваюць.

— У турму могуць пасадзіць.

Селі вячэраць. Даўно ён не еў такую смачную бульбу і не піў такое прыемнае густое малако. Зноў у гаворцы вярталіся да бацькі і гэтай ненавіснай жанчыны-спакусніцы. Маці паслала яму на старэнькім драўляным ложку ля акна.

У цемры яны перагаворваліся.

— Ці праўда, што Галіна выскачыла замуж?

— Праўда,— ледзь выціснуў ён з сябе.

Здагадлівая маці болей не вярталася да дачкі аднавокага Шкоды.

Сава не змог заснуць... прыслухоўваўся да кожнага шораху за старымі, выцвілымі да белізны шпалерамі. Падалося ў паўсне, паўдрымоце, што нехта ходзіць па двары.

Сярод ночы прачнуўся, аж падхапіўся. З канапкі даносіўся гучны храп. Раней ён ніколі не чуў, каб маці ў сне храпла. Няўжо гэта першы сігнал надыходзячай старасці? Акрамя ж дзеда, ніхто ў хаце так моцна не хроп. Ён тактоўна аклікнуў — пабудзіў маці. Скрозь сон яна вымавіла: «Божа мой праведны, уратуй і памілуй».

«Не... я не змог бы тут жыць. Не змог бы! За гэтыя пяць гадоў адвык!»

Бацьку судзілі. За дзень да суда Сава сустрэўся з ім. Бацька зрабіўся маўклівы, адно толькі шмат курыў «Прыму» і неадрыўна глядзеў на раку.

— Мне, сынок, срок прыпаяюць, ведаю. Адвакат сказаў, што пракурор будзе прасіць сем, а дадуць пяць. Ратавання няма. Памятаеш, у калгасе Якаў украў два кабанчыкі пры Хрушчову? Мо і не памятаеш? Два гады далі. Вось, пане дабрадзею, такія парадкі.

Сумна гледзячы Саву ў вочы, бацька працягваў:

— Каб у той самы дзень пагасіў растрату, як рэвізія была... а так, каб іншых у раёне напалохаць, срок дадуць. Крадуць усе, але за руку не ўсіх ловяць. Мне адзін падказаў, кажа, рыхтуйся, заўтра накрыюць рэвізоры. Спалі, кажа, магазін. Неяк шкада стала. А як жа людзі? Хлеб, цукар, соль, адзежа... Дзе купляць будуць?

Бацька ўцягнуў галаву ў плечы, прыгорбіўся. «Панік стары, састарэў»,— падумаў Сава.

— А гэту з Кіеўца... маці табе казала... я ад жаласці. Нечым узяла за сэрца. Позна я даведаўся, што таго хахаля ў Мінску не забыла, ездзіць. Я высачыў. Эх, падумаў, сцерва, як жа праўдзіва ты прыкідвалася няшчаснай, занядбанай. Уцяміў усё, ды позна. Ты, бачу, сюды, на хутар... не... не цягне? Адвакат кажа, калі пашанцуе, дык пайду пад амністыю, да з'езда партыі мусіць быць.

Далі бацьку пяць гадоў без канфіскацыі маёмасці, таму што ўсё хутарскае было нажыта задоўга да яго працы ў магазіне. Сава хоць і абяцаў бацьку, што будзе часцей наведваць маці, але ж сваё слова не стрымаў. Была на тое і аб'ектыўная прычына: яго ўгаварылі перайсці адміністратарам на хроніку ў аб'яднанне дакументальных і хранікальных фільмаў «Летапіс». Дні пайшлі аднастайныя. Паміж камандзіроўкамі ў цесным накураным пакоі дырэктара аб'яднання ён ламаў галаву над справаздачамі, часта даплачваючы ў студыйную касу з уласнай кішэні пяць, дзесяць рублёў. Поле для мухлярства звузілася, а рызыкаваць «уная глую» баяўся. Забівалі час успамінамі — у якой раённай

гасцініцы лепшыя ўмовы, на якім «узроўні жратва», дзе ёсць каналізацыя, а дзе яе няма, дзе можна набыць імпартны абутак, а дзе не. Атрымаўшы неабходную інфармацыю, Сава агітаваў каго-небудзь з адміністратараў альбо асістэнтаў, і яны ішлі ў піўны бар.

Адзіны блізкі сябра Савы Лявон Жабакрык за бойку ў інтэрнаце быў «разжалаваны» ў асістэнты і пакінуў студыю, паехаў загадчыкам клуба ў санаторый пад Мінск. Лявон лічыў, што яму пашанцавала, быў рады, як той дзяк на вялікдзень: далі яму асобную аднапакаёвую кватэру ў доме абслугі. Апошні раз яны бачыліся на пахаванні адзінага на студыі народнага артыста СССР, які набываў славу і набіваў руку на фільмах толькі пра рэвалюцыю і яе дзеячаў і які заўсёды злаваў на маладых крытыкаў: «Не вучыце мяне рабіць кіно пра рэвалюцыю. Я вось шабляй рубіў у Першай коннай белякоў». Труну з целам нябожчыка, як дыктаваў яго высокі ранг, выставілі ў будынку філармоніі і арганізавана падвозілі аўтобусамі прадстаўнікоў ад працоўных калектываў заводаў і фабрык.

— Мала ўлады арганізавалі народа, мала! — казаў скептычна Лявон.— Кіраўнікоў раней хавалі, помніш? Так маглі стварыць уяўленне ўсеагульнай журбы, аж дзіўна было. Трэба сказаць, рупліва падвозілі людзей і натуральна інсцэніравалі народнае гора. А тут радкавата. Ніхто не плача. Незразумела, ці супраць, ці рады, што нарэшце памёр гэты рамеснік сярэдняй рукі і лакіроўшчык.

Лявон крыўдаваў. Яго не толькі не запрасілі пастаяць у пачэснай вахце з чырвона-чорнай павязкай на рукаве, але нават не далі несці вянок.

— Паедзем на могілкі?

— Марнаваць дарма час. І без нас разявак хопіць,— адказаў Сава.

— Твая праўда. Нябожчык мяне ніколі не браў пад сваю абарону. А ты як жывеш? Прыехаў бы да мяне ў лясок, на возера. Сумнавата, праўда, але ж наконт харчоў, баб — у ажуры. Скажу, дарога цягне да сябе. Грэшным дзелам падумаў, а ці не махнуць на БАМ. У мяне знаёмы ў Цюмені нафту качае. Дублёнкі прывозіць, дарагія каўбасы, кансервы. Галота, разумееш, надакучыла. Хто ў галечы, тым лягчэй кіраваць. А тут і гарэлка даражэе. А ты на хроніцы папранейшаму?

Сава хітнуў галавой.

Лявон зморшчыўся:

— Там аніякай перспектывы. Магу ўзяць цябе ў сана-

торый масавіком-зацейнікам. Таксама грошы. Харч дармавы, дом казённы... Не хочаш? Бачу, не хочаш. Прыгажунь сваіх баішся адных без прыгляду пакінуць. Адпачывала адна ў мяне на зімовых канікулах... баявая шэльма... думаю, акаўпачу цябе, балбатушка, ціхенька... На рабочым месцы інструкцыяй шашні заводзіць забаронена. Тралі-валі, ландышы... Угаварыў. Ат тваю налева. Пра кінастудыю нешта ўспомніў — яна адразу — а вы Саву Дыма ведаеце? Вот чорт, думаю, і тут ён мяне апярэдзіў. Здагадваешся, пра каго гавару?

Сава прыкінуў: хто ж мог быць на канікулах, і не памыліўся, канечне ж, Томка.

— Слухай,— ажывіўся Лявон,— адкрылі ў былым касцёле Дом кіно. Вось бы табе туды ўладкавацца метадыстам! Работа — не бі ляжачага. Сувязі, павага. Давай зойдзем туды, пасядзім у бары. Я частую. На дзвесце грамаў каньяку хопіць.

Усё спадабалася Саву ў Доме кіно: інтэр'ер у люстэрках, вінтавая лесвіца, як у іспанскіх замках, на другі паверх, велізарныя (ён іх бачыў упершыню) вітрыны на ўсё акно, а найбольш вабілі вока дзяўчаты, якія грацыёзна хадзілі па гэтай вінтавой лесвіцы і красаваліся перад люстэркам.

— Нічога птушкі? Сюды на закрытыя прагляды фільмаў увесь цвет сталіцы збіраецца. Шукай, калі хочаш жаніцца, сабе партыю з іх. Быў бы я маладзейшы, сам пайшоў бы ў метадысты. Дырэктарам не возьмуць — я беспартыйны. Ілля Ваданос усё яшчэ ходзіць у сакратарах Саюза кінематаграфістаў... прасі яго, няхай парэкамендуе. На хроніцы, акрамя язвы ад харчоў у раённых сталоўках, нічога не заробіш... Сюды ты нават нашых настаўнікаў з інстытута можаш запрашаць, яны табе ў залікoвую кніжку з заплюшчанымі вачыма адзнакі ставіць будуць. Падумай. Я справу гавару. Хроніка — пясок. Хлопец ты талковы. На трэцім курсе. Арганізуй пры Доме кіно тэатр-студыю, вось табе будзе дзе паставіць дыпломны спектакль. Я ўсё яшчэ без дыплома. Сунуўся на тэлебачанне, там — не прабіцца. У народных тэатрах адны дзяўчаты. Падумай. Жыццё ляціць. Тут месца прэстыжнае.

Памалу пачалі збірацца рэдкія гледачы на звычайны радавы фільм адной сярэднеазіяцкай студыі.

— У нас партызанфільм, а ў іх басмачфільм. Усё аднолькава, усё шэра і аднабакова: нашы перамагаюць, вораг бяжыць паміраць на гнілы Захад,— прааналізаваў Лявон. Быў ён у гуморы.

Сава правёў сябра да электрычкі на чыгуначны вакзал недалёка ад Дома кіно. Яны пацалаваліся на развітанне — і сапраўды развіталіся надоўга, каб сустрэцца праз два гады на «паўночнай адысеі», якая ледзь не завяршылася для Савы трагічна.

На вакзале Дым падбег да кіёска, каб купіць газету «Вячэрні Мінск», і напаткаў брата Галіны Васіля. Той не змяніўся, такі ж хударлявы, з сумнымі, стомленымі, глыбока пасаджанымі вачыма. Сава не зачапіў, не падышоў да яго. Моцна яшчэ сядзела ў яго душы злосць і крыўда на сястру Васіля. Пісклявы жаночы голас запрасіў пасажыраў на пасадку. Нетаропка (запаволенасць была ў яго з дзяцінства) Васіль узваліў на плечы рукзак і накіраваўся на перон. На шумнай прывакзальнай плошчы Сава стаяў у задуменні, не ведаючы, куды сябе дзець, адчуваючы роспач і адзіноту.

Да Міхася ехаць далёка, позна, у абрыдлы інтэрнат не хацелася, ён успомніў пра Іру, якой да гэтага некалькі разоў званіў.

Паехаў да яе. На гэты раз яму пашанцавала. Іра была адна і ў гуморы. «Яна схуднела і трошкі пабрыдчэла»,— Сава сеў у адзінае вялікае крэсла. У пакоі стаяла старая канапка, побач з ёй шафа для посуду (там стаяла і некалькі кніжак), круглы столік.

Іра паставіла на плітку чайнік, вярнулася з кухні і села побач. Сава паклаў сваю руку на яе вострае калена.

— Стаміўся. Як добра, што на свеце ёсць твая дабрыня, дом, дзе можна знайсці ўцеху. Табе заўтра ў якую змену?

— У другую.

— Цудоўна. І ў мяне дзень вольны.

— І калі ў вас там працуюць?

— Заўсёды і ніколі. Мы людзі вольнай прафесі. Трэба: суткі працуем напралёт, а бывае тыдзень адпачываем. Добра, што мы адны. Прыемны інтым. Я чакаў гэта.

— Захавай кампліменты для іншых.— Іра закурыла.

— Чаму? Я шчыра.

— Мне здаецца, што табе проста захацелася пераспаць са мной.

— Мне падабаецца твая шчырасць.

Яна прынесла каву. На адным кубачку ён заўважыў чырвоны абадок ад памады. І яна гэта заўважыла.

— Прабач, гэты з памадай пасунь мне. І маленькіх лыжачак у мяне яшчэ няма.

— Я не арыстакрат. І чайныя падыдуць. Дарэчы, пра арыстакратаў. Я яшчэ са школы так і не зразумеў, хто ж

Чацкі, параможца ці ахвяра? У цябе кава ў зярнятах?

— Так. Знаёмая дастала. Я ёй сустак-мітэ, а яна мне каву. Тэлевізара ў мяне няма, магнітафона таксама, на прайгравальніку іголка пласцінку драпае.

— Я люблю без музыкі.— Ён правёў рукой вышэй яе калена.— О, у цябе паўднёвы загар.

— За якія шышы? Скура смуглая. На Мінскім моры мой загар. Усе вы толькі абяцаеце. І ніводзін не мае сродкаў, каб павезці ў Крым.

— Не ўсе ж дзеці Палянскага... і я пакуль не абяцаў.

— Ты не крыўдуй. Я пра ўсіх. Яшчэ кавы?

— Дзякую.

— Ну, што? Будзем класціся ў ложак?

Сава развёў рукамі. Яна акуратна патушыла ў попельніцы акурак, дастала прасціну.

— Ты ручнік вазьмі белы. Махровы.

Сава не затрымліваўся ў ваннай, выйшаў, падышоў да яе, хацеў пацалаваць у вусны.

— Пачакай. Я вытру памаду.

Ён патушыў святло, уключыў свяцільнік на сцяне, у якім адразу забілася, ажыла муха, і залез пад коўдру.

— Выключы свяцільнік, а? — Іра выглядвала з прыхожай.

— Чаму? Я хачу цябе разглядваць.

— Знайшоў Мерлін Манро. Ну, патушы святло,— прасіла яна.

Ён устаў з ложка, узяў яе за руку і пацягнуў у пакой.

— Хочацца... можаш разглядваць...— і яна, як у вальсе, закружылася. Сава падхапіў яе на рукі...

Нейкі час яны ляжалі моўчкі. Іра курыла.

— Мне падалося, што я табе не спадабаўся.

— Не звяртай увагі. Не магу прыйсці ў сябе пасля смерці маці.

— А што здарылася з маці?

— Што? Я і сама дагэтуль не разумею.

— Ну, а як яна памерла?

— Выкінулася з балкона... у першы ж дзень, як мы сюды прыехалі. Да гэтага выпадку да ўрачоў-псіхіятраў не звярталася.

— А дзе рабіла? — міжволі спытаў Сава.

— На цукернай фабрыцы. Работа адавая. Я пасля школы паспрабавала яе хлеб. Кашмар. Ты ўявіць нават не можаш, колькі карамельнай масы жанчыны пераносяць на сваіх плячах. Яна выхоўвала мяне адна. Як паехаў

наш бацька на цаліну, дык там і асеў. Знойдуць яго — атрымліваем аліменты, пасля зноў згіне. Пятнаццаць гадоў маці чакала гэту кватэру. Ёй не хацелі даваць, яна амаль сілком вырвала... зубамі...

— Піла?

— Ніколі. Ну, у свята там сто, дзвесце грамаў віна. Нават запіскі не пакінула. У мяне былі мужчыны... яна ведала... часам мы моцна сварыліся. Мне яе вельмі шкада. У цябе маці ёсць?

— Ёсць.

— Лічы, што шчаслівы.— Голас Іры задрыжаў.— Я, паверыш, усё яшчэ адчуваю прысутнасць смерці ў гэтай кватэры. Баюся.

— Замуж трэба.

— Разумненькі які... Ты ж не возьмеш?

— У маіх жыццёвых планах жаніцьбы няма. Я не створаны для сямейнага ачага.

— Усе вы так абараняецеся. Ды я і не імкнуся за цябе... Жыві спакойна.

— Я ў гэтым і не сумняваўся,— са штучнай упэўненасцю адказаў Сава.— Будзем сустракацца, пакуль нам добра, будзе дрэнна — пакінем адно аднаго. Мы спалучым два паняцці: сябра і палюбоўнік. Можаш разлічваць на мяне.

— Здрасце, я ваша цёця! — адказала яна, пільна ўглядаючыся ў яго.— Я сытая абяцаннямі. А можа, табе нехта наплёў, што я ўжо бяру за каханне грошы?

— Я жыву сваім розумам і плёткі не ўспрымаю.

Раніцай Сава не стаў выцірацца вялікім махровым ручніком, уяўляючы, што ім маглі выцiраць і цела нябожчыцы. Яму было непрыемна.

Ён хутка выпіў каву, не стаў есці бутэрброд з сырам, прыдумаў тэрміновую справу: «Трэба а дванаццатай гадзіне быць на студыі».

— Звані,— сказала яна наўздагон.

Ён паабяцаў і званіць, і прыходзіць.

Студыйныя калідоры вымерлі: супрацоўнікі, рабочыя, творчыя работнікі збіраліся ў прыёмных, у кабінетах дырэктараў аб'яднанняў, у зале гуказапісу, у парткоме слухалі і глядзелі па тэлевізары прамую трансляцыю справаздачнага даклада Генеральнага сакратара на з'ездзе партыі.

Перад гэтым на адкрытым партыйныч сходзе выказалі

добрыя парады на дарогу і наказы дэлегату з'езда, які прадстаўляў раённую партыйную арганізацыю. Дэлегата — сціплую мантажніцу гадзіннікавага завода «Прамень», якая ўсё не магла апамятацца ад нечаканага выбару і шчасця, якое выпала ёй, прадстаўляў таварыш з райкома партыі Марат Свістун. З усмешкай, нібыта прыклеенай да твару навечна, у мажным бліскучым фінскім касцюме, доўга з натхненнем расказваў пра дасягненні працаўнікоў сталіцы, пра выкананыя і перавыкананыя планы, вельмі настойліва праводзячы думку, як усё ў нашым горадзе добра і цудоўна.

Сава, як толькі заўважыў, што ёсць Свістун, сеў у другі рад і горача пляскаў у ладкі. «Чорт яго ведае. Ён злапомны. Яшчэ перакрые дыханне па дарозе ў Дом кіно».

З непрыхаванай угодлівасцю Дым доўга хадзіў вакол Ваданоса, і той, нарэшце, паабяцаў, што назаве яго кандыдатуру на сакратарыяце, але ж пры ўмове, калі яго, Ваданоса, на маючым адбыцца з'ездзе кінематаграфістаў пакінуць у сакратарах.

Сава зразумеў намёк і ўзяўся асцярожна, яшчэ задоўга да з'езда, усяляк папулярызаваць і прапагандаваць сярод кінабраціі кандыдатуру Ваданоса, мімаходзь тонка і неўпрыкмет збіраў інфармацыю, факты, плёткі ўсялякія пра астатніх творцаў, якія мелі ахвоту заняць крэслы сакратароў.

«Имеющий уши да услышит» — ён цвёрда запомніў гэтую любімую прыказку Ваданоса. Сава хапіўся так бурна дзейнічаць, што інакш, як «стукач», пра яго асобу і не ўспаміналі. Трэба прызнаць: Дым сабраў вялікі матэрыял і ведаў, хто ёсць хто і хто чым дыхае. Ваданос, калі атрымаў такую шырокую інфармацыю, яшчэ больш наблізіў да сябе руплівага хлопца. Выбраліся неяк у суботу да знаёмых трэнераў спартыўнага комплексу «Стайкі», каб папарыцца там у лазні-сауне ды адпачыць у гасцініцы. Рахманы Ваданос мякка намякнуў Дыму, што няблага было б якім-небудзь чынам «павесяліць» чыста мужчынскую кампанію, запрасіць некалькі незалежных сучасных дзяўчат. Сава хутка прыкінуў: хто змог бы прыняць з ахвотаю, без выбрыкаў і ўгавораў, гэткую прапанову. «Вось сюды б Томку,— з жалем падумаў ён.— Леакадзія — бітая баба. Ірына? Так. Застаецца яна. Няхай бярэ надзейную сяброўку. Толькі Іра».

Ён пазваніў у аптэку, рады, што патрапіў на яе, пачаў угаворваць, абяцаючы райскі вечар адпачынку: «Толькі

прыхапі сяброўку. Надзейную. Без комплексаў. Буду чакаць ля кінастудыі».

Госці спазняліся. Ваданос, аператар, мастак, дырэктар карціны і вядомы сцэнарыст з Масквы пачыналі нервавацца, чакаючы Саву, які бегаў то да аўтобуснага прыпынку, то да тэлефона-аўтамата. Нарэшце Іра і яе сяброўка з фіялетавай галавой выйшлі з тралейбуса.

— Даруй. Спазніліся. На таксі не было грошай. Пазнаёмся: гэта Люба, а гэта Сава,— казала Іра.

— Усё ў ажуры. Фірма гарантуе шыкоўны адпачынак.

— А мы ўбачым там алімпійскага чэмпіёна? Страх, як хачу ўбачыць алімпійскага чэмпіёна,— вельмі сур'ёзна спытала Люба.

— Не толькі ўбачым, а нават загадаем яму што-небудзь учудзіць. Вы, Люба, патрапілі ў свет кіно, а для яго нічога немагчымага няма. Прашу за мной!

Усю дарогу ў «рафіку» панаваў прыўзняты настрой. Жартавалі ўсе, успамінаючы смешныя гісторыі, падабрэў і Ваданос, расказаў некалькі анекдотаў, праўда, з пасрэднымі акцёрскімі здольнасцямі. Па ўсім было бачна, дзяўчатам усё падабаецца і ўсе падабаюцца.

Сава ў парылку не пайшоў, застаўся апякаць жанчын і рыхтаваць вячэру ў нумары Ваданоса. Яшчэ быў час, і ён павёў дзяўчат паказаць комплекс — да возера.

— Далей не пойдзем. Там мінскае «Дынама» жыве. Малафееў не пусціць.

— Шкада,— пакрыўдзілася Люба,— а дзе жывуць алімпійскія чэмпіёны?

— У гасцініцы. Будуць і яны. Тут праходзяць зборы валейбалістаў і стралкоў з лука. Шэф тут свой чалавек. Ён здымаў спартыўны фільм. Усё будзе.

— А хто з іх шэф? — пацікавілася Іра.

— Гэты з сівымі скронямі ў скураным паліто. Побач з ім сядзеў аператар. На пярэднім сядзенні — дырэктар карціны.

— Я так і падумала. А што я казала,— радавалася Іра, што ўгадала, хто Ваданос.

— А танцы тут бываюць? — гнула сваё Люба.

— У бáры танцуюць. Тут і фільмы круцяць.

— Умеюць людзі жыць! — Люба глядзела на ўсё з адкрытай зайздрасцю.

— Дзе яна робіць? — непрыкметна пацікавіўся Сава.

— Пераплётчыцай у праектным інстытуце. Мая суседка па пад'ездзе.

У нумары Сава выставіў на стол чатыры бутэлькі каньяку, дзве — шампанскага і некалькі бляшанак рэдкіх дарагіх кансерваў.

— У-у-у! Печань траскі? Крабы? Шпроты? Ялавічына. У нас адна дзяўчына такое прыносіла. Маці яе мышыністкай у ЦК робіць. Смакоцце, Ірка... Пальчыкі абліжаш,— ажывілася Люба, асцярожна кранаючы кансервы.

— Я вам казаў: для кіно нічога немагчымага няма,— з пачуццём уласнай годнасці паўтараў Сава.

— Давай я нарэжу хлеб. Мужыкі не ўмеюць, наразаюць тоўстымі кавалкамі,— набівалася ў памагатыя Люба. Яна так хацела паказаць сваё ўменне, што перастаралася і моцна парэзала палец.

— Без мітусні і панікі! У нумары ёсць аптэчка. Спакойна,— Сава знайшоў бінт, ёд, пластыр.

Яшчэ праз дзесяць мінут вячэра была гатова. Прыемны пах казытаў нос, слых вабіў прыемны шум вады ў ваннай, дзе прахалоджваліся бутэлькі са спіртным. Чакалі «саўністаў», якія, як назло, доўга не ішлі. Мінула паўгадзіны, гадзіна. Люба нецярпліва паглядвала на стол. Адчуў голад і Сава. Каб не спакушацца ежай, ён прапанаваў выйсці на балкон.

— Не пайду. Ад курава мяне ўжо муціць. Што яны, патапіліся там, ці што? — пачынала бунтаваць Люба.

Сава на балкон не пайшоў, ён баяўся пакінуць рослую Любу сам-насам з ежай... бо пры яе камплекцыі, зайздрослівых вачах і голадзе, цяжка было ручацца за ўсе кансервы.

— Пачакаем яшчэ пятнаццаць мінут,— супакоіў ён дзяўчат.

— Не магу. Самлею ад голаду. Давай шпроты з'ямо,— патрабавала Люба.— Я без абеду. Давай, Сава, ну?

— Нялоўка. Вазьмі мякішык ды макні ў шпроты, калі ўжо паміраеш так,— прапанаваў Дым.

Люба абмакнула хлеб у шпротнае масла і імгненна, як акула, праглынула.

Севу перакасіла.

— Можа, пойдзем насустрач? Падыхаем свежым паветрам? — Дым ужо не ведаў, як стрымаць дзяўчат.

— У мяне няма сілы спусціцца на першы паверх... я без абеду,— гнула сваё Люба.— Калі гэтых прыдуркаў праз пяць мінут не будзе, ідзём у бар. Я думаю, алімпійцы пачастуюць нас.

— Ну, добра, я табе адкрыю бутэльку піва,— падабрэў Сава.

— Што мне тваё піва? Толькі лішні раз у туалет бегаць. Я жраць хачу. Усё, Ірка, айда ў бар!

— Супакойся, Любка, не выступай,— спрабавала ўціхамірыць сяброўку Іра.

— Божа мой... Хто табе не дае... На вось... вазьмі адну шпроціну,— зміласціўіўся Сава.

Люба ўзяла за хвост шпроціну, адкрыла шырокі рот і апусціла туды рыбіну.

Маўчалі. Гаварыць не хацелася. Голад дрэнны субяседнік. Нарэшце ў калідоры пачуліся гучныя галасы. Кампанія была, як заўважыў Сава, вясёленькая: «Відаць, у парылцы яны ўзялі на грудзі па сто грамаў».

— А вось і мы! — гулліва з парога пачаў чырванашчокі Ваданос.— О, ды ў вас райскі куточак і такія мілыя гейшы... Калі я быў у Японіі...— але яму не далі дагаварыць. Садзіліся хто як: хто ў крэсла, хто на ложак. Мастак дык той сеў па-азіяцку, скрыжаваўшы ногі пад сабой, на падлогу.

Мала хто прыслухоўваўся да ювелірнага словаблудства Ваданоса, сэнс якога быў прыблізна такі: «Трэба жыць, трэба піць, трэба кахаць, бо ўсё хуткаплынна».

Люба першай каўтнула залпам паўшклянкі каньяку і, не звяртаючы ўвагу на субяседнікаў, накінулася на ежу, падсунуўшы да сябе бляшанку ялавічыны, і так малаціла сківіцамі, што Сава аж перастаў есці ад здзіўлення.

Яшчэ адзін тост, пасля яшчэ адзін... і ўсё стала на сваё месца. Пацякла нетаропкая гутарка, у якой першую скрыпку ўсё намагаўся іграць Ваданос.

Хутка, аднак, папрасіўшы прабачэння, дырэктар, мастак і сцэнарыст паехалі ў Мінск да жонак. Як зразумеў Сава, аператар быў з тых «ціхіх алкашоў», якія з задавальненнем абмяняюць самую прыгожую жанчыну на бутэльку гарэлкі. Яго ўжо цягнула ў сон, і ён з цяжкасцю мо ў соты раз слухаў «мемуары» Ваданоса. Іра з Любай, як дзеці, лавілі кожнае слова самазакаханага Ваданоса.

Сава пазяхаў, абдумваючы план «эвакуацыі» аператара ў суседні нумар.

— Сава, што там у нас ёсць яшчэ выпіць? — патрабавальна спытаў Ваданос.

— Акрамя піва, нічога.

— Я хачу на танцы. Там будуць чэмпіёны? — цягнула ўсіх у бар п'яная Люба.

— Непатрэбная справа, сябра мой. Вось грошы. Пры-

нясі з бара спіртнога,— Ваданос падаў Саву дваццацьпятку.

— Што браць?

— Вазьмі шампанскага.

— Не. Ад шампанскага ў мяне жывот пучыць,— спяшалася папярэдзіць Люба.

— Бяры каньяк! — удакладніў Ваданос.

Сава хуценька вярнуўся.

— У бары толькі бальзам.

— Бяры бальзам! — ускіпеў Ваданос.

— Яго трэба піць у кактэйлі,— паказвала сваю дасведчанасць Люба.— У нас адна пераплётчыца выпіла ў гасцях гэты хвалёны рыжскі бальзам. Пасля яе тры дні ганяў панос. Яны што робяць? На экспарт даюць натуральны, на травах, а нам з нафты... Іра, давай сходзім у туалет? — па-свойску так, як сярод аднагодкаў, казала Люба. Хістаючыся, яны пайшлі ў туалет.

Развялі бальзам апельсінавым сокам (Сава бегаў у бар яшчэ раз), выпілі. Гэты царскі напітак быў залішні для ўсіх.

Аператар са слінаю на барадзе папоўз да ложка, абхапіў падушку і лёг спаць.

— Як Люба? Застанецца ў нумары шэфа? — спытаў у Іры Сава.

— Думаю, застанецца.

Люба паказала пальцам на бязвіннага аператара:

— Забярыце яго куды-небудзь! Пачне рыгаць, а я гэта не пераношу. Былі мы ў гасцях у адных інжынераў. Напіліся да чорцікаў. Адзін хлюпік пачаў рыгаць, а я не вытрымала, рыгаю таксама. Стала побач з ім і рыгаю... а за мной гаспадыня дома пачала... усе пачалі рыгаць... нават кот. Зарыгалі ёй кватэру ўсю... акрамя абажура... убытку на тысячу рублёў...— успамінала, ікаючы, Люба.

— Сава, адвядзі яго ў нумар,— загадаў Ваданос.

Аператар хоць і быў невялікага росту, але ж аказаўся цяжкім, як чыгунная пліта. Сава заходзіў і з аднаго боку, і з другога, ды зразумеў, што адзін не ўправіцца.

— Ну што вы з ім цацкаецеся? Узваліце яго мне на плечы. Давайце. Я ў вёсцы ў заклад мяшок бульбы сто метраў пранесла. Давайце... падтрымлівайце,— узялася дапамагчы Люба.

Усцягнулі аператара на яе шырокую спіну, і яна досыць лёгка панесла.

— Любка, табе трэба не пераплётчыцай, а ў медвыцвя-

рэзніку, там табе цаны не было б,— трапна жартавала Іра.

— Малайчына, Любанька, залатая наша ты, вяртайся назад да шэфа, мы з Ірынай гэтага чувака распранём і да вас,— паціраў рукі ад задавальнення Сава.

— Толькі каб нядоўга. Я хачу на танцы,— папярэдзіла Люба.

Сава і не думаў вяртацца назад у нумар да Ваданоса, ён лічыў, што справа зроблена і яе працяг у валасатых руках шэфа. Яны з Ірай так-сяк распранулі аператара, паклалі яго на ложак, патушылі святло і пайшлі ў нумар да Савы. Яшчэ на парозе, не паспеўшы зачыніць дзверы, ён пачаў цалаваць Іру, і яна абвіла яго рукамі, падалася ўсім целам да яго грудзей. Праз мінут дваццаць у нумары Ваданоса пачулася валтузня.

Сава выразна чуў мацюгі, жаночы крык і звон пабітага шкла.

Ён выскачыў на балкон у надзеі ўбачыць, што ж там такое ўсчалося.

Яшчэ праз мінуту Люба хадзіла па калідоры, стукала ва ўсе дзверы і гучна клікала Іру.

— Ірка, дзе ты? Адчыні! Гэта Люба.

Яна мусілі, не дай бог большай бяды, адчыніць ёй дзверы свайго пакоя.

Люба — яна была захутана ў адну прасціну — пераступіла парог і адразу пачала лаяць Ваданоса:

— Падонак, тваю... Не на тую нарваўся, казёл паршывы! Ух, сука... Хопіць, усё! Ірка, куды ён нас прывёз? Паехалі дахаты. Давай!

— Супакойся, суседзі спяць. Тут рэжым. Сядай. На вось выпі вады,— не хацеў думаць пра горшае напалоханы Сава.

— Ср... я хацела на ваш рэжым! Едзем, Ірка... Падонак... Я прыйшла, села, чакаю вас... Бачу, ён ужо намыліўся... давай ліпнуць да мяне, лапаць... Маўчу. Ды ён унаглую, нахрапа. Хапае мяне прама за грудзі, ірве. Я толькі ўчора купіла ліфчык. Я не дачка акадэміка, у мяне няма запасных французскіх... Кажу, супакойся, дзядзя, адыдзі, не будзі ўва мне звера... па-добраму хачу... Ён лезе цалавацца. Кажу, хадзем у бар, патанцуем, не лезь, не люблю нахрапістых. Абяцалі, кажу, з алімпійскім спартсменам пазнаёміць. Штурхнула яго я на ложак, супакоіла, а сама да дзвярэй... а яны зачынены. Ах ты, дрэнь... Калі я выходзіла ў туалет, ён паспеў іх замкнуць. Кажу, дай, падла, ключ, а то пажар учыню. Ты помніш, Ірка, у нашым пад'ездзе

касавокая Жэня... якую павезла адна кампанія ў гараж... дык яна ім такі феерверк утварыла...

Маўчыць. Напалохаўся, не лезе. Я думаю, пагляджу пакуль, ці не парваўся ліфчык. Што робіць гэты казёл? Хапае мяне за голыя грудзі... зрывае з майго парэзанага пальца бінт. Кажа, што ў мяне рот такі, як у Сары Манцьель. Тут я са злосці як звезданула яму паміж вачэй: кажу, дзе алімпійскі чэмпіён, абяцалі паказаць?! Дык ён, пузаты кот, распранаецца да трусоў і кажа: — Я — алімпійскі чэмпіён. Па чым, пытаю. Па грэблі, адказвае. Палез да мяне, кажа, ты навошта сюды ехала, шалава, не ведаеш? Цябе, кажа, сяброўка хіба не папярэдзіла? Хамло, крычу я, не на тую нарваўся. Мяне, кажу, трэба напачатку ў рэстаран разоў дзесяць звадзіць ды ў кіно пяць, а тады што-небудзь патрабаваць. Збоч з дарогі, кажу, бо я двум такім ахвотнікам рукі паламала. Ён, п'яная рожа, як бы не чуе, зноў лезе... Тады я хваць графін і ў акно — шах. Падзейнічала, супакоіўся. Кажу, адчыняй дзверы, насільнік! А то ў суд падам. Во, ліфчык парваў... Стрыказёл ванючы... Цьфу.— Яна сплюнула на падлогу.— Я адсюль нікуды не пайду. Прынясі мне іголку, я буду зашываць ліфчык і калготкі.

Сава, з тварам бляднейшым за воблака, подбегам кінуўся да шэфа. Той, трохі ачуняўшы, разглядваў у люстэрка драпіны на шчацэ.

— А, гэта ты?! Ты дзе адкапаў гэтую дэбілку? Не падрыхтаваў?!

— Не ведаю, не ведаю... Разбярыся з імі.

Ён вярнуўся ў свой нумар у поўнай разгубленасці, не ведаючы, што рабіць, як дагадзіць Ваданосу.

Люба — яна была ў адных трусіках — схілілася над унітазам, яе рвала.

Сава сеў на ложак і ў задуменнасці абхапіў галаву рукамі. Маўчаў.

— У цябе непрыемнасці? Бачу...

Знясіленая Люба, не звяртаючы ўвагі на Саву, вярнулася ў пакой і звалілася на ложак.

Іра накрыла яе пакрывалам.

— Разумееш, я на яго рабіў стаўку... У яго сувязі, вага агромністая. Ён лаўрэат прэміі. Сябруе з намеснікам старшыні Савета Міністраў. Ад яго цяпер залежыць мой далейшы лёс, будучыня... Усе гэтыя творцы злапомныя, прапітаныя зайздрасцю. Эх, чорт... Напілася, дурніца...

— Карацей, ты хочаш, каб я пайшла да яго і супакоіла? — без крыўды спытала Іра.

— Не... Я ж так не гаварыў. Я проста аналізую, як выйсці з гэтай ідыёцкай сітуацыі. Мы ж з табой сябры... ты вольная ў сваіх учынках... Нас многае яднае. Я не магу табе нават прапанаваць... Канечне, я толькі магу быць удзячны табе за гэткае парыванне. Трэба знайсці разумнае выйсце. Можа, твая прапанова і заўчасна. Будзем думаць...

— Іншага выйсця няма... ты ж разумееш. Я цябе падвяла з Любкай... Павер, я не думала, што яна яшчэ дзяўчына. Чорт ведае што ў гэтым свеце дзеецца. Я не буду крыўдаваць на цябе. Бо гэта, ты кажаш, вельмі важна для цябе. Спадзяюся, і ты не будзеш раўнаваць? Падай мне мой рыдыкюльчык.

Ён моўчкі падаў ёй рыдыкюльчык са штучнай «пад кракадзіла» скуры.

— Не ведаю, не ведаю. Мы спяшаемся. Нейкі паганы дзень, увесь час не шанцуе. Пачакай. Давай абмазгуем.

— Бог мой, нічога не думай, я на цябе не крыўдую. Не турбуйся... Я вінавата. Пайду, пакуль ён не заснуў.

Іра выйшла. Усё яшчэ ахоплены нейкай трывогай, Сава падкраўся да дзвярэй нумара Ваданоса, прыслухаўся. У нумары было ціха...

Ранкам яго пабудзіў асцярожны стук у дзверы. Іра вярнулася пры поўным парадзе з падмаляванымі вейкамі і з яркай чырвонай памадай на вуснах.

— Люба, падымайся, едзем!

— А колькі зараз? — не адплюшчваючы вачэй, спытала Люба.

— Сем нуль-нуль.

— Я адна спала? Побач нікога не было? — Люба падхапілася.

— Адна. Ну ты і тып, скажу табе. Я не трактар, каб араць. Паўімпатэнт, самадур. Паўночы ўсё тэорыю сексу расказваў. Маньяк-самавучка. Збірайся, Люба.

— Едзем, Ірка, я гатова. Вусны памажу, і ўсё.

— Пакуль, Сава!

— А дванаццатай гадзіне прыедзе наша машына, можа, пачакаеце?

— Рэйсавым аўтобусам хутка даедзем,— махнула рукой Іра.

— Дзякуй табе, Ірка, дзякуй. Да сустрэчы.

— Пакуль. Любка, уперад!

Ён іх праводзіў да лесвіцы, уніз не пайшоў.

І прыйшоў гэты доўгачаканы дзень: Сава атрымаў новую пасаду, а разам з ёй і ўтульны, чысты пакой, у ім стол, кніжная шафа, сейфік, чырвоны тэлефон з нумарам, які так лёгка запомніць. За два дні ён вывучыў усю спецыфіку работы метадыста Дома кіно і не знайшоў у ёй касмічнай складанасці для свайго розуму. Плануй сабе на месяц уперад прэм'еры новых фільмаў, выбірай з пракату пад планы творчых секцый патрэбныя ім фільмы і заказвай у аддзеле Дзяржкіно СССР на семінары лепшыя карціны рэжысёраў з сусветна вядомымі імёнамі — вось і ўсё.

Праўда, назвы тых закрытых для простых людзей фільмаў падказвалі Дыму кіраўнікі творчых секцый, альбо тактоўна навязвалі метадысты маскоўскага Дома кіно. Сава хутка ўцяміў, што менавіта ў чаканні гэтых самых фільмаўшэдэўраў і жыве ўвесь кінематаграфічны свет сталіцы, кіраўніцтва Саюза, метадысты Дома кіно. Часам нават прыдумлялі фіктыўныя семінары, толькі б вырваць з дзяржфільмафонду карціны з «бытавымі шаласцямі», як ахрысціў сексуальныя фільмы Ваданос. «Няхай нашы прафесіяналы навучацца ў італьянскіх, французскіх, амерыканскіх рэжысёраў, як трэба рабіць кіно без забабонаў,— казаў ён з апломбам.— Грошай на перакладчыкаў не шкадуй».

Сам Ваданос, да слова, не часта хадзіў, хіба выбіраўся на вельмі скандальныя: як «Апошняе танга ў Парыжы», «Начны парцье». Відаць, лічыў, што яму няма што ўзяць у такіх вялікіх майстроў, як Бергман, Пазаліні, Бунюэль. Асвоіў Сава і ўсю механіку гэтах праглядаў, ведаючы, хто і за што ў гэтыя тлумныя вечары адказвае, ад каго залежыць колькасць запрашальных білетаў і хто мае права, акрамя дырэктара і адказнага сакратара, іх выпісваць. З часам ён даведаўся, хто запрашае адказных работнікаў Цэнтральнага Камітэта партыі, гаркома і Саўміна. Паступова, дагаджаючы дырэктару дэфіцытамі і частуючы яго каньяком, Сава так пераблытаў усе карты ў падрыхтоўцы і правядзенні гэтых праглядаў, так закруціў справу, запрашаючы ў перакладчыкі-сінхраністы сваіх людзей, што як бы міжволі замкнуў, як кажуць, праблему на адным сабе. Трэба сказаць, што працаваў ён апантана, не лічачыся з часам і здароўем. За два-тры месяцы асвоіў і вывучыў творчасць добрай сотні замежных рэжысёраў, трымаў у памяці трыста, пяцьсот назваў і складаных, і авангардысцкіх, і займальных, і філасофскіх, ды яшчэ чортведама якіх фільмаў.

«Перамагае той, хто валодае інфармацыяй»,— любіў ён паўтараць сваім калегам-метадыстам.

Сава Дым рос па службе, і ўжо ніхто не пярэчыў, калі яго прызначалі старшым метадыстам, нават тыя, хто яго люта ненавідзеў.

Нібыта нябачны чарвяк тачыў яго душу: «Узвысся над імі ў дублёнках, узвысся над тымі, хто пад'язджае сюды на шэрых і чорных «Волгах», хто п'е каньяк з прыгажунямі ў бары, хто сядзіць заўсёды толькі ў дзевятым ды дзесятым радзе, узвысся над імі ўсімі!»

У элегантным касцюме Сава, як паўлін, хадзіў па Доме кіно. Толькі ён быў фігурай нумар адзін, а не тыя, каго чакалі дзесяць, пятнаццаць мінут і мелі права пачынаць без іх прагляд. «Сава, як фільм? Ёсць секс, Сава? Хто рэжысёр? На якім фестывалі ўзяў прыз? Хто аператар? Дзе Ніро іграе? А копія каляровая? Няўжо, Сава, будзе «Дэкамерон»? А заўтра пакажуць для актыву секцый? Сава, калі табе пазваніць?» — Гэтыя і дзесяткі іншых пытанняў ляцелі да яго і лашчылі слых з усіх бакоў. Ён быў запанібрата з дырэктарамі гасцініц, вядомымі сталічнымі ўрачамі, начальнікамі вакзалаў, палкоўнікамі міліцыі, нібыта ведаў іх сто гадоў.

Абсалютна незнаёмыя яму людзі рады былі пачаставаць яго каньяком, шампанскім, бо адразу прыкмячалі гэтага важнага, з акуратна падстрыжанымі бакенбардамі і вусікамі сімпатычнага маладога чалавека, які непрыкметна кіраваў усімі на «свяце кінасеансаў»: «Іванаўна, дайце трэці званок! Таварышы, прашу ўсіх у залу, мы пачынаем!»

Апафеоз звычайна прыпадаў на момант заканчэння фільма. Да яго падыходзілі, ціснулі з падзякай руку:

«Вось гэта мастацтва! Дзякую. Гэта Еўропа». Толькі высокія чыноўнікі не дзякавалі і нічога не пыталіся.

«Можа, ім не спадабалася смелая эротыка?» Ён перажываў. «Спадабалася, спадабалася»,— супакойваў яго Ваданос, аператар дадаваў: «Плюнь. Яны маўчаць, таму што нічога не разумеюць у кіно. У нас дэградацыя мастацтва, прафанацыя яго. Ды і там, у іх, трагедыя, яшчэ год, два, і тонкі секс заменіць адкрытая парнаграфія. Давай вып'ем...»

Сава ўспомніў сваіх старых чыжоўскіх сяброў. Была падстава з імі сустрэцца і адсвяткаваць усё разам: і яго новую пасаду, і кватэру, якую яму здаў у наём Мікалай Кандратавіч. Міхася за прагулы ўсё ж звольнілі, і добрая Рая забрала яго ў свой магазін грузчыкам. Выпіваць ад

гэтага ён меней не стаў, праўда, у Дом кіно прыйшоў цвярозы, у белай кашулі. Сава паказаў ім будынак, сунуў пасадачныя талоны і часова растварыўся ў стракатым гурце. Да пачатку сеанса было яшчэ добрых паўгадзіны, і Міхась угаварыў Мікалая Кандратавіча на «справу». Яны адышлі ў куток бара і дасталі прынесеную з сабою бутэльку гарэлкі.

Рая амаль сілком пацягнула Міхася ў залу.

Той ўпіраўся як мог, і яна дацягнула яго да трэцяга рада.

Загаварылі з экрана загарэлыя белазубыя людзі на незразумелай мове, тараторыў перакладчык. Сокала развязло, і ён пачаў «выступаць», як гэта звычайна рабіў у сваім родным кінатэатрыку ў рабочым квартале. Каменціраваў па-свойму падзеі на экране.

— О, дае! На халяву выпіць хоча, га! Ух ты, якія формы? Жывуць жа людзі...

Некалькі разоў яго тактоўна папярэджвала Рая, шчыпала за бок. Шыкала на яго і Зіна, незнаёмы сусед пачціва папрасіў не перашкаджаць глядзець, але Міхася спыніць было ўжо немагчыма.

Нехта ў зале крыкнуў: «Ды вывядзіце гэтага дурня! Пускаюць тут усялякіх. Адміністрацыя!» Гэтыя нахабныя словы балюча кранулі паэтычную душу Міхася, і ён пайшоў шукаць свайго крыўдзіцеля.

— Ану, жаба падкалодная, паўтары, што ты сказаў? Хадзі сюды, хлюпік, ану, выйдзем...

Трэба было ратаваць становішча, і дзяжурная (яна адна ведала, чый гэта госць) пабегла шукаць Саву. Мажліва, усё б і завяршылася ціха-мірна, але ж у зале ўключылі святло, прыпынілі сеанс. Сава, барвовы ад сораму і гневу, мусіў прылюдна выводзіць крыкуна.

Міхась і зараз пацвердзіў, што ён тут невыпадковы госць:

— Сава, скажы яму, няхай ён выйдзе. Я яму намылю рожу. Ды не штурхай мяне, сам выйду. Што я голы зад не бачыў... Тожа мне кіно... Коля, айда з намі, яшчэ кірнём па маленькай.

Мікалай Кандратавіч, здавалася, моцна урос у спінку крэсла.

Такой ганьбы Сава нават не мог сабе ўявіць.

Міхася цягнула «на ўчынкі», ён настойліва парываўся зноў у залу.

— Ён у мяне папросіць прабачэння. Сядай, Сава,

вып'ем. Публіка ў цябе вашывая. Я аднаму руку падаў, другому — не здароваюцца: «Прабачце, мы з вамі незнаёмы!» Не-е... на футболе лепей. Там хлопцы з душою. А тут... цьфу. Касцёл... а вы голай ж... бога ганіце. Пакліч Колю, вып'ем.

Дарага абышоўся гэты выпадак Дыму.

Вынеслі вымову і строга наказалі надалей нікога пабочнага не прапускаць. Знаходлівы Сава навучыўся праводзіць патрэбных яму людзей цішком.

Сваімі паводзінамі найбольш яму ўпадабалася Іра. Прыходзіла ў Дом, як мыш, брала два кубачкі кавы і ціха сядзела ў куточку, азіраючы вышэйшы свет сваімі насцярожана-ўважлівымі вачыма. Ніколі не падыходзіла да Савы, не лезла з пытаннямі. Леакадзія ж, наадварот: апранала свае самыя дарагія крымпленавыя, замшавыя ды велюравыя спадніцы, не сядзела на адным месцы, выстаўлялася перад сяброўкай, што і яна тут роўная сярод роўных.

«Не інакш хоча надыбаць тут багатага бабра»,— думаў Сава.

Ён аднаго разу павёў яе па высокай драўлянай лесвіцы аж на самую верхатуру касцёла, хацеў паказаць сталіцу з вышыні птушынага палёту.

Леакадзія была расчаравана, яна чакала ўбачыць горад-прыгажун, небаскробы, а перад ёй былі аднатыпныя, нізенькія, як бы прыплюшчаныя, аднастайныя дахі. Сава, абхапіўшы яе за талію, цалаваў у шыю.

— Бессаромнік! Сюды ж могуць падняцца.

— Хто? — усміхнуўся ён.— Дзяжурным не пад сілу — яны старыя, нямоглыя. Жаданне ёсць, а наталіць гэтае жаданне няма ўжо сіл. Гармонія з жыццём у чалавека часовая. Хіба ў безграшовай маладосці? Чаго тваё цела так напружана? Расслабся. Павярніся да мяне. Пакінем тут памяць. Будзеш у праклятай старасці ісці міма з сяброўкай і пакажаш на купал: «І там мяне любілі». Экзотыка.

— Ты вар'ят! Мілы вар'ят! Нельга ж у храме грашыць?!

— Бога няма. Яго лоўка прыдумалі, каб загладзіць аднабаковае сумнае зямное існаванне і ўтаймаваць у чалавеку жывёльны пачатак. Каханне заўсёды ўзвышае, так пішуць у кнігах. Любоў заўсёды прыемна богу. Мне здаецца, што і грудзі пабольшалі?

— Ага... проста да гэтага ў цябе была жанчына з першым нумарам.

— Не памятаю. Мажліва. Я цябе часта ўспамінаю. Асабліва раскладушку на кухні.
— Няўжо? А я і забылася пра яе...

Непазнавальна змяніўся ў адносінах з Савам і Марат Эдуардавіч, які ў гэты час працаваў на адказнай пасадзе ў Цэнтральным Камітэце камсамола. Неяк сам пазваніў. Пачцівым голасам нагадаў пра мінулае, пра сяброўства і папрасіў два запрашальных білеты сакратару і сабе. Сказаў, што забярэ пасыльны. «Пасыльнаму не дам. Прыйдзі сам»,— асмеліўся адказаць Дым.

І ён прыйшоў. З павагай узяў канверт з білетамі. «Стары, звяртайся. Будуць праблемы, звані ў любы час. Паможам. На беразе Мінскага мора мы адгрохалі салідны турысцкі комплекс «Юнацтва». Трэба дзе месца, каб правесці семінар, таксама звані».

Марат вельмі тактоўна, даверліва, як блізкаму і надзейнаму сябру, параіў Саву выступіць ініцыятарам і даць ад імя Саюза кінематаграфістаў і Дома кіно віншавальную тэлеграму Генеральнаму сакратару з выпадку ўзнагароджання яго чарговай Зоркай Героя Сацыялістычнай Працы. «Будзеце ў авангардзе. Першыя! Як гэта важна ў наш час быць першым. Гэта будзе працаваць на вас!»

Увечары, надзейна схаваўшыся ў натоўпе, Сава чакаў Марата: «Каго ж ён узяў на другі білет?»

Свістун прывёў зусім маладую дзяўчыну. У яе былі прыемныя рысы твару. Была яна ў акулярах. Марат трымаўся побач з ёй не з той бравадай і смеласцю, каб сцвярджаць, што яны прыйшлі разам. Ён насцярожана ўсё азіраўся наўкол, нібыта ўдакладняючы, ці не сочыць хто за яго паводзінамі.

...Цяпер у думках вяртаючыся ў мінулае ад трагедыі, якая здарылася з ягонай апошняй палюбоўніцай Марыяй Жураўлёвай, Сава ўспомніў, што гэтай самай сімпатычнай дзяўчынкай у акулярах са стрыжкай і была менавіта яна, Жураўлёва, але тады ў Доме кіно, яна не паспела ўстрывожыць яго душу, толькі запомнілася, а ўсё пачалося значна пазней.

Аднаго чалавека ён наўмысна не запрашаў у сваю «рэзідэнцыю» — гэтым чалавекам была Томка. Невылечная крыўда на яе за той вечар у рэстаране «Папараць-кветка»

не праходзіла ўжо каторы год. Пакуль жа ўсё было добра. Горад «капітуляваў», прызнаў яго сваім.

«Дзе цяпер Галіна? Паглядзела б, які я і кім стаў. Чахне дзе-небудзь на кропцы ракетнай. Сумуе...»

Дыму здавалася, што ён адзіны на ўвесь горад сярод дзеячаў мастацтва не мае ворагаў. Гэта ад маладосці: у часовым дурмане лёгкай славы, ён, канечне ж, памыляўся. Метадысты, дзяжурныя, кантралёры, бармен, нават кінамеханікі — усе яго недалюблівалі, а некаторыя і адкрыта ненавідзелі. Дым лічыў, што для паўнаты шчасця яму не хапае толькі грошай, багата грошай і машыны. Спрабаваў (знайшоў падстаўнога чалавека) скупліваць дэфіцытныя кніжкі ў кіёску, якія сам жа і заказваў на пленумы, семінары, а пасля іх той чалавек перапрадаваў. Аднак дробныя махінацыі не апраўдвалі сябе. Навару хапала хіба што на каньяк і таксі. Траплялiся дні, калі ён наўмысна не прыходзіў на службу дзень, два, тры... таму што быў вінен бухгалтару грошы. Ляжаў у кватэры на канапе, піў малако з хлебам, утаропіўшы погляд у партрэты сусветных «зорак» кіно, якімі ён абляпіў замест шпалераў усе сцены. У доўг ён не браў, ні ў кога. Распірала, разрывала грудзі зайздрасць да фешэнебельнай, багатай публікі Дома кіно.

У каторы раз на дапамогу, праўда, на гэты раз з вельмі сумніцельнай прапановай, прыйшоў Лявон, пра якога ён пачынаў забываць.

— Трэба, каб жыццё прыносіла асалоду, калі ты малады. На чорта мне, даруй, багацце, калі я стары і нядужы. Ты мне можаш парыраваць, што, маўляў, сама маладосць і ёсць асалода. І табе можна будзе верыць,— разважаў, седзячы на кухні ў сябра, Лявон.— Але лепш, калі гэта натуральная асалода, падмацаваная грашыма. Я ўяўляю нават і ў гэтай кватэры дабротную фінскую мэблю — я бачу кабінет за чатыры тысячы — люкс, магнітафон «Соні», бар з напіткамі, машыну пад акном... Капіталісты хітрыя... Няхай у крэдыт, але ўсё ў маладыя гады. А мы павінны давіцца «Санцадарам». Сюда жанчыну прывесці жахліва...

Сава маўчаў. Ён успомніў сваё. Правяла ў яго ноч лабарантка з НДІ, які займаецца ці то вырошчваннем мікробаў, ці шукае лекі супраць іх. Добра, што яна любіла ранкам доўга спаць. Ён заўважыў на сцяне вялікага клапа. Ратаваўся ад гэтай нечысці. Паліў агнём, залiваў у дзіркі газу, заклейваў пластырам разетку, думаў, што яны, праклятыя, паўзуць ад суседа, крапіў хларафосам ды іншымі ядамі, нават спаў пры святле. Усё вытрымлівала крывапій-

ная сіла. Маці дала палын-траву. Можа, і напраўду клапы «перабазіраваліся» да іншых, мажліва, ягоная кроў ім надакучыла, а мо памог палын, аднак яны зніклі. Пра клапоў Сава Лявону не расказваў, і без таго было ад чаго чырванець. Не палац шэйха, канура.

— Дык вось, мой сябар сітцавы, жанчынамі заласканы,— казаў Лявон.— Хачу табе сур'ёзную справу прапанаваць, ты працавіты, ведаю. Мне такія патрэбны. Ты ведаеш, што ў мяне і аглобля народзіць. Пагадненне на месцы па прыездзе. Усё дамоўлена. Едзем на Поўнач, да Пячоры. Чуў? У тундру, дзе імчацца кур'ерскія Ленінград — Варкута. Укалваем сезонна з мая па кастрычнік. Па чатыры тысячы на рыла. Мяне ведаеш, я методыкай не займаюся. Лявон плюнуў на ідэалы і ідэі канчаткова. Лявон цяпер робіць толькі грошы. Даю табе дзень на сумненні. Аднаго чалавека ў маёй брыгадзе не хапае. Вазьмі ў сваёй багадзельні адпачынак за свой кошт... у мёртвы летні сезон, паабяцай дырэктару сотню, дзве... там хопіць нахлебнікаў і тваю работу пацягнуць. Я на месцы ўрада ўвогуле палову горада разагнаў бы, як у Кітаі. Дарэчы, пакажу цытатнік Мао — цікавая рэч. Вырашай. У мяне жадаючых — толькі свісні. За Лявонам пойдуць і ў агонь і ў ваду.

Прапанова была акурат у час і вельмі прываблівала вялікімі заробкамі. Сава задумаўся: «Ці атрымаем па чатыры тысячы... вось пытанне?»

— Тысячу ў маі дадуць жалезна. Стары, мяне на мякіне не правядзеш. Трыццаць тры гады... Хрыстос ужо нацешыўся зямным. Я жанаты. Мне самому трэба ў верасні грошы ўносіць за кааператыў. Ты можаш пакласці ў банк, жыві на працэнты альбо купляй «Жыгулі».

Сава знайшоў на студыі чалавека, які бываў на шабашках, параіўся з ім і даў Лявону сваю згоду. Хітры дырэктар прапанаваў Дыму падаць заяву на часовае звальненне і паабяцаў да яго вяртання трымаць пасаду вакантнай. Пакідаў горад Сава без суму, адно хіба дужа маркоціла: з кім застануцца тут яго палюбоўніцы?

«Але, як кажуць, дасць бог дзень, чорт дасць жанчыну».

Разам з Лявонам ехала трое засяроджаных, з тварамі, падобнымі на абух сякеры, шабашнікаў, ягоная жонка Алена з двухгадовай дачушкай Хрысцінай і стараваты чалавек, Кузьма. Была ў яго кволай постаці, светлых вачах, у тонкім голасе нейкая дзіцячая непасрэднасць і безабароннасць.

Сава ўсё не мог прыпомніць, каго ён нагадвае: ці не

блажэнных на царкоўным цвінтары? У раннім дзяцінстве ён сустракаў падобных на Кузьму і ля ракаўскай царквы. На выгляд яму было гадоў пяцьдзесят.

«Знайшоў Геркулеса. Яго трымаць трэба, каб ветрам не садзьмула».

— Ты не глядзі, што ён знешне худы. Кузьма мужык жылісты, упарты і працавіты.— Лявон быццам пачуў яго думкі.— З нашага роду. Мой стрыечны дзядзька. Ён быў старастам. Царква ў вёсцы ад часу пасыпалася, і ён папрасіўся са мной. Веруючых, кажа, сярод нашых людзей мала бачна. Паеду, кажа, пагляджу на Поўнач, можа, там багамольцы яшчэ засталіся. Башкавіты. Пасля вайны бухгалтарам рабіў. У хоры з пеўчымі спяваў. Ён мне трэба, каб пры разліку не аб'ягорылі. Бывалі і такія выпадкі. Ён у мяне будзе пеленгаваць кожны дзень. Праўда, ён трохі, як бы чокнуты на сваім, з дзівосамі, жыве не ад свету гэтага... ды не звяртай увагі. Як табе мая жонка? — працягваў з больш будзёрым настроем Лявон,— у санаторыі знайшоў, на кухні рабіла — і свая ў дошку, без комплексаў.

Лявон пайшоў у свой купейны вагон, усе астатнія ехалі ў плацкартным.

Удалая тройка былых шабашнікаў усю дарогу альбо піла, альбо, задраўшы ногі з дзіравымі шкарпэткамі, дрыхла, адсыпалася. Кузьма не піў. Неўзабаве Сава распачаў з ім гутарку. Усё ж цікава, царкоўны чалавек.

— А вось чаму цэрквы маюць розную колькасць купалаў?

Кузьма адразу ажывіўся. Ён пачухаў сваю рэдкую сівую бародку і няспешна казаў:

— Колькасць купалаў у храме мае сімвалічнае значэнне. Адзін купал — значыць, у царквы адна галава — Хрыстос, тры купалы ўстрайваюцца ў памяць Святой Троіцы, пяць купалаў — у памяць Хрыста і чатырох Евангелістаў, сем — у памяць сямі таінстваў, трынаццаць — ёсць і такія — у памяць Хрыста і дванаццаці апосталаў. Усе храмы падобны альбо на карабель, альбо на крыж. Царкоўны звон таксама мае кожны сваё значэнне. Благавест, калі ў адзін звон б'юць некалькі разоў, падае знак аб пачатку богаслужэння. Трызвон, калі б'юць у некалькі званоў разам у тры прыёмы — урачыстыя службы, а ў час хросных паходаў б'юць у кожны звон па разу і, перабраўшы іх усе, ударакоць разам ва ўсе званы — гэты звон называецца перазвонам. Рэдка дзе цяперака пачуеш песню званоў.

Кузьма паглядзеў у акно вагона.

— Кольца вакол месяца... Да ветру.

— А даўно вы верыце ў бога?

— Ды, лічы, ад нараджэння... калі мне бацька загадаў на благавешчанне выпусціць з клеткі на волю птушак. Чалавек, які прадаецца граху і сам робіцца нявольнікам яго, не можа рабіць тое, што хоча, а падпарадкоўваецца граху.

— А вось скажыце... Святы Сава, быў такі ці не?

— Даруй, не прыпомню. Народ жыў такі, арабскага паходжання — Савы... не браў хрысціянскай веры і знік... А вось пра інака Саву Старажоўскай абіцелі раскажу. Цар Аляксей Міхайлавіч паляваў паблізу Старажоўскай абіцелі, каля Званігорада. Выбег з лесу мядзведзь і кінуўся на цара. Цар, чакаючы смерці, стаў маліцца, і тады раптам з'яўляецца старац у манашскім адзенні, і мядзведзь уцякае назад у лес. Цар пытае: «Хто ты? Я Сава, інак абіцелі». Прыбыў у манастыр цар, стаў шукаць інака, але ж такога не было. Аляксей Міхайлавіч убачыў вобраз прападобнага Савы заснавальніка абіцелі і пазнаў у ім старца, які явіўся яму ў лесе. Вось такі прыклад уяўляе ў ім прападобны Сава. Заступніцтва ў імя жыцця іншага. Добрае табе імя бацькі выбралі, слаўнае.

Разам глядзелі ў акно, як згасае за лесам акраец сонца.

— І ўсё ж я не разумею Хрыста,— Саву хацелася паказаць і сваю вучонасць.— Яго распялі на крыжы, а ён заяўляе: «Ойча! Даруй ім, бо не ведаюць, што робяць!» Яго забіваюць і ведаюць, што забіваюць, а ён — «даруй».

— Так. Хрыстос дараваў ім грэх. Мы ж не крыўдуем на сляпога, які на парозе хаты спатыкнуўся. Ён сляпы. Так і народ. Можна вельмі доўга знаходзіцца ў духоўным асляпленні. Ёсць смерць цялесная, а ёсць і духоўная.

— Я б на месцы Хрыста дараваў.

— Бог бясконцы ў сваёй любві. У кожнага чалавека ёсць свой крыж і свае пакуты. Насі іх з мірам і цярпеннем. Саграшыў, пакайся, ачысціся ад грахоў праз малітву.

— І якую ж малітву чытаць. «Ойча наш»?

— Усякая малітва гаючая, калі звернута да бога з любоўю і пакаяннем. Прачытай самую кароткую: «Святы Божа, святы крэпкі, святы бессмяротны, памілуй мя!» Вось я жыву з пастаяннай прысутнасцю бога ў душы.

— Як гэта? — здзівіўся Сава.

— Усё жывое нагадвае мне аб яго велічы і прысутнасці. Еду ў цягніку і кажу: «Божа, памажы і блаславі машыніста

на дарогу далёкую і цяжкую». Бог перадасць яму мае ўцяшэнні, умацуе іх. Вялікая сіла ёсць дабралюбства, бо колькі ні выпрабоўвай сябе, якія хочаш здзяйсняй подзвігі і труды цела, а калі не будзеш мець заўсёды ў вуме бога ды малітвы ў сэрцы, ты ніколі не супакоішся ад помыслаў і заўсёды будзеш падатлівы граху.

— Навука даказала, што ніякага загробнага жыцця няма. Дык чаго да яго рыхтавацца, калі ўсё цячэ ў нябыт?

— Можа, няма, а можа, і ёсць. А нават калі і няма? Хуткаплыннае жыццё цела, пра якое мы так пячэмся, што яно варта, калі няма ўратавальнага жыцця для душы. Якая асалода адчуць унутраны свет, бачыць сябе як бы знутры, правяраць свае справы і памкненні імем госпада. Каб часцей цяперашнія людзі ўспаміналі бога, можа, мы і не так хутка набліжаліся б да Апакаліпсіса. Людзі і робяцца зайздросныя, злосныя, гнеўныя, а гнеў ніколі не творыць праўды. Якім чалавек выглядае нікчэмным, адзінокім без разумення бога і яго вечнай прысутнасці. Нават калі застанецца адзін жах за садзеяны грэх перад ім, і то добра. Паступова жах перарастае ў благагавейную радасць ад пачуцця падабенства.

— Заблытаў ты мяне зусім. Бог трэба грамадству як стрымліваючы фактар, падобна суду, закону. Але ж убачыць увесь народ на каленях перад богам? Гэта рабы, непрыемная карціна. Згадзіся, дзядзька Кузьма.

— Ну, а стаяць на каленях перад ідалам Сталіна — прыемная карціна? Бог заклікае да дабра. Ідэя святая. Могуць быць вінаватымі людзі, якія прыкрываюцца імем бога. Вось пажыві з богам хаця б тыдзень. Павярні розум у сэрца.

— Ну што ж, паспрабую,— усміхнуўся Сава.

Сава па прыкладу Кузьмы на ноч тройчы перахрысціўся, аднак як толькі прыехалі на месца, пачалі ўладкоўвацца, адразу і забыў пра сваё абяцанне. У вагоне яны яшчэ некалькі разоў вярталіся да любімай тэмы Кузьмы. Дым даведаўся пра сем таінстваў царквы, пра дзесяць запаведзяў, пачуў аб святых і пакутніках праваслаўнай веры Ефрасінні Полацкай, Сергіі Раданежскім, Гермасе, уведаў, чаму на іконах з распяццем Хрыста ля яго ног малююць чалавечы чэрап. Сказаў яму Кузьма, колькі дзён быў Хрыстос сярод сваіх вучняў пасля свайго уваскрэсення. Вядомы Дыму сталі сімвалы веры, і зусім здзіўлены быў Сава, калі пачуў малавядомае: Хрыстос не меў сілы

несці на сабе свой крыж, быў настолькі слабы, што нёс за яго крыж зямляроб Сімон.

«Вось бы казырнуць усім гэтым перад Ваданосам, які бывае так любіць эфектна запузырыць што-небудзь з Бібліі». Сава запісаў нават у сваю запісную кніжку некаторыя цытаты з Евангелля, якімі трапна карыстаўся ў гаворцы Кузьма, праўда, часу чытаць ды перачытваць не ставала, ды да таго ж запісную кніжку разам з грашыма ў Савы потым укралі. Кузьма выклікаў у Дыма павагу, і не больш. За цяжкаю працаю, а будавалі на чыгуначнай станцыі доўгую і высокую эстакаду-платформу, хутка забыліся словы пра бога і сам бог. Работа выцягвала ўсе жылы. Лявон узяў аванс — дзве тысячы рублёў і пароўну падзяліў паміж усімі, кожны даў сваю долю на харчы.

Завіхалася на кухні вёрткая Лена. Укалвалі з нейкай злосцю ад золку да цемнаты, спяшаліся, лічылі, што гэту работу можна і трэба зрабіць хутчэй тэрміну. Лявон ужо абяцаў новы падрад. Узялі такі шалёны тэмп, што, натуральна, надарваліся, стаміліся да галавакружэння. Са злосцю лаяліся тры шабашнікі, у іх душах ужо тады пасяліўся недавер да гаманлівага Лявона, які прыдумляў штораз паездку да кіраўніцтва па будматэрыялы альбо дакументы, а сам адседжваўся на кухні, папіваючы з жонкай віно. Пачыналася з дакораў, а заканчвалася пагрозамі і сваркай. Кузьма з Савам былі як бы паміж двух агнёў, баючыся паўстаць і супраць нахрапістасці шабашнікаў і супраць лайдацтва Лявона. Злосць крэпла і ад голаду. П'яная Лена не паспявала, а то і зусім не рыхтавала абед, агрызалася, паводзіла сябе нахабна.

Садружнасць, сцэментаваная на жаданні зарабіць шмат грошай, рушылася на вачах. А тут яшчэ аб'явіўся вярбоўшчык і пачаў актыўна пераманьваць асноўную моц іх брыгады — шабашнікаў — на больш прыбытковую справу. Сава ўпершыню пашкадаваў: «Не трэба было згаджацца. Лявон за гэтыя два гады змяніўся. Ён не той». Шабашнікі населі, патрабуючы разлік за двухмесячную працу.

Лявон на вячэры паабяцаў, што ўважыць іх просьбу. «Я свісну, і на ваша месца прыйдуць пяцёра!»

Паехаў да кіраўніцтва, калі ж вярнуўся, знайшоў пад каструляй запіску ад Лены. Губы яго задрыжалі, і ён моўчкі выйшаў з вагончыка.

Пазней усе даведаліся, што было ў той пісульцы: яго жонка паведамляла, што ўсё надакучыла, што ён не дае ёй поўную волю і што яна пакідае яму Хрысціну і правы на

выхаванне, а сама едзе да любага чалавека ва Ухту. Лявон доўга не мог уцяміць, хто гэты мужчына? Успомніў, што яшчэ на вакзале ва Ухце яна выпадкова пазнаёмілася з двума п'яненькімі хлопцамі, якія не выклікалі тады ў яго сімпатый. Адчуваючы ўсё ж сваю працоўную крэўнасць, члены Лявонавай брыгады спачувалі яму і шкадавалі свайго брыгадзіра. Разам выпілі, праклінаючы жаночае племя. Дзень пражылі ў суладдзі.

Кузьма паклаў пад падушку Хрысціны Евангелле і ўсю ноч маліўся аб уратаванні душы яе маці. Смутак быў нядоўгі. Лявон (праўда, вяла, роспачна) узяўся за работу на эстакадзе, пакінуўшы дзіця ў адзіноце. Галодная і непрыкаяная дзяўчынка, як сіротка, хадзіла па пасёлку. Лявон усё спадзяваўся, што Лена адумаецца ды вернецца.

Мінуў доўгі тыдзень. Прыехаў касір армянін Бабаян, выдаў кожнаму па паўтары тысячы рублёў. Вярбоўшчык забіраў з сабою шабашнікаў.

Засмучаны і прыніжаны Лявон не бунтаваў. Армянін прывёз на аб'ект новую брыгаду. Пад вечар, калі яшчэ не паспелі сесці за развітальную вячэру, нечакана ў суправаджэнні двух рослых хлопцаў прыехала Лена і запатрабавала ў Лявона сваю долю заробку. Надзіва пачцівы Лявон без лішніх слоў адлічыў ёй восемсот рублёў, з якіх яна пакінула яму пяцьдзесят.

— Купіш Хрысціне ў горадзе калготкі і куртачку. Можаш часова здаць яе ў Дом дзіцяці. Мяне не чакай. Ніколі не чакай.

Лявон падышоў да насцярожаных хлопцаў і плаксівым голасам (што надта здзівіла Саву) пачаў іх упрошваць, каб яны не забіралі ад яго жонку. Доўга зневажаў сябе, адно што не ўпаў на калені. Адзін не вытрымаў, абсек:

— Надакучыла, дзядзя, закрый паддувала. Яна нас кахае двух, зразумеў, не? Усё. Адстань, амёба, і зачыні фантан.

Яны паехалі. Лявон стаяў разгублены, бездапаможны. Шкада Саву было глядзець на сябра. Ён спрабаваў суцешыць яго.

«Ай, кінь... Ты ж заўсёды казаў: жанчына параджэнне пекла, яна не варта нашага кахання, нашай душы. Супакойся. Ты ж мужык. А, Лявон?» — «Я кахаў яе, Сава, кахаю...»

Дужа многа і доўга пілі. Раніцаю ўсе раз'ехаліся, як чужыя, хто куды.

Лявон павёз дачку ў Мінск. Сава з Кузьмою падаліся

ў Малую Перу, у надзеі знайсці халтуру, каб месяц дарам не прапаў. Вось тут Сава і хапіўся: грошай у яго чамаданчыку не было: хто іх калі ўкраў, ці ж зараз успомніш. П'яныя былі. Ды і што пасля буры парус шукаць. Паўздыхаў Кузьма, праклінаючы гарэлку, і даў Саву дваццаць пяць рублёў. У Малай Перы грашовай работы не знайшлі. Кузьма вырашыў ехаць аж да Пячоры. «Можа, знайду там месца ды пакланюся праху бацькі, якога вывезлі сюды ў трыццатых гадах».

Ён прапанаваў Саву грошы на білет дадому, але ганарлівы Дым адмовіўся. Бралі яго рабочым на чыгунку. Саву не хацелася вяртацца ў Беларусь «на нулі», і ён рызыкнуў застацца, каб хоць сотню-дзве зарабіць.

Так Дым нечакана для сябе апынуўся сярод чужых людзей, якія ставіліся да яго з падазронай недаверлівасцю. Ён гэта адчуваў скураю, кончыкамі пальцаў, як гаворыцца. Таму і не рашаўся адразу шукаць кватэру. Аднапавярховыя драўляныя хаткі, апусцелая вуліца палохалі яго аднастайнасцю і няўтульнасцю. Дым кружыў вакол каменных сталоўкі і бальніцы, у якіх, як яму здавалася, павінны быць гарадскія людзі, якія яму памогуць. І не памыліўся. Часова пажыць у сябе прапанавала яму работніца сталоўкі Сычова, відаць, яна першай заўважыла ў яго вачах мальбу, страх. Муж Сычовай інвалід — у яго замест нагі быў пратэз і на левай руцэ, акрамя вялікага пальца, іншых не было — насцярожана сустрэў маладога, ладнага, сімпатычнага хлопца. Так здарылася, што раніцай і Сычова і Сава разам выходзілі з хаты і нейкі час, пакуль не разыходзіліся ў розныя бакі, ішлі адной дарогаю поруч.

— І чаго гэта ён выходзіць на ганак праводзіць? Раней такога не было,— здзівілася Сычова.

— Можа, раўнуе? Давайце будзем выходзіць паасобку,— прапанаваў Сава.

— Яшчэ чаго... Ты мне ў сыны гадзішся. У мяне дачка тваіх гадоў, ва Ухце ў Доме піянераў працуе.

Сычоў запіў. Гэта вельмі не спадабалася жонцы, і яна ўчыніла сварку. Аказалася жанчына узрыўною, нерваю.

Сычоў у гарачцы разбіў свой стары прыгожы гармонік. Шахнуў з размаху аб падлогу.

— Так... Раўнуе. Ты даруй... Я яго шкадую. Люблю. Знайдзі, Сава, сабе іншую кватэру. Падыдзі да Надзі Залатаровай... яна з табой робіць. У яе дом вялікі...

Сава быў знаёмы з Надзяй яшчэ да гэтай непрыемнай гутаркі.

Залатарову ў брыгадзе паважалі і любілі за незласлівы характар і небывалую цягу да работы. Па-мужчынску, магутна, прафесійна цяжкім молатам Надзя за адзін удар заганяла кастыль у шпалу. За яе знешняй грубасцю, мужчынскай паходкай, рэзкімі жэстамі, часам нязграбнасцю ўважлівае вока магло ўгледзець жаноцкасць і натуральную прыродную прывабнасць. У глыбокіх вачах часам успыхвала адценне меланхоліі. Было ёй недзе каля сарака. На кірпатым абветраным твары ніхто не бачыў азлобленасці, сярдзітасці ці проста непавагі да іншага. Не, твар яе не свяціўся падобна ліку Кузьмы святасцю, духоўнай думкай, але ж вочы яе прываблівалі не менш — абаяннем, добразычлівасцю і даверам.

— Надзя, вазьмі часова на кватэру. Сычоў раўнуе. Жонка яго прасіла да цябе звярнуцца,— шчыра прызнаўся Залатаровай Сава.

Яна ўсміхнулася.

— А мой што ж, не стане раўнаваць?

— Яна гаварыла, што з табою дачка дарослая жыве, сын першакласнік і што твой лес у тайзе валіць... Дом у цябе, казала, вялікі.

— Бач, як усё расклала, як па клавішах. А чаго ты скіс, галавой панік? Ладна... Дзе наша не гіне. Часова вазьму.

Шчаслівы Сава з выпадку наваселля купіў на апошнія грошы дзве бутэлькі партвейна. Вячэралі разам. Па поўнай шклянцы віна выпілі Надзя і яе дачка, студэнтка тэхнікума.

Ад недаядання і цяжкай работы Сава ап'янеў імгненна.

Дачка Надзі завяла прайгравальнік, вельмі ж ёй хацелася пахваліцца перад прыгожым маладым чалавекам сваёй калекцыяй модных шлягераў. Па чарзе, у нейкім безупынным вяселлі і лёгкасці ён запрашаў на танец кожную з іх і не саромеўся дзякаваць кожную пацалункам у руку, шчаку. Сава не кантраляваў сябе: адчуўшы цяпло, якое неслі Надзіны грудзі, ён пацалаваў яе ў шыю, схіліў галаву ёй на плячо.

Увесь наступны дзень яны не размаўлялі, саромеліся глядзець адно на аднаго. «Зрабіў глупства. Тактоўна трэба, асцярожна». Ён наўмысна затрымаўся ў сталоўцы. У свой пакойчык прайшоў непрыкметна. Увесь наступны вечар прасядзеў з дачкою Надзі, разглядваючы сямейныя фотаальбомы. Надзя напаліла лазню і павяла туды сына. Пасля лазні прыйшла да іх у светлай сукенцы, якая была ёй вель-

мі да твару. Упершыню, гледзячы на яе, Сава мог беспамылкова сказаць: «Прыгажосць не абышла яе».

— Дачура, ану жыва ў лазню! А мы з Савам вячэру прыгатуем.

— Дзякую. Я вячэраў,— запярэчыў Сава.

— Такіх пельменяў, як у мяне, нават у Сібіры не знойдзеш.

Дачка як бы з неахвотаю сабралася ў лазню. Сава не ведаў, як сябе паводзіць, што рабіць, куды сябе дзець у гэтай невялічкай кухні. Ён сеў на табурэт і стаў чакаць ад яе ўказанняў.

Здарылася тое, чаго яны абое не чакалі: Надзя аступілася і, каб не ўпасці, ухапілася за край стала, але не ўтрымалася і села да яго на калені. Доўга ён апошнім часам не быў з жанчынаю: толькі абняў яе... і не стрымаўся... да болю зацалаваў твар, шыю... як палкі палюбоўнік, якому на спатканне адведзена мінута, дзве.

— Пачакай, Савушка... Дачка вось-вось прыйдзе... ой, сукню памну... пачакай, галубок мой, пасля... чуеш, я сама прыйду... калі дзеці заснуць... Не трэба тут... У акно ж бачна... Божа, што ж я раблю?

Усхваляванае чаканне пладзіла бяссонніцу. Надзя прыйшла пасля апоўначы.

— Ой! Божа мой, і чым ты прываражыў мяне? Сіла нейкая штурхае да цябе... Грэх, ведаю, грэх жа. Мацер божая... гляджу на цябе і не магу... даруй мне... Я баба ў бяспамяцтве...

...Хутка яна ціха і неўпрыкмет пакінула яго пакойчык.

Пакуль дачка не паехала да Ухты, Надзя болей да Савы не прыходзіла. Пакрыўджаны, як кот, якога прагналі з пярын ды падушак, Сава пачаў яе ўгаворваць у час работы.

— Не крыўдуй... не магу я, калі дачка тут... у хаце... Заўтра ад'язджае... тады ўжо... Думаю, увесь час, што б ні рабіла, пра цябе думаю. Не ўгаворвай... душа неспакойная.

Ён не спаў, а пакутаваў у чаканні начнога спаткання, ад душэўных трывог. «Хе... чорт... Што гэта са мной? Няўжо я пакахаў гэтую бабульку?» Гэта нагадала юнацкія пакуты, калі ён кахаў Галіну.

Праўда, тут ён цалкам залежаў ад яе волі і жадання. І гэта, як і кожнага мужчыну, гняло яго. Сава ведаў, што муж Надзі, які валіў вахтавым метадам лес, раней як дзевятага верасня не вернецца ў пасёлак. Ён, усё ўзважыўшы і абдумаўшы, вырашыў ехаць сёмага. На руках у Савы

было сто рублёў. «Хопіць! На бічавоз і дахаты». Каб не так прыцягвала, маніла да сябе Надзя, ён з'ехаў бы і раней. Ах, як непадобна ні на чыю яе пяшчота, ласка, пакорлівасць. У той вечар дужа шмат выпілі. Ён сказаў Надзі, што вырашыў ехаць дамоў праз тыдзень, а сам намеціў зрабіць гэта раніцай. Здавалася, іх шчасцю і ласцы не будзе канца, яна як бы адчувала (о, гэтая магутная жаночая інтуіцыя), што гэта ноч у іх апошняя. Яны прачнуліся адначасова, пачуўшы цяжкія крокі пад акном.

— Гэта муж! — з такім надрыўным жахам сказала Надзя, што ён анямеў. Яна ледзь паспела накінуць халат.

Сава да канца не асэнсаваў, што здарылася і што чакае наперадзе. Ён ляжаў ні жывы ні мёртвы, як бы на глыбокім дне акіяна. Муж быў ужо ў пярэдняй, зірнуў і на крэсла — убачыў Надзіну камбінацыю і панчохі.

— Сцёпа, я кватаранта на днях пусціла. Часова,— казала Надзя не сваім ад хвалявання голасам.

— Бачу,— ён пераступіў парог пакоя, убачыў Саву, вярнуўся назад у пярэднюю, зняў з крука сваю двухстволку і патрабавальна павярнуўся да Савы.

— Ну, уставай, саколік! Паглядзім, на каго ты мяне прамяняла, сука?

Сава, скамянелы ад напружання і жаху, ляжаў нерухома.

— Уставай, гніда, каму сказана? — Сцяпан наставіў на Дыма стрэльбу.

Сава падхапіўся, ускочыў і стаў ля ложка. Галава кружылася. Ён баяўся зрабіць крок — так і стаяў голы перад імі.

— Да-а... Не надта, каб надта... А я думаў... Апранайся.

Смяротна белая Надзя трымалася збоку ад мужа, баючыся і слова выказаць у сваё апраўданне.

Сава знарок пачаў апранацца вельмі нетаропка, прыкідваў магчымыя варыянты далейшых падзей. Трэба было шукаць нейкія словы ў адказ.

— Я вас разумею... але вы памыляецеся. Я да дачкі вашай... іменна... да яе... далібог... нічога не было, так?

— Ты мяне, гнус, не агітуй, не на партыйным сходзе. Выходзь!

— Вы перабольшваеце... паверце. Ваша фантазія... я ж быў смяротна п'яны... спаў адзін, клянуся,— заікаючыся, шукаючы словы, апраўдваўся Сава.

— Маўчы, погань, а не дык прышыбу на месцы!

— Я пра тое, што вы дарма падазраяце жонку,— не хацеў здавацца Дым,— я да дачкі...

— Ідзі ўперад і маліся богу,— загадаў Сцяпан і ўскінуў да пляча стрэльбу.

Шырыня дня для Дыма звузілася за некалькі імгненняў да сцяжынкі. Туман яшчэ не рассеяўся. Раса абдавала холадам яго босыя ногі. Дым малымі крокамі, нібыта ў яго ногі былі спутаны, як у каня, рушыў да лазні, у бок балота. «Хоць бы малітву ўспомніць. Як гэта вучыў Кузьма?.. «Свенты, Божа, свенты крэпкі...» Малітву не ўспомніў. Успомніў фільмы, у якіх пры такіх абставінах ахвяры ўцякалі. Так зрабіў і Сава, ірвануў змейкай з месца.

Сцяпан стрэліў. Нешта нябачнае моцна апякло яму галаву, і ён упаў на зямлю, думаючы, што падае ў нябыт. Апрытомнеў праз хвіліну, дзве. Над ім схіліліся Надзя і яе муж, у вачах якога Сава прачытаў страх. «Слава богу. Дабіваць не будзе».

— Жывы?

Сава маўчаў.

— Ды жывы, хіба не бачыш? Мала табе мінулага? Засумаваў па нарах? — асмялела Надзя.

Сцяпан падняў Саву моцнымі рукамі і панёс у хату.

Надзя знайшла бінт, ёд, перавязалі Дыму галаву. Ён усё не мог апрытомнець ад шоку, цела яго яшчэ калацілася.

— Жана, дай гарэлкі!

— А дзе я табе вазьму... Ёсць віно.

— Нясі віно.

Сцяпан наліў усім па поўнай шклянцы. Выпілі. Хмель не браў Саву, свядомасць была ясная. «Толькі не пароць гарачкі... Не сапсаваць справу... Нельга адразу ўцякаць, ад'язджаць адразу нельга. Заб'е»,— унушаў сабе Дым.

— Ты б, стары, і сам падумаў... Што мужык зможа, калі справа наклёўваецца, у такім стане? Пасля дзесяці «фаустпатронаў» я быў смяротна п'яны, во, на руку адрэж,— Сава паказаў на куток у якім стаялі пустыя бутэлькі.

— А чаму там... на крэсле ў тваім пакоі яе камбінацыя вісіць і панчохі? — ускіпеў Сцяпан.

— Ды яны там... тры дні ляжаць. Дачка насіла. Я іх забылася забраць,— памагала Надзя заблытаць ісціну.

— Маўчы. Ладна. Не забіў цябе сёння, заўтра заб'ю. Усё адно злаўлю. Бог шэльму меціць,— Сцяпан ап'янеў, стаміўся, упаў на ложак і, не распранаючыся, адразу заснуў.

— Я на работу пайду,— услых сказаў Сава.

— Ты ў медпункт не заходзь, нельга! Трэба, каб ніхто пра гэта не ведаў. У нас строгія парадкі. Муж баіцца суда.

— Я ўсё разумею,— амаль спакойна адказаў Сава.

Пасля работы Дыма знайшоў участковы міліцыянер, які, гледзячы ў вочы, пацікавіўся: ці не чуў ён, хто страляў і дзе?

Сава адказаў, што не чуў, а на пытанне: «А што з галавой?» — адказаў, што параніў на працы яшчэ ўчора.

Міліцыянер пачасаў рубам далоні нос, гэта значыла, што ён, хоць і сумняваецца, але ж верыць таму, у каго пытае.

У дажджлівы вечар пілі зноў. Сцяпан аднекуль прынёс дзве пляшкі гарэлкі. Быў ён невясёлы, гатовы ў любы момант успыхнуць і ўсё надрыўна глядзеў на Саву. Дым, наадварот, рабіў усё, каб не распазналі глыбока схаванай трывогі, харахорыўся, з усмешкай расказваў пра тое, як два бічы адбілі жонку ў яго сябра Лявона.

— Дзяшоўка! Я б яе прыхлопнуў на месцы! — узарваўся Сцяпан.

— У цябе іншага суда няма. Усіх перастраляў бы,— не надта каб з асуджэннем сказала Надзя.

— А што ж яшчэ? Божы суд? Суд сумлення? Смешна! Каго цяпер страшыць жах перад геенай вогненнай?

Сава хутка перакінуў размову на іншую тэму, паведаміў ім аб сваёй сустрэчы з участковым.

— Правільна... Вось так гні дугу і далей. На рабоце, маўляў, параніўся, і ўсё,— адобрыў Залатароў.

За размовай дапілі гарэлку дарэшты.

— І за што цябе бог утрымаў на свеце? Не разумею. Пасеяў сумненні ўва мне. За што? — Сцяпан павярнуўся да Савы, і таму стала страшна ад яго погляду.— Ох, як ты мне не падабаешся... Хоць і п'ю з табой, за адным сталом сяджу, а душа кіпіць, бунтуе. Слізкі ты чалавечак, гадкі, як варан. Памяні маё слова, ты шчасця не сееш і ў цябе яго не будзе. Лічы, што табе пашчасціла са мной. Нехта іншы будзе разумнейшы, прыстрэліць.

— Зноў за сваё? Супакойся, Сцёпа, госпадзі, колькі ж можна,— прасіла Надзя.

Пара было класціся спаць, больш не сядзелі. Яшчэ доўга Сцяпан нешта бубніў у ложку. Сава чакаў раніцы, як чакае цяжкахворы прыходу ўрача.

Час прыпынку дзве мінуты. Адпраўленне цягніка ў сем пятнаццаць. За гадзіну да адпраўлення ён ужо быў на станцыі і ўсё глядзеў і глядзеў у адзін бок: «Ці не бяжыць са

стрэльбай Сцяпан?» Надзя, што яго вельмі здзівіла, усё ж набралася смеласці, прыйшла яго праводзіць. На вачах у яе былі слёзы. Сава трымаўся збоку, не рызыкаваў стаяць блізка ля яе.

— Госпадзі! Мацер божая, не здагадалася я... хоць бы падарыць табе што на памяць... Што ж мне адной рабіць... галубок мой... саколік мой... А можа, застанешся яшчэ?.. Хоць на дзень... Заўтра ж аванс. Савушка, не застанешся? Напішы... Я буду чакаць!

«Наіўная, сумазбродная... Ды я малю бога, каб забыцца на гэты кашмар. На даху вагона гатовы да сталіцы... а там у падполле, на дно. А яна — напішы. У жанчыны тайны няма. Яна ўся зверху. Ёсць наіў, часам высакамер'е, элементарны рэфлекс уласніцы, зайздрасць».

Сава не разумеў і не хацеў разумець душэўных пакут і памкненняў Залатаровай. Ён замкнуўся, ахоўваў душу, і не толькі чужыя людзі, сам баяўся туды заглянуць.

Першы тыдзень у сталіцы ён сядзеў, як крот, безвылазна, нагадваў аб сваім прыездзе хіба што тэлефоннымі званкамі. Так сказаць, рыхтаваў аўдыторыю. Частаваць пагусарку не хацеў нікога, ды і не было за што. Першы візіт аддаў дырэктару Дома кіно. Прынёс у падарунак рогі аленя, якія яму даў Міхась, і бутэльку каньяку. Дырэктар сувеніры ўзяў, але Дыма насцярожыла абыякавасць кіраўніка.

— Разумееш, Сава, пакуль ты ездзіў, адбыліся непрадбачаныя катаклізмы. Я ледзь утрымаўся ў крэсле. Адбыўся нечарговы пленум. Выбралі нанава сакратарыят і палову прэзідыума. Змянілі штат Дома кіно... метадыстаў. Цябе абараніць не было каму... Ваданоса самога патурылі. Я застаўся адзін... выказаў слова за цябе, толькі распаліў злаcліўцаў. Навязалі мне сваіх людзей. Ты не крыўдуй. Пасядзі часова дзе-небудзь на тэлестудыі. Наіўныя, яны думаюць, што нешта зрушаць... Усё вернецца на старое. Звані, не прападай надоўга. Я забяру цябе ў штат... год, два максімум пацярпі. Білеты там на закрытыя прагляды — гэта калі ласка. Табе магу выпісаць пастаянны чырвоненькі з фота і пячаткаю. Новыя ўлады прыдумалі. Парадак хочуць навесці...

— Ну, а на новае кіраўніцтва хто ўплыў мае? Каб надавіць? — у цяжкай скрусе вымавіў Сава.

— Толькі яны,— дырэктар паказаў пальцам угору.

Там, наверсе, у апараце ЦК, у Савы быў толькі Марат

Эдуардавіч. Ён успомніў яго самазадаволены твар са слінявым ротам, кічлівую фанабэрыю і здрыгануўся.

Але ж трэба было нешта рабіць. Пайшоў у будынак ЦК. Дзяжурны міліцыянер даў яму нумар тэлефона, прапанаваў пазваніць, каб даведацца, ці на месцы інструктар аддзела агітацыі і прапаганды Цэнтральнага Камітэта. Сава набраў чатыры лічбы і назваў сябе. Марат Эдуардавіч паабяцаў праз некалькі мінут спусціцца ўніз. Сава чакаў паўгадзіны.

— Сто гадоў цябе не бачыў, прывітанне! — з уздымам, падаючы руку, пачаў Свістун.— У мяне, на жаль, часу мала. Але для цябе пяць хвілін выкраю. Расказвай, як, што... якое гора?

— Не ведаю, ці дапаможаце,— сам таго не чакаючы, перайшоў Сава на «вы».

— Давай. Я слухаю.

Дым паведаміў Марату пра сваю авантуру з Поўначчу і шчыра запытаў, ці зможа той вярнуць яго ў Дом кіно?

— Ах, чорт... дзе ты быў месяц таму? Разумееш, якая справа. Паступіў у вышэйшую партыйную школу. Але ж з вашым першым сакратаром Саюза пагавару, абяцаю, мы з ім былі разам у паездцы па Балгарыі. Што будзе ў маіх сілах, зраблю. Цябе не дамо ў крыўду. Ты хараша нам служыў. Такімі кадрамі не кідаюцца. Сталін бы за такое... Харакіры. Крызіс у сістэме кіно. Быў я на пленуме. Зарваліся «творцы». Клююць Цэнтральны Камітэт, трэцяга сакратара. Хто ж імі, скажы на міласць, мусіць кіраваць? Дворнікі? Дай ім волю, перагрызуць глоткі і здымуць такое, што ніхто не зразумее. Такія грошы ім дзяржава адвальвае, і не сорамна. Абарзелі.

Ну, а так, як жыццё? Не жаніўся?

— Пакуль не.

— І правільна. Я спатыкнуўся... мы з ёй у камсамоле разам працавалі. Мужчына можа да трыццаці гуляць. Як жыллёвыя ўмовы?

— Наймаю кватэру.

— О-го, з шыкам. Адразу бачна, з Поўначы чалавек прыехаў. Пакінь свой нумар тэлефона... я пазваню. Стары сябра лепей новых двух.

Сава запісаў Марату свой нумар тэлефона, мала спадзеючыся на яго дапамогу, і ён не памыліўся.

Свістун пазваніў праз месяцы тры і пачаў несці нейкую бязглуздзіцу, называючы прозвішчы то аднаго вядомага партыйнага кіраўніка, то другога, усё абяцаў, што пытанне

будзе вырашана станоўча, і нарэшце прагаварыўся: «Ці не дасі, Сава, мне ключ ад сваёй кватэры на гадзіну-дзве, ад сямі да дзевяці?» Дым усё зразумеў і суха, са здзекам адказваў, што кватэра сёння занятая, што перад вачыма ходзяць дзве голыя дзеўкі, чакаюць чаргі, а яшчэ дзве на вуліцы, пад вокнамі, чакаюць, калі іх запросяць, так што ў бліжэйшыя месяцы кватэра будзе занята.

На кінастудыю Саву назад не ўзялі, гэта кантора мела даўнюю традыцыю: звольніўся — назад не браць.

Тэлестудыю ліхаманіла — ішло глабальнае скарачэнне штатаў, там яго і слухаць не захацелі. Чатыры месяцы ён боўтаўся без работы, кожны вечар ішоў у артыстычнае кафэ, якое жартам нехта ахрысціў «Мутнае вока», бавіў там час за пустымі размовамі. Грошы пазычаў у Раі, Іры.

Манатоннасць, шэрасць дзён атуплялі яго, даўгі, якім не бачна было канца, гнялі душу, рабілі яго злосным.

Выпадковая сустрэча ў «Мутным воку» з фатографам Феліксам Гаўрылкам некалькі аблегчыла яго становішча. Фелікс атрымаў ад аднаго навукова-даследчага інстытута фоталабараторыю і запрасіў сумнага, беспрацоўнага Саву да сябе: «Зарплата не акадэміка, але і работа — не бетон размешваць. Праяўляй плёнкі, памагай пячатаць фота, насі ў аддзел гатовы матэрыял, збірай новыя заказы — вось і ўсё».

Сава згадзіўся.

У лабараторыю мала хто прыходзіў, да таго ж праз кінабудку быў запасны выхад на вуліцу, працоўны час не кантралявалі надта строга, адносная воля была ў іх руках — і гэта не магло не радаваць. Праз патайныя дзверы ён выходзіў «у горад», ішоў ва ўтульны бар суседняга НДІ і сядзеў там гадзінамі, знаёміўся з навуковымі супрацоўнікамі, найбольш з супрацоўніцамі — непрыгожымі ў большасці, надзьмутымі і ганарлівымі. Часам запісваў (не доўга прасіў) іх службовыя тэлефоны, абяцаючы ім зрабіць прыгожыя фота.

Работа падручнага (Фелікс быў чалавек згаворлівы) не зневажала яго, адно хіба — без грошай не было паўнаты фэсту. Без цікавасці ён узіраўся ў людзей. Нешта гняло душу зноў: «Прадчуванне нестабільнай будучыні?» Адгалоскі былой славы «галоўнага» ў Доме кіно яшчэ луналі над ім. Ён не хацеў змірыцца з пачаткам фіналу той былой славы. Гэта быў самы бязрадасны год яго жыцця. Не радавалі нават добрыя змены на хутары. Бацьку па амністыі выпусцілі з турмы. Маці перахварэла рэўнасцю і даравала яму.

Абодва яны прыкметна састарэлі. У старога балелі ногі, хадзіць яму было цяжка. У суседні калгас на працу не пайшоў. «А... жыццё пагнулася... Колькі нарабіў на гэтую пенсію, няхай столькі і выпішуць... дваццаць рублёў, трыццаць, сорак. Выслуга гадоў ёсць. І на службу не пайду. Пасля турмы не возьмуць туды, дзе грошы. Да пенсіі некалькі гадоў, перакантуюся і на хутары,— казаў ён Саву пры сустрэчы.— А ты, сынок, не хочаш жаніцца? «Куды спяшацца... у пятлю? Рана яшчэ»,— нехаця адказаў Сава.

Правёў Сава эксперымент. Рызыкнуў тыдзень пажыць пад адным дахам з маладой лабаранткаю. У турыстычную паездку па Прыбалтыцы яна не паехала, засталася ў яго. Два дні ўсё было ў радасць: і ноч, і дзень, і вечар, і раніца. На трэці дзень ён з сумам падумаў: «Чаму гэтая круглатварая з вуграмі на лбе (ён пачаў да яе пільна прыглядацца і ўсё ацэньваць) не ідзе на працу?» Яны амаль не размаўлялі. Калі ж яна спрабавала ўспамінаць нейкія класныя гісторыі — яго цягнула да сну, калі ж ён пачынаў расказваць ёй пра Кузьму, яна пазяхала: «Хадзем у кіно».

Яго ж у кіно не цягнула. Да таго ж ён заўважыў, што яна неакуратная. Чатыры дні складвала ў ракавіну міскі, шклянкі, лыжкі, відэльцы і ні разу не памыла іх. Сава яе тактоўна выжыў з кватэры, спасылаючыся на тое, што нечакана прыязджае гаспадар Мікалай Кандратавіч.

«І як яны ўжываюцца? — думаў Сава, гледзячы на Міхася і Раю.— Што іх аб'ядноўвае? Дзяцей няма. Можа, сядзяць кожны вечар ля тэлевізара ды п'юць? А ў выхадны спяць. Не-е. У замкнутай структуры пад надзорам узвыць можна». Але ж і жыць шыкоўна, вольна сам ён не мог, не было праклятых грошай.

— Слухай, Фелікс,— прапанаваў ён сябру, нос у якога быў прыплюснуты, як у баксёра.— Навошта мы слепім вочы за капейкі? Давай халтурнём. Я знайду натуршчыц, распранём, здымем, напячатаем хаця б ігральныя карты, а што? Глуханямыя, я сам бачыў, носяць па вагонах ад Брэста да Уладзівастока. Што мы лапцем роблены?

— На тое і глуханямыя. А нам падсудная справа.

— Ты зрабі мне на ўзроўні. Каляровыя. А збываць мая турбота.

Фелікс згадзіўся. Захоплены новай ідэяй, Сава кінуўся на пошукі натуршчыц. Іра не падыходзіла, яна была худая, з пераборам. Шукаў дабротныя формы, каб правацыравалі... Томка пасля заканчэння інстытута працавала недзе ў раённым цэнтры. Лабарантцы з НДІ не рызыкнуў прапана-

ваць — ведаў, што яе бацька робіць у міліцыі, ці мала што. Леакадзія ў гадах, ды і наўрад ці згодзіцца, яна асцярожная.

Інэса і Воля — студэнткі-першакурсніцы інстытута культуры не згодзяцца: яшчэ палахлівыя козачкі, трэба прыручыць. Падыходзіла толькі адна — навучэнка ГПТВ. Родам яна была аднекуль з-пад Віцебска. Бацькі не было (ці памёр, ці кінуў сям'ю), маці жыла адна ў вёсцы, братоў не было таксама. Даведаўся і пра гэта — на ўсякі выпадак. Сава паказаў ёй венгерскія, чэхаславацкія фотачасопісы, унушаючы дзяўчыне, што фігура ў яе калі не лепш, то і не горш, як у еўрапейскіх «зорак»-натуршчыц.

Сустрэліся ў кафэ. Ён даў ёй аванс пятнаццаць рублёў: «У нас фірма. Усё салідна і на сусветным узроўні». Вочы дзяўчыны загарэліся, бачна было, што ёй хочацца стаць «еўрапейскай зоркай», і як мага хутчэй. Абставілі фоталабараторыю пад фотапавільён, прынеслі бутафорыю, рэквізіт. Чакалі пэтэвэшніцу. Па просьбе Савы яна прынесла некалькі сваіх спадніц, трусікаў, камбінацый.

— Разумніца наша... Ну як жа цябе не любіць і не паважаць. А дзе ліфчыкі?

— Э... а... у мяне адзін. На мне.

— І ўсё?

— Усё.

— Та-ак.

— Божа мой, сапраўдныя «зоркі» здымаюцца без ліфчыкаў,— прыспешваў Фелікс.— За абедзенны перапынак мы павінны ўсё паспець.

Дзяўчыне паказалі на цёмную кабіну (там пячаталі фота), і Сава папрасіў там распрануцца.

— Разувацца не трэба? А то ў вас холадна... з-пад дзвярэй вецер дзьме.

— Пажадана, канечне, без абутку.

— Няхай застаецца ў ботах,— згадзіўся Фелікс, абкусваючы сабе на пальцы пазногаць.

Вельмі доўга распраналася ў кабіне дзяўчына, нарэшце, саромеючыся, выйшла да іх у ліфчыку, доўгіх трусіках і ў ботах на высокіх каўчуковых абцасах.

— Я гатова. Што трэба рабіць?

— Разумееш, Валюша, справа ў нас далікатная... калі мы здымем цябе ў такіх трусіках, ніводзін еўрапейскі часопіс не рызыкне надрукаваць наша фота. Хіба што трэцяму свету... дзе-небудзь на востраў папуасаў. Еўропа... мы падпісалі міжнародную канвенцыю, праз інтэграцыю і інтэнсіфікацыю да уніфікацыі. Разумееш, фасон не той, крой не

той... не хочацца ганьбіць дзяржаву. А ліфчык? Як сітцавае вядзерца для пераносу вады ў пустыні ён падыходзіць, але фота... для фота... трошкі не тая эстэтыка,— угаворваў дзяўчыну Сава.

У Валі прапаў увесь настрой.

— Што ж рабіць?

— Давай усё гэта здымем... не будзем паганіць шырпатрэбам тваю боскую фігуру.

— А сюды ніхто не прыйдзе? — пачырванела Валя.

— Не. Гэта гарантуем.

У дзяўчыны дрыжалі рукі. Яна зняла ліфчык, трусікі. Канечне, у яе была далёка не боская фігура: шырокія плечы, унушальныя грудзі, квадратны зад і тоненькія ножкі.

— Будзем здымаць ню. Французскае слова,— прыцмокнуў губамі Сава.

— Як гэта?

— Усе часткі твайго асляпляльнага цела.

— Але ж мы так не дамаўляліся,— зусім панікла Валя, прыкрываючы рукамі ніз жывата.

— Саромецца не трэба. Гэта мастацтва. Мы прафесіяналы. Насільнічаць цябе тут не будзем... гарантуем. Будзь спакойна.

— У мяне тут на грудзях засос,— ніякавата сказала дзяўчына.

— Нічога. Яго не будзе бачна. І хто ж яго табе пакінуў?

— Адзін з групы. Нахабны такі.

— Пачнём. Трэба расслабіцца. Як ёгі. Уяві на мінуту, што ты не ты, а егіпецкая жрыца альбо царыца Сафская... адна на беразе лагуны, дзе-небудзь на Маўрыкіі. Глядзі ўдалячынь. Так, так... Бач, Фелікс, якая яна здольная артыстка? Добра. Крані рукой валасы. Фелікс, ты шчоўкай, дзейнічай. Лаві імгненне. А цяпер уяві, што ты скачаш на кані... Добра. Шырэй ногі... Прыпаднімі свае грудзі рукамі, нібыта корміш дзіця. Цудоўна. Як натуральна. Пакажы нам язык... Яшчэ. Пашавялі ім. Брава!

Раптам на іх напаў ідыёцкі смех. Каб Валя не заўважыла (яе асляплялі прыборы), яны адварочваліся альбо беглі ў цёмную кабіну і там аж давіліся гамерычным рогатам, ведаючы, што ў павільёне не чуваць.

— А зараз новая поза. Уяві, што ты вінаградная лаза, якая ўсю сябе аддае галодным. Павярніся да нас спінаю і пашукай на сцяне свой цень. Чорт, якая здольная артыстка, ты бачыш, Фелікс? Боты не перашкаджаюць?

— Няхай. У гэтым ёсць свой шарм.

— Добра. А цяпер буйным планам усе часткі цела.

— Толькі каб не было бачна засосу,— прасіла пасмялелая Валя. Цела яе перастаў біць калатун. Яна спрабавала ўсміхацца. І ўжо не рэагавала, калі Фелікс датыкаўся рукамі да яе пухлага цела.

Праявілі дзве плёнкі. Чакалі. Пілі сухое віно. Фелікс падаў Валі свой сіні рабочы халат.

— Калі не будзе хапаць экспазіцыі, паўторым.

Валя зусім асвоілася. Адчувала сябе як у пакоі інтэрната.

— У яе рэдкі профіль. Паслухай, Сава, пакінь нас... я хачу зрабіць яе партрэт,— употай, нерашуча папрасіў Фелікс.

— Аб чым гаворка, стары. Яна ўжо ручны кадр. Дзейнічай.

Перад тым як адправіцца ў рызыкоўнае падарожжа на электрычцы Мінск — Маладзечна, Сава вырашыў абавязкова змяніць свой знешні выгляд. Знаёмы студыйны грымёр прыклеіў яму бараду. Палову дарогі Сава хадзіў з вагона ў вагон і ўсё прыглядаўся да пасажыраў. Нарэшце прыкмеціў карцёжнікаў, затрымаўся ў тамбуры і пачаў чакаць кліента. Увайшлі з транзістарным магнітафонам у руках два маладыя хлопцы, і ён рызыкнуў прапанаваць ім свой тавар. «Мы-ы... э... у... кар... ы...» — ён актыўна жэстыкуляваў перад іхнімі тварамі і паказваў ім карты. Яны зацікавіліся, спыталі: «Колькі?»

Сава помніў жэст глуханямога, выставіў перад сабой дзве далоні.

— Чырвонец? — не паверыў адзін хлопец.

Сава хітнуў галавой.

— Не-е. Дорага.— Яны вярнулі яму калоду карт і пайшлі ў вагон.

У другім тамбуры курылі трое мужчын сярэдняга ўзросту, і ён прапанаваў «дэфіцыт» ім.

— Цана? — спытаў адзін.

Сава паўтарыў жэст далонямі.

— Не. Мне за чырвонец тры дні пахаць трэба. Рубель дам, ну, два,— і ён паказаў Саву палец.

Сава не згадзіўся. Яшчэ ў адным тамбуры знайшоў маладых хлопцаў і паказаў ім адну далонь.

За пяць рублёў яны купілі. Да Савы прыйшла ўпэўненасць. Ён хадзіў па вагонах, як сышчык, выбіраў «ахвяр» і смела прапаноўваў «карты» альбо проста фота, на якім буйна былі зняты грудзі і іншыя часткі цела Валі.

З адным доўга не маглі згаварыцца.

— Чатыры. Болей не дам,— казаў мужык з сіняком пад вокам.

Дым на пальцах паказаў «восем».

— Ідзі з богам. Болей шасці не дам.

— Давай сем і забірай,— забыўшыся на тое, што ён глуханямы, вымавіў у азарце Сава.

— Дык ты, падла, не глуханямы? — вочы ў мужыка забегалі.— Скачы адселя, тунеядзец, пакуль я табе рыла не намыліў. Ух, сука...

Працоўны дзень закончыўся. У кішэні было сорак пяць рублёў. Ні жадання, ні сілы, каб сесці на апошнюю, яшчэ адну, электрычку ў Дыма ўжо не было. Адпачываў два дні. Вырашыў паўтарыць «аперацыю» у шматлюдную пятніцу. Спраўна пайшла справа. Ужо на вакзале ён збыў тры калоды па восем рублёў. Пасажыраў у гэты дзень было значна больш. Ён не меў магчымасці хадзіць па вагонах, перабягаў ад аднаго вагона да другога на прыпынках. Цудам на адной станцыі не патрапіў пад колы цягніка. У адным тамбуры прапанаваў карты тром маладым маўклівым хлопцам. Яны на яго жэсты адказалі з ахвотаю на пальцах. Сава зразумеў, што нарваўся на сапраўдных глуханямых і знямеў. На сваёй мове яны нешта дамагаліся ад яго.

— Рабяты, я не ваш, я так! Я...— Язык у Савы заплятаўся.

Адзін вырваў у яго з рук цэлафанавы пакецік з картамі, а другі моцна даў пад дых. Сава зразумеў, што цяпер пачнуць біць, і хутка сарваў з твару накладную бараду. Яны аслупянелі. Карыстаючыся паўзай, Сава хутка напісаў на лістку паперы: «Я артыст. Рыхтуюся да ролі глуханямога ў кінакамедыі. Рэпеціруюю». Гэта падзейнічала. Яны ўсміхнуліся, вярнулі яго пакет і паціснулі на развітанне руку.

Сава ўсё яшчэ не мог апамятацца. Паехаў дамоў. Выпадак з глуханямымі пазбавіў яго магчымасці займацца парнабізнесам. Сава даказаў Феліксу, што гэта пустая трата часу. Не пойдуць ні «Бітлы», ні коцікі, ні Джон Рыд. «Да пенсіі будзем збіраць дзесяць тысяч». Зарабілі ўсяго сотню рублёў, з якіх сорак Фелікс аддаў Валі на аборт. Фелікс знішчыў негатывы, спалілі рэшту — пяць калод карт і дзесяткі з два фота ў позах. Фелікс быў напалоханы не толькі міліцыяй, а і жонкаю, якая адрознівалася ад усіх знаёмых Савы нечалавечай, буйна-лютай рэўнасцю. Трэба было шукаць больш сціплую халтуру. За гэта ўзяўся вынаходлівы Сава.

— Адзінае, што засталося ў нашым грамадстве, у людзях, якія губляюць веру,— гэта любоў да дзяцей. Мы з табой, Фелікс, атакуем дзіцячыя сады. Рубель, паўтара адно фота. Колькі дзяцей у горадзе? Тысячы, дзесяткі тысяч. Такому бізнесу амерыканцы пазайздросцяць. Я дамаўляюся, заключаю кантракт, а ты шчоўкаеш. Пакуль дзяржаўныя фотаатэлье заняты альбомамі выпускнікоў, вяселляў, пахаванняў... мы возьмем на сябе дзяцей. Толькі трэба б ў тэмпе, пакуль маю ідэю не падхапілі іншыя.

Феліксу сціплая і талковая прапанова Савы спадабалася. Ён наогул быў з пароды паслухмяных. Амаль год іх падпольная «дзіцячая» справа набірала моц і дзейнічала на поўную катушку. Сава вярнуў даўгі, купіў джынсы, галандскія зімовыя боты, пыжыкавую шапку (адну ў яго ўкралі ў гардэробе рэстарана «Мінск»), дублёнку. Толькі цяпер рана, якую нанёс яму кінематаграфічны свет, загаілася. Ён стаў часцей наведваць рэстараны і дабіраўся ў сваю Чыжоўку толькі на таксі, нягледзячы на тое, што цэны і на таксі, і ў рэстаранах падвоіліся. Наведваліся да яго ў госці знаёмыя, аднак ён быў асцярожны, не дазваляў наладжваць п'яныя оргіі. З новымі сталічнымі жанчынамі сыходзіўся неахвотна, шукаў дачок маленькіх начальнікаў з правінцыяльных гарадкоў.

І Фелікс з яго дапамогай выбіўся ў людзі: яго фота можна было сустрэць на старонках газеты «Вячэрні Мінск», адно нават надрукаваў часопіс «Советское фото». Незгаворлівы і просты Фелікс так звыкся з Савам, што не мог і кроку ступіць без яго. Угаварыў сваё кіраўніцтва, і Дыма пакінулі на пасадзе лабаранта яшчэ на адзін год — у парадку выключэння, бо зноў паўсюдна скарачалі штаты.

Сава ў знак падзякі прывёў у павільён да сябра сімпатычную і абаяльную, зусім яшчэ маладую натуршчыцу Юлю, студэнтку выпускнога курса балетнага вучылішча. Доўга яе не ўгаворвалі, яна сама распранулася і паводзіла сябе так вольна, што нават Сава здзівіўся.

— Я спадзяюся, палавы акт здымаць не будзем? — спытала Юля, закрываючы рукой зялёныя вочы ад святла юпітэраў.

Гэта іх зусім збянтэжыла.

— Чаму ж не, будзем! — упэўнена сказаў Сава.

— Тады я пас. Буду апранацца. Не ўгаворвайце. Мяне маці заб'е, калі ўбачыць гэта на фота.

Сава супакоіў Юлю. Фелікс маўчаў, ліхаманкава кусаючы на пальцах пазногці. Юлю не прасілі, не рэжысіравалі, яна сама, пазіруючы, імітавала сексуальныя позы і рабіла

гэта з усмешкай пад музыку, як бы забаўляючыся. Пасядзелі, выпілі шампанскага. Юля спяшалася да пачатку спектакля, яна танцавала ў кардэбалеце. Сава (ён быў у добрым настроі) праводзіў яе да службовага ўвахода. Яны пацалаваліся амаль як закаханыя. Бедны Фелікс прызнаўся Саву (ці не праз дні тры-чатыры), што ён сумуе па Юлі, і папрасіў у Савы яе адрас. Сава ні тэлефона, ні адраса не ведаў і паслаў Фелікса «дзяжурыць» ля балетнага вучылішча. Фелікс закахаўся ў свае сорак гадоў у юную балерыну, не падазраючы, што яна ўжо правяла ноч у пасцелі з Савам. «Выхаваная па-сапраўднаму дзяўчына тая, якая кладзецца ў ложак да мужчыны ў восем, каб быць у адзінаццаць дома»,— жартавалі яны.

Фелікс зрабіў дзіўныя па прыгажосці фота без пошласці і адкрытага сексу, прынёс іх да тэатра, дачакаўся Юлю і падарыў іх балерыне. Невядома якім чынам, але гэтыя фоткі трапілі ў рукі маці Юлі. Маці амаль сілком «выцягнула» з дачкі адрас фоталабараторыі, прывяла яе за руку, але не змагла распачаць скандал: побач з Феліксам сядзеў — Сава.

Леакадзія прыкметна пастарэла: дзве глыбокія маршчыны абрамлялі рот, вочы пабляклі, на руках праз скуру выпіралі сінія пражылкі. «Відаць, п'е»,— падумаў Сава. Трэба было нешта рабіць, і яна накінулася на Фелікса, пачала яго сароміць і палохаць міліцыяй. Сава паабяцаў, што «ходу фоткам у свет ён не дасць». І што яны болей Юлю не ведаюць. Каб пацвердзіць свае словы, Сава перадаў Леакадзіі ўсе негатывы.

— Праводзь мяне,— папрасіла Леакадзія, яна ўсё яшчэ не магла супакоіцца.

Сава ўзяў яе пад руку, і яны пайшлі па праспекце. Леакадзія скардзілася на дачку, на яе занадта ранняю самастойнасць, жорсткасць і нянавісць да яе, маці. Яна нават усплакнула.

— Яна ледзь не пайшла жыць да аднаго генерала-ўдаўца. І гэта ў семнаццаць гадоў. Канечне, жыццё даражэе... я за сваю зарплату ўжо не магу наталіць яе дзікунскія запатрабаванні. Адны джынсы — сто восемдзесят цалковых. Я не магу даваць ёй грошы на падарожжы і рэстараны. Унушаю, не спяшайся, усё прыйдзе, у цябе залатая прафесія, з ёй можна аб'ездзіць увесь свет. Не. Падавай усё і адразу. Ні міласэрнасці, ні сораму, ні ідэалаў. У пятнаццаць гадоў я яе вадзіла на аборт. Ты ўяўляеш, Сава, што я перажыла за апошні год? Ты глядзіш на мае сівыя валасы і не

пазнаеш. Не штурхайце яе да пропасці, прашу... Яна сустракалася з адным хлопцам... Ён ідзе ў армію. Кахае яе. Хачу, каб яны распісаліся. Табе смешна? Я ведаю, ты цынік, нігіліст. Аднаго баюся, каб не паўтарыла мой лёс. Жахлівей, як адзінокая жанчына, нічога на свеце няма. Гэта пекла. Не разбэшчвайце яе... малю... Дурная маладосць хутка праляціць, яна паразумнее.

Сава абняў Леакадзію за плечы, супакоіў, паабяцаў, што больш Юлю яны чапаць не будуць.

Увечары, седзячы ля шчарбатага люстэрка, Сава доўга і пільна разглядваў сябе: «Няўжо і я састарэў?» Ён палічыў маршчыны на лбе, пагладзіў шыю, праверыў, ці цэлыя зубы, шукаючы ў іх голачкай дзірачкі. «Нараджаць дзяцей трэба пакуль зубы цэлыя,— успомніў ён дзедавы словы,— інакш не паспееш іх паставіць на ногі». Прыгледзеўся ён і да сваіх вачэй... парадаваўся, знайшоўшы ў іх спакой і прыцягальнае абаянне. «Хто я? Што там, за вачыма? Што я? Дзе тая душа? Няўжо Кузьма мае рацыю — «чалавек — тварэнне бога». Адны вочы — цуд! А скура?! Няўжо і я мушу састарэць і абавязаны буду памерці? — Ніколі раней ён не думаў, што і ён смертны, і напалохаўся жорсткай думкі.— Трэба спяшацца жыць! З вясны буду шукаць работу. Палову дня сяджу ў цемры, як крот. Канура. Чорт, як даўно тое было: вакзал, прыезд у Мінск, Галіна! Раней яна мне снілася. Дзе зараз? Шчаслівая, відаць?» Увесь вечар у думках ён вяртаўся да яе зноў і зноў, нібыта прадчуваючы хуткую сустрэчу.

Завіс над стомленым горадам месяц, палохаючы сваім вечным таямнічым, непазнавальным лімонна-малочным святлом.

У гэту ноч яму прысніліся надзіва чыстыя луг, рэчка, кладачка, а на ёй Галіна ў чорнай хустцы.

У канцы тыдня, агітуючы выхавацельку аднаго дзіцячага садзіка ля кінатэатра «Партызан» зрабіць на памяць здымак яе групы, Сава звярнуў увагу на пяцігадовага хлопчыка. Вельмі ж ён прыглянуўся яму і так нагадваў сваім тварам знаёмае. Толькі каго? Не мог успомніць Сава. Сфатаграфавалі. Праявілі плёнку. Напячаталі фота. І тут, які раз углядаючыся ў насцярожаныя вочы хлопчыка, Сава ўспомніў, каго ён яму нагадвае. «Чорт... не можа быць! Гэта ж копія маленькай Галіны?!» Ён выскачыў на вуліцу, ухапіў таксі і паехаў у дзіцячы садзік. Дзеці адпачывалі. Ён спытаў у выхавацелькі:

— А як вунь таго, ля акна, прозвішча?

— Макавец,— адказала яна.

Дзеці прачыналіся з неахвотаю. Мажная няня памагала ім апранацца.

— Як цябе завуць, хлопчык?

— Сярожа Макавец.

— Малайчына. А маму тваю як завуць?

— Галіна Іванаўна.

— А дзе вы жывяце?

— На вуліцы Чайкоўскага.

Сава гатовы быў заплакаць, не ведаючы ад чаго: ад радасці ці ад надзеі?

— А дзе робіць яго маці? — пацікавіўся ён, хаваючы хваляванне, у выхавацелькі.

— Галіна Іванаўна загадвае аддзелам у дзіцячым магазіне па вуліцы Якуба Коласа.

Яму хацелася адразу спытаць, а хто прыходзіць па Сярожку, маці ці бацька? Але каб не наклікаць лішніх падазрэнняў, змаўчаў.

Узрушаны навіною, ён хадзіў па прыгожым бульвары ад кінатэатра да праспекта і ўсё думаў, як дзейнічаць далей: паехаць неадкладна ў магазін альбо прасачыць, хто будзе забіраць хлопчыка. Выбраў апошняе.

Яна мала змянілася. Ён пазнаў бы яе з тысячы. Сава не рызыкнуў спыніць. Раніцай узяў таксі і зноў паехаў, каб убачыць — хто ж Сярожку адводзіць у садзік?

І абрадаваўся і насцярожыўся, калі зноў дзіця вяла Галіна. Так, нават яе нетаропкая паходка не змянілася. Яна нешта перадала выхавацельцы, пастаяла з ёй на ганку і паспешліва пайшла па вуліцы. Ён ішоў следам, затым пазваў:

— Галіна.

Яна павярнулася.

— Божа! Ты?

— Я.

— Выпадкова ці сачыў?

— Выпадкова.

— Не падманьвай. Па вачах бачу... сачыў.

— Сачыў. Ад учарашняга вечара. Ну, добры дзень! — еў яе вачыма Сава.

— Добры дзень, Сава.

Яму спадабаўся яе даверлівы, прыўзняты настрой.

— Як ты знайшоў мяне?

— Не ведаю. Інтуіцыя. Магнітнае поле. Фатаграфавалі дзяцей ў садзіку, і на фота пазнаў цябе ў сыне. Гэта нічога, што я іду побач?

— Нічога. Я не спяшаюся. Мне на працу ўдзесяць.

— А твой дзе? На вучэннях?

— На вучэннях. Як ты?

— Не скажу што купаюся ў масле. Інстытут не закончыў. Расчараваўся. Працую. У параўнанні з настаўніцай, медсястрой, інжынерам — атрымліваю нядрэнна, у параўнанні з амерыканскім рабочым — я галота. Уласнай кватэры няма. У выканкоме на чарзе дзесьці ў адзінаццатай тысячы. Звычайнае жыццё радавога савецкага чалавека. Праўда, ступень незалежнасці, якую я заўсёды паважаў, ад дурняў, бюракратаў, багатых, перагружанага транспарту ў мяне стабільная. Для мяне жыццё яшчэ не ўспамін, але ўжо і не мара. Люблю ўсё тое, чаго няма ў продажы. Ці шчаслівы? Двоякі адказ. Ты ж сама любіла калісь пушкінскае «на свеце шчасця няма, але ёсць спакой і воля». Я атрымліваю малыя перамогі, не лётаю ў космас па залатую зорку, не даў бог, не афармляю міжнародныя выстаўкі і не рыхтую алімпійскіх чэмпіёнаў, не кармлюся ў закрытых буфетах і сталах заказаў, не валодаю прэстыжнай прафесіяй... на жаль... мажліва, для некаторых я плыву па цячэнні, аднак ведаю, што я гаспадар жыцця, я плыву туды, куды хачу я, у адрозненне ад іншых, з вяслом. Жыву з прынцыпам: забівай час, бо ён заб'е цябе.

Саву не хацелася выглядаць небаракам ці няўдачнікам, таму і спяшаўся выгаварыцца, каб выгарадзіць сябе і нейкім чынам апраўдаць.

— А вас перавялі ў Мінск?

— Перавялі. Як бацька, маці? Я чула, ён трапіў у турму?

— Так. Была справа. Нашых людзей яшчэ да канца не разбэсцілі, яшчэ не навучылі толкам красці і падманваць. Парода складаная. Вярнуўся з турмы. Жывуць... Твая мачаха, чуў, захварэла? Даруй, не разумею, чаму адрас Чайкоўскага, а не ваенны гарадок? Вы чакаеце кватэру? — вёў дазнанне Сава.

— Ты па-ранейшаму хітры.

Яны падышлі да зялёнага знаёмага плота па вуліцы Чайкоўскага.

— Так. Проста цікава.

— Ты не хацеў бы сустрэцца з маім мужам? Баішся?

— Не. У цябе рэпутацыя замужняй жанчыны. Я не ведаю, якія ў вас адносіны.

— Рэпутацыя не парушыцца. Што ты прыпыніўся?

— Не ведаю, як сябе паводзіць. Першы раз. Я б не адмовіўся ад кубачка кавы. Папраўдзе, не снедаў, але...

— Божа, як ты навучыўся валодаць словамі, як каментатар. Хадзем. Я запрашаю.

— А як цётка? Муж? Розыгрыш нейкі?

— Не разыгрываю я цябе, Сава, мой мілы Сава. Цётка ў бальніцы, а мужа... няма.

— У камандзіроўцы?

— Не. Памёр.

— Гэта... як... іншасказанне? Праўда? — даўкі камяк засеў у горле Савы.

— Праўда, праўда.

Яны ўвайшлі ў хату. Пахла кіслай капустай. Ён любіў гэты пах капусты і тміну. Яна дастала торт, заварыла каву.

Ён не пытаўся, як яна жыла, дзе, што здарылася з мужам,— адчуваў, што яна і сама гатова ўсё яму расказаць. «Яна даравала мне, даравала»,— з прыхаванай радасцю думаў ён.

— Кава гарачая. Не спяшайся. Бяры бутэрброд.

— І даўно ты адна?

— Даўно. Ён загінуў на вучэннях «Днепр». Чуў пра такія?

— Чуў. Ледзь выкруціўся. Ваенкамат і мяне хацеў заграбці на зборы. І што яму далі Героя ці ордэн Чырвонай Зоркі?

— Нічога не далі. Ён па-дурному загінуў. За ноч да фарсіравання вырашылі, каб аблегчыць задачу, а можа, выслужыцца, з адным маёрам праверыць дно ракі. Усе і загінулі. Адна ў гарадку я не змагла жыць. На сына далі пенсію. Прыехала сюды. Цётка ў мяне цяжка хворая. У яе быў другі інсульт. Яна ж адна. Вось... і прапісала мяне, сына... увесь дом на мяне запісала.

— У-у... такія людзі цяпер рэдкія. Яна была на фронце?

Ён паказаў на фотаздымкі, якія былі на сцяне.

— Так.

— Дык вам трэба тэлефон паставіць. Пастанова прынята: ветэранам без чаргі. Вам «хуткую» даводзіцца выклікаць. Цётка хварэе.

— Я неяк і не думала.

— Няхай падасць заяву ў выканком. У мяне там... знаёмыя.

— Дай божа, каб яна з бальніцы выкарабкалася... А тэлефон пасля.

— А можа, трэба лекі? Дэфіцытныя — ты спытай у дактароў,— у мяне ў аптэцы знаёмая працуе,— дадаў ён,— майго сябра жонка. Што трэба, усё будзе.

— Дзякую. Я спытаю.

— Да-а, цяжка жыццё планаваць. Я цяпер гатовы верыць у лёс. Ён нас зводзіць зноў на адной сцяжыне. Я ўспамінаў цябе.

— Фантазія. Не падманвай мяне і сябе.

— Ты адрознівалася заўсёды празмернай сур'ёзнасцю. Ты не ўспрымала маю гарэзлівасць, юнацкае ап'яненне жыццём, нават легкадумнасць. Нешта з гадамі памірае само па сабе. Толькі не думай, што, згубіўшы цябе, я зрабіўся самым нешчаслівым чалавекам на зямлі, але ж буду шчырым да канца... і шчаслівым таксама не стаў,— Саву нават самому спадабаўся такі афарыстычны вывад, яму хацелася разжалобіць Галіну.

— Гаварыць ты навучыўся прыгожа. Хвалю,— усміхнулася яна.

— Гэта шчыра,— ён пагладзіў ёй руку.

— Не трэба. Вось гэта рабіць не трэба. Сустракаеш нашых аднакласнікаў? Маеш з кім-небудзь сувязь? — знайшла яна іншую тэму.

— Не. Ракаўскія аселі. Усе перажаніліся. Некаторыя па два разы. Хто застаўся ў сталіцы, зашыўся ў нару. Сустракаў таго, хто быў у цябе тайна закаханы — Тамашэвіча. Яго выключылі з універсітэта. Кажуць, за нацыяналізм. Хадзіў па дзіцячых садзіках і агітаваў выхавацелек весці выхаванне дзяцей на беларускай мове. Хворы... Няхай жыве і пасецца. Смешна. Каму цяпер трэба беларуская мова? А ты з Наташай не перапісваешся? Так, здаецца, звалі тую афіцыянтку з кафэ, якая дапамагала нам тады.

— Не.

— Да трыццаці гадоў усе ў крэпасці зачыняюцца. Быт заядае. Асабліва наш. Я чуў, што яна ці не за касманаўта выйшла замуж.

— Кажуць. Муж працуе ў Звёздным. А ці ён касманаўт, ці інжынер-даследчык, не ведаю. Ніколі не любіла лічыць чужыя грошы.

— А чым вы грубку паліце?

— Брыкет выпісваюць, вугаль купляем. Што паспеем ухапіць, тым і палім.

— Зноў жа льготы ветэранам. Шурудзіць толькі трэба, патрабаваць. Трэба ўрваць ва ўлады належнае. Сына ў музычную школу не аддала?

— Не.

— Не сучасна. Усе пранырлівыя людзі аддалі сваіх дзяцей альбо ў музычныя, альбо ў англійскія школы, а яшчэ

лепш у спорт. У нас адна маці, жонка знаёмага, са сваёй дванаццацігадовай дачкою палову свету праехала. Барахла навезла — на ўсё жыццё.

— Не хачу калечыць дзіця.

— Маеш рацыю. Нагрузкі там, ворагу не пажадаю. Цяжка адной выхоўваць?

— Не скарджуся. Ён у мяне паслухмяны, добры.

— Дык тут жа табе і да працы недалёка.

— Так. Калі сілы застаюцца, хаджу пешкі. Яшчэ кавы?

— Давай. У мяне сэрца моцнае. Я на ноч вып'ю, дык яшчэ лепей сплю.

Яны выпілі яшчэ па кубачку кавы. Сава, як бы неўпрыкмет, пакінуў ёй свой хатні нумар тэлефона. Пра сваю работу змаўчаў, не хацеў, каб яна ведала, што ён у фоталабараторыі. На парозе, калі яны выходзілі з хаты, ён памкнуўся да яе, хацеў пацалаваць. Яна зрабіла крок назад, выставіла перад сабой абедзве рукі.

— Не трэба. Калі хочаш, каб паміж намі засталіся добрыя адносіны, не рабі гэтага.

— Галіна... Чаму? Я ж не чужы?

— Чужы.

— Пакуль чужы... ці чужы?..

— Калі табе так хочацца, лічы, што пакуль чужы.

— Разумею. Дзякую і за гэта. Зараз табе хочацца сказаць, што жывеш ты толькі для сына?

— Твая праўда.

— Але я магу хоць зрэдку прыходзіць?

— Прыходзь. Баюся, што са мной табе будзе сумна. Я стала тыповай дамаседкай. Вольны час аддаю Сярожку і хворай цётцы. Не хапае часу на іншае. Нават на тэлевізар. У працоўнай жанчыны сумнае, аднастайнае жыццё.

— Развесялім. У цырку былі? Бачу, не... Усё. Запісана. У мяне адміністратар знаёмы. Білеты гарантую.

— Не варта клапаціцца.

— Гэта дробязь. Я запішу твой нумар тэлефона, пазваню сам.

— Запішы.

— Замётана. Скажы, вось я пакінуў свой нумар тэлефона... ты пазвоніш?

— Не ведаю. Відаць, не.

— Я так і ведаў. Не будзем усё ж развітвацца назаўсёды. Лепш сказаць: да су-стрэ-чы.

— Да сустрэчы.

Яна села ў аўтобус. Ён застаўся стаяць на месцы з на-

дзеяй, што яна, затрымаўшыся на пляцоўцы ля акна, азірнецца на яго. Як яму гэта хацелася! Яна стаяла ля акна спінаю да яго. «Чэрствая душа».

У Міхася ён дастаў апельсінаў, лімонаў і завёз іх Галіне ў магазін. Яна дала яму за пакупкі грошы, усе да капеечкі. Ён не хацеў іх браць. Яна настаяла і прасіла больш нічога не прывозіць.

— Не губляй дарма час. У мяне знаёмыя дзяўчаты з суседняга магазіна «Овощи и фрукты». Яны нам носяць фрукты і цытрусавыя, а мы ім свае дэфіцыты. Табе далёка ехаць праз увесь горад.

— Галіна, гэта ад душы.— Ён пакрыўдзіўся.

— Я веру. Вось за білеты ў цырк дзякую. Сярожку вельмі спадабалася.

— Ну што ты! Адзін Серабракоў — міравы клоун. Я дастаў два білеты ў тэатр лялек.

— Дзякую. Пойдзем абавязкова. Даруй, мяне чакаюць на складзе. Тавар атрымліваем.

— Калі ласка. Не буду замінаць. Я пазваню.

Саву прырода надзяліла здольнасцю прымаць хуткія, лаканічныя рашэнні, амаль беспамылковыя. Але ў гэтым выпадку ён вырашыў, не «гнать лошадей»: «Трэба яе прыручаць паступова. Яна не блудніца, не галодная студэнтка, не дзяўчынка багемы і не прастытутка з праспекта. Дама з характарам і цвёрдымі прынцыпамі. Яна прывабная, і завіўка ёй да твару. Дзіўна, адна яе прысутнасць усяляе ў мяне надзею і сілу, спакой і ўпэўненасць. Яна не іранічная, не хітрая, не дасціпная. І чаму мяне цягне дарыць ёй падарункі? Трэба «адкапаць» у знаёмых французскую пудру, польскі крэм, памаду...»

Фелікс, калі і быў не з баязліўцаў, дык вельмі падыходзіў да пароды асцярожных і абачлівых. Як толькі ён пранюхаў, што людзі з кампетэнтных органаў зацікавіліся іх бізнесам, ён па-сяброўску параіў Саву хуценька шукаць новую работу. Дым не крыўдаваў, яму і самому абрыдла ў лабараторыі. Так ён апынуўся часова, не без уласнага задавальнення, у скуры беспрацоўнага. Збіраючыся штовечар на «Брадвей» — месца ад галоўпаштамта да кафэ «Вясна» — ён абяцаў сабе: «Заўтра абавязкова буду шукаць работу». А вечарам сустракаўся са знаёмымі, і хадзілі тудысюды па праспекце, сядзелі ў скверыку Дзяржынскага, абменьваліся цыгарэтамі («Кент», «Марльбара»), імпартнымі пласцінкамі, магнітафоннымі стужкамі з запісамі Элінгтона, Амстронга, слухалі свежыя анекдоты, кадрылі дзевак

і ліняли ў кафэ «Мутнае вока». Тырчалі там, зашываліся ва ўсе куткі, да поўнай перамогі: даўно не было гардэробшчыцы, ішоў дахаты смяротна натомлены шэф-повар, іх надакучыла выганяць дзяжурнай, а яны ўсё сядзелі і ўсё даказвалі адзін аднаму, у якой краіне лепш жыць і чаму эмігранты едуць у Ізраіль, а асядаюць у Штатах. Ён забываўся пра работу. Было бестурботна-хараша, вольна, пакуль у кішэні былі грошы. Даўно ён не здаваў пустыя бутэлькі ў адной чарзе з алкашамі. Даўно не піў з ранку да вечара ваду з хлебам. Пайшлі касяком новыя даўгі. Ён пазбягаў сустрэч з Міхасём, Ірай. Галіна, як назло, не званіла.

«Нічога. Мы гэту гардыню зломім. Толькі б грошай, трошкі грошай... Пару сот». Міхась купіў галубятню і шызануўся на чыстых пародах. Ён жа параіў Саву месца, дзе можна хутка і адразу зарабіць багата грошай: «На млынкамбінаце. Там трэба грубая рабочая сіла з грубымі мясістымі насамі».

Праўда, Саву абяцалі пасаду ў Доме сямейных урачыстасцей дзяржаўным тамадой на вяселлі, але трэба было пачакаць. Дзве рэчы Сава не любіў у жыцці — чакаць і даганяць. Вырашыў два тыдні паўкалваць на млынкамбінаце.

«Колькі я атрымаю, калі буду пахаць да поту?» — цікавіўся ён у мужыкоў, якія жылі ў інтэрнаце. Большасць з іх былі вяскоўцы. Няголеныя, з жоўтымі, гнілымі зубамі, з тлустымі валасамі, яны амаль не размаўлялі паміж сабой. Ехалі сюды з адной мэтаю: зарабіць грошай і камбікармоў. Адзін будаваў хату (пра гэта Сава даведаўся пазней), у аднаго саступілася жонка, пачала піць, трэці жаніў сына. «Ты гарадскі, разумны, палічы 14 капеек за тону, а што грузіць авёс, грэчку, пшаніцу, мучныя адыходы — усё адно. Бяры мех на спіну і цягні да транспарцёра».

З горада, «сваіх» грузчыкаў было нямнога, такія ж выпадковыя людзі, як і ён, адзін тэрапеўт (а мо і схлусіў), нервовы такі, хацеў зарабіць на машыну, чацвёра студэнтаў, адзін былы алімпійскі чэмпіён (ён паказаў Саву бронзавы медаль) і Кузьма, якога Сава аніяк не чакаў сустрэць тут.

Усяго дзве аперацыі, але ад стомы — валішся. Пагрузіць, разгрузіць, прыбраць вагон — цяжэй у разы тры, чым праца на чыгунцы Поўначы.

— Кузьма, у левым вуху звініць. На што?

— Да холаду,— адказаў Кузьма, пазнаўшы Саву, шчыра ўзрадаваўся новай сустрэчы.

— Месца суспакаення бацькі я там, Сава, і не знайшоў. Затое ведаю, дзе быў іхні лагер. І відзенне было ўначы.

Слава табе госпадзі, бацька прыходзіць да мяне ў сне і гаворыць: «Царкву ты, сынок, у вёсцы пабудуеш, не адразу... але пабудуеш яе навекі ў чэсць святога Гермагена-мучаніка, патрыярха». Прыязджаю ў вёску, а прыхаджане мяне чакаюць, сабралі-такі сваю долю. Цяпер пішам высокаму начальству, каб дазволу дабіцца. Нашы вясковыя тута рабілі, паеду, думаю, і я на іконы яшчэ зараблю.

— Дзівак ты, дзядзька Кузьма, царквы яшчэ няма, а ты пра іконы пячэшся. Гэтая катарга цябе тут у тры пагібелі сагне, шкада на цябе глядзець. Я малады вось, а язык набок і пыхчу, як паравоз. Думаў, тыдзень паўкалваю, а два дні мінула, сэрца цісне ад нагрузак. Едзь дахаты, памрэш тут, і пахаваць не будзе каму,— спачувальна так унушаў Сава.

— Э, Савушка, дык мне ж цяпер наш нябесны ўсявышні і ўсясільны не дасць памерці. Не-е. Пакуль храм не пасвецім, жыці буду. Бацька ж сказаў: «Царкву, сынок, пабудуеш».

— Дай бог чутае бачыць. А ты чаго сала не ясі? Твае вяскоўцы лопаюць, аж за вушамі трашчыць.

— Мне нельга. Пост вялікі.

— Да ты што?! Для такой работы добра харчавацца трэба, каб ногі не працягнуць. Не лічыў, колькі ўчора мяшкоў перанёс?

— Не.

— А я скажу. Тысяча дзвесце шэсцьдзесят штук у вагон. Калі і ў пекле так укалваюць, буду маліць, прасіць бога перавесці хоць дворнікам у рай. Пакаюся ў грахах.

— Э-ге... у раі думаць трэба, работа сэрцу і розуму.

— Гэта няцяжка.

Перакур закончыўся. Вечна незадаволены жыццём і планам брыгадзір з носам колеру бурага памідора даў каманду пачынаць пагрузку. Ён закрываў нарады, яго баяліся больш, чымсьці начальніка ўчастка, які гэтыя самыя нарады падпісваў. За рабочую сілу млынкамбінат выдаваў калгасу дзесяць тон камбікармоў, акрамя таго, адну тону дазвалялася купіць за пяцьдзесят рублёў кожнаму грузчыку.

Першы, хто не вытрымаў, быў алімпійскі чэмпіён, збег, пакінуўшы на ложку дзіравую шкарпэтку. Тэрапеўт кусаў губы, аднак трымаўся, тужыўся, як вол. Маладыя здаровыя сілы трымалі на нагах студэнтаў. Найцяжэй было Кузьму, ён крактаў, бялеў, але лямку цягнуў. Узмыленыя, з запалымі вачыма, з едкім пахам поту ішлі да вагонаў маўклівыя калгаснікі.

«Да д'ябла! Праца не аб'ядноўвае людзей, не! Гэта прыдуманая хлусня. Аб якой палітычнай вучобе нам тут хочацца думаць? Аб якім самаўдасканаленні свядомасці ідзе гаворка? На які мітынг нас адгэтуль заманіш? Сіл застаецца толькі на тое, каб дапаўзці да ложка ды бухнуцца ў сон. Не, бегчы трэба адсюль, пакуль грыжу не нарваў. Няхай сюды прывязуць на суботнік Марата з яго аддзелам прапаганды і агітацыі. Лепш зневажаць сябе перад Ірай, узяць лішні раз доўг у Раі, але каб за 14 капеек за тону... Егіпецкім рабам было лягчэй піраміды будаваць. Там была добрая механізацыя, і іх кармілі. Што ж прыдумаць? Грыжу, апендыцыт? Хваробу маці? За тры дні па закону мусяць заплаціць... і хрэн з імі. Здароўе даражэй. Сорамна хіба перад Кузьмою... але ў яго свае праблемы. Не я ж яго наймаў».

І Сава пасля абеду да вагонаў не пайшоў. Дома спаў беспрабудна амаль суткі, не чуў тэлефонных званкоў. Увечары наступнага дня адплюшчыў вочы. Рукі, ногі, спіна, шыя — усё, здавалася, не падпарадкоўвалася загадам мозгу. Доўга, надакучліва доўга званіў тэлефон. Ён падняў трубку.

Званіла Галіна. Яна паведаміла аб смерці цёткі і прасіла яго прыехаць, дапамагчы пахаваць. У глыбіні душы, хоць гэта гучыць па-кашчунску, ён абрадаваўся навіне.

Сярод незнаёмых людзей: былі суседзі, супрацоўнікі нябожчыцы з кафэ, рэстарана — Сава хутка асвоіўся і пачаў распараджацца. Кіраваў «кадрамі» — адных пасылаў у камбінат па труну, другіх у магазін па прадукты. Галіна мела ўжо на руках пасведчанне аб смерці і талоны ў прадуктовы магазін «Сталічны». Некага пасылаў да кухонных пліт, нехта паехаў па спіртное.

Перад смерцю цётка перадала Галіне тысячу рублёў і прасіла ўпрыгожыць труну ажурнымі сурвэткамі, якія яна вязала ў вольны час. Усё ішло спраўна, як па графіку. Сава павёў Галіну ў суседні пакой і нясмела прапанаваў:

— А можа, не будзем сюды прывозіць? Адразу з морга і на могілкі. Цяпер так багата хто робіць. Каб дзяцей не траўміраваць. Мы ж не ведаем, ці зможа пасля ўсяго Сярожка заставацца ў хаце адзін?

— Непрыгожа так, Сава. Трэба па-хрысціянску. І перад суседзямі будзе сорамна. Няхай яна хоць гадзіну у сваёй роднай хаце пабудзе.

— Ты не крыўдуй... Я хацеў як лепш,— хутка апраўдаўся ён.

Набожная бабка-суседка запаліла свечку, паставіла ля галавы нябожчыцы шклянку з жытам, салонку з соллю,

паклала буханку хлеба. Прыйшла нейкая жанчына ў сціплай простай сукенцы, пастаяла ля труны, усплакнула і перадала Галіне пяцьдзесят рублёў. «Вазьміце. Я брала ў нябожчыцы ў доўг».

Сава, як матор, быў пастаянна ў руху. Выходзіў на двор, бег да суседзяў, лез на вышкі каморы, ішоў на вуліцу — яму хацелася прыспешваць час. Здзіўляла, што большасць людзей, якія прыходзілі, плакалі ля труны. «Пакідае аб сабе добрую памяць, а я яе запомніў дзіклівай, панурай». Нарэшце з палёгкай уздыхнуў: на вуліцу паварочваў знаёмы аўтобус з чорнай паласой пасярэдзіне. Не ведалі, і Сава не ведаў, як правесці грамадзянскую паніхіду. Нехта прапанаваў сказаць апошняе слова ля магілы. Так і вырашылі. Прадстаўнік прафсаюза рэстарана коратка пераказала ля магілы біяграфію нябожчыцы, ахарактарызавала як надзіва сумленнага і добрага чалавека. Выступіла яшчэ адна сяброўка з кафэ, якая, з цяжкасцю падбіраючы словы, паўтарала ўжо выказанае прафсаюзным лідэрам. Сава гучна сказаў:

— На гэтым жалобны мітынг, прысвечаны памяці дарагой і незабыўнай Лідзіі Міхайлаўны, абвяшчаю закрытым. Прашу родных і блізкіх развітацца.

— Ногі, ногі ў нябожчыцы развяжыце! — спяшалася папярэдзіць набожная бабка. Дым запрасіў усіх, хто застаўся стаяць ля магілы, да стала, каб памянуць блізкага для ўсіх чалавека. Сава палічыў: за сталом у хаце сабралася чалавек трыццаць. Мачаха Галіны да стала не садзілася, яна тупала на кухні, падносіла закускі, гарэлку. Выпілі раз, два... Акрамя слоў: «Ну, памянём яшчэ, няхай ёй зямля будзе пухам», больш ніхто і нічога не гаварыў. Рэзала душу непрыемная тупая паўза. Тады падняўся Сава і, умела спалучаючы словы, пачутыя ад прафсаюзнага лідэра і ад сяброўкі Лідзіі Міхайлаўны, сказаў і сваё досыць нечаканае, цёплае слова пра нябожчыцу, абагульняючы яе жыццё з лёсам пакалення і наогул з жыццём чалавека на зямлі.

Гэтая яго прамова вельмі спадабалася Галіне, ён гэта заўважыў. Выпілі і трэці раз. Людзі ўсталі з-за стала. Сава паспеў стаць ля дзвярэй і не прамінуў сказаць кожнаму: «Дзякую, што падзялілі з намі наша гора».

З чужых у хаце засталася адна набожная бабка, якая, прачытаўшы малітву, патушыла свечку і добразычліва сказала Галіне:

«Ай, няправільна... абрус на стале трэба было пасцяліць навыварат. І свяшчэнніка трэба было наняць. Ай, спаганіліся людзі, усё забываем».

Сава спытаў пасля ўсяго:

— Мне застацца ці ісці?

— Як хочаш. Месца хапае.

— Добра. Тады мы з Сярожкам будзем вунь у тым пакоі.

Ён як бы «забіў» для сябе месца, баяўся, каб мачаха не паслала яму тут, у зале, на канапцы, дзе стаяла труна. Нават у суседнім пакоі ён палову ночы не спаў, прыслухоўваўся да гутаркі Галіны і мачахі. Раніцай мачаха прыбірала стол; набожная бабка наказала, каб усё, што на стале, пераначавала, бо нябожчыца ўначы прыйдзе паглядзець.

Сава з Галінай снедалі на кухні.

— А мачаха да цябе надоўга?

— Тыдзень, можа, два пабудзе. Хачу паказаць яе дактарам.

— Я заўважыў, што яна схуднела. Жоўты твар зрабіўся, ці мне падалося. У мяне ёсць знаёмыя ў кардыялагічным цэнтры. Некалькі бутэлек каньяку, і абследуюць.

— Баюся, што ў яе падазраюць іншую хваробу.

— Усё роўна звані.

Яны цёпла развіталіся.

Месца тамады цвёрда яму было абяцана пасля Новага года. Піяніст, з якім яны некалі працавалі разам у рэстаране, падкінуў яму новую і перспектыўную ідэю: «А чаму б не паспрабаваць сябе ў ролі маклера, хадайніка па справах, можна сказаць, клапатуна кліентаў па абмене кватэр?» Маўляў, там ён сам сутыкнуўся, непаваротлівыя людзі.

— Вісяць дзесяткі аб'явак. Вазьмі ў свае рукі тэлефоны, сувязь — і табе цаны не будзе. Там адзін прайдзісвет ходзіць, пустабрэх, дык яму ўсе кланяюцца. Сто рублёў бярэ. Сядзі сабе, звані, камплектуй, накіроўвай, угаворвай. Нехта хоча з фінскай пліткай, нехта, каб абавязкова быў чэшскі унітаз. Павер майму слову, клёвае дзела. Табе за каробку цукерак дзяўчаты-інспектары яшчэ і дапамагаць будуць. Ты абаяльны, падыход маеш. Ідзі на Астроўскага ў кантору і шукай кліентуру. Усе ж укалваюць, часу няма хадзіць шукаць.

— А што ж... і сам... з жонкаю. Разменьваеш?

— Так. Фантазія ўпала да нуля. Ведаеш анекдот? Прыходзіць п'яны муж дахаты. Распранаецца да трусоў. Жонка глядзь, а на ім жаночыя трусы. А ён ёй і кажа: у мяне сіл няма, прыдумай у апраўданне што-небудзь сама.

— А ў цябе як? Яна застукала ці ты яе?

— Яна мяне. І ведаеш як? Выпадак адзін на тысячу. Прывёў я адну кадру да сябе на хату... ніколі такога не практыкаваў, усё было чын чынаром, у ажуры. Хто мог знаць, што мая жонка з ёю на адным паверсе працуе. Дзверы насупраць. Там, на рабоце, яны пілі чай, разгаварыліся. Бабы таксама часам любяць аб сваіх любоўных прыгодах пагаварыць. Гэта мая новая палюбоўніца вазьмі і ляпні: «Прывёз, кажа, да сябе. Зайшла я ў ванну. Нічога. Чорнай пліткай вылажана, але ж уся бялізна, і жаночая, і дзіцячая, замочана ляжыць, кісне, гніе ў ваннай. А на шнуры вісіць — сохне адзін ліфчык. Небагата такіх ліфчыкаў вы знойдзеце ў горадзе. Ажурны, французскі... шосты нумар! Ну, думаю, гром-баба тут у гаспадынях. Дыскабол. Думаю, не дай бог застукае, рэбры паламае. Давай хутчэй апранацца ды прыспешваць свайго палюбоўніка. Калі ж яна дадала, што ліфчык быў чорны, мая жонка, ужо не ведаю якім чынам, угаварыла яе і паказала сваю ванну. Вось і ўсё. Яна ў мяне гордая. Я ўгаворваць не стаў. Мы надакучылі адно аднаму. Развод дык развод. Ты малайчына! Мужыку трэба абзаводзіцца сям'ёю ў трыццаць, трыццаць пяць. Ідзі ў бюро па абмене і дзейнічай.

— А як дзіця?

— Шкада трохі. Кажа, буду дазваляць сустракацца раз на тыдзень. Сям'я, дружа мой, гэта як землетрасенне — растлумачыць можна, прадказаць трагедыю нельга.

## РАЗДЗЕЛ ЧАЦВЁРТЫ

## ПАРОГ СТРАХУ

У вузкім доўгім калідоры бюро па абмене стаялі уздоўж старыя, невядома кім згрызеныя крэслы, збітыя драўлянай рэйкай. З пакояў, што былі адзін супраць другога, выходзілі людзі, чакалі сваю чаргу і ішлі ў дзверы, абабітыя чорнай скурай. Некаторыя чыталі пры слабым святле аб'явы. Сава сеў у куточку і пачаў назіраць, не прыспешваў падзеі.

— У вас што? — звярнулася да яго жанчына з астматычнай адышкай.

— Я чакаю аднаго чалавека.

— А-а... а я разменьваю трохпакаёвую. Нявестка не можа ўжыцца са мною. Тапчуся на кухні, гладжу бялізну,

прыбіраю, за звіненнем, г...— а ўсё не так. Выхавалі моладзь.— Адчувалася, што жанчыне хочацца з некім адвесці душу.— Мае вышэйшую адукацыю маюць. Неяк я захварэла. Дык, паверце, не падышлі да ложка, вады не падалі. Пруць мяне ў камуналку, у падвал... Я ўсё жыццё ў Батанічным садзе рабіла. Кветкі, зяляніна, прырода... Я ўсіх і ўсё люблю, дык за што мяне ненавідзець? Ногі ў мяне хворыя, а хаджу сюды, шукаю варыянты. Гэта ж калі такое было ў нашых людзей, каб бацькоў у грош не ставілі. Ой госпадзі, што далей людзей чакае?

— А навошта вам сябе абцяжарваць? Я чуў, ёсць маклеры, пасрэднікі, якія за невялікую плату знойдуць вам узаемакарысны абмен,— вырашыў праверыць Сава.

— Я ўжо нікому не веру. Усё. Гэта страшна — згубіць веру ва ўсё. Знойдзецца прайдзісвет, выманіць грошы, а пасля шукай яго.— Жанчына пайшла да дошкі з аб'явамі.

З вуліцы ў калідор увайшоў кульгавы стары яўрэй, прытрымаў дзверы, увайшла і сівая яўрэйка. Не спяшаючыся, яны абое дасталі акуляры, пачалі чытаць аб'явы. Доўга чыталі, ён нешта дыктаваў ёй. Яна запісвала абломкам алоўка. «З гэтымі можна паспрабаваць»,— рашыў Сава. Назваўся. Паказаў ім свой пашпарт, тыцнуў пальцам у прапіску. Сказаў, што гэтай справай займаецца другі год. «Кліенты задаволены. Усё раблю аператыўна. Вось тэлефон. Па жаданні шукаю трайны абмен. А вашую трохпакаёўку размяняць — раз плюнуць. Ёсць варыянты нават у адным доме. Калі, канечне, давяраеце. Задатак наперад і чакайце сабе, а вам пазвоняць!»

З пакоя інспектараў выбегла жвавая дзяўчына з доўгім носам і пустымі вачыма, Сава аж пакланіўся ёй... Яна здзівілася і ў адказ ветліва ўсміхнулася.

— Вопытныя дзялкі бяруць сотню, дзве... я не вымагаю. Укалваю, не шкадуючы ног...

— Добра. Мы... пазвонім дзецям, параімся,— даверліва адказаў стары.

Сава не стаў ім перашкаджаць, стаяў ля акна, чакаў, пакуль яны пазвоняць. Раптам з пакоя насупраць з надакучліва рыпучымі дзвярыма выйшла Іра. Ён здзівіўся: «Чорт, як яна змянілася! Якая прыгожая!» Яна была цяжарная.

— Іра, а ты што тут робіш? — узрадаваўся Сава.

— Прывітанне. Тое, што і ўсе астатнія. Шукаю сабе абмен.

— Ты? Навошта?

— Трэба. Я выйшла замуж. Аб'ядноўваемся з мужам.

— Ты? Замуж? Ну, старая, здзівіла. Усё мог падумаць... але каб ты замуж?

— Як бачыш.

— Я яго ведаю?

— Не.

— НТР, рабацяга?

— Якое гэта мае значэнне?

— Цікава. Хто змог раскалыхаць тваe маральныя ўстоі свабоднай любові, сексуальнай рэвалюцыі, вечнага кайфа да старасці... незалежнасць ад пялёнак, п'янага мужа, кухні? Хто? Я гатовы ўкленчыць перад ім... на адно калена.

— Не выступай, Сава, не тыя абставіны і не той час.— Іра ўсміхнулася.— Мой муж просты хлопец. Вадзіцель тралейбуса. Расхістаў устоі, як ты гаворыш, вельмі проста: каханнем...

— Ты ж у каханне ніколі не верыла. Ці можа такое быць?

— Прыйшоў час, і паверыла. Прыйдзе час, і ты паверыш, калі, канечне, зможаш каго-небудзь пакахаць. Баюся, табе будзе гэта цяжка зрабіць. Але што загадваць. Упершыню ў жыцці я шчаслівая, бо па-сапраўднаму кахаю і мяне кахаюць.

— Веру. Здаюся. У цябе нават тэмбр голасу змяніўся. Віншую.

— Дзякую. Калі гэта, канечне, шчыра. Ты самалюбівы чалавек... і тое, што робіцца не тваім, ты здольны і ненавідзець.

— О-го... ды мы і разумныя. Я шчыра рады. Вось мая рука на сэрцы.

— Спадзяюся, ты разумееш, што цяпер не варта мне званіць на работу. Ён у мяне раўнівы. Ды я і сама болей не хачу вяртацца ў мінулае... Я яго хачу як мага хутчэй забыць.

— Разумею. Ну, а калі вельмі патрэбна будзе дэфіцытнае лякарства? Бацькам?

— Не звяртаўся. Я цябе дастаткова добра ведаю. Дамовіліся? Бывай.

— Бывай,— суха, без усмешкі адказаў ён.

Сава стаяў ля акна, у якое білася муха, глядзеў услед Іры. «Яны адыходзяць... Я, наіўны, думаў, што можна іх утрымаць сілай прыцягнення. Яны паслухмяныя, ручныя, разгубленыя перад непаразуменнем жыцця. І вось яна знайшла веру праз каханне і ўзвысілася нада мной. А я ўсё лічыў, што яна шаўка бязродная».

Думкі яго перабіў стары яўрэй, які з дазволу дзяцей

рызыкнуў прыняць прапанову Савы і даў яму задатак — пяцьдзесят рублёў.

Сава выпісаў у бюро два дзесяткі тэлефонаў і ўвечары з ахвотаю і дзелавой хваткай узяўся за працу. Недзе каля поўначы ён падлічыў, што крутануў дыск тэлефона тысячу разоў. Раніцаю — яму вельмі хацелася пакончыць з абменам за тры дні — ён паехаў да аднаго кліента, які не меў хатняга тэлефона, на край горада. Не застаў. Злосна сплюнуў на лесвічнай пляцоўцы. Пакінуў у дзвярах запіску, што наведаецца яшчэ раз у адзінаццатай гадзіне.

У хаце зноў, як тэлефонны маньяк, круціў да болю ў галаве дыск, шукаў новыя варыянты. А дзесятай гадзіне зноў паехаў у Курасоўшчыну да кліента, якому пакінуў запіску. Гаспадар не надта каб абрадаваўся Саву — нешта мямліў (быў на падпітку), нарэшце прызнаўся, што ў яго ёсць лепшы варыянт. Сава не здаваўся, наступаў, абяцаў, што кліенты за лішнюю плошчу дададуць грашыма. Праз гадзіну кліент нарэшце згадзіўся толькі паглядзець кватэру.

Сілы ў Савы не заставалася, ён ледзь прыплёўся да аўтобуснага прыпынку, сеў у аўтобус і адразу пачаў кляваць носам. Два хлопцы, якія сядзелі перад ім, непрыкметна выразалі на спінцы сядзення новенькага «Ікаруса» знаёмае слова, дзве літары якога ужо былі гатовы... З шумам і смехам яны амаль на хаду аўтобуса выскачылі на прыпынку ля вакзала. Дым усміхнуўся ўпершыню за гэты катаржны дзень.

Неяк вечарам увагу яго прыцягнуў да сябе хлопец са старым чамаданчыкам, які ён трымаў у руках, баючыся паставіць побач. Твар юнака скаваў жах, без цяжкасці можна было здагадацца, што хлопец апынуўся ўпершыню самнасам з начным горадам. Насцярожана, падазрона з-пад ілба ўглядаўся ён у твары адзінокіх пасажыраў. Сава пазнаў у юнаку сябе. Як даўно тое было і як нядаўна. І чамаданчык такі ж... Дзесяць гадоў прамінула-праляцела. Эх чорт, толькі б раздабыць грошы, закаціў бы ў рэстаране банкет з цыганамі, запрасіў бы сяброў... Хоць у прынцыпе няма каго і запрашаць. Не ўмеюць людзі жыць! Маюць, ёсць у людзей вялікія грошы, і не ўмеюць. Зацюканыя ўсе, з пячаткай пастаяннай трывогі на тварах... панурыя.

Няўжо і ён збоку так смешна выглядае? Не! Ён можа ганарыцца незалежнасцю... Лепш ужо, калі прыцісне лёс, схавацца пад крыло да Галіны. А пакуль наперад!

Ён склаў досыць аб'ёмную картатэку сваіх кліентаў. І зноў пачынаў званіць, калі стамляўся, гартаў газеты,

часопісы, сваю запісную кніжку. Гартаючы яе, аж сам здзівіўся: «Які я быў вынаходлівы, склаў цэлую абойму эпітэтаў, якімі карыстаўся, заводзячы новыя знаёмствы з жанчынамі. І чаго толькі не выдумляў! «Сонечная, разняволеная, гордая, строгая, прамяністая, свабодная, салодкая, працавітая, дзівосная, энергічная, томная». У гэтай самай кніжцы закрэсліў службовы тэлефон Іры. Былі ў ёй і выпіскі з прамоў Плевакі. Некалі марыў пра юрыдычны факультэт, бачыў сябе следчым, пасля адвакатам. «Як доўга гэта было... юнацкія мары».

Нялюбая работа маклера зацягнула яго, як ціна, надоўга. Набраў у жадаючых (пасля некалькіх удалых спраў пра яго загаварылі) авансаў на суму пяцьсот рублёў. А справы, як назло, далей тэлефонных званкоў не ішлі. Больш таго, некалькі чалавек, не паспеўшы аформіць неабходныя паперы, памерлі. Некаторыя асцярожныя кліенты пачалі патроху «выцягваць» з яго грошы назад, нехта больш скваплівы і злы пагражаў судом. Яго галава-камп'ютэр (у памяці ён трымаў сотні нумароў тэлефонаў) ішла кругам: бо званілі да яго на кватэру ў любы час сутак — ад пяці раніцы да дзвюх ночы. Як маньяк бегаў ён па ўсім горадзе, шукаючы прамы унітаз — такая была ўмова аднаго «аднаклетачнага» кліента, які прывык садзіцца толькі на стары прамы унітаз. У Савы пачыналася алергія на тэлефонныя званкі. Ён забыў, як яно выглядае, голае жаночае цела. Ён адключыў тэлефон і вырашыў развеяць хаос і мітусню. Пазваніў лабарантцы НДІ, запрасіў «праверыць» кухню ў рэстаране «Патсдам». Яна з цяжкасцю ўспомніла, які гэта Сава ёй звоніць, і, нарэшце ўспомніўшы, адмовілася, таму што ехалі з сяброўкамі ў Маскву на экскурсію. Браць Леакадзію? Неяк сорамна, ужо кідаецца ў вочы розніца ва ўзросце. Запрасіць Зінку? Яна адстала ад моды на гадоў пяць. Яна з цяжкасцю асіліла твіст, а шэйк, рок-н-рол для яе нязбыўная мара. Успомніў «грэшную» Томку. Ды што вярэдзіць душу... Была на прыкмеце яшчэ студэнтка з інстытута замежных моў. Зусім ужо экзальтаваная асоба, слабая на слёзы. З ёю палавы акт ператвараўся ў прагляд індыйскага фільма: пакуль яна не раскажа пра ўсіх нягоднікаў, якія яе спакушалі, пакуль не выплача да істэрыкі ўсе слёзы аб сваёй долі, да таго часу не кладзецца ў ложак. Бывалі выпадкі, калі, знаходзячыся ў яго гарачых абдымках, у экстазе, яна раптам пачынала наўзрыд плакаць: «Мы жывёліны, так, так! Бо калі, скажам, народзіцца ў мяне дзіцятка, ты ж не жэнішся са мной, і я буду вымушана здаць дзіця ў прыют...

Яно будзе стаяць у акне і махаць мне ручкай, сіраціначка! Не-е! Усё гэта брыдка. Як ты можаш спакойна адносіцца да нашай блізкасці? Трэба бунтаваць, трэба пісаць у газеты, выступаць па тэлевізары супраць палавой блізкасці наогул! Трэба біць у званы!»

Тады Сава распачынаў — часам доўгія — размовы пра векавую віну мужчыны, які менш пакутуе. Казаў, што толькі яе ён ставіць у прыклад астатнім. Толькі з такой ступенню адказнасці маеш права на каханне. Натомленая, яна лезла да яго пад коўдру і супакойвалася, а раніцай не забывалася папрасіць два рублі на таксі.

Паехаў у цэнтр дзейнічаць па абставінах, успомніць хвіліны імправізацыі спакусы ў першы ж вечар.

Па дарозе ўспомніў, што знаёмая актрыса Аксана Дрозд — ён быў знаёмы з ёй яшчэ ў час яе вучобы ў тэатральна-мастацкім інстытуце — прайшла па конкурсе ў тэатр лялек і перабралася ў сталіцу. Ён пазнаў неяк яе на фота ў вячэрняй газеце, пазваніў у тэатр, павіншаваў з прыездам, прапанаваў нават свае паслугі наконт жылля. Аксана ахвотна ўсё пра сябе яму расказала, што разышлася з мужам, які праз акцёрскую біржу наняўся ў тэтр горада Ірбіта, і што яна часова жыве на кватэры ў сяброўкі. Яшчэ тады па тэлефоне яны дамовіліся аб сустрэчы, але ж праклятае маклярства забрала ад яго і вольны час і ўсе жаданні. Сава прыехаў да тэатра, чакаў яе ля службовага ўвахода. Купіў «для понта» тры гваздзікі. І гэта дробязь так кранула жанчыну, што яна павісла яму на шыі і ад радасці ўсяго расцалавала. Як старыя, надзейныя, добрыя знаёмыя яны пайшлі вячэраць у кафэ Дома мастацтваў «Мутнае вока».

Аксана вырасла пад Барысавам, у невялікай вёсачцы на высокім беразе Бярэзіны. Ад тых далёкіх часоў дзяцінства несла з сабой гісторыю пра вужа, якую любіла расказваць у самых розных кампаніях. Вуж жыў у іх пад печчу і з усіх дзяцей кусаў толькі яѐ і толькі ў руку. Бабка казала: «Ты, Ксюша, мечаная. Пары ў цябе не будзе і грошай доўга не будзе».

— Пракляты вужака. Усё пакуль збываецца.

Смуглявая, мяккая, таварыская, Аксана была, бадай, адзінай яго сяброўкай, з якой ён адчуваў сябе проста і натуральна, ведаў, што ні яна, ні ён адно аднаму не хлусяць. За яе прастадушнасцю не хавалася сквапнасць, карысць, яна ніколі не была... сабе наўме. Адной ёй адказваў ён на даверлівасць і сяброўскую адданасць сваёй шчырасцю.

Часта яна з пікантнымі падрабязнасцямі расказвала

пра ночы, праведзеныя ў пасцелі з мужчынамі. І дзіўны, і рэдкі выпадак — ён не раўнаваў.

— Мяне і ў сталіцу выцягнулі дзякуючы пасцелі. Калі муж «сжег мосты», знайшоўся добры чыноўнік з міністэрства культуры, які так і прапанаваў: «Ноч кахання — і я зраблю, што ты будзеш у сталіцы». Я не абурылася. Ён сказаў жартам як бы, як бы жартам я згадзілася. Ён быў у гадах. Стараўся, божа мой, як пыжыўся. Аж смешна. Я, ведаеш, такі фокус выкінула — прыкінулася егіпецкай жрыцай: крычала да хрыпаты ў горле, охала і ахала, скакала да столі, адным словам, усё рабіла, каб ён паверыў, што ён суперсексуал. Ох, як гэта яго, дурня старога, цешыла. Яго ледзь хапала на адзін раз, і ён заўсёды спяшаўся дахаты, лічыўся добрым сем'янінам. Кляўся, што пазней адзінаццаці вечара не прыходзіў дамоў вось ужо дваццаць пяць гадоў.

Пераехала я. Уладкавалася ў гэты с... тэатр. Ну, думаю, трэба разлічыцца і з табой, міністэрскі пацук. Ты ж ведаеш мой сумазбродны характар. Падсыпала яму ў віно снатворнага. Паспі, думаю, галубок, да трох гадзін. Напілася я кавы, сяджу на кухні, чытаю апавяданні Буніна, дарэчы, ён мне гэтую кніжку падарыў. У тры гадзіны пабудзіла яго. Што рабілася? Маці родная! Ён пачаў мяне абыходзіць пасля гэтага за тры кіламетры. У лялечным тэатры нашым мужыкі слабыя, хваравітыя, нейкія недаразвітыя. Табе пашчасціла. Я месяц без мужыка. Не баішся?

— Не. Калі не апраўдаю надзеі, і мне падсыплеш якой-небудзь атруты?

— Не. Абяцаю. Ты не састарэў тут з маладзенькімі кабеткамі?

Аксана кранула яго нос сваім носікам. У яе былі няроўныя зубы, адзін клычок тырчаў, як у вампіра. «Трагедыя» ўсяго яе акцёрскага жыцця. Далей тэатра лялек наўрад ці ёй прабіцца.

— Прызнавайся, донжуан, згуляўся тут?

— Скажу шчыра, каб займацца ў нас сексам, трэба мець торбу грошай і конскае здароўе. У свае трыццаць я больш згубіў, чым набыў.

— О-о, даруй. У мяне ў кішэні ўсяго тры рублі. Давай закупім прадуктаў і да цябе?

— Не турбуйся. На сёння нам грошай хопіць. Закажам шашлык!

— Брава. Хачу мяса і каньяку. Сто гадоў не піла каньяк. Самыя безграшовыя ў нас артысты тэатраў лялек. Слухай, а ў «Мутнае вока» ваенныя не ходзяць? Цярпець не магу

ваенных. Сто пяцьдзесят каньяку і бутэльку шампанскага заказвай, Сава!

Так ён і заказаў. Неўпрыкмет гадзіне а дзесятай сталы кафэ занялі пастаянныя наведвальнікі. Завіс над галовамі гул чалавечых галасоў. Іх гэта не бянтэжыла: знаёмая і прыемная ўтварылася атмасфера.

Дыма пазнавалі, віталіся з ім і з Аксанай. Адзін заслужаны артыст нават праспяваў на ўсю невялічкую залу: «Приветствую тебя, мо-ой дру-у-г Са-ва-а-а!»

Жартавалі. Нехта знарок крычаў афіцыянтцы: «Бочку піва і хвост селядца!»

У кутку ля ўвахода пачаў чытаць свае вершы пузаценькі з сівой галавой паэт. Чытаў вельмі гучна (хацеў, каб чулі ўсе), каўтаў апошнія склады слоў.

— Хто гэта?

— Паэт. Ніхто іх не ведае, ніхто не чытае, дык рады, што хоць тут ёсць аўдыторыя.

— Цікава. Нічога не ўцямлю. У яго нешта з дыкцыяй. Ці п'яны. А можа, зубы ўставіў? Пра што ён чытае?

— А пра што яны пішуць — толькі пра каханне. Непрыемны тып.

Заўважыўшы незнаёмую для яго Аксану, паэт падышоў да іх століка і, пырскаючы слінай і смешна патрасаючы казлінай бародкаю, пачаў чытаць верш, як бы адной Аксане.

— Гэты свой верш, які напісаўся ўчора а палове восьмай, я прысвячаю вам, незнаёмая прыгажуня,— з бравадай сказаў паэт, перакуліўшы фужэр з шампанскім.

— Асцярожна, класік,— з дакорам папрасіў Сава.

— Выбачайце. Раечка, сюды прашу бутэльку шампузы. Я частую,— звярнуўся паэт да афіцыянткі.

Сава разумеў, што адразу паэт не адчэпіцца, пакуль не даканае сваімі вершамі, але ж спяшацца не было куды, і ён змаўчаў. Па характары паэт быў пыхлівы і фанабэрысты, але бяскрыўдны, калі яму надакучвалі новыя знаёмыя, ён ішоў да іншага століка і пачынаў усё спачатку.

— Па вашых вачах бачу, прыгажуня, што вы разумееце паэзію... Мала хто ў наш гіблы час ведае толк у паэзіі. Я падпішу вам свой зборнік вершаў. Назва такая — «Спякотны снежань у пчалы». А? Моцна? Выйдзе праз год... я знайду вас і падпішу. У ім санеты пра каханне. Іх ніхто не разумее, бо па-сапраўднаму цяпер не кахаюць. Пануе дэкадэнс. Усё паўтараецца. Паталогія хутка прыйдзе на змену дэкадэнсу. Вып'ем за паэзію. Прашу, не адмаўляйце.

— За вас,— прапанавала Аксана.

— Я вам прысвячаю санет. Экспромт. Ніхто, акрамя мяне, у Саюзе не здольны на экспромт,— і ён прачытаў нешта сабе пад нос. Яны зразумелі толькі словы «веснаход, бруіць, неруш».

Сава апладзіраваў. Паэт раскланяўся ўсім... хацеў сесці, зачапіўся за ножку крэсла і ўпаў на падлогу. Усе падумалі, што гэта трук, і пачалі апладзіраваць паэту. Сава дапамог яму ўстаць. Паэт нахіліўся да Аксаны, галантна пацалаваў ёй руку і сказаў:

— Нікому з гэтых нікчэмных людзей я не прысвячу ані вершыка. У вас чыстыя, крынічныя вочы. Уцякайце адсюль. Я ўцёк бы, ды няма куды. Я прапіў бацькаву хату. Паехаў у вясковую школу, хацеў пачаць усё спачатку і не змог. Вы студэнтка філфака? Мне знаёмы ваш твар. Вы не бралі ў мяне аўтограф тры гады таму назад?

— Не,— адказала Аксана,— я актрыса.

— Тады я вам проста абавязаны падарыць свой зборнік, і вы прачытаеце яго па тэлебачанні. Старшыня камітэта мой лепшы сябар. Я вам памагу прабіць. Сава, не загубі гэтую прыгажуню, толькі яна зможа прачытаць памайстэрску мае санеты. Вось вам мая візітоўка. Званіце кругласутачна. Я працую ўсю ноч. Усё. Выбачайце, што парушыў гармонію. Рады знаёмству.— Паэт яшчэ раз пацалаваў руку Аксане і пайшоў у гардэроб.

— Смешны чалавек, праўда? — У Аксаны быў цудоўны настрой.

— Так. Без яго і цяжка ўжо ўявіць «Мутнае вока»,— адказаў Сава, разліваючы віно ў фужэры.

Афіцыянтка закрыла дзверы на вялікі чорны, падобны на малаток крук. Гэта быў першы сігнал перад закрыццём кафэ. Не мінула і пяці мінут, як у дзверы гучна пастукалі, пачуліся патрабавальныя галасы. Афіцыянтка доўга не падыходзіла, нарэшце ёй надакучыў грукат, і яна адчыніла дзверы.

— Зачынена! Зачынена, няўжо незразумела, от людзі. Чаго дзверы ламаць?

Любімец сталічнай публікі вядомы драматург падхапіў яе на свае моцныя рукі, адарваў ад падлогі і панёс да бара.

— Каханенькая, родненькая, я ж не засну, пакуль цябе не пацалую і не вып'ю па сто грамаў каньяку са сваім рэжысёрам.

Афіцыянтка расплылася ва ўсмешцы, адразу падабрэла. Разам з людзьмі, якія акружалі драматурга, праціснуўся ў дзверы і Руслан Тамашэвіч, былы аднакласнік Дыма.

Шчодры драматург частаваў усіх, хто стаяў пабач з ім.

Руслан таксама ўзяў свой каньяк, бутэрброд і павярнуўся тварам да залы, спадзеючыся знайсці свабоднае месца. Ён пазнаў Саву. Дым жэстам запрасіў земляка да свайго століка. Пазнаёміў з Аксанаю.

— Даруйце. Я паем трохі, а то баюся не паспею. Рая, дайце, калі ласка, шніцэль і хлеба.

— Хто ўзняў гармідар за дзвярыма? — пацікавіўся Сава.

— Блазен гарохавы. Наш паэт даказваў аднаму, што ён геніяльны. Такія графаманы загубяць беларускую літаратуру. Народ цёмны, як ніколі наш народ абыякавы сам да сябе. Здавалася б, інтэлігенты, носьбіты культуры, духоўнасці, этыкі.

— Я чуў, што цябе выключылі з універсітэта. Гэта праўда?

— Можна сказаць, праўда. Інспіравалі непаспяховасць. Год я быў у акадэмічным. Пайшоў здаваць гісторыю КПСС і да сённяшняга дня не здаў.

— Складаны выпадак. Ты ж, помніцца, туды толькі на трэці год паступіў? У Курган не ездзіў, на аперацыю?

— Не. Не да таго. Яны мяне выключылі па іншай прычыне. Напалохаліся маёй беларускасці. За нацыяналізм выключылі з нацыянальнага універсітэта. Парадокс. Зараз хочуць выслаць у сувязі з Алімпійскімі гульнямі на сто першы кіламетр як дармаеда. Стварылі мы на факультэце гурток «Спадчына», сталі заклікаць беларусаў быць беларусамі, вывучаць гісторыю свайго народа, берагчы культуру, традыцыі і асабліва мову. На адным сходзе прынялі калектыўнае пісьмо і звярнуліся з просьбай у Цэнтральны Камітэт партыі палепшыць выкладанне гісторыі і паставіць у сталіцы помнікі Скарыне і Каліноўскаму. І ўсё. З гэтага тэрор і пачаўся. Скрыты тэрор на выгнанне. Камітэт камсамола, партыйныя органы, ЦК камсамола, студэнцкія саветы, рэктарат, дэканат, КДБ і хто толькі не палохаў. Маладыя душы не вытрымалі, здаліся... да апошняга трымаліся толькі я і мой сябар. І вось вынік. Я без прафесіі, работы... Пасля мне прапаноўвалі, як падачку, перавесціся на трэці курс у педінстытут. Згадзіцца ў маім становішчы — значыць прызнаць, што яны маюць рацыю. Але праўда мая! Мы, наіўныя цяляты, спадзяваліся на дапамогу чыноўнікаў... Няшчасная беларуская культура, зачыняюцца беларускія школы, паміраюць так званыя бесперспектыўныя вёскі, забрудзілі і зруйнавалі апошнія храмы, панскія маёнт-

кі, паркавыя ландшафты... іх прыладзілі пад кароўнікі і канюшні. І ўсе маўчаць. Усе. Чуцен толькі шквал авацый на ўрачыстасцях. А наша інтэлігенцыя? Пакуль не выцыганіць прэмію, ганаровае званне... моўчкі, як тхор, сядзіць пад прыпечкам. Падпісвае сфабрыкаваныя пасквілі супраць Салжаніцына.

— А можа, гэта рэфлекс выжывання? Ты, Руслан, з пераборам, сурова судзіш пра ўсіх,— без жадання навязаць спрэчку сказаў Дым.

— Для чаго ім патрэбна выжыванне? Праз пяць, дзесяць гадоў іх не будзе каму чытаць і слухаць.

Рая прынесла шніцэль.

— Давайце адразу разлічымся,— незадаволена, стомлена папрасіла яна.

— Палічыце за ўсё разам. Я заплачу,— ажывіўся Сава.

Сядзелі, чакалі, пакуль Руслан павячэрае.

— І ў нас у вёсцы школу закрылі,— як бы вінавата сказала Аксана.— Жах... Вёска без школы, падобна на вішню... без цвета ў маі.

— А вы дзе працуеце? — звярнуўся да яе Руслан.

— Актрыса.

— Самы аморфны і бяскрылы народ. Якія хочуць, такія вяроўкі з вас рэжысёры і ўюць. На сцэне ніводнай высокай п'есы: усе яны прапітаны ядам і цынізмам да паняцціяў: народ, радзіма, патрыятызм. Савецкі патрыятызм задавальняе: «Ад Масквы да самых да акраін». Спявай, народ. І ўсе спяваюць і разбураюць, а вочы як у марожаных судакоў. Татальная бездухоўнасць.

— А што для гэтай самай духоўнасці трэба, вось забі мяне бог, часта чуў гэтае слова і не магу ўрубіцца? — сказаў сваё і Сава.

— Для духоўнасці? Ды хоць бы для пачатку дастаткова мець пачуццё абавязку і любові да свайго народа.

Тройчы выключылі і ўключылі ў зале святло — гэта было апошняе папярэджанне нявыхаваным наведвальнікам аб тым, што кафэ зачыняецца.

— Сава, пазыч мне пяць рублёў,— не саромеючыся Аксаны, папрасіў Руслан.

— Канечне, стары, калі ласка. Трымай.

— Дзякую. Як ты? Хто ты? Гадоў пяць цябе не бачыў.

— Я? Існую празаічна. Не пакутнік, не хрысціцель і не п р е д т е ч а.

— Ты на кінастудыі?

— Не. У адрозненне ад цябе не бунтую, не качаю пра-

вы. Сам пакінуў інстытут на трэцім курсе, бо лічу, што ў нас вышэйшая адукацыя даецца для таго, каб не даць чалавеку зарабіць грошай, а я іх, праклятыя, люблю. Жыву ў Чыжоўцы. Далёка ад цэнтра, але ў асобнай кватэры.

Яны перайшлі з залы ў прыціснутую нізкай столлю гардэробную. На чырвонай канапцы ля акна ў расхрыстаным старэнькім паліто з белым каракулевым каўняром сядзеў паэт і спаў, закінуўшы галаву назад.

— Хлопцы ўлева, дзяўчаты ўправа,— прапанавала Аксана, паказваючы на туалеты.

Яны засталіся яе чакаць ля тэніснага стала.

— Руслан, даруй, мажліва, я ханжа, касмапаліт, няўжо ты лічыш, што механізатар, які загаворыць па-беларуску, збярэ большы ўраджай. Я не веру, што народ адродзіцца.

— Пакуль ён не памёр, ён абавязаны адрадзіцца. А наконт механізатара... памыляешся. Зараз яму глыбока начхаць і на сваю зямлю, і на камбайны з Растова, і на насенне з Літвы, таму што ў ягонай душы няма любові не толькі да сваёй крэўнай зямлі, але і да Расіі, і да Літвы. Ён бяздушны робат.

— Не ведаю. Асабіста я жыву без комплексаў непаўнацэннасці, шчыра скажу, што не чытаю беларускіх газет і ад гэтага нічога не губляю.

— І ў беларускіх газетах ды ў іншых нашых газетах чытаць няма чаго. Хлусня альбо алілуйшчына. Ты ж, да прыкладу, з газет не даведаешся, як народ у Сібіры і на Урале жыве? Чаму Брэжнеў паехаў на БАМ ды прыхапіў з сабой і Усцінава? Для смеласці, каб сіла была. Ды што далёка хадзіць: у нас на аўтамабільным і на трактарным асобныя цэхі баставалі. Ты дзе-небудзь чытаў пра гэта? У Кобрыне заснавалі нешта накшталт нашай «Спадчыны», дык разагналі як нацыяналістаў. Чытаў пра гэта? А што робіцца ў Польшчы? Што нам пішуць пра «Салідарнасць» — толькі як пра ворага сацыялізму. Я чуў па радыё. У іх здаровая крытыка.

Па крутых сходах ад былога маёнтка мінскага мітрапаліта яны спусціліся на праспект.

— Слухай, Сава, можна цябе на секунду. Даруйце, Аксана. Грошы больш прасіць не буду. Паслухай, ты казаў, што маеш асобную кватэру,— спытаў Руслан, калі яны адышлі ўбок.— Можна, я ў цябе перакантуюся... ноч, дзве?... Часова.

— Канечне, стары. Сёння, сам разумееш, дама едзе да

мяне... а заўтра прыязджай. Матрац знойдзем, і чай з бутэрбродам будзе.

— Дзякую. Некаторыя знаёмыя баяцца нават загаварыць са мной на вуліцы... Пусцілі чутку, што я дысідэнт.

Тут Сава ўспомніў пра Галіну і ледзь не прапанаваў Руслану яе адрас, але ў апошнюю секунду спахапіўся, рэўнасць утрымала яго.

— Яшчэ раз дзякую. Усяго вам добрага. Мне ў другі бок.

— Поспехаў вам,— шчыра пажадала Аксана.

— Та-ак,— працягвала яна,— Мінск хоць неяк бурліць, а на перыферыі санлівае царства, журба. Мне пашчасціла, што я вырвалася з Бабруйска. Нам на якім транспарце: аўтобус, тралейбус?

— Графіня, вы мяне недаацэньваеце. Даруйце, як кажа Руслан, мы едзем на таксі! Трэба жыць у асалоду кожную мінуту — вось мой дэвіз.

— Брава. Таксі, шампанскае, ванна з пенаю, марожанае ў шакаладзе — вось мае бытавыя слабасці.

— А я?

— Ты прыемнае выключэнне і дапаўненне. Мой першы сябар, мой «друг бесценный»,— так сказаў паэт.

Ім было весела. Яны абое былі ўважлівыя адно да аднаго. Гэта быў дзіўны вечар. Пры свечках. Яны больш не ўспаміналі ні Руслана, ні паэта. Густы, як вата, снег сыпаў і сыпаў з цёмнага неба перад іх акном. Хацелася аж дакрануцца да белых камякоў, так яны прыцягвалі сваёй пяшчотаю. Зацішак садзейнічаў даверлівасці, даверлівасць дыктавала інтым, паўшэпт.

— Можа, мы зрабілі памылку. Сава? Можа, нам трэба было тады даўным-даўно пажаніцца? У такую ціхую зімовую благадаць мне асабліва сумна бывае без... не ўгадаеш, без дзіцяці. Я не веру Чэхаву, яго героям, якія пакутуюць. Як Платонаў: ах, трыццаць пяць гадоў, і нічога не зроблена, жыццё не адбылося. Гульня розуму. Дзеля таго, каб жыццё адбылося, дастаткова дакрануцца да першай расы, пацалаваць сцяжынку, прытуліць маці, пасадзіць дрэва... столькі падстаў для шчасця, падлічыць цяжка. Самыя шчаслівыя і мудрыя людзі, якія любяць жыццё дзеля самога жыцця,— парушыла ласкавую цішыню Аксана.

— Я не ведаю нават, што табе адказаць і па першым і па другім пытаннях.

— Звычайна ты на ўсё ужо маеш гатовы адказ. І ўсё ж з нас магла ўтварыцца неблагая пара. Я не кажу, прыкладная. Мы жылі б, як французы.

— А ты ўпэўнена, што калі я быў бы тваім мужам, то змог бы даравацць усе твае амурныя прыгоды?

— Я б табе пра іх і не расказвала. Ты хітры, я ведаю. Нам ад таго і хораша, што мы нічым не абавязаны адно аднаму. Дарэчы, хто была твая першая любоў? Пра ўсіх, амаль пра ўсіх ты мне расказваў, а пра яе ніколі. Таямніца, фантом? Што? — Аксана нахілілася да яго і зазірнула ў вочы.— Гэта было ў школе? У дзевятым? У дзесятым? За табой дзяўчаты бегалі... Я слухаю... Сядзем, раскажы.

— Першае каханне даецца ў такім узросце, каб з ім не саўладаць. Чые словы?

— Пачакай... хто ж у нас пра каханне... Заля? Стэндаль? Бунін?

— Шэкспір. У мяне складаная гісторыя, не хочацца ўспамінаць. Мала прыемнага. Людзі мала і неахвотна ўспамінаюць пра свае паражэнні. Скажу, што цяпер яна жыве адна з сынам. Муж трагічна загінуў.

— Ты горды, ведаю. Да яе не вернешся?

— Ты ўгадала.

— Яна прыгожая?

— Калі скажу прыгожая, пакрыўджу цябе, так? Таму скажу, што ў ёй ёсць нешта такое, што выдзяляе яе на агульным фоне, робіць прывабнай. А што гэта? Фантазіруй сама: прыгажосць, уменне сачыць за сабой, культура паводзін, гордасць, незалежнасць, духоўная работа душы.

— Ой, памру, ой, ратуйце! Ну — ты і хітрушчы! Толькі, дзеля ўсіх святых, не трэба мне гаварыць пра духоўнасць сучаснай гарадской жанчыны. Дзякуй богу, жыву, назіраю. У нас у тэатры быў адзін рэжысёр. Запрасілі на адну пастаноўку. Дурыў усім галовы гэтай самай духоўнасцю і работай душы. Хадзіў у кірзавых ботах, касаваротцы... з бародкай. Маска такая была пад старавера. Час прэм'еру іграць, усе тэрміны выйшлі. Дырэктар у шаленстве, яго язва абвастрылася і цела свярбець пачало, а гэты ў кірзачах усё разбірае духоўнасць чэхаўскіх сясцёр. Чаму ў Маскву хочуць, якая духоўнасць імі рухае? Была адна ў трупе бітая баба, спецыяліст па ўводу ад жонак галоўных рэжысёраў. Такая шухерная казачка... зух... да яе пад гарачую руку ў ложак не лажыся. Вазьмі яна ды і ляпні:

«Вось што, пераўтваральнік сексуальнай энергіі ў духоўную, мне надакучыла. Сёстры едуць у Маскву купіць жратвы і шмотак у магазінах «Ванда» і «Лейпцыг». Давай пра гэта і будзем іграць у п'есе». Пакрыўдзіўся на яе страшна. У буфеце піў адну мінеральную ваду і курыў махорку. Схуднеў,

як кашчэй. Бачыць наша баба, справа-дрэнь. Пашкадавала яго. Апісаць табе яе знешне магу коратка — секс-баба. Не грудзі, а жывое кавадла. Прывяла яго да сябе на кватэру, накарміла і пакінула на ноч. І што ж... як рукой зняло ўсе яго высакапарныя словы аб духоўнасці. Праз дзень ігралі прэм'еру. Кірзачы ён зняў, апрануў касцюм. Бараду збрыў. Без барады зрабіўся такі гліст, смеху варта. Адразу запусцілі яго з новай п'есай. І ён галоўную ролю — нашай секс-бабе. Але ж яна, баба, не з простых. Дазналася, што ён тайком ад бухгалтэрыі дасылае аліменты ў Талды-Курган! Уведаўшы, дала яму па шапцы. Давай на яго вачах шашні круціць з адным маладым героем, які прыехаў на сезон з Хабараўска. Няшчасны рэжысёр зноў упаў у журбу. Зноў апрануў касаваротку, кірзачы, зноў пачаў дурыць нам галовы духоўнасцю. Такі вось быў казус. А твая першая любоў усё ж прыгожая, бо перажываеш, адчуваю. Мяне ў класе адзін кахаў... моцна, аддана... а я, дурная, закахалася ў маладога настаўніка.

— І маю тайна кахаў Руслан, загадзя ведаючы, што не можа разлічваць на ўзаемнасць.

— Ты раўнаваў? Не. Ты халодны... валодаеш сваёй сілай волі, як касманаўты. Відаць, табе гэта самазабойнае пачуццё — рэўнасць незнаёма. Мяне ты ніколі не раўнаваў.

— Яе раўнаваў.

— Веру. Я зайздрошчу тым, каго раўнуюць. Значыць, кахаюць. Мяне муж ніколі не раўнаваў. Ён ніколі мяне не сустракаў, калі я вярталася позна дахаты. Не цікавіўся, чаму і дзе я затрымалася. Жанчыну мусяць раўнаваць... і ты раўнуй мяне, я сумую без рэўнасці, хаця б рабі выгляд, што раўнуеш. Ты ж неблагі артыст. Ведаеш, журботна, калі не званяць, не дораць кветкі, не дзяжураць ля пад'езда ці насупраць акна, не дасылаюць віншавальных паштовак. Так іншы раз хочацца адчуць сябе слабай, безабароннай, а джэнтльменаў, на жаль, няма. Можа, я і пакахала б каго-небудзь, ды не хачу ахвяраваць вольным часам... бо ўсім трэба адно і адразу — у ложак. У нецікавы час выпусціў нас бог да людзей. Вось сто гадоў, сто пяцьдзесят назад я б хацела жыць. Балы, карэты... галантныя кавалеры... цнатлівыя сустрэчы пад месяцам... А ў нас? Жлабы, пашлякі... Я вось, можа, смешна, увесь вечар вяртаюся ў думках да Руслана. Ён заслугоўвае пашаны. Перад ім мне за сябе сорамна. Мы ўжо з табой не народ.

— А хто?

— Насельніцтва.

— Жанчыне трэба думаць пра каханне, а не пра палітыку,— адказаў ён.— Мажліва, Руслан унушае давер. Такі разначынец, нарадаволец. Але ж часы барацьбітоў-адзіночак канулі ў Лету. У нас меншасць падпарадкоўваецца большасці.

— Няўжо яго не вернуць, не дазволяць вучыцца ва універсітэце?

— Не трэба і марыць. Нават калі напіша на з'езд партыі, не паможа. Спусцяць пісьмо сюды, а тут ходу не дадуць. Зачараванае кола, у якім рука руку грэе, і чыноўнікі знізу дагаджаюць чыноўнікам зверху.

— Скажы, а яго і напраўду могуць вывезці на сто першы кіламетр? У нас і Алімпіяды па сутнасці не будзе. Чвэрцьфіналы па футболу, і ўсё.

— Вывезуць. Нават без санкцыі пракурора арыштуюць і вывезуць.

— І немагчыма памагчы? — усё яшчэ сумнявалася Аксана.

— Напішы пратэст альбо выйдзі з плакатам на плошчу, дык і цябе з ім за кампанію на сто першы. Помню, у нас на студыі бухгалтар быў адзін. Напісаў крытычную работу на эканоміку Маркса. Дык з партыі выключылі і са студыі выперлі. І ўсе прагаласавалі аднагалосна. Людзям усё да лямпачкі. Штогод у Мінску пасля Новага года спальваюць 140 тысяч елак, і думаеш, нехта б'е трывогу? Заклікаюць па тэлебачанні паўстаць супраць варварства. Цішыня! Так што пратэставаць супраць таталітарнай адміністрацыйнай сістэмы бессэнсоўна. Ратуе кампраміс.

— Але ж прыкра, не хочацца жыць абыякава, бессэнсоўна,— не згаджалася з яго доказамі Аксана.

— Навучыся вязаць. Пры Доме афіцэраў ёсць курсы. Не ўступай з грамадскай фармацыяй у канфлікт. Рэвізійная камісія, народны кантроль, нават генеральны пракурор — цябе не ўратуюць. Прадажныя людзі наўкол. Салжаніцына выперлі? Хто падпісваўся? Усе цяперашнія лаўрэаты Ленінскіх прэмій і Героі Сацпрацы. Руслана, скажу табе, яшчэ ў школе адрознівала ад усіх схільнасць да драматызацыі дробязей. Руслан пакутнік за смутную, нежыццёвую ідэю. Так, ён можа спадабацца такім эмацыянальным, чулым, як ты, дзецям вёскі, прыроды, якіх пакалечыла некамунікабельнасць вялікага горада, і ні больш таго. Рух мае павінен мець праграму, сродкі інфармацыі, газету, партыю, нарэшце, а так гэта ўсё самадзейнасць.

— Што ж застаецца? Канфармізм?

— Ого! Табе вядома гэта імпартнае слова. Ды не... Застаецца секс. Толькі ў сексуальнай рэвалюцыі няма пераможцаў і пераможаных. Ён не падуладзен модзе і палітыцы. Не верыш? Падай мне часопіс. Правядзём эксперымент.

Яна падала яму замежны часопіс з каляровымі ўклейкамі голых мужчын і жанчын.

— Вось, Адам і Ева. Голенькія. Фота на ўсе часы. Якую б ты назву прыдумала для гэтай карцінкі?

Аксана задумалася і, не знайшоўшы нічога арыгінальнага, сказала:

— Адам і Ева XX стагоддзя.

— Няхай так. Плоска, наіўна, праўда. Я магу за тры мінуты прыдумаць трыццаць назваў. Бяру цэнтральную газету і чытаю толькі назвы артыкулаў і перадавіц. Слухай: «Вяртанне гаспадара», «Пераварот у Гватэмале», «Трансплантацыя душы», «Ці трэба вучням мундзір», «Як змагаюцца за нашы інтарэсы выбраннікі народа», «Цэны і зарплата без ілюзій», «Перапады напружанасці», «Калі ты не згодзен з класам». А зараз пачытай ты.

Аксана ўзяла газету і прачытала першую ж назву.

— «Быть богатой хлебом ниве», «Подвиг их бессмертен».— Аксана давілася смехам.

Усміхаўся і Дым.

Яна ўпершыню трымала ў руках амерыканскі парнаграфічны часопіс і з цікавасцю гартала яго.

— І ўсё гэта ў свабодным продажы?

— Кішыць ў кіёсках... Я маўчу пра Швецыю і Данію. Мы заскарузлыя пурытане. Нельга быць свабодным у несвабоднай краіне.

— Не ведаю, не ведаю. Калі б гэта ўбачыла мая маці, не ўяўляю яе рэакцыю. Выданне якое шыковае. Папера гладкая. Якасць.

— Грашовая справа.

— А гэта? Не разумею. Дзве жанчыны?

— Так. Лесбіянкі. Чалавецтва дасягнула такога ўзроўню мастацтва дэмагогіі, што можа апраўдваць усё, што пажадана: таталітарную сістэму, Пінача, вайну на Усходзе, неабходнасць сям'і і неабходнасць яе распаду. Так што бог не трэба. Ён састарэў.

— Не хачу верыць. Бог трэба.

— І без бога можна пражыць кожны дзень як апошні. Цалуй мяне, прагна цалуй, усё хістка ў гэтым свеце і ненадзейна, цалуй, як у апошні раз, і я адкажу табе ўзаемнасцю.

— Сава, мне страшна... у цябе жах перад смерцю... я чы-

тала ў класікаў. Гэта прыходзіць пасля трыццаці. Вочы ў цябе як у дэмана.

— Няўжо? — з іроніяй спытаў ён.

— Так. І Буда ў сорак гадоў адмовіўся ад мірскога.

— Глупства. Ты эмацыянальная натура і ўсё перабольшваеш. У мяне страх выключна перад тымі, каму я вінен грошы. Пачуццё ўласнай прыніжанасці. Але ж сёння мы багатыя, нам хочацца кахаць і давай не думаць, што там за акном, усё роўна жыцця не хопіць, каб зразумець. Абдымі мяне і цалуй — мы востраў ісціны ў акіяне хаосу. Свет абсурдны — акрамя твайго пацалунка і цела.

Праз дзень увечары прыехаў Руслан, дастаў з сумкі тры пачкі пельменяў, некалькі бляшанак кансерваў, кіло венгерскага сала, пасыпанага чырвоным перцам, і лівернай каўбасы. Як убачыў усё гэта Сава, так і панік. Яму не хацелася, каб Руслан асядаў у яго надоўга. Смачна павячэралі. Бачна было, што Руслан вельмі згаладаўся.

— Я вось аб чым падумаў. А ці не лепш табе, Руслан, паехаць у Ракаў да хворай маці. Перавядзіся на завочнае. Плюнь на ўсё. Ты ж у школе неблагія вершы пісаў. Заняўся б літаратурнай працай. Жыў бы сярод народа, вывучаў бы сацыяльныя, аграрныя пытанні. Цяпер жа піша і жук і жаба. Шкада змарнаванага часу.

— Няўжо ты лічыш, Сава, што на сваёй зямлі, зямлі незалежнай Беларусі, члена Арганізацыі Аб'яднаных Нацый, я не адолею бюракратыю? Я звярнуся ў Маскву, у ЦК з пісьмом, каб утварылі камісію, якой я буду здаваць экзамен па гісторыі партыі. На сваім факультэце я не давяраю выкладчыкам. Акрамя таго, у каторы раз запісаўся на прыём да сакратара ЦК у нас. Паўгода не дапускаюць. То ён у камандзіроўцы, то хворы, то адпачывае ў Крыме, то за мяжой, то ў Маскве на курсах.

— Зрэшты, гэта тваё права. Шкада маладых гадоў. Усе інструкцыі, пастановы, палажэнні і законы ў іхніх руках.

— Што ж, па-твойму, застаецца абліць сябе бензінам ды спаліць перад будынкам ЦК?

— Ты ж не будыст? У нас не В'етнам і не Лаос. Мы памяркоўны люд.

— Я такому будысту па-добраму зайздрошчу. Яго сіле, волі, энергіі. Мяне не хопіць на такі ўчынак. Падарваў гарэлкай здароўе.

— Не падай духам. Давай знайду табе работу.

— Не хачу. Буду змагацца. Ты гэта чытаў?

— Так. Венгерскія дэтэктывы.

— На вось што пачытай. Мне далі на тры дні,— і ён падаў Саву кніжку невялічкага фармату,— гэта «Архіпелаг Гулаг» Салжаніцына.

— Няўжо? Я чуў, але не чытаў.

— Бяры пачытай. А я пасплю. Дзве апошнія ночы кантаваўся на вакзале.

— Адпачывай. Я нават тэлефон адключу. Давай.

Сава чытаў кніжку да глыбокай ночы. Яна не забрала яго за жывое, хаця новая інфармацыя, якую ён не ведаў, трымала ўвагу, яму хацелася асіліць кніжку да апошняй старонкі, каб пры выпадку пахваліцца, дзе трэба, што і ён ведае Салжаніцына і тое-сёе чытаў.

Раніцаю Руслан паехаў у цэнтр горада і вярнуўся недзе каля апоўначы. Быў п'яны і злосны. У поўдзень наступнага дня, калі Дым нарэшце ўзяўся варушыць і свае маклерскія справы, у дзверы пазванілі, прыйшоў мясцовы міліцыянер з участка. Дзякуючы звычцы ды інтуіцыі, Сава паспеў схаваць «Архіпелаг Гулаг».

Чырванашчокі з марозу ўчастковы адразу пачаў Дыма палохаць.

— Эт самае, я ўпаўнаважаны заявіць табе наступнае: ты пусціў на кватэру дысідэнта Тамашэвіча. Мала таго, што сам пражываеш на чужой плошчы, дык яшчэ і парушаеш законы. Ён тып неблаганадзейны, на ўліку ў міліцыі і, не сакрэт, у КДБ. Ты ж і сам даўненька не працуеш. Так? Маем усе правы альбо пасадзіць цябе, альбо выселіць з Мінска. Мая табе парада: не звязвайся. Нам клопату менш. Чорт ведае чым вы займаецеся... можа, вы распаўсюджваеце забароненую літаратуру? І без таго суседзі скардзяцца, звоняць, што ты разбэшчанасць плодзіш. Які ты прыклад паказваеш савецкай моладзі? Камсамольцам? Што гэта ў цябе на тумбачцы? Парнаграфія? Бардэль! На два гады хочаш загрымець? Спалі. Ты ж талковы хлопец, ведаеш, пачым фунт ліха... і даў маху з Тамашэвічам. Што цябе з ім звязвае? Пра яго ўжо «Свабодная Еўропа» перадавала. Дажыліся. Вось на такіх Тамашэвічаў і робіць стаўку наш вораг, хоча нашы камуністычныя ідэалы разбэсціць. Не дапамагай адшчапенцу, не перашкаджай нашым людзям будаваць светлае заўтра. Пратакол складаць не стану, спадзяюся, што ты ўсё зразумеў... Між намі, не сакрэт, маем права і можам цябе выселіць і забраць кватэру ў выканком. Спадзяюся, што мне другі раз да цябе прыходзіць не давядзецца. Падумай...— Участковы адкашляўся і, не падаючы рукі, выйшаў.

Сава затрымаўся на парозе. «Дурань! Хам! Жлоб! Якое ты маеш права ўказваць мне, як жыць, з кім сябраваць, каго пускаць у кватэру, каго не?» — Душа яго бунтавала. Яму хацелася кінуць абвінавачванне ў патыліцу ўчастковаму, але ён стрымаўся. Бо гэта быў толькі мімалётны пратэст яго душы, які хутка патух. Звычка смяяцца з людзей неўпрыкмет, асуджаць іх за вочы моцна ўкаранілася ў ім. І чым больш ён разважаў над словамі міліцыянера, тым больш схіляўся да думкі участковага: «Трэба ювелірна сплавіць Руслана... альбо знікнуць самому. Але куды і як?» Ён перабраў усіх, пералічыў усе варыянты і нарэшце ўспомніў, хто яго ўратуе і надзейна схавае і ад Руслана, і ад лішніх кліентаў: гэта Галіна!

Яшчэ да сустрэчы з Русланам мільганула ў яго ратавальная думка: узяць у яе чатырыста рублёў, разлічыцца з надакучлівымі кліентамі і кінуць гэту дурную работу. Утрымлівала адно — гардыня. Прасіць у яе — значыць дараваць усё, змірыцца, адчуць сябе рабом. Ён якраз рабіў усё наадварот, паводзіў сябе так, каб яна змірылася, стала паслухмянай, ручной. Як толькі сцямнела, ён лёг у ложак і не ўключыў святло. Сілком прымушаў сябе заснуць. На гэты раз Руслан пазваніў у дзверы недзе каля дзесяці вечара. Сава ляжаў здзічэла, як перакінутая дагары дном лодка на пяску. Недзе праз гадзіну Тамашэвіч яшчэ раз пазваніў. Пачаў у адчаі клікаць: «Сава, гэта я, Руслан. Ты дома? Адчыні. Гэта я, Руслан».

Сава ляжаў, не зварухнуўся: «Надакучлівы тып. Фанат. Не дай бог пачне званіць суседзям». Але ўсё абышлося. Больш званкоў не было.

Ранічкай Сава пакінуў у дзвярах пісульку: «Даруй, стары. Прыехаў гаспадар кватэры. Я сам часова пераходжу да сябра. Рэч тваю вярну пры сустрэчы ў «Мутным воку». Твой С.». Ён меў на ўвазе кнігу Салжаніцына.

Дым паехаў да Галіны. Пасля пахавання цёткі наведваў ён яе двойчы і двойчы быў п'яны. Яна цярпліва выслухоўвала яго лухту, не дазваляючы да сябе дакранацца. Папярэдзіла, каб ніколі больш у такім выглядзе да яе не прыязджаў. Ён памкнуўся апраўдвацца, яна і слухаць не хацела. Заўвага гэта параніла яго самалюбства.

Доўга ён не ехаў да яе. І вось цяпер прымусіў сябе пра ўсё забыць.

Пачаў здалёк. Што не мае часова грошай, што заядаюць даўгі. Шчыра жаліўся, што засталіся вакол яго адны падонкі, што ён, можа, як ніхто, адзінокі ў гэтым мільённым го-

радзе, што немагчыма свабодна жыць у чужой кватэры, чакаючы, што цябе могуць у любы час выставіць на вуліцу. У гэтай сваёй споведзі з даўнім жалем прызнаўся, што ўсё жыццё праклінаў сябе за тую гарачнасць, эгаізм і бяздушнасць, што думаў пра яе амаль пастаянна. І зразумеў, што, акрамя яе, яму ніхто не патрэбны. Так! Ён згодны ўзяць яе разам з сынам, гатоў падаць заяву ў загс неадкладна, гатовы ўсынавіць Сярожку. Сава падумаў, што няблага было б у гэтым месцы пусціць слязу пакаяння; гэта б яшчэ больш уздзейнічала на яе, але слёз не было. І без іх, трэба сказаць, выгляд ён меў варты жалю.

— Не праганяй мяне... не аддаляй... я буду спаць тут, у прыхожай. Зразумей, я таксама маю сэрца і яно крывавіць. Будзь маёй жонкаю і даруй...

— Добра. Заставайся. Я табе веру.— Ён так і не зразумеў да канца яе слоў-згоды: чаго ў іх было больш — пачуцця, спагады ці жалю да яго.

Ён абняў яе ў парыве падзякі, не цалаваў, толькі моцна прытуліўся да яе. Не рызыкнуў уначы ісці да яе ложка, як і яна саромелася выйсці да яго ў залу. Ужо даўно заснуў сын, даўно стары насценны гадзіннік адбухаў апоўнач, а яны ўсё не адважваліся зрабіць крок насустрач адно аднаму.

— Ты не спіш?

Яна не адказвала. Ён паўтарыў пытанне:

— Галіна, ты спіш?

— Не.

І гэтым мяккім, простым «не» яна як бы ўзнавіла згубленую былую атмасферу давер'я.

Ён пайшоў. Узяў яе на рукі і перанёс у залу, асыпаў усю пацалункамі, як калісь. Яна абняла яго цёплымі рукамі за шыю і адказвала на яго пацалункі...

Да непазнавальнасці ўважлівы заставаўся ён увесь тыдзень. Сустракаў яе з работы, дапамагаў рыхтаваць вячэру, забіраў са школы Сярожку, насіў ад калонкі ваду, прыбраў двор, навёў парадак у каморы.

І Галіна прыкметна змянілася, адказвала на яго ўвагу пяшчотаю і ласкаю. Мажліва, ён упершыню падумаў, што ўсё вось гэта (гэтая часовая ідылія) у народзе і называецца сямейным шчасцем?

Іх мядовы месяц цягнуўся тры месяцы.

Дым атрымаў доўгачаканае запрашэнне на работу ў Дом сямейных урачыстасцяў і зноў апынуўся ў сваёй стыхіі, у паўзабытай атмасферы начнога горада, якая заўсёды вабіла яго сваім трывожна-прыемным чаканнем дзіва. Яго

часовая сямейная гармонія надакучыла яму, не таміла яго, але ўжо і не была адзінай натхніцелькай жыццёвага аптымізму. Душа яго, як ён зразумеў, не пазбылася таго прыемнага вольнага блукання. З жахам ён падумаў: «Як я мог жыць без выбару, волі? Як я мог так доўга пераносіць атмасферу замкнёнасці, адчужэння ад усяго таго, што заўсёды вабіла і радавала мяне і ніколі не надакучвала?»

З новай работай здольны Дым асвоіўся хутка. З усіх сямейных абрадаў у быт «фабрыкі» ўкаранілася толькі вяселле. Хрэсьбіны, памінкі, дні нараджэння, юбілеі заказвалі вельмі рэдка, абыходзіліся хатнім застоллем, а ўжо вяселлі гулі кожную пятніцу, суботу і нядзелю. У панядзелак і аўторак адпачывалі, прыбіралі смецце, рамантавалі мэблю, мылі падлогу, завозілі свежыя прадукты.

Сава стварыў свой арыгінальны сцэнарый рытуала гарадскога вяселля. Але госці вытрымлівалі ягонуую схему вяселля толькі да сярэдзіны, а пасля большая частка публікі напівалася, і накіроўваць іх настрой Саву было амаль немагчыма. Напачатку ўсё яму вельмі падабалася: ён быў у цэнтры ўвагі, як усюдыісны дырыжор, кіраваў маладымі, сватамі, гасцямі. Ён яшчэ быў нявопытны тамада, але ж старанны, служыў вяселлю сумленна.

Адно вяселле найбольш запомнілася, і не толькі таму, што на ім ён напаткаў амаль забытую Томку.

Жаніўся стары халасцяк, равеснік Савы, браў маладзенькую вясковую дзяўчыну. Ён быў шафёр, а яна працавала кінамеханікам у буйным кінатэатры. Сваякі маладога, як паспеў заўважыць Сава, паводзілі сябе ганарыста, лічачы, што іх гарадскому хлопцу яна, простая рыжая вясковая дзяўчына, не пара. Вясковы ж сват, нязграбны, перакормлены мужык з маленькімі вочкамі, наадварот, лічыў, што гэты «стары казёл, якому месца падмятаць вуліцы» не пара яго прыгажуні.

Нервознасць адных, незадаволенасць другіх — усё гэта напачатку было вельмі бачна.

Маладым прапанавалі стаць на ручнік перад уваходам у банкетную залу.

Сват, мякка кажучы, нарываўся на сварку. Усё яго даймала, усё было не так, як яму хацелася б. Быў смелы, мо ад таго, што «панюхаў» па дарозе чарачку.

— Дарагія маладыя, станьце на ручнік — гэты сімвал чыстага і светлага, бессмяротнага кахання,— вяшчаў Сава. Быў ён у чорным казённым касцюме з чорнымі атласнымі лампасамі на штанах, як у швейцара, з чорнай бабачкай.

— Дзе бацькі нявесты? Давайце сюды з хлебам-соллю. Дзе ваш хлеб-соль?

Напалоханая сваццця вінавата паціснула плячыма.

— У Васі, у машыне... ай-ёй... а ён пагнаў машыну ў гараж,— успомніў брат нявесты з перебітым носам.— Можа, зганяць на таксі?

— Не варта. Што-небудзь прыдумаем.— Сава папрасіў афіцыянтку прынесці з кухні хлеб і соль.

Незапланаваная паўза нагнятала прыглушаны настрой. Усе ўставіліся на Саву, як веруючыя на свяшчэнніка ў мінуту пропаведзі.

— Жизнь прожить — не поле перейти,— пачаў Дым, з цяжкасцю ўспамінаючы вершы,— будут горы и низины...

— Будзе ўсё! — дадаў «Таптыгін»-сват.

— Будет все! И солнце, и гроза, и лютый зной, холодные метели!

— Няхай жывуць у вас карова і каза,— вельмі хацелася свату, каб звярнулі ўвагу і на яго красамоўе.

Жонка — мажная жанчына — локцем ударыла ў жывот свайго «артыста».

Сава вярнуўся да сцэнарыя:

— Пусть вам запомнится эта минута. Да будет священной она. Отныне не просто вы друг и подруга. Отныне вы муж и жена!

Госці горача апладзіравалі. Афіцыянткі з хлебам і соллю ўсё яшчэ не было.

Усе зноў глядзелі на Саву, як на выратавальніка.

— Мы рады приветствовать и гостей в этом лучезарном зале, передовиков производства, ударников коммунистического труда. В добрый час, под мирным небом, вы, дочь и сын советского народа, равноправные наследники пролетариата и трудового крестьянства, его надежда на будущее, делаете этот важный шаг,— Сава зноў глядзеў на маладых.— Впереди у вас бесконечная пора семейной жизни. Пусть вам запомнится эта минута, да будет священной она... отныне вы друг и подруга, отныне вы муж и жена.— Сава чартыхнуўся, ён пераблытаў радкі ў сцэнарыі і паўтарыўся.

Нахрапісты сват (цяпер ён перамясціўся ад жонкі на другі бок) сказаў цішком Саву:

— Яны даўно муж і жонка. Яна на пятым месяцы цяжарнасці. Гэта я прымусіў жаніцца гэтага паршывага казла. Канчай валынку, вядзі людзей да стала, усе даўно і страшна галодныя.

У гэты самы час Сава і пазнаў сярод гасцей Томку. Ён адчуў сябе ніякавата за блытаны і бляклы сцэнарый.

Яна таксама пазнала яго і памахала рукой.

— Союз этот брачный,— пайшоў па другім крузе Сава,— пусть будет взаимной любовью согрет.— Ён азірнуўся і ратавальна ўздыхнуў: на сходках бегла афіцыянтка з хлебам і соллю.

Сава перадаў хлеб-соль бацькам нявесты і падказаў ім:

— Гаварыце так: дарагія дзеці, прыміце хлеб-соль на добрае здароўе, на шчасце. Няхай пацалуюцца.

Бацькі паўтарылі ўсё сказанае Савам.

Сава, як малады пеўнік, бег угару па лесвіцы.

— Дарагія госці, прашу ўтварыць сімвалічную дарогу шчасця маладым.

Госці сталі па два бакі ад Савы, стварылі нешта накшталт калідора.

— Маладому насыплем у кішэню зерня. Колькі ў кішэні зярнятак, столькі ў хаце будзе дзіцятак. Прашу ўсіх за маладымі. Род жаніха на правы бок, род нявесты — на левы. Сядайце да святочнага стала. Аркестр, прашу вітаць новую сям'ю ўрачыстым гімнам Гіменея.— Ён глянуў у запісы: «Когда Гименей встречает два любящих сердца, два голубка, он дарит им золотые кольца, которые наши молодые по постановлению Мингорисполкома купили в салоне «Счастье» по талонам за честно заработанные деньги». Сава з прыкрасцю адкінуў сцэнарый.— Вы дзеці слаўных і добрых бацькоў, добрасумленных, працалюбівых, гордых і шчырых, якія, я не сумняваюся, выканалі датэрмінова свае сустрэчныя планы.

— І перавыканалі! — выгукнуў нехта з-за стала.

Зарагатаў на ўвесь стол толькі сват-непаседа. Жонка зноў тыцнула яму кулаком у бок.

— Наполним же бокалы прозрачным вином, даром земли, нас взрастившей, и пожелаем молодоженам: пусть их семейный корабль выдержит все штормы, минует все океаны, пусть ваша семья станет прочной опорой социалистического общества, победоносно строящего коммунизм.— Сава здзівіўся, што не можа адысці ад прымітыўных запісаў, якія заселі ў памяці.— Мужчыны, не забывайце пра жанчын, якія сядзяць па правы ад вас бок. Горка-а-а-а!

Здавалася, што гэтага знаёмага ратавальнага слова ўсе толькі і чакалі. Рэхам аддалося яно ад бетонных сцен, пакацілася!

Сава перавёў дых, выцер з ілба пот.

«Цяпер не даць ім апамятацца. Адразу па другой чарачцы!»

— Дарагія сябры, вы чуеце гукі музыкі? Вас вітае наш ансамбль «Інтэгралы на цэгле». Перад тым як запрасіць вас на танцавальную праграму, прашу яшчэ раз напоўніць бакалы. Вып'ем за здароўе бацькоў, якія падаравалі маладых. Вам слова, дарагія наш сват і сваццproperя.

Сава не слухаў пажаданні бацькоў, пайшоў у падсобку, перадыхнуць.

Госці нарэшце дарваліся да харчоў.

На парозе Саву прыпыніў кіраўнік аркестра:

— Не гони лошадей, стары. Дай ім пажраць.

Сава сеў ля міні-аргана і пачаў гартаць часопіс «Советский экран».

Першы ўправіўся з закускамі сват Таптыгін. Ён падышоў да Дыма.

— Слухай, начальнік, што ты, панімаеш, апетыт людзям надаў? Мы чатыры сотні заплацілі за цябе і ансамбль, дзве тысячы аддалі на харчы і гарэлку.

— Не разумею вас, таварыш, вяселле толькі пачынаецца... уся праграма наперадзе. Што вам ад мяне канкрэтна трэба?

— Табе грошы заплочаны. Што госці хочуць, тое і выконвай. Чаго аркестр лайдачыць? Завадзі танцы, давай халтуршчыкаў!

Сава клікнуў з падсобнай хлопцаў, тыя з неахвотаю падключылі свае электрагітары.

— Увага! Увага! — Сава, як фігурыст, праплыў па паркетнай падлозе.

Шагайте новою дорогою,
Любовь и счастье не тая.
И пусть всегда, как в этот час,
Мелодия любви звучит для вас.

Дарагія сябры, нашы маладыя танцуюць свой першы сямейны танец. Давайце станем у круг. Паглядзім на гэты танец маладых. Колькі ў ім паэзіі! Грацыі і натхнення!

Госці вельмі доўга выпаўзалі з-за стала, нарэшце ўтварылі круг і без цікавасці, санлівымі вачыма назіралі за маладымі. Потым, штурхаючы адзін аднаго, накіраваліся да сваіх месц. Зноў пачаліся тосты. Нехта зацягнуў песню «Касіў Ясь канюшыну», але яго груба прыпынілі. «Маўчы. Не было каманды вядучага».

— А зараз, мілыя таты і мамы, танец толькі для вас! — Сава адчуў, што ў сваёй талерцы. Яго яшчэ было каму слухаць.

Ён бадзёрым голасам працягваў па праграме:

— Среди нас есть ветераны войны, сталинские соколы и ворошиловские стрелки. Благодаря им мы живем в мире и счастье! Давайте вместе споем песню их молодости.

«Расцветали яблони и груши...» — зала хорам і з ахвотаю падхапіла знаёмыя словы песні. Не паспелі перадыхнуць ад песні, як нехта выгукнуў: «Горка-а-а-а!»

— Ды пачакайце вы! Дайце ім гарачую адбіўную з'есці, бо халодную яе не прыглынеш! — нехта не згаджаўся з прапановай. Ды было позна. Сотня галасоў падхапіла: «Горка-а-а!»

Малады, праз сілу ўсміхаючыся, крануў мокрыя губы маладой.

Госці лічылі.

— Раз, два, тры... пяць, дзесяць...— далічылі хорам да дваццаці трох.

— А зараз танцавальная праграма дзесяць мінут! — аб'явіў Сава.— Хачу папярэдзіць, што, калі будзем дзяліць каравай, грошы лепш падаваць у канвертах, падарункі ад грамадскіх устаноў уручаюцца маладым публічна. І так, танцы, танцы, танцы...

Сава ўспацеў. У зале зрабілася душна. Курцы не вытрымалі, пайшлі ў хол на перакур. З суседняй банкетнай залы, дзе праходзіў нясціплы банкет загадчыка сціплай булачнай, таксама выйшлі людзі на падпітку. Сава не паспеў адпачыць ля адчыненага акна і трох мінут. Жаночы крык прымусіў яго бегчы ў хол, дзе счапіліся госці яго вяселля і сябры загадчыка булачнай.

Разнялі. Сава на ўсялякі выпадак замкнуў металічныя дзверы, адгарадзіў сваю залу ад хола і дазволіў курыць у падсобцы.

Калі біліся на вяселлях, Сава заўсёды губляў пачуццё раўнавагі. Не мог доўга супакоіцца і завадатар сваркі, дзядзька маладой, сват Таптыгін.

— Што твае людзі іграюць твісты? Людзям танга трэба, полька. Давай сюды другіх музыкантаў,— патрабаваў ён.

— Супакойцеся. Усё будзе. Увага! Па просьбе працоўных гучыць танга кахання — гэтай крыніцы нашых перамог і дасягненняў. Бо без кахання не народзіцца дзіця, не можа быць выплаўлена высокалегіраваная сталь, па выплаўцы якой мы займаем першае месца ў свеце. Ну, чаго стаіцё? Ідзіце, танцуйце, вы ж прасілі. Будзе і полька. Фірма гарантуе.

Пільны ахоўнік дысцыпліны і парадку не здаваў пазіцыі.

— Людзі! Яны халтураць! Іграе магнітафон! Яны не іграюць! — Дзядзька папёр на музыкантаў.

Кіраўнік аркестра паспеў непрыкметна адключыць магнітафон. Саву трэба было бараніць «честь мундира».

— Адвядзіце таварыша! Ён перашкаджае ансамблю працаваць!

Бацькі маладой, угаворваючы сваяка, павялі яго да стала.

— Я люблю, каб ўсё было чэсна! Халтуршчыкі! — гразіў кулаком дзядзька.

Звычайна Сава ніколі сам не танцаваў на вяселлях, але на гэтым зрабіў для сябе выключэнне, запрасіў Томку.

— Цябе не пазнаць. Ты імпазантны, як Джо Дасэн, і абаяльны, як Чалентана,— весела гаварыла яна.— Гэта колькі мы не бачыліся?

— Ды гадоў пяць. Дзе ты зараз?

— Добрыя людзі памаглі. Вярнулі ў інстытут на родную кафедру лаборанткай і аспіранткай.

— Як ты высока ўзляцела! Замуж выйшла?

— Паспрабавала гэтага хлеба. Наелася ўдосталь. Дагэтуль адрыжка. Як ты?

— Пакуль тут. Часова. Гэтая работа не для мяне.

— А як я? Ці змянілася? Пастарэла?

— Ані грама. Па-ранейшаму дама, прыемная ва ўсіх адносінах.

— У-цю-цю... Толькі не цалуй мяне на вачах ва ўсіх. Усё ж я госця, а госць павінен паводзіць сябе прыстойна.

— Слухаюся і павінуюся.

— Гэта мне падабаецца.

— Я заўважыў, цябе тут ніхто сур'ёзна не апякае?

— Так. Я адна. Шэрая публіка не для мяне.

— Згодзен. Цяжкія людзі. Сумныя. Ім цяжка дагадзіць. Ты нікуды не спяшаешся пасля ўсяго? Можа, пройдземся? Ёсць што ўспомніць.

— А ты ўсё такі ж. Хітры-ы... Добра гэта ці дрэнна, не ведаю.

— Дык што?

— Я падумаю.

— Дзякую.— Сава элегантна пацалаваў ёй руку.

— Ну, зняў кадру? — спытаў кіраўнік музыкантаў.

— Гэта старая знаёмая.

— Нічога. З выгляду абяцаючая.

— Не без таго.

— Віншую,— сказаў яму музыкант-гітарыст.— Адпа-

чывай, табе спатрэбяцца сілы. Зараз вяселле коціцца як па масле.

Вяселле пераваліла свой экватар.

Саву заставалася правесці дзялёж каравая, замест якога купілі торт. Сёння гульні, загадкі для сватоў, складанне прымавак не падыходзіла: не тая публіка.

Дзядзька маладой усё парываўся кіраваць вяселлем:

— Начальнік, хадзем шукаць месца, дзе схаваем маладую. Хлопцы гатовы яе ўкрасці. Выкуп у жаніха прыгатаваны — тры бутэлькі «Маскоўскай». Хадзем, паказвай сваю адрыну. Такія грошы ўвалілі. Ці ж гэта вяселле? Я казаў, давайце ў вёсцы рабіць. Ніводнай песні ніхто да канца не ведае. Цьфу, і чаму тутака, у горадзе, вас вучаць, ядрона вош?

Дым маўчаў. Уважліва шукалі месца, і, акрамя... туалета, мала што і падыходзіла.

— Ну і смярдзіць жа тут... асабліва на кухні. Такія грошы ўзялі. Я тваю адбіўную яшчэ пражаваў, а ў жонкі пломба выпала. Прымусіць бы цябе з сваёй кішэні залаты зуб уставіць, забегаў бы, навёў бы тут парадак. Думаеце, па п'янцы і здохлага сабаку з'ядуць. А людзям жа хацелася... ах, рэстаран... Я свет бачыў... усё еў... Мой род не такі. Я вас праверу. Мой аднакласнік працуе памочнікам старшыні Савета Міністраў. Я вам прачасон устрою.

— Аб чым вы гаворыце?! Мяса натуральнае. Усё, што застаецца, калгас з Кунцаўшчыны забірае свінням. Дзе будзем хаваць маладую?

— «Дзе», «дзе»! Акрамя туалета, нічога няма?

— Можна пад лесвіцай... некаторыя хаваюць там. Калі на кухні смярдзіць.

— Ладна. Няхай пасядзіць у туалеце. Гаргарыну адбудавалі, а схаваць няма дзе... Я табе дам знак, а ты ў свой мацюгальнік крыкнеш: «Маладую ўкралі!» І каб усё талкова мне... Нашы грошы...

Аперацыю з прапажай нявесты правялі дасканала і хутка. Усе былі задаволены. Сава завяршыў цырымонію ўласнымі вершамі.

Желаем дорогой счастья
По жизни идти прямиком.
Невзгоды пускай и напасти
От вас отлетят кувырком.

Ансамбль «урубіў» польку, і госці не ўседзелі, хоць і былі добра прытомлены, пабеглі ў круг размяць ногі. Дрыгала, як каза, і п'яная Томка.

Сава пайшоў у бытоўку і пазваніў старому знаёмаму Феліксу Гаўрылку. Дым ведаў, што Фелікс размяняў кватэру і халасцякаваў. Сава сказаў, што едзе не адзін, што з ім дама.

«Што з табой рабіць? Гэта мужчынскія справы, я іх паважаю. Давай. Аддам табе тахту, а сам зачынюся на кухні»,— добразычліва адказаў Фелікс.

Падалі да стала салодкае. Тут сват не вытрымаў, патрабаваў аўдыенцыі з шэф-кухарам.

— У меню запісана — шакаладны крэм. Які гэта шакалад? Гэта блявоціна. Што вы з нас дурняў робіце! Дзе цукеркі «Мишка на Севере», «Аэрофлотские»? Што вы нам падсунулі? Гані грошы назад. Мы іх мазалямі зарабляем... Дайце мне дырэктара! Кампот з разынкамі? Дзе ён? Нясіце натуральныя цукеркі, усё! Пасаджу ў турму!

Дзядзька напалохаў. Падалі на стол некалькі кіло шакаладных цукерак. Сват хадзіў як бык. «Вось, маўляў, які мой род. Учэпісты!» Госці пілі на брудэршафт, нехта ўжо кляваў носам. Ансамбль іграў танга. Танцавалі, схіліўшы галовы адно аднаму на плечы, толькі маладыя людзі. Старэйшыя, не звяртаючы ўвагі на музыку, спявалі модны шлягер «Малиновки заслышав голосок».

Сава другі раз запрасіў на танец Томку. На яе напала ікота. Яму, цвярозаму, бачыць было гэта непрыемна.

— Хадзем у бытоўку. Віп'ем чыстай вады, і пройдзе.

— Ой... Піла... Ой, не магу.

— Трэба сціснуць рукі за спінаю і рабіць глыбокі ўздых. Я выйду першы, а ты праз мінуту ідзі ў мой бок.

Так і зрабілі. Яна паслухмяна выконвала яго рэкамендацыі. Намагалася зрабіць глыбокі ўздых, выставіла перад ім свае грудзі. Ён пацалаваў яе ў губы, ад якіх несла спіртным.

— У-у, бессаромнік! Гэта таксама сродак супраць ікоты? Бач, як рукой зняло. Ты мой чараўнік.

— Я заказаў таксі. Не спяшайся.

— Добра, мой доктар. І куды ж мы паедзем? Ты павязеш да сябе? А не баішся, калі я па дарозе ўцяку?

Ён ледзь стрымаўся. Памяць вярнула Дыма ў той далёкі вечар у рэстаране «Папараць-кветка».

Яму страшэнна захацелася прынізіць, зняважыць гэту прымітыўную пустую ляльку. «На гэты раз яна не ўцячэ. Хутчэй неба ўпадзе на зямлю, чым яна абвядзе мяне вакол пальца...»

Згаворлівы фатограф выменяў сабе кватэру ў новым

мікрараёне ля самага занядбанага часам і недаглядам лесу. У пакоі стаяла адна старая, з камісіёнкі, тахта, дзве табурэткі ды столік на кухні. Фелікс (ён адпусціў густую бараду) сустрэў начных гасцей вельмі гасцінна, пачаставаў натуральнай кавай. Томка клявала носам, і моцная кава на нейкі час падбадзёрыла яе.

— Прывёз мяне ў такую далячынь... Пабудзілі мілага добрага Фелікса... Бессаромнік. Завязі мяне дахаты ў аэрапорт.

— Багіня, мы правядзём рэшту ночы ля тваіх ног,— сказаў Сава, цалуючы ёй пальчыкі.

— Не хачу! Я стамілася наогул... напілася... Пакіньце мяне ў пакоі адну... я хачу на тахту, чур, маё месца... усё, я адключылася. Прашу вас роўненька на кухню, а я тут адна. Давайце, давайце.

— Добра, наша багіня. А хто пацалуе нас, пажадае спакойнай ночы?

— Адзін пацалунак, і без фокусаў.

Яна па чарзе пацалавала іх.

— Можа, я табе памагу распрануцца, укрыю нашу багіню коўдрай? — не супакойваўся Сава.

— Не-е... дай мне спакой. Хачу адпачываць. Усё раніцай, усё...

Застаўшыся адна, Томка пачала паспешна распранацца.

Сябры сядзелі на кухні і дапівалі каву.

— Ну што, стары, я пайду ...і пакіну дзверы адчыненыя,— сказаў Сава.

Фелікс падміргнуў і ўсміхнуўся.

Сава зняў з сябе ўсю апратку і голы пайшоў у пакой да Томкі.

— Зайчык мой ласкавы, гэта я — шэры воўк. Пусці ў церамок пагрэцца.

— Зайчык адказвае, што да Палтавы занята,— прымаючы яго гуллівы тон, адказала Томка.

— Але ж шэраму ваўку холадна, злітуйся з яго,— і ён, не дачакаўшыся адказу, падышоў да тахты.

— Здрасце. Мы ўжо і голенькія. Пryткія. Ну, няма ў чалавека сумлення. Прасіла ж, дай адпачыць. От, пакаранне. Мама родная, мне ж цяжка, прыдушыш... Пашкадуй, Сава...

— Мы не дамо заснуць зайчыку. Мы яго прыгалубім, прылашчым...

Раніцай яе вымуціла, некалькі разоў яна бегала ў туалет, прасіла падаць ёй на галаву мокры ручнік, піла мінераль-

ную ваду, стары кефір. Сава пасля ночы чакаў убачыць яе разгубленую, раззлаваную, аднак Томка была да ўсяго абыякавая і хадзіла голая туды-сюды, не саромеючыся, як па сваёй кватэры.

— Усё. Я не транспартабельная. Як хочаце, а я павінна выспацца. І кавы, наварыце кавы...

— Заставайся, што ж рабіць,— нерашуча сказаў Фелікс.

— Я еду, у мяне справы. Зачыні гэту дурніцу, няхай дрыхне. Я думаў — яна жанчына ў саку, а гэта — старая вешалка, якая прайшла агонь і ваду. Слухай, адкуль у цябе значок майстра спорту?

— Падарыў адзін чэмпіён,— адказаў Фелікс.

— Дзейнічае?

— Бывае, хуліганы абыходзяць бокам.

— Дай панасіць.

— Бяры. Пачакай, пойдзем разам. Я яе замкну. Акрамя клапоў і кіло кавы, у мяне красці няма чаго.

Сава нават і не развітаўся з Томкай. Гэта была першая ноч, якую ён правёў (з таго часу, як сышліся з Галінай) у чужым ложку. Трэба было прыдумаць для жонкі верагодную, арыгінальную легенду. Ён не спяшаўся дахаты. Зусім нядаўна яны купілі ў крэдыт каляровы тэлевізар «Гарызонт». Ён рашыў пераступіць парог хаты ў час перадачы «Ранішняя пошта». Было прадчуванне, што на першы раз яна яму даруе.

Звычайна, калі ён вяртаўся на таксі а другой гадзіне ночы, яна не спала, чакала яго. Прасіла, калі будзе п'яны, каб дахаты не ехаў. «Так і скажу, што быў у сцельку п'яны і не хацеў, памятаючы яе словы, паказвацца ў такім стане. Даруе».

Ішоў ад кінатэатра «Партызан» пешкі.

Ён любіў сонечна-марозную раніцу, можа, таму, што яна была заўсёды рэдкаю ў гэты самы цёмны месяц года.

Нізенькія аднапавярховыя хаткі, на яго думку, выглядаюць значна прыгажэй, як шэрыя аднатыпныя пяціпавярховыя каробкі.

Успылі на памяць размовы з Галінай.

«Пашкадуй ты сябе. Гэтымі начнымі застоллямі ты пасадзіш сэрца.— Галіна спачувала яму.— Шукай іншую работу». Ён абяцаў, што абмазгуе «перспектыву». А наогул думаў: «А ці трэба гэтая самая перспектыва?» Усё часцей і часцей у хвіліны апатыі прыходзіў да сумнага вываду, што яго наогул мала што хвалюе і мала што цікавіць:

ні ўлада, ні палітыка, ні прырода, ні эксплуатацыя ў свеце, ні голад, ні людзі, ні неба, ні зямля.

Ён не аналізаваў уласнае жыццё, не шукаў сэнсу ў чалавечым існаванні. Ён успрымаў толькі сябе ў свеце, а не свет у сабе. Можна было падумаць, што ён помсціць усім за свае няўдачы, але ж якраз няўдачнікам ён сябе не лічыў. У душы яго не было спачування да старасці, да зняважаных... да ўсяго ён ставіўся з іроніяй і нават цынізмам. Часам, седзячы ля грубкі, яму здавалася, што з калодзежа жыцця ён ужо ўсё вычарпаў, і там засталася ржавая мутная вада, здавалася, што ён жыве не адной, а дзесяццю жыццямі адначасова, згаджаючыся з усім і не пратэстуючы супраць элементарнай несправядлівасці. Прынцыпова не глядзеў тэлевізар, не слухаў радыё, не чытаў газет. Там наперабой даводзілі: «Даганяй, спаборнічай, абыходзь, аддай усе сілы на выкананне мудрых рашэнняў». Акрамя самога сябе, яму не было каго даганяць, з кім спаборнічаць. Калі раней ён у нечым і зайздросціў Марату Эдуардавічу, дык зараз інакш, як вузкалобай нікчэмнасцю, яго і не называў. Давялося Дыму зусім нядаўна слухаць выступленне Свістуна на пасяджэнні культработнікаў горада ў сувязі з абмеркаваннем мерапрыемстваў па выкананні «Асноўных напрамкаў эканамічнага і сацыяльнага развіцця СССР на 1981—1985 гады». Свістун выступаў як лектар ЦК КПБ.

Сава яго з цяжкасцю пазнаў: лысы, з акулярамі на вострым носе, прыгорблены не па гадах, Марат Эдуардавіч не ўзбег, а ўзляцеў на трыбуну. Бадзёра, добрай дыкцыяй ён прачытаў першыя сказы прамовы: «В окрыляющих планах одиннадцатой пятилетки ярко отражена забота партии о создании благоприятных материальных и духовных предпосылок для всестороннего гармонического развития советского человека — строителя нового общественного строя. Во всем этом большую роль должно сыграть искусство, являющееся верным помощником партии во всех ее начинаниях, ибо, как писал Леонид Ильич Брежнев в книге «Целина», «для деятелей литературы и искусства нет более интересной и вдохновенной задачи, чем отображать подвиги народа».

Як толькі Дым выслухаў гэтыя словы, ён спусціўся ў буфет Палаца прафсаюзаў піць чэшскае піва. У перапынку пасяджэння там сабралася вялікая чарга па зефір у шакаладзе. Да Савы падышоў Марат Эдуардавіч.

— Здароў, Дым! Не-не ды нашы шляхі і перакрыжоўваюцца. Як табе маё выступленне? Я ж прамову пакінуў у папцы, працаваў на імправізацыі,— Свістуну

хацелася, каб нехта ацаніў яго палымяныя словы.

— У духу часу, ідэйна, партыйна... Пераконвае. Верныя ўстаноўкі, выкладзены нестандартна, я б сказаў, нават жыва, літаратурнаю моваю, так што аўдыторыі ёсць што ўзяць на ўзбраенне ў справе выхавання мас у духу ідэалаў інтэрнацыяналізму і камунізму.

— Дзякую. Мяне заўсёды, дзе б я ні выступаў, цікавіць думка простага радавога слухача. Наш брат ідэолаг можа быць прыстрасны. А як стыль? Не стамляе? Тэмпрытм, параўнанні?

— Ты ведаеш, я праглынуў усё на адным дыханні. Не горш як гаворку па тэлевізары ў розных панарамах ды аглядах.

— Так, друг мой, вопыт прыходзіць з гадамі. Вытанчанасць стылю, сучаснасць думкі, філіграннасць формы. Пастаянная напружаная праца з першакрыніцамі. Я з алоўкам у руках прачытваю ад першай і да апошняй старонкі кнігі Леніна, Суслава, Брэжнева. Валодаю, трэба прызнаць, інфармацыяй, фактам і аналізам. Каласальная работа думкі, часам і сам не рады, што выбраў такую прафесію. Думаеш, чаго я злысеў? Уяві сабе, колькі разоў у самых розных аўдыторыях мушу я адказаць на адно і тое ж пытанне: чым адрозніваецца сацыялізм у Югаславіі ад сацыялізму ў СССР? А камень у правай нырцы думаеш сам па сабе ўзнік? Усё нервовая напруга, гіганцкая работа думкі. «Ці жыве Венгрыя ў доўг? Што такое інфляцыя? Праўда, што балгары жывуць за кошт турызму?» Ад адных пытанняў пра кітайскую рэвалюцыю ў мяне абвастрыўся гастрыт. А ад польскай «Салідарнасці» павялічваецца пякотка. Не магу есці смажанае кураня. Я ўжо не кажу пра каверзныя пытанні пра Албанію, Афганістан. Стамляюся, як раб. Часам так хочацца ў глыбінку, дзе яшчэ, кажуць, можна нюхнуць сена, травы, кветак... Пацягнула, прызнаюся, да літаратуры. У нас у аддзелах усе пішуць. І я здаў дзіцячую кніжку ў выдавецтва, не чакаў, га?

— Няўжо? Там, кажуць, чарга велізарная. Цяжка выдаць.

— Мы ж не лыкам шыты. Выйду на Міхалкова. Знайду падтрымку. Дырэктар там свой мужык. Аднакурснік па партшколе. Так што праз год купляй у магазінах. Дзеці ёсць?

— Ёсць.

— Жаніўся?

— Жаніўся.

— Правільна. Сям'я — аснова нашага грамадства. Базіс сацыялізму. Ты дзе зараз прыносіш карысць грамадству?

— Я? — Саву не хацелася называць сваю пасаду, і ён схлусіў:

— У адным Доме культуры працую мастацкім кіраўніком.

— У рабочым раёне?

— Так.

— Цудоўна. Рабочы клас — аснова партыі. Упусціш яго з-пад увагі — непрадказальныя вынікі. Што вытварае «Салідарнасць» у Польшчы? О-ге-ге... Я ж маю допуск да сакрэтных дакументаў. Дарэчы, у суботу ў дзевятнаццаць трыццаць я выступаю на тэлебачанні і закранаю некаторыя аспекты гэтай тэмы. У дзевятнаццаць трыццаць. Запішы. Па другой праграме,— паўтарыў Марат Эдуардавіч.

— Не забуду.

— Ну, а як жанчыны? Ты, наколькі я помню, быў спецыяліст па гэтай часці?

— Чаму быў?

— Ну, я падумаў, жаніўся. Гады бяруць сваё. Турботы і так далей, і так далей... Цяжар за плячыма не адчуваеш?

— Не. Я трымаюся дэвіза Эміля Заля: усіх жанчын палюбіць нельга, але трэба гэтага дамагацца.

— Арыгінальна! Французы знатакі па часці сексу. Быў у нас адзін з апарату ў Парыжы, бачыў там кінафільм «Эмануэль». Чароўна. Я каменцірую афарызмы, мудрыя словы, часам добра падмацаваць і свае чужым. Запішу.

— Век жыві, век вучыся.

— Думка правільная. А яшчэ лепш у наш імклівы час сумяшчаць гарманічна і працу, і вучобу. Да гэтага заклікае партыя. Трэба ўмець перабудоўвацца на хаду. Вось арганізавалі раённыя ўлады выстаўку птушак. Добрая высакародная справа, але ж не дадумалі. Я падказваю ідэю. Выстаўку птушак трэба прымеркаваць да 60-годдзя КПБ, і ўжо значна ўсё і важка. Маглі б наогул выцягнуць на Дзяржаўную прэмію, калі б гаспадар пеўчага дразда навучыў птушку па камандзе ў дзень адкрыцця праспяваць роўна шэсцьдзесят трэляў. Га? Спіць творчая думка, спіць фантазія.— Марат Эдуардавіч выпіў шклянку яблычнага соку, падхапіў пад паху сваю «вечную» карычневую папку і з горда ўзнятай галавой пераможцы пайшоў да выхаду.

Хацеў нешта сказаць наўздагон Сава, ды так і не сказаў...

Было пятнаццаць мінут пасля адзінаццаці, калі ён падышоў да зялёнага плота па вуліцы Чайкоўскага. У хаце «Ранішнюю пошту» ніхто не глядзеў. Галіна сядзела моўчкі ля стала, чакала яго. Ён заўважыў на падлозе вялікую поўную дарожную сумку. Галіна атрымала тэлеграму, у якой паведамлялася аб смерці мачахі. Сава з палёгкай уздыхнуў. Мачаху, згодна яе апошняй волі, пахавалі на каталіцкіх могілках у Ракаве. Толькі за гадзіну да пахавання прыехаў сын Васіль. Суткі ён дабіраўся з Цюмені ў Беларусь. На шчырую гаворку пасля сціплых памінак ён пайшоў сам. У прысутнасці Савы сказаў Галіне, што ўсе правы на гэты стары хутар (хату і гаспадарку) пакідае ёй, таму што з Сібіры вяртацца сюды не думае, што асеў там надоўга, ажаніўся, гадуе двух сыноў. «Навошта, каб яна гніла. Пад дачу купяць. Пакуль у цане, прадавай».

За ягоную думку ўчапіўся Сава, яго турбавала тое, што Галіна аднеслася да прапановы брата вельмі стрымана. Дым пачаў актыўна і наступальна ўгаворваць жонку:

— Чаго ты ўпарцішся? Усё па закону. Правы аддадзены табе. Высакародны ўчынак. Я яго паважаю. Ты трацілася, даглядала хворую, купляла на базары мёд, арэхі, вінаград, а дэфіцытныя ўколы? А падарункі ўрачам, медсёстрам? Будзь-будзь... Наш дом у Мінску — тая ж самая дача. Захочацца наведаць радзіму, прыедзе да нас... месца хопіць. Мне сябра абяцаў уступіць свае «Жыгулі» за пяць тысяч. Машына — гэта ж рай на колах. Сорак мінут і мы — на хутарах. Час ляціць. Хочацца паруліць на машыне, пакуль маладыя. А што пасля? Зрок не той, ціск высокі, сэрца цісне, рукі дрыжаць.

Галіна настойвала на сваім, даказваючы, што хата яшчэ можа спатрэбіцца брату. Усялякае бывае. Можа, калі падрастуць дзеці, яму ці ім захочацца на радзіму? Чалавека з гадамі цягне да свайго кута.

— Дык што,— узарваўся ён,— мне ты раіш гібець і чакаць, пакуль яго пацягне на радзіму? Не думаў, што ты такая цвердалобая, камплексуеш, як Тамашэвіч. Дабро павінна быць рацыянальным. Цябе ж самую жыццё не шкадавала... перажыла, не дай бог, усяго... Што мы будзем адмаўляць сабе ў асалодзе. Падумай... І вош і жаба маюць машыны, няўжо табе не карціць гэта?

— Ён сказаў, што хата мая... але ж пісьмовага пацвярджэння няма. Я ніколі і прасіць аб гэтым не буду. Трэба табе машына... калі ласка. Пастаў на нашым гародзе цяпліцу... гуркамі, цюльпанамі, ружамі заробім на «Жыгулі».

— Не гандляр я. Не мая справа калупацца ў зямлі. Не звыклы. Сябра не будзе чакаць, пакуль за два-тры гады я наскрабу за цюльпаны грошы.

— Як хочаш. Прадаваць без брата я не буду.— Ён ведаў упартасць жонкі і болей не вяртаўся да гэтай тэмы.

І ўсё ж у тайне ад яе напісаў ліст у Цюмень Васілю, у якім скардзіўся, што ў Галіны частыя галаўныя болі, і асцярожна папрасіў Васіля пераслаць пісьмовае пацвярджэнне наконт Галініных праў на хату і маёмасць. Васіль надзіва хутка выканаў просьбу Савы. Галіна, атрымаўшы братаў ліст, два дні з мужам не размаўляла.

— Цяпер усё па закону. Ну добра, спішы ўсё на мяне... Чэрствасць, жорсткасць, эгаізм, некаму на зямлі і гэта трэба насіць. Для цябе ж усё. Шкада ж... танная машына... яны з году ў год даражэюць. Давай загонім хутар. Я і пакупніка знайшоў. Адзін свяшчэннік.

— Не. Пасля гэтага пісьма я не прадам. Вось табе тысяча рублёў. Купі сабе матацыкл.

— Ты мне смерці жадаеш? Па статыстыцы найбольш гінуць матацыклісты. І потым, гэта зневажае. Усе с... музыканты маюць машыны, а я на матацыкле.

— Да лета я хутар прадаваць не буду. Ён прыедзе ў адпачынак... я адчуваю... у мяне інтуіцыя. Тады ўсё вырашым.

— Павер мне, некалі твая ўпартасць цябе і загубіць.

Праз паўгода яна магла папракнуць Саву, бо праўда была на яе баку, але ж не зрабіла гэтага. У чэрвені прыехаў Васіль. У яго выявілі адкрыты працэс туберкулёзу лёгкіх. Ён і без таго не вылучаўся моцным здароўем з дзяцінства. Сібір, відаць, яго даканала. Ужо з вясны ён жыў адзін. Жонка пакінула яго.

Галіна купіла кіло натуральнага пчалінага мёду, сала, кракаўскай каўбасы, грэцкіх арэхаў, лімонаў, і яны паехалі наведаць хворага брата. Маўклівы Васіль больш слухаў, чым расказваў. Незразумелая варожасць да жонкі, якую насіў Сава ў сэрцы, памякчэла. Галіна пакінула брату ключ ад хаты.

— Ты не прадала хутар? — Было бачна, што ён надта здзівіўся.

— Не. Гэта ж хата тваёй маці. Твая дзедаўшчына. Табе на лячэнне грошы трэба.

— У нас дармавое лячэнне. Дзякую. Я і сапраўды думаў, дзе жыць? Марыў адрадзіць дзедаў пчольнік. Не думаў, што ты... што так усё... І даруй... Я цябе недалюбліваў. Лічыў чужой. Я бацьку твайго ненавідзеў. Паехаў у Сібір ад

злосці на вас. Калі на Урале ў тэхнікуме вучыўся, памятаю, твой бацька мне кожны месяц пятнаццаць рублёў дасылаў. Я наўмысна нават прывітанне ў пісьмах яму не перадаваў. Ішлі гады. Многае забывалася. Калі ж загінуў твой бацька, я адчуў перад ім віну... бо ў жыцці ніколі слова падзякі так яму і не сказаў.

— А што дактары гавораць? Як твой працэс? — Галіне хацелася змяніць тэму гаворкі.

— Адкрыты працэс. Двухбаковы туберкулёз і палачкі выдзяляю. Трымайцеся далей ад мяне. Прапануюць аперацыю. Неяк усё хутка праявілася. Дзеці у мяне амаль дарослыя. Адзін у вучылішчы. Пражыву. Яна ад аліментаў адмовілася. Быў у яе кавалер... я проста не ведаў. Вось... старэйшы сын прыслаў ліст. Баюся кровацячэння. Здаецца, не вытрымаю, памру. Кровахарканне здараецца... а вось кровацячэння баюся. Так на маіх вачах двое сканалі. Жахлівая смерць.

— Дай божа, усё і наладзіцца, можа, уратуешся. Вось табе мой тэлефон. Табе трэба добрыя харчы, не адказвай сабе ў ежы. Я буду наведваць.

— Усё з'ядай. Потым мы прывязём яшчэ,— сказаў упершыню за ўсю сустрэчу Сава.

— Дзякую. Асабліва табе, сястра. За ўсё.

Слова «сястра» яна пачула ад яго ўпершыню.

Праз тыдзень пасля сумнага вяртання Васіля ў Беларусь разбіўся насмерць на Віцебскай шашы сябра Савы. Гэтая жахлівая вестка астудзіла жаданне Савы набыць машыну. Ён проста напалохаўся. Як ніколі ўздзейнічала на яго душу пахаванне аднагодка. Напала атупенне, дэпрэсія... ён глянуў у люстэрка і не пазнаў сябе: нават шчокі абвіслі. Сава апантана пачаў прыслухоўвацца да свайго цела, да болю ў жываце, да шуму ў галаве, да непрыемнага паколвання ў сэрца. Праверыў кіслотнасць у страўніку. Амаль праз дзень мераў крывяны ціск. Купіў два зборных веласіпеды (навінку дастала Галіна), і разам з Сярожам штодня круцілі педалі ў Севастопальскім скверыку.

«Формула жыцця простая: больш пражытых дзён пры меншай асалодзе і менш пражытых дзён пры большай асалодзе»,— успомніў ён любімыя словы брыгадзіра Чакатоўскага. Цікава, колькі ён пражыў? Трэба будзе паехаць на Паўночныя могілкі ды знайсці яго магілу.

Дым з вялікай цяжкасцю купіў корань жэньшэня і паспрабаваў яго піць. Калегі па рабоце дзівіліся, як змя-

ніўся лад яго жыцця. Адзін мужык прывёз з вёскі казіныя шарыкі і прапанаваў Саву як мумiё, якое ратуе ад усіх хвароб, нават ад рака. Сава з ахвотай купіў у таварыша цёмныя шарыкі за дваццаць пяць рублёў, якія музыканты ў той самы дзень і прапілі за Савава здароўе. Дым стаў набожным, пачаў верыць розным чуткам. А тут яшчэ з усіх бакоў непрыемныя навіны ўражвалі і без таго знерваваную душу. У Лявона ад алкаголю ўтварыўся інсульт. Акрыяў ён, праўда, хуценька. Пакідаў сталіцу, ехаў да бацькоў у Брэст.

«Бывай, Сава. Дваццаць гадоў я змагаўся з горадам і не адужаў яго. Дваццаць гадоў я быў прапісаны ў інтэрнаце і так і не атрымаў кватэру. Гэта рэкорд для кнігі Гінеса. Ты выжыў... А я адчуваю ў целе старасць... не магу болей. Так сумна развітвацца з маладосцю, але законы жыцця не пераробіш. Дзякуй богу, што пасля інсульту памяць адрадзілася. І што заўважаю... усё, што ўспамінаецца, чамусьці сумнае... Няўжо, думаю, маё жыццё было суцэльным сумам? Ну, бывай. Будзеш у Брэсце, заходзь».

А тут яшчэ адна навіна. Тамашэвіча паклалі ў псіхіятрычную бальніцу. Прычын захворвання, як і самога дыягназу, ніхто не ведаў. У «Мутным воку» ўпарта сцвярджалі, што яму хваробу інспірыравалі, маўляў, алкаголік з белай гарачкай, і па гэтай прычыне ізалявалі як палітычнага дысідэнта. Нехта казаў, што пра яго пакуты зноў перадавала радыёстанцыя «Свабодная Еўропа».

Галіна вельмі хваравіта ўспрыняла навіну пра Тамашэвіча і прапанавала Саву наведаць у Навінках іх былога аднакласніка.

— Ты што, ачумела? Дзе ты жывеш? Я не хачу, каб мне прыпісалі нядобранадзейныя цёмныя справы. Сахарава вывезлі. Акадэміка... Лаўрэата. Ды цябе выпруць з работы адным махам. Усе ж напалоханы,— ён горача яе адгаворваў.— І потым... у мяне стрэс, ступар... я чытаў, ёсць такі дыягназ. У Канадзе вывучаюць. Мне цяжка будзе глядзець на гэтых людзей, не толькі размаўляць.

— Цябе даканае гэтая работа. Ты ж не спіш начамі. Вазьмі пуцёўку у санаторый, у дом адпачынку. Не магу на цябе такога глядзець. Ныеш, ныеш... сум у вачах, незадаволенасць.

— Так, у тваіх словах ёсць рацыя. Трэба кінуць гэту суматошную работу. Можа, сапраўды паехаць у дом адпачынку. Калі іх будуюць, значыць, людзям патрэбна час ад часу і адпачыць. Мне абяцалі з восені ўзяць дыск-жакеем

у новую дыскатэку «Нептун». Цяпер паўсюдна на іх мода.

— Зноў да апоўначы?

— Не. Дзіцячы сад. Ад сямі да адзінаццаці. Я буду сам сабе гаспадар. Надакучыла, не магу пасля трыццаці падпарадкоўвацца... асабліва дурням, а яшчэ горш бабам.

— Не ўсе бабы дурныя. Ёсць жа і касманаўты, і выдатныя ўрачы, вучоныя.

— Гэта выключэнні. Большасць тупыя. Я гэтым не хачу пакрыўдзіць цябе... Цябе яшчэ бог мілаваў.

— Ты незадаволены ўсім выключна ад свайго мінорнага настрою.

— Так. У мяне няма апоры. Табе знаёмы мінуты расчаравання ў жыцці? Калі даводзіцца сябе падбадзёрваць, прымушаць любіць жыццё.

— Былі. Але ж я не адчайвалася. На цябе паглядзіш, дык боязна. Такое пачуццё, што ты гатовы налажыць на сябе рукі.

— Не перабольшвай так. Я не здольны на глупства. У чым ты шукала апору ў мінуты свайго адчаю?

— Па-рознаму. У каханні мужа, адданасці яго, у сыне, у сябрах... нават і ў тваім учынку, дабрыні.

— Шмат слоў. А канкрэтна, скажы адным словам, у чым?

— Не ведаю. Відаць, усё ж у каханні.

— А, старое як свет. Я не веру, што ў сённяшнім яго разуменні і вульгарным праяўленні яно здольна ачысціць і аднавіць душу, пазбавіць яе ад жаху перад уласным бяссіллем у гэтым свеце, які немагчыма зразумець і асэнсаваць.

— А ты не хочаш дапусціць, што ў цябе «пераходны» ўзрост, што ты развітваешся з маладосцю і пераходзіш да сярэдняга ўзросту?

— Магчыма, магчыма. Проста я жыў і не думаў, не хацеў ведаць, што і я смяротны. Я не цярплю, калі мяне папракаюць: што ты зрабіў для людзей, для радзімы? Даруй, але мне глыбока начхаць на ўсе гэтыя заклікі. Маё жыццё адно, і я хачу распараджацца ім па сваёй волі.

— Дык у цябе ж яго ніхто і не забірае. Цябе ж сілаю не возьмуць у Афганістан, Афрыку, у Сірыю. Жыві ў сваю асалоду. Калі ужо і мы з Сярожам перашкаджаем табе, калі адчуваеш сябе заложнікам, пакінь нас... Што ж рабіць, пажыві зноў адзін.

Ён узяў яе за руку, пяшчотна пагладзіў.

— Я не гэта меў на ўвазе. Паталогіі ў раду няма. Вар'я-

таў не было. Мне добра побач з табой, мажліва, калі б я быў адзін, я б яшчэ горш перажываў гэты крызіс духу. Твая цярпімасць, мудрасць і спакой мяне ўмацоўваюць. Лявон мяне калісь папярэджваў, што я не народжаны для сямейнага жыцця. Я табе прыношу гора і непрыемнасці, нават сваёй іпахондрыяй. Даруй.

Галіна была ўжо знаёма з такімі яго пераходамі да сентыментальнасці, самавыкрыцця. Часам ёй здавалася, што яму і самому прыемна выстаўляць сябе ахвярай.

— А калі гэта рак? Але за што? Я нікому не здрадзіў, не адчуваю віны перад людзьмі... Калі і грашыў, дык не прыносіў болю іншаму...

— І будзь сабою. А калі гэта прасвятленне? Чаму ты яму не рады? Ты задумаўся над сваім жыццём, ці ж гэта дрэнна? Не псіхоз, не неўроз, не стрэс, а элементарны роздум, сумненні, разважанні. Не прыдумляй сабе нічога, ты застанешся такім, які ёсць.

— І ты мяне такога прымаеш?

— А што ж рабіць. Я змірылася.

— І ты б мне даравала, скажам, калі б я пайшоў да другой?

— Даравала б... але назад не ўзяла б... А што, у цябе ёсць да каго ісці? Ты сур'ёзна закахаўся? Мажліва, твая дэпрэсія ад кахання без узаемнасці? Ты гэта хочаш мне сказаць, так?

— Не смяшы мяне. Ці ж можна паўтарыць усё тое, што было паміж намі на хутары?

— Паўтарыць нельга, я згодна, але паўтарыцца можа. Ад турмы і кахання не даюць зароку.

— Гэта напісана не для мяне.

— Ты такі самаўпэўнены?

— Пакуль мая самаўпэўненасць адзінае, што наталяе мой аптымізм.

— Тады я памыляюся. Ты моцны духам чалавек і ўсё будзе добра.

Дым хацеў ёй сказаць, што яму не хапае надзейнага сябра, хаця б Лявона альбо Кузьмы, бо няма з кім развеяць сумненні душы. Але не сказаў. Трэба было нешта рабіць. Найперш сэрца падказвала кінуць работу. Змяніць абставіны. Выбрацца прэч з абрыдлага горада.

Лёс звёў іх разам у дзівосную пару мая ў доме адпачынку тэатральных работнікаў «Астрашыцкі гарадок» — яго,

дыск-жакея папулярнага сярод моладзі кафэ «Нептун», і яе — бухгалтарку мастацкіх майстэрняў Марыю Жураўлёву, тую самую, якую ён даўным-даўно бачыў разам з Маратам у Доме кіно.

Было ёй трыццаць тры гады, мела яна дваіх дзяцей: дзесяцігадовага сына і дванаццацігадовую дачку. Саву ішоў трыццаць сёмы год.

Куратар і мецэнат дыска-клуба «Нептун», буйны завод электравылічальнай тэхнікі не паскупіўся. Сава атрымаў увесь набор неабходнай яму гукавой і светлавой апаратуры: дыяпраектары, кінаўстаноўку. Па яго заяўцы ў цэху зрабілі апарат, які імітаваў марскія хвалі. Сцэнарый, як і ў Доме ўрачыстасцяў, Сава пісаў сам, набіў руку. Найбольшым поспехам карысталіся сцэнарыі «Чалавек-час», «Дружба, спорт, маладосць» і «Планета Акіян». Па законах асіметрыі і сіметрыі мяняліся слайды, на поліэкране чырвоны падсвет зменьваўся на сіне-зялёны, бегла ружовая хваля, за ёй блакітна-жоўтая, потым зноў чырвоная — і ў гэтай феерыі гучаў урачысты голас дыск-жакея Савы:

«Борцы за мир! Пусть демон истребленья голодной смертью сдохнет взаперти. Все, кто за ним таится черной тенью, должны, как он, конец себе найти».

Асабліва Сава любіў нагадваць мудрагелістыя назвы біт-груп. Выгукваў іх у мікрафон наўмысна з англійскім акцэнтам. «Группа «Скай», группа «Рожденные землей», ансамбль «Зодиак», группа «Чикаго», группа «Фемили»: Роджер Чемпен — вокал, Джим Кинг — духовые инструменты».

Кафэ рабілася папулярным сярод студэнцкай моладзі, і разам з гэтым набывала папулярнасць і фігура дыск-жакея Дыма. Прыходзілі да яго на праверкі (і неаднойчы) адказныя камсамольскія работнікі, работнікі гаркома партыі, хвалілі праграму, адзначаючы злабадзённасць і ўменне вопытнага дыск-жакея «развлекая, просвещать».

Паспяховую работу Дыма адзначылі граматамі на рэспубліканскіх і гарадскіх конкурсах вядучых дыскатэк, узнагародзілі каштоўным падарункам: шкатулкай з дрэва і саломкі коштам дзесяць рублёў. Яго ставілі ў прыклад іншым дыск-жакеям, якія раслі, як шампіньёны.

У другой частцы праграмы (за гадзіну да закрыцця) Сава дазваляў сабе і лірычнае адступленне: расказваў новыя анекдоты, спяваў фрывольныя прыпеўкі альбо ўключаў

плёнку з падпольнымі запісамі адэскіх вакалістаў. Гэтая частка праграмы якраз і была прыманкай, бударажыла ўсіх і заманьвала новых наведвальнікаў у «Нептун». Хадзілі паглядзець ды паслухаць Саву. І ён апраўдваў надзеі, не падводзіў, знаходзіў нешта новае, паспяваў выпісваць анекдоты, гумар з «Вожыка», «Перца», «Крокодила», «Шпілек»: «Людзі хочуць бамона. Будзе ім бамон, без стрыптызу, але будзе».

Ён не заўважаў, а можа, і не хацеў бачыць розніцу ва ўзросце паміж наведвальнікамі і сабой. Упэўненасць паступова вярталася да яго. Сум сядзеў толькі ў вачах. Вечары паляцелі неўпрыкмет, лёгка, яго больш палохала п'янства і шэрая аднастайнасць вяселляў. Стаў ён асцярожна ставіцца і да жанчын. Яго больш цікавіў сам працэс спакушэння, бо ў пачуццё ён не верыў.

Тлуміў галаву студэнтцы чацвёртага курса політэхнічнага інстытута Святлане. З якой асалодай ён пазіраў, як яна зменьваецца пад уздзеяннем яго ўвагі. Паралельна ўлагоджваў і салістку рытм-групы Леру, з якой, можа, і закруціў бы раман, каб не яе непрыемны, рыпучы смех без дай прычыны. Яна яму нагадвала велікоднае яечка, якое пакрылі лакам розных колераў. Маладзенькія дзяўчаты сядзелі за столікамі ў кафэ з адным жаданнем — падабацца ўсім адразу.

Саву падабалася роля пастара юных душ, для якіх ён быў кумірам. Як знакі-маскі, яны блукалі вакол яго, і ён мог у любы час расшыфраваць іх жаданні. Жыццё паварочвалася да яго светлым бокам. Ён ахвотна хадзіў з Галінаю на адведкі, улазіны, проста на свята да яе знаёмых і там не сумаваў. Сваёй дасціпнасцю ён падабаўся ўсім яе сяброўкам. І гэта было прыемна Галіне, ён заўважаў. Яна захацела купіць сабе норкавую шапку і аўстрыйскае паліто. Купілі, нягледзячы на вялікія растраты. Ён бачыў, як яна радавалася пакупкам, і радаваўся сам, на яе гледзячы. Яна (можа, вярталася каханне) пачала тонка кантраляваць яго вольны час, падазраючы ў здрадзе. У ёй прачнулася рэўнасць. Гэта і радавала яго, і трывожыла. А неяк яна спытала:

— Сава, чаму ты ніколі не сказаў мне, што хочаш мець ад мяне дзіця?

Ён, хаваючы прыкметную разгубленасць, адказаў:

— Я... пакуль не думаў, разумеючы, як было табе цяжка з Сярожкам. Я ведаю... што такое кесарава сячэнне. Неяк пра другое думалася... мы ж яшчэ маладыя. Хочацца па-

жыць для сябе. Малое дзіця зноў звяжа і цябе і мяне па руках і нагах.

— Ты любіш мяне?

— Нечаканае пытанне.

— Калі не жадаеш ад мяне мець дзіця, выходзіць, не кахаеш?

— Ну, гэта бабуліны забабоны. Усё ж не так адназначна. Я ўдзячны табе за гэтае шчырае пытанне, якое для мяне адкрыла вочы на многае. Зразумей, я мушу пераадолець комплекс прымака, якога могуць ці маглі ў любую мінуту выставіць за дзверы. Табе і мне патрэбны быў час, каб выявіць ступень неабходнасці адно аднаму. Гэтым пытаннем ты развеяла многія мае сумненні, я буду глядзець на жыццё, на нашы адносіны іншымі вачыма. Толькі давай дамовімся: не трэба прыспешваць падзеі. Будзем прыслухоўвацца не толькі да пачуццяў, але помніць пра логіку, розум, разлік. Так-так... у наш час гэта не апошняе. Я, як памятаеш, і не спяшаўся прапісвацца сюды... будзем спадзявацца, што жыццё само накіруе нашы планы і жаданні.

Яна, ахопленая трывогай, маўчала.

— Добра. Даруй. Больш такога ты ад мяне не пачуеш.

— Галіна, ці ж у нашых адносінах нешта змянілася? Я такі ж, як і раней.

— Так. Такі ж. Сямейнае жыццё вымушае адказнасці, а лёгкая весялосць — не.

— Мы шчаслівыя, мы будзем шчаслівыя... Я хачу трымаць тваю руку ў сваёй руцэ, і мне гэтага дастаткова. Летам паедзем у Алушту. Разам. Усе. У жніўні. Раяць ехаць туды толькі ў жніўні. На тры тыдні хопіць, думаю, семсот рублёў. Падавай заяву ў адпачынак на жнівень. Ці ў вас таксама пракляты графік — той, хто ўкалвае, адпачывае ў зімовы перыяд, восенню, той, хто кіруе,— улетку?

— Па графіку.

— Ганьба. Першая знявага чалавека... і не трэба ківаць на Захад. Кажуць, што мора супакойвае. І Сярожку з яго вечнымі прастудамі не пашкодзіць умацаваць здароўе. Горад стамляе мітуснёй. Мне часам і самому здаецца, што варта мне ў дыскатэцы яшчэ дваццаць разоў паўтарыць адно і тое ж — і я чакануся... Мне балюча і на цябе глядзець. Сяброўкі штогод лятаюць у Сочы, ходзяць загарэлыя, упэўненыя ў сабе, дагледжаныя, а мы глынаем сліну ад зайздрасці. Пішы заяву на жнівень. Не век — ішачыць,— Сава дастаў з халадзільніка бутэльку сухога віна.

Пасля майскіх свят, якія прайшлі да атупення сумна —

на хутар не паехалі (быў дождж), а сядзелі да дурнаты перад тэлевізарам, паабедалі і дзве гадзіны спалі, а недзе пасля чацвёртай гадзіны пайшлі на дзіцячую чыгунку, і дарма: яна не працавала, не паспелі падрыхтаваць, прыпаўзлі стомленыя дахаты, зноў уставіліся ў тэлевізар і прасядзелі да глыбокага вечара.

Праз тры дні дыск-жакея Дыма супраць яго волі выправадзілі ў чарговы адпачынак. У дыскатэку наляцела рэвізія (відаць, быў сігнал), ён ведаў, што пісалі скаргі ананімныя і на яго вольныя паводзіны перад мікрафонам... Ці нехта баяўся рэвізіі, ці выпадкова, але ж у кафэ ўзнік пажар. Рэвізораў-кантралёраў змянілі следчыя органы. Мусіў даваць паказанні і Сава. Ён быў пабочны чалавек, хоць і чуў пра махінацыі на кухні, справу з наркотыкамі, але ж казаў не ўсё, што ведаў. Званілі, прасілі заступіцца, папярэджвалі, нават пагражалі. Усё гэта было непрыемна. Ён нерваваўся. Нехта падказаў паехаць у дом адпачынку тэатральных работнікаў «Астрашыцкі гарадок»: «Ёсць пуцёўкі... там салідная публіка... Рэдкая прыгажосць прыроды. Возера. Даюць два пакойчыкі ў фінскім доміку. Уваход асобны. Чым не рай. Як дача ў Левадзіі». Пачуўшы ўсё гэта, Дым згадзіўся. Яму хацелася збегчы з горада хоць куды. Паехаў з лёгкай душой, таму што на яго ад'езд Галіна не крывілася.

Першага чэрвеня, калі ён ужо трошачкі асвоіўся, заехала вялікая група адпачываючых з дзецьмі. Гэта не дапякала яго, як, напрыклад, суседа па століку, акцёра-пенсіянера Льва Безмагільнага, які падзяляў адпачываючых на людзей са званнем і без яго.

Сава браў надзіманы матрац, ішоў да возера і там у адзіноце рашаў шахматныя эцюды ды задачы. Газеты чытаў толькі перад сном. Шукаў, хоць гэта было яму цяжкавата, натхненне і сілу ў прыроды. Жыў адчужана, хацеў пабыць вольны і бестурботны, як матыль. Дзіўна, упершыню ён заўважыў, што кожная гадзіна дня мае сваю непаўторную фарбу. Ён уяўляў сябе гусаком, якога падвесілі ў прасціне над зямлёй, паставілі перад ім ежу і ваду і шчодра кармілі. Ці прададуць яго, ці заб'юць, гусаку ўсё адно — пі ды еш уволю. У сябры набіваўся хіба што Леў Марцінавіч Безмагільны, які другі тыдзень не пераставаў здзіўляцца: «Каму прадаюць пуцёўкі, каму? Адны чужыя, пабочныя людзі: дыябетчыкі, язвеннікі, туберкулёзнікі, далёкія ад вышынь мастацтва. Няма з кім завесці дыспут. З кім пагаварыць пра Бергмана, Эдуарда дэ Філіпа, а... вы не ве-

даеце, гэта праўда, што Таркоўскі паехаў у Італію?»

Сава вельмі хутка збыў гаварлівага акцёра экстравагантнай салістцы аперэты, якая вельмі любіла ўсякія тэатральныя кур'ёзы, анекдоты. Леў Марцінавіч не першы раз адпачываў тут.

Тры куміры яго маладосці, перад якімі ён схіляў галаву, наталялі яго фантазію і дыктавалі стыль яго паводзін. Гэтымі славутымі зоркамі былі Радж Капур, Габен і Хемінгуэй. У гэты сезон Леў Марцінавіч «працаваў» пад Хемінгуэя. Меў сівенькую бародку, насіў капялюш і курыў люльку.

Дым цвёрда вырашыў выпіць чашу адзіноты да канца, пакаштаваць яе, як кажуць, на зуб. Столькі пра гэтую самую адзіноту ён чытаў у замежных раманах (праўда, ніводнага да канца так і не адолеў), столькі пра яе гаварылі ў Доме кіно маскоўскія крытыкі. І вось цяпер была магчымасць самому асэнсаваць: ці такое страшнае гэта зло — адзінота?

Самай маладой сярод адпачываючых была Марыя Жураўлёва, ён гэта адзначыў не без увагі, але спакойна. Яна сядзела праз тры столікі тварам да яго, і ён без асаблівай увагі сачыў за яе сям'ёю: дзяўчынкай з вялікім чырвоным бантам і хлопчыкам у акулярах. Праз два дні яна памянялася месцамі з блізарукім сынам і цяпер сядзела да Савы спіною. Ён толькі хмыкнуў. Незадаволенасці не было.

Спрабаваў падбіць, падбухторыць Саву да амурных спраў Леў Марцінавіч.

— Здуру я на гэты раз прыехаў сюды. Дзесяць дзён... чорную ікру не даюць. Тут, канечне, трошкі лепш, як у стойле для коней... у сэнсе харчавання... Але публіка... гляджу на ўсіх... павесяліцца хочацца. Адзіны суб'ект сярод гэтай брацііі, якая прыехала сюды спаць і есці, гэтая мілатварая дама з дзецьмі. У ёй ёсць шарм... ты прыгледзься ўважліва. І дзейнічай, дзейнічай... памятай: адзін пражыты без кахання дзень — загублены. Спяшайся. З надыходам імпатэнцыі цікавасць да жыцця губляецца на дзевяноста працэнтаў. Павер, на жаль, майму горкаму вопыту. Канечне, каб дзяржава турбавалася аб пенсіянерах, як у Аўстраліі, давалі чорную ікру не толькі па святах, а штодня... я б выступіў табе канкурэнтам... Дзейнічай, не марнуй дарма час. Заўтра на Сонцы ўспышка... На баб гэта дзейнічае. Помні, усё ў першы і апошні раз.

Дзейнічаць Саву не хацелася, ён і з'ехаў прэч з горада, каб наогул не дзейнічаць і не думаць, а існаваць у самазабыцці. Іх імклівыя сустрэчы, якія здараліся выпадкова раз,

два на дзень ля возера, у сасонніку, ён адносіў на кошт яго вялікасці выпадку. Звярнууся да яе чыста механічна аднойчы, калі яна сядзела на лаўцы ля свайго фінскага доміка і нешта чытала.

— Даруйце, вы не актрыса? Гляджу на вас... не магу ўспомніць, дзе я мог вас бачыць?

— Не. Не актрыса,— з ледзь прыкметнай усмешкай адказала яна.

— Але працуеце ў сферы мастацтва?

Яна здзівілася яго нечаканай настойлівасці.

— І там, і не.

— Тады дазвольце і трэцяе пытанне? Можа, тут пашанцуе. Вы чытаеце «Немного солнца в холодной воде»?

— Не, «Тени исчезают в полдень».

— Даруйце. Не мой дзень. Я дрэнна пераношу ўспышкі на Сонцы.

На гэта яна яму нічога не адказала.

Дзіўна, але пасля гэтай кароткай гаворкі ў яго знік настрой на ўвесь дзень. Усю наступную раніцу ён каменем праляжаў ля возера. Бачыў, як яна шпацыравала разам з дзецьмі і сівой мажнай жанчынай. Яны не дайшлі да яго метраў пяцьдзесят, звярнулі ў сасновы лясок. «Што ж ёй не падабаецца ўва мне? Чаму абыходзіць? Акрамя дзяжурнага «добрай раніцы», я ж не чапляюся да яе, не даю падстаў нешта думаць. Дзіўна».

Сава без цікавасці перастаўляў на шахматнай дошцы фігуры. Да яго падышлі вальяжны Леў Марцінавіч з люлькай і сімпатычная актрыса аперэты ў мексіканскім самбрэра.

— Як вадзічка, Сава Паўлавіч? Дама хоча выкупацца, я катэгарычна адгаворваю.

— Плюс васемнаццаць. Для нашай прыроды — гэта Чорнае мора.

— Няўжо? Я лічыў, не больш дзесяці,— кісла адказаў Безмагільны.

— Вось вы і засталіся ў пройгрышы,— зашчабятала пісклявым голасам артыстка аперэты.— Я казала, што будзе градусаў пятнаццаць.— І яна са штучным какецтвам зняла сукенку, перадала яе на захаванне Безмагільнаму і грацыёзна пайшла ў ваду, віляючы задам, на манер парыжскіх манекеншчыц. Праплыла метраў дваццаць ад берага і раптам заспявала знаёмую ўсім арыю з папулярнай венгерскай аперэты.

— Сава, мой юны меланхолік, у наступны раз адказвай мне, халерыку з інтэлектуальным ухілам, што вада толькі

дзесяць. Яна рызыкоўна далёка заплывае ад берага. Пляж пусты. Я нервуюся, а раптам пачне тануць? Я ж плаваць не ўмею. Ты кампране, Сава? Учора гаворыць: як вы глядзіце на начное купанне? Я плюарыст. Да нудызму адношуся лаяльна. Але ж лезці ў ваду ў цемень... Не паддаецца ўгаворам. Паказуха — гэта хвароба ўсёй аперэты. Мы драматычныя акцёры, пакаленне Станіслаўскага, выхаваны на Шэкспіру і Астроўскім. Яна мне давай спяваць: ах, начное купанне, колькі ў ім паэзіі, дзівосаў, рамантыкі, шакіруючай асалоды... Не мне пра гэта гаварыць. Я быў з адной трэнершай, царства ёй нябеснае, у басейне... не аддалася, пакуль не прымусіла пераплыць басейн туды-сюды. Страхавала, праўда, але ж не прывядзі божа такое паўтарыць. Мая экзальтаваная прастушка, відаць, перажывае часы клімаксу, псіхіка трошкі бунтуецца, на гэтым этапе бывае... я ведаю, але ж ва ўсім трэба трымацца меры. Яна ўтопіць мяне, адчуваю нешта нядобрае. І сны нейкія, фу-у... пашанцавала, што тут не здагадаліся пабудаваць трамплін ці вышку... Так... у маім жыцці засталося мала асалоды. Але ўсё ж хочацца яшчэ патаптаць гэтую грэшную зямлю. Адгавары яе ад начнога купання, скажы ёй, што тут процьма мікробаў, хімічных адходаў, п'явак, што ўначы з вады вылазяць выдры, вадзяныя змеі, вужы...

— Вы аб гэтым ёй расказвалі?

— І не адзін раз. Яна адказвае, што ёй сам дракон не страшны. Разумееш, Сава, мая жыццёвая трагедыя ў тым, што я ад прыроды джэнтльмен. Я служу жанчыне, служу, паважаючы іх племя, як артыст, як паклоннік. Мае продкі калісь мелі маёнтак і прыгонных. Мажліва, у мяне царская кроў, я моршчуся, калі п'ю гарэлачку, але ж... я добрасумленны. Цябе яна паслухае. Жанчыне лесціць, калі аб ёй клапоціцца малады чалавек.

— Добра. Калі просіце, паспрабую нагнаць страху.

Артыстка выйшла з вады, дастала з сумкі махровы ручнік.

— Ах, які цуд, які цуд! Як бадзёрыць цела!

— Гэта вам пашчасціла. Учора ўвечары я рашыў выкупацца. А вецер з усходу прыгнаў з боку фабрыкі цацак такія хімікаты і мазут, што ледзь скура не адклеілася ад мяса.

— Супастаты! Зона адпачынку, і што дазваляюць. Куды глядзіць мясцовая ўлада? Кіраўніцтва БТА? — вельмі натуральна сыграў пратэст Леў Марцінавіч.

— Гэта яшчэ што?! За дзень да вашага прыезду там

правала каналізацыю. Малюнак, далажу вам, авангардысту і не сніўся.

— Да-а. Дакаціліся, усё сыходзіць з рук. А каб усыпалі штраф паўмільёна... ды з уласнай кішэні дырэктара фабрыкі тысячы тры,— разышоўся Безмагільны.

Артыстка не рэагавала. Хутка яна пацягнула Льва Марцінавіча ў лясок. Сава сеў і, падставіўшы спіну сонцу, прасядзеў так нерухома гадзіну, глядзеў усё на сцяжынку, якая вяла ў сасоннік. Ён злавіў сябе на думцы, што чакае Марыю. «Ды што я, пацан, далібог жа! Ляплю з яе вобраз богабаязнай, асаблівай, не ад свету гэтага... Што ў ёй асаблівага? Кірпаты носік? Прывабная ўсмешка? Прыемная жаноцкасць? Гордая паходка? Але ж ўсё гэта на фоне старых і, можна сказаць, зусім старых людзей альбо такіх дзівакоў, як артыстка аперэты ды Леў Марцінавіч. З яе боку гэта амаль нахабства не заўважаць яго. Падумаеш, строгая захавальніца сямейнага ачага. Трэба раззлавацца, ісці і браць, як усіх, як і раней!»

Ён яшчэ ўспомніў пра ўчарашняе, калі яна, вяртаючыся ў домік, абмінула наўмысна яго катэдж. Праўда, ён назіраў за яе няхітрымі рухамі з ганка бібліятэкі. «Так... яна ўмее валодаць пачуццямі, умее іх хаваць. Чорт, цяжка за акулярамі прачытаць, што там, у вачах!»

І ён стаў шукаць падставу, каб як-небудзь апынуцца з Марыяй сам-насам. Уваходзіў ён у сталоўку апошнім, павольна крочыў паміж столікаў, чакаючы, што вось-вось яна зірне ў яго бок.

Раніцай на яе месцы сядзела пажылая жанчына ў старамодных акулярах, у ёй няцяжка было пазнаць маці Марыі, так яны былі падобны.

— «А дзе яна? Паехала? Надоўга? Куды? Праведаць мужа?» Ён губляўся ў здагадках, увесь астатак дня хадзіў вакол фінскіх домікаў. Нешта зрушылася ў яго душы, дагэтуль паўзабытае, трывожнае.

Яна адсутнічала два дні, толькі два дні, а яму падалося — месяц.

Яны прыехалі на новенькіх жоўтых «Жыгулях»: двое мужчын, жанчына ў стракатай блузе і шортах, двое дзяцей і яна. Усім было весела. Дзеці Марыі кінуліся ў абдымкі да маці. Усе, перакідваючы адзін аднаму вялізны каляровы мяч, рушылі да возера. Сава стаяў ля адчыненага акна сваёй «хібары» і неадступна сачыў за ёю. Яна не азірнулася. Увечары таго ж дня, гэта была нядзеля, вясёлая кампанія на «Жыгулях» паехала ў горад, паехала з імі і яе маці.

Марыя зноў засталася адна з дзецьмі. Трывога яго аціхла. Яна была побач і да заканчэння тэрміну заезду заставалася яшчэ сем дзён.

Ён ішоў у бібліятэку, а яна выходзіла з яе. Ён не спадзяваўся яе сустрэць і ўпершыню прыкметна разгубіўся.

— Добры дзень! Вось мы і загаварылі ў трэці раз. Маё імя Сава. Не кажыце мне сваё імя, я хачу ўгадаць.

— Паспрабуйце.

— Людміла?! — Як яму было прыемна бачыць яе ветлівую ўсмешку.

— Не.

— Святлана?! — Сава спяшаўся, усё думалася, што яна пойдзе, пакіне яго.

— Не.

Ён панік, бо падумаў, калі не ўгадае і на трэці раз, яна пойдзе. Але яна сама выратавала становішча.

— Відаць, і сёння не ваш дзень. Маё імя — Марыя.— Яна не адштурхнула яго, не адвяла ўбок руку, якую ён падаў ёй. Яна сышла з прыступак.

— Дзякую.

— Вам дзякуй, што вярнуліся з горада. Я думаў, што не прыедзеце.

Яна нічога не адказала, пайшла да свайго жоўтага фінскага доміка. Сава ненавідзеў сам сябе. «Ды што яна, цвердакаменная? Набівае цану? Дзікунка якая? Ці так напалохана мужам? Пурытанка? Я ж паводжу сябе прыстойна, пачціва, ні кроплі пошласці... Што ж прымушае яе быць такой асцярожнай? А можа, гэта маска? Яна мяне наўмысна заводзіць, каб я сарваўся, адкрыўся. І тады ёй будуць падставы кінуць у твар: ах, дык і вы, як усе, нахабнік і жлоб? Не-е... фантазіі. Яна мяне зусім заблытала. Ну, не... я даб'юся ўвагі і даверу хоць на залатнік, няхай дзеля спартыўнага інтарэсу, але дасягну!»

І ён стаў настойліва шукаць сустрэчы з Марыяй. Дзеля гэтага згадзіўся на шпацыр у кампаніі Безмагільнага і яго «фурыі». У прысутнасці Савы абое разгаварыліся.

— Як вы, Сава, лічыце, чаго больш у Марчэла Мастраяні, як у нашых, перажывання ці прадстаўлення? — дапытвалася артыстка.

— Я думаю, у маэстра больш, як у нашых, грошай!

Артыстка залілася такім рогатам, што яго маглі чуць не толькі ўсе адпачываючыя, але і работнікі фабрыкі цацак на процілеглым беразе, за два кіламетры ад іх. Безмагільны ўдакладніў:

— Мой анёл, толькі наша школа здольна на існае перажыванне, цяперашні Захад толькі лоўка ўсё прадстаўляе. Так як нашы жанчыны ўмеюць любіць, не многім дадзена.

Сава лавіў сябе на думцы, што, слухаючы іх, ён усё больш і больш думае пра Марыю і моліць усявышняга, каб напаткаць яе дзе-небудзь у адзіноце.

— А вы чыталі пра тыбецкую медыцыну? Ашаламляльна! Лезе пальцамі табе ў жывот, дастае самую вялікую кішку, перакусвае тое, што баліць, і запіхвае кішку на месца. І ўсё без скальпеля, іголкі, нітак! Фенаменальна. Вы чыталі?

— Чытаў,— адказаў артыстцы Сава.

— І вы верыце?

— Па праўдзе кажучы, з цяжкасцю. На свае вочы не бачыў.

— А я веру,— фанатычна сказала артыстка і нечакана пабегла навыперадкі з дзецьмі за вялікім мячом, які нёс вецер да возера.

— Много есть чудес на свете, всех чудесней импотент,— працягваў тэму артысткі Леў Марцінавіч.— Раней нестандартныя паводзіны жанчыны, якая ішла са мной побач, кранал маё самалюбства. Цяпер жа, слухаючы іх наіўную балбатню, я адпачываю, здзіўлены глупствам гэтых стварэнняў. Даўней, як бывала... мне дзед расказваў... на балі, усе ў раскошы... халодная ветлівасць... на шыі жэмчуг, побач гусары.. Дзе гэтая Русь? А ў гасціных віст, прэферанс... Не было ні пятнаццаці сутак, ні медвыцвярэзніка. Усё галантна. Мы ўзвалілі на жанчыну цяжкі воз і зараз, спахапіўшыся, патрабуем ад яе жаноцкасці, палёту пачуццяў, пяшчоты і лірыкі. Была ў мяне гадкоў гэтак... наццаць адна дамачка. Адуванчык, матылёк. Апраналася ў дзіцячым магазіне. Але характар: ЦРУ, ФБР, КДБ усе разам. Яна трымала мяне ў яжовых рукавіцах. Так мяне кахала, што кантралявала дзень па мінутах. Больш таго, ведаючы, што кожныя дваццаць секунд у чалавека капля мачы паступае ў мачавы пузыр, яна з матэматычнай дакладнасцю вылічвала, калі я пайду ў туалет пасля спектакля і колькі ў ім пабуду. Фенаменальныя здольнасці. У вышуку ёй не было б роўных. Ёй прарочылі бліскучую будучыню. Не ведаю, хто б з ёй зжыўся... калі б яна не трапіла ў аўтамабільную катастрофу. Хвіліну. Твая, думаецца, сядзіць у адзіноце. Дзейнічай, дзейнічай... помні мудрага Гётэ, лаві імгненне, а я рэцыруюся. Не буду перашкаджаць. І вось што, калі мяне адвязуць да ўролага, ведай, гэта мая мадам праверыла на мне тыбецкі метад. Павер, першы раз не рады кантакту з жанчынай.

Лічу да ад'езду дні, як калісь у тэатры лічыў да зарплаты. Успамінаю сваё першае каханне... Нябожчыцу жонку... наіўны анёл... так. Яна магла дазволіць сабе мардабой... пад ахвоту... але рэдка. Альбо вось прыклад: другая мая супруга, нябожчыца, чытала ў арыгінале французскія кнігі, магла адной рукой гнуць падкову... феномен... гіпнозам лячыла запоры, аднак жа ўсякім дзівосам мяне не вучыла. Я ўжо маўчу пра трэцюю супругу... нябожчыца... аднак хопіць... табе трэба дзейнічаць. Гэта прыліпла з адным, кажа, не паеду адсюль, пакуль цябе, Лёва, не навучу выдатна плаваць. Ну, ці ж не трагедыя ўсё гэта? Я трымаюся на вадзе пасабачаму, і хопіць. Навошта з мяне на восьмым дзесятку жыцця рабіць алімпійскага чэмпіёна? Праўда, я ёй сказаў, што мне ўсяго пяцьдзесят восем. Дарма мы ім далі волю, яны на нас ваду і возяць. У жанчыны інтэлект на ўзроўні здольнасці палічыць колькасць варон на карціне Саўрасава «Гракі прыляцелі». Дарэчы, ты ведаеш, колькі іх там? Трыццаць тры. Усё. Я пабег. Сёння па прапанове маёй мадам мы праводзім дзень памяці Рамэо і Джульеты. А ты дзейнічай, ну, жадаю поспеху!

Заўважыўшы Саву, Марыя рэзка паднялася, аднак пайшла да фінскіх домікаў няспешна. Ён дагнаў яе, узяў за руку:

— Малю вас, не пазбягайце мяне так адкрыта. Я чорт ведае што думаю. Гэта зневажае мяне.

Ён рызыкнуў і пацалаваў яе руку, якую яна адразу адняла.

— Я нічога не патрабую, не маю права патрабаваць, але ж не зневажайце мяне татальнай абыякавасцю. Я быў бы шчаслівы ісці вось так побач з вамі, я ўсё разумею... даруйце за дзёрзкасць, я гатовы чакаць вас кожны вечар, калі заснуць дзеці, на гэтым месцы, паўтараю, я не прэтэндую, нічога не патрабую, акрамя вашай прысутнасці. Я губляюся ў здагадках, я хачу аддаць вам усю ўвагу, пяшчоту, клопат, але ж баюся назаляць, баюся, што не так зразумееце маё жаданне быць побач. Я не чужы для вас, паверце, не вампір, не дэман. Я жывы чалавек, і мною кіруюць добрыя намеры. Даруйце... я знікаю. Нам насустрач ідуць людзі. Дзякую вам за маўчанне, яно надае надзею на новую сустрэчу. Я буду чакаць вас тут на алеі штовечар.

І ён, як апантаны, хадзіў па алеі да позняй ночы, аж пакуль не ўбачыў, што яна патушыла святло ў сваім пакоі. Яна не адгукнулася на яго просьбу сустрэцца. Ён не пайшоў нават вячэраць. Баяўся, што не стрымаецца і скажа ёй

грубае слова. Ляжаў на ложку апрануты і абуты. Гартаў без цікавасці газету. Нехта асцярожна пастукаў у шыбу. Сэрца яго здрыганулася: «Няўжо яна?» Не помнячы сябе, зрабіў крок да акна.

— Гэта я,— адазваўся Безмагільны,— малю цябе, ратуй хутчэй! Гэта канец. Мая ідзе ўсё ж на начное купанне. Падстрахуй мяне. Хадзем. Ты схаваешся за кустамі на пляжы. Нічога яе, упартую, не палохае: ні ядахімікаты, ні змеі. Я ганаруся яе смеласцю, рашучасцю, яе здольнасцю пераадолець жах у начной вадзе, але ж я не хачу ляжаць на дне. Сава, табе гэта залічыцца ў раі, у пекле... у нас аднолькавыя душы... ты нагадваеш мяне ў маладосці... але за што мне такая помста... я ж іх усіх кахаў. Хутчэй ідзі!

— Калі трэба, значыць, зробім,— без бадзёрасці адказаў Сава.

— Не... Збываюцца словы маёй чацвёртай жонкі. Яна была скалалазка. Я тады ў Нальчыку працаваў. Сарвалася са скалы ў маладым яшчэ ўзросце...дык вось яна накаркала, ты, кажа, Лёва, сваёй смерцю не памрэш. Згодны, але чаму зараз і чаму так: захлынуцца пратухлай вадой, цінай, ілам... не магу. Я хачу памерці прыгожа, на пышных грудзях якой-небудзь фурыі. Хадзі сюды, хавайся вунь у тыя кусты. Чакай майго сігналу. Я скажу: знікні, нячыстая сіла, святы дух, памажы мне. Ведай, гэта азначае, справа дрэнь, трэба ратаваць. Усё. Хавайся. Вунь яна ідзе. Я пазнаю па сілуэце.

Падышла артыстка аперэты. Яна зняла халат, кінула яго пад ногі Льву Марцінавічу і голая пайшла да вады, ласкава запрашаючы за сабой Льва Марцінавіча. Ён распрануўся, праўда, застаўся ў трусах, зайшоў у ваду па калена, не перастаючы яе падбадзёрваць:

— Я тут. Я побач, мой адуванчык.

— Ах, якая вадзічка! Сырадой,— амаль спявала артыстка, яна была ўжо далёка ад берага. Потым нечакана ўсталявалася над воднай гладдзю цішыня.

— Дзе вы? А-у-у? Залатая мая, не прымушайце мяне хваляваццца. У нас так адзін у Нясвіжы ад інфаркту памёр. Выходзьце з вады, ау-у... я трымаю напагатове ручнік. Радасць мая, дзе вы?.. Божа! Я так і ведаў! — Няшчасны Безмагільны хацеў клікаць на дапамогу Саву, але ж раптам нешта нябачнае ўхапіла яго за ногі. З перапуду ён упаў у ваду.

— А вось і я,— артыстка гучна рагатала.

— Мамачка мая, так да смерці напалохаць можна. Я ве-

ру, вада сапраўды як сырадой, але ж... я так за вас перажываю.

— Расціраўце мяне... усю, усю... я ваша, толькі ваша... Расціраўце... О, як прыемна... якія ў вас ласкавыя рукі... Ды вы мужчына ў росквіце сіл... Больш упэўненасці, больш натхнення... Абдыміце мяне, сагрэйце... Цалуйце, цалуйце... яшчэ...

Леў Марцінавіч, як малады пеўнік, забегаў вакол сваёй дамы. Усяго яго калаціла так, што ён баяўся, каб не выпала штучная сківіца.

— О, мая непараўнальная... багіня... Я зараз закрычу ад шчасця,— павесялеў ён.— Знікні, нячыстая сіла! Ты чуеш мяне, знікні, святы дух, памажы мне... апошні раз у жыцці памажы!

Сава, пачуўшы дамоўлены пароль, падняўся на ўвесь рост, гатовы бегчы на дапамогу.

Заслужаны артыст, відаць, спахапіўся, успомніў, што ён пераблытаў словы, і паспяшаўся папраўляць справу:

— Стой! Назад! Святы дух, знікні дахаты, у катэдж, нячыстая сіла, памажы мне. Вы зразумелі мяне, сілы дабра і зла! Знікні, дух, у фінскі домік!

— Любы мой, не трэба займацца псіхааўнушэннем... Навошта клікаць духаў, я твой дух, твой рок, тваё каханне. Ах, якая ноч... Цалуй мяне, мой рыцар... Божа, якія моцныя ў цябе абдымкі...

Сонечным ранкам Леў Марцінавіч быў у цэзарскім настроі трыумфатара, увесь дзень ззяў, нібыта толькі што ён спусціўся ў кратэр вулкана і вылез адтуль жывы.

— Ведаеш, Сава,— усмешка не пакідала яго твар,— нешта ўсё ж у гэтых бестыях ёсць незямное. Яшчэ дзень таму я гатовы быў зрабіць сабе харакіры... Дарэчы, мая дазналася, дзе твая непрыступная працуе. Марыя — бухгалтар вытворча-мастацкіх майстэрань пры Саюзе мастакоў. Муж яе спявае ў хоры опернага тэатра. Гэта рэдкі альянс. Ім нялёгка знайсці агульную тэму. Праўда, і гэта мая ўведала, Марыя трошкі трымкае і сама на фартэпіяна. Натура музычная. Трэба больш рамантыкі, сентыментальнасці... Эх, мне б гэтак гадкоў сорак скінуць... я правёў бы паказальны ўрок. Праз два дні ад'язджаем... Дзейнічай, дзейнічай...— не стамляўся даваць адну і тую ж параду Безмагільны. Сава і без напаміну ведаў, што хутка, ой, як хутка яна паедзе, што ён можа згубіць яе назаўсёды. «Што ж застаецца? Выцыганіць тэлефон і не адставаць у Мінску? Глупства. Там іншыя абставіны, іншая атмасфера... Бадай, першы выпадак

у жыцці, калі так абыякава ставяцца да маіх заляцанняў. Каб жа яна ведала, што ўсё шчыра... без гульні...»

У дзень ад'езду зноў прыехала маці і павяла яе дзяцей да возера. Сава ўпершыню рызыкнуў падысці так блізка да яе акна. Чакаў. І, о дзіва, акно адчынілася!

— Добры дзень! — спяшаўся паказацца ёй на вочы Сава.— Вам калі выходзіць на работу?

Яна паказала яму далонь.

— Праз пяць дзён. А дзе дзеці? — сам не ведаў, чаму менавіта спытаў пра гэта.

— Гуляюць з бабуляй,— адказала яна і ад акна не адыходзіла.

Ён прайшоў метраў дзесяць па алеі, азірнуўся... яна стаяла на тым жа месцы і глядзела яму ўслед. Тады ён звярнуў з алеі і праз мінуту апынуўся з другога боку доміка,— адчыніў дзверы і ўвайшоў да яе.

— Я тут, Марыя.— Голас яго дрыжаў.

Яна павярнулася, аперлася спіна́ю аб сцяну і так стаяла як укопаная, бледнатварая, са здзіўленнем і насцярогай у вачах.

Сава падышоў да яе.

— Як я чакаў гэтай мінуты... як маліў бога...

— Не чапайце мяне, не трэба... прашу вас,— у яе голасе не было настойлівай мальбы.

— Даруйце, толькі адзін пацалунак... мы больш не ўбачымся... Толькі адзін.— Ён асыпаў яе градам пацалункаў, патушыўшы ў абдымках яе кволае супраціўленне. Сава быў хуткі, як страла. Яна, прыціснутая ім да ложка, ледзь паспела сказаць:

— Дзверы не замкнёны!

Ён імгненна павярнуў ключ і праз секунду зноў цалаваў яе горача і страсна, як нікога і ніколі.

— Гэта сон... Божа... не магу зразумець... Навошта гэта ўсё! — казала яна, намагаючыся не глядзець яму ў вочы.

Сава спяшаўся выйсці. Пацалаваў яе ў шыю.

— Я знайду цябе, знайду... Ты мне патрэбна...

На апошнюю вячэру ў сталоўцы Марыя прыйшла ў белай сукенцы, з гладка зачасанымі, сабранымі ў вузел на патыліцы валасамі. Нешта няўлоўнае на яе твары ён усё ж прыкмеціў...

Саву абяцаў падкінуць у горад загадчык сталовай на сваім старэнькім «Масквічы».

Усе ад'язджалі аўтобусам. Сава загадзя пайшоў да дарогі, яму хацелася яшчэ раз убачыць яе ў аўтобусе. Пашэнціла.

Яна сядзела ля акна, праводзіла яго трывожна-ласкавым поглядам.

— «Мавр сделал свое дело, мавр может уходить»,— у лёгкім ап'яненні пахваліў ён сябе ўслых.

У драндулеце ён не слухаў гаспадара машыны, які са смакам крытыкаваў кіраўніцтва тэатральнага таварыства. Горад, які мільгаў жоўтымі, лімоннымі, чырвонымі агнямі, падаўся яму паўзабытым, чужым. Пяць дзён ён не выходзіў з хаты. Не хацелася. Ён яшчэ жыў там... у «Астрашыцкім гарадку», жыў успамінамі. На шосты дзень наведаў сваё роднае кафэ-дыскатэку. Там ішоў рамонт, будаўнікі (трэці раз) абяцалі завяршыць яго да восені.

Ён пайшоў па праспекце, зазірнуў у кнігарню. Без цікавасці абышоў паліцы з букіністычнымі кнігамі, пакінуў лаўку, паплёўся да кінатэатра, да якога заманьвала рэклама амерыканскага фільма. На душы было неспакойна. Спытаўся ў першага ж сустрэчнага ля кінатэатра, ці не падкажа той, дзе тут знаходзяцца мастацкія майстэрні?

Ссівелы ад часу і прыгнуты да зямлі чалавек з адышкай назваў вуліцу. Сава не ведаў, дзе такая вуліца, і спытаў у таксіста, той адказаў, што гэта ў раёне новага універсама. Нейкая сіла панесла Дыма туды, да універсама. Знайшоў хутка і будынак з патрэбнай яму шыльдай. Мінут дзесяць прастаяў пад вокнамі, затым падняўся на другі паверх, адчыніў дзверы бухгалтэрыі.

Марыя сядзела ля акна, па шчаслівай выпадковасці за суседнімі двума сталамі нікога не было.

— Добры дзень! — Ён пацалаваў ёй руку.— Гэта я.

Яна прыветліва ўсміхнулася.

— Вы прыйшлі? Добры дзень! Я баялася працягу, але ж вы прыйшлі.

— Я не мог не прыйсці... Сам не ведаю чаму, але гавару вам праўду. Я пачакаю вас пасля работы.

— Мне трэба на вакзал. Праводзіць сваіх.

— Куды яны едуць?

— Муж адвозіць дзяцей да бацькоў у Новалукомль.

— Добра. Тады я буду чакаць вас заўтра. Я пазваню.— Ён паглядзеў на нумар яе тэлефона.

У аддзел увайшла высокая жанчына з начосам. Сава, не вітаючыся з ёю, хутка выйшаў. Ён пазваніў Феліксу Гаўрылку, дамовіўся з ім аб сустрэчы, а калі сустрэўся, выпрасіў у яго ключ ад кватэры да дваццаці нуль-нуль.

Ехалі да дома фатографа на аўтобусе, як ён пасля, праз месяц, шкадаваў, чаму не ўзяў таксі ў гэты першы іх сталіч-

ны дзень. Маўчалі амаль усю дарогу. Ён толькі гладзіў яе руку.

У ліфце ён упершыню абняў яе, пацалаваў.

— Можа, не трэба нам сустракацца? Адчуваю... раблю ўсё супраць волі... і не магу спыніцца.

— Значыць, так трэба... Няхай намі кіруюць пачуцці.

Яна саромелася паказацца перад ім голай, прыкрывалася ручніком, скрыжаваўшы на грудзях рукі. Яна была скавана, хоць і адказвала на яго незвычайную пяшчоту сваімі гарачымі пацалункамі. Пілі каву. Да васьмі гадзін заставалася яшчэ дваццаць мінут.

— Ой госпадзі... як гэта ўсё ў нас... дагэтуль не разумею. Калі б хто сказаў, што я так... адразу... не паверыла б. Нічога добрага з гэтага не будзе. У цябе ёсць сям'я?

— Так.— Ён не сказаў, што Сярожа не яго.— Жонка, сын.

— Вось бачыш... Усё супраць нас. У мяне ўсё ішло добра, адносна добра... Я думала, што жыву няблага. І вось з'явіўся ты. І я, як наіўная дзяўчына, чакаю кожны дзень, кожную гадзіну тэлефонны званок. Чаму ты не званіў?

— Я быў упэўнены, што дачакаюся цябе пасля работы.

— І дачакаўся. Дасягнуў свайго. Спакусіў маці дваіх дзяцей, сціплую жанчыну... ва ўсялякім разе сціплую дагэтуль.

— Не кажы так. Гэта нешта іншае. Усё іншае. Я яшчэ не магу зразумець, што гэта. А муж калі вернецца?

— Не ведаю. Будзе званіць. У мяне дома пакуль жыве маці. Мы кроім і шыем спадніцу.

— Ого, дык ты і рукадзельніца?

— Стараюся. Ну, што, едзем?

— На жаль, трэба.

Ён завёз яе на таксі ў новы мікраараён Зялёны Луг-6. Марыя паказала яму свой дом, свой балкон на трэцім паверсе. Яны вельмі цёпла развіталіся. Сава абышоў яе дом і апынуўся на дзіцячай пляцоўцы перад яе балконам. Стаяў і чакаў. Не ведаў яшчэ што, але чакаў. Сеў на арэлі і чакаў. Проста яму не хацелася ісці адсюль. Як бы адчуваючы яго прысутнасць, яна выйшла на балкон. Яны абое ўзрадаваліся. Усміхаліся і падавалі рукамі адно аднаму знакі.

Пакуль муж з тэатрам быў у Новасібірску, іх сустрэчы сталі частымі. Вельмі здзівіла Саву і тое, што Марыя запрасіла яго да сябе. «Не баіцца суседзяў?»

Двухпакаёвая кватэра была абстаўлена проста, айчыннай мэбляй, але з густам. Магчыма, дапаўнялі традыцыйны

шэры інтэр'ер, які назаляў паўсюдна ў знаёмых, мноства самых розных дзівосных сувеніраў, якія муж прывозіў з розных гарадоў і розных краін.

Яна ўключыла магнітафон з прыемнай мелодыяй, наварыла кавы, частавала цукеркамі, пячэннем, не ведала, чым яшчэ абрадаваць, была як ніколі шчодрая на ласку.

— Што з табой, мой любы чалавечак? Нібыта ты развітваешся са мной?

— Так. І не так. Я хачу, каб табе спадабалася, каб ўсё запомнілася. Ой, што гэта са мной? Згарым мы хутка, адчуваю, таму што вельмі ж соладка душы.

— І мне люба з табой, вельмі люба.

— Не можа доўга цягнуцца усё гэта... не можа. Павер. Заўтра дзеці прыедуць, а я іх не так чакаю, як цябе... гэта ж жахліва падумаць. Стаю ля акна, як вар'ятка, гадзіну, дзве... усё цябе чакаю. Я купіла твой любімы гранатавы сок. Я іншая, я зусім не тая, што была. Баюся часам сябе.

— І са мной дзеецца нешта дзіўнае. Не пазнаю свой характар. Мне нічога няміла. Ні горад, ні сябры, ні сям'я... Табе не цалавалі калені?

— Не.

— Я іх пацалую. Табе ногі ніхто не цалаваў?

— Ніхто і ніколі.

— Я іх пацалую.— І ён цалаваў.

— Не гавары так. Я баюся.

— Я люблю цябе ўсю. Ты асабліва прыгожая зараз.

— Гэта прыкмецілі і мае сяброўкі на рабоце. Гэта ж колькі мы... у нас... гэта... два месяцы, а здаецца, як адзін дзень... Вочкі мае блакітныя,— казала яна і цалавала яму вочы.

— Вочы мае карыя,— казаў ён і цалаваў яе вочы.

— Ой, як я баюся таго дня, калі надакучу табе, як надакучыла свайму мужу.

— Не думай пра гэта. А чаму ты вырашыла, што надакучыла яму?

— Адчуваю. Я нават ведаю, што ў яго ёсць палюбоўніца. Скрыпачка з аркестра тэатра. Мне яе паказвалі. І дзіўна, але зараз мяне гэта не хвалюе, як раней. Надта многа месца ў маім сэрцы заняў ты. Мне балюча, калі я бачу цябе перад вокнамі майстэрняў. Табе даводзіцца доўга чакаць. Не прыходзь так рана. Добра?

— Добра.

Ён згаджаўся, але ж прыходзіў усё роўна на гадзіну раней. У час яе абеду пілі каву ў кафетэрыі новага універ-

сама. Дні хутка ляцелі пад акампанемент прачулых слоў: «Я гатовы цалаваць паветра жніўня».— «Я таксама». Развітваючыся, ён паспяваў шапнуць ёй: «Я буду думаць пра цябе». Яна перад тым, як зачыняцца дзверы тралейбуса, паспявала адказаць: «Я таксама».

Шчаслівая ўсмешка не пакідала іх твары ў гэтыя незабыўныя мінуты.

Асабліва сумаваў ён без яе ў выхадныя дні. Прыехалі яе дзеці, вярнуўся з Новасібірска муж. Яна мусіла тактоўна пераносіць спатканні. Тады Дым знаходзіў дома адгаворку: маўляў, трэба паехаць купіць білеты ў кіно ці пашукаць у суседнім гастраноме бараніны. Ён садзіўся на веласіпед і імчаў да яе дома. Калясіў там па дзіцячай пляцоўцы і з надзеяй глядзеў на вокны яе спальні, на балкон. Гэта было неверагодна, але ў якую б гадзіну ён ні прыехаў да яе дома, праз пяць — дзесяць мінут яна альбо з'яўлялася ў акне, альбо выходзіла на балкон.

— І ўсё ж не магу ўспомніць, дзе я цябе бачыў раней? — Неяк яны хадзілі па скверыку ля Балотнай станцыі, і Сава ўсё дапытваўся ў яе пра гэта.— Ты ніколі не была ў Доме кіно?

— Даводзілася. У зусім маладыя гады.

— Па запрашальным білеце?

— Мяне праводзіў адзін чалавек.

— Марат Эдуардавіч? — у страшнай здагадцы ўсклікнуў ён.

— Так.

— Навошта ты мне гэта сказала? Бывай. Я хачу, мне трэба пабыць аднаму,— рашуча, нават са злосцю сказаў ён.

Усё мог дапусціць Сава, але толькі не такі цяжкі ўдар лёсу. Гэты плюгавы кар'ерыст, нікчэмнасць, гэты дэмагог і пустамеля і тут апярэдзіў яго.

— Што з табой? — дапытвалася насцярожаная і здзіўленая Марыя.— Я ж адмовіла яму, выйшла замуж за іншага.

— Бывай! — Сава хуткімі крокамі, адчуваючы стук уласнага сэрца, рушыў да бліжэйшага прыпынку тралейбуса.

Галіна даўно заўважыла рэзкую перамену ў характары мужа, яго замкнёнасць, жаданне застацца аднаму, халодную абыякавасць да яе. Некалькі разоў яна намагалася выклікаць яго на шчырую гаворку, жадаючы сардэчна памагчы, высветліць прычыну смутку. Сава спасылаўся на нуду, на вымушаную бяздзейнасць. Ён не працаваў ужо пяты месяц. Нарэшце ў канцы кастрычніка яму прапанавалі месца дыск-

жакея ў адной аддаленай ад цэнтра дыскатэцы. Мода на іх паступова знікала. Зараз збіраліся маладыя людзі групкамі ў першыя відэасалончыкі, пакуль нелегальныя. Аб'явіліся першыя дыспетчары і крэдыторы відэакасет і відэамагнітафонаў. Пазнаёміўся з гэтым дзівам нашага стагоддзя і Сава. Фелікс запрасіў Дыма да свайго знаёмага кампазітара. Увесь вечар круцілі эратычныя касеты, якія шакіравалі нават Саву: групавыя оргіі, лесбіянства, гомасексуалізм.

«Не гаварыце мне больш, што жанчына здольная на высокія, высакародныя пачуцці! Фрэйд кажа праўду...» — даказваў п'яны Фелікс кампазітару.

Яму ніхто не адказваў, з ім ніхто не спрачаўся.

Сава адразу змікіціў, што гэтая справа ў перспектыве абяцае грашовы лівень. Ён пастараўся бліжэй пазнаёміцца з усімі і найбольш з лагодным і дагледжаным, як хатні кот, кампазітарам. Дым шукаў забаву для душы, каб не думаць пра Марыю. Ноч правёў з лабаранткай НДІ. Нічога не ратавала. Яго не цягнула да старых «кадраў», не хацелася заводзіць новыя знаёмствы з жанчынамі.

Галіна ўгаварыла яго паехаць у ЦУМ і купіць нарэшце салідны, як у людзей, дыван. Хадзілі чуткі, што з новага года ўсё зноў падаражае. Выбірала яна, ён паныла прысутнічаў, не цікавіўся колерам, коштам. На вітрыне біжутэрыі яго ўвагу забралі пацеркі, і формай, і колерам падобныя на тыя, што насіла ўлетку Марыя. Ён затрымаўся... і глядзеў на карычневыя шматгранныя каменьчыкі.

Прыйшла ранняя зіма, снежная, марозная. Ехаць на веласіпедзе да дзіцячай пляцоўкі і, як дурань, мазоліць вочы суседзям Марыі было і нязручна, і неразумна. І ён, пераадолеўшы сябе, вырашыў усё-такі пазваніць ёй на работу. З ледзь прыкметнай незадаволенасцю галоўная бухгалтарка адказала, што Жураўлёва хварэе, і кінула трубку. Дзе яна? У бальніцы?.. Дома? Як доўга будзе хварэць?

Дым купіў білеты на оперу «Рыгалета». Упершыню за ўсё сваё сталічнае жыццё ён патрапіў у оперны тэатр. Узяў бінокль і прыняўся пільна разглядваць хор, спадзеючыся ўгадаць сярод артыстаў мужа Марыі. Навошта гэта яму патрэбна было, ён і сам не адказаў бы. Разгледзеў толькі стаптаныя чаравікі ў аднаго саліста і худзенькія рукі салісткі. Прымусіў сябе дасядзець першую дзею да канца і пайшоў. Ён ведаў нумар тэлефона яе суседкі (яна неяк пры ім набірала, і ён запомніў), абяцаючы тады, што пазвоніць хіба толькі ў вельмі экстрэмальнай сітуацыі. Дым набраў

патрэбны нумар і, назваўшыся вядомым мастаком-графікам, папрасіў, каб запрасілі да тэлефона суседку Марыю Жураўлёву па вельмі неадкладнай справе ў сувязі з яго паездкай на выставу ў Парыж.

— Алё-е? — пачуў ён праз мінуту слабы і да болю знаёмы голас.

— Гэта я. Даруй. Скажы для канспірацыі што-небудзь наконт заказаў. Я хачу ўбачыць цябе, чуць цябе, Марыя!

— Так, чую. Заўтра я выходжу на працу. Званіце туды. Да сустрэчы.

— Да сустрэчы,— ледзь паспеў сказаць і ён. «Голас абыякавы, сухі...» Ён губляўся ў здагадках, што стаіць за гэтым... «да сустрэчы». Ці вернецца ўсё? Хацелася спадзявацца на лепшае. Паступова і настрой яго палепшыўся. Ён угаварыў Сярожу, і яны з асалодай прайшліся па першым снезе на лыжах.

«Гэта нават і добра, што я ёй тры тыдні не званіў. Мне патрэбна атрымліваць перамогі пастаянна. Няхай гэта зайздросныя імпатэнты і называюць гімнастыкай пачуццяў. Няхай».

Раніцай ён не пазваніў, а паехаў сам, прыадчыніў дзверы бухгалтэрыі. Яна, заўважыўшы яго, праз мінуту выйшла ў калідор.

— Што здарылася?

— Нічога. Мне зрабілася млосна, калі я падумаў, што чакаць цябе яшчэ цэлы дзень... і вось прыехаў.— Ён узяў яе руку ў свае.— Баюся паверыць, што ты зноў побач.

— Так. Мне страшна і за цябе, і за сябе. Ты празмерна недаверлівы...

— Не вяртайся пасля абеду на работу. Я хачу цябе павезці куды-небудзь, дзе ты ніколі не была.

— Куды?

— У храм... У Кафедральны сабор, напрыклад. Мы паедзем і паставім свечкі за ўпакой... нашых далёкіх продкаў. Гэта дзякуючы іх старанням мы сустрэліся.

— Добра. Я паспрабую адпрасіцца.

— Вячэрняя служба ў саборы пачнецца ў шэсць гадзін вечара,— пачціва сказаў ім вартаўнік храма.

Яны вырашылі гэтыя тры гадзіны пахадзіць. Ёй падабалася трымаць яго за руку і блукаць па заснежаным горадзе.

— Для адных какафонія гукаў на вуліцы, а для другіх сімфонія.

— Так. Усё залежыць ад таго, з якімі пачуццямі ў сэр-

цы ідзеш па вуліцы,— адказаў ён.— Скажы, каб я папрасіў, забі Марата Эдуардавіча, і я ажанюся з табою? Ты б зрабіла гэта?

— Бог з табой! Такія жахлівыя планы. Ад слабай жанчыны патрабаваць забойства... чорны гумар, так?

— А калі б я вельмі папрасіў... патрабаваў... Калі б настойваў, дзеля нас, дзеля будучыні нашай?

— Не ведаю. Гэта проста недаступна мне. Недзе па другі бок свядомасці. Навошта ты з'ядаеш сябе рэўнасцю да мінулага?

— Адкажы: так ці не? — гарачыўся Сава.

— Мажліва, і так, а мажліва, і не... Я яшчэ, як аказалася, і сама сябе добра не ведаю. Наша сустрэча праявіла мяне з другога боку.

— Я хачу пацалаваць цябе. Тут.

— Дзівак, кругом людзі. Убачыць яшчэ хто.

— Няхай зайздросцяць.

І ён пацалаваў яе.

У саборы было нешматлюдна. Сава купіў на рубель дзве свечкі. Яны іх паставілі ў медны падсвечнік, які стаяў ля вялізнай іконы Мікалая-Чудатворца.

— Ты памятаеш сваіх продкаў? Дзеда, бабу?

— Не. Яны памерлі ў час вайны.

— А імёны ты іх ведаеш?

— Не.

— Тады проста скажы: «Пашлі, божа, ім вечны спакой» — і перахрысціся.

— А як?

— Здаецца, як вучыў Кузьма, справа налева. Эх, шкада, што яго няма.

— А хто ён такі?

— Хто яго ведае. Можа, і поп... хаваў прафесію.

— Скажы, а чаму ў святых на іконах вочы сумныя?

— Не ведаю. Вясёлымі павінны быць мы... Жывыя... а яны памерлі і сумныя.

Некалькі ссівелых жанчын у грубых валёнках, вясковых хустках і старэнькіх паліто ўторылі за дыяканам «верую ў адзіную веру хрысціянскую» . Сава і Марыя стаялі нерухома мінут дзесяць, прыслухоўваючыся да малазразумелых слоў службы. Сава згубіў цікавасць першы, у яго балела спіна, і ён чакаў, калі ж ёй надакучыць і яны пойдуць з царквы. Ля ўвахода, ля бакавых дзвярэй стаяла ў фіялетавым паліто і вялікіх валёнках жанчына з кійком у руках, яна вельмі пільна, з недаверам сачыла за ўсімі рухамі Савы

і Марыі. Ёй не спадабаўся Сава, які стаяў у храме з дыпламатам у руцэ. Яна пачала хрыплаватым барытонам вурчаць:

— Ходзяць тут... бязбожнікі... правяраюць... Правяральшчыкі праклятыя!

Да яе падышла матушка (яна прадавала свечкі) у сінім халаце з белым каўнерыкам і пачала супакойваць:

— Соня, гэта не тыя... Гэта сціплыя людзі.

Жанчына ў фіялетавым паліто не супакойвалася:

— На ім агонь! Я бачу на ім агонь! Ізыдзі, сатана, госпадзі, свят господзь, спасі і памілуй, ізыдзі з храма, сатанінскае племя, ізыдзі... на ім агонь, на ім агонь!

І яна з ледзянымі, ненавідзячымі вачыма паказала кійком на Саву.

Веруючыя ўсе больш і больш пачалі звяртаць увагу на Саву і яго сяброўку.

Тады Марыя і прапанавала пакінуць храм. Да Савы падышла пачцівая матушка і сказала, каб яны не звярталі ўвагі на Соню. «Яна ў нас трохі... дзіўная».

Яны выйшлі на ганак. Сава азірнуўся. Злыя вочы Соні сачылі за ім. «Які агонь? Што яна меле, сумазбродка». Саву было непрыемна, што гэта здарылася пры Марыі.

— Дзіўная бабка.

— Мне шкада яе.

— Заўтра я вазьму ключ у Фелікса. Добра?

— Добра,— проста адказала яна.

Упершыню ў той вечар ён праводзіў Марыю да самага пад'езда. Мажліва, ад таго, што было цёмна наўкола, ім не хацелася развітвацца.

Юродзівая Соня запала яму ў душу, не давала супакоіцца. Сава наўмысна прыехаў да храма ў нядзелю раніцай з адным жаданнем: даць падаянне менавіта Соні, але ж каля ўвахода жанчыны ў фіялетавым паліто не было, а зайсці ўсярэдзіну ён не рызыкнуў.

Сава абяцаў Марыі дастаць дарагіх шакаладных цукерак і пакінуў ёй нумар тэлефона сваёй дыскатэкі. Калі ў іх не было магчымасці сустрэцца, яны абавязкова званілі адно аднаму, не забываючы ў канцы кароткай гаворкі сказаць: «Чакаю. Кахаю. Думаю». Пад Новы год ён даслаў ёй віншавальную паштоўку. Сонечнай раніцай трыццатага снежня яна пазваніла яму і прызначыла сустрэчу ў кафетэрыі універсама.

— Скажы, чаму ты не давяраеш мне? — Яна глядзела яму ў вочы.

— Не разумею.

— Чаму ты напісаў мне віншавальную паштоўку, а да таго і нумар тэлефона левай рукой? Ты не давяраеш мне? Баішся? Страхуешся?

— Марыя, я зрабіў гэта чыста машынальна. Не думай дурное.

— Не. Ты сабе наўме. І думаеш толькі пра сябе. Няўжо я памылілася? Ты не давяраеш мне? Не давяраеш майму сэрцу, так выходзіць, майму пачуццю, марам?

Ён заўважыў, што яна моцна пакрыўдзілася.

— Я аддала табе ўсё. Забыла пра дзяцей, мужа.

— Супакойся, Марыя. Мне імпанаваў твой халодны аналіз... я фантазёр, я жыву эмоцыямі, ты ўдумлівая. Дзякуючы тваёй адкрытасці, пяшчоце, шчырасці і я змяніўся ў лепшы бок. Мне здаецца, я ўпершыню зразумеў, як гэта хораша насіць у душы пачуццё. Не верыш? Бачу, сумняваешся. Тады вось мае ўмовы. Рашай. Мы пакінем у адзін дзень і адзін час нашы сем'і... і... і паедзем у Цюмень, я не ведаю, на Пячору, у Курган... Я гатовы... хоць сёння. Падумай. Узваж усё і прымі рашэнне. Глядзі мне ў вочы. Я ў поўным здравіі, з цвярозым розумам і кажу ўсё шчыра. Верыш?

— Так.

— Усё зразумела?

— Так. Я падумаю. Пасля Новага года я дам табе адказ. Я і сама думала, што бясконца ўсё, што паміж намі, цягнуцца не можа. Я не хачу, мне цяжка хаваць, саромецца сваіх пачуццяў. Хачу ўзяць цябе за руку і вольна пайсці па вуліцы, сядзець у кафэ, у кінатэатры. Мы ж так і не былі ніводнага разу ў кінатэатры. Ты прапанаваў выйсце. Я падумаю.

Ён пацалаваў яе на людзях каля століка кафетэрыя і правёў да майстэрняў.

— З надыходзячым Новым годам!

— І цябе таксама.

— Я буду стаяць роўна ў дванаццаць нуль-нуль ля акна і глядзець на месяц.

— І я таксама.

— Да сустрэчы ў новым годзе!

— Да хуткай сустрэчы.

Якую ролю ён сам сабе адводзіў зараз? Прызнацца, дык яго занепакоіла і насцярожыла нечаканая і цвёрдая рашучасць, з якой яна адгукнулася на яго імправізаваную прапанову. У Новы год ён не стаяў ля акна. Давялося сустракаць у дыскатэцы. Работа, нічога не зробіш.

Прыехаў дахаты з бутэлькай шампанскага, павіншаваў

Галіну (Сярожка спаў), якая глядзела праз сілу навагодні канцэрт.

— Заплюшчы вочы. Гатова! — Ён зарадзіў у плэйер касету з канцэртам зорак сусветнай эстрады. Яны выпілі шампанскага і дагледзелі да канца двухгадзінны канцэрт.

— Я Сярожу мульцікі Дыснея запішу,— паабяцаў ён ужо праз сон.

Патайным шляхам з сумак «Адзідас», праз інтэрнаты замежных студэнтаў да Дыма траплялі відэакасеты пра клімакс, пра сцюардэс, якія не падзялілі паміж сабой палюбоўніка, пра прыватныя сексуальныя ўрокі маньяка, пра вампіраў і прастытутак. Дым хутка і паўсюдна стаў вядомы як «падпольны магнат відэабізнесу». «Вазьмі ў Савы. Па таксе. У яго ўсё ёсць».— Гэтую ходкую фразу ведалі партыйныя работнікі, следчыя, таксісты, артысты, прадаўцы і пісьменнікі. Сава з Феліксам ладна і з густам абставілі кватэру Фелікса і зрабілі з яе нешта накшталт бара-відэасалона альбо дома для сустрэч сяброў вузкага кола.

Саву хутка надакучылі ўсе відэакасеты, вытрымліваў прагляд ад пачатку да канца толькі аднаго фільма, які лічыў самым сумным фільмам усіх часоў і народаў. Гэта быў фільм Феліні «Казанова». Ён гэты фільм нікому не прапаноўваў, ведаў, што пакуль на ўвесь горад копія толькі ў яго, адна. «Вакол жлабы. Гэты фільм ніхто не зразумее, як я. Усе будуць чакаць толькі палавыя акты...»

Фелікс набыў стары «жыгуль». Цяпер у іх былі «колы», і поле іх дзейнасці пашырылася на ўсю рэспубліку.

Пасля каляд Сава ўпрасіў Фелікса завезці яго на Паўночныя могілкі. Дым купіў гваздзікоў роўна на пяць рублёў. (Сава даўно пазычаў у Чакатоўскага пяць рублёў і не аддаў доўг). Прыехалі. Было вельмі холадна. Дзяжурнай на рабочым месцы не аказалася. Нахмураныя магільшчыкі параілі яму, каб шукаў магілы пахаваных у васьмідзесятым годзе ў шостым сектары. Ён доўга блукаў сярод помнікаў і не знайшоў магілы свайго брыгадзіра. Прамёрз да касцей. Паслухмяны, абыякавы, здаецца, да ўсяго, акрамя грошай, Фелікс узарваўся: ён быў у лёгкай куртачцы і задубеў, ссінеў увесь. Крыў мацернымі словамі і сябра, і яго брыгадзіра. Сава паклаў кветкі на магілу воіна-інтэрнацыяналіста і пакінуў могілкі.

З Марыяй яны сустрэліся тыдні праз тры пасля Новага года. Хварэла на грып яе дачка. Марыя паспявала сказаць Саву некалькі цёплых слоў па тэлефоне. Удалося сустрэцца на кватэры Фелікса ў канцы студзеня.

— Я ўсё расказала маці.

— Як? — Яму карцела аблаяць яе пасля гэтых слоў.

— Даруй. Яна ў мяне самая шчырая дарадчыца.

— Навошта?

— Нічога не думай. Яна разумная жанчына, добрая. Яна ўсё зразумела. Даравала мне, бо ведала, што я нешчаслівая з мужам ці не зусім шчаслівая. Яна ж маці, зразумей мяне. Я падвяла яе да гаворкі не адразу. Паведаміла ёй пра наш план. Яна згадзілася пакуль што забраць дзяцей да сябе. Яна працуе карэктарам у выдавецтве. На пенсіі... праўда, але часова яшчэ працуе. Я паабяцала, што дзяцей хутка забяру.

— Правільна. Натуральна. Калі адкрылася, значыць, так табе падказала інтуіцыя. Мне трэба толькі сабраць грошай. Яны нам вельмі будуць патрэбны напачатку. Спяшацца не будзем. Зіма. Хваробы. Твая дачушка хварэе. Няхай акрэпне. Так?

— Так, так. Нельга такую пакідаць нават на тыдзень.

— Я не хачу цябе нікому аддаваць. Ведай пра гэта. Твая ранімасць, жаночая слабасць кранаюць мяне, і прыемна адчуваць сябе апорай. Не ведаў, што і ў гэтым можа быць асалода для душы. Я раўную цябе нават да ветру.

Яму і самому спадабаліся гэтыя словы.

— Ведаеш, што ў мяне стаіць перад вачыма?

— Не.

— Не першая наша сустрэча ў доме адпачынку, не першая блізасць, не тваё ласкавае і пяшчотнае цела, не твае губы, абдымкі, не. Перад вачыма стаіш ты на балконе. Стаіш, бо немагчыма выйсці, там у пакоі муж і дзеці, яны глядзяць тэлевізар, а ты ў думках побач са мной на дзіцячай пляцоўцы, і я гэта адчуваю.

— Цяпер я ўсё больш і больш зайздрошчу тваёй Галіне, бо яна побач з табой увесь час.

— І я пачынаю раўнаваць цябе да мужа. Раней не раўнаваў.

— Мы паедзем?

— Несумненна. Прыйдзе першае цяпло, і паедзем.

Ён адказваў ёй так пранікнёна-пяшчотна, з доляй цвёрдай упэўненасці, даверлівасці, што ёй хацелася зноў і зноў паўтараць пытанне, каб пачуць яго адказ: «Прыйдзе першае цяпло, і паедзем». Яна гатова была клікаць тую вясну са шчаслівай надзеяй ў голасе. Яна гатова была маліцца, каб прыспешыць яе надыход. Прынесла на работу галінкі бэзу, наліла ў слоік вады, кінула туды два кавалачкі

цукру і паставіла слоік з галінкамі на маленькі столік да самавара, да цяпла. Гатова была, здаецца, саграваць сваім дыханнем кожную галінку, каб хутчэй дачакацца першага кволенькага бледна-зялёнага лісціка. І колькі было радасці, калі яе бэз — а такія ж самыя галінкі стаялі і ў прыёмнай на стале сакратаркі дырэктара — ажыў першы. Часам седзячы ля акна і узіраючыся ў яшчэ шэрае неба, якое недзе далёка хавала сонца, Марыя адчувала раптам, што сэрца трывожна ные, а душу атуляе сум. Не, яна яшчэ не прадчувала, што Сава яе падмане. Навошта? Ён тады б, калі выношваў такі план, і размову не заводзіў бы аб «уцёках».

Напярэдадні Міжнароднага жаночага дня 8 Сакавіка, калі яна з сяброўкамі, як звычайна, амаль не дамаўляючыся, сустрэліся ля ўвахода, падняліся на свой паверх, адчынілі пакой, дык былі прыемна здзіўлены: на кожным стале былі букецікі пралесак і шакаладка, а стол Марыі ля акна упрыгожвалі шыкоўныя ружы.

— Дзіва, ды і толькі! — казала старэйшая супрацоўніца.

— Хоць бы адным вокам глянуць на гэтага сучаснага графа Монтэ-Крыста,— наўмысна расцягваючы словы казала маладзейшая яе сяброўка.

— Хіба ж Монтэ-Крыста? Лепш скажы Дон-Жуан,— папраўіла старэйшая.— Мае дзяды-аднагодкі, на жаль, на такія сюрпрызы ўжо не здатны. Прызнавайцеся, чый гэта містэр X?

— Мой не такі багаты і шчодры. Не-е... Ён баязлівец. Прывяду дамоў, кажу, заставайся, бацькі на дачы. Усё адно знойдзе прычыну і ўцячэ. Дробныя мужыкі пайшлі, эгаісты. Не пайду за яго. Мой не здольны мяне абараніць,— доказна выказалася маладзейшая.

— І ты, Марыя, не ведаеш, хто нас так арыгінальна павіншаваў?

— Не ведаю. Можа, якісь мастак,— адводзіла позірк убок Марыя.

Добры настрой не пакідаў жанчын. Яны не-не ды і дапытваліся ў Марыі: «Хто ж гэты мастак?» Яны не сумняваліся, што зрабіў ласку знаёмы чалавек, але здзівіла, што ён так смела выказаў сваю сімпатыю да Жураўлёвай. Трошкі расчараваліся, калі даведаліся ад прыбіральшчыцы, мажнай глухаватай добрай цёткі Сцепаніды, што кветкі ранічкай, калі яна прыбірала, прынесла маладзенькая дзяўчына. Пасля гэтых слоў Марыю больш нічога не цікавіла. Прыходзілі мастакі, сам дырэктар, віншавалі іх са свя-

там, прыносілі падарункі ўласнай работы: які-небудзь накід, стары эцюд. У другой палове дня жанчыны нават выпілі бутэльку шампанскага. Употай выпілі, замкнулі дверы, каб чужое вока не бачыла «грэх» на вытворчасці.

Марыя ўвесь гэты дзень пільна хавала ўнутраную трывогу. Яна, не ведаючы яшчэ нічога, акрамя аднаго факта, раўнавала Саву да той маладой дзяўчыны, якая на досвітку прынесла кветкі.

У Вадзіма ў гэты святочны дзень быў выязны канцэрт у падшэфным калгасе. Ён даўно ўжо без асаблівай урачыстай ўзнёсласці досыць сціпла віншаваў яе і з Жаночым днём, і з днём нараджэння, які прыпадаў на дванаццатае сакавіка. Найчасцей віншаваў у адзін дзень, часам са спазненнем. Калі быў на гастролях, даваў віншавальную тэлеграму пятнаццатага альбо, меў і такую звычку: набыўшы падарунак, уручаў яго за два, тры дні да свята.

І зараз яна засталася з дзецьмі, якія не адыходзілі ад тэлевізара. Хадзіла з кухні ў ванную, нешта рабіла, прыбірала, шукала работу рукам... А сама ўсё чакала, чакала: а раптам знойдзе прычэпку, пазвоніць суседзям ды выклікае яе, ён жа такі вынаходлівы, калі яму трэба.

Сава не пазваніў. Ён з'явіўся на наступны дзень і першае, што сказаў, інтуітыўна па голасе ў тэлефоннай трубцы, адчуўшы яе халоднасць і нервовасць, каб дарма не хвалявалася і нічога не думала: ён наўмысна наняў сяброўку-палюбоўніцу Фелікса, і тая занесла кветкі, а яны з фатографам чакалі пасыльную ў таксі ўнізе.

Гадзіну, дзве Марыя правяла з Савам. Паступова да іх зноў вярнуўся лагодна-сумны настрой, які атуляў іх душы ў мінуту развітання. Ён часта-часта цалаваў ёй рукі, твар.

— Ты зноў спяшаешся? — палахліва-трапяткім голасам пытала яна.

— Дурненькая мая, харошая. Мне заўсёды не хочацца адпускаць цябе туды, да яго,— мякка супакойваў ён.

— Што ж рабіць, што ж рабіць?

— Нешта прыдумаем. Пачуцці падкажуць. Хутка ўжо паедзем.

Як ёй хораша рабілася на душы пасля гэтых слоў.

А як жа Вадзім Жураўлёў, муж Марыі?

Надзелены ад прыроды глыбокай назіральнасцю, тонкай паэтычнасцю, ён недзе пасля трыццаці гадоў разгу-

біўся перад, як казаў сам, аднастайнасцю і шэрасцю жыцця.

«Калі я не магу сказаць, што кожная мінута, якую я пражываю, прыносіць мне асалоду, дык які сэнс змагацца з абставінамі жыцця і шукаць гэты самы сэнс?» — любіў паўтараць Вадзім сваёй жонцы, суседу-таксісту, з якім мог гадзінамі сядзець на кухні, піць піва і спрачацца: чыя метадалогія футбола лепш — Малафеева ці Лабаноўскага, а тым часам цяжарная Марыя прыбірала кватэру.

Кожную суботу раніцою яна ішла ў магазін, па дарозе ў кіёску купляла Вадзіму газеты «Літаратура і мастацтва», «Советский спорт», часопіс «Крокодил» — такая была ў сям'і завядзёнка. Вяртаўся ён з тэатра позна і спаў да адзінаццатай гадзіны. Акрама артыкулаў пра музыку, больш у «ЛіМе» ён нічога не чытаў. У «Советском спорте» цікавіўся інфармацыяй пра футбол, альпінізм, шахматы. У «Крокодиле» любіў фельетоны і карыкатуры, а таксама кароценькія афарызмы, якія перапісваў сабе ў запісную кніжку. Паступова яго глыбокая назіральнасць ператварылася ў выбарачнасць, у хобі, а тонкая паэтычнасць саступіла месца эгаістычнаму практыцызму. Ён захапіўся літаратурай пра фантастыку, прыгоды і ўвесь свой вольны час таптаўся каля букіністычнага магазіна, вымеmaking ўчы ў такіх жа фанатаў (а часам і звычайных перакупшчыкаў) дэфіцытныя рэдкія кнігі аб падарожных у нязведаныя далячыні. У апошні год яго зацікавілі новыя ідэі пра іншапланецянаў.

Дзяцей ён па-свойму любіў, але мала бываў з імі, яны яму хутка надакучвалі. Ён купляў ім з самага маленства розныя хітрыя, дарагія імпартныя гульні, цацкі, каб толькі яны неназалялі і не забіралі яго вольны час. Набыў нават вялікі акварыум з рэдкімі рыбкамі. Але праз тыдзень ён махнуў рукой і на акварыум. Ленаваўся ехаць у магазін «Прырода» па корм для рыбак, ленаваўся памяняць ваду. Здаралася, што вадзіў дзяцей у Батанічны сад, але даваў ім поўную волю, сам садзіўся і чытаў фантастыку. Калі ж яны звярталіся да яго з мноствам пытанняў, ён прасіў, каб яны ўсё запаміналі, што, дзе і як расце, а дома маці ім пра ўсё падрабязна раскажа.

У нечым Вадзім быў падобны на Саву. І ён мог бы падпісацца пад любімым выразам Савы, які ён час ад часу нагадваў Галіне: «Я толькі ўтвараю вам умовы для асалоды, а сам не ўдзельнічаю ў гэтым». Але калі Дым дзейнічаў,

змагаўся, бараніў як умеў сваю незалежнасць ці нават ілюзію незалежнасці, дык Вадзім жыў адасоблена, не верачы, што ёсць каштоўнасць, дзеля якой можна рызыкаваць. Сава з прычыны карыслівасці нікога не пускаў у сваю душу. Вадзім жа разумеў, што яго асабістыя пачуцці, мары, надзеі, меркаванні проста нікога не цікавяць, як і яго самога ніхто не цікавіць. Нельга сказаць, што над ім уладарыла лянота. Проста ён зачыняўся ад свету дзвярыма «аптымістычнай абыякавасці». Такі выраз прыдумаў сам. «Тэатрам кіруюць адны і тыя ж людзі. Мы, артысты, не маем голасу, акрамя голасу на сцэне, але ж там даводзіцца спяваць чужыя ноты»,— часта казаў ён Марыі.

Марыя сумна разважала: ці яна надакучыла яму, ці ён разлюбіў яе? Калі ж даведалася, што ў Вадзіма ёсць палюбоўніца, доўга не хацела верыць.

Гады чатыры ён абяцаў жонцы знайсці «саліднага краўца з імем», які мае заказы ад сталічнай эліты і які працуе у іх тэатры. Яго абяцанні так і засталіся абяцаннямі. То быў кравец заняты па горла, то хворы, то ў адпачынку, то ў бальніцы, то ў медвыцвярэзніку, і так бясконца. Яна стамілася яму нагадваць. Здаралася, што ён, як ні дзіўна, прасіў яе часцей званіць яму, калі ён быў дзе-небудзь далёка ад Мінска на гастролях. Сваіх абавязкаў па гаспадарцы Вадзім не меў. У лепшым выпадку казаў: «Для мяне быт — катарга. Няхай табе дапаможа маці, але зрабі ўсё, каб яна не заставалася ў нас начаваць». У хаце панаваў культ караля рок-н-рола Э. Прэслі, аднак культ гэты Вадзім не навязваў Марыі. Праўда, дзеці паступова ўцягваліся ў магію рытмаў караля самі, як бы неўпрыкмет. Ім падабалася пад бадзёрую музыку рабіць з бацькам гімнастыку. Дзіўна, выхаваны на класічных творах геніяльных кампазітараў свету, бессмяротных народных песнях, Вадзім пасля музычнага вучылішча ніколі больш імі не захапляўся. Надзелены ад прыроды прыемным барытонам, ён мог і меў права падрыхтаваць сольную праграму ці ў рэшце рэшт увайсці ў склад канцэртнай брыгады ад філармоніі. Марыя не сумнявалася: ён меў бы поспех і не толькі ў сваёй рэспубліцы. Аднак такая перспектыва яго не вабіла.

«Я люблю спяваць у хоры. Адказнасці менш. Не трэба браць на сябе арганізацыйныя клопаты. Паверыш, спакайней жыць у гурце непрыкметных. Мне здаецца, што ўсе наўкола, ты пільна прыгледзься, гуляюць у нейкую трагікамедыю, фарс, і потым... Пакуль нам хапае грошай. Падрас-

туць дзеці, пайду ў пеўчыя на клірас у Кафедральны сабор. Цяпер нашы ідуць зарабляць грошы і ў царкву. Жыццё амаль не мяняецца, гэта мы паступова мяняемся. Мажліва, я ў нечым цябе расчараваў. Даруй. Але не думаю ўсё ж, каб я табе надакучыў. Ты, калі я бываю на гастролях, бавіш час вольна... Гэта найпершыя атрыбуты чалавечага шчасця. Прымай жыццё такім, якое яно ёсць. Я стаміўся быць правільным. І экстрэмістам быць не хачу».

«Сапраўды ён змяніўся»,— думала яна,— і, здаецца, у горшы бок. Як ён любіў казаць, «у бок аптымістычнага індывідуалізму».

Узімку таго года, калі напаткала на сваю бяду і радасць Саву, Марыя моцна хварэла на грып. Вадзіму часцей давялося хадзіць у магазіны, нерравацца ў чэргах, ісці ў аптэку, на бацькоўскі сход у школу, плаціць падаткі ў ашчаднай касе. Рабіў ён гэта ўсё моўчкі, але як бы цераз сілу, незадаволена.

Неяк ён сядзеў ля тэлевізара, глядзеў нешта спартыўнае, калі яна папрасіла, каб ахінуў чым-небудзь, бо ёй холадна. Вадзім хутка дастаў з шуфляды старэнькую коўдру, якую трымалі для неспадзяваных гасцей, і кінуў ёй на ложак.

«Божа, няўжо гэта той самы Вадзім, які сустракаў яе на парозе ваннай, падаваў цёплы махровы халат, браў на рукі, каб не студзіла ногі, бо вельмі ж дзьмула з-пад балкона, і нёс у ложак, цалуючы і гаворачы ёй ласкавыя словы. Няўжо гэта той самы Вадзік?»

Марыя больш не сумнявалася ў яго незлаблівай няўвазе, якая межавала з абыякавасцю. Скупы на пачуцці, ён усё менш і менш быў для яе родным, блізкім. Яна раптам адчула, што аддаляецца ад яго душэўна і што не пратэстуе супраць гэтага і не змагаецца за адраджэнне сваіх і яго пачуццяў.

Бывала, ён яе запрашаў да філасофскай гаворкі аб жыцці. Задаваў пытанне: «Ці можа добры быць разумным і наадварот?»

Яна слухала. Гаварыў ён, доўга гаварыў. Часам яго разважанні ёй падабаліся, як некалі маладой падабалася дэмагогія Свістуна, але ж цяпер яна ўспрымала ўсё без былога захаплення.

У Вадзіма ніколі не было боязі застацца аднаму, у яе — была.

Муж Марыі прыкмячаў змену ў характары жонкі. Яна стала больш энергічнай, рухавай, пачала, як ніколі раней,

вельмі сачыць за сваім знешнім выглядам, часта бегала ў цырульню, аднак вялікага значэння гэтаму не надаваў. Замкнёны, лаяльны эгаіст, як ён называў сябе сам, не лез ёй у душу, ён даўно жыў толькі сваім жыццём, недаўменна здзіўляючыся на яе папрокі: «Табе ніхто не трэба. Ты ніколі не цікавіўся, як я жыву, што думаю. Не цікавяць цябе і ўласныя дзеці. Ты спяшаешся кінуць нас адных і збегчы да сяброў рамантаваць машыну, крыць дах дачы, масціць лінолеум». Таксама халадна, суха, як і з жонкаю, паводзіў ён сябе і з палюбоўніцай-скрыпачкай. Такі быў чалавек... Відаць, ніхто ніколі не выхоўваў у ім уменне разумець і спачуваць чалавеку, які ідзе побач.

Прыйшла вясна. З навальніцай на голыя дрэвы і раннімі сціплымі песнямі птушак пад акном. Трэба было выконваць абяцанае альбо нешта прыдумаць новае. Колькі ні ламаў галаву, не змог знайсці грунтоўнай прычыны, каб адкласці ад'езд. Саву падалося, што Марыя ўсумнілася ў яго шчырасці і праўдзівасці. Ён быў як бы прыціснуты гэтым абяцаннем да сцяны. Самалюбства ўзяло сваё: ён рашыўся. На ўсякі выпадак ён папярэдзіў Галіну, што едуць на пяць дзён у Вільнюс на ўсесаюзную нараду-практыкум дыск-жакеяў. З найбольш блізкімі сябрамі ён усё ж рызыкнуў параіцца. Калі тыя даведаліся пра яго жаданне кінуць усё і паехаць у Сібір, то вырашылі, што ён жартуе. Бо каму яшчэ так цёпла і прывольна жылося тут, калі не Саву Дыму. «Трэба быць вар'ятам, каб мяняць шкуру льва на шкуру мышы». І адгаворалі, і палохалі.

Марыя напісала мужу пісьмо і апусціла яго ў скрынку на вакзале за дзве гадзіны да адпраўлення іх цягніка. Не магла больш заставацца ў кватэры, хоць ведала, што Вадзім вернецца дахаты а палове адзінаццатай. У чамадан склала толькі самае неабходнае. Дзеці паснулі, яна іх на развітанне пацалавала, папрасіла маці, каб тая праводзіла да аўтобуса.

— Так Вадзіму і скажаш, што ты і сама не ведаеш, куды я паехала і з кім. Маўляў, праз тыдзень, два пазвоніць,— яшчэ раз папярэджвала Марыя сваю маці. Жанчына рызыкнула ў апошні раз запытаць, не адгаворваць, бо давярала і любіла сваю дачку, заўсёды верыла, што на які лёгкі флірт яе Марыя ніколі не пойдзе, хоць усё было амаль абгаворана:

— Можа, варта было б напачатку ўсё ж атрымаць развод з Вадзімам, узяць шлюб з тваім Савам і ўжо тады ехаць у белы свет, пачынаць усё спачатку?

Маці не баялася гэтага «пачынаць спачатку». Сама яна — жонка былога афіцэра, які быў у палоне, адседзеў у лагерах, часта пачынала з любімым мужам усё спачатку.

Марыя супакоіла маці:

— У нас трошкі ўсё не так, як у людзей. Гэта зневажае асобу... усе гэтыя заявы, угаворы адміністрацыйных асоб. У нас адно выйсце — знікнуць разам, парушыць усё адным махам, а пасля можна будзе заняцца і фармальнасцямі. Калі кахаеш, не гэта галоўнае. Паперка не ўтрымае.

— Дай бог, каб усё ў вас там было добра, каб ты не памылілася і ён не перамяніўся. Ой, божа мой, якая жахлівая доля жанчыны на зямлі. Каб адказаць на каханне, самой кахаць — трэба пакутаваць. Не, ніколі не зможа быць жанчына вольнай і незалежнай. Уся гэтая гульня ў эмансіпацыю — блеф. Не, я не плачу, не асуджаю, крый божа. Я такая ж моцная, як і ты. Калі ты пайшла на такое, значыць, ніхто не мае права даваць парады ці перабіваць тваё памкненні.

Яны абняліся.

— Ключ? Можа, усё-ткі ўзяла б запасны ключ?

— Не. Не хачу. Гэта дрэнная прыкмета. Не хачу я да яго вяртацца. Паверыш, я змагалася да апошняга. Яшчэ раніцою як бы асуджала тое, што цяпер раблю, шкадавала Вадзіма... а зараз воля... вольная... спакойная. Хочацца спяваць. Усё. Напішу адразу, як толькі ўладкуюся.

Мінула гадзіна, ішла другая... вось нарэшце да адпраўлення цягніка Мінск — Масква заставалася пятнаццаць мінут. Яна выйшла на перон , зноў вярнулася ў залу чакання, выбегла на прывакзальную плошчу, не ведаючы, што рабіць, што думаць. Пазваніла яму дахаты, набралася смеласці. Трубку падняла Галіна, яна не стала з ёй размаўляць. Набрала нумар тэлефона кватэры Фелікса. Там тэлефон не адказваў. Яна абхадзіла ўздоўж і ўпоперак увесь вакзал, нават прыбегла ў будынак кас — і там нікога. Тады Марыя села на свой маленькі чамаданчык ля аптэчнага кіёска і не зварухнулася да дзвюх гадзін ночы. Няцяжка сабе ўявіць, у якім стане яна вярталася дахаты. Муж не спаў. Ён здзівіўся яе выгляду і позняму прыходу, але нічога не стаў распытваць. Яна і сама папрасіла не чапаць яе. Распранулася. Залезла ў ванну, відаць, хацела сагрэцца, а мо проста не ведала, дзе сябе дзець. Муж ляжаў, зрэдку варочаўся ў ложку, маўляў, ведай, што не сплю.

Марыя села на кухні, зацягнула фіранку на акне, паглядзела на дзіцячую пляцоўку — такую цёмную, бязлюднажахлівую, і заплакала.

Муж злёгку пастукаў у кухонныя дзверы. Яна ў істэрыцы папрасіла яго пайсці ў спальню. Марыя адчыніла халадзільнік. На вочы ёй трапіла бутэлька воцатнай эсенцыі. Машынальна яна наліла поўную шклянку, пачала піць, сілком каўтаючы атруту. Не ўсё выпіла. Ёй зрабілася дрэнна. У роце, на губах запузырылася пена, дыханне перахоплівала, нібы шыю круцілі вяроўкамі, і яна, не вытрываўшы, крыкнула: «Дапамажыце!»

Муж адчыніў дзверы. Яна, абхапіўшы шыю рукамі, сядзела на падлозе ля халадзільніка і вымавіла адно толькі ціхае слова «даруй».

Сава за чатыры гадзіны да адпраўлення фірменнага цягніка прыехаў да Фелікса. Яны на пасашок выпілі каньяку. Назіральны Фелікс бачыў, што Дым знаходзіцца ў нервовай напружанасці, і адданы сябар вырашыў крута павярнуць справу, накіраваць «гульню» ў патрэбнае рэчышча. Сава і сам па дарозе да Фелікса для сябе тое-сёе прыкінуў: «Давязу Марыю да Масквы. Пагуляем там да кайфа. Прыдумаю нешта непазбежнае, як камета Галея, і павернем назад». Цяпер ён чакаў парады ад Фелікса... О, як ён хацеў, каб нехта ўзяў адказнасць на сябе, зняў, ці хоць бы падзяліў, ці прымусіў яго перайначыць што-небудзь. Не хацелася губляць Марыю і не хацелася ехаць. Раздвоенасць, як удушлівы смурод, завісла над ім.

— Я віншую цябе! Ты магутны чалавек! Ты даказаў сам сабе, што здольны на такі адважны ўчынак... і дастаткова, навошта яго ажыццяўляць. Яна ж згадзілася? Перамога атрымана, і цудоўна... У чужым месцы, у чужым горадзе? Навошта? Радасць-казка ложка прысутнічае і тут. Там нічога новага не будзе. Носік той жа, рукі тыя ж самыя, губкі, грудзі, ногі... без змен. Павер мне,— Фелікс падабаўся сам сабе,— ты знаходзішся пад часовай уладай пачуцця. Вярніся да самога сябе. Хутка табе гэта надакучыць... колькі іх было.

Разумею... яна асаблівая. Ну, вытрымаеш год, два ад сілы. Надарвеш грыжу, пасадзіш сэрца і ўжывай электракардыестымулятар, лепш японскі, у нас яны толькі-толькі пачынаюцца. Твая рызыка на мяжы авантуры. Калі яна разумная жанчына, а з выгляду гэта так, і яна не паедзе на

вакзал. Ты ўжо арол, а не пеўчы дрозд, не пакутуй ад пытання... ці стане чалавек, які корміць арла, і сам арлом... Не спакушай лёс. Зазірні ў заўтрашні дзень. Ці тое ты робіш? Ці здольны ты? Цябе ж я ведаю, дзякую богу, не адзін год. Але навошта мне губляць сілы і ўгаворваць самазабойцу. Дзейнічай, дзейнічай! Скачы з балкона! Чорт з табой! Мне нават цікава. Давай аналізуй, даследуй сваю душу, яе магчымасці... Калі табе так хочацца зазірнуць у яе глыбей, калі ласка. Давай я замкну цябе на кухні. Як Адысея перад сірэнамі. Вось ключ. Ён будзе ляжаць ля дзвярэй.

Я буду сядзець і дзяжурыць. Урублю відэа і буду сядзець. Ты клікнеш, калі ўзвые сэрца і пацягне на вакзал.

Бог мой, якім трэба быць наіўным лапухом, каб не бачыць, не ацаніць перспектывы, якія чакаюць нас наперадзе. Тавар ідзе касяком. Правядзем конкурс прыгажунь. Па прыкладу Захаду. Яны стадам паваляць сюды, да нас... гатовыя па руху мезенца падымаць спадніцы вышэй калень. Ды гэта ж саранча... бабы... Яны былі вакол цябе, яны і будуць. Створым кааператыў. Цябе выберам старшынёю, больш і няма дастойных кандыдатур. Набліжаецца час афганскага фальклору, песнапенняў, эротыкі, уседазволенасці... Усё. Я замыкаю цябе на кухні. Сядай, думай. Клікнеш.

— Добра,— выціснуў з сябе Сава.— Ты не ўсё прадумаў, мне здаецца, што я кахаю яе.

— Вось іменна, здаецца. Любоў — ілюзія. Я і не забіраю яе ад цябе. Кахай. Трэба ўзбадзёрыцца. Тэлефон я адключу да раніцы. Ты ў Вільнюсе.

— Добра. Замкні мяне. Я падумаю. Мне цікава. Замкні... замкні. Хутчэй.

— Гадзіннік пакінуць?

— Пакінь.

Так і зрабілі. «Будзе з кім падзяліць адказнасць. Усё ж не адзін». Сава прасядзеў на кухні пяць гадзін. У дванаццаць папрасіў сябра адамкнуць дзверы.

— Ну, дарагі мой, харошы, мудры таварышок... нават і валасінка не ссівела. Вось гэта і патрэбна было сабе даказаць. Ты выстаяў. Вось гэта сіла волі.

Сава папрасіў Фелікса выклікаць таксі. Яму падалося, што ён не мае голасу, не зможа выціснуць з сябе нават слова.

Чамадан пакінуў у фатографа. Прыехаў дахаты. Прасіў бога, каб толькі Галіна нічога не западозрыла. Сказаў,

што семінар перанеслі. Раніцаю жонка пабудзіла яго, званіла маці Марыі.

— Вы нягоднік, падонак. З-за вас мая дачка... яна хацела атруціцца. Вы здраднік. Памятайце пра гэта ўсё ваша паршывае, паганае жыццё.

— Нешта здарылася?

Галіна заўважыла яго незвычайную ўсхваляванасць.

— Не... Непаладкі на службе. Трэба ехаць. Але ўсё будзе добра. Будзем дзейнічаць.

Ён таропка сабраўся і паехаў зноў да Фелікса.

Пазваніў у бальніцу. На сэрцы было неспакойна. Не дай бог усё раскрыецца, і яго пацягнуць у суд. Сказаў, што звоняць з работы. Дырэктар камбіната. Яму адказалі: «Жыць будзе».

Першае і адзінае, што папрасіла Марыя ў мужа, каб ён вярнуў ёй пісьмо, якое атрымае сёння ці заўтра нераспячатаным.

Ён абяцаў выканаць просьбу.

«Мама, даруй... я буду жыць толькі дзеля дзяцей, толькі дзеля іх»,— казала Марыя. Маці ціхенька выцірала слёзы, не адыходзячы ад ложка цяжкахворай.

Сава не пакідаў кватэры Фелікса, яму было страшна выйсці на вуліцу аднаму, баяўся, што яшчэ пазнаюць, ці нехта ўжо ведае пра спробу самагубства жанчыны і ткне ў яго з асуджэннем пальцам. Але ніхто не ведаў, гэты выпадак так і застаўся незаўважаным. Ён баяўся заставацца адзін і ў пакоі. Адкрыў запісную кніжку наўгад, як гэта звычайна рабіў. Выпала літара «Л» — Леакадзія. Пазваніў ёй. Хораша пагаварылі аб жыцці. Ён даведаўся, што яна стала бабуляй. Павіншаваў. Запрасіў адзначыць гэту падзею, абяцаючы паказаць смешную італьянскую камедыю па відэа.

— У цябе ёсць відэа? — узрадавалася на другім канцы дроту пяцідзесяцігадовая Леакадзія.— Чаму ж ты раней не званіў?

— Ды ведаеш, разгубіўся, забегаўся ў джунглях жыцця, якое чамусьці называюць светлым.

— Эх, Дым, Дым... Трэба ўспамінаць сваіх паклонніц. Як зрабіўся вялікім чалавекам... дык і ўсе... простыя смяротныя не цікавяць. Ладна. Дарую. Сёння я не змагу, а заўтра ўся ў тваім распараджэнні.

— Замётана, мая аператыўніца. У васемнаццаць нуль-нуль ля паштамта. Да сустрэчы?

— Да хуткай, Дымок!

Ен дастаў з паліцы дзве касеты: «Эмануэль» і «Чорная Эмануэль», для пачатку, для затраўкі хопіць.

Неба было няласкавае, невясёлае. Бляклыя промні сонца праглынула шэрая імгла. Ён не любіў такое надвор'е. Адарваў лісток ад календара з лічбай дваццаць пятае красавіка і апусціў лісток з балкона. Вецер падхапіў кволую паперку, пагнаў яе вышэй страхі, але ж дробны дождж зацалаваў лісток, і ён, зрабіўшыся цяжкім, змяніў накірунак, пачаў паступова, ляніва апускацца ўніз, да бруднага асфальту. Дым злавіў сябе на думцы, што ніколі не скакаў з парашутам і што гэтага яму ніколі не хацелася.

Стоячы на балконе чужой кватэры Сава Паўлавіч Дым тупа і бяздумна сачыў за мокрай паперкай...

*1988—1989*

ЗМЕСТ

Вочы і сон . . . . . . . . . 7

Сава Дым і яго палюбоўніцы . . 173

**Марчук Г.**

М 30 Вочы і сон; Сава Дым і яго палюбоўніцы: Раманы.— Мн.: Маст. літ., 1990.— 381 с.: іл.

ISBN 5-340-00433-3.

Марчук Г. Глаза и сон; Сава Дым и его любовницы: Романы.

Герой рамана «Вочы і сон» Іван Чачырка падазрае жонку ў здрадзе і ўцякае з турмы, каб адпомсціць Аўяр'яну Ліхадзею, якога лічыць палюбоўнікам жонкі. Падазрэнні Чачыркі не пацвердзіліся, аднак выпадкова ён стаў сведкам замаху на жыццё Ліхадзея. Замах рабіў сляпы музыкант Казік Батура. Ён і расказаў Чачырку пра загадкавае мінулае Ліхадзея.

Чаму так склалася жыццё Савы Дыма, сімпатычнага маладога чалавека, назіральнага, здольнага, практычнага, які, апынуўшыся ў вялікім горадзе, перабраў многа прафесій і спакусіўся лёгкім жыццём? Адказ на гэта пытанне аўтар імкнецца даць у рамане «Сава Дым і яго палюбоўніцы».

М $\frac{4702120201—106}{М302(03)—90}$ 19—90

ББК 84 Бел7

*Литературно-художественное издание*

**МАРЧУК** Георгий Васильевич

**ГЛАЗА И СОН**

**САВА ДЫМ И ЕГО ЛЮБОВНИЦЫ**

Романы

Минск, издательство «Мастацкая літаратура»

На белорусском языке

*Літаратурна-мастацкае выданне*

**МАРЧУК** Георгій Васільевіч

**ВОЧЫ І СОН**

**САВА ДЫМ І ЯГО ПАЛЮБОЎНІЦЫ**

Раманы

Рэдактар *Е. А. Пяршай*
Мастак *Р. А. Панцялееў*
Мастацкі рэдактар *М. Я. Шкурпіт*
Тэхнічны рэдактар *І. І. Дуброўская*
Карэктар *А. Т. Глушчанка*

ІБ № 3227

Здадзена ў набор 12.12.89. Падп. да друку 28.03.90. АТ 06003. Фармат 84 × × 108¹/₃₂. Папера друк. № 2. Гарнітура тып Таймс. Высокі друк з ФПФ. Ум. друк. арк. 20,16. Ум. фарб.-адб. 21,42. Ул.-выд. арк. 22,73. Тыраж 24 500 экз. Зак. 3142. Цана 1 р. 70 к.

Выдавецтва «Мастацкая літаратура» Дзяржаўнага камітэта БССР па друку. 220600, Мінск, праспект Машэрава, 11.

Мінскі ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат МВПА імя Я. Коласа. 220005, Мінск, Чырвоная, 23.

Выдавецтва
«Мастацкая літаратура»
1990

---

Набывайце і чытайце
новыя творы
беларускіх празаікаў

---

*В. Гігевіч*
«МАРСІЯНСКАЕ ПАДАРОЖЖА»
Аповесць, раман

*А. Жук*
«ПРАКЛЯТАЯ ЛЮБОЎ»
Аповесць, апавяданні

*А. Кажадуб*
«ДАРОГА НА ЗАМЧЫШЧА»
Аповесці

*Ул. Рубанаў*
«СВЕТЛЫ РУЧАЙ ЛЮБВІ»
Аповесці

*Ул. Саламаха*
«ЦЯПЛО ЧУЖОГА СЭРЦА»
Аповесці, апавяданні

1 р. 70 к.





Георгій Марчук

# ВОЧЫ І СОН